— Пакуль яшчэ ён патрэбен для навучання ваяроў. Гандляр Чорнавіл паслязаўтра адплывае ў Расток. Калі вернецца з майстрамі Эйсманта, тады і наогул не скажам. Гандляр сёння ці заўтра ўвечары прыйдзе з табой пагаварыць, я яго папярэдзіў.

— Добра.

Так і дамовіліся. На вячэры акрамя князя і князёўны быў і гандляр Чорнавіл. Князь Рынгольд перадаў гандляру пусты кошаль і словы, якія яму трэба сказаць княжычу Доўспрунку, а таксама Эйсманту і Выкінту.

Міндоўг спачатку прыслухоўваўся да размовы князёў, але заўважыўшы што князёўна з цікаўнасцю ўтаропілася на новы пярсцёнак княжыча, сказаў:

— Гэта абярэг ад злых чар. Яго мне падарыў гандляр Чорнавіл.

Убачыўшы, што пасля гэтага князёўна апусціла погляд, княжыч працягнуў прыслухоўвацца да размовы князёў. Яны казалі аб будаўніцтве замка Ворута. Пасля вячэры князь Рынгольд і

княжыч з задавальненнем памыліся ў лазне Вялікага замка. На наступны дзень, прыйшоўшы на плошчу пасля сняданку, Міндоўг заўважыў, што ваяводы не было.

Адразу ён захацеў паглядзець бітвы чацвёрак. На гэты раз у чацвёрках былі і кароткія, і доўгія шчыты. З'явілася шмат шчытоў зробленых па ўзору яго шчыта. Яму было цікава хто і як будуе бітву з улікам living рознага памеру шчыта ў розных ваяроў. Княжыч распытаў сваіх збраяносцаў, у якіх чацвёрках сотнікі лепш арганізуюць вядзенне бітвы. Да гэтага, назіраючы адзіночные бітвы на мечах, Міндоўг вылучыў некалькі сотнікаў найбольш здольных да навыкаў ваяра. Цяпер назіраючы за бітвай чацвёрак, ён канчаткова вызначыў сотнікаў, якіх трэба было прыцягваць на свой бок. Потым княжыч паказаў сваё майстэрства валодання сякучым ударам па манекене, скачучы галопам на баявым кані. Гледзячы як ваяры паўтараюць яго рухі, ён падумаў, што з гэтых сотнікаў і дзесятнікаў можна сабраць вельмі моцны і рашучы атрад, калі да іх дадаць лепшых дазорных.

Цікава як прасоўваецца навучанне дазорных егерам Дзімiном? Вечаром Міндоўг пацікавілся аб гэтым ў таты.

— Пасля двух дзён навучання з імі ён прыходзіў да мяне. Распавядаў, што сярод іх шмат здольных. Вельмі добра страляюць з лука, ведаюць звычкі звяроў, ставяць пасткі на іх. Аб некаторых пастках Дзімін не ведаў і быў здзіўлены, як спрытна яны іх робяць. Але ёсць яшчэ над чым працаваць. Гэта перш за ўсё ўзаемадзеянне з канямі. Яны звыклі пешшу па лесе хадзіць і паляваць. Па яго просьбе я накіраваў яму ў дапамогу нашага ганца Курыла. А таксама яму дапамагае іх егар Сірвід. Так што навучанне прасоўваецца.

— Трэба мне з ім пагаварыць. Я хачу, каб ён назваў мне найбольш здольных.

— На вячэры я перадам князю Ізяславу, каб яго знайшлі і да цябе накіравалі.

Калі яны прыйшлі на вячэру, акрамя князя і князёўны там быў ваявода Ердзівіл. Міндоўг здагадаўся, што будуць казаць аб вайсковых справах. Пачаў размову князь Ізяслаў:

— Мяне цікавілі крыжакі, якія напалі на зямлі Эстляндыі. Я пасылаў свайго ганца, каб выведаць, чым скончыўся гэты па-

ход і якіе яны маюць намеры рабіць далей. Але ганец нешта доўга не вяртаецца. Ваявода Ердзівіл ездзіў да нальшанскага князя, каб выведаць можа яму нешта вядома. Ён таксама непакоіцца і таксама паслаў ганца, каб гэта выведаць. Колькі дзён прайшло?

— Ужо пяты дзень як ганец паскакаў. Князь Таўцівіл цяжка паранены ляжыць, хварэе. У яго Нальшанах тры сотні ваяроў і дзве сотні ў Крэве. Ён і князь і ваявода. Без яго сотнікі нічога не вырашаюць і нічога не робяць.

— Ён нам сябра. Часта ваявалі разам супраць ворагаў і заўсёды дапамагалі адзін другому. Калі крыжакі пойдуць у паход, то праз полацкія землі, але яны хрысціяне, ці скрозь жамойтаў на нас. І хутчэй за ўсё, спачатку нападуць на Крэва. Мы не можам страціць Крэва. Нам трэба быць разам. Я прапаную баявым атрадам выйсці ім насустрач. Я з княязем Рынгольдом будзем займацца будаўніцтвам Воруты. А ты, княжыч Міндоўг, з ваяводам Ердзівілам і з чатырма сотнямі ваяроў Наваградка, а таксама сотня моцных ваяроў жырмунтов, накіруецесь ў Ліду. Ад Ліды сумесна с сотней лідскіх ваяроў пойдзеце спачатку ў Нальшаны. Я зараз пашлю ганца да полацкага князя з прапановай, калі будуць пагражаць крыжакі ім ці нам, то аб'ядначца для сумеснага супраціва. Заадно ганец разведае пра паход крыжакоў. Не ведаю, колькі дасць ваяроў князь Таўцівіл, але далей накіруецеся ў Крэва. І ў Крэва сустрэнецеся з маім ганцом. Ён да гэтага павінен вярнуцца з Полацка. Калі для Полацка няма пагрозы, то накіруйцеся строга на поўнач, на сустрэчу ім, а ганца адпраўляйце да мяне.

Міндоўга вельмі зацікавілі гэтыя сведкі, і ў яго ўзнікла пытанне:

— А далёка на поўнач гэтыя землі Эстляндыі, і якая там вера?

— Далёка. Ад Крэва прыблізна чатыре сотні вёрст. У эстаў, як і ў нас, шматбожжа.

— А з кім мяжа ў эстаў?

— На захадзе і на поўначы Балтыйскае мора, на ўсходзе русіны пскоўскай зямлі, на поўдні лівонцы.

— Мы будзем праходзіць праз лівонскія землі?

— Ад Крэва на поўнач будуць некалькі невялікіх паселішчаў нальшанскай зямлі. Потым прыкладна столькі ж зямлі

жамойтаў. Потым пачынаюцца зямлі селаў, але яны ўжо пад уплывам біскупа Рыгі і крыжакоў. І ўжо называюцца лівонцы. Наогул лівонцы аказваюць уплыў на шэсць паўночных зямель, якія цяпер называюцца лівонскія, а раней яны былі: лівы; куроны; земгалы; селы; латыголы і латгалы. Усе яны шматбожцы. Лівы знаходзяцца каля вусця ракі Заходняя Дзвіна, на якой раней панавалі полацкія князі. Полацкія князі каля ракі пабудавалі замкі Герцыке і Кукенойс, і бралі даніну з усіх хто плыў па гэтай рацэ, з русін, з нарман, з брэменцаў, з саксонцаў. Лет трыццаць таму рымская Царква накіравала сваіх прапаведнікаў у вусце ракі. Першага прапаведніка я не ведаю, а другога біскупа Бертольда лівы забілі дваццаць лет таму. Трэці біскуп Альберт разам з пілігрымамі, якія прыбылі ў вусце ракі, пабудаваў горад-крэпасць Рыгу і семнаццаць лет таму запрасіў крыжакоў, дакладней мечаносцаў. З пачатку яны плацілі даніну полацкаму князю, але потым дванаццаць лет таму захапілі замкі Кукенойс і Герцыке, і перасталі плаціць даніну Полацку. З тых часоў сталі пагражаць Полацку, а гэтыя шэсць паўночных зямель падпарадкавалі сабе, пабудавалі там дзве крэпасці.

— А недаўні паход да лівонаў гэта ў зямлю селаў?

— Так. Праз іх лепш не ісці, яны і так спустошаныя намі і русіны таксама туды хадзілі. Раней мы на іх не хадзілі, але пасля таго як яны дапамаглі крыжакам захапіць полацкія замкі Герцыке і Кукенойс, сталі часта туды наведвацца. Хай падумаюць пад чыю руку ім лепш, пад нашу ці пад крыжакоў. Калі справа ў вас будуць шмат прыгожых азёр, возьміце яшчэ правей, гэта будзе полацкая зямля, перасячэце раку Заходняя Дзвіна, і зноў строга на поўнач будзе зямля латыгалоў. А паўночней іх, зямля латгалоў. Крыжакі, магчыма будуць вяртацца праз гэтыя зямлі, там будзе зручна напасці на іх.

— А справа ад латгалаў будуць русіны пскоўскай зямлі?

— Так.

— А магчыма дамовіцца з русінамі і сумесна напасці на крыжакоў?

— Гэта было б добра, але наўрадлі так атрымацца. Мінулым летам мы хадзілі на іх і да гэтага таксама хадзілі.

— Зразумела. А як русінскія ваяры выглядаюць?

— Так як і мы. Даспехі такія ж і кані такія ж. Ты княжыч Міндоўг пытаеш, баючыся, што русіны, ўбачыўшы цябе і тваіх збраяносцаў падумаюць, што вы крыжакі? Рыцары мечаносцаў носяць белыя плашчы, на якіх чырвоны крыж і чырвоны меч.

— Не. Я хачу, каб яны нас прынялі за русінаў, за іх суседзяў. Магчыма, што мы сустрэнем толькі частку атрада крыжакоў. Пасля таго як мы разобъем іх, трэба каб да біскупа і да астатніх крыжакоў дайшло сведчанне, што іх разбілі русіны. Каб далей ваявалі хрысціяне з хрысціянамі.

— Добрая думка. Шлемы і каней трэба меняць. Вашы рыцарскія шлемы топфельмы трэба памяняць на сфераканічныя. У маім арсенале мы падбярэм для вас шлемы. Толькі для твайго волата будзе цяжка падабраць шлем і каня. Пасля вячэры пойдзем у арсенальны супакой. Заўтра трэба падрыхтавацца, а паслязаўтра з раніцы ў паход. Збожжа з палёў сабралі. Так што асноўныя гаспадарскія справы скончаны. Княжыч Міндоўг і ваявода Ердзівіл, вызначыцесь якія дзве сотні возьмеце пад сваё кіраўніцтво і прасачыце заўтра, каб іх сотнікі і дзесятнікі навучылі сваіх ваяроў тым навыкам, якія яны набылі. Я думаю, што кіраваць будзеце ўдваіх у згодзе.

Атрымаўшы згоду абодвух, ён дадаў:

— Мяне цікавяць вашы думкі па асаблівасцях вядзення бою крыжакамі. Калі вы з імі не сустрэнецеся ў баі, то можа ўдасца выведаць у ваяроў тых зямель, якія ўдзельнічалі ў бітвах з імі.

Пасля вячэры князь Ізяслаў з Міндоўгам пайшлі да арсенала. Там іх ужо чакалі сівы служка, былы ваяр, кульгавы на адну нагу і збраяносцы княжыча. Для Міндоўга падабралі сфераканічны шлем з кальчужнай барміцай. Для Альгерда і Стрыгівілала падабралі такія ж, а для Доўбуда такі ж толькі без кальчужнай барміцы.

Князь Ізяслаў указаў сівому служцы заўтра да поўдня дарабіць шлем для княжыча. Шлемы спадабаліся, яны былі лягчэй і больш падыходзілі для паходу. Перад сном князь Рынгольд паведаміў сыну пра тое, што ён чуў, як князь Ізяслаў па яго просьбе ўказваў пасыльным, каб заўтра з раніцы ўсе дазорцы і егеры былі перад Вялікім замкам.

Княжыч пасля некаторага роздуму спытаў:

— Тата, можа палоннага лесніка ўзяць з сабой? Нарыхтоўваць дзічыну для ежы вам будзе егер наваградскі Сірвід. А ляснік ведае тыя месціны і русін. Можа і крыжакоў бачыў?

— Заўтра я яго спытаю. Калі пачую, што ён не ўцячэ там, то ўвечары прыбудзем разам.

Засынаючы, княжыч адзначыў пра сябе, што думкі аб паходзе засланілі ўсе астатнія, нават прыемнае думкі пра Яньку, якая хвалявала яго апошнія дні, не ўзнікла пасля вячэры.

Пасля сняданку, вышаўшы на плошчу перад вялікім замкам, Міндоўг пагаварыўшы з егерам Дзімінам і сваімі збраяносцамі, ён вызначыў сотнікаў і дазорных якіх возьме ў паход. Адабраныя сотнікі і дзесятнікі сабралі сваіх ваяроў і сталі іх навучаць бітвам на мечах. Ім у гэтым дапамагалі збраяносцы княжыча. Міндоўг заўважыў, што палова ваяроў не мела мячоў, а былі з баявымі сякірамі.

Узяўшы з сабой сотніка Вітольда, княжыч звярнуўся да князя Ізяслава з просьбай аб выдзяленні гэтай сотні з княскага арсенала мячоў на час паходу. Акрамя мячоў, князь Ізяслаў перадаў Міндоўгу допрацаваный шлем, на версе якога было чатыры афарбаваных пяра. Княжычу гэта ўпрыгожванне спадабалася, і ён з задавальненнем апрануў на сябе гэты шлем. Гэта ўпрыгожванне было не гэтакім пышным як у папярэднім шлеме, але не гэта галоўнае, а галоўнае тое, што яно вылучала яго сярод іншых.

Акрамя шлема, Міндоўг атрымаў у падарунак ад князя Ізяслава і каня мясцовай пароды. Ён быў ніжэй яго Імклівага, і княжыч з цікавасцю выпрабаваў яго. Уражанне было добрае. Конь быў паслухмяны і, нягледзячы на невысокі рост, апынуўся жвавым конікам, і што асабліва здзівіла яго гэта тое, што ён з месца шпарка набірал вельмі высокую хуткасць. Такія кані падабралі і для збраяносцаў Міндоўга. Вечарам княжыч ў добрым настроі сустрэўся з татам. Князь Рынгольд вярнуўся ў Наваградак разам з ляснікам і сваім збраяносцам Скірмунтам, які таксама захацеў ісці ў паход.

Скірмунт быў абадрытам. Ён хоць і быў на адно лета маладзей Альгерда, але ўжо даўно быў збраяносцам ў таты і меў баявы вопыт, што вельмі цаніў Міндоўг.

Перад сном Міндоўг доўга разважаў пра тое, што магло прымусіць мужчыну не простага становішча ў грамадстве, ў росквіце сіл адмовіцца ад радасцяў паўнавартаснага сямейнага жыцця дзеля сумных пропаведзяў юдэйскага рабіна, ў якіх навязваецца затворніческае жыццё з штодзённымі доўгімі малітвамі. А таксама прапаведуецца забойства іншых людзей, толькі таму, што яны не жадаюць верыць гэтым вельмі хворым на галаву, ці што часцей, вельмі прагным біскупам. Не знайшоўшы тлумачэння гэтаму, ён успамінаючы апавяданні Эйсманта пераходзіў на разважанні аб тактыцы вядзення бою рыцарамі крыжакоў. Ён раней звычайнага лёг, каб выспацца і раніцай ўстаць бадзёрым, але гэтыя бурлівыя ў ім думы не адставалі ад яго, і ён заснуў пазней звычайнага часа.

## ГЛАВА 5

## ПАХОД

Калі раніцай пасля сняданку, Міндоўг выйшаў з замка, атрад з чатырох сотняў ваяроў чакаў яго. У канцы моста яго чакаў Альгерд верхам на мясцовам кані і трымаў у левай руцэ павады ад каня Імклівы, а ў правай павады ад мясцовага каня. Княжыч сеў на Імклівага, і атрад рушыў у паход. Атрад накіраваўся на поўнач, пасля поўдня наблізіўся да паселішча Ліда, абгароджанаму сцяной з завостраных зверху тоўстых бярвенняў. Паселішча было вялікае. Наперадзе магутных варот з дазорнай вышкай чакалі дзве сотні коннікаў гатовых да паходу.

Яны прапусцілі чатыры сотні ваяроў і далучыліся да атрада апошнімі. Міндоўгу не цярпелася пазнаёміцца з сотнікам жырмунтаў, ён аддзяліўся ад сваіх і стаў чакаць, калі наблізяцца жырмунты.

Наперадзе сотні княжыч убачыў магутнага вершніка сярэдніх лет з чэпкім поглядам, і на шлеме ў яго было такое ж ўпрыгожванне з пёраў, як і ў яго.

— Добры дзень, мяне завуць Міндоўг.

— Добры дзень, княжыч Міндоўг. Мяне клічуць Радмонт.

— Ты з лужычан, з жырмунтаў?

— Так. Мой дзед распавядаў, што яго дзед з сям'ёй пераехалі сюды з лужыцкіх зямель з племяні жырмунтаў. А ты княжыч з абадрытаў Ростака?

— Так. Хутка весці пра мяне даходзяць да вас. І весела паглядзеўшы на Радмонта, спытаў:

— А ці ведаеш ты, што з намі прыбылі ў гэтыя зямлі княжыч жырмунтаў са зброяносцамі?

— Ведаю, — насцярожана адказаў Радмонт. — Княжыча жырмунтаў клічуць Жыгімонт. Ён мой сябра. Нядаўна ў яго і гародзенскай князёўны было вяселле, я там быў сябруком у Жыгімонта. Княжыч ведае, што ў наваградскай зямлі ёсць паселішча яго супляменнікаў, і ён цікавіўся ў мяне, ці ўсё ў вас добра.

Міндоўг бачачы, што Радмонт адказвае аднаскладова, як быццам чагосьці асцярожнічае, стараўся казаць шмат і лагодна, а таксама спрабаваў даведацца пра яго больш.

— Ты ж не толькі сотнік?

— Я намесьнік і сотнік. У нальшанскай зямлі ёсць паселішча лужычан, яны прыйшлі ў гэтыя землі пазней за нас. А яшчэ ёсць шмат паселішчаў люцічаў у розных землях. Русіны і мазуры ўсіх нас разам з яцвягамі называюць Літвой. А альманцы ўжо адціскаюць і абадрытаў?

— Так, але гэта не заўсёды агрэсіўна, і не ўсе альманцы. Гэта залежыць ад князёў. Франкі, швабы і баварцы мірныя, а вось саксонцы тые агрэсіўныя. У іх землях князі падпалі пад уплыў лацінскіх хрысціянскіх прапаведнікаў і імкнуцца каланізаваць землі, дзе яшчэ шануецца шматбожжа. Саксонскія сям'і перасяляюцца на нашы землі, будуюць царквы. Гэтыя прапаведнікі ўмешваюцца ў праўленне князёў, і нашым валхвам шматбожцаў ствараюць вялікія цяжкасці. Я сюды і перасяліўся з татам, каб выратаваць нашага моцнага валхва Вітаўта. Пачуўшы гэта, выраз твару Радмонта стаў радасней.

— Так, толькі ў гэтых землях ёсць моцныя князі з ваярамі якіе здольныя абараніць наша шматбожжа ад хрысціянаў.

— Жанаты, на кім?

— Так, жанаты на яцвяжцы. Два сыны і дачка. Волхв з мясцовых, яцвяг.

— Ці даводзілася табе ваяваць з рыцарамі крыжакамі?

— Не.

— А можа, з тваіх палонных хтосьці змагаўся або мае сведкі як яны змагаюцца?

— Мы бярэм у палон рамеснікаў. Я іх распытваў. Ніхто не быў сведкай і не ведае як яны змагаюцца. Полацкія ваяры змагаліся з рыцарамі крыжакоў. Трэба ў іх распытаць. Я ведаю, што ты княжыч наладзіў навучанне бітваў на мячах наваградскіх ваяроў, а таксама па навыкам дазорных. У нас ёсць патрэба ў гэтым навучанні. Можа пасля паходу акажаце нам дапамогу ў гэтым, а мы дапаможам у будаўніцтве вашага замка?

— Добра, пасля паходу дамовімся пра гэта. Усе вашыя ваяры з мячамі? І колькі дазорных ў сотні?

— Дванаццаць ваяроў без мечоў, яны з баявымі сякерамі. Спадзяюся, у гэтым паходзе захопім мечы. Дазорных ў нас чатыры.

— Добра Радмонт.

— Дзякуй, княжыч Міндоўг.

Княжыч прапусціў сотню жырмунтаў і наблізіўся да вершніка старэйшых лет са шлемам, наверсе якога красаваліся пёры:

— Добры дзень, мяне клічуць Міндоўг.

— Добры дзень, княжыч Міндоўг. Мяне завуць Паганяйло.

— Ты сотнік і намеснік?

— Не, я толькі сотнік. Намеснік у нас Роальд.

— Ці даводзілася табе ваяваць з рыцарамі крыжакамі?

— Не. Я спадзяюся на цябе княжыч Міндоўг. Я ведаю, што ў Наваградку, ты княжыч наладзіў навучанне ваяроў бітвам на мечах, а таксама навучанне дазорных. Я пытаўся ў наваградскага ганца пра тое, каб і мы гэтаму навучыліся, але ён сказаў, што гэта залежыць ад княжыча.

— Пасля паходу, мы знойдзем час, каб правесці ў вас гэта навучанне. У вас усе з мячамі?

— Не, толькі палова. У гэтым паходзе спадзяюся, здабудзем мечы.

— А колькі дазорных ў сотні?

— Пяць.

— Добра. Дзеці дарослыя?

— Два сына са мной ў паходзе. Ёсць яшчэ дачка, яна на выданні.

— Добра, Пагоняйло. У нас яшчэ будзе час пагутарыць.

— Дзякуй, княжыч Міндоўг.

Княжыч паскакаў да сваіх збраяносцаў, ўбачыў палоннага лясніка і звярнуўся да яго:

— Добры дзень. Як цябе завуць?

— Добры дзень, княжыч Міндоўг. Мяне клічуць Кодрун.

— Кодрун, накіроўваемся ў твае зямлі. Засумаваў па ім?

— Не. Сям'і ў мяне там не засталося. Тут мне больш падабаецца. Вялікі прыгожы горад-крэпасць. Прыгожыя вялікія паселішчы. Падабаецца, як будуецца ваш замак. Шмат людзей з розных месцаў прыязджаюць будаваць замак. Вельмі падабаецца ваш волхв Вітаўт. Калі з'яўляўся ў нашым паселішчы хрысціянскі прапаведнік, мы свайго валхва хаваем у лес. Хачу заслужыць ваш давер і стварыць тут сваю сям'ю.

— Добра, Кордун. У тых месцах ты бачыў, як змагаюцца рыцары крыжакоў ці можа хтосьці распавядаў, як яны змагаюцца?

— Я не ваяваў. Я ж ляснік. А нашы вої разам з рыцарамі-крыжакамі нападалі на полацкія замкі. Нашы вої распавядалі, што рыцары ў жалезных даспехах вельмі моцна змагаюцца на мечах. Перамагчы іх вельмі цяжка. У іх такія закрытыя жалезныя шлемы, што з лука іх не параніць.

— Але сам ты іх не бачыў?

— Не, княжыч Міндоўг, не бачыў. Але лук пры мне, страляю трапна, так што буду старацца іх параніць. Яшчэ я ўзяў з сабой нож паляўнічы і сякіру цеслярску. Іншай няма.

— Добра, Кодрун. Будзь каля нас.

Калі стала цямнець, атрад спыніўся на начлег у паселішчы Зыгмунты (сучасная назва Зыгмунцішкі). Гэта было невялікае паселішча каля ракі Гавья. Валасціцель паселішча Даўмунт запрасіў да сябе ў дом княжыча, ваяводу і сотнікаў на вячэру. За сытнай трапезай Даўмунт распавёў, што яго дзед з сынамі і яшчэ чатыры сям'і прыбылі сюды з зямель люцічаў.

— Вы заўважылі, што наша паселішчэ невялікае, не абгароджанае, але ўвесь час пашыраецца. Па заканчэнні кожнага лета, мы плацім усё большы натуральны чынш князю. Амаль кожнае

лета нашы ваяры ўдзельнічаюць у ваенных паходах у складзе княскага атрада. І хоць ваяроў у нас не так шмат, як у вялікіх паселішчах, усяго паўсотні, але падрастаюць маладыя ваяры і будзе папаўненне.

Апоўначы княжыч падзякаваў Даўмунту за пачастунак і з нецярпеннем пайшоў спаць. Раніцай лёгка паснедаўшы, атрад накіраваўся ў бок Нальшан. Міндоўг вырашыў праверыць цягавітасць каня, падоранага яму князем Ізяславам, і перасеў на яго. Ён хутка скакаў па лясных сцежках, быў паслухмяны ў кіраванні. Конь яму спадабаўся, і княжыч стаў клікаць яго Стрэмя.

Неўзабаве пасля поўдня атрад прыбыў у Нальшаны. Гэта быў горад на ўзгорку, ўнізе працякала нешырокая рака. Сцены і дамы былі драўляныя. Міндоўг і ваявода накіраваліся ў церам князя. Княжыч убачыў на ложку князя Таўцівіла. Яго галава ляжала на высокай падушцы. Левая палова твару была зачынена сухімі лісцямі травы, ён глядзеў правым вокам. Каля яго сядзеў сівы волхв і штосьці ціха казаў князю. Адразу першым падышоў да князя ваявода Ердзівіл і аб чым-то ціха з ім гаварыў. Па іх гутарцы, Міндоўг заўважыў, што яны сябруюць. Затым ваявода запрасіў княжыча да князя.

Пасля прывітання, князь Таўцівіл сказаў:

— Я шмат чуў пра цябе, княжыч Міндоўг. Гэты паход у паўночныя зямлі лічу вельмі важным, таму наш волхв правядзе варажбу на прадвесце паходу.

— Добра, князь Таўцівіл.

Волхв, а таксама княжыч і ваявода са сваімі канямі прыйшлі на капішча. Волхв узяў шэсць копій і ўваткнуў іх у зямлю, па два ў шэраг, адзін каля іншага на роўнай адлегласці, і да ўсякай падвойнай прывязваў яшчэ дзіду папярок на вышыню калена каня. Потым волхв пасля варажбы, абраў каня княжыча, ўзяў яго за аброць і перавёў праз тры папярэчные дзіды. Усе тры разы Імклівы пераступаў дзіды правай нагой. Гэта было добрае прадвесце паходу. Княжыч і ваявода ў добрым настроі пайшлі да князя Таўцівілу. І зноў ваявода першым падышоў да князя і пра нешта ціха пагаварылі. Потым князь паклікаў да сябе Міндоўга:

— Княжыч Міндоўг, ведаю што ў Крэве вы чакаеце вестак з Полацка. Рыцары крыжакоў ўзялі моцныя полацкія замкі Ку-

кенойс і Герцыке, трэба каб вы ацанілі абараназдольность Крэва. Раскажыце як умацаваць Крэва. Я даю адну нальшанскую сотню, адну сотню з Крэва і сотню з паселішча Лужышча, што ў чатырох вёрстах ад Крэва. Усе нашы сотнікі добра вядомы ваяводзе Ердзівілу, таму яны будуць пад яго кіраваннем. Вы там вырашыце колькі каго браць у паход, а каго на ўмацаванне абараназдольнасці Крэва. Ганец ад вас па дарозе ў Наваградак хай зазірне да мяне.

— Добра, князь Таўцівіл.

Княжыч цалкам быў згодзен, каб тры нальшанскіе сотні былі пад кіраваннем ваяводы. Праязджаючы па нальшанскай зямлі, ён заўважыў, што дамы тут не гэтак дыхтоўныя як у наваградчан, паселішчы маленькія і не гэтак умацаваныя, ды і ваяры іх мала хто ў кальчузе, і мала хто з мечамі. У Міндоўга была думка, што лепш кіраваць малакалькасным, але добра ўзброенымі і ўмелымі ваярамі, чым шматлікімі, дрэнна ўзброенымі і ненавучанымі. Нальшанская сотня ўзначаліла атрад.

Праскакаў дзве версты Міндоўг які быў побач з ваяводам, убачыў удалечыні і ў баку вялікае паселішча, і спытаў у яго:

— Гэта што за паселішча?

— Гэта Лужышча, яны таксама прыбылі з вашых мясцін. Моцныя, адчайныя ваяры. У Крэве вырашым узяць іх сотню ў паход ці не трэба. Да Крэва недалёка.

Сапраўды наперадзе па іх кірунку шляха княжыч убачыў на вяршыні пагорка вялікае абгароджанае паселішча. Пры набліжэнні Міндоўг адзначыў, што паселішча абгароджана высокай драўлянай агароджай з чатырма дазорнымі вышкамі. Яно знаходзілася на высокім пагорку, ў зліцці рэк Крыўлянка і Шляхцянка. Больш спадзісты ўздым да паселішча праходзіў праз нешырокі мост у браму пад высокай дазорнай вышкай. Пачалось цямнець, таму княжыч не прыглядаўся да ўмацаванняў паселішча.

Міндоўга і ваяводу сустрэў намесьнік і запрасіў да сябе ў церам. Там іх ужо чакаў наваградскі ганец і яшчэ ваяр з Полацка. Полацкі ваяр Мікола распавёў, што палачане з ахвотай сустрэлі прапанаву наваградскага князя аб сумесным супрацьдзеянні рыцарам крыжакоў.

— Пасля нечаканай смерці князя Полацку Валодшы, на княжанні ягоны старэйшы сын Барыска. Ён малады, неспрактыкаваны і яму патрэбен моцны саюзнік, такі як наваградскі князь Ізяслаў. Пасля захопу рыцарамі двух нашых замкаў на рацэ Заходняя Дзвіна, яны для нас самая вялікая небяспека. Я нядаўна вярнуўся з паўночных ускраін нашых зямель, пранікаў у суседнія зямлі латыгалаў і пскавічан. Я цікавіўся ў мясцовых жыхароў пра рыцараў крыжакоў, але ўсе казалі, што даўно іх не бачылі.

— Мікола, а сам ты ваяваў супраць рыцароў ці табе расказвалі, як ваявалі супраць іх? — пацікавіўся княжыч.

— Я супраць іх не ваяваў, але нашы палачане распавядалі, што ўдваіх ці нават ўтрох вельмі цяжка справіцца з адным рыцарам.

— Мы пойдзем у паход на паўночныя зямлі. Нам патрэбен дазорны, добра ведаюшчы тыя мясціны. Пойдзеш з намі ў паход?

— Так, пайду.

— Добра. Заўтра раніцай будзь гатовы.

Засынаючы, Міндоўг прыйшоў да думкі, што лепш каб атрад быў не вялікі, але добра ўзброены і з многімі дазорнымі.

Раніцай княжыч з ваяводам абышоўшы ўсе ўмацаванні сцяны, прыйшлі да думкі, што паміж рэчкамі і сцяной замка трэба пабудаваць агароджваны частакол з завостранага бярвення, накіраваных на штурмуючага праціўніка. На дадатковым ўмацаванні вельмі настойваў ваявода. Міндоўг падумаў, што пра гэта была дамоўленасць ваяводы з яго сябрам нальшанскім князем. Княжыч не пярэчыў. Яны дамовілся, што Міндоўг адзін ўзначаліць паход. З сабой у паход ён возьме дзве свае сотні, адну сотню ад ваяводы, сотню жырмунтаў і лідскую сотню. Вырашылі, што астатнія сотні разам з мясцовымі будуць займацца будаўніцтвам умацавання.

Княжыч быў задаволены, што аднаасобна ўзначаліць паход і што ўзяў з сабой самыя моцныя сотні. Пасля сняданку атрад накіраваўся на поўнач. Ваявода са сваіх двух сотняў адправіў у паход сотню з больш старым сотнікам, як ён сказаў, найбольш дасведчаным. Гэты сотнік быў менш здольны да навучання ў бітвах на мечах, але Міндоўг не стаў мяняць сотніка, каб не выклікаць у ім варожые пачуцці.

Княжыч захацеў яшчэ пагаварыць з полацкім ваяром і паклікаў яго да сябе.

— Мікола, ты казаў, што размаўляў з мясцовымі жыхарамі паўночных зямель, латыгаламі і пскавічанамі. Ты ведаеш іх говоркі і звычаі, што яны табе лёгка ўсё распавядаюць? А можа яны бачаць, што ты чужынец і кажуць табе крыўду, а не тое што на самой справе?

— Княжыч Міндоўг, перш чым гаварыць з імі я некаторы час назіраю за імі. Вызначаю, які настрой і які характар у яго, а потым узалежнасці ад гэтага размаўляю з імі. З баязлівымі я размаўляю пагрозліва, з іншымі сяброўскі. Латыголы шматбожцы і пачынаю з імі размову з праслаўлення таго бога ад якога яны залежаць у гэты дзень і ў гэтую справу, якой яны займаюцца. Гаворка іх мне знаёмая. Мая гаворка выдае мяне, як чужынца, але аднолькавыя багі і сяброўская гутарка схіляе да праўды. Пскавічане ў большасці сваім канстанцінопальскія хрысціяне, таму праслаўлю іх адзінага бога. Гаворка ў іх вельмі падобная на нашу, толькі ў іх нашы словы з буквіцай а, ў іх з буквіцай о. Я іх гаворке добра навучыўся, таму яны прымаюць мяне за свайго.

— А сам ты хрысціянін?

— Мяне ў дзяцінстве хрысцілі па канстанцінопальскім абрадзе, але ў царкву я вельмі рэдка хаджу. Я і мае ўсе родзічы выконваем абрады і звычаі шматбожнікаў.

— Добра.

Пасля поўдня атрад перасёк мяжу зямлі жамойтаў, княжыч павялічыў колькасць дазорных. Неўзабаве наблізіўся адзін дазорны і паведаміў, што наперадзе паселішча жамойтаў, жыхароў гэтага паселішчы нідзе не відаць. Паселішча было маленькае, два дзесяткі маленькіх дамоў, без дымахода. У гэтых хатках было адно маленькае пустое акно, якое прапускае дым знутры і святло звонку. Былі таксама домікі сплеценыя з дубцоў вакол калоў, уваткнутых у зямлю. Міндоўг паклікаў да сябе наваградскага сотніка сярэдніх лет Ардзеня.

— Ардзень, у жамойтаў усе такіе маленькія паселішчы?

— Так, княжыч. У гэтых мясцінах усе такія. Побач з моцным полацкім княствам, вялікіх паселішчаў у іх няма. Вялікія паселішча ў іх на захадзе і на поўначы, недалёка ад ракі Нёман.

Ужо два лета, як да іх туды прыйшлі прусы і сталі ў іх князямі, пабудавалі сабе драўляныя хаты.

— Мы з гандлярамі прасоўваліся ўздоўж ракі Нёман. Добрая вялікая рака, прыдатная для гандлёвых драккараў. Чаму там не ставяць паселішчы? Там жа зручна займацца гандлярствам?

— Жамойты баяцца, што іх захопяць. А вось, чаму прускія прышэльцы не паставілі каля ракі Нёман паселішчы, мне не зразумела. Міндоўг на гэтае пытанне ведаў адказ, але не захацеў казаць пра гэта.

— Наперадзе на поўнач такія ж паселішчы як той, што мы праехалі?

— Так, княжыч. Недалёка, на ўсход полацкія зямлі.

— Пакліч да мяне полацкага ваяра Міколу.

Калі наблізіўся полацкі ваяр, княжыч спытаў:

— Мікола, вечарэе, дзе ў полацкай зямлі зручней спыніцца на начлег?

— Цяпер наперадзе будзе маленькае паселішча жамойтаў, а ад яго возьмем на ўсход у нашы, полацкія зямлі і там недалёка будуць два прыгожыя возеры. Мы іх мінуем калі будзе яшчэ светла, а далей перасячэм раку Заходняя Дзвіна і яшчэ трохі прасунемся на поўнач, там яшчэ будзе возера і каля яго ёсць добрае селішча. Там і пераначуем.

— Добра.

Пад'ехаў дазорны і сказаў, што наперадзе паселішча, дзе адзін стары жамойт нешта хоча паведаміць. Княжыч паклікаў да сябе сотніка Ардзеня, палачаніна Міколу і лесніка Кодруна.

— Хто з вас жамойцкую гаворку ведае?

Убачыў, што астатнія задумаліся і маўчаць, ляснік сказаў:

— Жамойцкая гаворка падобная на гаворку селоў. Я некалькі разоў размаўляў з імі.

Заехаўшы ў паселішча, яны ўбачылі старога. Міндоўг звярнуўся да лесніка Кодруна:

— Спытай чаго ён хоча?

Кодрун коратка пагаварыў з жамойтам, а потым павярнуўшыся да княжыча паведаміў:

— Жамойт кажа, што ў іх лечыцца ліцвінскі вершнік.

— Няхай пакажа яго.

Жамойт падвёў іх да дома, ля якога самотна стаяў конь. Увайшоўшы, Міндоўг убачыў, што слабыя прамяні сонца, прабіўшыся скрозь маленькае акенца асвятлялі мужчыну, які ляжыць жыватом на шкуры мядзведзя, пасцеленай на яловых тонкіх галінках зямлянога полу. Сотнік Ардзень распазнаў у ім наваградскага ганца Варашылы. Ганец распавёў сотніку:

— Калі я вяртаўся, ў зямлі латыгалоў мне ўдалося падслухаць размову двух дазорных з Пскова. Яны казалі, што пскоўскі князь Уладзімір хоча праз два дні пайсці ў паход на зямлі латгалаў. Калі я абярежно адышоў ад іх, а потым паскакаў у жамойцкія зямлі, яны мяне заўважылі і пагналіся за мной. Мой конь панёсся з усіх сіл і яны ўбачыўшы, што не дагоняць мяне, сталі страляць у мяне з лука. Адна страла патрапіла мне ў спіну. Я прыпаў да шыі коня. Яны падумалі, што забілі мяне і перасталі праследваць, а мой конь працягваў яшчэ доўга гнаць галопам, і я спыніўся ў гэтым паселішчы. Я не ведаю, колькі дзён тут быў у ліхаманцы. Цяпер мне лепш, жамойты дапамаглі. Заўтра ці паслязаўтра адпраўлюся ў Наваградак. Рыцараў крыжакоў нідзе не бачыў і ніхто пра іх не казаў.

Міндоўг падзякаваў жамойту і распарадзіўся пакінуць аўса і ежы на пяць дзён для ганца і для жамойта.

Атрад павярнуў на ўсход і калі пачала цямнець прыбыў у намечанае паселішча полацкай зямлі, недалёка ад мяжы з зямлёй латыгалаў. Увесь гэты шлях княжыч абдумваў пачутае, ад параненага ганца. Рыцары мечаносцаў падобна затрымаліся ў Эстляндыі, а майму атраду выпадае добры выпадак напасці на русінскі Пскоў.

Разведаўшы ад палачаніна Міколы пра багацце Пскова, Міндоўг вырашыў скарыстацца адсутнасцю пскоўскага князя з войскам. Сабраўшы на савет сотнікаў і полацкага ваяра, ён распавёў ім аб задуманым плане нападу на багаты горад. Да горада сорак вёрст, таму трэба полацкаму ваяру і яшчэ тром, прыдатным для непрыкметнага пранікнення да русінаў, выязджаць да світання. Да поўдня атрад будзе чакаць у лесе, недалёка ад Пскова, ўмоўленага з Міколам сігнала атакі на горад. Па звестках Міколы, драўляны замак Пскова быў маленькі і знаходзіўся ля зліцці маленькай рэчкі Пскова ў раку Вялікая. У замку чац-

вёртую частку плошчы займала праваслаўная царква, акрамя яе там быў церам князя, дзе таксама жыла яго асаблівая дружына ваяроў. Былі таксама склады, дзе захоўваўся скарб багатых псковічан. Да замка вёў невялікі мост праз рэчку Пскова, які злучае замак з пасадам. Княжыч добра ведаў, што поспех атакі на горад будзе залежыць ад яе нечаканасці і асцярогі ад вяртання пскоўскага войску. У ахову атрада ад войска пскоўскага князя, Міндоўг задумаў паставіць сотню ваяводы, з менш здольным старым сотнікам.

Раніцай перад сваім сняданкам, княжыч папярэдзіў дазорных шукаць самы кароткі шлях праз зямлі латыголаў да мяжы з русінамі найбольш блізкі да Пскова. Шлях гэты павінен праходзіць міма паселішчаў, у пазбяганні агалоскі. Пасля сняданку, ўсхваліўшы бога Перуна, Міндоўг пажадаў атраду поспеху і папярэдзіў, каб рухаліся ціха і хутка. Да поўдня ім трэба быць ва ўмоўленым месцы. Дозорные правялі атрад міма паселішчаў латыголаў і толькі прайшоўшы мяжу з русінамі, ўсіх сустрэчных бралі ў палон.

Да поўдня атрад прыбыў у прызначанае месца. Сарыентаваўшыся на мясцовасці, княжыч паказаў месца ахароннай сотні. Зараз вельмі шмат залежыць ад разведнікаў. Можна было зменшыць жаданне і захапіць адзін пасад, гэта было не цяжка, але княжыч хацеў прадэманстраваць, што пры яго кіраўніцтве нават малы атрад ваяроў здольны цалкам захапіць багаты горад з замкам.

Пры абмеркаванні з Міколам магчымасці захопу замка, Міндоўг раіў спачатку захапіць на рацэ якое-небудзь гандлярскае або рыбацкае судна і на ім падплысці да брамы замка. А каля брамы прапанаваць стражнікам нешта купіць і ўсыпіўшы іх пільнасць, забіць варту і ўзяць пад кантроль браму замка. Па задумцы княжыча, апоўдні адзін з дазорных, які ведае гаворку псковічан, з'явіцца ў пасадзе на дарозе ў замак, на коні з двума забітымі цецерукамі. Яго заданнем было перадаць умоўны сігнал — зняцце з галавы шапкі і абтрасанне яе аб калена, для выведнікаў ля брамы і для дазорнага каля атрада. Найбольш цяжкае і рызыкоўнае заданне было ў Міколы і лясніка Кодруна. Ім трэба было паспець да поўдня апынуцца каля брамы замка і чымсці

адцягнуць увагу ахоронцаў ад дарогі на мост у замак. Калі яны з гэтым справяцца, дазорны на дарозе падае сігнал.

Пры атрыманні такога ж умоўнага сігналу ад дазорнага, які знаходзіцца недалёка ад атрада, Міндоўг і яго чатыры збраяносца паскакалі рыссю праз пасад у браму замка. Пасля таго, як княжыч з збраяносцамі наблізіўся да брамы замка, дазорны вершнік апранаў на галаву шапку, і гэта быў ўмоўны сігнал чатыром сотням атакаваць увесь пасад. Забіўшы ахорону брамы замка, збраяносец Доўбуд і палачанін Мікола кінуліся ўзламываць замкі складоў, а Міндоўг з астатнімі збраяносцамі ўварваліся ў церам князя. Ляснік Кодрун падбег да брамы царквы і ўбачыўшы, што яна зачыненая, падрыхтаваў лук са стрэламі і стаў назіраць за званіцай. У цераме княжычу прыйшлося забіць двух выбеглых яму насустрач ахоронцаў. З астатняй чэляддзю разбіраліся яго збраяносцы. Браму замка пільнавалі два разведнікі да таго, як падскакалі ваяры з наваградскай сотні. Задумка Міндоўга была выканана. Ваяры прыхапіўшы з сабой палонных жанчын, скарб, зброю, даспехі і каней выйшлі з замка і княжыч скамандаваў трубіць на ўвесь пасад адыход.

Міндоўг баяўся вяртання пскоўскага князя з яго войскам. Яго хвалявала таксама, ці выканае яго просьбу сотнік Ардзень, знайсці зброевую майстэрню і захапіць як мага больш мечоў і кальчуг, а таксама кузнецкія прылады. Для перавозкі гэтага ён перадаў сотніку баявога коня волата Доўбуда. Набліжаючыся да месца збору, ён вышукваў вачыма сотніка Ардзеня і калі ўбачыў яго, то адразу накіраваўся да яго.

— Што з зброевай майстэрняй?

— Знайшлі, княжыч. Шмат захапілі з сабой і каваля таксама. Самае цяжкае пагрузілі на вялікага баявога каня.

— Дзе ён?

— Ззаду зараз пад’едуць

Міндоўг убачыў каня Доўбуда. Па яго вачах відаць было, як ён незадаволены гэтым грузам. Княжыч загадаў падвесці да яго свайго баявога каня Імклівага. Ён падклаў пад сядло Імклівага плашч і ваяры пераклалі на яго частку грузу з каня Доўбуда. З боку замка пачуўся звон. Заўважыўшы, што некаторых палонных цягнуць пешшу, Міндоўг распарадзіўся ўсіх палонных

пасадзіць ваярам на сваіх каней. Трэба было хутка вярнуцца ў полацкія зямлі.

Пад'ехаў адзін з дазорных і паведаміў, што наперадзе невялікае русінскае паселішча. Княжыч загадаў вывесці атрад міма дарог русінскіх паселішчаў, выставіўшы дазорных ў іх бок. Міндоўг пад'ехаў да полацкага ваяра Міколы.

— Мікола, дзякуй табе. Самае небяспечнае і цяжкае заданне было ў цябе. Я верыў у цябе, і ты не падвёў, малайчына. У Полацку ў цябе сям'я?

— Дзякуй, княжыч. Мая жонка памерла пры родах. У Полацку ў мяне толькі старая маці.

— А тата?

— Забіты рыцарамі мечаносцаў пры аблозе замка Герцыке.

— Перасяляйся да нас з маці. Калі праваслаўны, то ў Наваградку ёсць праваслаўная царква. Знойдзем табе добрую жонку. Нам патрэбны хоробрыя ваяры.

— Я старую маці не кіну, а яна перасяляцца не захоча.

— Вось цябе ад мяне.

Міндоўг працягнуў яму тугі кашалёк з манетамі.

— Тут срэбраные манеты з княжацкага церама. Я не ведаю ўсёй дабычы, але калі будзе нешта карыснае для цябе, то будзе тваё. І запамятай, калі будзе ў цябе з маці жаданне пераселіцца, буду рады. Мяне можна знайсці ў Наваградке або ў Воруце, гэта дзесяць вёрст ад Наваградка. Спытаеш мяне ці майго тату князя Рынгольда, я яму раскажу пра цябе.

— Добра. Дзякуй, княжыч.

Толькі цяпер, Міндоўг звярнуў увагу на сваіх збраяносцаў, і міжволі ўсміхнуўся. Усе яго збраяносцы трымалі жанчыну перад сабой на канях. Вось, аказваецца якая здабыча для іх самая важная. Прайшоў ужо доўгі час, як яны з'ехалі з Ростака. Хоць яны не былі жанатыя, але магчыма ў іх там былі блізкія адносіны. У Альгерда былі, гэта добра ведаў княжыч. Калі яны раптам пакінулі Расток, ніхто не ведаў, што іх чакае наперадзе. Цяпер усім стала зразумела, іх будучыня ў гэтых землях. Яны гэта прынялі з задавальненнем, так здалося Міндоўгу. Іх выбар здабычы пацвярджаў гэта. Княжыч падумаў, што трэба падтрымаць іх у гэтым выбары. Трэба каб тата і волхв Вітаўт ура-

чыста пасвячэлі іх у рыцарства, пасля гэтага паходу. Яны гэта заслужылі. Гэта каля брамы замка было трое забітых. А колькі ў цераме было забітых, Міндоўг не ведаў, але да яго даносіўся гук бітваў з іншых пакояў церама. І супраціў ім аказвалі больш досведчанные ваяры, чым у пасадзе. Трэба ім надарыць на ўладкавання сям'і, са здабычы ў княжым цераме. Разважаючы над гэтым, Міндоўг угледзіў коня без седла. Княжыч забраў яго ў ваяра і наблізіўся да Доўбуда і з усмешкай сказаў яму:

— Не мучай коня. Перасядзі жанчыну на коня, толькі ён без сядла. Міндоўг здзівіўся, калі Доўбуд саскочыўшы з коня, лёгка перамясціў палонную жанчыну ў сядло, а сам ускочыў на коня без сядла і радасна усклікнуў:

— Дзякуй княжыч!

Міндоўг ўпершыню бачыў радаснага Доўбуда, тым больш ўскокваюшчага на каня без сядла. Яму аказваецца, ў радасць трываць нязручнасці язды на кані без сядла, дзеля таго каб яго палонная жанчына была з выгодамі. Побач з'явіўся Альгерд і нягучна сказаў:

— А перад мной, яшчэ больш прыгожая. Сапраўды, перад Альгердам сядзела выдатная, светлавалосая і далікатная дзяўчына. Яна чымсьці нагадвала Яньку. Тут жа яго думкі перайшлі на Яньку, думкі прыемныя і доўгія, такія што ён не заўважыў, як стала цямнець.

Яны вярнуліся ў тое жа полацкае паселішча, адкуль раніцай выехалі. Княжыч паклікаў да сябе сотнікаў і прапанаваў усім пашукаць са здабычы ў сваіх сотнях, чым аддзячыць полацкаму ваяру. Калі сотнікі разышліся, Міндоўг кожнаму са сваіх збраяносцаў падарыў кашалёк з срэбраннымі манетамі. Пасля вячэры, сотнікі прынеслі падарункі для полацкага ваяра: прыгожы паляўнічы нож; штылет саксонскі; калчан з дзвюма дзесяткамі стрэл, а таксама коня. Выклікаўшы да сябе Міколу, княжыч прапанаваў яму выбраць сабе падарунак. Полацкаму ваяру вельмі спадабаўся паляўнічы нож і конь. Калі ён падзякаваўшы сышоў, нечакана прыйшоў Альгерд:

— Княжыч, табе спадабалася дзяўчына, якая была са мной на кані?

— Так. Альгерд, а чаму ты пра гэта пытаеш?

— Я табе яе захапіў. Я заўважыў, што табе падабаецца Янька, таму вырашыў што такая табе вельмі спадабаецца.

— А як жа ты?

— Я пакуль выбіраю.

— Калі выбірэш, дапамогу чым магу. А цяпер дзякую цябе, Альгерд. Вось табе мой падарунак, гэта штылет тваіх супляменнікаў.

— Дзякуй, княжыч.

Раніцай паснедаўшы і падзякаваўшы волосціцеля паселішчы, Міндоўг цяпло развітаўся з полацкім ваяром Міколам. Княжыч з атрадам рушыў на паўднёвы захад. Яны прайшлі праз жамойцкае паселішча, дзе даведаліся, што наваградскі ганец, які хварэў тут, гэтай жа раніцай адправіўся да сябе ў Літву. Калі атрад перасёк мяжу з нальшанскай зямлёй, Міндоўг паклікаў да сябе сотнікаў. Па дапытлівых поглядах сотнікаў ён дагадался, што ім нецярпіцца падзяліць багатую здабычу.

— Хто добра ведае самы кароткі шлях, няхай намеціць селішча, дзе спынімся на начлег. Там і падзелім здабычу.

Калі пачалось цямнець, атрад падышоў да паселішча Эйгерда (сучаснае Эйгерды). У цемры княжыч не змог разглядзець паселішча, але сустрэлі яго гасцінна. Міндоўг па раздзелу здабычы ўзяў сабе каваля, збраевыя і кузнецкі прылады, а таксама двух цесляроў. Вызначыўшы здабычу для князя Ізяслава, ён астатняе аддаў на размеркаванне сотнікам, папярэдзіўшы іх аб павялічанай долі дазорным. Міндоўг асабліва пахваліў дазорных, ад іх дасканалай працы атрымалась, што атрад паспяхова і без страт выйшаў з гэтага паходу.

Усе сотнікі былі задаволеныя дзяльбой здабычы і дзякавалі за гэта княжыча. Лідскі сотнік Паганяйло прынёс вялікі збан медавухі і прапанаваў Міндоўгу выпіць за паспяховы паход, але княжыч адмовіўся і папярэдзіў, што паход заканчваецца, калі ўсе прыйдуць у свае дамы.

Раніцай да княжыча падышоў сотнік жырмунтаў Радмонт, які яшчэ раз падзякаваўшы, нагадаў аб дамоўленасці дапамагчы ў навучанні бітвам на мечах. Ён таксама прапанаваў праз два дні даслаць дапамогу ў будаўніцтве замка. Міндоўгу гэта спадабалася і ён з задавальненнем пагадзіўся. Сотня жырмунтаў

накіравалася на захад. Астатнія сотні атрада накіраваліся на поўдзень. Праз некалькі вёрст лідская сотня таксама павярнула на захад.

Апоўдні пры падыходзе да Наваградку, княжыч накіраваў сваіх збраяносцаў з палонам і здабычай ў Воруту. Вестка аб вяртанні дасягнула горада раней, чым сам атрад. Князь Ізяслаў чакаў княжыча ля брамы замка. Пасля прывітання, агледзеўшы княжацкую здабычу, князь Ізяслаў застаўся вельмі задаволены Міндоўгам. Ён запрасіў яго да сябе на гутарку. Княжыч распавёў князю, як прайшоў паход. Князя больш за ўсё турбавалі рыцары крыжакоў.

— Княжыч, з таго што ты чуў пра рыцараў мечаносцаў, якія спосабы процідзеяння ім будуць карысныя?

— Яны вельмі моцныя ў баі верхам на баявых конях. Рыцары ўсе вельмі добра ўзброены мечамі і ў іх трывалыя цяжкія даспехі. Але ў гэтым я бачу іх слабыя бакі. У проціборстве з імі галоўнае забіць баявога каня. Для гэтага патрэбны моцныя і трапныя стрэлкі з лука на адлегласці сто дваццаць крокаў. Для паразы каня і вершніка вельмі патрэбна кідаць на скаку кароткія дзіды. Я бачыў, як іх кідаюць наваградскія ваяры. Яны гэта робяць добра, але трэба яшчэ больш дасканала. Нашы кані лягчэй і хутчэй за іх, таму трэба скакаць ім насустрач па чатыры вершніка ў шэраг, а калі застаецца адлегласць да іх шэсцьдзесят або семдзесят крокаў, кідаць у іх кароткае дзіда, і адразу разгортвацца назад па двое налева і направа. Затым кідае ў іх дзіды, ці як я чуў дроцікі, наступная чацвёрка і таксама разгортваецца назад, і так некалькі шэрагаў чацвёрак. Трэба каб гэтых дроцікаў у кожнага лёгкага вершніка было не менш за пяць. Гэтую атаку я назаву кругавой атакай лёгкіх коннікаў. Пасля таго, як лёгкія коннікі выкарыстоўваюць усе свае дроцікі, ўступаюць у проціборства з рыцарамі цяжкія коннікі. У цяжкага вершніка неабходна быць доўгае, больш двух даўжынь каня, дзіда з шырокім, доўгім і вострым лязом. Дзіда трэба зрабіць лягчэй і даўжэй, чым для рыцарскіх турнірных бітваў. Гэта дзіда прызначаецца для паразы каня рыцара. Цяжкаму вершніку неабходны быць у кальчузе і з мечом. Сотні ваяроў неабходна фармаваць па спецыялізацыі лёгкіх і цяжкіх коннікаў з адпаведным узбраен-

нем. Невялікія паселішчы, якія не могуць мець больш за сотню ваяроў, неабходна спецыялізоваць коннікаў напалову лёгкіх і цяжкіх. Гэта процідзеянне рыцарам у поле, але лепш за ўсё нападаць на атрад рыцароў у лесе. Для таго каб іх прывабіць у лес трэба большая колькасць выдатных дазорных. У лесе многае залежыць ад лучнікаў. Князь, я заўважыў, што ваша асабістая ахорона з нашымі растокскімі мечамі, а ў сотнях выдатных мечоў вельмі мала.

— Княжыч, мая асабістая ахорона мне адданая і я пра яе клапачуся. А іншыя ваяры няхай здабываюць сабе мечы ў бітвах. Мае ахоронцы хутка пачнуць збіраць даніну з падуладных паселішчаў. Да зімы яны скончаць. Пасля гэтага трэба з імі правесці навучанне ў бітве на мечах.Раніцай пасля сняданку мой служка завядзе цябе да каваля і да цесляра, каб яны пачалі рабіць такія дзіды, як ты казаў. Добра, княжыч?

— Добра, князь.

Са здабычы, што захапіў сам Міндоўг у княжым цераме, былі залатыя жаночыя ўпрыгожванні з каштоўнымі камянямі. З гэтых упрыгожванняў, залаты бранзалет для тонкай жаночай рукі, княжыч хацеў падарыць Яньке. Але стала цямнець і вось-вось з'явіцца тата.

Князь Рынгольд з'явіўся з радасным настроем. Павіншаваўшы сына з удалым паходам, пахваліў за выбар здабычы. Кузнецкая майстэрня і цесляры вельмі патрэбны для будоўлі. Тата з задавальненнем распавёў, што пад дахам ужо шэсць дамоў і ўсе з печкай. Яшчэ ў двух дамах зрабілі печку, а дахі заўтра скончаць накрываць.

Гэтыя весці спадабаліся княжычу, і ён распавёў, як беражліва ставіўся Доўбуд да сваёй палоннай жанчыны. Ён прапанаваў тату разам з волхвом Вітаўтам, заўтра правезці ўрачыстае пасвячэнне чатырох збраяносцаў у рыцары, а таксама кожнаму з іх вылучыць гатовы дом. Князь Рынгольд ўважліва паглядзеў на сына і вымавіў:

— Мне гэта падабаецца, а таксама падабаецца тое, што ты расцёш не толькі вялікім ваяром, але і моцным князем, турбуешся аб сваіх падданых. Гэта яшчэ раз пацвярджае, што мы зрабілі правільны выбар, перасяліўшыся ў гэтыя зямлі.

— Дзякую, тата. Яму было прыемна гэта чуць, і ён гэтага не хаваў.

— Сын, скажы, як тваe адносіны з князёўнай Марфай?

— Я яшчэ не вызначыўся, тата.

— Ты ж ведаеш, што калі ў Гародні князь Ізяслаў прапанаваў нам адправіцца ў Наваградак, ён вырашыў аддаць сваю адзіную дачку за цябе. Ён хоча праз вяселле яе з табой, працягнуць сваю дынастыю князёў тут у Наваградку. Князь Ізяслаў вельмі шмат робіць для будаўніцтва замка Ворута. Шмат у чым дзякуючы яму хутка прасоўваецца будаўніцтва Воруты. Калі табе нейкія рысы характару князёўны Марфы не падабаюцца, то гэта не бяда. Яна яшчэ маладая і характар яе зменіцца. А калі нават не зменіцца, то ў цябе могуць быць прыхільнасці да іншых дзяўчат. Гэта мне з тваёй маці пашанцавала, і ў нас была ўзаемная любоў. У княжых сем'яў гэта рэдка здараецца, ў большасці змоў бацькоў карыслівая цікавасць.

— Я падумаю, тата.

На вячэры князь Ізяслаў быў у радасным настроі, ці то атрымаў адказ на мучышчае яго пытанне, як змагацца з рыцарамі мечаносцамі, ці то ад той багатай здабычы, што прынёс яму Міндоўг з паходу. Князёўна Марфа таксама была ў добрым настроі, напэўна, жаночая футравая шуба, што была ў княжацкай здабычы ей спадабалася. Князь Рынгольд распявёў князю Ізяславу, што ён с сынам вырашылі заўтра ўрачыста прысвяціць збраяносцаў ў рыцары, таму разам паедуць у Воруту і застануцца там, на ўрачыстую трапезу і на начлег. Княжыч доўга не мог заснуць, усё разважаў, пра пачутае ад таты.

Ён успомніў, што быў без абярэга, калі меў зносіны з Янькай. Можа, таму яе чары так моцна ўздзейнічалі на яго. Яна нават, нягледзячы яму ў вочы, адгадвала яго жаданні. А ён нават не ведаў з чаго пачаць адгадваць яе намеры, ў яго знікала здольнасць думаць. У яго было адно і тое ж у галаве: хачу глядзець на яе; хачу размаўляць з ёй; хачу дакранацца да яе; хачу яе. Усе гэтыя перажыванні прыводзілі да разгубленасці, да бессэнсоўнасці сваіх дзеянняў, да прыніжэння сабе. Іншая справа кіраваць вайсковымі дзеяннямі і прымаць асабіста і вырашальна ўдзел у іх. А пасля ўдалага кіраўніцтва бачыць, як змяняецца

да цябе стаўленне старых сотнікаў, з недаверлівага да поўнай пакоры. Бачыць з якой ўдзячнасцю прымаюць ад цябе заслужаныя імі падарункі. Калі ўзнагароджваеш іх, такое адчуванне, што тройчы ўзнагароджваеш сабе. Мой мудры тата мае рацыю, рэалізаваць сабе, як моцны князь, я магу толькі праз вяселле з князёўнай Марфай.

За сняданкам князь Ізяслаў паведаміў Міндоўгу, што княжы служка ўжо гатовы праводзіць яго да каваля і цесляра. Дамовіўшыся з татам, што дагоніць яго па шляху ў Воруту, княжыч паспяшаўся да брамы замка. Ускочыўшы на Імклівага, Міндоўг разам са служкай спачатку адправіліся да цесляра. Заехаўшы ў пасад, княжыч быў здзіўлены, што многія мужчыны і жанчыны выходзілі ім насустрач і пакланіўшыся, віталіся з ім:

— Добры дзень, княжыч Міндоўг.

Міндоўг ледзь паспяваў адказаць:

— Добры дзень. Княжыч падумаў, што няўжо і ў Малым замку будуць таксама выходзіць і вітацца з ім. Калі таксама, то пракрасціся незаўважаным да Янькі не атрымаецца, і ён з глыбокім смуткам сумна ўздыхнуў. Цесляр чакаў іх перад домам. Міндоўг патлумачыў цесляру, якія дрэўкі патрэбны для дзід, і папрасіў тут жа зрабіць самы тонкі, але кароткі ўзор. Узяўшы ўзор, яны накіраваліся да каваля. Той таксама чакаў іх. Патлумачыўшы кавалю, якія лязы патрэбны, і аддаўшы яму ўзор дрэўка, княжыч ў суправаджэнні служкі накіраваліся да дарогі на Воруту. А выехаўшы на гэтую дарогу, Міндоўг хутка дагнаў тату. Разам з ім ехалі два егеры, Дзімін і Сірвід. У кожнага з егераў было па шэсць звязаных пеўняў, напэўна, ад князя Ізяслава. Яны абмяркоўвалі, што яшчэ б падстрэліць у лесе для ўрачыстай трапезы.

Княжыч даўно не быў у Воруце, таму быў моцна ўражаны будаўніцтвам. Асабліва яго зацікавіў доўгі дом з двума печкамі ў розных канцах дома. Ён стаяў без даху, цесляры ладзілі кроквы пад яе. Але ўсё ж Міндоўг праехаў міма яго, а накіраваўся да валхва Вітаўта. Побач з ранейшай хаткай для яго, цесляры ўкладвалі чацвёрты венец невялікага, але трывалага дома. Уваход у домік быў зроблены з старой з латамі парусіны, і быў адкрыты. Княжыч, увайшоўшы ў домік, убачыў побач з валхвом

двух яго наведвальнікаў, і павітаўся. Двое наведвальнікаў павітаўшыся з Міндоўгам і падзякаваўшы валхва, паспяшаліся да выхаду. Уважліва прыгледзеўшыся да бліскучаскурага валхва, княжыч з захапленьнем прамовіў:

— Рады бачыць вас волхв Вітаўт, бадзёрым і здаровым. Як вам тут падабаецца?

— Так, княжыч Міндоўг. Тут добра і людзі добрыя, клапацяцца пра мяне. Бачыш, колькі шкур ваўкоў і мядзведзяў мне падарылі?

— Так, добрыя людзі. Яны ведаюць, што заўсёды могуць атрымаць ад вас дапамогу. Вось сёння патрэбна дапомога ад вас. Тата і я вырашылі нашых збраяносцаў пасвяціць у рыцары.

— Добрая справа. Трэба на узгорку паставіць ідал Перуна. Ідзем са мной, я пакажу дзе.

Яны выйшлі і пайшлі ў напрамку замка. Па дарозе княжыч распавёў, што паміж замкам і пасадам, хоча ў будучыні вырыць глыбокі роў, і праз яго будзе апускацца мост з замка.

Калі яны наблізіліся да замка, іх дагнаў князь Рынгольд з цесляром. Волхв Вітаўт звярнуў увагу на вельмі стары дуб. У гэтага дуба некаторыя галінкі былі без кары, яны ўжо засохлі. Волхв Вітаўт патлумачыў, як з гэтага дуба зрабіць ідала Перуна, і дазволіў цесляру гэтую працу выканаць. Падбеглі да іх збраяносцы, яны былі ў радасным настроі, вочы іх блішчэлі ад пачутых вестак. Волхв патлумачыў ім, як зрабіць капішча і пажадаў знайсці адзін, а лепш два вялікіх каменя валуна, і падкаціць іх да дуба. Міндоўг памерыў адлегласць ад дуба да сцяны замка, шаснаццаць крокаў. Выходзіць мост будзе кароткім, усяго дзесяць ці дванаццаць крокаў. У Наваградку мост да Вялікага замка даўжэй, таму княжыч вырашыў, што трэба будзе роў вырыць глыбей. Убачыўшы лясніка, ён паклікаў яго да сябе, і пасля прывітанняў сказаў:

— Кодрун, вось табе падарунак ад мяне, калчан стрэл з дваццаццю стрэламі. У нападзе на Пскоў у цябе быў вельмі важны загад, перабіць ахову брамы замка, і ты добра з гэтым справіўся. Дзякую табе.

— Дзякуй, княжыч Міндоўг. Я вельмі задаволены, што вы мне давяраеце.

— Кодрун, сёння будзе ўрачыстая трапеза. Два егеры Дзімін і Сірвід хочуць у лесе папаляваць на буйнога звера, дапамогі ім.

— Добра, княжыч.

Міндоўг з нецярпеннем пайшоў у замак які будуецца.

Патройны пласт мура з буйных камянёў заканчваўся ў праёме для брамы замка, а ў баках ад гэтага праёму было выкладзена яшчэ чатыры пласта буйных камянёў. Таўшчыня сцен у тры кроку здалося дастатковай, з улікам крутасці ўзвышша на якой будаваўся замак. Праца прасоўвалася на будаўніцтве княжацкага церама. На падмурак былі ўсталяваны чатыры венца. Княжыч стараўся непрыкметна ўсё агледзець, каб не адцягваць будаўнікоў, але яго заўважылі і ўсё пасяброўску павіталіся.

Міндоўг ацаніў па плошчы гэты церам, і з задавальненнем адзначыў, што ён будзе больш, чым у Пскове, але крыху менш, чым у Наваградку. Яму спадабалася, што ўваход у ледасховішча будзе з церама. З трох бакоў ад церама ляжалі на брусках і прасушваліся абчасаныя доўгія бярвёны. Княжыч адшукаў у пасадзе тату і распавёў яму, што заўтра ці паслязаўтра прыбудзе з паселішча жырмунтаў дапамога для будаўніцтва замка. Убачыўшы доўгі дом, ён вырашыў больш уважліва прыгледзецца да яго. Калі Міндоўг падышоў да яго, ён здагадаўся, што спешна будуецца доўгі стол прызначаны для сённяшняй ўрачыстай трапезы.

Княжыч вырашыў не адцягваць іх увагу. Ён знайшоў ссечанае дрэва таўшчынёй з кулак і ўкапаў яго ў зямлю, а зверху на вышыні галавы вершніка павесіў шлем без барміцы.

Заданнем для новых рыцараў будзе на скаку ссекчы з аднаго ўдару частку ствала дрэва, крыху ніжэй шлема. Пакуль ён гэтым займаўся, цесляр зрабіў ідал Перуна. Бог Пярун выглядаў суровым мужчынам, які трымаў меч двума рукамі. Пакуль трое збраяносцаў выкладвалі з камянёў ахвярнік, Доўбуд падкаціў да ідалу велізарны камень валун. Такое было б не пад сілу тром іншым збраяносцам. Нечакана з’явіўся наваградскі ваяр Акуш. Ён прывёз на кані два жбаны ў аплеценцы з дубцоў вярбы, і радасна паведаміў:

— Добры дзень, княжыч Міндоўг.

— Добры дзень, Акуш.

— Даведаўся, што ў вас ўрачыстая трапеза пасвячэння ў рыцары, прывёз вам два жбана нашай медавухі. У мяне таксама радасная падзея, жонка нарадзіла сына.

— Віншую, Акуш. Спадзяюся, што праз некаторы час ён стане добрым ваяром, сапраўдным рыцарам.

— Дзякуй, княжыч. Давайце за гэта крыху вып'ем медавухі.

— Так, за гэта трэба выпіць.

Яны выпілі трохі медавухі і Акуш паспяшаўся ў Наваградак, на сваю ўрачыстасць. Мёдавуха спадабался Міндоўгу і была дарэчы, нягледзячы на тое, што тата ўжо замовіў медавуху ў будаўнікоў з суседняга паселішча. Пасля таго, як скончылі будаўніцтва ахвярніка, запалілі ў ім Святы Белы Агонь і аблілі медавухай ідал Перуна. Егерам і ляснiку ўдалося забіць вялікага дзіка. Яго і дванаццать пеўняў прынеслі ў ахвяру Пяруну. Пасля ўрачыстага абраду прысвячэння ў рыцары, знаёмага княжычу, новыя чатыры рыцара прадэманстравалі свае навыкі валодання мечом. Прычым, перад апошнім выпрабаваннем, які праходзіў Доўбуд, яму будаўнікі падмянілі ссечанае дрэва на ў два разы таўсцей. Усе збраяносцы справіліся з выпрабаваннем.

Пасля прысвячэння, у звароце да новых рыцараў сталі спачатку ўжываць званне рыцар. Ва ўрачыстай трапезе ўдзельнічалі ўсе, хто быў у гэты дзень на будаўніцтве Воруты, і было весела. Міндоўг нарэшце ўбачыў мазурку і змог прыглядзецца да яе. Яе клікалі Ванда, і яна сапраўды была прыгожай бялявай жанчынай. Тата адносіўся да яе з пашанай, і ён гэтага не хаваў. Яна заўсёды была ветлая і лагодная з князем, але княжыч не быў пераканаңы ў тым, што гэта шчырая лагоднасць, а не падняволенае стаўленне да свайго гаспадара. Прыглядаўся Міндоўг і да маладзенькай дзяўчыне, палоненной Альгердом. Яна была падобная на Яньку, такая ж далікатная, безабаронная і мілавідная. Яна спадабалася княжычу, і калі ён у гэтым зацвердзіўся, Міндоўг пасадзіў яе побач з сабой і пачаў распытваць.

Яе клічуць Вольга, яна дачка пасадніка і сяброўка дачкі князя. Дачка князя са сваёй маці былі ў царкве, калі на іх напалі ліцьвіны, а яна ў гэты час вырашыла скончыць вышыўку рукава сваёй сукенкі. Яна любіць вышываць і спяваць. Яна ахрышчана ў праваслаўнае хрысціянства, але хадзіць у царкву і маліцца не

любіць. Ёй па душы старыя абрадавыя святы. Ёй споўнілася пятнаццаць лет праз тры дні пасля мінулага Купалля. Да яе ніхто не сватаўся таму, што ведалі жаніха ёй выбірэ яе тата, пасаднік. У яго швейна-ткацкая майстэрня. У дзень нападу ліцвінаў, ён раніцай адправіўся на ладдзі ўніз па рацэ Вялікая па гандлёвых справах.

— Калі вернецца, будзе моцна перажываць, што цябе захапілі ў палон?

— Не ведаю, можа і не будзе моцна перажываць. Ёсць яшчэ малодшая мая сястра, яе ён больш любіць чым мяне. А больш за ўсё ён любіць сваіх сыноў. Мой старэйшы брат сотнік у войску князя, а другі брат дзесятнік. Тата больш клапаціўся пра братоў, чым пра мяне і сястру. Пра нас клапацілася маці, але яна два лета назад памерла пры родах. Пасля гэтага пра малодшаю сястру клапацілася нянька.

— Вольга, скажы ў цябе ж няма ненавісці да нас, за тое, што мы забілі ахоронцаў ў княжым цераме?

— Няма. Я бачыла, што ў пасадзе вы нікога не забівалі. А ахоронцы князя, як ты кажаш, адрозніваюцца ад жыхароў пасада. Князь Уладзімір узяў у сваю ахову людзей вельмі аддадных яму. Гэтыя, як ты кажаш ахоронцы, ўсіх хто прыходзяць да князя, падазраюць у жаданні забіць яго. Яны жывуць у цераме і не выходзяць у пасад. Таму пасадскія людзі да іх ставяцца з асцярогай.

— Зразумело. Добра, што нашы гаворкі вельмі падобныя.

— Так, я ўсё разумею, што ты кажаш.

## ГЛАВА 6

# КНЯЗЬ РЫНГОЛЬД

Пасля выпрабаванняў князь Рынгольд падарыў усім новым рыцарам гатовыя дамы. Першы дом ён пакінуў сабе, другі дом падарыў рыцару Скірмунту, а трэці па леваму баку падарыў рыцару Альгерду. Чацвёрты і пяты дома падарыў рыцарам Доўбуду

і Стрыгівілу на правым баку. Адразу пасля сыходу князя сталі разыходзіцца і астатнія. Падышоў рыцар Альгерд і паклікаў Міндоўга і Вольгу ў дом, падораны яму. Альгерд паставіў на стол збан квасу і сказаў, што прыйдзе заўтра раніцай. Выпіўшы квасу, яны ляглі на адзіны ў доме ложак. Прайшло шмат часу, калі ён апошні раз мілаваўся з Савінкай. У рэдкія вячэрнія часы, калі не трэба было думаць аб ваярскіх справах, княжыча асільвалі салодкія ўспаміны аб гэтых мілаваннях. Заўсёды гэтыя ўспаміны прыводзілі да хуткага сну. Калі ж галава Міндоўга была забітая невырашальнымі думамі пра рыцараў хрысціянскіх ордэнаў, і ён доўга не мог заснуць, выхад быў знойдзены. Яму трэба было перайсці на ўспаміны пра мілаванне з Савінкай, і ён ад гэтых лёгкіх, прыемных дум хутка засынаў.

Княжычу нецярпелася пашырыць свае сведкі ў прыемных адчуваннях. Але ён добра ведаў, што перад ім не Савінка з яе вопытам, а выдатная, але скованая і асцерагаюччаяся гэтага дзяўчына. Таму ён прыцішыў сваё нецярпенне і пастараўся як мага больш увагі надаць ласкам і чуласці. Калі ж адчуў, што Вольга сама гэтага вельмі хоча, то ён пайшоў ёй насустрач. Потым, пяшчотна лашчачы яе яшчэ ўздрыгвае цела, ён адчуў сабе як у другі раз захапіў Пскоў.

Раніцай іх разбудзіў Альгерд і запрасіў на сняданак. Першай выскачыла Вольга, Міндоўг не спяшаючыся, папіўшы квасу, таксама накіраваўся на сняданак. Па дарозе княжыч сустрэў князя, той быў увесь у думках аб будаўніцтве.

— Добрай раніцы, сын. Калі прыбудзе абяцаная дапамога будаўнікамі ад жырмунтаў?

— Добрай раніцы, тата. Павінны быць сёння, але не пазней заўтрашняга дня.

— Егер Сірвід вечарам адправіўся ў Наваградак, магчыма з ім прыбудуць.

За сняданкам усе рыцары былі ў добрым настроі, нават Альгерд, што здзівіла Міндоўга. Але калі князь паеў і строга сказаў рыцару Доўбуду, каб той заняўся кузнецкай майстэрняй і адразу пасля поўдня паведаміў яму, чаго для кузні не хапае, рыцары зразумелі, што свята скончылася і трэба прыступаць да працы. Рэзкасць таты трохі здзівіла княжыча, і ён стаў прыглядацца да

Ванды. Яна была, як звычайна ветлая і добрадушная, і ніякіх зменаў у настроі ў яе не было.

У Вользе былі прыкметныя перамены, хоць яна старалася гэта захаваць. Хутка робячы ўсё, што ёй казала Ванда, яна старалася непрыкметна паглядзець на Міндоўга і тут жа адводзіла погляд. Яму гэта было знаёма, па зносінах з Янькой. Тые зносіны былі, як размова поглядамі. Янька начытаная, ў ёй адчуваецца таямнічасць, складаная для разуменьня. Вольга прасцей і даступней. Калі тата казаў, што ў княжыча могуць быць акрамя жонкі прыхільнасці да іншых дзяўчат, ён думаў пра такіх, як Вольга.

Скончыўшы снедаць, Міндоўг пайшоў да валхва Вітаўта. Над новым домам для яго працавалі два цесляры, яны ўкладвалі сёмы венец. У летнім доміку ўваход з парусіны быў адкрыты, і княжыч увайшоўшы, ўбачыў наведвальніка валхва. Той уважліва прыслухоўваўся да Вітаўта. Княжыч ціха прысеў каля парога і стараўся ім не перашкаджаць. Калі наведвальнік усё ўважліва выслухаў, і падзякаваўшы валхву, павярнуўся сыходзіць, то ўбачыўшы княжыча спалохаўся і стаў прасіць прабачэння за тое, што не заўважыў яго. Павітаўшыся, Міндоўг распытаў валхва Вітаўта пра здароўе і настрої, а потым выйшаў да будаўнікоў. Цесляры папрасілі княжыча накіраваць да іх печніка. Міндоўг пайшоў шукаць князя і ўбачыў егера Сірвіда з трыма вершнікамі. Яны і былі дапамогай жырмунтаў, два цесляра і печнік.

Адшукаўшы князя Рынгольда, княжыч дамовіўся, што печнік жырмунтаў пойдзе працаваць да дома волхва, а адзін з тых цесляроў далучыцца да будаўніцтва церама. Двум цеслярам жырмунтаў князь даручыў будаўніцтва кузні. Там жа на кузні працавалі чатыры рыцара. Усюды ўпарта працавалі. Толькі Міндоўг адчуваў сябе ў гэтым лішнім. У будаўніцтве ў яго не было навыкаў. Ён дамовіўся з татам, што заўтра з раніцы адправіцца разам з Альгердам і Стрыгівілам да жырмунтаў. Убачыўшы Вольгу, ён падышоў да яе. Пытацца пра яе здароўе і настрой было лішнім, яна была прыгожая ў сваёй радасці, вочы яе блішчэлі.

— Вольга, вечарам я з татам і двума рыцарамі адпраўлюся ў вялікі горад Наваградак. Потым я з двума рыцарамі надоўга

адпраўлюся ў іншыя паселішчы. Я памятаю ты казала, што табе падабаецца вышываць. Ты зможаш нарэзаць льняную тканіну на кавалачкі, з маю далонь і вышыць на іх чырвонымі і белымі ніткамі знак — скакушчага на баявым кані вершніка з узнятым у руцэ мечом?

— Так. Магу.

— Добра. Гэты знак — герб князёў Ростака. Такіх кавалачкаў з вышыўкай мне патрэбна два дзесяткі. Гэтымі кавалачкамі тканіны можна выціраць забрудны твар. Усё патрэбное для гэтага табе перададуць. Ён намаляваў гэты знак палкай на зямлі і абгарадзіў яго галінкамі.

— А як доўга цябе не будзе?

— Не ведаю. Можа дваццаць дзён, а можа больш.

Княжыч распавёў князю Рынгольду аб сваёй задумцы, каб у кожнага з ворутскіх ганцоў быў апазнавальны кавалачак тканіны, па якім усе ведалі, што ганец кажа ад імя князя Рынгольда або княжыча Міндоўга. Тата ўхваліў задумку сына і запэўніў, што перадасць Вользе ўсё патрэбное.

На вечары ў князя Ізяслава, княжыч прыслухоўваўся да размовы князёў і пачуў, як тата казаў пра патрэбнасці кавалачкаў тканіны для выцірання спацелага твара, як прынята ў Ростаку.

Раніцай пасля сняданку, Міндоўг разам з двума рыцарамі Альгердам і Стрыгівілам, і ў суправаджэнні іх ганца Курыла, адправіліся на поўнач. Спачатку яны накіраваліся міма паселішчы Ліда да пасялішча жырмунтаў. Ганец Курыла ўжо тры разы разам з наваградскім ганцом скакаў у гэтыя паселішчы і добра ведаў кароткія сцежкі туды.

Пасля поўдня княжыч і суправаджаючыя прыбылі ў паселішча Жырмунты. Гэта паселішча было абгароджана сцяной з завостраных зверху тоўстых бярвенняў. Уезд быў адзін, праз браму з дазорнай вышкай. Паселішча знаходзілася на ўзвышшы побач з невялікай рэчкай Дзітва. Было відаць, што ў адной вярсце знаходзіцца возера, а за ім лес. Лес быў і з усходняга боку. У астатнім гэта было поле, ў якім вырошчвалі збожжа. Калі пад'ехалі да брамы іх сустрэў намесьнік Радмонт, відаць было, што ён рады з'яўленьню княжыча. Па дарозе ў дом намесніка, Міндоўг заўважыў яшчэ дзве дазорныя вышкі.

У доме Радмонт пахваліўся сваімі двума сынамі, старэйшаму было дваннацаць лет, і ён быў у паходзе на Пскоў, а малодшаму было дзесяць лет. Пакуль рыхтавалі лазню для гасцей, Радмонт распавёў, што ўсяго ў яго сто дваццаць чатыры ваяра. У Пскове ім удалося здабыць чатырнаццаць мячоў і ўсяго ў іх сто два мечы. Міндоўг падзяліўся сваёй думкай аб арганізацыі цяжкіх і лёгкіх коннікаў, і пра будуючых бітвах з рыцарамі хрысціянскіх ордэнаў. Радмонт быў уражаны пачутым.

— Добрая думка, княжыч Міндоўг. У нас толькі сорак шэсьць кальчуг. Толькі адзін каваль ўмее рабіць кальчугі. І робіць ён дзве за ўсё лета. Здабываем кальчугі больш у паходзе. З Пскова здабылі чатыры. Дзіды з такімі лёзамі пачнем рабіць заўтра.

— Радмонт, трэба яшчэ кагосці навучыць рабіць кальчугу.

— Добра, княжыч. Будзем вучыць. А цяпер лазня для вас падрыхтавана. Міндоўг і два рыцары з задавальненнем папарыліся ў лазне. Княжыч ужо стаў прывыкаць да моцнага пару.

Раніцай пасля сытнага сняданку, Міндоўг з рыцарамі правёў некалькі паказальных бітваў на мечах, як у індывідуальных, так і ў групавых бітвах. Гэтыя паказальныя бітвы выклікалі моцнае ўражанне. Княжыч адзначыў пры сабе, што жырмунты з вялікай ахвотай навучаюцца гэтым навыкам і ў іх гэта лепш атрымліваецца, чым у наваградскіх ваяроў.

Радмонт таксама ўдзельнічаў у гэтым навучанні і паказаў свае вялікія здольнасці. У навучанні ўдзельнічалі і два яго сыны. У асабліва здольных, Міндоўг пытаўся ў іх імёны і хваліў за ўдалыя дзеянні. Відаць было, як яны гэтым ганарыліся.

Княжыч стараўся запомніць гэтых здольных ваяроў, таму што сам быў яшчэ малады, а ў далейшым трэба ведаць на каго разлічваць. У гэтым невялікім, у параўнанні з іншымі, паселішчы было шмат ваяроў, відаць ваенныя паходы іх асноўная здабыча. Земляробства, бортніцтва і рыбалоўства на возеры гэта для мужчын, а ў жанчын падрыхтоўка ежы і ткацка-швейная рамяство, вось і ўсе справы для іх.

Княжыч з рыцарамі прабыў сем дзён у паселішча Жырмунты і вырашыў, што гэтага достаткава. Яго праводзілі ўрачыста, ўсе сто дваццаць чатыры ваяра ў поўным баявым уборы. Да пасялішча Ліда яго з рыцарамі суправаджаў жырмунтцкі ганец.

Дабраліся хутка. Яно знаходзілася на ўзгорку, акружаным двума рэкамі Каменкай і Лідзейкай. Вакол былі багністыя месцы. Гэтае паселішча было больш, чым Жырмунты і да адзінай магутнай брамы з дазорнай вышкай вяла адзіная цвёрдая дарога.

У раскрытай брамы іх чакаў сотнік Паганяйло. Ён правёў княжыча з рыцарамі да дома намесніка Роальда. Ля ганка дома побач з намеснікам грэўся на сонцы доўгі вуж.

Роальд быў сівавалосым распаўнелым мужчынам, кульгавым на правую нагу. Ён гасцінна запрасіў у свой вялікі дыхтоўны дом. На стол тут жа прынеслі ежу, хоць рыцары не былі галодныя, але саступілі настойлівай просьбе гаспадара і паспыталі смачных страў. Намеснік Роальд распавёў, што яго дзед з сям'ёй і яшчэ чатыры сям'і перасяліліся сюды з зямель люцічаў, ад гвалтоўнай хрысціянізацыі. Тут ім вельмі падабаецца.

— Волхв мясцовы, яцвяг. На нас ніхто не нападае, а самі мы па першым клічы князя Ізяслава заўсёды ідзем у паход. Сам я ўжо пяць лет не ваюю, а тры маі сына ваявалі, але апошні малодшы сын загінуў два лета таму. Ёсць дзве дачкі на выданні, старэйшай пятнаццаць лет, малодшай чатырнаццаць.

І ён уважліва паглядзеў на двух рыцароў. Потым гаспадар крыкнуў, каб прынеслі медавуху. Прыйшлі дзве мілавідныя дзяўчыны, дачкі намесніка, і налілі княжычу і рыцарам медавухі. Медавуха таксама прыйшлася даспадобы госцям. Затым іх запрасілі ў лазню. У вялікай лазне, тры маладыя дзяўчыны без адзення лунали іх, з дапамогай дубовага веніка. Калі госці выходзілі адпачыць ад моцнага пара, іх частавалі медавухай. З лазні госці выйшлі стомленыя, але чыстыя, і іх моцна хіліла да сну.

Раніцай сытна паснедаўшы без медавухі, княжыч і рыцары з ахвотай прыступілі да навучання мясцовых вояроў. Навучанне працягвалася восем дзён. Намесьнік Роальд у падзяку княжычу адправіў двух цесляроў для будаўніцтва замка ў Воруту. Міндоўг запомніў найбольш здольных лідскіх вояроў.

У зваротны шлях да Наваградка іх суправаджаў малады лідскі ганец, які ўпрасіў княжыча ўзяць яго для навучання ў дазорнага. Пасля пскоўскага паходу многія вояры пажадалі прайсці навучанне ў дазорных.

Ужо вечарэла, калі Міндоўг і суправаджаючыя прыбылі ў Навапрадак. Ля моста ў браму Вялікага замка княжыч сустрэўся з татам, якога суправаджаў егер Сірвід. Калі князь Рынгольд застаўся ўдваіх з сынам у пакоі, ён распавёў, што Сірвід паведаміў князю Ізяславу аб мілаванні княжыча з пскоўскай палоннай дзяўчынай.

— Цяпер князь Ізяслаў настойвае на заключэнні змовін на вяселле з яго дачкой Марфай. Ён дае нам чатыры паселішчы на поўдні і ўсходзе ад Воруты. Мяжу ён устанаўлівае каменем валуном на сярэдзіне між Навапрадкам і Ворутай. Я яго запэўніў, што гэта ў цябе пястота па маладосці. Бо так, сын?

— Так, тата.

— Па маёй просьбе Ванда пагаварыла з Вольгай. Тая была згодна з усім, што ёй казалі. На вячэры князь Ізяслаў будзе чакаць пацверджання змовін. Я яго запэўню, што ты пацвярджаеш. Цяпер яго асабістая дружына збірае даніну з падуладных паселішчаў. Думаю, што заўтра мы з князем і ты са сваімі рыцарамі наведаем тыя паселішчы, што нам перадаюць. Я жадаю, каб яны даніну перавозілі да нас у Воруту. З князем я дамовіўся, што вяселле будзе на Каляды. Толькі вось церам наўрад ці паспеем пабудаваць. Для мяне важна, каб будавалі добра і надзейна. Адбіраюць самыя тоўстыя, доўгія і прамыя ствалы. Па блізкасці ўсе прыдатныя ссеклі. Цяпер заходзяць глыбока ў лес. Там сякуць, абчэсваюць і падцягваюць на бліжэйшую да нас паляну, і пакідаюць на прасушку.Некаторыя падцягваюць да нас па рацэ. Зараз ужо гатовых дваннаццать дамоў. Доўгі дом з двума печкамі таксама гатовы. Калі не паспеем з церамам, то справім вяселле ў доўгім доме. Кузню пабудавалі. Зрабілі ў Навапрадку па замове Доўбуда падвойныя скураныя футра, для бесперапыннага і большага нагнятання паветра ў горне. Для пачатку вырабілі жалезныя завесы дзвярныя, зараз не трэба іх прасіць у князя Ізяслава. Калі Эйсмант пераселіцца да нас, то наша зброевая майстэрня будзе лепшай ва ўсіх усходніх землях.

На вячэры княжыч прыслухоўваўся да размовы князёў, пасля таго, як тата сказаў князю Ізяславу аб згодзе сына, размова была аб будаўнічых справах, але потым князь Ізяслаў звярнуўся да Міндоўга:

— Княжыч Міндоўг, да мяне прыбылі ганцы ад ваўкавыскага князя Даў'ята і слонімскага князя Вілікаіла з просьбай, каб ты са сваімі рыцарамі правёў у іх навучанне ў бітвах на мечах. Ты зможаш у бліжэйшыя дні правесці ў іх навучанне?

— Так, князь Ізяслаў. Змагу.

— Добра. У нас з імі мірныя дамовы. Мы дапамогаем адзін аднаму. Яны гатовыя дапамагчы ў будаўніцтве.

Княжыч і князёўна пазіралі адзін на аднаго. Міндоўг у яе поглядах заўважыў разуменне значэння яе жаніха, сама ж чула, што іншыя князі просяць княжыча аб паслугі па навучанні іх ваяроў. Пскоўскі паход паказаў сілу Міндоўга. Футра з Пскова, напэўна, нагадвала ёй пра гэта, а можа і навучанні князя Ізяслава. Усё часцей ў яе поглядах княжыч заўважаў уціхаміранне і пакорлівасць. Для яго будучае вяселле з князёўнай гэта важнае ўзмацненне яго значэння ў гэтых зямлях. Пасля сняданку, атрад коннікаў, які ўзначальваўся двума князямі, адправіўся ў кірунак Воруты. Прыкладна на сярэдзіне гэтага шляху, князь Ізяслаў загадаў свайму ахоронцу пазначаць гэта месца вялікім каменем і яловай галінкай.

Пасля мяжы яны павярнулі на ўсход і неўзабаве прыбылі ў паселішча Ваўчыцы (сучаснае Ваўковічы), дзе іх сустрэў валасціцель. Паселішча знаходзілася на ўзвышшы правага берага ракі Рута, якая ў гэтым месцы поварачывала на ўсход. Паселішча не было абгароджана, ў ім стаялі каля шасцідзесяці дыхтоўных дамоў. Князі папярэдзілі валасціцеля, каб даніну ён перадаў у Воруту князю Рынгольду. Княжыч разведаў, што ў гэтым паселішчы пяцьдзесят два ваяры.

Не затрымліваючыся тут, князі накіраваліся ў Воруту. Прытрымліваясь побач з татам, княжыч пачуў, як князь Ізяслаў папярэдзіў тату, што спыняцца ў Воруце яны не будуць, няма часу. Ён толькі зазірне на будаўніцтва, не злазячы з коня, і паедуць далей.

Міндоўг паклікаў да сябе Альгерда і папярэдзіў яго, каб ён адшукаў Вольгу, і ўзяў у яе тры кавалачкі тканіны з вышытым гербам князёў Ростака. Пры ўездзе ў Воруту, княжыч быў уражаны павелічэлым будаўніцтвам. Ён з радасцю заўважыў, што зімовы дом волхва Вітаўта быў гатовы, з печкай і дахам, і тут жа

здзівіўся, што тата яму пра гэта не казаў. Прасоўваючыся верхам, ён адзначыў, што будаўнікі не адцягваліся ад працы на з'яўленне князёў. Зразумела, што тата іх прывучыў не адцягвацца пры ім, але тут з'явіўся наваградскі князь Ізяслаў, а яны працягвалі працаваць, не заўважаючы яго. Тым больш гэта было дзіўна, што пры яго з'яўленні ў пасадзе Наваградка пасля пскоўскага паходу, ўсе стараліся выйсці з дамоў і павітацца з ім, з княжычам.

Прасоўваючыся па пасадзе, ён з радасцю бачыў які вялікі і прыгожы атрымаўся доўгі дом з двума печкамі, чуў гукі удараў молата ў кузні, і стараўся ўбачыть Вольгу. Але князі хутка агледзелі церам і павярнулі назад на выезд з Воруты. Альгерд паспеў знайсці Вольгу і ўзяць у яе тры кавалачкі тканіны з вышыўкай. Міндоўгу спадабалася вышыўка. Бліжэйшае паселішча ўніз па правам баку ракі Рута было Пагорак (сучаснае Загор'е). Яно знаходзілася ў трох верстах ад Воруты. Паселішча таксама не было абгароджана, і ў ім былі каля сямідзесяці дыхтоўных дамоў. Воласціцель ягоны сказаў княжычу, што ў паселішчы семдзесят пяць ваяроў.

Далей праз дзве вярсты таксама на правым беразе ракі Рута было вялікае паселішча Карэлчы (сучаснае Карэлічы). Яно было абгароджана і знаходзілася на ўзвышшы. У ўязной брамы з дазорнай вышкай іх чакаў намесьнік. Твар намесніка княжычу здалося знаёмым, ён пазнаў у ім госця валхва Вітаўта. Намесьнік Яраш запрасіў іх у свой дом. За сталом з ежай і медавухай намесьнік распавёў новаму князю і княжычу, што ў паселішчы вялікая ткацка-швейная майстэрня, кузня. Усе цесляры, сталяры і печнік цяпер працуюць на будаўніцтве замка Ворута. Штодня адпраўляюць па рацэ ў Воруту камяні і плінфу. У паселішча сто дванаццаць ваяроў, сотніка клічуць Борыч.

З гэтага паселішча конны атрад князёў перавезлі на левы бераг ракі Рута. Чацвёртае паселішча было праз дзве версты на ўсход, каля левага берага ракі Рута. Гэта было маленькае неагароджанае паселішча Людвік (сучаснае Людвікі). Сівавалосы воласціцель Людвік распавёў князю і княжычу, што ён з сям'ёй і яшчэ тры сям'і перасяліліся сюды з зямель люцічаў ад гвалтоўнага навязвання хрысціянства сорак лет таму. Уцякалі яны верхам на конях без скарбу, толькі з ежай праз зямлі паммораў і прусаў. На

беразе ракі Нёман у зямлі скаловаў, яны дамовіліся з яцвяжскімі гандлярамі, якія былі на двух драккарах, пераселіцца да іх. У гэтых мясцінах і спыніліся. Тут ім падабаецца, волхв мясцовы. Зараз у паселішчы дваццаць дзьве сям'і. Займаюцца земляробствам, конегадоўляй, бортніцтвам. Трыццаць адзін ваяр, ва ўзросце ад пятнаццаці да пяцідзесяці лет.

Міндоўг пацікавіўся:

— Пры ўездзе ў паселішча, я заўважыў слуп і на ім дзве тоўстыя, змацаваныя дошкі са слядамі ад трапленняў ці то дзід, ці то стрэл.

— Гэта сляды ад кідальных дзід. У нас з пяці лет хлопчыкі верхам на конях практыкуюцца ў кіданні дзід.

— Пакажыце, як яны ўмеюць кідаць.

Людвік хутка распарадзіўся, і неўзабаве госці пераканаліся ў дасканалым уменні не толькі кіраваць канём, але і на скаку дакладна кідаць дзіды у цэнтр шчыта, падлеткамі і дарослымі ваярамі. Асабліва яго здзівіў ваяр лет дваццаці, які на вельмі хуткім скаку з адлегласці прыкладна сто крокаў кінуў дзіду дакладна ў цэнтр. Яго клікалі Яргайла, ён ваявода для гэтага паселішча. Княжыч раней бачыў як добра кідалі наваградскія ваяры, але так дакладна кідаць бачыў упершыню. Ён не ўтрымаўся і сам зрабіў гэта з адлегласці шэсцьдзесят крокаў. У шчыт ён трапіў, але не ў цэнтр, а ў край. Міндоўг быў задаволены. Ён ведаў, што на іх ўсіх можа разлічваць.

Пераправіўшыся на правы бераг ракі Рута, конны атрад князёў, не затрымліваючыся нідзе, прыбыў у Воруту. Хутка перагаварыўшы з будаўнікамі, і ўзяўшы з сабой егера Сірвіда, князі і суправаджаючыя прыбылі ў Наваградак. Раніцай пасля сняданку княжыч і два рыцары, а таксама наваградскі ганец адправіліся на поўдзень у Слонім.

Пасля поўдня яны прыбылі ў Слонім. Прасоўваючыся па пасадзе, Міндоўг адзначыў дыхтоўнасць шматлікіх дамоў. Замак быў пабудаваны на ўзвышшы пры зліцці ракі Іса ў раку Шчара. Сцены замка былі драўлянымі, вышынёй ў пяць маховых сажняў. Трапіць у браму замка можна было па вузкім падвесным мосце праз глыбокі роў. Па мосце маглі праехаць не больш двух вершнікаў у шэрагу.

Пры набліжэнні да цераму, ім выйшаў насустрач князь Вілікаіл. Гэта быў малады, рослы, моцнага целаскладу князь. За сталом ён распавёў, што ён з чатырнаццаці лет удзельнічае ў ваенных паходах. Яго тата быў князем і калі ён загінуў, то яго абралі князем. У іх шматбожжа, ўсе яго родзічы яцвягі. Цяпер яму дваццаць лет, а два лета таму яго жонка пры родах першынца памерла. На Каляды скончыцца тэрмін двухлетнега смутка, і ён зможа паўторна ажаніцца. У іх даўні мірны і саюзніцкі дагавор з заходнім ваўкавыскім княствам. Калі на кагосці нападаюць, то яны аб'ядноўваюцца і даюць сумесны адпор.

— У нас з імі шматлікія роднасныя адносіны. Але цяпер у ваўкавыскага князя Даў'ята няма дачок, толькі тры сыны, таму нявесту буду шукаць у іншым княстве. У нас мірныя і саюзніцкія дамовы з моцнымі наваградскім і гародзенскім княствамі. Ваюем з мазурамі і паўднёвымі русінамі. У ваўкавыскага князя бывалі сутычкі з усобнымі заходнімі яцвяжскімі плямёнамі. Але ў апошні час гэта бывае вельмі рэдка. Часцей мы разам з імі нападаем на мазураў, радзей на паўднёвых русін.

Міндоўг па просьбе князя, распавёў аб пскоўскім паходзе, а потым падзяліўся сваімі думкамі пра асаблівасці будучых бітваў з рыцарамі хрысціянскіх ордэнаў. Князя Вілікаіла гэтыя думы вельмі зацікавілі, і калі яму паведамілі, што лазня падрыхтавана, ён прасіў працягнуць аповяд. Толькі па заканчэнні аповяду, князь падзякаваў яго і запрасіў у лазню. Княжыча рассмяшылі выразы твара рыцараў, калі яны ўбачылі, што замест чаканых трох голых дзяўчат, іх будзе парыць сівавалосы дзед. Але ён так добра дзейнічаў дубовым венікам, што госці ледзь еле вылазілі ў супакой адпачынку і былі рады выпіць травяны адвар, а не медавуху. Там жа іх чакаў падарунак ад князя — новая споднняя бялізна з лёну. Пасля сытнай вячэры ва ўсіх траіх госцей быў сапраўдны сон волата.

Пасля сняданку князь Вілікаіл у баявым адзенні суправадзіў госцей на поле за пасадам у бок ракі Іса. Тут ужо іх чакалі больш за тры сотні ваяроў. На першую паказальную бітву на мечах княжычу супрацьстаяў велізарны волат, як Доўбуд. Паказальная бітва скончылася звыкла ў такіх выпадках, волат стаяў бяззбройны і здзіўляўся, як гэта адбылося. За гэтай бітвай ўважліва

назіраў князь Вілікаіл. Ён прымеціў асаблівасці дзеянняў Міндоўга. Пад усеагульнае адабрэнне князь прапанаваў сябе ў якасці суперніка княжычу. Міндоўг добра ведаў, што князь фізічна мацней яго, і напэўна хутчэй чым волат. Таму княжыч вырашыў выматаць праціўніка, як калісьці Жыгімонта. Нягледзячы на тое, што з часам рыцарскага турніру Міндоўг узмужнеў і нарасціў яшчэ больш цягліц, яму з цяжкасцю ўдавалася адбіваць вельмі моцныя ўдары князя. Нарэшце-то княжыч ўлавіў імгненную страту пільнасці князя, і пасля падманнага руху выбіў меч у яго з рук. Рэакцыя князя на паразу ўзрадавала Міндоўга, калі той зразумеў, што абяззброены, то ўсміхнуўся і агаліўшы правую далонь, працягнуў яе княжычу. Пасля поціску рукі Міндоўг зразумеў, што яны сябры.

Пагаварыўшы з княжычам, князь Вілікаіл накіраваў на будаўніцтва замка ў Воруту чатырох цесляроў і печніка, а таксама даў указанне па вырабе дзід. Да вечара вырабілі тры манекены для адпрацоўкі ўдараў на скаку. На вячэры княжыч распавёў пра ўзмацненне значэння дазорных і аб іх навучанні. Навучанне слонімскіх ваяроў працягвалася дзевяць дзён. У поўдзень пасля заканчэння навучанняў, князь Вілікаіл сам праводзіў госцей да канца пасада.

На растанне княжыч перадаў князю вышыты кавалачак тканіны з выявай герба князёў Ростака, і яны дамовіліся аб тым, што важныя весці або просьбы аднаго да іншага будуць перадаваць праз ганцоў з такім кавалачкам тканіны. Далей іх праводзіў на захад слонімскі ганец. Да вечера Міндоўг з рыцарамі прыбыў у Ваўкавыск. Горад знаходзіўся на ўзвышшы ў зліцці ракі Ваўкавыя ў раку Рось. Сцяна, якая агароджвае замак была драўлянай, вышынёй у тры маховых сажняў. У ўязной брамы іх чакаў пасівелы, але яшчэ моцны князь Даў’ят. Князь запрасіў госцей да стала, за якім з цікавасцю назіралі за імі тры сына князя. Двое з іх былі дарослыя, як княжыч, а трэці подлеток не больш за дзесяць лет.

Князь распавёў Міндоўгу, што ў самім Ваўкавыску трыста дваццаць шэсць ваяроў. Месца для навучання за пасадам, там ужо стаяць чатыры манекена. Так, у іх пабываў ганец ад слонімскага князя і распавёў аб вучэннях, якія праходзілі там.

Цяпер ён пашле на будаўніцтва замка ў Воруту шэсць цесляроў і двух печнікоў. Ганец перадаў дзіда, па ўзору якога яны ўжо вырабляюць такія дзіды.

Княжыч пацікавіўся:

— Князь Давъят, з-за чаго такія назвы ракі і горада?

— Ваўкі вельмі ўшанаваныя ў гэтых мясцінах. Тутэйшы стары волхв, які памёр дзесяць лет таму, расказваў, што бывалі выпадкі, калі страчаные дзіцяці выкармліваліcь ваўчыцамі. Потым яны станавіліся ваўкалакамі, у іх была воўчая поўсць. Яны маглі пераўвасабляцца на некаторы час ваўком і назад. У любым выпадку такі чалавек у абліччы ваўка заўсёды захоўваў розум. Кожнае ператворэнне гэта пераход з чалавечага святла ў іншы,



нечалавечы. Калі мяжа паміж чалавекам і зверам настолькі непрыкметная, што ён быццам і чалавек, і звер адначасова. У яго знешнасць вычайнага ваўка, і толькі па некаторых асаблівасцях можна разгледзець у ім пярэваратня. Ён заўсёды бегае не ў групоўке, а адзін і пры гэтым адкідае чалавечую цень, а вочы гараць агнём. Звычайнага чалавека могуць пераўвасобіць у ваўкалака тутэйшыя нядобразычлівыя чараўнікі. Усе пярэва-

ратні-ваяры па натуры. Я бачу у цябе пярсцёнак-амулет ад чароўніцтва, гэта добра. У нас ніхто ваўкоў не баіцца. Калі чалавек сустракае ваўка і кажа яму пяць імёнаў сваіх памерлых родзічаў, то воўк яго не кранае. Пры старым валхву, напярэдадні зімовага сонцавароту, ўсе мужчыны яцвягі разам з ім ўтваралі воінскае братэрства і апраналі на сябе воўчыя шкуры, што сімвалізавала іх пераўвасабленне ў ваўкоў. Так яны кантактавалі са сваімі звярынымі продкамі, ў якіх прасілі моцы і мудрасці. Майго тату семнаццаць лет таму абралі ваўкавыскім князем, і мы перасяліліся сюды са Слоніма. Пры старым волхву, кожны падлеток Ваўкавыска перш чым стаць ваяром, павінен быў прайсці абрад ініцыяцыі. У поўначы яны збіраліся ў лесе без зброі, толькі са шчытамі. Апраналіся ў воўчыя шкуры, збіраліся каля вогнішча, рухаліся ў рытме валхва, ўваходзілі ў транс. У іх пачыналіся воўчыя звычкі, раздаваўся іх воўчае выццё, і зграя выходзілі на паляванне. Палявалі яны іншых звяроў, пры гэтым яны змагаліся рукамі, нагамі і зубамі. Ад нас у дванаццаці верстах на захад ёсць наша паселішча Монтовт (сучаснае Монтовты). Гэта перасяленцы люцічы з вашых зямель.

— Люцічы побач з намі абадрытамі, трохі ўсходней.

— У іх татэм воўк. У нас кажуць люты, значыць люты воўк. Татэмнае жывёла ўвасабляе адзінства роду і яго сілу, яго нельга забіваць. У любы момант, пры неабходнасці, чалавек можа заклікаць свой татэм на дапамогу і атрымаць усю яго сілу. Часта, пры цесных зносінах са сваім татэмам, чалавек мог атрымаць магчымасць абарачэнне і навыкі пераўвасаблення ў цела жывёлы заступніка і назад у чалавечае цела. У гэтым паселішчы сто сорак два ваяра, іх смага і лютасьць бітвы раўнацэнная тром, а то і чатыром сотням. Навучанне пачнем заўтра, а цяпер у лазню.

У лазне іх лунаў бярозавым венікам сівавалосы дзед, кульгавы на правую нагу. Пасля сытнай вячэры сон наступіў хутка і быў моцным. Пасля сняданку, калі князь Дав’ят з госцямі прыбылі на поле за пасадам, княжыч убачыў каля трох сотняў ваяроў. Міндоўг адабраў адну сотню ваяроў для свайго навучання, а астатнія дзве сотні размеркаваў двум рыцарам.

У суперніку па паказальнай бітве яму дастаўся вельмі высокі і моцны ваяр. З боку гэта магло выглядаць, як суперніцтва Філіс-

тымскага волата Галіяфа супраць маленькага падлетка Давіда. Толькі замест прашчы і каменя ў княжыча быў меч. У гэтай сутычцы Міндоўгу вельмі патрэбна была спрытнасць і шпаркасць перамяшчэння, таму ён адкінуў у бок шчыт, які бескарысны ад магутнага ўдару. З улікам вялізнага росту праціўніка княжычу лягчэй было адгадваць дзеянні ваяра. Але першы ўдар мечом па локці ня выбіў з рукі мяча волата, а наадварот ваяр яшчэ больш люта стаў размахваць ім.

У чарговы раз пасля ўдалага манеўру, Міндоўг нанёс моцны канцэнтраваны ўдар па локці рукі, якая трымала меч і ён выпаў, а волат хоць і схапіўся левай рукой за павіслую правую, але лютасць яго была такая, што ён гатовы быў біцца левай рукой і зубамі. Толькі рэзкі вокрык князя Дав'ята трохі супакоіў ваяра.

Боль у руцэ ў ваяра не праходзіла, і ён паскакаў у пасад. Князь не адважыўся супрацьстаяць княжычу, напэўна, яму паведамілі, чым скончыўся паядынак слонімскага князя Вілікайла з Міндоўгам. У гэтых навучэнцаў ваяроў было велізарнае жаданне хутка авалодаць навыкамі бітвы на мечах, але ўважлівасці і дасканаласьці ў разуменні таго, што тлумачыў княжыч, ім не хапала. Міндоўг цярпліва тлумачыў ім іх паўторные памылкі. Ён разумеў, што калі на гэтых ваяроў накрычаць, то з іх могуць атрымацца ворагі. Вокрык свайго князя імі ўспрымаецца, як праява сілы, а ад чужога, як абразу.

Адзінае што адрознівае іх з лепшага боку ў параўнанні з наваградскімі ваярамі, так гэта ўсеагульнае і вялікае жаданне добра навучыцца змагацца на мечах.

Разважаючы над гэтым, княжыч зрабіў выснову, што ваяры гэтых мясцін знаходзяцца ў заўсёднай гатоўнасці да адбіцця нападаў варожых войскаў, а ў Наваградку адвыклі ад гэтага. Князь Ізяслаў здолеў акружыць Наваградак княствамі, з якімі ў яго дамовы не толькі аб вайсковай дапамогі пры нападзе варожых войскаў, але і дамовы аб гаспадарчай ўзаемадапамогі. У Наваградку вельмі шмат рамесных майстэрняў і ў навакольных іх княствах гэта добра ведаюць, таму калі яны нешта патрэбнае не знаходзяць у сябе, яны ведаюць што гэта патрэбнае могуць знайсці там. Можа таму, нягледячы на дрэнныя адносіны з валхвом, князь Ізяслаў працягвае княжыць у Наваградке.

На наступную раніцу, прыбыўшы на поле для вучэнняў, першае, што ўбачыў Міндоўг гэта ўчорашні супернік. Волат быў з падвязанай і чымсьці абматанай правай рукой. Княжыч наблізіўся да яго і лагодна прамовіў:

— Добры дзень. Як цябе завуць, моцны ваяр?

— Добры дзень, княжыч Міндоўг. Мяне клічуць Туробіт.

— Туробіт, рука моцна баліць?

— Баліць, але знахарка казала, што дзён праз дзесяць перастане.

— Туробіт, добра што ты прыйшоў, нягледзячы на боль у руцэ. Ты добры ваяр, такія як ты, нягледзячы на цяжкія раненні, працягваюць ваяваць. Так ваююць сапраўдныя ваяры многобожцаў, унукі Перуна.

Міндоўг заўважыў, што ваяру сказанае спадабалася. Паступова ваяры сталі набываць навыкі бітваў на мечах. На пяты дзень навучання, княжыч прадэманстраваў, як трэба наносіць сякучы ўдар па манекене на скаку. Ваўкавыскія ваяры паказалі свае навыкі ў кіданні дроцікаў і ў нанясенні коляшчых удараў дзідай пры хуткай верхавой яздзе. На вячэры ў князя Дав'ята, княжыч пераканаў яго ў далейшай ўдасканальнасці гэтых навыкаў, з-за маючых адбыцца бітваў з рыцарамі хрысціянскіх ордэнаў. Міндоўг таксама растлумачыў тактыку вядзення бою з гэтымі рыцарамі. Княжыч скончыў навучанне ваяроў на дзесяты дзень. На наступную раніцу Міндоўг, пры расставанні перадаў князю вышыты кавалачак тканіны і яны дамовіліся аб тым, што важныя весці або просьбы аднаго да іншага будуць перадаваць праз ганцоў з такім кавалачкам тканіны.

У доўгі зваротны шлях іх суправаджаў ваўкавыскі ганец. Яны спяшаліся да наступлення цемры прыбыць у Наваградак, ночы ўжо былі халоднымі. Міндоўг вельмі хацеў паспець да вечара ў Наваградак, але ў той жа час баяўся загнаць каней. Яны прыбылі да Вялікага замка ўжо зацемна і пад'ёмны мост быў узняты. Пасля доўгіх і вельмі нервовых для княжыча тлумачэнняў з аховай ля моста, яго праводзілі ў церам. Там насустрач яму выйшаў князь Ізяслаў і паведаміў, што князь Рынгольд цяжка паранены на паляванні, ляжыць у Воруце. Міндоўг узяўшы іншага каня, паскакаў у Воруту. У поўначы ён адрозніваў дарогу, таму гнаў

каня не шкадуючы. Убачыўшы агні ад паходняў, ён ведаў, што гэта Ворута. Падскакаўшы да дома князя, ён заўважыў як стаяць побач з домам рыцары Доўбуд і Скірмунт, а таксама егер Дзімін.

Саскочыўшы з каня і моўчкі прабегшы міма сваіх суплеменнікаў, ён убег у дом і кінуўся да ложку князя. Тата вельмі бледны, нават пасінелы з азызлым тварам, які жыве толькі вачыма, ўбачыўшы сына толькі і змог на імгненне бліснуць вачыма, і ўсё, погляд спыніўся, ён быў знежывелым. Міндоўг не верыў, што гэта магло адбыцца. Потым з цяжкасцю, але ўсё ж ён зразумеў, што гэта адбылося. Ніякіх думак у яго не было, было толькі моцнае адчуванне адзіноты. Ён так і не зразумеў, задрамаў ён ці не, калі раніцай да яго, сядзяшчага каля цела таты, дакранулася Ванда і прапанавала выпіць вады. Пакорліва выпіўшы, і таксама пакорліва ён рухаўся разам з ёй, калі яна вывела яго з дому, і пасадзіла каля ганка..

Падышлі Скірмунт і Дзімін. Егер, каб адцягнуць Міндоўга ад цяжкіх дум, пачаў распавядаць пра тое, што здарылася на паляванні. Егер Сірвід сказаў князю, што па паведамленні нашых цесляроў лесарубаў, у лесе на захадзе з'явіўся вялікі тур.

— Гэта ў іх так называюць вялізнага быка. Туры ходзяць статкамі, а тут з'явіўся адзін. Сірвід казаў, што гэта можа быць у двух выпадках, ці ён захварэў, ці ў двух самых моцных адбыўся бой за вяршэнства ў статку. Пераможаны тур сыходзіць з статка. А князь даўно хацеў папаляваць на буйнога звера. Вось ён і арганізаваў паляўнічую групу. У групу ўзяў рыцара Скірмунта, мяне, егера Сірвіда, лясніка Кодруна і двух лесарубаў, якія бачылі тура. Накіраваўшыся верхам, узялі з сабой доўгія дзіды, рагаціны, сякіры і лук са стрэламі. Неяк на паляне мы ўбачылі горку цёмна бурага колеру, падобную на стог сена, калі сталі набліжацца гэтая горка павольна ўстала на ногі. Гэтая дзіўнае жывёла было даўжынёй больш росту чалавека на палову, задняя частка, як у звычайнай каровы, але пярэдняя з рост чалавека і шырынёй больш чым плечы Доўбуда. Ён нас адчуў па паху, і калі павольна разгарнуўся ў наш бок, мы убачылі грозныя рогі, трохі загнутыя ўнутр. Нягледзячы на засцярогі Сірвіда, князь пад'ехаў да яго бліжэй і выставіў дзіду наперад. Тое, што адбылося далей, ніхто не чакаў. Гэты велізарны непаваротлівы звер

раптам скокнуў на каня князя, перакуліў яго і прыціснуў да зямлі. Тут жа страла Кодруна трапіла яму ў вока, а мы дзідамі з усіх бакоў усадзілі яму ў галаву. Князь не паспеў выцягнуць ногі з стрэмяні, і быў раздаўлен канём і зверам.

Прыбылі з Наваградка рыцары Альгерд і Стрыгівіл, а таксама егер Сірвід. Да Міндоўгу падышоў волхв Вітаўт, і гучна, каб чулі ўсе, прамовіў:

— Князь Міндоўг, не сумуй, твой тата памёр па волі бога Воласа. Мы ўсе жадаем яму добра і балазе, а вышэйшае балазе, гэта развіццё, новая ступень у пазнанні. Смерць выдатная, бо сам сэнс смерці, складаецца ў пераходзе ўверх па прыступках свайго развіцця. Па волі бога Воласа твой тата перайшоў у вышні свет багоў. Я з рыцарам Альгердам правядзем пахавальны абрад па нашых традыцыях. Вечарам зробім святочную трызну па твайму тату.

Пасля гэтых слоў волхва пачаліся падрыхтоўкі да пахавальнага абраду. Магілу вырылі недалёка ад ідала Перуна. Цесляры вырабілі труну і на яе вечку выразалі малюнак мяча. У доме, Ванда і Вольга памылі небожчыка, апранулі ў чыстае і святочное, а потым з дапамогой рыцараў змясцілі цела ў труну. Труну з небожчыкам паставілі побач з выкапанай магілай. Побач з целам князя Рынгольда паклалі яго меч, з папярэдні зламаным лязом.

У гонар памерлага князя зладзілі турнір па стральбе з лука сярод рыцараў. Апусцілі труну ў магілу так, што галава князя была ў заходні бок. Міндоўг развязаў мяшочак таты з зямлёй Ростака і высыпаў яе яму пад ногі. Апусьцілі труну ў магілу на глыбіню з рост невысокага чалавека і засыпалі спачатку зямлёй, а потым камянямі — каменны курган. На вяршыні кургана паклалі яго зброю і даспехі. Ахвярапрынашэнне было каля ідала Воласа.

Пасля гэтага балявалі да позняга вечара. На балі Міндоўг, як ні стараўся быць вясёлым, у яго гэта не атрымлівалася. Да адчування сваёй адзіноты дадаліся тыя клопаты, якія раней клаліся на плечы таты. Будаўнічымі справамі трэба займацца штодня, але жадання і гэтых навыкаў у яго не было. За час яго адсутнасці пабудавалі шмат дамоў, кузню, свіран, стайню. Да прыстані шмат падвозяць будаўнічых матэрыялаў. Зараз, як ніколі шмат будаў-

нікоў сабралася і ўсімі імі трэба кіраваць. Кожны неправільны ўказ па будаўніцтве прыводзіць да памяншэння яго ўплыву. Больш за ўсё разам з татам займаўся будаўніцтвам рыцар Скірмунт, вось няхай і далей ён разам з будаўнікам Моўдзенко займаюцца гэтым. Альгерд заўважыўшы, што Міндоўг або ад стомы, або ад цяжкіх дум, не вясёлы на святочнай трызне па тату, адвёў яго ў дом, каб ён выспаўся, а не мучыў сябе.

## ГЛАВА 7

# ПЕРАМЕНЫ

Прачнуўся Міндоўг раней, чым звычайна, ці ад ранішняга холаду, ці то ад дум у сне аб будаўнічых справах. Спачатку зайшоў у дом да рыцара Скірмунта, а потым разам з ім і будаўніком Моўдзенко яны абышлі ўсе будуючыеся дамы і пабудовы. Цалкам скончыць княскі церам да з'яўлення снегу не выпадала, таму князь Міндоўг указаў паставіць сцены ў два паверхі і дах, а ўнутранае аздабленне рабіць зімой ўласнымі цеслярамі і сталярамі. Каменны мур сцен замка рабіць настолькі доўга наколькі гэта будзе не ў шкоду якасці мура.

Князь таксама ўказаў пабудаваць яшчэ два доўгіх дамы з двума печкамі і адзін шырокі дом, каб зімой ў суровы мароз праводзіць там трэніроўкі ў бітвах на мечах. Рыцару Скірмунту, князь указаў пашырыць высечку дрэў, каля стайні. Прыбыў з Наваградка егер Сірвід, які перадаў просьбу князя Ізяслава прыбыць цяпер да яго.

Пагутарыўшы з валхвом Вітаўтам, князь Міндоўг накіраваўся ў Наваградак. Князь Ізяслаў паспучуваўшы Міндовгу, спытаў:

— Князь Міндоўг, тваё рашэнне пра вяселле з князёўнай Марфай застаецца ў сіле?

— Так, князь Ізяслаў. Толькі само вяселле будзе праз два лета, будзем захоўваць традыцыі даўніны.

— Добра. Праз два лета не будзем чакаць Калядаў, а роўна праз два лета, дзень у дзень?

— Так.

— Князь Міндоўг, нальшанскі князь Таўцівіл памёр пяць дзён таму, па яго волі і па згодзе заможных людзей княства, князем нальшан абралі на іх веча нашага ваяводу Ердзівіла. Ён ужо пачаў перасяляцца. Я пагаварыў з пасаднікам, сотнікамі і іншымі заможнымі людзьмі, ўсе мы просім цябе стаць нашым ваяводам. Дапамогу ў будаўніцтве твайго замка мы па-ранейшаму будзем аказваць. Як ты, князь, пагаджаешся стаць нашым ваяводам?

— Так, згаджаюся.

— Добра. Па тваей замове ўжо больш за сотню вырабілі доўгіх дзід.

У гэты час зайшоў служка князя Ізяслава і паведаміў, што прыбыў ганец з Гародні. Ганец паведаміў, што сёння ўвечары або заўтра прыбудуць у Гародню гандляры з суправаджаючым іх конным атрадам з Ростака. Больш ён нічога не змог сказаць таму, што сам ганец гэты атрад не бачыў, а толькі перадае словы князя Жывінбуда. Калі ганец выйшаў, князь Міндоўг выказаў здагадку:

— Там, хутчэй за ўсё будзе мой старэйшы брат Доўспрунк з жонкай і малодшай сястрой, а таксама магчыма дзядзька Выкінт. Рыцар Эйсмант са сваёй зброевай майстэрняй наўрадлі будзе таму, што ў гэтыя дні яго жонка павінна была нарадзіць. Жонка брата Доўспрунка таксама хутка павінна нарадзіць. Князь Ізяслаў, як вы думаеце размясціць іх?

— Калі жонка твайго брата збіраецца нараджаць, тады іх трэба размясціць тут у Наваградку. На першый час ў доме Ердзівіла, калі перасеміцца. А потым паглядзім па пасялішчах, або дапаможам у будаўніцтве новага. А дзядзька з кім прыбудзе?

— Мой дзядзька Выкінт прысвячаны рыцар, ваяваў з хрысціянскімі войскамі, ў яго сем збраяносцаў. У яго няма дзяцей. З кім ён прыбудзе не ведаю, добра будзе, калі прыбудзе з збраяносцамі, яны вопытныя ваяры.

— Я сабіру ганцоў, якія былі ў розных нашых паселішчах. Пацікаўлюся, дзе і як жывуць намеснікі і валосціцелі. Мая дружына заканчвае збіраць даніну, яны таксама весці мне апавядуць. Потым сумесна прымем рашэнне. Спакой, што быў у цябе

з татам, застанецца за табой. На вячэру і сняданак запрашаю на кожны дзень. Увайшоў служка князя Ізяслава і паведаміў, што прыбыў егер Сірвід. Калі ўвайшоў егер, Міндоўг звяртаючыся да князя Ізяслава, прапанаваў:

— Мне патрэбна прыглядзецца да будаўнічых спраў, таму я буду ў Воруце, а праз егера Сірвіда буду перадаваць просьбы па будаўніцтву. Заўтра днём я прыбуду сустракаць супляменнікаў з гандлярамі. Добра, князь Ізяслаў?

— Добра, князь Міндоўг.

Накіроўваючыся ў Воруту, Міндоўг разважаў над склаўшымся становішчам. Ён ніколі з татам не казаў аб размяшчэнні брата і дзядзькі, гэта трэба было вырашаць князям. Але князь Ізяслаў, на гэтае пытанне адказаў няўпэўнена. Каб пераняць частку сілы князя Ізяслава перад іншымі, мне патрэбно ажаніцца на яго дачцэ. Калі перадаваў князям вышытыя кавалачкі тканіны для іх ганцоў, я прапаноўваў ім, паведамляцца са мной абыходзячы князя Ізяслава. Пасля таго, як я стаў князем Воруты і ваяводам Наваградка, па вайсковых справах ім патрэбна звяртацца да мяне, а па гаспадарчых справах хай звяртаюцца да князя Ізяслава. Лет на дзесяць такое размеркаванне мяне задаволіць, а потым усе справы неабходна вырашаць мне аднаму. Гаспадарчыя справы таксама вельмі важныя і моцна ўплываюць на ўладу.

Пры набліжэнні да Воруты, князь з задавальненнем адзначыў, што нягледзячы на тое, што пачынае цямнець, гук працы сякірай і молатам да гэтага часу чутны.

Пры ўездзе ў пасад Воруты, каля стайні была кузня і ён вырашыў, што нарэшце то ёсць час зайсці туды. Кузня хоць і была менш, чым у Эйсманта, але не была цеснай. Доўбуд разам з кавалём сярэдніх лет кавалі доўгую паласу металу, а падлеток раздзьмухаў мяхамі аранжавы агонь у печы. Было горача, і Міндоўг вырашыў не адцягваць іх ад працы.

Насупраць кузні цесляры па размечаных пляцоўках пад доўгіе і шырокі дамы, ставілі на камяні лагі. Угледзеўшы князя, падбег будаўнік Моўдзенко.

— Князь Міндоўг, мы пакуль размецілі пад шырокі дом і пад адзін доўгі, а заўтра будзем пад другі.

— А дзе рыцар Скірмунт?

— Ён разам з іншымі рыцарамі выкарчоўвалі пляцоўку каля стайні. Пляцоўка патрэбна роўная для выгулу коней. Так?

— Так.

— Вось яны выкарчоўвалі з дапамогай коней, а потым засыпаюць ямы. Адсякаюць карчы ад дрэва, і карчы адносяць углыб лесу. Князь, патрэбны пяць цеслярскіх сякір і лесарубы для гэтай працы. Не гожа рыцарам гэтым займацца.

— Трохі хай і гэтай працы паспрабуюць. А што сякір не хапае?

— Цесляры і сталяры шкадуюць свае сякіры. Толькі ляснік Кодрун даў сваю сякіру.

— Добра. Усё што патрэбна для будаўніцтва, заўтра днём скажыце егеру Сірвіду, а ён перадасць князю Ізяславу.

Набліжаючыся да замка, князь убачыў Ванду і сказаў ёй, што прагаладаўся. Яна запрасіла Міндаўга ў дом рыцара Альгерда. Увайшоўшы ў дом, ён убачыў Вольгу, якая пры яго з'яўленні на імгненне ўспыхнула тварам і вачыма, а потым збянтэжыўшыся адвяла погляд. Хваляванні апошніх дзён адбіліся на ім, і ён з прагнасцю сытна паеў. Пасля ежы, выходзячы з хаты, ён сутыкнуўся з задыханым ад бегу Альгердам.

— Князь, я хацеў бы пагаварыць сам-насам.

— Кажы, мы адны.

— Князь, памятаеш пасля Пскова, я казаў табе, што ў сваім выбары жанчын, яшчэ пакуль выбіраю.

— Памятаю, ведаючы цябе, я тады гэтаму здзівіўся.

— Князь, праўда ў тым, што калі ўпершыню ўбачыў Ванду, я зразумеў свой выбар. Я нікому не казаў пра гэта і ёй таксама, але цяпер мяне трывожыць, што князь Ізяслаў захоча яе вярнуць сабе. Я цябе князь, прашу не дапусціць гэтага.

— Добра, я табе абяцаў дапамагчы ў гэтым так, што ты не перажывай. А сам ты, як адчуваеш яна не будзе супраць?

— У гэтым я не ўпэўнены, але яна заўсёды з ахвотай ішла на размову са мной. Я таемна назіраў за яе адносінамі з князем Рынгольдам. Іх добрым адносінам нешта перашкаджала, я б сказаў, што Ванда была чымсьці незадаволеная князем.

Апошнія словы Альгерда чулі падышэдшыя да іх рыцары Скірмунт і Стрыгівіл. І калі Альгерд зірнуў на Скірмунта, той вымавіў:

— Калі князю Рынгольду паведамілі пра тое, што недалёка ў лесе бачылі гэтага вялізнага тура, то ён адразу адклаў усе будаўнічыя справы і арганізаваў паляванне. Ён хацеў паказаць, перш за ўсё Вандзе, што ён у сіле перамагчы гэтага вялізнага звера. Міндоўга гэтые словы трохі раззлавалі.

— Зразумела. Ніколі і ні з кім пра гэта не кажыце. Хадземце да мяне ў дом.

Калі яны ўвайшлі і селі за стол, князь убачыўшы нецярпенне Альгерда сказаў:

— Бачу табе не трываецца, пачну з цябе. Заўтра табе трэба аб'ехаць нашы чатыры паселішчы і выявіць з намеснікамі і валосціцелямі, подлеткаў адзінаццаці, дваннаццаці лет жадаючых вучыцца на збраяносцаў для мяне, і прывезці іх сюды. У Людвіка акрамя подлетка, трэба каб ён накіраваў сюды праз дзевяць дзён ваяра Яргайла, які навучыць трапна кідаць дроцікі ў мішэнь на скаку.

Зайшоў у дом рыцар Доўбуд. Міндоўг працягнуў:

— З сённяшняга дня я яшчэ і ваявода Наваградскага княства. Ранейшага ваяводу абралі на веча нальшанскім князем. Альгерд, калі ўсе зразумело, бяжы. Цяпер табе, рыцар Стрыгівіл, трэба праверыць ці ўсе падуладныя паселішчы прывезлі нам даніну спаўна. Рыцар Скірмунт, будаўнічыя справы на табе разам з будаўніком Моўдзенко. Усё, што патрэбна для будаўніцтва днём паведамляеш егеру Сірвіду а ён перадасць князю Ізяславу.

— Добра, князь Міндоўг.

— Рыцар Доўбуд, бачыў нашу кузню, добрая праца. Як цябе пскоўскі каваль?

— Князь Міндоўг, добры каваль, алё каваць такія мечы, як у кузні Эйсманта не атрымліваецца. Сёння кавалі меч, атрымаўся горш, чым у Эйсманта, але лепш чым наваградскія. Будзем спрабаваць яшчэ. Князь Рынгольд знайшоў у падуладным паселішчы памочніка-падлетка.

— Бачыў. Нальшанскі князь памёр ад цяжкага ранення стралой ў твар, каля вока. Трэба вырабіць шлемы мне і ўсім рыцарам, такія каб прыкрывалі частку твара каля вачэй, але не такія цяжкія, як турнірныя для рыцараў.

— Зразумело, князь Міндоўг. Зробім.

— Заўтра пасля сняданку паскачу ў Наваградак. Вяртаюцца гандляры з Ростака з конным атрадам. Думаю, што ў атрадзе Эйсманта не будзе, ты ж ведаеш, у гэтыя дні яго жонка павінна нарадзіць.

Калі рыцары сышлі, Міндоўг стаў абдумваць, ці правільна ён не сказаў Альгерду, што патрэбны плотніцкіе сякіры. Усё ж ён вырашыў, што са сваіх паселішчаў ён у любы час зможа сабраць пяць сякір, а цяпер, калі князь Ізяслаў падатлівы, трэба гэта выкарыстоўваць і няхай ён іх збірае. Увайшла Вольга з гарлачом і з пытаннем у вачах, але ўбачыўшы, як князь ўсміхнуўся ёй, яна таксама ўсміхнулася.

— Не, князь. Там іх нема. Яны пасадзілі іх у нашых паселішчах і паселішчах латыгалаў, якія знаходзяцца блізка да ракі Заходняя Дзвіна.

— Да земгалаў не пойдзем. Ідзем у тое паселішча, дзе лацінскія прапаведнікі. Ведаеш такое паселішча?

— Ведаю, князь. Гэта паселішча ў дзесяці верстах на поўнач.

— Добра, вядзі туды. Няхай зараз да мяне прыйдуць трое дазорных.

Праз трох дазорных, Міндоўг хутка растлумачыў, што ім трэба рабіць. Трэбованні былі ўжо звыклыя па ранейшаму паходу. Усё атрымалась, як у мінулы паход на селаў, толькі цяпер наперад пайшлі абодва села і з двух канцоў падавалі сігнал да атакі. Атака была таксама нечаканая і не сустрэла супраціву. На гэты раз прапаведніка ў паселішчы не было. Быў яго памочнік з лацінцаў і сел, які пагадзіўся яму дапамогаць. Да іх паставіліся бязлітасна. А з астатнімі, як у мінулы паход. Узялі ў палон ўсіх,

акрамя старых, якіх зачынілі ў трох дамах. Вярталіся асцярожна, і без прыгод на ноч вярнуліся ў полацкія зямлі. Палон быў такі ж вялікі, як у мінулы паход. Каваля з сям’ёй, князь перадаў у сваё паселішча Ваўчыцы. Для Воруты Міндоўг адабраў палонных вояроў з сем’ямі. Сястрэ Альгуте ён падарыў футравую шубу, Вользе зімовыя боцікі, а княэёўне Марфе яшчэ адзін пярсцёнак. Усе былі задаволеныя здабычай, князь Ізяслаў таксама быў задаволен. Не быў задаволены толькі Міндоўг, ён адчуваў сябе звычайным грабаўнікам.

Не гэтага ён прагнуў. Ён прагнуў перамог над рыцарамі лацінскіх хрысціян. Але гэта пачуццё незадаволенасці сабой было звычайным нецярпеннем маладосці. Да гэтай думкі ён прыйшоў, калі ляжаў у ложку церама побач з Вольгай, якая заснула. Гэтыя паходы не толькі памяншаюць колькасць даннікаў лацінцаў, але і падрываюць веру ў непераможнасць рыцараў лацінскіх хрысціянаў. Па заканчэнні пасяўных прац, Міндоўг правёў навучанне ўзаемадзеянняў вояроў сваіх паселішчаў у полі недалёка ад паселішча Карэлчы.

## ГЛАВА 10
# ВЕСЦІ З ПОЎДНЯ

Неўзабаве прыбыў ганец ад слонімскага князя Велікаіла. Ганец перадаў Міндоўгу, што здзітаўскі князь Яраш прасіў яго князя Велікаіла дамовіцца з князем Міндоўгам аб аказанні дапамогі ў навучанні бітваў на мечах і заключэнні мірнай дамовы, а таксама дамовы аб узаемадапамозе. Міндоўг даў згоду, і калі слонімскі ганец адправіўся назад, князь з трыма рыцарамі стаў рыхтавацца ў дарогу на Слонім, а потым у Здзітаў. Але на другі дзень пасля слонімскага ганца, прыбыў ганец ад валынскага князя Даніїла Рамановіча з просьбай да князя Міндоўга аб сумесным паходзе супраць рыцараў лацінскіх хрысціян. Валынскі князь прапаноўваў аб’яднаць войскі на дзясяты дзень пасля свята Яна Купалы ў дзесяці вёрстах на захад ад горада Драгічын. Га-

нец перадаў тры кошаля срэбра і пажаданне Данііла Рамановіча, каб у войску Міндоўга было пяць сотняў моцна ўзброеных конных ваяроў. Гэтая просьба вельмі ўзрадавала князя, і ён адразу даў згоду валынскаму ганцу, і стаў рыхтавацца да гэтага паходу. Ён выслаў ганца ў Слонім і Ваўкавыск з пажаданнем да гэтых князёў перадаць яму па адной сотні моцна ўзброеных конных ваяроў для гэтага паходу. Міндоўг таксама паслаў ганца ў Жырмунты каб сотня Радмонта была гатовая да гэтага паходу.

Князь Міндоўг добра разумеў, што гэты паход не лёгкі грабаўніцкі, а паход небяспечны, за славай. У гутарцы з князем Ізяславам, Міндоўг растлумачыў, што вялікай здабычы ад гэтага паходу не будзе і ад Наваградка яму патрэбна адна моцная сотня. Яшчэ адну сотню ваяроў будуць складаць яго ваяры. Князь Ізяслаў паведаміў Міндоўгу, што ўчора вярнуўся з паўднёвых зямель гандляр Міхайла. Накіроўваючыся да яго, князь быў упэўнены, што навін будзе шмат. Міхайла распавёў, што кракаўскі князь ляхаў Ляшко Белы выгнаў Мсціслава Удалага, цесця Данііла Рамановіча, з Галіча і пасадзіў туды каралевіча ўграў Андрэя, аддаўшы за яго сваю малодшую дачку.

Князь Данііл Рамановіч лічыць Галіцкую зямлю сваёй спадчыннай вотчынай ад таты Рамана Галіцка-Валынскага. Кракаўскі князь абапіраецца на падтрымку біскупа Вікенція Кадлубка і рыцараў цыстэрцыянскага ордэна ў Лубежы, каля Вроцлава. Пасля таго, як Міндоўг паведаміў, што атрымаў просьбу аб сумесным паходзе ад Данііла Раманавіча, гандляр падзяліўся думкай, што князь ляхаў паслаў рыцараў цыстэрцыянцаў супраць яцвягаў Берасця і Драгічына. Гэтыя яцвягі больш залежаць ад галіцка-валынскіх князёў, чым ад князя мазавецкага Конрада. Князь Конрад Мазавецкі малодшы брат кракаўскага князя Ляшко Белага, і яны супернічаюць між сабой за вяршынства над усёй Польшчай. Калі месца збору Драгічын, то Данііл Рамановіч прагне, разбіўшы рыцараў цыстэрцыянцаў, аслабіць кракаўскага князя, і адначасова паказаць князю мазавецкаму, што гэтыя блізкія да яго яцвягі і надалей будуць пад уплывам галіцка-валынскіх князёў.

Атрымаўшы згоду ад слонімскага і ваўкавыскага князёў, Міндоўг адправіўся з атрадам у тры сотні ваяроў у Слонім.

З сабой ён узяў лепшых дваццаць два дазорных са сваім егерам Дзімінам, а таксама сваіх чатырох рыцараў без збраяносцаў. Па прыбыцці ў Слонім, князя Міндоўга пазнаёмілі з князем Здзітава Ярашам, і яны дамовіліся аб навучанні ваяроў у будучыні. Ідучы далей ў Драгічын, да атрада далучылася сотня ваяроў з Ваўкавыска. Набліжаючыся да Драгічына, дазорные паведамлялі князю, што хоць і не бачылі, але адчувалі, што за імі сочаць дазорные яцвягаў. Міндоўг разумеў, што пакуль ён не ў сілах аб’яднаць усіх яцвягаў пад сваю руку, але ён быў задаволен тым, што яцвягі бачылі яго сілу і яны гэта запамятаюць.

У прызначаны час атрад прыбыў у ўмоўленае месца. Пры сустрэчы князь Даніїл Рамановіч распавёў тое, што ведаў Міндоўг ад гандляра Міхайла, а таксама аб сваім жадані цалкам разбіць рыцараў тым больш, што агульная колькасць аб’яднанага войска больш чым рыцараў са сваімі збраяносцамі. Міндоўг распавёў аб задумках на гэтую бітву. Улічваючы, што вялікую частку войскі Даніїла Раманавіча складаюць стэпавыя ваяры лучнікі, яны пачынаюць бітву з левага паўкола і адцягваюць лучнікаў рыцараў, а потым уступаюць ваяры Міндоўга з правага паўкола і паспрабуюць падзяліць рыцараў на дзве часткі і цалкам іх знішчыць. Зброю і даспехі рыцараў забірае сабе Міндоўг, а затым ён дапускае Даніїлу Рамановічу разрабаваць, і ўзяць у палон, безабароненное паселішча ляхаў.

Выставіўшы дазорных, Міндоўг схаваў свой атрад у лесе. Князю спадабалася, як конныя лучнікі Даніїла Раманавіча пачалі атакаваць войска рыцараў. А калі тыя вылучылі сваіх лучнікаў на атрад Даніїла Раманавіча, Міндоўг адразу ўказаў аднаму дзесятку лучнікаў страляць у цэнтр тылу суперніка з аднаго боку, а іншаму дзесятку лучнікаў страляць па цэнтры з іншага боку. Затым накіраваў між лучнікамі тры дзесяткі ваяроў з паселішчы Людвіка кідаць дроцікі ў цэнтральных рыцараў па кругавой атацы. Калі ў цэнтры праціўніка палегла шмат коней з рыцарамі, Міндоўг прарваўся ў разбураны цэнтр са сваімі ваярамі, а следам за ім злева сотні Слоніма і Ваўкавыска, а справа сотні жырмунтаў і наваградчан.

Конь Міндоўга Імклівы, пачуў нецярпенне гаспадара, быў першым, хто ўварваўся ў табар рыцараў. Цяжка сказаць, чаго

было больш у дзеяннях Міндоўга, ці то назапашанай нянавісці да лацінскім хрысціянам, ці то жадання паказаць усё сваё нерастрачанае майстэрства валодання мячом. Абодва, і конь Імклівы, і князь Міндоўг разгарэліся гэтай бітвай, неўзабаве перад імі не было жывых рыцараў. Міндоўг справа ўбачыў рыцара і спрабаваў накіраваць коня туды, але Імклівы заўважыў рыцара на коні ў другім баку, і калі закусіўшы цуглі кінуўся туды, князь са здзіўленнем саступіў жаданню коня, і расправіўся з тым рыцарам на якога накіраваў конь. Ваяры Міндоўга здымалі даспехі з забітых рыцараў, і са здзіўленнем бачылі, як княскі конь з вершнікам у чырвоным плашчы імчаліся па полі бітвы ў пошуку застаўшыхся ў жывых рыцараў цыстэрцыянцаў.

Пад незадаволенае пырханне коня, князь усё ж пераканаўся, што жывых рыцараў не засталося. Міндоўг з чатырма сваімі рыцарамі і з аголенымі, чырвонымі ад крыві мечамі накіраваўся да Данііла Рамановіча. Іх суправаджалі асцярожные погляды стэпавых ваяроў. Набліжаючыся да валынскага князя, Міндоўг, а за ім і яго рыцары, ўклалі свае мечы ў ножны. Данііл Раманавіч паказаў на паселішча ў заходнім кірунку, якое вырашыў паграбаваць, і сказаў, што дастаткова паўсотні ваяроў Міндоўга, каб яны з'явіліся з паўночнага ўваходу. Князь з чатырма рыцарамі і лучнікамі ненадоўга з'явіўся ля паўночнага ўваходу ў паселішча ляхаў. Убачыўшы, як бязлітасна стэпавыя ваяры звяртаюцца з ляхамі, князь Міндоўг са сваімі ваярамі павярнулі назад.

З гэтага паселішча, князь дазволіў ўзяць лучнікам шэсць коней. Нягледячы на ўказ князя, ваўкавыскі сотнік прасіў Міндоўга, дазволіць узяць у палон двух маладых збраяносцаў цыстэрцыянцаў.

Супакоіўшыся і разумеючы, што патрэбна зменшыць уражынне ад яго бязлітаснасці, Міндоўг дазволіў ваўкавыскаўцам, але памяншыў ім колькасть даспехаў ў здабычы. Сярод ваяроў атрада Міндоўга забітых не было, гэта было з-за разгубленасці рыцараў ад раптоўнай і лютай атакі ў тыл рыцараў, а таксама ад колькаснай перавагі нападнікаў. Князь быў задаволен тым, што ў наваградскай сотні не было параненых. Гэта яшчэ больш ўмацавала наваградчан ў думке пра ўдачлівасць Міндоўга ў вайсковых справах.

Нягледзячы, што ў жырмунтах былі параненыя, іх сотнік Радмонт быў задаволены здабычай. Здабытыя даспехі і зброя будуць узорам для яго каваля. Рыцары Міндоўга знайшлі са здабычы шмат чаго патрэбнага для сябе. У гэты раз князь іх не абмяжоўваў. Праз шэсць дзён пасля паходу, Міндоўг з двума рыцарамі пабываў у горадзе Здзітаў і правёў навучанне. У зваротны шлях князь узяў з сабой трох цесляроў для працы ў Воруце да зімы.

Па заканчэнні палявых прац, Міндоўг правёў навучанне ўзаемадзеянняў павялічанной колькасці вояроў сваіх паселішчаў, у поле недалёка ад паселішча Карэлчы. Гандляр Чорнавіл, які прыбыў з восеньскага падарожжа, паведаміў, што рыцары Тэўтонскага ордэна захапілі стольны град люцічаў Менцэлін, таму некаторыя люцічы пачалі перасяляцца ў вусце ракі Нёман, у зямлі скаловаў.

Гэтай навінай Міндоўг падзяліўся з князем Выкінтом і князем Доўспрунком на памінках па князю Рынгольду. Дзядзька і старэйшы брат прыйшлі да аднольковой думкі, што яны своечасова перасяліліся ў гэтыя зямлі. Адразу за памінкамі адбылося вяселле князя Міндоўга з князёўнай Марфай. Самым задаволеным на гэтым вяселле быў князь Ізяслаў. Ён падарыў князю Міндоўгу маленькае паселішча Бярэзцы (сучасная назва Беразавец) у чатырох верстах на поўдзень ад паселішча Карэлчы. Гэта паселішча знаходзіцца на правым беразе ракі Сервеч, у якую ўпадае рака Рута. А сама рака Сервеч ўпадае ў раку Неман. У гэтым паселішчы дваццаць чатыры дамы і дваццаць адзін ваяр. Да зімы пабудавалі дамы для палонных селаў.

Да першага снегападу, будаўнікі павялічылі вышыню каменнай сцяны замка да чатырох маховых сажань. У браме замка ўсталявалі механізм пад'ёмнага моста. У замку пабудавалі доўгі дом з двума печкамі для княжых слуг і служанак. У замак, услед за князёўнай Марфай пераехала сястра князя Альгута. Вольга засталася жыць у доме, дзе спачатку жыў князь Рынгольд, а потым Міндоўг з ёй.

Каляды прайшлі весела і шумна. Да князя і князёўны прыбывалі калядоўшчыкі з усіх паселішчаў, нават з самага далёкага паселішча Бярэзцы. За зімой наступіла новае 6729 лета (1221 па

хрысціянскім календары). Нечакана да князю Міндоўгу прыбыў полацкі ваяр Мікола. Ён распавёў, што ў Полацку заможным людзям, прыхільнікам спадчынніка памерлага полацкага князя Валодшы і ягонага старэйшага сына Барыскі, аказваюць моцны супраціў смаленская галіна полацкіх князёў.

— Але тых і іншых турбуе пагроза рыцараў Лівонскага ордэна. У Полацк прыязджаюць розныя лазутчыкі і ўсе спрабуюць выведаць, чые гэта атрады спустошылі два паселішча каля Герцыке. Я заможным людзям сказаў, што здагадваюся чые гэта атрады, і распавёў ім пра наш паход на Пскоў. Яны прасілі мяне перадаць табе, князь, іх пажаданне здзейсніць такі ж паход у гэтае лета, і даць ім ведаць, што гэта полацкі атрад.

— Навошта ім гэта патрэбна?

— Яны хочуць паказаць сілу полацкага войску, і заключыць з рыжскім біскупам і лівонскім ордэнам мірны дагавор.

— Гэта два дагавора або адзін?

— Лівонскі ордэн мечаносцаў арганізаваў Рыжскі біскуп Альберт. У пачатку, біскуп Альберт даваў ім траціну заваяванай зямлі, а зараз ужо мечаносцы даюць траціну заваяваных зямель біскупу. Дагавор у Полацку хочуць падпісаць адзін, дзе іншым бокам будуць і біскуп і мечаносцы.

— Зразумела. Мікола, што ты ведаеш аб гарнізоне ў Герцыке?

— Князь Міндоўг, па вестках маіх дасведчаных сяброў, у Герцыку каля дваццаці рыцараў і каля шасцідзесяці збраяносцаў, а таксама пяцьдзесят прыслужнікаў з селаў і латыгалоў. Штурмам ўзяць замак вельмі цяжка, патрэбны каменямёты.

— Я не збіраюся штурмаваць Герцыку, мне патрэбны сведкі аб гарнізоне, калі яны выйдуць насустрач майму атраду. А таксама мне патрэбны весткі аб паселішчах, якія ім падпарадкоўваюцца.

— Князь Міндоўг, рыцары мечаносцаў заваёўваюць толькі тыя паселішчы, якія побач з ракой Заходняя Дзвіна, каб падпарадкаваць сабе гандль па ёй. Таксама, як раней рабілі полацкія князі. Гэтые паселішчы, блізкія да ракі, найбольш развітыя, ў іх моцны гандль і рамесныя майстэрні. На тыя паселішча, якія далёка ад ракі, ў мечаносцаў не хапае рыцараў, і яны мала развітыя, як жамойты. Пасля таго, як вы разграбавалі два паселішчы і вывелі

ўсіх працоўных жыхароў, лацінцы часткова перасялілі ў гэтыя паселішча жыхароў з далёкіх паселішчаў.

— Я не мог іх падпальваць таму, што з палонам павольна прасоўваўся і рыцары маглі заўважыць дым пажару і нас дагнаць.

— Князь Міндоўг, я разумею гэта. Я ведаю паселішча селаў, каля ракі і ў шасці верстах да Кукенойс. Калі ваш атрад возьме ў аблогу паселішча, і выставіць дазорных ў бок Кукенойс, а потым выведзе ўвесь палон на поўдзень, я са сваім сябром запру старых у крайняй хаце. Растлумачу ім, што лепш быць пад полацкім князем. Потым падрыхтую ўсе хаты акрамя той, ў якой старыя, да спалення. Пачакаю такі час, каб ваш атрад далёка адышоў, так каб быў крыху на поўдзень ад Герцыке, і ўдваіх з сябром падпалем пасялішча з двух бакоў. У нас будуць свежыя коні, мы іх будзем трымаць у паўночнай часткі полацкай зямлі, там жа будзе вартавы атрад з Полацка. Калі ты князь Міндоўг, згодны з такой думкай, то Полацк выдае ўзнагароду. Мікола выклаў на стол князя пяць мяшочкаў з срэбраннымі манетамі.

— Добра Мікола, я згодны. Яны дамовіліся сустрэцца праз сем дзён у паўночнай часткі полацкай зямлі.

Князь вырашыў узяць у паход разам са сваёй сотняй, сотню наваградскіх ваяроў і сотню лідскіх ваяроў. Намеснік пасялішча Ліда Роальд яшчэ мінулым летам прасіў Міндоўга ўзяць яго сотню ў паход. Князь Ізяслаў таксама прасіў Міндоўга ўзяць з сабой сотню, якую даўно не браў у паход, апошні раз гэтая сотня ваяроў хадзіла на Пскоў. Князь Міндоўг пагадзіўся ўзяць гэтую сотню ваяроў у паход, толькі замест старога сотніка ён паставіў маладога дзесятніка, здольнага ў бітвах на мечах.

Атрад князя прыбыў у прызначанае месца вечарам, а раніцай полацкі ваяр Мікола правёў атрад незаўважаным, да абгаворанага паселішча. Дазорныя ўзялі ў аблогу паселішча з усіх бакоў, а таксама выставілі варту ў накірунак горада Кукенойс. Атака на паселішча атрымалась нячаканай і паспяховай, без страт. Пакінуўшы ў паселішчы двух полацкіх ваяроў, атрад з асцярогай накіраваўся на поўдзень, у полацкія зямлі. Да вечара праходзячы ў дзесяці верстах на захад ад Герцыку, Міндоўга сустрэў вартавы полацкі атрад, пра гэта князь дамовіўся напярэдадні. Далей-

шае прасоўванне на поўдзень замыкаў вартавы полацкі атрад. Неўзабаве пасля таго, як атрад князя Міндоўга прыбыў на начлег у полацкай зямлі, з'явіліся Мікола і яго сябра. Мікола распавёў, што ўсё зрабілі, як меркавалі і без цяжкасцяў.

Па прыбыцці ў Воруту, Міндоўга чакала непрыемная навіна. У князёўны Марфы быў выкідак, і яе адвезлі ў Наваградак. Сястра князя Альгута распавяла, што служанка Марфы, якая прыбыла ў Воруту разам з ёй, нешта ёй распавяла такое, ад чаго князёўна Марфа стала крычаць на ўсіх і разбіла прыгожую вазу. Служанка з'ехала разам з ёй пасля выкідка, а пра што быў яе аповяд Альгута не ведае.

Міндоўг узяўшы з сабой частку здабычы для князя Ізяслава, адправіўся ў Наваградак. Князь Ізяслаў быў рады прыбыццю князя Міндоўга, а таксама быў задаволены здабычай. На пытанне аб самаадчуванні князёўны Марфы, яе тата адказаў, што нічога кепскага не было. Быў выкідак, гэта звычайная зъява, ёй трэба пабыць пад наглядам дасведчаных знахарак і ўсё будзе добра. Міндоўг перадаў для яе падарунок, прыгожую зімовую футравую шапку.

Вярнуўшыся ў Воруту, князь стаў распытваць сваіх слуг аб размове служанкі з князёўнай Марфай. Адзін з слуг распавёў, што ён быў у суседнім спакоі, калі яны размаўлялі. Аб чым была размова ён не зразумеў, толькі чуў, што згадваліся волхв Вітаўт, Вольга і Ванда.

Праз пяць дзён Міндоўг зноў наведаў князя Ізяслава і перадаў яму, што ён чакае князёўну Марфу ў Воруце, калі яна выздаравее, толькі без яе служанкі. Пасля таго, як Міндоўг пераселіўся ў княскі церам, у доме, які застаўся за ёй, Вольга наладзіла ткацкую і швейную майстэрні. Ткацкія прылады са здабычы ў двух паходах у Лівонію, ёй перадаў Міндоўг. Вользе дапамагалі дзве паланянкі з селаў, дасведчаныя ў гэтай працы. Яны не толькі ткалі льняное палатно, але і кроілі, шылі, фарбавалі і вышывалі. Вольга была задаволена сваім жыццём, нягледзячы, на рэдкія сустрэчы і мілаванні з Міндоўгам. Князь даражыў гэтымі рэдкімі сустрэчамі, ў іх ён прагнаў абменьвацца радасным пачуццем з Вольгай. Пасля ад'езду князёўны Марфы, іх сустрэчы былі пастаянныя.

Дзён праз дваццаць Міндоўгу патрэбавалася дапамога ў будаўніцтве ад князя Ізяслава і ён адправіўся ў Навагрудак. Пры размове князь Ізяслаў прапанаваў іншую служанку для князёўны Марфы з Навагрудка, але Міндоўг сказаў, што ён дасць Марфе магчымасць выбару з пяці сваіх служанак у Воруце. Да князя Міндоўга нечакана прыбыў Мікола з Полацка і паведаміў, што русіны Ноўгарада і Пскова прапануюць сумесна напасці на лівонскіх рыцараў. Міндоўг не захацеў ісці ў паход з-за нявызначанасці адносін з князёўнай Марфай, а таксама ад таго, што не ён кіруе гэтым паходам, таму яны наведалі князя Ізяслава. Міндоўг прапанаваў князю Ізяславу адправіць атрад пад кіраўніцтвам нальшанского князя Ердзівіла і даць яму дзве сотні ваяроў з Навагрудка. Але ўсе выкліканыя сотнікі даведаўшыся, што Міндоўг не жадае ісці ў гэты паход, адмовіліся ад гэтай прапановы. Пасля гэтага, князь Ізяслаў адправіў свайго ганца і Міколу да нальшанскага князя.

Гандляр Міхайла, вярнуўшыся з поўдня распавёў, што цесць Даніла Рамановіча, Мсціслаў Удалы выгнаў уграў з Галіча. У гэтым паходзе дапамог Даніл Рамановіч, а ляхі не змаглі дапамагчы каралевічу уграў Андрэю.

Мінула шэсць дзён пасля апошняй размовы паміж князямі, і дачка князя Ізяслава адна вярнулася ў Воруту. Гандляр Чорнавіл, які вярнуўся з восеньскага падарожжа, паведаміў, што ў вусце ракі Нёман на прускія зямлі скаловаў ідзе масавае засяленне ўцекачамі люцічамі.

— Мы з гародзенцамі, калі спыніліся там на начлег, сустракаліся з люцічамі. Яны распытвалі пра наша шматбожжа, пра нашы гарады і майстэрні. Ім усё спадабалася і яны захацелі перасяліцца да нас, але я сказаў, што нам патрэбны досведчаныя ў сваёй справе майстры і са сваімі прыладамі. Я лічу, што досведчаный майстэр будзе перасяляцца са сваімі прыладамі для працы. Я ж па праўдзе сказаў, князь?

— Так. Ты добра сказаў, гандляр Чорнавіл. Няўжо ніхто не ўзяў з сабой прылад для працы?

— Ніхто, князь.

— А як яны растлумачылі, што не ўзялі з сабой неабходныя для працы прылады?

— Ім трэба было хутка сабрацца для пераезду верхам. Паспелі на коней ўзваліць толькі ежу.

— Няхай бы да жамойтаў перасяліліся. Узмацнілі б іх.

— Я пра жамойтаў усю праўду распавёў, але бачыў, што ім гэта не спадабалася. Яны казалі, што перазімуюць ў прусаў, а далей вырашаць, як быць. Гародзенцы ўзялі з сабой чацвярых маладых і здаровых мужчын, без сем'яў.

— Добра. Да вясны пагавару з князем Выкінтом, магчыма возьме іх да сябе.

Пасля шасцідзесяці дзён, як адбыў полацкі ваяр Мікола, прынеслі вестку, што нальшанскі князь Ердзівіл разам з ноўгародскімі і пскоўскімі войскамі пад кіраўніцтвам ноўгародскага князя Юрыя Усеваладавіча хадзілі на Лівонію. Поспеху гэты паход князю Ердзівілу не прынёс. Да наступлення маразоў будаўнікі павялічылі вышыню каменнай сцяны замка да пяці маховых сажань, і Міндоўг вырашыў, што гэта дастаткова. Будаўнікі зрабілі дзве дазорные вежы, адну над брамай, іншую ў супрацьлеглым баку. У браме ўсталявалі мост з пад'ёмным механізмам, а перад брамай вырылі роў, шырынёй дванаццаць крокаў, а глыбінёй ў тры маховых сажні. Паспелі пабудаваць дамы для новых палонных селаў, а таксама яшчэ адзін свіран і іншыя пабудовы. Князь асаблівую ўвагу надаваў заняткам сваіх зброяносцаў. Сярод іх стаў набіраць сілу Ленгвін, які ў трэніровачных бітвах на мечах некалькі разоў перамагаў больш рослага першага зброяносца Яўнута. Міндоўг удзельнічаючы ў бітвах на мечах супраць іх, адзначыў, што Ленгвін самы хітры, з большай колькасцю падманных рухаў. Прычым гэтыя рухі ён удасканаўлівае штодня і аднойчы падлавіў на ім князя. Міндоўгу спадабалось спаборніцтва сярод зброяносцаў.

Пасля Калядаў прыбыў менскі (сучасная назва мінскі) князь Глеб Уладзіміравіч (сын менскага князя Уладзіміра Валадарыевіча) са сваім старэйшым сынам. На вячэры Міндоўг заўважыў, што сын князя часта паглядае на сястру Альгуту. Міндоўг зразумеў, што пара сястру выдаваць замуж, але ў гэтым ён быў вельмі асцярожны. Пасля вячэры менскі князь заключыў з Міндоўгам мірны дагавор з узаемадапамогай, а потым прапанаваў выдаць Альгуту замуж за яго старэйшага сына. Пры

гэтым ён падкрэсліваў, што рады парадніцца са славутым князем Міндоўгам. Міндоўг запэўніў князя, што перадасць гэта пажаданне сястры. Альгута сказала брату, што асцярагаецца выходзіць замуж за хрысціяніна. Князёўна Марфа спрабавала пераканаць яе, што канстанцінопальскія хрысціяне не такія кепскія, як лацінскія. Раніцай перад сняданкам, Альгута размаўляла з валхвом Вітаўтам, а потым паведаміла брату, што не жадае выходзіць замуж за хрысціяніна.

Наступіла вясна і новае 6730 лета (1222 па хрысціянскім календары). Міндоўг заўважыў, з якой радасцю сястра адзначала вясёлыя святы Масленіца і Гуканне вясны, і пераканаўся, што Альгута ніколі не адмовіцца ад шматбожжа. У Воруту прыбыў полацкі ваяр Мікола. Ён распавёў, што ўнутраная барацьба ў Полацку скончылася, і цяпер князем стаў Святаслаў Мсціслававіч. Князь і заможныя людзі Полацка прасілі перадаць князю Міндоўгу, што яго паходы ў Лівонію дапамаглі Полацку заключыць мірную дамову з біскупам і ордэнам мечаносцаў. Цяпер Полацк просіць князя Міндоўга не хадзіць паходам на Лівонію, каб не парушаць гэтую мірную дамову.

Міндоўг запэўніў Полацк, што без узгоднення з імі, ён не будзе хадзіць паходам на Лівонію.

Па запрашэнні Міндоўга прыбыў у Воруту князь Выкінт. На прапанову Міндоўга размясціць у сваім пасялішчы люцічаў, Выкінт адказаў, што ён бы ўзяў рамеснікаў са сваімі рамеснымі прыладамі, а без іх не хоча размяшчаць, каб не абвастраць адносіны з жамойтамі.

Вярнуўся з вясновага падарожжа гандляр Чорнавіл і распавёў, што гародзенцы прынялі шмат люцічаў на поўдзень ад свайго горада. Таксама ён паведаміў, што растоцкі рыцар Эйсмант узяўся навучаць рыцарскаму майстэрству сына гарбарнага рамесніка Вісманта. Наведваючы князя Ізяслава па будаўнічых справах, Міндоўг выведаў, што вярнуўся з паўднёвых зямель гандляр Міхайла. Пры сустрэчы Міхайла паведаміў, што быў у нашым паўднёвым клечаўскім (сучасная назва клецкім) княстве. Клецкі князь Корігайло хоча ажаніць свайго старэйшага сына. Ён яцвяг, шматбожац, таму хоча ажаніць сына на шматбожцы. Міхайла распавёў пра сястру князя Міндоўга, пра яко-

га Корігайло шмат добрага ведае ад свайго суседа, слонімскага князя Вілікайла.

— Так што, князь Міндоўг, чакай госцей.

— А далёка гэты Клеческ ад Слоніма?

— Семдзесят вёрст на ўсход ад Слоніма, князь.

Па заканчэнні палявых прац, прыбыў у Воруту клеческі князь Корігайло з сынам. Яны хутка дамовіліся аб міры і ўзаемадапамогі. Потым князь Міндоўг паклікаў князя Корігайло паглядзець на балісту, пакінуўшы Альгуту з княжычам сам-насам. Князь Корігайло зацікавіўся таксама і доўгім домам з двума печкамі. Калі князі вярнуліся, то па тварах Альгуты і княжыча Карыбута было бачна, што яны ўзаемазадаволены. Змовіны адбыліся і вяселле прызначылі праз дваццаць сем дзён. Да прызначанага дня ў Клечаск адправіліся князь Міндоўг з рыцарам Альгердам і Альгута з Вольгай. Альгута з Вольгай былі ў добрых адносінах. Князёўна Марфа была цяжарная і яе пільна засцерагалі служанкі і знахарка.

Міндоўг быў рады цяжарнасці Марфы. Князь ужо зайздросціў рыцарам у якіх дзеці пачалі хадзіць. Яму таксама захацелася, каб яго нашчадак цешыў яго.

Клецкі замак быў пабудаваны на высокім беразе ракі Лань. З трох бакоў замак абараняў выгіб ракі, з чацвёртай быў выкапаны глыбокі роў з зямляным валам. На вале стаялі ўмацавання — драўляныя чатырохкутныя клеці. Вакол замка быў вакольны горад. Жыхары вакольнага горада і замка вельмі ветла сустракалі князя Міндоўга і яго сястру.

Высокі узровень добрабыту і добры волхв, які праводзіў абрад, усё гэта сведчыло аб тым, што сястре тут будзе добра. Княжыч Карыбут быў вельмі ласкавы з Альгутай і гэта быў добры знак на іх далейшае жыццё. Вяселле прайшло шумна і з многімі розыгрышамі, якіх Міндоўг бачыў у першыню, задаволены былі ўсе.

У гэтае лета даніна Міндоўгу была ў два разы больш, чым за мінулае. Усе паселішча князя пашырыліся і сталі больш моцнымі, чым раней. Роў пад мостам ля замка паглыбілі да сямі маховых сажань. У старэйшага брата Доўспрунка нарадзіўся другі сын. Яго назвалі Таўцівілом, як ранейшего нальшанского князя.

Доўспрунк сябраваў з цяперашнім нальшанскім князем Ердзівілом. Па характару яны былі падобныя адзін аднаму. З Гародні, ад Жыгімонта прыйшла вестка, што ў іх сям'і прыбаўленне, другі сын.

Узімку князь Міндоўг шмат думаў аб паходах у надыходзячае лета. Паспяховыя вайсковыя паходы гэта не толькі здабыча, павелічэнне палонных і дасканалянне ваенных навыкаў, гэта таксама знак нядобрым суседзям асцярогацца яго. Для добрых суседзяў гэта знак вернасці выбраных адносін. Напад рыцараў крыжакоў на люцічаў сведчыць аб тым, што лацінская царква вырашыла пазбавіцца ад шматбожцаў на гэтых землях. Далей яны пойдуць на поморскіе і прускія землі. Прусы ля вусце ракі Нёман умацаваліся люцічамі. Але з поўдня на гэтыя землі будуць нападаць мазурскія лацінскія хрысціяне. Можа з гародзенскім княствам напасці на мазураў? Калі лівонскія рыцары пагадзіліся на мірную дамову з полацкім княствам, значыць вайна з эстамі адабрала ў іх шмат сіл. Каліб не дамова іх з Полацкам, я б напаў на лівонцаў.

Усе ўсходнія ад мяне княства, ўключаючы самае моцнае полацкае, маюць князёў з канстанцінопальскіх хрысціян. Стварыць з імі вялікае аб'яднанае княства шматбожцаў не атрымаецца. Будзе достаткава заключэння з імі трывалых дагавораў аб міры і ўзаемадапамогі. На поўдні з княствамі многобожцаў Клеческа, Здзітава і Слоніма заключаны дагавора. Яны ў выпадку небяспекі гатовыя аб'яднацца. На захадзе Ваўкавыскае і Гародзенскае княства шматбожцаў таксама гатовыя да аб'яднання ў Вялікае княства. Ужо цяпер большасць княстваў шматбожцаў прыдатныя на тое, каб я быў ваяводам аб'яднанага княства. А вось князем вялікага аб'яднанага княства мяне не будуць лічыць, з-за маладосці. Хутчэй назавуць такім князем Ізяслава, таму што ў яго самае моцнае княства. Але карані я пусціў, узяў у жонкі дачку князя Ізяслава, таксама сястра замужам за клеческім княжычам, старэйшы брат княжыць на паўночным усходзе, дзядзька на поўначы. Волхв Вітаўт пачытаем ва ўсіх княствах шматбожцаў. Таксама ворутское княства развіваецца хутчэй за іншых.

Так, я малады, але ў мяне ўсё наперадзе.

## ГЛАВА 11

# ЯШЧЭ АДНА ПАГРОЗА

Наступіла вясна і разам з ёй новае 6731 лета (1223 па хрысціянскім календары). Князь Міндоўг вырашыў напасці на мазураў, і паслаў ганца ў Гародню з прапановай Жыгімонту аб'яднаць яго дзве сотні са сваімі трыма, для паходу на захад. Ён умысьліва паслаў прапанову Жыгімонту, каб яго вылучыць перад князем Жывінбудам, як ваяра яму дасведчанага і ў якім ён упэўнены. Трэба каб усе гародзенцы ведалі Жыгімонта, як паспяховага ваяводу. У той жа дзень калі ганец прынёс згоду Жыгімонта з гэтай прапановай, у Воруце з'явіўся полацкі ваяр Мікола. Пры яго з'яўленні, у Міндоўга з'явілася чуйка, што адносіны Полацка і Лівоніі пагоршыліся, і ў князя з'явілася надзея на паход да лівонцаў. Сеўшы за стол, Мікола стаў распавядаць:

— Князь Міндоўг, я да цябе не ад князя Святаслава Мсціслававіча, а ад некалькіх заможных людзей Полацка. Князь Святаслаў стаіць больш за інтарэсы Смаленска, чым за Полацк. Трэба яму нагадаць, што моцная Літва заключыла дамову з Полацкам, а не са Смаленскам.

— Мікола, ты прапануеш мне паход на Смаленск?

— Не князь, між нашымі княствамі шмат роднасных сувязяў і ўсякая свара між намі аслабляе абодва княства. У нашых князёў няма нікога з кіеўскай дынастыі. Мы даўно самастойныя княства. Зараз Смаленск пачуў сваю сілу і хоча захапіць торапецкае княства, і падпарадкаваць свайму ўплыву віцебскае княства, якое знаходзіцца паміж нашым і торапецкім княствамі. Торапецкі князь Мсціслаў Удалы захапіў Галіч, побач з ляхамі, гэта больш багаты і моцны горад, чым Торапец. Але ў торапецкім княстве заўсёды была кіеўская дынастыя. Калі князі кіеўскай дынастыі разведаюць, што Торапец захапілі полацкія ваяры, то яны аб'ядноюцца і нападуць на Полацк. Нам гэта не патрэбна. Сярод князёў кіеўскай дынастыі заўсёды хтосьці незадаволены сваёй доляй, і заўсёды хоча захапіць нешта яшчэ. Ёсць весткі, што ў князя Яраслава Усеваладавіча з'явілася думка захапіць Торапец. Калі Торапец спустошыць моцная Літва, то Смаленск будзе ас-

цярагацца Полацка і не будзе ўзмацняць уплыў на Віцебск, роднасны нам. Трэба паспяшацца, каб апярэдзіць князя Яраслава Усеваладавіча. Князь, калі згодзен з нашай прапановай, то вось табе падарунок.

Полацкі ваяр паклаў на стол тры тугіх кошаля з срэбранымі манетамі.

— Мікола, я так разумею, што ты са сваім сябрам павядзеш мой атрад туды?

— Так, князь, павяду. Мой сябра ўжо чакая нас на поўначы полацкіх зямель.

— Мікола, яшчэ пытанне. Усе князі кіеўскай дынастыі сваякі і канстанцінопальскія хрысціяне. Чаму яны ўсе ваююць між сабой?

— Князь, для мяне гэта вельмі цяжкае пытанне.

— Для нас шматбожцаў, у радасць прыйсці да валхва і пагутарыць пра свае цяжкія пытанні, атрымаць тлумачэнне і адысці ў добрым настроі, без цяжкіх дум. Волхв ніколі не чакае ўзнагароды, калі да яго прыходзяць з радасцю і з падарункамі, ён іх з радасцю прымае, а ад беднага не прыме да таго часу, пакуль ён не стане багацей. Хрысціянскія прапаведнікі заўсёды чакаюць узнагароды, пазбягаюць бедных і імкнуцца да багатых. Потым багатыя, каб не выглядаць дурнямі перад іншымі, распавядаюць усім, якія разумныя гэтыя прапаведнікі і трэба ва ўсім верыць ім. Князі і багатыя хваляць прапаведнікаў, а прапаведнікі хваляць князёў і багатых, угаворваюць людзей, што іх адзіны бог пажадаў, каб менавіта яны былі князямі і багатымі. Чаму ж іх адзіны ва ўсіх гэтых князёў бог не пярэчыць таму, што гэтыя князі ваююць між сабой. Вайна гэта гібель людзей, разбурэнне, гора для ўсяго племяні. Навошта ж верыць у гэтага бога, а па праўдзе, гэтым хрысціянскім прапаведнікам?

— Князь, я чую, што ты ведаеш лепш за мяне адказ на гэта пытанне.

— Добра, Мікола, я згодзен. Заўтра раніцай адправімся ў паход.

— Князь, у гэтым паходзе не трэба браць палон, асцерагаюся пагоні.

— Я гэта разумею. Дапамогу Полацку.

Міндоўг узяў з сабой лепшую наваградскую сотню, Радмонта з яго сотняй жырмунтаў і лепшую сваю сотню, а таксама 32 дазорных. Дазорные ў гэтым паходзе зрабілі самую цяжкую працу. На дарозе адыходу з горада Торопец яны ўсталявалі шмат хітрых пастак, якія перашкаджаюць пераследу атрада. Князь дазволіў толькі Радмонту ўзяць у палон гарбарнага і кастарэзнага рамеснікаў, з умовой пасяліць у сябе люцічаў разам з імі. Астатнія ваяры забіралі з сабой каштоўны скарб і ўсіх коней. Забівалі толькі мужчын, якія спрабавалі аказаць супраціў. Шмат дамоў, якія стаялі каля дарогі адыходу з горада, падпалілі. Калі апынуліся ў Полацкай зямлі, ваяр Мікола прызнаўся:

— Князь Міндоўг, два лета назад я быў у паходзе на Лівонію разам з нальшанскім князем Ердзівілам і яго чатырма сотнямі ваяроў. Гэта быў самы дрэнны паход для мяне. Атрад Ердзівіла рухаўся, не ведаючы, што наперадзе і што ззаду. Наўгародскі князь Юрый Усеваладавіч паставіў Ердзівіла ахороняць атрад наўгародцаў з Захаду, а сам калі спустошыў паселішча латгалоў, то не папярэдзіў Ердзівіла, каб ён здымаўся з ахороны. Угледзячы небяспеку, Ердзівіл з атрадам ратаваўся ўцёкамі ў Пскоў, а я тады ўцёк у Полацк. З таго паходу я даў сабе зарок, хадзіць у паход толькі з табой, князь.

— Цяпер русінскія князі будуць думаць, што ў Літве толькі такія атрады, як атрад Ердзівіла.

— Не, князь Міндоўг. Яны ведаюць, што ёсць розныя князі.

Вельмі ўразілі Міндоўга хітрыя пасткі, ўсталяваныя на дарозе з горада Торапец ў лесе, па ўказе егера Дзіміна. Пяршае што зрабіў князь Міндоўг, калі вярнуўся ў Воруту так тое, што разам з валхвом Вітаўтам прысвяціў Дзіміна ў рыцары. Дзімін не толькі навучаў дазорных ў Наваградку і ў воруцкім княстве, але і самастойна прыбываў у Жырмунты, Ліду, Слонім і Ваўкавыск, і там навучаў. Князь разумеў, што Дзімін і яго дазорные шмат зрабілі для поспяховасці яго паходаў. Міндоўг заўсёды пасля паходу вылучаў Дзіміну большую, чым іншым, здабычу. У егера быў вялікі дом, як у іншых рыцараў, і ён яго ўпрыгожыў не шкадуючы срэбра. Дзімін ажаніўся на яцвяжцы, і яна таксама, як і Марфа была цяжарная. Цяпер усё звяртаючыся да яго, казалі, рыцар Дзімін. Ён быў вельмі рады і ганарыўся гэтым. Яго жон-

ка нарадзіла сына за дзень да Марфы, і гэтаму ён таксама быў вельмі рады. Марфа таксама нарадзіла хлопчыка, яго назвалі Войшалк. Гэта князь Ізяслаў прапанаваў такую мянушку, хлопчык быў крыклівы. Больш за ўсіх нараджэнню Войшалка радаваўся яго дзед, князь Ізяслаў. Ён на дзевяты дзень угаварыў князя Міндоўга, пагадзіцца з кароткачасовым пераездам Марфы з дзіцем у Наваградак. Калі раніцай ў Воруце з'явіўся гандляр Міхайла, князь зразумеў, што ёсць важкія навіны з поўдня.

Гандляр распавёў, што на поўдні з'явіліся вельмі вялікіе войска стэпавых азіяцка-тартарскіх ваяроў, якіх русіны называюць Ардой. Гэтая Арда напала на зямлі полаўцаў, якія цяпер у міре з русінскімі князямі. Вельмі многія русінскія князі аб'ядналі сваі войскі, каб разам з полаўцамі даць адпор нашэсцю ардынскіх ваяроў. Але ардынцаў было больш, у іх было адзінаначалле, і яны былі больш арганізаваны, чым аб'яднанае русінска-палавецкіе войска. На поўдні, каля ракі Калкі, ардынцы разграмілі аб'яднанае войска. Загінулі дзесяць русінскіх князёў. Загінулі два нашых князя, якіх запыталі русіны ў аб'яднанае войска. Гэта князь Андрэй Іванавіч з Турава і князь Юры Яраполкавіч з Нясвіжа. Князь Данііл Рамановіч, ратуючыся ад пагоні, паранены і без свайго войска вярнуўся ва Уладзімір Валынскі. Ардынцы гналіся за рэшткамі русінскіх войскаў да вялікай ракі Дняпро. Пасля пераможнага балю, ардынцы з вялікім палонам адправіліся на ўсход.

— Гандляр Міхайла, якія плямёны складаюць арду і якія ў іх прапаведнікі?

— Князь Міндоўг, гэта розныя плямёны на усходзе Тартарыі. Гэта качавыя плямёны і ў іх няма прапаведнікаў. У іх ёсць шаманы. Гэта азіяцкія чарадзеі, якія паўтаралымі гукамі прыводзяць сябе ў вельмі ўзбуджаны стан, і ў ім могуць даць сведкі па лячэнні ад хваробы, а таксама па долі чалавека. У адным з самых ваяўнічых плямёнаў тартар монголаў лет трыццаць пяць таму вылучыўся ваявода па мянушцы Тэмуджін. Ён здолеў арганізаваць баявы атрад з лютым сваім кіраўніцтвам. Заваяваўшы ўсе суседнія плямёны, ён утварыў ваенную дзяржаву, стаўшы яе ханам. Змяшаўшы плямёны і роды, Тэмуджін усё насельніцтва падзяліў на сотні і тысячы. Ён прызначыў вая-

водамі сваіх здольных людзей. Усе дарослыя і здаровыя мужчыны былі ваярамі, якія ў мірны час займаліся сваёй гаспадаркай, а ў ваенны браліся за зброю. У іх з дзяцінства хлопчыкаў выхоўвалі ваярамі, добрымі вершнікамі. Яны трапна стралялі з лука на скаку, спрытна ўправляліся з арканамі. Тэмуджін пасля многіх перамог, семнаццаць лет таму абвешчан Вялікім ханам, Чынгісханам. Потым за чатыры лета ён заваяваў суседніе лясныя зямлі тартараў. Дзесяць лет таму заваяваў паўночную частку Кітая да мора. Пяць лет таму, атрады цемнікоў Чынгісхана заваявалі Семірэчча і Усходні Туркестан. Чатыры лета таму яны напалі на вялікую развітую дзяржаву ў Сярэдняй Азіі, Харэзмшахаў. Гэтай вясной ардынцы заваявалі вялікую частку гэтай дзяржавы да Хваліського (Хазарскае, сучасная назва Каспійскае) мора. Апошні з Хорезмшахаў Джэлал ад-Дын Манкбурны хаваецца на нейкім востраве.

— Міхайла, ты казаў, што ў ардынцаў вельмі вялікае войска, гэта колькі?

— Князь, гэта дзясяткі тысяч, па іхняму, тумены.

— Адкуль у іх такая вялікая колькасць ваяроў?

— Князь, калі яны захопліваюць зямлі, яны забіваюць толькі тых хто супраціўляецца, а калі супраціву няма, то яны не чапаюць нікога, нават мясцовых прапаведнікаў, ведаючы іх сілу на мясцовых жыхароў. Яны апекаваюць любым мясцовым прапаведнікам. Ардынцы ўсталёўваюць даніну і ўмову ўсіх захопленым паселішчам, па першаму закліку Чынгісхана, высылаць вызначаную колькасць ваяроў. Нават вялікія кітайскія гарады, гледзячы на вялікае войска Чынгізхана і ведаючы яго патрэбованні, здаваліся без бою і згаджаліся на яго умовы. Калі хто-то не выконваў умовы, то іх люта каралі. Таму ў яго войсках шмат ваяроў самых розных плямёнаў і самых розных вераванняў. Да русінскіх князёў таксама прыбылі ардынскія паслы з прапановой не аб'ядноўвацца з полаўцамі. Ардынскія паслы казалі, што гэты паход не на русінскія зямлі, а толькі на палавецкія. Выслухаўшы ардынскіх паслоў, русінскія князі ўказалі забіць іх, а для Чынгісхана гэта азначае, што русінаў трэба караць.

— Але калі яны цалкам разграмілі русінскіх ваяроў на Калке, то чаму яны не пайшлі на багатыя русінскія гарады?

— У гэтае лета яны вельмі шмат захапілі, а бою з русінамі яны не хацелі, але забойства паслоў іх прымусіла напасці на аб'яднанае войска. Калі ардынцы наладзяць нагляд за захопленымі зямлямі, яны вярнуцца караць далей.

— Добра, Міхайла. Я зразумеў цябе. Дзякуй.

Узімку князь Міндоўг пабываў ва ўсіх гарадах і вялікіх паселішчах наваградскага княства, а таксама ў княствах з якімі мел дамовы аб міры і ўзаемадапамогі. Мэтай гэтых паездак было не толькі пераканаць князёў і намеснікаў будаваць дадатковыя перашкоды для захопнікаў, але і пераканаць іх у тым, што толькі ён, князь Міндоўг больш за ўсіх ведае і клапаціцца за абараназдольнасць саюзных княстваў. Будучы ў Гародні, Міндоўг распавёў князю Жывінбуду і княжычу Жыгімонту, што з поўдня можа з'явіцца захопнік больш моцны, чым русінскія князі, таму цяпер важней ўмацоўваць абараназдольнасць, чым нападаць на мазурскіх лацінскіх хрысціян.

У новае 6732 лета (1224 па хрысціянскім календары) князь Міндоўг вырашыў сканцэнтравацца на будаўніцтве дадатковых перашкод для захопнікаў. Ля падножжа ўзвышшаў на якіх стаялі замкі, ён указаў вырыць глыбокія равы, а вырутую зямлю кідаць на вал перад ровам, і ўсталёўваць хутка прыбіраемыя масткі ад рова. У лясных сцежках, якія вядуць да горада ці да вялікага паселішча, ладзіць пасткі для захопнікаў. Радмонт, як і абецал, павялічыў пасялішча жырмунтаў люцічамі. Князь Выкінт таксама прыняў шэсць сем'яў люцічаў, якія прыйшлі разам з гандляром Чорнавілам ўздоўж ракі Нёман.

Восенью прыбыў полацкі ваяр Мікола з віцебскім ваярам да князя Міндоўга. Мікола паведаміў,што віцебскаму княству вельмі перашкаджае гандляваць з Ноўгарадам і нарманамі ваяры Русы(сучасная назва Старая Руса), якія знаходзяцца перад возерам Ільмень. Віцебскі ваяр Пятро расказаў:

— Князь Міндоўг, сам я з Усвяч (Усвят, сучаснае назва Усвяты). У мяне родзічы даўно гандлююць з Ноўгарадам і з нарманамі. Мы добра гандлюем з жыхарамі Лук (сучасная назва Вялікія Лукі), але калі вяртаемся з Ноўгарада або ад нарманаў, то нашых гандляроў рабуюць і забіваюць атрады пасадніка Русы Фёдара, асабліва лютуюць атрады пад камандай Дамажыра і Богшю. Нам

вельмі важна знішчыць усіх ваяроў Русы, але так, каб жыхары ведалі, што гэта зрабіла Літва, а не Віцебскае і Полацкае княства таму, што мы далей хочам гандляваць у тым напрамку. Калі мы дамовімся, то вось наш падарунак. Пятро выклаў на стол пяць тугіх кошаляў срэбрянных манет.

— Наўгародскія і іншыя паўночныя русінскія ваяры змагаліся з Ардой?

— Не, князь. Толькі паўднёвыя русінскія ваяры змагаліся.

— Хто нас туды павядзе?

— Мы абодва, князь.

— Добра, згоден. Праз тры дні выступаем.

Мікола застаўся ў Воруце, а Пятро адправіўся дамаўляцца з ахаронным атрадам. У гэтым паходзе князь Міндоўг чакаў сутычку з ваярамі Русы, значыць, будуць страты ў сваім атрадзе, таму ён не ўзяў у паход ваяроў Наваградка, каб не губляць веру іх у ўдачлівасць і сілу Міндоўга. Князь узяў з сабой рыцараў і збраяносцаў, дзве сотні ваяроў сваіх паселішчаў і сотню жырмунтаў а таксама дваццаць два дазорнага. Больш нельга было браць, таму што начлегаў на русінскай зямлі чакалася не менш за два.

Ваяр Пятро далучыўся да атрада на поўначы полацкай зямлі, адкуль быў самы кароткі шлях да Русы. Віцебскі ваяр правёў атрад у баку ад русінскіх паселішчаў. Пасля першага начлегу на русінскай зямлі, атрад прасоўваўся ўздоўж ракі Палісці, якая вядзе ў горад. Да князя наблізіўся Дзімін і паведаміў, што наперадзе на гэтай рацэ заўважылі лодку, ў якой весляры жвава веславалі ўніз па плыні да горада, магчыма яны заўважылі дазорных атрада. Ваяр Пятро распавёў, што атрад знаходзіцца ў пятнаццаці верстах да горада. Руса знаходзіцца ў зліцці маленькай ракі Руса ў раку Палісці. У адной вярсце ад горада на рацэ Руса ёсць мост. Горад Руса абгароджаны невысокай драўлянай сцяной, і да лесу адна верста.

Міндоўг указаў дазорным, хутчэй заняць назіральныя пазіцыі ля краю лесу, а да дазорцы, назіралым за мостам, ён накіраваў дзесяць лучнікаў. Калі атрад наблізіўся да канца лесу перад горадам, дазорный паведаміў, што з брамы горада з'явіліся ваяры русін. Князь даў выйсці з горада ўсяму войску, а сам высунуў з

лесу толькі сотню лёгкай конніцы. Лёгкая конніца наметам панеслася насустрач русінам, першымі пачалі стрэлкі з лука, потым коннікі сталі кідаць дроцікі. Калі русіны пачалі ахопліваць лёгкую конніцу з флангаў ўздоўж рэк, Міндоўг высунуў з лесу дзве сотні цяжкіх коннікаў. Першыя шэрагі цяжкіх коннікаў накіраваліся ўслед за лёгкімі вершнікамі і паступова падзялілі цэнтр русінаў. Наступныя шэрагі накіраваліся бліжэй да ракі, адціскаючы да яе русінаў. Калі ваяры Міндоўга цалкам вызвалілі цэнтр, лёгкія коннікі накіраваліся да брамы, не даючы замкнуць горад.

Русіны гледзячы на заваяваную браму праціўнікам, спрабавалі выратавацца пераплыўшы раку, а некаторыя спрабавалі прабіцца ў лес. За такімі ўцекачамі сачылі збраяносцы і стралкі. Русінскіх ваяроў не шкадавалі, а ў гараджан адымалі іх скарб і коней. Абрабаваўшы горад і сабраўшы зброю з даспехамі, атрад Міндоўга да вечара адправіўся ў зваротны шлях.

Ваяр Пятро паведаміў князю, што паселішчаў да возера Ільмень няма, і пагоня можа з'явіцца толькі ад Ноўгарада, і ганцы з Русы дабяруцца туды толькі заўтра. Але Міндоўг указаў спыніцца на начлег толькі апоўначы, выставіўшы частазменяемые варты. З раніцы злёгку паснедаўшы, атрад працягнуў шлях на поўдзень. Наступны начлег быў яшчэ на русінскай зямлі.

У Воруту атрад прыбыў у сярэдзіне дня. У гэтым паходзе ў двух сотнях Міндоўга было чацвёра параненых, а ў сотні жырмунтаў тры ваяры атрымалі лёгкае раненне. Полацкі ваяр Мікола і віцебскі ваяр Пятро былі вельмі задаволеныя гэтым паходам. Князь быў задаволены сваімі збраяносцамі, яны былі адважнымі і ўмелымі ваярамі.

Да зімы будаўнікі будавалі больш унутры замка. Пабудавалі яшчэ адзін доўгі дом для збраяносцаў, а таксама да сцяны замка знутры пабудавалі склады з лесвіцамі наверх для нагляду на верху сцяны.

Прайшло сем дзён, як наступіла вясна і новае 6733 лета (1225 па хрысціянскім календары), і з'явіўся ў Воруце полацкі ваяр Мікола. Князь Міндоўг пры яго з'яўленні чакаў просьбы аб наступе на Лівонію, або на русінаў, але ад яго паступіла нечаканая просьба.

— Князь Міндоўг, сорак пяць дзён таму памерла ў Полацку мая маці, цяпер мяне там нічога не ўтрымлівае, і я памятаючы тваю прапанаву, князь, вырашыў перасяліцца да цябе.

— Добра Мікола, я рады твайму рашэнню. Мне патрэбны такіе досведчаные ваяры, як ты.

— Князь Міндоўг, у мяне да цябе вельмі важная просьба. Дазволь мне ажаніцца на Вользе.

Міндоўг пасля нараджэння сына вельмі радаваўся яго поспехам, і гэта перанеслася на яго адносіны з Марфай. Сустрэчы і мілаванні з Вольгай сталі рэдкімі. Яе найстарэйшая сяброўка Ванда ўсё ж такі нарадзіла сына ад Альгерда, і Вользе таксама хацелася нарадзіць. Усё гэта цяпер абдумваючы, князь спытаў:

— Мікола, а ты з ёй казаў пра гэта?

— Князь, мінулай восенью перад паходам я добра пагаварыў з ёй, але пра гэта не казаў. Перш чакаю дазволу ад цябе, князь.

— Добра, Мікола. Пагавары з Вольгай, калі яна сгодна на тваю прапанаву, то я даю дазвол.

— Дзякуй, князь Міндоўг. Буду старанна служыць цябе, князь.

Гледзячы на радасны твар сыходзіўшага ваяра, Міндоўг быў задаволен сваім рашэннем. Мікола быў добрым ваярам, будзе добрым мужам для Вольгі. Вяселле Міколы і Вольгі адбылося праз дзевяць дзён. А яшчэ праз дванаццаць дзён у Воруту прыбыў сябра полацкага ваяра Міколы. Ён паведаміў князю, што русінскія князі вырашылі адпомсціць Літве, за восеньскі паход на Русу і яны цяпер падыходзяць да полацкіх зямель. Міндоўг паслаў ганца ў паселішча Ліда з указам, каб сотнік Паганяйла са сваімі ваярамі быў заўтра ўвечары ў Нальшанах у князя Ердзівіла. Туды ж накіраваў ваяра Міколу з яго сябрам. А з трыма сотнямі сваіх ваяроў ранняй раніцай таксама адправіўся ў Нальшаны. Па шляху ў Нальшаны, Міндоўг прыбыў у Жыжмы да свайго старэйшага брата Доўспрунку, і ўзяў з сабой у паход адну сотню пад кіраваннем яго збраяносца Кантегерда.

Каля поўначы атрад Міндоўга прыбыў у Нальшаны, там ужо знаходзілася сотня Паганяйла. Князь Ердзівіл чакаў Міндоўга, ён паведаміў, што па звестках дазорных, русінскі вялікі атрад размясціўся на начлег у дзесяці верстах на ўсход ад Крэва. У за-

мак Крэва, князь Ердзівіл накіраваў апоўдні сотню з селішча Лужышча, і разам з ёй ў Крэва знаходзіцца тры сотні ваяроў. Тут у Нальшанах у яго чатыры сотні ваяроў. Нальшанскі князь чакаў парады ад князя Міндоўга.

— Князь Ердзівіл, цяпер я пашлю сваіх дзесяць дазорных на чале з рыцарам Дзімінам, а таксама чатыры тваіх дазорных ў наваколлі Крэва. А з самай раніцы я з пяццю сотнямі і ты князь з чатырма сотнямі пойдзем у Крэва. У сам замак зойдзеш ты, князь, са сваімі ахоронцамі, а я і твае чатыры сотні будзем дзейнічаць па звестках дазорных. Калі спатрэбіцца дапамога з замка я прышлю да цябе твайго ганца.

— Добра, князь Міндоўг. Раніцай сумесны атрад з Міндоўгам і Ердзівілам накіраваўся ў Крэва. Рыцар Дзімін паведаміў, што ў русінаў вялікае войска, каля тысячы ваяроў пад кіраваннем двух князёў, рыхтуецца атакаваць замак Крэва. Першым падышоў да Крэва атрад Міндоўга. Князь Ердзівіл са сваімі ахоронцамі ўвайшоў у замак і пакінуў браму адкрытай. Дзве сотні нальшанскіх ваяроў з дзесяццю дазорнымі, Міндоўг накіраваў правей замка ў засаду. Сотню лёгкай конніцы і сотню лідскіх ваяроў, князь размясціў перад брамай замка. Дзве сотні нальшанскіх ваяроў і сотню брата Доўспрунка з дазорным, Міндоўг паслаў у абыход з левага боку. А сам з двума сотнямі цяжкай конніцы размясціўся ў лесе за сваёй лёгкай конніцай.

Дазорцы Акуш і Румбовд прывялі да Міндоўга палоннага дазорнага русін. Русін распавёў, што іх аб'яднаны атрад прыйшоў сюды адпомсціць Літве за восеньскі паход на Русу. Атрадам камандуюць суздальскі князь Яраслаў Усеваладавіч і торапецкі князь Давыд, галоўны з іх суздальскі князь. У атрадзе дзесяць сотняў ваяроў, усе коннікі. Засад яны не чакаюць, князі ўпэўнены ў сваей калькаснай перавагі ваяроў.

Калі русіны падышлі да замка, асноўны іх атрад падрыхтаваўся да атакі на лёгкую конніцу Літвы, а левы фланг русінаў стаў абыходзіць замак з мэтай ўзяць яго ў аблогу. Лёгкая конніца атакавала русін лучнікамі і кідальнікамі дроцікаў. А флангавых русін абсыпалі градам стрэл з замка. Цяжкая конніца Міндоўга атакавала, калі лёгкая конніца стала ўцякаць ад русін, і адцягнула большую частку русінскіх ваяроў ад брамы замка.

У гэты час з брамы выйшлі тры сотні вершнікаў і напалі на русін. Калі ўступіла ў бой цяжкая конніца з Міндоўгам і яго рыцарамі, раптоўна засадныя сотні Літвы напалі на сустрэчных русін. У пагоні за літоўскай лёгкай конніцай ў русінскіх коннікаў лучнікаў не было, былі толькі ваяры з мечамі. Гэта тое, што задумваў Міндоўг, і ўзначаліўшы цяжкую конніцу, ён быў ў прадчуванні радасці бітвы.

Яго Імклівы, ўчуўшы жаданне гаспадара, кідаўся ў самую гушчу іншых коней, як быццам у яго асабісто ёсць жаданне даказаць усім, што ён самы моцны конь. Скачуўшые за ім, рыцары ледзь паспявалі. Пасля таго, як доўгія дзіды ліцьвінскіх цяжкіх коннікаў ўтыкаліся ў коней русін, даставаліся мечы і пачалася лютая рубка. У гэтай рубцы Міндоўгу было дастаткава нанесці адзін удар мечом па русіну, каб яго абясшкодзіць. У бітвах з рыцарамі каля Драгічына, патрэбно было два і нават тры ўдары, але тады не было такой цеснаты, а тут патрэбно было паспяваць пасля ўдару з аднаго боку хутка перамясціцца і ўдарыць з другога.

Чырвоны плашч князя Міндоўга прыцягваў русінскіх ваяроў, і князь з ахвотай карыстаўся сваім мечом. У левай руцэ князя быў шчыт, у правай руцэ меч, таму Імклівы сам шукаў коня з жывым русінскім вершнікам. Аглядая поле боя з дазорнай вышкі замка, князь Ердзівіл быў упэўненный ў перамозе войска князя Міндоўга. Аб гэтым ён запэўніў Міндоўга пасля бою. Асабісто ён добра адгукаўся пра самога князя, яго рыцарах і пра яго збраяносцах. Міндоўг сказаў, што ён не сумняваўся ў умеласці і адвагі яго рыцараў і збраяносцаў, а потым дадаў, што калі вернемся ў Воруту, ён разам з валхвом Вітаўтам прысвяціць усіх семярых збраяносцаў ў рыцары. Гэта пачулі збраяносцы князя Доўспрунка, і трое з іх падышлі да Міндоўга, і прасілі яго ўзяць іх да сябе, таму што яны былі збраяносцамі князя Рынгольда. Сярод гэтых траіх збраяносцаў не было Кантегерда. Чуйка Міндоўга падказала яму, што гэтыя трое незадаволеныя старэйшым братам Доўспрунком, і таму ён сказаў што забярэ іх да сябе ў Воруту.

Падышлі ваяр Мікола і яго полацкі сябра Копысь і паведамілі, што сярод забітых торапецкі князь Давыд, а суздальскі князь Яраслаў Усеваладавіч са сваёй аховай ўцёк. Князь Ердзівіл пра-

панаваў Міндоўгу адправіцца ў Нальшаны на ўрачыстую трапезу ў гонар перамогі і па забітым ліцвінскім ваярам, ён ужо паслаў туды ганца, каб рыхтавалі трапезу. Большая частка здабычы ў зброі, даспехах і конях дасталася чатыром сотням князя Міндоўга. У гэтай здабычы было ўсё, што ад забітага тарапецкага князя Давыда. У трох сотнях воруцкіх ваяроў было чацвёра забітых і шасцёра параненых. У лідскай сотні было двое забітых і чацвёра параненых. Урачыстая трапеза была вельмі шчодрай і сытнай. На наступны дзень праязджаючы праз Жыжмы, князь Міндоўг паведаміў старэйшаму брату Доўспрунку, што па просьбе трох яго збраяносцаў, ён забірае іх да сябе ў Воруту. Старэйшы брат быў вельмі незадаволены гэтым, але супраціўляцца не стаў.

Прыбыўшы ў сваё княства, Міндоўг адразу шчодра узнагарадзіў сям'і загіблых. Волхв Вітаўт разам з князем прысвяцілі ў рыцары семярых збраяносцаў, а для трох прыбыўшых новых збраяносцаў пабудавалі новы доўгі дом, і неўзабаве да іх далучылі пяць маладых вучняў збраяносцаў. Пасля бітвы ў Крэве, Міндоўг задумаўся аб павялічэнні сваіх паселішчаў на ўсходзе. Пасля таго, як яго сястра Альгута адмовіла менскаму княжычу, ён не быў упэўнены ў захаванні дамовы аб міры і ўзаемадапамогі з менскім князем.

Міндоўг пагаварыў з князем Ізяслаўам і яны вырашылі будаваць замак на высокім беразе ракі Нёман. На ўсход ад Нёмана была пушча, заходняя частка якой была ў валоданні наваградскага князя. Князь Ізяслаў запэўніў Міндоўга ў дапамогі будаўнікамі і будаўнічымі матэрыяламі. З усіх сваіх рыцараў, якім ён бы даверыў будаўніцтва замка і арганізацыю ваярскіх спраў, Міндоўг абраў Стрыгівіла. Ён яму растлумачыў што будаўніцтва замка гэта ўтварэнне новага княства, таму што побач з будучым замкам, вышэй па рацэ Нёман ёсць самае ўсходняе паселішча наваградскай зямлі з назвай Купны (сучасная назва Купіск) і яно будзе яму падуладна. Рыцар Стрыгівіл быў вельмі ўсхваляваны, і запэўніў, што будзе верны яму і зробіць усё патрэбное князю. Раніцай прыбыў з Наваградка егер Сірвід, ён добра ведаў тыя месціны, шмат палюючы ў пушчы з князем Ізяславам. Князь Міндоўг, узяўшы з сабой рыцара Стрыгівіла, ганца Песціла і

шасцярых цесляроў, адправіліся на ўсход. Праз васямнаццаць вёрст яны прыбылі на высокі левы бераг ракі Нёман. Гэта было добрае месца для будаўніцтва замка. З боку ракі быў высокі круты бераг, з другога боку вялікай пляцоўкі быў глыбокі роў. Князь патлумачыў цeслярам, што па ўсім краі пляцоўкі трэба паставіць драўляныя сцены. У той частцы, што ля стромкага берага ракі, трэба паставіць княскі церам, а побач з ім доўгія дамы. У процілеглай частцы трэба паставіць мост праз роў і адразу за ім каменную браму замка.

Цесляры прыступілі да працы, а Міндоўг, Стрыгівіл, Сірвід і Песціла накіраваліся на поўдзень у паселішча Купны. Яно знаходзілася ў чатырох верстах на левым беразе ракі Нёман. У паселішчы было дваццаць чатыры дамы, яго валосціцель Юрла паведаміў, што ў іх дваццаць шэсць ваяроў, чатыры цесляры, астатнія земляробы і рыбакі. Ваяры працуюць у полі, разводзяць коней і нават майструюць рыбацкія лодкі. Паселішча не было абгароджана, але на самым высокім месцы была пабудавана дазорная вышка, што вельмі спадабалася Міндоўгу. Сірвід паведаміў валосціцелю Юрле, што князь Ізяслаў перадаў паселішча рыцару Стрыгівілу, і побач будуецца яго замак, і даніну восенню перадаваць яму. Рыцар Стрыгівіл паведаміў, што жонку Любчу з сынам ён пакуль пакідае ў Воруце, а заўтра з раніцы забірае чатырох цесляроў на будоўлю замка.

Вяртаўся князь Міндоўг разам з егерам Сірвідам. Было бачна, што егер прагнуў быць ганцом Стрыгівіла да князя Ізяслава з просьбамі аб дапамогі ў будаўніцтве, але Міндоўг вырашыў, што ўсе просьбы аб будаўніцтве будуць паступаць да яго ад свайго ганца Песціла. На наступны дзень прыбыў у Воруту ганец Песціла, патрэбна дапамога ў каменным мураванні брамы замка. Міндоўга зацікавіла навіна, што Стрыгівіл прыцягнуў ваяроў да будаўніцтва калодзежа і лазні. Князь Ізяслаў быў задаволены, што Міндоўг звярнуўся да яго з просьбай аб дапамогі ў каменнай кладкі мура. Ён прыцягнуў да гэтай працы больш майстраў, чым прасіў Міндоўг. Разгадка гэтаму высветлілася тут жа. Князь Ізяслаў прасіў адпусціць Марфу з сынам да канца лета ў Наваградак. Міндоўг гэтаму не пярэчыў, ён ведаў, што з гэтым будаўніцтвам ён яшчэ шмат будзе прасіць дапамогі, і тады

будзе наведваць сына. Князь Міндоўг яшчэ дадаткова паслаў да Стрыгівіла па адным цесляру з кожнага свайго паселішча. У пачатку восені Міндоўг наведаў будуючыся замак Стрыгівіла. Акрамя доўгага дома з двума печкамі, пабудавалі чатыры дамы для маладых ваяроў, якія пажадалі ўжо цяпер перасяліцца ў замак. У цераме быў гатовы першый паверх, алё печка была высокай, Стрыгівіл стараўся зрабіць другі паверх да першага снегу. У другой палове восені перад памінкамі Дзяды, Міндоўг з валхвом Вітаўтам абышлі сям'і загіблых у бітве ля Крэва. Яны прынеслі пшаніцу, проса, ялавічыню і мёд, для падрыхтоўцы традыцыйных абрадавых страў.

У Міндоўга ў цераме перад Дзядамі чыста прыбіраліся, мыліся ў лазне і пакінулі кадку чыстай вады, а таксама новы венік для душы князя Рынгольда. На ўрачыстую памінальную вячэру было прыгатавана дзевяць страў. Гэта розныя куцці, крупнік з грыбамі і рыбай, кіслая капуста з розным мясам, клёцкі і медавуха. Перад вячэрай ўсе дзверы адчынілі, каб дух князя Рынгольда змог зайсці і сесці за стол. А перад тым, як прыступіць да чарговай стравы, частку яго адкладалі ў асаблівую міску для духу. А таксама налівалі медавухі ў асабістую чару. У час вячэры Міндоўг узгадваў важныя думкі таты, якія ён яму часта казаў. Пасля заходу сонца Міндоўг з сям'ёй і служкамі падышлі да магілы князя Рынгольда, развялі вогнішчэ і пры ягонам свеце абклалі магілу дробнымі камянямі, і абмялі яе ад лісця. Венік пакінулі ля магілы. Апоўначы ўсе сышлі, а запаленыя вогнішча пакінулі.

У сярэдзіне зімы ў Воруту прыбыў сябра Міколы полацкі ваяр Копысь. Ён паведаміў Міндоўгу, што атрад у пяць сотняў ваяроў нальшанскага князя Ердзівіла прайшоў праз полацкія зямлі на русін. Князь шчодра падзякаваў Копыся за весці і сказаў яму, што чакае яго са звесткамі па заканчэнні гэтага паходу. Разважаючы над гэтай навінай, Міндоўг прыйшоў да думкі, што Ердзівіл паверыў у абескроўленнасць русінаў пасля разгрому іх тысячнага атрада ў Крэво. Таму ён вырашыў пайсці ў рабаўніцкі паход на русін, не асцярогаючыся супраціву з іх боку. Князь з нецярпеннем чакаў новых вестак. Праз адзінаццаць дзён Копысь знова з'явіўся ў Воруце.

Полацкі ваяр паведаміў, што нальшанскія ваяры вярталіся не адзіным атрадам, а малымі гуртамі, што сведчаць аб іх уцёках. Некаторыя ваяры былі з запасным конём, нагружаным скарбам, а іншыя ваяры былі на кані без скарбу. Сам князь Ердзівіл вярнуўся.

Калькасць ваяроў па думцы Копыся зменшылась. Падзякаваўшы Копыся, Міндоўг адправіўся ў Наваградак да гандляра Чорнавілу. Ён успомніў, што Чорнавіл не толькі тата князя Ердзівіла, але і дзед старэйшага ўнука Яргайла, у якога дом у Наваградке і ён быў сярод ахоронцаў таты ў Крэво. Гандляр Чорновіл быў рады з'яўленню Міндоўга ў яго:

— Добры дзень, князь Міндоўг. Рады падзяліцца з табой добрай весткай. Мая дачка Янька нарадзіла сына.

— Віншую, гандляр Чорнавіл. Пашыраецца сям'я княжычамі. Акрамя княжычаў Яргайла і Сенгайла ў Нальшанах, цяпер яшчэ княжыч у Слоніме.

— Так, князь. Толькі малодшы сын Волімунт не жадае быць князем, яму больш па душы гандлярства і кнігі, як яго дзядзьку Міхайла.

— Таксама добра. А даўно бачыў Яргайла?

Гандляр пачуў нядобрае і асцярожна сказаў:

— Быў на Калядах, а потым вярнуўся ў Нальшаны. Князь, ёсць весткі пра яго?

— Весток пра яго ў мяне нема, але ёсць весткі, што нальшанскі атрад князя Ердзівіла ў пяць сотняў ваяроў пятнаццаць дзён таму пайшоў паходам на русін. Учора мне паведамілі, што атрад з князем Ердзівілом вярнуўся не адзіным суцэльным атрадам, а зменшаным лікам. Бачу, што гэтыя весткі ў навіну.

— Так, князь. Дзякуй за весткі, якія яны б не былі. Зараз пашлю ганца ў Нальшаны, да сына. Калі вернецца, пашлю яго да цябе, князь.

— А Міхайла яшчэ не вярнуўся з поўдня?

— Яшчэ рана, князь Міндоўг. Дзён праз дваццаць чакаем яго.

— Гандляр Чорнавіл, вясной на зваротным шляху ў вусце ракі Нёман, запрасіце да нас дваццаць ваяроў люцічаў. Гэтым летам скончым будаўніцтва замка на ўсходнім беразе Нёмана. Ваяры нам будуць патрэбны.

— Добра, князь Міндоўг, запрашу люцічаў.

Шэсць дзён чакаў Міндоўг ганца ад Чорнавіла, а на сёмы накіраваўся ў Наваградак да князя Ізяслава і гандляра Чорнавілу. Убачыўшы гандляра, Міндоўг зразумеў, што весткі кепскія. Чорнавіл распавёў, што з чатырма нальшанскімі сотнямі ваяроў была і адна сотня князя Доўспрунка. Атрад Ердзівіла пасля таго, як абрабаваў торапецкую воласць і Таржок, вяртаўся са скарбом, і пад Усвячом іх нагнаў вялікі русінскі атрад, многія нашы ваяры не здолелі перабудавацца і сталі ўцякаць. Яргайла не вярнуўся. Ніхто не ведае яго забілі або ўзялі ў палон.

— Чорнавіл, што вы намерваецесь рабіць?

— Мне ўчора пра гэта сказаў ганец. Я разгублены і не ведаю, што рабіць. Можа ты, князь, ведаеш?

— Па пяршае трэба высветліць, што з Яргайлам сталася. Калі вы з Ердзівілом не ведаеце, як гэта зрабіць, я дапамогу.

— Дапамогі, князь Міндоўг. Буду вельмі ўдзячны цябе, князь.

— Добра. Сёння я буду займацца гэтым. Міндоўг наведаў князя Ізяслава. Распавёў яму пра няўдалы паход князя Ердзівіла, і падзяліўся думкай, што цяпер не трэба азлобляць русінаў рабаўнічымі паходамі, для іх і так было аслабленне ад цяжкай паразы на Калке ад Арды. Калі яны моцна аслабнуць, то лацінскія рыцары лёгка іх захопяць. Таксама распавёў, што яго рыцары Доўбуд і Скірмунт хочуць, як і Стрыгівіл пабудаваць свае замкі. Мая прапанова пабудаваць замак на паўночным усходзе перад нальшанскім княствам. Пасля гэтага паходу, Ердзівіл аслабеў, а замак у тых мясцінах ўмацуе ўпыйненасць князя Доўспрунка і абароніць яго ад магчымасці паходу русін.

— Князь, ёсць у мяне там маленькае паселішча люцічаў Эйгерда (сучасная назва Эйгерды). Але гэта далёка, амаль пяцьдзесят вёрст. Яшчэ не скончылі будаваць замак Стрыгівілу.

— Князь Ізяслаў, пакуль не скончым замак Стрыгівілу, іншы будаваць не будзем, але нам трэба будаваць замкі на важных напрамках.

— Князь Міндоўг, а чаму б нам не захапіць жамойцкія зямлі, блізкія да нальшанскай і нашых зямель.

— Князь Ізяслаў, захоп многіх іх зямель зробіць іх варогамі нам. Князь Выкінт вельмі асцярожна адносіцца да жамойтаў. Ён

паказвае ім, што ліцвіны ў адрозненне ад прусаў Рушковічаў і Булевічаў, прыйшлі на гэтыя землі для ўзмоцненне іх добрабыту і абараназдольнасці. Прычым са згоды іх валхва, які для іх самые галоўны. Калі Выкінт прывёз каваля і ганчара ў паселішча і запрашаў жамойтаў навучыцца ў іх, то волхв сказаў, што гэта забаронено. Волхв назваў каваля і ганчара ведзьмакамі, якія вядзьмарствам ператвараюць асобныя кавалкі жалеза і гліны ў мячы і збаны. Іх валхвы, ў адрозненне ад нашых, не разумеюць гэтых ператварэнняў. Князь Выкінт не абвастрае адносіны з валхвом. Ён прыняў збеглых люцічаў, а тыя добра працуюць з яго збраяносцамі. У іх, а таксама ў тых жамойтаў, якія добра працуюць з збраяносцамі, добрыя дамы, добры посуд і агулам добрабыт. Жамойты усё гэта бачаць і па раўноўваюць словы валхва і князя. Да Выкінта прыходзяць жамойты з іншых паселішчаў у якіх Рушковічы і Булевічы. Яны таксама добра працуюць ў яго, і ён ім будуе дамы. Калі такіх працаўнікоў князя будзе большасць, тады і волхв будзе з гэтай большасцю. І мы будзем упэйнены, што гэта княства заўседы будзе з Літвой. А калі мы захопім шмат іх паселішчаў, то не паспеем наладзіць іх добрабыт, і ў нас не будзе ўпэўненасці, што яны з намі. А ў такой ліхі час, вельмі важна каб унутры нас была згода, каб мы былі ўпэўнены ў сваіх сябрах. Калі гэтага не будзе, то гэта горш усякага знешняга ворага. Калі мы ўнутры адзіныя, то многакалькастные рыцары і іншыя ворагі могуць нас перамагчы ў адной або ў двух бітвах, але пройдзе кароткі час і мы абовязкова іх пераможам, прычым вельмі моцна.

— Я з табой, князь Міндоўг, цалкам згодзен.

Прыбыўшы ў Воруту, Міндоўг выклікаў Міколу і растлумачыў, што яму трэба высветліць з полацкім і віцебскім сябрамі. Мікола ўзяўшы ад князя тугі кашалёк з срэбрянымі манетамі, і развітаўшыся з цяжарнай Вольгай, накіраваўся на ўсход. На другі дзень вясны і новага 6734 лета (1226 па хрысціянскім календары) вярнуўся з поўдня гандляр Міхайла. Пры сустрэчы з князем Міндоўгам ён распавёў, што князь Данііл Рамановіч у саюзе з князем ляхаў Ляшко ваюе супраць свайго цесця князя Мсціслава Удалога за Галіч, які лічыць сваім спадчынным правам па тату. У гэтую сварку ўстрэвае бельзскі князь Аляксандр

Усевалодавіч, які раней прэтэндаваў на валынскую зямлю. Ён запэўніў Мсціслава Удалога, што Данііл Рамановіч мае намер забіць яго, а цяпер дапамогае ваярамі Мсціславу Удалому. Міндоўг вельмі здзівіўся таму, што пасля цяжкага паражэнне ад Арды на Калке, паўднёвыя русіны не аб'ядноўваюцца, а збіраюць астатніх ваяроў і імкнуцца да проціборства між сабой.

Прыбылі ў Воруту Мікола і віцебскі ваяр Пятро. Князь разам з віцебскім ваяром накіраваліся ў Наваградак да гандляра Чорнавіла. Пятро распавёў, што Яргайло знаходзіцца ў палоне русінаў, у Торжку, за яго патрабуюць дзве сотні срэбраных манет. Адразу пасля гэтага гандляр Чорнавіл разам з віцебскім ваяром накіраваліся ў Нальшаны да Ердзівілу.

Князь Міндоўг дамовіўся з князем Ізяславам аб тым, што вялікая колькасць цесляроў Наваградка і паселішчаў скончаць будаўніцтва замка Стрыгівіла і пачнут будаўніцтва замка рыцару Доўбуду, а князёўна Марфа і Войшалк з сярэдзіны вясны да пачатку восені будуць у Наваградку. Князю Ізяславу было нязвыкла самотна ў Вялікім замку і да яго часта стаў прыходзіць прапаведнік канстанцінопальскага хрысціянства. Міндоўг часта бываў у Наваградку не толькі з-за таго, што наведваў сына, а і па гаспадарчых справах. Князь Ізяслаў ужо даўно перадаў вайсковыя справы Міндоўгу, а цяпер паступова і гаспадарчыя справы пераходзяць да яго. Калі Міндоўг замаўляе дзіды, дроцікі, кальчугі, стрэлы майстрам Наваградка, ўсе ведаюць, што гэтая праца будзе ўлічана ў даніну князю Ізяславу. Узоры новых кальчуг, мячоў і шлемаў майстры Наваградка і іншых паселішчаў княства пераймалі ў майстраў Воруты.

Пасля бітвы ў цесніне коней у Крэва, Міндоўг успомніў села Тума і яго аповяд пра тое, як яго параніў шчытом рыцар. Паводле яго ўказу шчыты для вершнікаў акантавалі жалезнымі пласцінамі, і князь стаў развучваць рухі шчытом такія, каб абараніўшыся ад удару, адразу атакаваць ім. Калі ён дасканала вывучыўся гэтым рухам, Міндоўг стаў навучаць ім рыцараў і збраяносцаў, а тыя сталі навучаць ваяроў. Такі шчыт быў узорам вырабу шчытоў для ўсіх цяжкіх коннікаў, ва ўсіх гарадах і паселішчаў наваградскага і воруцкага княстваў. Замак Стрыгівіла скончылі будаваць да свята Яна Купалы. Стрыгівіл даў

назву замку і будучаму гораду па імені сваёй жонкі Любчы. Гандляр Чорнавіл выканаў сваё абяцанне і вярнуўся са свайго падарожжа з дваццаццю двума ваярамі люцічамі, некаторыя з іх былі з сем'ямі.

Наваградскі егер Сірвід прывёў усіх тых, хто ўдзельнічаў у будаўніцтве замка Любча, на новае месца будаўніцтва замка рыцара Доўбуда каля ракі Дунай, у пяці верстах ад паселішча люцічаў Эйгерда. Князь Міндоўг, рыцар Доўбуд і егер Сірвід, наведаўшы гэта паселішча, паведамілі яго валосціцелю, што з гэтага часу яны даюць даніну Доўбуду, і з заўтрашняга дня дапамогаюць ў будаўніцтве замка. Улічывая, што рыцар Доўбуд не займаўся будаўнічымі справамі, Міндоўг замацаваў свайго цесляра Яна за гэтым будаўніцтвам з далейшым яго пражываннем там. У пачатку восені вярнуўся з поўдня гандляр Міхайла, і распавёў Міндоўгу, што паклёп бельзскага князя Аляксандра Усеваладавіча на свайго стрыечнага брата Данііла Раманавіча князю Мсціславу Удаломy адкрыўся, і Данііл Рамановіч паміраўся са сваім цесцем. Гэтая навіна парадавала князя Міндоўга, таму што добра мець дамову з тым, хто моцны і надзейны.

Служанка распавяла Міндоўгу, што Вольга нарадзла спакойнага сына, не крыклівага, ахвотнага да кармлення. Княжна Марфа чамусці не можа нарадзіць другога дзіцяці. Яна пасля выкідка і нараджэння сына змянілася, ў параўненні з тым, якую ён бачыў у дні знаёмства. Яна стала спакойней, ва ўсім згоднай з Міндоўгам. Яна ведала, што Міндоўг пры ёй мілаваўся з Вольгай, але ніколі не папракала яго ў гэтым. Князь жадаў, каб Войшалку хутчэй мінула пяць лет, і ён адбярэ сына ад гэтых нянь, дзядуль і вельмі клопатлівай мамы, і будзе яго гадаваць сапраўдным ваярам. Яго рыцары ўжо шпацыруюць з сынамі верхам на спакойных конях. Іх сыны з задовольненнем размахваюць драўлянымі мечамі. Ёсць яшчэ адна прычына па якой князь хацеў, каб сын хутчэй падрос. Прапаведнік канстанцінопальскага хрысціянства зачасціў да князя Ізяслава, зразумело шматбожцы яцвягі не будуць яго карміць.

Князь Ізяслаў вельмі хваляваўся пра тое, што Марфа з цяжкасцямі нарадзіла. Улічываючы ранейшые сямейныя хваляванне і сталы ўзрост, ён мала меў радасці ў жыцці. А без радасці

князь становіцца не ўпыйненным у сабе і слабым духам. Прапаведнік гэтым скарыстаўся і цяпер, як зразумеў Міндоўг, дрэнна ўплывае на князя Ізяслава і Марфу. А яны магчыма будуць дрэнна ўплываць на яго сына. Міндоўг прагне каб гэтага не было. Увосень вярнуўшыся з гандлярскага падарожжа, Чорнавіл распавёў:

— Князь Міндоўг, калі мы спыніліся на начлег у вусце ракі Нёман, падышоў да нас ваяр з скаловаў і прасіў перадаць табе, князь, што ўсе прусы зараз ваююць з хрысціянскімі ваярамі князя Конрада Мазавецкага. Прусы ведаюць, што ты, князь Міндоўг, разбіў рыцараў цыстэрцыянцаў, але цяпер у мазавецкага князя ёсць іншыя рыцары, якія пагражаюць паходам на прусаў, таму яны просяць цябе нападаць на ўсіх мазурскіх ваяроў.

— А ў самбаў не былі?

— Не князь, не былі. Я зараз бурштын выменьваю або купляю ў люцічаў, якія збіраюць яго на ўзбярэжжы мора, недалёка ад вусця Нёмана.

— Гандляр Чорнавіл, калі самбы або скаловы будуць пытацца пра Рушковічаў і Булевічаў, скажы што іх не ведаеш. Так трэба.

— Добра, князь. Так і скажу. А яшчэ, князь, трое з люцічаў захацелі да нас пераселіцца, і калі мы спыніліся на начлег у паселішчы князя Выкінта, то ён прапанаваў ім застацца ў яго. Яны там засталіся.

— То добра. Дзякуй табе, Чорнавіл.

Перад Калядамі, князь Міндоўг пабываў у Любчы ў князя Стрыгівіла і ў будуючымся замку Доўбуда. У Любчы ўсе добра было наладжана і Стрыгівіл быў задаволен, а ў замку Доўбуда церам не скончылі, таму Міндоўг вяртаўся ў Воруту разам з Доўбудам. У будуючымся замку паспелі зрабіць каменны падмурак для сцен замка, а таксама паставілі два дамы з печкай і адзін доўгі дом з двума печкамі, зрабілі лазню і вырылі калодзеж. На зіму там засталіся цясляр Ян і чатыры ваяры-цесляры люцічаў з суседняга паселішча Эйгерда. За зіму яны будуць нарыхтоўваць доўгія і прамыя бярвёны для церама.

З надыходам вясны і новага 6735 лета (1227 па хрысціянскім календары) Міндоўг стаў рыхтавацца да паходу ў зямлі Мазовіі.

Ён даўно згаворваўся з гародзенскім княжычам Жыгімонтам аб сумесным паходзе супраць мазураў, таму ён паслаў ганца ў Гародню з прапановай да свайго сябра падрыхтаваць адну моцную сотню ваяроў для паходу. Таксама ён паслаў ганца ў Ваўкавыск да князя Даў'ята з такой жа прапановай, і прасіў знайсці ляснікоў і дазорных, якія добра ведаюць тыя мясціны. А калі такіх няма, то магчыма звернуться да князёў адасобленых яцвягаў з прапановай аб такіх дазорных.

Праз восем дзён у Воруту прыбыў ганец з Ваўкавыска, які распавёў, што ў іх паселішчы люцічаў з татэмам ваўка Мантовт ёсць ваяр, які сябруе з ваяром адасобленых яцвягаў, і які добра ведае мясціны на поўнач і захад ад Драгічына. Ён дапаможа без ведама свайго князя. Гэтай весткай князь падзяліўся з рыцарам Дзімінам, той вельмі зацікавіўся гэтымі двума ваярамі. Дзімін успомніў, што ў мінулы паход на мазураў, у лясах перад Драгічынам, ён і яго дазорные адчувалі, што за імі наглядаюць, але не бачылі іх. Яму было б карысна пераняць іх навыкі.

На дванаццатый дзень вясновага раўнадзенства ў Воруту прыбыў ганец і ваяр ад Данілы Рамановіча. Князь прасіў напасці на мазурскія зямлі на поўнач ад Драгічына, за згоду ён дорыць Міндоўгу дзвесце манет срэбрам. На роспыты князя пра прычыны гэтай просьбы, ганец і ваяр адказвалі, што гэтага не ведаюць. Галіцкі ваяр паведаміў князю, што ведае тыя месціны і правядзе атрад. Міндоўг паслаў ганца да Жыгімонта аб прыбыцці яго сотні ў Ваўкавыск праз два дні. Князь акрамя двух сваіх сотняў, узяў у паход моцную наваградскую сотню Вітольда.

Калі Міндоўг прыйшоў са сваімі трыма сотнямі ў Ваўкавыск, Жыгімонт са сваёй сотняй ужо чакаў яго. Пасля кароткачасовага адпачынку атрад накіраваўся на захад. Ваўкавыскі ваяр з люцічаў Кгашталт і яго сябра яцвяг Алвад узгоднілі з галіцкім ваяром Паўло месца начоўкі і далёкі шлях. Атрад раніцай паснедаўшы, рушыў на захад. Дазорцы вылучыліся перад атрадам на трычатыры вярсты. Ваўкавыскі сотнік выказаў Міндоўгу думку, што атрад рухаецца ў напрамку трыццаці вёрст на поўнач ад Драгічына. Князь быў задаволены гэтым, чым паўночней, тым бліжэй да прусаў. Паспяховы паход парадаваў бы і прусаў, і князя Данііла Раманавіча.

Пасля поўдня да Міндоўга падскочыў Дзімін і паведаміў, што ў чатырох верстах прасоўваецца на поўдзень атрад рыцараў, каля трыццаці з збраяносцамі, каля двух сотняў і пешыя ваяры, каля двух сотняў. У напрамку іх руха ёсць невялікае поле сярод лесу. Міндоўг указаў паскорыцца атраду да далёкага канца поля. Яны паспелі заняць у лесе месца для атакі перад дарогай з поля. Каля дарогі, князь размясціў сваю лёгкую конніцу, злева ён паставіў сотню Жыгімонта і ваўкавыскую сотню, а наваградскую сотню Вітольда справа. Да Міндоўга прывялі палоннага дазорнага мазураў, але ён на ўсе пытанні рабіў знакі, што не разумее князя.

Прыбыў Дзімін і паведаміў, што ўвесь мазурскі атрад выйшаў з лесу на поле. Міндоўг указаў расцягнуцца ў лесе і цалкам замкнуць гэтае поле, а пасля таго, як яго лучнікі лёгкай конніцы адстраляюцца і пачнуць кідаць дроцікі, астатнім флангавым сотням пачаць атакаваць лучнікамі. У той час, калі пярэднія рыцары мазураў дасягнулі адной траціны поля да дарогі ў лесе, лёгкая конніца выехала з лесу і стала страляць з лука, а потым пачала кідаць дроцікі, і з гэтым флангавыя сотні выйшлі з лесу, і сталі страляць з лука.

Мазурскія рыцары рынуліся ў атаку на лёгкую конніцу, а тыя расступіліся перад цяжкай конніцай князя. Наперадзе сотні цяжкай конніцы скакаў Міндоўг з адзінаццаццю рыцарамі і трыма збраяносцамі. Пры набліжэнні да пярэдняга рыцара, князь уваткнуў дзіду ў яго каня і хутка выняўшы меч, абрынуў яго на падаючага рыцара. Для гэтага рыцара аднаго ўдару было дастаткова, і ён увагу засяродзіў на іншага бліжэйшага рыцара.

Пачалася лютая рубка, ў якой любое самое нязначное паслабленне ўвагі каштавала жыцця. Заднія шэрагі мазурскага атрада былі хутка знішчаны, з-за раптоўнасці нападу ліцвінскіх ваяроў. Міндоўг у час бою не адчуваў стомленасці, нават калі перад ім не было рыцара, ён не марнуючы часа накіроўваўся да іншых на дапамогу.

Мазурскія рыцары і збраяносцы былі разгромлены, а некалькі пешых ваяроў здаліся ў палон. Толькі пасля заканчэння бою, князь адчуў стомленасць, не столькі цялесную, колькі душэўную ад таго, што ўбачыў, як у моцна параненага ў правую руку,

Стрыгівіла спрабуюць спыніць кроў. Толькі, калі да яго глыбокай раны прыклалі цвілы хлеб, кроў перастала цячы. У сотні лёгкай конніцы не было забітых і параненых, а ў ваўкавыскай і сотні цяжкай конніцы Міндоўга былі і забітыя, і параненыя.

Да князя наблізіўся галіцкі ваяр.

— Князь Міндоўг, дзякуй за разгром мазураў. У шасці верстах на поўдзень ёсць багатае паселішча мазураў. Я магу правесці туды атрад.

— Добра, вядзі.

Міндоўг пакінуў на полі бою сваю сотню цяжкай конніцы, збіраць зброю і даспехі, а таксама даглядаць за параненымі і палонам, а з астатнімі накіраваўся на поўдзень. Князь узяў у аблогу вялікае паселішча, без супраціву абрабаваў яго. У палон бралі толькі добрых рамеснікаў і маладых дзяўчат. Рыцар Доўбуд вывез на трох конях прылады для кузні. Вярнуўшыся на поле бою, і падзяліўшы здабычу, атрад накіраваўся на ўсход.

У Ваўкавыску знахарка доўга займалася параненай рукой Стрыгівіла, таму Міндоўг, пакінуўшы тут чатырох ваяроў, а са сваімі трыма сотнямі і палонам накіраваўся дахаты. У сотні Жыгімонта не было забітых, было толькі чацвёра параненых, таму ён быў задаволены паходам і багатай здабычай. Міндоўгу было важна, што ў Наваградскай сотні не было забітых. Гэта ўмацоўвала наваградчан ў думцы, што Міндоўг вельмі ўдачлівы ў вайсковых справах. Яны былі ўпэўнены, што гэтаму спрыяе бог Пярун і волхв Вітаўт, які праводзіць чарадзейства перад кожным паходам Міндоўга. Князь асабіста заахвоціў яцвяга Алвада з адасобленых яцвяжскіх княстваў, даўшы яму самому першаму выбраць сабе здабычу з багатага скарба. Міндоўг спадзяваўся, што праз яго ён даб'ецца прыхільнасці да сябе з боку гэтых князёў. Доўбуд узяў у свой замак каваля і чатырох палонных ваяроў. Спачатку Міндоўг падумаў, што пяць мазураў могуць згаварыцца і ўцячы, але потым памеркаваўшы, што доўгі час яны будуць пад наглядам будаўнікоў яцвягаў і суседніх люцічаў, ды і адлегласць да Мазовіі вельмі вялікая, і пагадзіўся з Доўбудам. Да сябе ў Воруту ён узяў шэсць дзяўчат і аднаго косторезного рамесніка. Тры былых растокскіх збраяносца жадалі ажаніцца і маладыя рыцары таксама сталелі. Па прыбыцці ў Во-

руту, князь разам з валхвом Вітаўтам ўрачыста прысвяцілі трох збраяносцаў ў рыцары, і для іх пачалі будаваць асобныя дамы.

У Стрыгівіла была параненая правая рука ледзь вышэй локця, там дзе заканчвалася кальчуга, таму Міндоўг указаў ўсім кавалям падоўжыць кальчугі. Разважаючы пра гэта параненне, князь прыйшоў да думкі, што Стрыгівіл стаў меньш часу надаваць штодзённым рыцарскім трэніроўкам, а больш будаўніцтву. Міндоўг папярэдзіў Доўбуда аб тым, што нельга зменьшать рыцарскія трэніроўкі на карысць кузнецкіхі і будаўнічых спраў. Князь задумаўся, дзе будаваць замак рыцару Скірмунту. Міндоўг вырашыў паставіць замак яшчэ бліжэй да Доўспрунку, каб ён не крыўдзіўся на яго.

У размове пра гэта, князь Ізяслаў успомніў, што на паўднёвым усходзе ад Жыжмы ёсць маленькае паселішча люцічаў Даўмонты (сучасная назва Дзямонты), і ён гатовы перадаць яго Скірмунту, каб яны дапамагалі яму ў будаўніцтве замка. У пачатку восені скончылі будаваць замак Доўбуду, і ён назваў замак Даўбуды (сучасная назва Даўгердзішкі) і перавёз туды жонку і сына. А ўсіх будаўнікоў перавялі на новае месца, побач з князем Доўспрункам. Гэтае месца знаходзілася пасярэдзіне паміж замкам Доўбуды і паселішчам Ліда, і ўсяго ў дзевяці верстах ад Жыжмы.

Князь Міндоўг наведаў старэйшага брата і паведаміў яму аб гэтым будаўніцтве. Доўспрунка гэтая навіна супакоіла, ад добра наладжанай гаспадаркі брат распаўнеў, а падраслеўшые яго сыны глядзелі на дзядзьку асцярожно.

Ад Стрыгівілала прыйшла добрая навіна. Яго жонка нарадзіла другога сына, а вось яго рука не папраўлялася. З поўдня прыбыў гандляр Міхайла, ён распавёў Міндоўгу навошта князь Даніiл Рамановіч жадаў нападу на зямлі князя Конрада Мазавецкага. У полянскіх землях супернічалі за вяршэнства два саюза князёў. Пасля бою саюза князёў Одоніча і Святаполка Паморскага супраць саюза князёў Ляшко Белага, Конрада Мазавецкага і Хенрыха Барадатага, быў забіты Ляшко Белы. На самага моцнага князя прэтэндавалі Конрад Мазавецкі і Хенрых Барадаты. Русінскі князь Даніiл Рамановіч вырашыў аслабіць Конрада Мазавецкага.

— І калі ты, князь Міндоўг, разбіў рыцароў Конрада Мазавецкага, то самым моцным з полянскіх князёў стаў Хенрых Барадаты, што выгадна Даніілу Рамановічу.

Князь Данііл Рамановіч са сваім войскам пайшоў паходам на Берасце, і разбіў войска яцвягаў пад горадам, але горада не ўзяў. Міндоўга гэтая весткі ўзрадавалі. Ён паслаў ганца да Ваўкавыскага князя Даў'ята з прапановай, каб яго ваяр з паселішча Мантоўты сустрэўся са сваім сябрам яцвягам Алвадам, і каб той пераканаў свайго князя яцвягаў заключыць дамову з нашым саюзам яцвяжскіх князёў. Міндоўг спадзяваўся, што яцвягі пацярпеўшы паразу пад Берасцем, будуць больш дагаворныя з саюзам нашых князёў. Князь чакаў добрых вестак ад Ваўкавыскага князя, але раней добрымі весткамі падзяліўся гандляр Чорнавіл, які вярнуўся з поўначы. У вусце ракі Нёман калі яны спыніліся на начлег, да іх падышоў ваяр прусаў і прасіў перадаць князю Міндоўгу, што яны дзякуюць яму за тое, што ён разбіў мазурскіх рыцараў. Ён таксама распавёў, што прусы разбілі ў баі мазурскіх ваяроў, і малыя іх рэшткі ўцяклі ў замак Добжынь. Ганец, які прыбыў з Ваўкавыска, паведаміў, што яцвягу Алваду не ўдалося ўгаварыць свайго князя да дамовы з саюзам яцвяжскіх княстваў.

Трое новых воруцкіх рыцара ажаніліcь у пачатку зімы. У гэтае лета князь Міндоўг атрымаў даніну самую вялікую за ўвесь час яго княства, і добра што ён гэта прадбачыў, пабудаваўшы ў замку яшчэ некалькі гаспадарчых пабудоў для захоўвання збожжа і гародніны. Узімку да Міндоўга прыбывалі многія сотнікі з розных паселішчаў і Наваградка з прапановай новых рабаўніцкіх паходаў. Ён усім казаў, што паходы будуць толькі неабходные па з'яўленні новых важных вестак. А зараз трэба ўмацоўваць абараназдольнасць гарадоў і вялікіх паселішчаў. Рабіць загараджальныя валы і равы перад крайнімі дамамі. У гарадах і вялікіх паселішчах у рамеснікаў і майстраў была штодзённая праца. Гандляры менш моцныя, чым Чорнавіл і яго сярэдні сын, гандлявалі толькі з бліжэйшымі зямлямі і таму вялікага здабытка ў іх не было. А даніну князю трэба даваць. Таму сотнікі ваяроў разумелі, што здабыток будзе, калі князь Міндоўг возьме з сабой ў паход. Улічываючы жаданні ваяроў, Міндоўг так-

сама разумеў важнасць выбару паходу. Неразумны рабаўніцкі паход можа прывесці да зваротнага азлобленага пахода моцнага вялікага войска, а ўлічываючы высокі ўзровень жыцця наваградскага княства, то жадаючых аб'яднацца ў моцнае войска і парабаваць наша княства будзе шмат. Напад русінаў на Крэва, таму падцверджанне.

Знішчэнне рыцароў лацінскіх хрысціян апраўдана любымі стратамі. А з русінамі, якія не жадаюць тваіх зямель і скарба, не трэба ваяваць, а трэба дамаўляцца аб міре. У чацвёрты дзень вясны і новага 6736 лета (1228 па хрысціянскім календары) прыбыў у Воруту полацкі ваяр Копысь. Ён распавёў, што рыцары новага хрысціянскага ордэна тэўтоны разбілі шматбожцаў эзельцаў у Эстляндыі. З гэтай весткі, Міндоўг зрабіў высновы, што Рымская Царква вырашыла рыцароў новага хрысціянскага ордэна накіраваць на заваёву зямель балтыйскіх шматбожцаў. Спачатку тэўтоны разграмілі люцічаў, а цяпер эзельцаў. А нашы зямлі, як самыя развітыя і багатыя, для іх захопу найбольш прагныя. Пра ўсё гэта ён распавёў князю Ізяславу, і той пагадзіўся, каб ваяры і іншыя працаўнікі рабілі загараджальныя валы і равы ў ўлік княжацкай даніны. На будаўніцтва замка для Скірмунта, князь Ізяслаў накіраваў шэсць цесляроў і двух печнікаў, а Міндоўг дазволіў з канца вясны і да пачатку восені Марфе і Войшалку быць у Наваградку, пры гэтым наваградскі ваяр будзе навучаць Войшалка практыкаванням з драўляным мечом і яздзе ў сядле на кані. Князь Міндоўг вырашыў перад пасадам у Воруты таксама зрабіць загараджальны вал, таму ён толькі дваіх цесляроў накіраваў на будаўніцтва замка Скірмунта. У пачатку лета вярнуўся з поўдня гандляр Міхайла. Ён паведаміў, што князь Данііл Рамановіч аб'яднаў усю Валынскую зямлю, а цяпер разам з цесцем князем Мсціславам Удалым ваююць з вугорскім каралём. Усё лета і пачатак восені Міндоўг займаўся ўмацаваннем абараназдольнасці наваградскага і воруцкага княстваў.

Праз ваўкавыскага князя Даў'ята, ён спрабаваў дамовіцца з адасобнымі яцвяжскімі князямі. У пачатку восені, у Воруту прыбыў ганец ад Даў'ята з весткай, што чым больш мы ўгаворваем князёў яцвягоў на дамову з намі, тым больш яны супрацiўляюцца гэтаму. Затым прыбыў да Міндоўга полацкі ваяр Ко-

пысь і паведаміў, што ў русінаў у наўгародскай зямлі неўраджай. Купцы Ноўгарада спрабуюць купіць збожжавыя ў Полацку, Віцебску і Смаленску, але земляробы гэтых горадоў паднялі кошт збожжа, і русіны пагражаюць прыйсці да іх з вялікім войскам. Міндоўг праз Копыся перадаў князям гэтых гарадоў:

— Лепш дамовіцца па кошту збожжа, а не ваяваць. Настае ліхі час, калі рыцары лацінскіх хрысціян усё больш урываюцца ў гэтыя землі з поўначы. А з поўдня трэба чакаць ардынскіх ваяроў, яны па сваёй прыродзе стэпавых ваяроў хутка нападуць. Таму трэба зберагчы ваяроў для адпору ім. Але калі ў наўгародскага князя не хопіць розуму гэта зразумець, і ён пойдзе паходам на Полацк і Віцебск, то мы з вамі ў дамове, дайце мне вестку, і я з войскам прыйду да вас на дапамогу.

Разважаючы над магчымым русінскім паходам, Міндоўг вырашыў сабраць вялікае войска, ўлічываючы што палявыя працы скончыліс, магчыма было сабраць дваццаць сотняў з наваградскага і воруцкага княстваў. Сумесна з ваярамі полацкімі і віцебскімі гэта было б вялікім добра ўзброеным войскам здольным разбіць аб'яднанае русінскае войска. Гледзячы на такое вялікае і паспяховае ліцьвінскае войска, ды яшчэ з саюзным ім полацкімі і віцебскімі ваярамі, русіны засумняваліся б у сваёй перамозе. Гэта быў бы найлепшы вынік. Яны яшчэ магчыма не забыліся іх разгрому ў адкрытым баі ў Крэва. То што потым атрад нальшанского князя быў разбіты пры Усвяче, разумным русінам трэба было тлумачыць слабасцю недасведчанага князя. Ім трэба разумець розніцу між адкрытым боем і пагоняй за ўцякаючым з палонам праціўнікам. Князь чакаў весткі з усходу восенню і зімой, але іх не было. Міндоўг зразумеў, што розум русінаў перамог, гэта было ў радасць князю. У канцы зімы прыбыў ганец ад гародзенскага княжыча Жыгімонта з прапановай пайсці рабаўніцкім паходам у землі Мазовіі, ў яго ёсць правадыр з мясцовых яцвягаў. Такі паход для Міндоўга быў апраўданым, трэба знішчаць лацінскіх хрысціянскіх ваяроў, сотнікі жадаюць рабаўніцкіх паходаў, а для замка Скірмунта трэба палонныя рамеснікі і служанкі.

Надыходзячай вясной і новым 6737 летам (1229 па хрысціянскім календары) Міндоўг паслаў ганца да Жыгімонту з уда-

кладненем пытань паходу ў Мазовію. Жыгімонт праз ганца растлумачыў, што гэта хуткі рабаўніцкі паход на поўдзень Мазовіі, побач з зямлёй ляхаў у невялікае паселішча, таму ён возьме адну сотню, а ад Міндоўга дастаткова будзе двух сотняў. Князь вырашыў узяць адну сотню з Наваградка, іншую чым да гэтага, і дзве свае сотні, лёгкую конніцу і цяжкую. Усётакі ў Мазовіі былі рэшткі добжінскіх рыцароў, таму князь вырашыў не рызыкаваць і ўзяць цяжкую конніцу.

Перад вясновым падарожжам гандляра Чорнавіла, князь папярэдзіў яго, каб ў вусце Нёмана запрасіць у нашы зямлі дзесяць люцічаў, і калі Выкінт будзе перавабліваць іх да сябе, то сказаць яму, што гэта для Міндоўга. Гэтых люцічаў князь вырашыў накіраваць ва ўжо гатовы замак Скірмунта, які назваў Скірмунты (сучасная назва Стріженята). Міндоўг вырашыў ісці ў паход да канца вясны праз Ваўкавыск. У папярэднія паходы на захад, у ваўкавыскай сотні былі забітыя і параненыя, таму Міндоўг не чакаў, што князь Даў’ят будзе незадаволены, што яго сотню не возьмуць у паход. Перад паходам вярнуўся з поўначы гандляр Чорнавіл з адзінаццаццю люцічамі і вучнем Эйсманта васямнаццацілетнім Вісмунтам. Чорнавіл распавёў, што князь Выкінт быў вельмі незадаволены тым, што люцічы для князя Міндоўга.

Князя зацікавіў Вісмунт. Гэта быў высокі дужы ваяр з добрым узбраеннем і даспехамі. Вісмунт распавёў, што ў мінулае лета ён, як збраяносец удзельнічаў у двух рыцарскіх паядынках рыцара Эйсманта з іншымі рыцарамі і збраяносцамі. У абодвух паядынках Эйсмант і яго збраяносцы перамаглі. У збраяносцах тады ж быў сын рыцара Даўмонт, які хоць і маладзейшы за Вісмунта на тры лета, алё росту такога ж і майстэрства ў бітве на мечах яго не горш. Міндоўг успомніў маленькага хлопчыка каля кузні ў дзень, калі атрад таты накіраваўся ў гэтыя зямлі, і тое што ён сказаў:

— Калі я вырасту, я таксама буду рыцарам і буду змагацца, як ты.

Вісмунт працягнуў:

— Дачка Эйсманта часта хварэе, таму сям’я рыцара не вырашаецца пераселіцца ў гэтыя зямлі. Эйсмант прапанаваў мне

пераселіцца да цябе, князь Міндоўг, каб праверыўшы маё майстэрства ваяра, разам з валхвом Вітаўтам прысвяцілі мяне ў рыцары.

Міндоўгу нецярпелася праверыць навыкі ваяра Вісмунта, і ён зладзіў паказальную бітву на трэніровачных мечах паміж ім і самым моцным і дасведчаным у бітве на мечах сярод маладых рыцараў Ленгвіном. У іх паядынку была вялікая колькасць падманных рухаў, хуткія напады і хуткая абарона з адначасовай атакай. Ленгвін калі быў вучнем збраяносца не вылучаўся сваім ростам і сілай, ён і цяпер быў ніжэй свайго аднолетка Вісмунта, але вялікае жаданне стаць наймоцнейшым ваяром, дапамогло яму стаць у ровень з Міндоўгам у гэтым майстэрстве. У гэтым паядынку супернічалі вялікая стараннасць супраць майстэрства вучня вялікага рыцара.

Пасля хуткай камбінацыі падманных рухаў перамог Вісмунт. Князь прыйшоў да высновы, што як не старайся, але асабістае навучанне вялікага рыцара перамагае. Міндоўг даўно не адчуваў такой асалоды, гледячы на бітву сапраўдных майстраў, і ведаючы што яны ў тваім атрадзе. Князь павіншаваў Вісмунта з перамогай і сказаў яму, што ў хуткім часе яны ідуць у паход на захад, і ён бярэ яго з сабой.

Міндоўг вырашыў узяць яго замест Стрыгівіла, які моцна расхварэўся. Калі атрад Міндоўга прыбыў у Ваўкавыск, княжыч Жыгімонт са сваёй сотняй ваяроў ужо чакаў яго. Ваўкавыскі князь Даў'ят дадаў да атрада свайго дазорнага з люцічаў Кгашталту, а ён пры руху на захад прыцягнуў да паходу свайго сябра яцвяга Алвада. Міндоўг растлумачыў ім, што гэта рабаўніцкі паход, і ім трэба побач з тым паселішчам да якога іх вядзе правадыр Жыгімонта, знайсці яшчэ невялікае паселішча на якое магчыма бяспечна напасці. Калі атрад праходзіў праз зямлі адасобленных яцвягаў, да князя наблізіўся рыцар Дзімін і паведаміў, што ён заўважыў аднаго дазорнага гэтых яцвягаў, ён хаваўся на высокім дубе. Міндоўг указаў Дзіміну паставіць каля гэтага дуба аднаго са сваіх дазорных, найлепшага лучніка, каб вартаваў пакуль не пройдзе ўвесь атрад. Гэтым князь сведчыў гэтаму дозорному, а праз яго і князю яцвягаў, што аб ім ведаюць і ставяцца да яго мірна.

Зноў наблізіўся Дзімін і паведаміў, што ў сямі верстах на паўночны захад ад вызначанага паселішча, ёсць паселішча мазураў большае, чым першае, ўзброеных атрадаў нідзе нема. Міндоўг указаў першае паселішча ўзяць у аблогу паловай дазорных, а рэшткамі дазорных правесці атрад міма гэтага паселішчы да іншага далёкага, і пасля яго аблогі будзем атакаваць. Пасля паспяховай атакі на далёкае паселішча, дзве сотні ваяроў з палонам і скарбам прайшлі на поўдзень ад маленькага селішча, а іншыя дзве сотні атакавалі яго. Скончыўшы і з гэтым паселішчам, атрад вяртаўся на поўдзень ад ранейшага шляху. Абменьваючыся думкамі пра гэтыя адасобленыя яцвяжскія княствы, Міндоўг сказаў Жыгімонту:

— Гэтымі рабаўніцкімі паходамі мы забіраем здабычу ў іх. Калі мы ідзем праз іх зямлі на мазураў, яны не ведаюць нашу мэту паходу. Калі мы ідзем, каб знішчыць мазурскіх рыцараў і ваяроў, то ім гэта падабаецца, іх суседзі аслабляюцца. А калі мы ідзем, каб паграбаваць, то ім гэта не падабаецца. Калі іх дазорные паведаюць князю, што мы вяртаемся са здабычай пасля рабаўніцкага паходу, то яны могуць напасці на нас, таму мы пайшлі па іншым шляху. Здабычу мы будзем дзяліць толькі калі пяройдзем у зямлю Ваўкавыскага князя.

Перад Ваўкавыскам падзялілі здабычу і Жыгімонт са сваёй сотняй павярнуў на поўнач. Міндоўг шчодра адарыў дазорных Кгаштолта і Алвада. Пры сустрэчы з ваўкавыскім князем, Міндоўг сказаў, што калі б мы былі ў союзе з суседнімі яцвяжскімі князямі, мы б сумесна з імі нападалі на мазураў і дзялілі б здабычу, а без гэтага мы з імі не дзелімся. Хай гэтыя князі пра гэта добра падумаюць.

Князя вельмі цікавіла думка Вісмунта аб гэтым паходзе. У тых думках, якія ён выказаў, Міндоўг пачуў развражанні рыцара Эйсманта і гэта спадабалася яму. На наступны дзень па прыбыцці ў Воруту, князь і волхв Вітаўт урачыста прысвяцілі Вісмунта ў рыцары. Пры выкананні гэтага абраду валхву Вітаўту дапамагаў стары кульгавы ваяр, знаемый Міндоўгу па падарожжу ў гэтыя зямлі адзінаццаць лет таму. Яго клікалі Воят і ён з вясны бязменна жыве побач з валхвом. Міндоўг быў задаволены гэтым, таму што волхв Вітаўт у апошнія два лета ледзь

перасоўваўся і стаў менш бадзёрым, чым раней. Пры размове з Міндоўгам волхв Вітаўт хваліў Воята.

З Любчы прынеслі непрыемную навіну, Стрыгівіл памёр. Міндоўг з Альгердам пабывалі на пахаванне Стрыгівіла. Волхв Вітаўт не змог адправіцца з імі. Князь задумаўся на каго пакінуць замак Любча і суседняе паселішча. Патрэбен моцны і мудры ваяр, здольны арганізаваць абарону замка, навучыць ваярскому майстэрству. Міндоўг заўважыў, што рыцар Вісмунт не ўжываецца з маладымі рыцарамі. Магчыма Ленгвін і Яўнут адчулі ў Вісмунта больш моцнага за сябе суперніка. Некалькі дзён князь размаўляў з Вісмунтам аб навучанні ваяроў, і аб арганізацыі абароны замка. Зразумеўшы, што Вісмунт здольны ўзначаліць гэтае княства, Міндоўг прапанаваў яму ўзмоцніць княжанне ў замку Любча і суседнім паселішчы. Вісмунт быў вельмі рады і запэўніў князя ў сваёй адданасці і стараннасці. На саракавы дзень пасля сьмерці Стрыгівіла, Міндоўг з Альгердам і Вісмунтам прыбылі ў Любчу.

Пасля памінак Міндоўг прапанаваў князёўне Любчы перасяліцца ў суседняе паселішча Купны, і пабудаваць для яе і дзяцей вялікі дом. Любча папрасіла князя пераселіць яе з сынамі ў замак Скірмунты, яна ў Воруце была сяброукай жонкі Скірмунта. Міндоўг пагадзіўся з гэтым, і накіраваўшы ў Скірмунты сваіх будаўнікоў, хутка пабудаваў там вялікі дом для яе і сыноў. Калі вярталіся з Любчы, Міндоўг пацікавіўся ў Альгерда:

— Альгерд, чаму ўсе рыцары хочуць свой замак, сваё княства, а ты не хочаш?

— Князь Міндоўг, я з Вандай вельмі шчаслівыя і мы вельмі ўдзячныя табе за гэта. Я з маладосці сачыў за тваімі рыцарскімі трэніроўкамі і быў у захопленні ад тваіх поспехаў. Я паверыў у тваю вялікую будучыню рыцара, і цяпер я рады, што апынуўся правы. У мяне палоннага подлетка, нават у марах не было жадання стаць рыцарам, прычым шчаслівым рыцарам, а цяпер я ім стаў. Мы з Вандай разумеем, што пры нашым жаданні стаць такімі ж князямі, як Стрыгівіл, цябе б гэта не абцяжарыла. Але мы прыйшлі да агульнай думкі, што мы будзем шчаслівыя толькі побач з табой, будзем сябрамі табе, і ніякае княства нам не патрэбны.

— Так, вы шчаслівыя, я нават заўважыў, што ў вас рысы твару сталі падобнымі.

— Так, наш сын вельмі падобны на нас абодвух. Будзь упэўнен, што не толькі мы, але і наш сын будзе верным сябрам табе і твайму сыну.

— Я ў гэтым упэўнен, я толькі прагнуў пачуць гэта ад цябе.

— Мы бачым, як табе цяжка. Ты яшчэ малады, а без дапамогі таты, без дапамогі старэйшага брата, ў цябе ўсё атрымліваецца, ты нават сам дапамогаеш і старэйшаму брату і дзядзьке. З тваім кіраўніцтвам і дзеяннямі ўсі ліцвіны становяцца моцнейшымі і багацейшымі, ў іх ёсць упэўненасць у добрую будучыню. А ў будучыне будзе яшчэ цяжэй, але ты ведай, мы першыя будзем побач з табой ў цяжкіе часы. Я выканаю любое тваё пажаданне.

— Дзякуй табе, Альгерд.

Да пачатку зімы, князь Міндоўг займаўся ўзмоцненем абараназдольнасці наваградскага і воруцкага княстваў. Да працы па рыцью равоў і ўзвядзенню валоў прыцягвалі і ваяроў. Гандляр Міхайла паведаміў, што княжыўшы ў Галіче Мсціслаў Удалы памёр. Галіцкія баяры, асабіста моцны Судзіслаў, угаворвалі паміраючага Мсціслава, перадаць Галіч не Даніілу Рамановічу, а вугорскаму каралевічу Андрэю. Але, Данііл Раманавіч з войскам аблажыў горад, і ўзяў яго. Паланіў каралевіча, а потым адпусціў яго.

— Князь Міндоўг, мой сын Міхалок, якога я ўжо трэцяе лета бяру з сабой ў гандлярскае падарожжа, падслухаў размову дзвюх русінскіх гандляроў. Тыя казалі, што па падгаворванні пінскага князя Расціслава, кіеўскі князь Уладзімір Рурыкавіч разам з пінскімі, тураўскімі і чарнігаўскімі сотнямі ваяроў нападаюць на валынскія і галіцкія зямлі.

— Гандляр Міхайла, чаму русінскія князі працягваюць ваяваць супраць сваіх жа русінскіх князёў, яны што не асцярогаюцца нападу Арды?

— Князь, я таксама гэтаму здзіўляюсь. У Ардзе два лета таму памер іх Чынгісхан, і русіны ўпыйнены, што ў іх ідзе барацьба за наследны трон. У гэтай барацьбе яны вельмі аслабнуць і не пойдуць на русінаў.

— Звычайна ў гэтай барацьбе перамагае наймацнейшы, і каб даказаць сваю сілу, ён захоча атрымаць больш перамог, чым яго

тата. Асноўная іх сіла ў ваярах з захопленых зямель, а яны не ўдзельнічаюць у спадчыннай барацьбе, таму яны не могуць аслабнуць. Цяпер яны наводзяць свой парадак улады ў заваяваных вялікіх землях. Ваяроў з заваяваных зямель яны трэніруюць і арганізоўваюць у свае сотні і тысячы. Для гэтага патрэбен не малы час. Калі яны ўсё гэта арганізуюць, то абавязкова нападуць на русінаў. Арда ужо разграміла іх на поле бою. Цяпер яны прыйдуць заваёўваць, каб русіны плацілі даніну і пастаўлялі сваіх ваяроў для далейшых заваёваў Арды.

— Князь Міндоўг, у мяне такая ж думка.

— Міхайла, вось табе кавалачак тканіны з вышыўкай, гэта знак Даніілу Рамановічу, што вестка ад мяне. Трэба знайсці магчымасць сустрэцца табе з ім і перадаць яму, што я жадаю яму быць самым моцным князем у русін, і не ўмешвацца ў сваркі русінскіх князёў, а захоўваць і ўзмоцняць сваіх ваяроў ад вялікай небяспекі Арды.

— Добра, князь Міндоўг, буду старацца яму перадаць твае пажаданні.

Калі сышоў гандляр, князь стаў разважаць, што будзе калі русінскія князі не зразумеюць шкоду межусобнай вайны. Яны аслабнуць, а Арда на іх нападзе і ўсіх заваюе. Тады Арда, разам з русінскімі ваярамі, нападзе на нашы землі з усходу і поўдня, а рыцары лацінскіх хрысціян нападуць з поўначы і захаду. Трэба ўмацоўвацца з усіх бакоў. Пакуль лацінскія рыцары ў розных ордэнах, і ў іх няма адзінага кіраўніка, трэба шукаць магчымасць разбіць іх па асобку.

У другі дзень вясны і новага 6738 лета (1230 па хрысціянскім календары) да князя Міндоўга прыбыў полацкі ваяр Копысь. Ён распавёў, што ўзімку нальшанскі атрад хадзіў паходам у русінскія землі. У гэты раз яны пайшлі далей, за торапецкую зямлю, нават за Таржок, яны зрабілі набег на Любна, Мореву і Серегер, а калі вярталіся, іх атакавалі наўгародскія ваяры і адабралі палон.

— Князь, я думаю, што княжыч Яргайла захацеў адпомсціць за свой палон у Торжку, і таму яны пайшлі на тыя землі.

— Копысь, калі ты накіроўваўся ў Воруту, быў у Нальшанах або у Крэва?

— Не, князь, я начаваў у сястры ў маленькім паселішчы Люцічы (сучасная назва Лютошь), гэта на поўдзень ад Нальшан. Сястра шматбожка, замужам за люцічам.

— Копысь, мне трэба ведаць, што думаюць жыхары і ваяры ў Нальшанах, Крэва і вялікіх паселішчах такіх, як Лужышча пра нальшанского князя. Таксама мне трэба ведаць пра вынікі гэтага паходу, і якія сотні былі ў гэтым атрадзе. Вось табе срэбрянные манеты, калі патрэбен табе ў дапамогу ваяр Мікола, то дазваляю ўзяць яго з сабой. Дзевяць дзён табе будзе достаткова гэта ўсё выведаць?

— Достаткова, князь. Я з твайго дазвола возьму з сабой Міколу.

— Добра, Копысь.

Неабдуманыя паходы князя Ердзівіла, пачалі раздражняць Міндоўга. Зараз у чаканні навалы Арды на русінаў і на нас, трэба дамоўляцца аб міры і ўзаемадапамогі, а ён толькі шкодіць гэтаму. Праз дзевяць дзён да князя прыбыў Мікола. Ён распавёў:

— На восьмы дзень да іх сталі падазрона аднасіцца, і яны ўдваіх адправіліся ў напрамку Полацка. Праз некалькі вёрст ён павярнуў у Воруту, а Копысь адправіўся ў Полацк. У атрадзе Ердзівіла было пяць сотен. Па дзве сотні з Нальшан і Крэва, а таксама сотня з Лужышча. Калі атрад вяртаўся з палонам, у Таропца на іх нечакана напалі ззаду русіны. Сталі адбівацца, а яшчэ атрад русінаў нечакана напаў з боку. Тут многія кінулі палон і сталі ўцякаць, а княжыч Яргайла адчайна адбіваўся. Русіны ўбачыўшы, што ў палон яго не ўзяць, забілі княжыча. У гэтым паходзе загінулі каля трыццаці ваяроў, а параненых каля пяцідзесяці. Ваяры Нальшан, Крэва і Лужышча незадаволеныя князем. Яны кажуць, што варажба перад паходам папярэджвала князя, што паход будзе няўдалым, але князь і Яргайло ўсёроўна пайшлі ў паход. Ваяры кажуць, што толькі рабаваць здольны, а змагацца супраць ваяроў не здольны. Князь і яго малодшы сын Сенгайла першымі сталі ўцякаць, цяпер асцярогаюцца, што калі русіны пойдуць на нальшанскую зямлю, а князь Міндоўг не захоча дапамагчы, то русіны спустошаць іх.

— Што гавораць простыя жыхары?

— Жыхары, незадаволеныя, што новы князь павысіў даніну. Земляробы і гандляры, якія прадалі леташнее збожжа полацкім

гандлярам, задаволеныя. Крэўскі намесьнік задаволены князем Ердівілом. Большасць сотнікаў незадаволеныя, як і большасць рамеснікаў. Зараз князь Ердзівіл старацца задобрыць сотнікаў. Князь, я думаю, калі будзе вестка, што русіны пойдуць паходам на нальшанскую зямлю, то выбіруць іншага князя.

— Мікола, ёсць у цябе сябра ў Нальшанах або ў Крэва, які мог бы паведаміць мяне пра важныя перамены ў жыцці і настроі сотнікаў, зямляробаў і наместнікаў нальшанскага княства?

— Князь, ёсць сябра толькі ў Крэва, але я ведаю, што ў Лужышча ўсе ведаюць князя Міндоўга, як наймоцнейшага ваяра і таксама пераселенца з палаб'я, як і яны. У Лужышча намесьнік і ён жа сотнік Вітмонт вельмі добра адгукаўся пра цябе, князь, пасьля бітвы ў Крэва. Не толькі ён, а таксама ўсе ваяры ў Лужышчы за цябе, князь, і за намесніка Вітмонта.

— Мікола, не можа быць, штоб ў Лужышча ўсе за намесніка, абовязкова ёсць зайздроснікі і яны даносяць на яго князю Ердзівілу. Адпачні два дні, а на трэці накіроўвайся ў Лужышча, і дамовіўся з тым, каму ты цалкам даверны. Яму патрэбна, пасля атрымання важных вестак ад свайго намесніка або ад твайго сябра з Крэва, з'явіцца ў мяне ў Воруце. Пасля таго, як ты пагаворыш пра гэта з сябром у Крэва, накіроўваўся ў Полацк і Віцебск. Там ад тваіх сяброў мне патрэбны хуткія весткі аб намерах русін. Вось табе сярэбраные манеты.

Вярнуўся з поўдня гандляр Міхайла і распавёў Міндоўгу, што не ўдалося сустрэцца з князем Даніілам Рамановічам, але ён пагаварыў з адным набліжаных да князя. Ад яго гандляр выведаў, што адпушчаны князем вугорскі каралевіч разам з татам венгерскім каралём выступілі на Галіч. Галіцкія баяры здалі горад уграм. Потым вугорскі каралевіч пайшоў паходам супраць Данііла Раманавіча, і хоць перамог яго, але так шмат страціў ваяроў, што вярнуўся ў Галіч. Даніїл Рамановіч узяў дапамогу ад ляхаў і прагнаў ворагаў з валынскай зямлі. У тым саюзе русінскіх князёў, аддзяліўся кіеўскі князь Уладзімір Рурыкавіч з-за суздальска-чарнігаўскай сваркі, і цяпер ён зблізіўся з Даніілам Раманавічам.

— Гандляр Міхайла, ты казаў набліжанаму да князя пра маю думку пра небяспеку ад Арды, і пра пажаданне дамоўленасці з русінскімі князямі.

— Так, князь, казаў. Гэты набліжаны сказаў, што перадасць гэтую думку князю Данілу Раманавічу.

— Добра, Міхайла. Дзякую.

Вярнуўся з усходу Мікола. Ён дамовіўся са сваімі сябрамі і патрэбнымі ваярамі. Размоўляўшы з намеснікам Лужышча, Мікола даведаўся, што нальшанскі князь змяніў умовы падзелу здабычы на карысць сотнікаў, цяпер палову здабычы дастаецца сотнікам, а астатняя палова дзеліцца пароўну паміж князем і ваярамі. Вітмонт сказаў, што князю зараз карысліва ісці ў паход вялікім атрадам у дзесяць і больш сотняў ваяроў. Некаторыя сотнікі пасля гэтага перасталі наракаць, але князь хітрун. Калі ў атрадзе будзе дзесяць сотняў ваяроў, то князю дастаецца здабыча столькі колькі пяці сотнікам. Князь Ердзівіл вылучыў земляробам новыя землі пад раллю.

Больш трывожные весткі былі ад гандляра Чорнавіла, які вярнуўся з поўначы. У Ростаке ён чуў, як саксонцы казалі, што князь Конрад Мазавецкі для абароны ад набегаў шматбожцаў прусаў і яцвягаў аддаў рыцарам Тэўтонскага ордэна Хелмінскую зямлю, а рэшткі рыцараў добжынскіх ўліліся ў Тэўтонскі ордэн. Тэўтоны пачынаюць будаваць сабе замак у гэтай зямлі.

— Значыць прыйшлі трывала і надоўга. Колькасць іх вядома?

— Не, князь, не ведаю. Шэсць люцічаў, якія пайшлі з намі ад вусця Нёмана, засталіся ў паселішча князя Выкінта.

Міндоўг задумаўся, як умацаваць заходні напрамак. Гэтых люцічаў з вусця Нёмана трэба сотню перасяляць паўднёвей Гародні. У гэты ж дзень князь паслаў ганца ў Гародзень да Жыгімонту, з прапановай да восеньскага падарожжа гандляра Чорнавіла падрыхтаваць паселішча на поўдзень ад Гародні, для размяшчэння люцічаў, як магчыма больш. Таксама ўказаў ганцу папярэдзіць Жыгімонта аб магчымасці з'яўленні рыцараў тэўтонаў на захад ад яго. Распавядаючы князю Ізяславу аб павялічэнні небяспекі з захаду, Міндоўг прасіў больш задейнічать жыхароў для копання загараджальнага рова ў Наваградке. У Воруце з'явіўся полацкі ваяр Копысь. Міндоўг адразу падумаў, што русіны пачалі паход на нальшанскую зямлю. У яго на гэту навіну быў даўно падрыхтаван план дзеяній, замяніць Ердзівіла на Вітмонта з Лужышча, і толькі пры такой

ўмовы ён дапаможа нальшанцам абараніць іх ад русінаў. Але навіна была нечаканая.

У смаленскай зямлі быў землетрус. А гэта азначае, што ў смаленскай зямлі будзе неўраджай, і полацкія гандляры будуць скупляць зерне ў нальшанскай зямлі. А князю Ердзівілу будзе большый прыбытак. У наўгародскай зямлі недахоп збожжа. Русіны ў гэтае лета не пойдуць паходам на нальшанскую зямлю. Што ж, добра калі становішча на ўсходзе было зразумелым. Воруцкі замак быў непрыступный, а роў перад пасадам трэба паглыбляць, і вал перад ровам трэба было ўзмоцнять. Гэтай працай займаліся ваяры палаву дня, а другая палова дня для трэніровак. Калі Міндоўг зноў з'явіўся ў Наваградку, то вельмі здзівіўся, што роў перад пасадам ніхто не капае, а перад Вялікім і Малым замкамі капаюць глыбокі і шырокі роў. Князь Ізяслаў растлумачыў, што будаўнік Моўдзенко сабраў усіх на гэты роў, а потым будуць рабіць іншы. Роў вырашылі рабіць глыбінёй у чатыры маховых сажань, шырынёй сем маховых сажань, а вал з каменнай абкладкай і з драўлянымі счэпамі.

## ГЛАВА 12
## РАДАСНАЕ ПАПАЎНЕННЕ

Калі гандляр Чорнавіл адправіўся ў восеньскае падарожжа на поўнач, Міндоўг паслаў ганца да князя Выкінту, каб ён люцічаў не затрымліваў у сябе, яны для ўмацавання з заходняга боку. Таксама прасіў Выкінта, калі прыбудуць гандляры з люцічамі, паслаць да яго ганца, каб ён накіраваўся сустракаць іх у Гародні. Князь доўга чакаў ганца ад Выкінта, калі ганец прыбыў, то ён хутка з Альгердам і ганцом Песціла, адправіліся ў Гародню. Прыбылі яны да Жыгімонту раней, чым гандляры і люцічы. Князь Жывінбуд вельмі пастарэў, ледзь перасоўваўся, і ўсім кіраваў княжыч Жыгімонт. Абодва былі рады сустрэчы з Міндоўгам і Альгердам. У Жыгімонта падрасталі два сыны, Жывінмонту адзінаццаць лет, а Жыгінбуду дзевяць лет. Абодва

былі дужыя і трэніраваныя падлеткі. Нарэшце з'явіліся два драккары з гандлярамі і суправаждальные іх коннікі і пешыя. Пры набліжэнні іх да замка, Міндоўг убачыў на чале коннікаў рыцара Эйсманта і яго высокага, моцнага сына. Вось хто больш за ўсіх патрэбен яму.

Эйсмант распавёў:

— Мая хворая дачка памерла, і я з жонкай вырашылі перасяліцца. У Ростаке цяпер кіруе Генрых Борвін Трэці, які прыгнетае шматбожцаў, увёў суды на саксонскай гаворцы. Мы пахавалі дачку, і чакалі гандляроў. Калі яны прыбылі, то пагрузіўшы зброявую майстэрню і сям'ю каваля, мы адправіліся на ўсход. Нас суправаждаў ахоўнік гандляра Чорнавіла, а сваю жонку я пасадзіў у драккар. Калі прыбылі ва ўмоўленае месца вусця ракі Нёман аказалася, што мая жонка памерла. Яна вельмі перажывала смерць дачкі, а можа яе прадула на драккары. Жонку пахавалі там, каля вусця ракі Нёман. Мне гандляр Чорнавіл распавёў, што ты Міндоўг, стаў моцным князем. Да твайго княства яшчэ далёка?

— Рыцар Эйсмант, цяпер на поўдні прускай зямлі ўтвараецца моцны хрысціянскі Тэўтонскі ордэн рыцароў, таму нам патрэбна ўзмоцніць заходнія межы з мазурамі. Мы знайшлі для вас з люцічамі паселішча, якое пашырым і ўзмоцнім. За два лета пабудуем для вас замак і побач з паселішчам, будзе для цябе рыцар Эйсмант, тваё княства. За два лета трэба не толькі пабудаваць замак, але і навучыць моцных ваяроў.

— Добра, Міндоўг.

Гандляр Чорнавіл працягнуў шлях у Наваградак, а Жыгімонт са сваім ганцом, Міндоўг з Альгердам і ганцом Песціла, а таксама Эйсмант з сынам і сям'ёй каваля, і шэсцьдзясят дзвюма люцічамі адправіліся ў паселішча Сорбы (сучасная назва Вялікія Эйсманты).

У іх стаяў дваццаць адзін дом, вялікая частка жыхароў гэта перасяленцы з паселішчаў каля ракі Лабы, лужыцкія сорбы. У іх быў свой волхв, да якога прыходзілі за парадай яцвягі з суседняга паселішча Волаты(сучасная назва Волоцінь). Паселішча Волаты было ў двух верстах ад Сорбы, і гэтыя два паселішчы князь Жывінбуд аддае рыцару Эйсманту, як заснавальніку будучага княства. Само паселішча Сорбы знаходзілася пасярэдзіне

між Гароднем і Ваўкавыскам, і адносілася да гародзенскай зямлі. Князь Міндоўг перадаў дзесяць срэбных манет ганцу Песціла, каб ён іх аддаў ваўкавыскаму князю Даў'яту з просьбай дапамагчы ў будаўніцтве рыцару Эйсманту. Княжыч Жыгімонт паведаміў жыхарам паселішчы Сорбы і паселішчы Волаты, што іх князь рыцар Эйсмант, і ім трэба плаціць яму даніну і будаваць яму замак, і дамы для люцічаў. Вяртаючыся ў Воруту, князь радасна разважаў з Альгердам пра тое, што рыцар Эйсмант наладзіць добрае і моцнае княства з моцнымі ваярамі. Міндоўг быў упэўнен, што дапамога ў будаўніцтве ад княжыча Жыгімонта і князя Даў'ята, а таксама ад яго цесляроў і печнікоў забяспечыць добрыя дамы для люцічаў і замак для Эйсманта. Зараз вельмі важна наладзіць мірны дагавор аб узаемадапамозе з адасобнымі яцвягамі. Міндоўг радасна ўскрыкнуў

— Праз два лета Эйсмант пабудуе замак і наладзіць навучанне моцных ваяроў, а потым мы самі пойдзем у паход на гэтых тэўтонаў!

— Міндоўг, а ты заўважыў, што яго сын Даўмонт носіць два меча, злева і справа. Магчыма змагаецца двума мечамі адначасова.

— Так, заўважыў. У мінулае лета Вісмунт казаў, што сын Эйсманта, Даўмонт высокі, моцны і ўмелы ваяр. Цяпер я ў гэтым пераканаўся, а яму толькі шаснаццаць лет. Праз лета, або праз два, будзе сапраўдным волатам, як Доўбуд.

З Воруты князь адправіў да Эйсманта шасцярых цесляроў і двух печнікоў, важна было паспець да маразоў пабудаваць дамы для люцічаў. Воруцкія будаўнікі вярнуліся перад Калядамі і паведамілі, што ўсе люцічы зімуюць у новых дамах.

За два дні да вясны і новага 6739 лета (1231 па хрысціянскім календары) Міндоўг адправіў да Эйсманта семярых цесляроў і аднаго печніка. На вясновыя памінкі Радаўніцу, князь сабраў у Воруту Жыгімонта, Доўспрунка, Выкінта, Эйсмонта, Доўбуда, Скірмунта, Вісмунта і Альгерда. Яны памянулі князя Рынгольда, а потым Міндоўг распавёў пра становішча вакол іх саюзных княстваў.

Перад гэтай сустрэчай князь гутарыў з валхвом Вітаўтам і прасіў яго быць там. Волхв хварэў, з цяжкасцямі перасоўваўся і

адразу стаў сумнявацца, што зможа быць, але з дапамогай Воята і рыцара Ленгвіна прысутнічаў.

Міндоўг распавёў:

— Толькі ў нашых саюзных княствах і яшчэ ў прусаў, захавалась шматбоства, жамойтаў не ўлічываем таму, што яны не здольны супрацьстаюць хрысціянам. Князь Выкінт вельмі асцярожна далучае жамойтаў да рамесніцтва, ўжо іх волхв перастае лічыць каваля і ганчара вядзьмакамі. З часам яны навучацца ўсяму, але гэта будзе не хутка. На поўначы ўсё ўзбярэжжа мора захапілі рыцары Лівонскага ордэна, яны ж захапілі ніжнюю частку ракі Заходняя Дзвіна, асноўны гандлевы шлях полацкага княства. На паўночным захадзе паморʼя ў большай частцы хрысціяне, а цяпер побач з імі на поўдні прусаў, князь Конрад Мазавецкі перадаў Тэўтонскаму ордэну Хелмінскую зямлю. Зараз тэўтоны будуюць там свой замак, і будуць пагражаць нам з захаду сумесна з мазурамі. Нам вельмі важна абʼяднацца з адасобнымі яцвяжскімі князямі на захадзе. На поўдні русіны ваююць між сабой і з вуграмі, што вельмі кепска таму, як неўзабаве іх чакае напад Арды, вельмі моцнага ваеннага ханства. На ўсходзе саюзныя нам княства крывічоў, а за імі русіны больш асцярожные, чым паўднёвыя. Яны хоць і канстанцінопальскія хрысціяне, але як усе хрысціяне жадаюць захапіць усё больш зямель. Такія ж русіны на паўночным усходзе. Але паўночна-ўсходнія і ўсходнія русіны добра ведаюць нашу сілу, і цяпер трэба перастаць нападаць на іх. Для іх ёсць пагроза з поўначы ад Лівонскага ордэна, а таксама з поўдня і ўсходу ад Арды. Нам вельмі важна некалькі лет не нападаць і не рабаваць іх, каб яны перасталі глядзець на нас, як на ворагаў. А потым нам трэба заключыць з імі мірную дамову з узаемадапамогай. Іх ворагі нашы ворагі, і нам лепш сумесна разбіць гэтых ворагаў. Шкада, але саюзны нам нальшанскі князь Ердзівіл гэтага не разумее. Не валодаючы добрымі навыкамі бітваў з ваярамі, ён прагне паграбаваць і збегчы, але яго ваяроў заўсёды даганяюць і чатсково знішчаюць. У апошнім паходзе загінуло шмат ваяроў, у тым ліку і яго старэйшы сын.

На пры канцы сваёй прамовы, Міндоўг пакінуў самае важнае. Трэба было сказаць свайму старэйшаму брату Доўспрунку

што, нягледячы на тое, што князь Ердзівіл сябра табе, нельга ставіць пад пагрозу сілу і цэласнасць саюза княстваў. Калі б Міндоўг сказаў пра гэта Доўспрунку аднаму, то старэйшы брат кепска гэта ўспрыняў, а калі з гэтым прыдатныя ўсё, то магчыма ён задумаецца і зразумее яго. Тут спытаў волхв Вітаўт:

— Князь Міндоўг, а што нальшанскі волхв казаў перад паходам?

— Мне перадалі, што нальшанскі волхв папярэдзіў не ісці ў гэты паход. Але князь Ердзівіл і яго старэйшы сын Яргайла настойвалі на гэтым паходзе.

— Не паслухалі валхва, вось і забілі Яргайла, і шмат іншых ваяроў. Я ўжо вельмі стары, але ўпэўнены, што князь Міндоўг добра ведае як княжыць, і як ваяваць. Трэба добра слухаць князя Міндоўга, кепскага ён не пажадае.

Або волхв адчуў яго думкі, або ён думаў таксама, як і ён, але да гэтых слоў валхва, Міндоўгу няма чаго было дадаць. Усе былі прыдатныя з валхвом Вітаўтам, нават Доўспрунк хоць і быў некалькі разгублены, але таксама быў згодзен. Разведаўшы ў Эйсманта, што будаўніцтва замка і пабудоў атрымліваецца добра, Міндовг прасіў Выкінта знайсці жамойта, які сябруе з земгаламі, або з куронамі, каб ад іх выведаць пра задумкі Лівонскага ордэна напасці на Літву. Князь разумеў, што Лівонцы дамогшыся перамог над эстамі з дапамогай тэўтонаў, будуць і далей пашыраць свае заваёвы. Міндоўг у размове з Міколам пацікавіўся, як арганізаваць перадачу навінаў аб намёрах рыцараў Лівонскага ордэна. Мікола прапанаваў выкарыстоўваць весткі ад полацкіх гандляров, алё гэтая думка не спадабалась, з-за доўгага чакання гэтай навіны. Трэба знайсці спосаб як хутка перадаць навіну ў Воруту.

Мікола прапанаваў на поўначы полацкай зямлі каб двое ваяроў ў розных месцаў, чакалі навіну з паўночных земель і адзін з іх, які будзе больш паўднёвы, з важнай навінай хутка прыбудзе ў Воруту, а ваяр з поўначы хутка і непрыметна вярнецца назад. Навіны з пскоўскай і наўгародскай земель Мікола обяцаў арганізаваць сумесна з віцебскім ваяром Пятром. З гэтай думкай князь быў згодзен, і дадаў Міколе, што было б добра, калі сябры русіны распавядалі аб здеках лацінскіх рыцараў над жыхарамі

заваяваных зямель. Міндоўг спытаў у двух яго селаў Кодруна і Тумы:

— Ці засталіся ў вашых зямлях сябры, якія прыдатныя выведаць і перадаць у полацкія зямлі, звесткі аб намерах Лівонскага ордэна напасці на зямлі шматбожцаў?

Адказ быў аднолькавы:

— Князь, такіх нема, алё калі трэба такіх знайсці, то знойдзем.

Выдаўшы срэбраныя манеты, Міндоўг адправіў Міколу, Кодруна і Туму на поўнач, праз полацкія зямлі. Князь Ізяслаў упрасіў Міндоўга адпусціць на цёплае лета Марфу і васьмілетняга Война Войшалка ў Наваградак. Міндоўг ужо два лета, калі Марфа перасялялась у Наваградак, мілаваўся з маладой стройнай служанкай ў замку Ворута. Улетку ён аб'язджаў замкі і вялікія паселішча, каб наглядаць за ўмацаваннем абараназдольнасці іх, і за трэніроўкамі мясцовых ваяроў. Усе гаспадары ведалі, што пасля лазні Міндоўгу падабалась мілавацца з мясцовымі служанкамі. Вярнуўшыся з поўдня, гандляр Міхайла паведаміў, што Данііл Рамановіч умацоўвае адносіны з кіеўскім князем Уладзімірам Рурыкавічам. Князь ляхаў Уладзіслаў Танканогі памёр. Цяпер найбольшую сілу ў ляхаў мае гнезненскі князь Уладзіслаў Адоніч, які ў сваяцтве з ваяўнічым паморскім князем Светаполкам.

Неўзабаве з поўначы прыбыў малодшы сын гандляра Чорнавіла, Волімунт. Яго тата захварэў, таму гэта быў у Волімунта першый самастойны гандлярскі паход. Ён ведаў, што акрамя гандлярства, яму трэба старацца пачуць карысные для нас весці. Волімунт распавёў, што тэўтоны пабудавалі на рацэ Вісла замак Торн (сучасная назва Торунь), і пачалі будаваць яшчэ адзін замак на Вісле. Аб колькасці рыцараў разведаць не ўдалося. Вярнуўся ў Воруту Мікола. Ён распавёў, што ў паўночным полацкім паселішчы Валясы, каля возера Лісна, дамовіўся з двума ваярамі, якія прыдатны хутка перадаваць навіны ў Воруту. Там ён аддзяліўся ад Кодруна і Тумы, і накіраваўся ў Віцебск да сябра Пятра. Разам з ім накіраваліся ў Пскоў. У Пскове моцным купцам, карыслівы гандль з саксонцамі і гэтых гандляроў яны трымаюцца. Таму мы гаварылі з рыбакамі на рацэ Вялікая. Я гаварыў з багатым рыбаком на добрай лодцы, які прадае рыбу

заможнаму купцу і які задаволен сваім жыццем. Ён хваліў свайго купца і саксонскіх гандляроў. З ім дамовіцца было немагчыма. Пятро ґаварыў з бедным рыбаком, і распавядаў яму, што рыцары лацінскіх хрысціян здекуются над жыхарамі зямель земгалаў і сёлаў. Але гэты рыбак казаў, што яму трэба больш налавіць рыбы і прадаць яе багатаму рыбаку, а той за гэтых рыцараў.

— Вы з пскавічамі не дамовіліся?

— Князь Міндоўг, мы не дамовіліся з пскавічамі. Бедны рыбак стаў падазрона адносіцца да Пятра, і мы хутка накіраваліся ў Наўгарод. Там мы знайшлі аднаго рыбака, ён жа і ляснік, з якім дамовіліся. З ім мы вярнуліся ў паселішча Валясы і ўмовіліся, што за важную навіну перададзеную ў Валясы ён атрымае срэбраную манету. Князь, яшчэ трэба сказаць, што ў смаленскай зямлі неўраджай, але скупляюць зерне не ў Нальшанах, а ў менскім княстве. У віцебскім і мсціслаўскім княствах збожжавых менш, чым раней.

— Добра, Мікола. Будзем чакаць навіны з паселішча Валясы.

Неўзабаве ў Воруце з'явіўся Кодрун. Ён паведаміў, што сустрэўшысь з дасведчаным лясніком з суседняга паселішча селаў, доўга і добра пагаварылі, і дамовіліся аб перадачы навін у полацкае паселішча Валясы. Ляснік выказаў просьбу пераселіцца ў Воруту, але Кодрун папярэдзіў яго, што гэтага трэба заслужыць. Праз два дні з'явіўся Тума, і распавёў, што дамовіўся з земгалом з селішча, побач з зямлямі селаў. Пакуль толькі ад Выкінта не было вестак. Наведаўшы Наваградак, Міндоўг выклікаў у Вялікі замак Дангайла. Той паведаміў, што заўтра збіраецца з таварам адправіцца ў паселішча Выкінта, і запэўніў Міндоўга, што выведае, як здейсніваюць пажаданне князя. Вярнуўшыся праз тры дні, Дангайла распавёў, што ніхто з жамойтаў далёка на поўнач не хадзіў, і цяпер асцярогаецца хадзіць. Тады князь стаў шукаць іншыя магчымасці атрымання неабходных вестак.

На наступны дзень Міндоўг наведаў гандляроў Чорнавіла і Волімунта. Гандляры запэўнілі князя, што ў найбліжэйшам гандлярскім паходзе на поўнач, яны пагавораць з скаловамі і куронамі, якія за ўзнагароду перададуць важные навіны ў паселішча князя Выкінта. Для гэтага Міндоўг перадаў кавалачкі тканіны з вышыўкай, а князю Выкінту некалькі срэбранных манет для

разліка з гэтымі сведкамі. У сярэдзіне восені, вярнуўшыся ў Наваградак гандляр Волімунт, паведаміў Міндоўгу, што на зваротным шляху, скалоў з якім неаднаразова размаўлялі, запэўніў аб дамоўленасці з знаёмым куронам. Гэты дасведчаны скалоў сказаў, што яны таксама будуць збіраць важныя навіны для князя Міндоўга і перадаваць яму.

Зіма выдалася суровай, а на пры канцы яе вельмі захварэў волхв Вітаўт, і памёр. Ніхто не ведаў колькі яму лет, усе лічылі што ён самы старэйшы з усіх, каго яны калі-небудзь бачылі. Апошніе два лета ён казаў вельмі ціха, але калі ён казаў, то наступала поўная цішыня, нават стараліся не дыхаць, каб толькі пачуць кожнае яго слова. Кожны хто да яго прыходзіў, быў вельмі рады, калі ён згаджаўся ўзяць ад яго што-небудзь, будзь то ежу, або рэчы. Волхв Вітаўт гэта ведаў. Міндоўг неодноразова бачыў, што рамеснікі і гандляры прыносілі валхву найлепшае і каштоунае з свайго, алё ён не заўсёды і не з першага разу гэта прымаў, а калі яму нешта прыносіў бедачына, то ён гэта прымаў заўседы з умовой, што наўзамен той штосьці возьме ад валхва. Яго пахавалі побач з ідалам Воласа. На пахаванне прыбылі многія з найбліжэйшых месцаў, а таксама Выкінт і Эйсмант з сынам Даўмонтам з далёкіх месцаў. Не было толькі Доўспрунка, яго збраяносец паведаміў, што ён хварэе. Пасля святочнай пахавальнай трызне, Эйсмант пашкадаваў, што волхв Вітаўт памер і не прысвяціў яго сына Даўмонта ў рыцары. Яму семнаццаць лет, і ён высокі і моцны, як сапраўдны волат. Эйсмант распавёў Міндоўгу, што Даўмонт перамагае яго ў трэніровачных бітвах на мечах, ён хутчэй і моцней за яго.

— Даўмонт цяпер навучае ўсіх люцічаў і яцвягаў ваярскім навыкам, а я займаюсь будаўнічымі справамі.

— У моцны мароз таксама праводзіць навучальныя бітвы?

— Не, ў моцны мароз толькі на кароткі час выходзяць дроў пасекчы.

— Трэба пабудаваць вялікі шырокі дом, як у нас, і там праводзіць навучанне.

— Добра Міндоўг, пабудуем.

За тры дні да надыходу вясны і новага 6740 лета (1232 па хрысціянскім календары), Міндоўг накіраваў да Эйсманта пяць

цесляроў і аднаго печніка. Калі ў Воруце з'явіўся полацкі ваяр Копысь, князь у прадчуванні важных навін, адразу падумаў узяць у паход Эйсманта і Даўмонта з іх ваярамі, але навіна была больш мірная. У Полацку замест князя Святаслава Мсціславіча са смаленскай галіны абралі князем Брачаслава Васільковіча са старадаўняй полацкай дынастыі Ізяславічаў. Па ранейшему ў тых усходніх зямель, а таксама ў русін адчувалася нястача збожжавых. З'яўленне ў Воруце гандляра Міхайла, Міндоўг сустракаў з непакоем. Няўжо Арда напала на паўднёвых русін? Але навіны былі не настолькі трывожныя, хоць і не прыемныя. Зноў ў русінаў нема згоды. Чарнігаўскі князь Міхаіл Усеваладавіч пасварыўся з кіеўскім князем Уладзімірам Рурыкавічам, і пайшоў паходам на Кіеў. Кіеўскі князь звярнуўся за дапамогай да Даніілу Рамановічу, той прыбыў у Кіеў і паміры́ў іх. Атрымліваецца, Данііл Рамановіч добра зразумеў пажаданне Міндоўга. На цёплае лета Марфа з Войшалкам зноў перасяліліся ў Наваградак.

Князь Ізяслаў сам з дзевяцілетнім Войшалкам здзяйснялі верхавыя прагулкі на конях. Калі Міндоўг з'явіўся ў Вялікім замку Наваградка, Войшалк пахваліўся яму, як ён змагаўся на драўляных мечах з дзядулем. Гандляр Волімунт, які вярнуўся з поўначы, распавёў, што тэўтонскія рыцары пабудавалі на рацэ Вісла яшчэ адзін замак з назвай Кульм (сучасная назва Хелмно).

— Гандляр Волімунт, а што ты выменьваеш у Ростаке? Зброевай майстэрні Эйсманта няма.

— Князь Міндоўг, зброевую майстэрню Эйсмант прадаў гарбарнаму рамесніку Вітдоўгу, тату Вісманта. Там мячоў не робяць, толькі кальчугі і шлемы з даспехамі, а таксама гаспадарскія рэчы. Але рамеснік Вітдоўг скупляе мечы ў іншых кузняцоў, чые майстэрні вышэй па рацэ Варна. Да нашага прыбыцця, ён гэта назбірае і абменьвае на нашы футра, мёд, воск і іншыя тавары.

— А вы броняй з кім абменьваецеся?

— Князь, з Выкінтом мы два лета ўжо амаль нічым не абменьваемся, яны самі шмат могуць зрабіць. Ужо два лета мы абменьваемся ў двух паселішчах Булевічаў, гэта на ўсход ад ракі Нёман. Ім патрэбны мечы, кальчугі, шлемы і ганчарныя вырабы. Нам ад іх патрэбны футра, мёд і воск.

— Вы гандлюеце праз Дангайла?

— Так князь, праз Дангайла. Яго добра ведаюць жамойты і не асцярогаюцца.

У пачатку восені Міндоўг вырашыў убачыць навыкі Даўмонта ў бітве на мечах. За дзевяць дзён перад паездкай да Эйсманта, князь папярэдзіў Ленгвіна, што прагне паглядзець, як ён пазмагаецца на мечах з вельмі моцным і ўмелым ваяром, сынам рыцара Эйсманта. Усе гэтыя дзевяць дзён Ленгвін старанна і ўзмоцнена трэніраваўся. Акрамя Ленгвіна, князь узяў з сабой Альгерда і ганца Песціла. Міндоўгу спадабаліся пабудаваны замак і церам. Церам быў двухпавярховы з дрэва. У замку было таксама пяць дамоў, а ў пасадзе каля пяцідзесяці дамоў, пабудаваных у напрамку суседняга паселішча Волаты. Вышыня сцен замка, у выглядзе вертыкальнага частаколу, была каля трох маховых сажняў. У сцяне замка пабудаваныя дзве брамы з дазорнымі вышкамі, адна ў напрамку паселішчы Волаты, іншая ў працілеглым. Перад брамай ў напрамку паселішча, выкапаны глыбокі роў і зроблен пад'ёмны мост. Далей вакол замка працягвалі капаць роў.

Эйсмант быў рады прыбыццю Міндоўга, ён пахваліўся кузнецкай майстэрняй. Гэтая майстэрня была больш, чым у Ростаке. Каваль навучыў шэсць люцічаў вырабляць кальчугі, а двое люцічаў былі яго памочнікамі. Пабудавалі вялікі і шырокі дом для зімовых трэніровак ваяроў. Эйсмант падзякаваў за дапамогу ў будаўніцтве і за стварэньне княства. Міндоўг пажадаў пагаварыць з Даўмонтам, раней ён размаўляў толькі з татам.

— Даўмонт, я памятаю цябе каля кузні, чатырнаццаць лет таму.

— Я таксама памятаю цябе, князь Міндоўг.

— Ты вырас у сапраўднага волата, перамогаеш свайго тату. Мне вельмі цікава, як ты змагаешся з двума ваярамі.

Даўмонт абраў двух высокіх, моцных ваяроў. Іх паказальны бой скончыўся вельмі хутка перамогай Даўмонта. Міндоўг звяртаючыся да Ленгвіну адзначыў, што яго магчыма перамагчы толькі на предугадыванне дзеянняў, і раптоўна хуткіх і рашучых дзеянніў самому. Ленгвін быў на галаву ніжэй Даўмонта, але ён быў вельмі хуткі ў сваіх дзеяннях, і пры адгадванні намера волата, а таксама пры нядбайнасці Даўмонта, можна разлічваць на поспех.

Ленгвін першым зрабіў падманны рух, і ад першага ўдару Даўмонта ўшоў, але ён не паспеў наблізіцца на паражаюччаю адлеглаць, як моцны ўдар знізу па шчыце, атадвінул яго назад, а хуткі наступны ўдар па мечы Ленгвіна, і ён быў абяззброены. Міндоўг зразумеў, што Даўмонт самы моцны ваяр, якога ён бачыў. Ён павіншаваў Даўмонта з перамогай, і звяртаючыся да Эйсманта сказаў:

— Шкада, што волхв Вітаўт памёр, але ў вас ёсць свой волхв і нас тут чацвёра рыцараў, таму я лічу, што магчыма прысвяціць Даўмонта ў рыцары.

Даўмонт радасна заўсміхаўся, і Эйсмант быў задаволены гэтай прапановай Міндоўга. Эйсмант распавёў валхву Родмунту як правесці абрад прысвячэння ў рыцары. Абрад прайшоў пры ўсіх жыхарах замка Эйсманты, а ўвечары была ўрачыстая трапеза. Наступным днём вяртаючыся ў Воруту, Міндоўг быў рады, што з'явілася моцнае княства на важным заходнім накірунку, тым больш, што гэта княства Эйсманта.

Прыбыўшы ў Воруту, гандляр Міхайла распавёў, што кіеўскі князь Уладзімір Рурыкавіч падарыў Даніілу Рамановічу вымарачны надзел Мсціслава Мсціслававіча, горад Торческ, за дапамогу ў мірнай дамове з чарнігаўскім князем Міхаілам Усеваладавічам. Прынеслі вестку аб тым, што жонка Доўспрунка нарадзіла дачку. Міндоўг пажадаў, каб Марфа нарадзіла сына, кепска моцнаму князю мець аднаго сына.

З Ваўкавыска прыбыў ганец і паведаміў:

— Князь Міндоўг, наш дазорны Кгаштолд ад свайго сябра Алвада даведаўся, што яго князь з ваярамі абрабавалі мазурскае паселішча, а таксама іншы князь яцвягаў больш паўднёвы, абрабаваў іншае паселішча мазураў.

— Яны толькі абрабавалі, ці яшчэ і спалілі?

— Князь, яны толькі абрабавалі.

— Князя Конрада Мазавецкага гэтыя паходы раззлаваюць. На поўначы прусы нападаюць, на ўсходзе ліцвіны грамяць, дык яшчэ і яцвягі сталі нападаць. Калі сваіх сіл недастаткова, то ён цяпер з кімсьці дамовіцца, і нападзе ў адказ. Аб'яднаецца ён з ляхамі, а нападзе не толькі на аднаго князя, а на некалькіх. Зараз адасобленым яцвяжскім князям неабходна аб'ядноўвацца. Калі

яны не жадаюць з намі аб'ядноўвацца, то яны хаця б аб'ядналіся з астатнімі адасобленымі яцвягамі. Перадай гэтыя мае думкі князю Дав'яту, а таксама яцвягу Алваду, каб ён іх перадаў свайму князю.

Калі ганец адправіўся ў зваротны шлях, Міндоўг працягваючы развяжаць, прыйшоў да высновы, што яцвяжскія адасобленыя князі будуць вымушаныя аб'ядноўвацца з імі. Тады будзе вялікае аб'яднанае яцвяжскае княства шматбожцаў. Пасля Калядаў прынеслі сумную навіну з Гародні. Памёр князь Жывінбуд. Новым князем абралі Жыгімонта. Узімку князь Міндоўг аб'ехаў заходнія княствы і пераканаў князёў Даў'ята, Эйсманта і Жыгімонта, каб не аказвалі дапамогі адасобленым яцвягам, калі на іх нападуць мазуры з ляхамі. Трэба, каб яны самі прапанавалі аб'ядноўвацца з намі.

Апошнія два лета волхв Вітаўт, з-за дрэннага здароўя, не прымаў удзел у абрадавых святах. Воят таксама не праводзіў абрады, пакуль волхв Вітаўт быў жывы. Цяпер на Калядах Воят быў вельмі старанным і актыўным, што спадабалось Міндоўгу. У трыццаты дзень пасля вясновага раўнадзенства новага 6741 лета (1233 па хрысціянскім календары), Воят раніцай сабраў усіх мужчын Воруты на паляну ў лесе на Ярыліну гару. Яны купаліся ў ранішняй расе, накіраваліся да Ярыла з асабістымі просьбамі, і давалі асабістыя зарокі, а потым пракладвалі першую баразну ралі. У гэты дзень дзякавалі пастухам і ахоўнікам ад драпежнікаў хатніх жывел. З раніцы збіралі першую расу, яе лічылі моцнай і выкарыстоўвалі пры абрадавых катаннях мужчын па зямлі, для павялічэнне іх здароўя волата. Гэтую расу выкарыстоўвалі для аздараўлення ад хворасці. У гэты дзень пачынаюць расці травы, па дрэвам струменіца сок, ажываюць птушкі і звяры, закладваюць будучы ўраджай.

Міндоўг памятаў, што Ваўкавыскі князь Даў'ят казаў, што ў іх у гэтую раніцу мужчыны сыходзілі ў лес карміць ваўкоў. Князь быў здіўлен і задаволен, калі ўбачыў, як волхв Воят увечары ўдзельнічаў у выбарах Ярілхі сярод дзяўчат, апранутых у белую адзежу. Галаву Ярілхі ўпрыгожылі вянком, і прыхілілі да самотна стаяшчаму дрэву, а астатнія дзяўчыны вадзілі вакол яе карагоды і спявалі песні.

З'явіўшыўся ў Воруце гандляр Міхайла распавёў, што вугры, якія валодалі Галічам, захацелі завалодаць часткай валынскіх зямель. Рыхтуючы ім адпор, Даніiл Рамановіч паехаў у Кіеў да свайго саюзніка князя Уладзіміра, той заклікаў на дапамогу палавецкага хана Коцяна. Гэта аб'яднанае войска сустрэлася з уграмі ў Пшэмысле, і ўгры адступілі.

Да канца лета ў Воруце завершылі будаўніцтва абаронных збудаванняў, задуманых Міндоўгам. У замку былі дадаткова пабудаваны два доўгіх дамы з двума печкамі, і пяць для жыхароў воруцкага пасада. Навакол крайніх дамоў пасада выкапаны глыбокі роў, праз які быў збудаваны адзін здымны мост. Гэты мост злучаў Воруту з адзінай бяспечнай дарогай. Налева і направа ад гэтай дарогі былі зробленыя розныя хітрыя і ўтоеныя пасткі. Толькі праз дзясятую частку вярсты ад моста магчыма было бяспечна адхіляцца ад дарогі для збору садавіны, ягад і грыбоў у лесе, а таксама каб пасвіць хатняе быдла. Два каменямёты, ўстаноўленыя ў замку, былі накіраваныя на дарогу перад мостам.

Пабудаваныя ў замку ледавікі, свірны і іншыя пакоі для захоўвання прадуктаў, забяспечвалі аблогу замка на працягу двух сотняў дзён. У восень ганец ваўкавыскага князя Даў'ята, які прыбыў у Воруту, паведаміў:

— Князь, на адасобных яцвягаў напаў з мазурскім войскам княжыч Земавіт, сын князя Конрада Мазавецкага. Яны з'явіліся ў паселішча, якое паўночней княства, дзе Алвад. Мазуры разрабавалі паселішча і спалілі яго. Пасля гэтага ўсе яцвяжскія княства да Берасця аб'ядналіся і пайшлі ў паход на ляхаў, на поўдзень ад Берасця.

— Чаму на ляхаў, нападалі ж мазуры?

— Князь, яны вырашылі, што блізкія мазурскія паселішчы разрабаваны, а паселішчы ляхаў не. Калі аб'яднанае яцвяжскае войска разрабавала вялікае паселішча ляхаў і вярталася назад з палонам, на іх напалі войска ляхаў і войска князя Даніiла Раманавіча з полаўцамі. Ляхі з русінамі адабралі палон і многіх яцвягаў пабілі, і гналі да іх паселішчаў. Два паселішчы яцвягаў яны абрабавалі.

— Яны гэтыя паселішчы спалілі?

— Князь, яны іх не спалілі. Толькі абрабавалі з цяжкасцамі, спаліць не далі жыхары. У гэтых яцвягаў нават дзяўчыны трапна страляюць з лука.

— А як на гэтыя бітвы глядзіць князь Берасця?

— Князь, Берасце самы старажытны горад яцвягаў. У ім шмат гандляроў і рамеснікаў. Замак агароджвае тры сцены, і з усіх трох бакоў рэкі. Яго вельмі цяжко захапіць. Горад лічаць цэнтрам гандлярства. Туды прыбываюць гандляваць з усіх бакоў. Князя абіраюць здольнага адстаяць горад, а таксама дамовіцца з усімі аб міре. Таму ён нікому не саюзнік, і мае намер быць заўсёды самастойным. Калі у полян быў моцны князь Казімір, які валодаў ляхамі і мазурамі, то Берасце плаціла яму даніну.

— Добра, перадай князю Даў’яту, я чакаю што ў хуткі час гэтыя адасобныя яцвяжскія князі запытаюць саюза з намі.

Праз дванаццаць дзён прыбыў да Міндоўга гандляр Волімунт. Ён мовіў:

— Князь, тэўтонскія рыцары разграмілі прусаў пры Сіргуне ў Помезаніі. Тэўтонам дадапамагаў паморскі князь Светаполк. Зараз тэўтонскія рыцары пачалі будаваць у Помезаніі крэпасць Квідзы.

— Я памятаю, што паморскі князь Светаполк ваяваў супраць саюза князёў у якім быў Конрад Мазавецкі. Мазурскі князь запрасіў тэўтонскіх рыцараў на сваі зямлі, а цяпер князь Святаполк ваюе ў саюзе з запрошанымі Конрадам Мазавецкім. Мне не зразумелы думкі паморскага князя. Ён хрысціянін або шматбожац?

— Князь, у яго жонка русінка, канстанцінопальская хрысціянка. Ён таксама магчыма хрысціянін, але я ведаю, што многія паморы шматбожцы. З усяго, што я чуў пра яго, магу сказаць аб ім, як аб вельмі ваяўнічым князе. Ён думае выключно аб асабістой карысці. Дзеля карысці ён будзе ваяваць у саюзе з шматбожцамі супраць хрысціян і наадварот.

— Зразумело, дзякуй.

Увосень аб’язджаючы паселішчы навагрудского і воруцкага княстваў, а таксама замкі сваіх былых рыцараў, Міндоўг пераканаўся ў тым, што працы па будаўніцтве абаронных збудаванняў вядуцца, а таксама і трэніроўкі ваяроў. Колькасць ваяроў павя-

лічвалася і трэба было правесці вучэнні па ўзаемадзеянні ваяроў у ўмовах бою. На гэтае вучэньне ён сабраў ваяроў з усіх паселішчаў Воруцкага княства, а таксама з замкаў сваіх былых рыцараў. Войска Міндоўга атрымалась з двух сотняў цяжкай конніцы і двух сотняў лёгкай, а таксама асабістай дружыны князя з дваццаці рыцараў і збраяносцаў. Вучэнне прайшло, як і раней ў полі каля паселішча Карэлчы.

У пачатку зімы прыбыў у Воруту полацкі ваяр Копысь і распавёў, што па ранейшему ў русінаў не хапае збожжавых. Полацкія, віцебскія і мсціслаўскія гандляры прадалі русінам мала збожжавых, самім мала ў гэтае лета. З Наўгарода дайшла да Полацка вестка, што саксонскія гандляры прадалі ім шмат збожжа. У князя Міндоўга была з Копысем дамоўленасць, калі не было важных вестак, усёроўна полацкі ваяр да Каляд прыбывае ў Воруту з весткамі. Князю было неабходна ведаць становішча на ўсходзе.

Міндоўг быў незадаволены тым, што дзесяцілетні Войшалк без ахвоты змагаўся на мечах з сынам рыцара Альгерда. Князю надакучыло глядзець, як сын Альгерда іншым разам падаваўся Войшалку, і ён прымацаваў двух рыцараў Ленгвіна і Яўнута за навучаннем бітваў на мечах. Яны былі розныя між сабой. Ленгвін быў не высокі, але хуткі ў прыняцці рашэнняў і дакладнасці іх, шмат разважаў. Яўнут быў высокі і моцны, і гэтым карыстаўся перад іншымі. Войшалк больш паважаў Яўнута, але Ленгвін больш дамогся ў абучэні княжыча за кошт хітрасці. Ленгвін пераканаў Войшалка, што ведае адзін сакрэтны рух пасля якога магчыма перамагчы нават моцнага рыцара. Гэты сакрэтны рух яны вывучалі ўдваіх, каб ніхто не бачыў дваццаць дзён, робячы ўсё хутчэй і хутчэй. Калі княжыч добра вывучыў гэты рух, то ён прымяніў яго супраць сына Альгерда, і атрымаў сапраўдную перамогу. Міндоўг гэта бачыў і павіншаваў Войшалка з гэтай перамогай, і параіў сыну стаць моцным, і штодзенна ўжываць гэты рух.

На трэці дзень вясны і новага 6742 лета (1234 па хрысціянскім календары) прыбыў да Міндоўга гандляр Міхайла і паведаміў, што галіцкія баяры зімой пачуяўшы, што памірае вугорскі каралевіч Андрэй, перайшлі на бок князя Данііла Рамановіча.

Неўзабаве пасля смерці каралевіча Даніiл Рамановіч заняў Галіч. Міхайла таксама дадаў, што ляхамі ў Кракаве кіруе князь Казімір. Праз два дні пасля гандляра прыбыў у Воруту ганец ад ваўкавыскага князя Даў'ята і паведаміў, што пяць адасобных ятвяжскіх князёў прапануюць дамовіцца з саюзнымі княствамі. Князь Міндоўг быў вельмі задаволены гэтай навінай, і ўказаў ваўкавыскаму ганцу адправіцца да Жыгімонта і Эйсманта, для збору гэтых князёў на трэці дзень у Ваўкавыску. Князь Міндоўг узяў з сабой Альгерда і свайго ганца Песціла. Калі Міндоўг прыбыў у Ваўкавыск там ужо чакалі пяць адасобных яцвяжскіх князёў, а таксама Жыгімонт са сваім ваяводам, і Эйсмант з Даўмонтам. Першае чаму здзівіўся Міндоўг было тое, што побач з адным з князёў была дзяўчына ваяўніца, напэўна яго адзіная дачка. Ваяўніца была з мячом у похвах, а таксама з лукам і стрэламі. Міндоўг ніколі не бачыў дзяўчыны з такім рашучым выразам твара і ў ваяўнічым адзенні. У яго дзяцінстве маці расказвала аб амазонках, але тое было, як у казцы на ноч, а тут гэта перад ім.

Пры сустрэчы Міндоўга, ваўкавыскі князь паведаміў, што ўсяго шэсць адасобных яцвяжскіх князёў, адзін з іх не прыбыў. Напэўна не дамовіліся між сабой. Звяртаючыся да адасобных князёў, Міндоўг сказаў:

— Князі, цяпер для шматбожцаў настае ліхі час. Лацінская Царква сваімі рыцарамі ўсё больш захоплівае зямлі шматбожцаў. Наш заходні сусед князь Конрад Мазавецкі для барацьбы з намі яцвягамі і з прусамі запрасіў на сваі зямлі саксонскіх рыцараў Тэўтонскага ордэна хрысціян. Яны пабудавалі два замка на рацэ Вісла, зараз будуюць трэці замак, і ў мінулае лета разбілі адно з войскаў прусаў. На поўначы, паўночней жамойтаў, у ліваў утварылась рыцарства хрысціянскага Ордэна мечаносцаў. Ужо тры дзясяткі лет яго прапаведнікі з дапамогай рыцароў, гвалтоўна дакучаюць сваім адзіным Богам у землях ліваў, куронаў, земгалаў, латгалаў. Калі ім было б карысліва яны б і да жамойтам прыйшлі. Але ў жамойтаў, як вы ведаеце, няма чаго ўзяць. Паўднёвыя русіны, адзінаццаць лет таму былі разгромленыя вельмі вялікім аб'яднаным ханствам Ардой. Гэтая Арда захапіла вельмі шмат зямель, абклала іх данінай і абявязала даваць ім вяроў, якіх яны

навучаюць для захопу іншых зямель. Русіны не аб'ядноўваюцца між сабой, каб узмацніцца і даць адпор Ардзе, а наадварот ваюць між сабой і аслабляюць адзін іншага. Русіны, не разумеюць, што Арда неўзабаве прыйдзе на іх зямлі, а пасля іх, прыйдуць і на нашы зямлі. Таму вельмі важна нам аб'яднацца і пры першай пагрозе з усякого боку, вялікім аб'яднаным войскам даць адпор. З князем паўднёвых русін Даніілам Рамановічам у нас ёсць мірны дагавор. На вашы княства ён напаў таму, што з вамі ў яго нема такога дагавора.

Князь ваяўніцы, казаў за ўсіх:

— Князь Міндоўг, цяпер папярэдзь яго што ў нас з вамі ёсць дамова.

— Добра. Пашлю да яго свайго ганца з папярэджаннем аб нашай дамове. Вам князі, трэба па маёй вестцы хутка сабраць сваіх ваяроў і прыбыць у азначанае мной месца. Вас я буду прыцягваць толькі пры цяжкім становішчы, калі ўсіх ваяроў з адзінаццаці нашых княстваў будзе мала. Усе вашы ваяры будуць падпарадкавацца мне, або таму каму я ўкажу.

— Мы згодны, князь Міндоўг. Мы ведаем князь, што ты ва ўсіх баях перамог.

Ваяўніца падумаўшы, што тата запамятае, спытала:

— Князь Міндоўг, а мазуры і іх рыцары?

— Мазуры лацінскія хрысціяне, для нас ворагі, і мы для іх заўседы будзем ворагамі. Сумесна з русінамі мазуры зараз не прыйдуць. Магчыма яны прыйдуць адны, або з ляхамі. Ляхі таксама лацінскія хрысціяне.Трэба каб вашы дазорные наглядалі заўседы за іх зямлямі. Калі дазорные мазураў або ляхаў накіраваюцца на вашы зямлі, трэба іх захапіць і спытаць аб іх намерах, і пра колькасці іх ваяроў. Потым арганізаваць сумесны адпор з усемі бліжэйшымі суседзямі, і паслаць ганцоў за князямі Даў'ятам, Эйсмантам і Жыгімонтам, а таксама за мной. Калі вашы дазорные разведаюць, што невялікі атрад з рыцарамі ідуць у вашы зямлі, або мінуюць іх, або ідуць паблізу, то магчыма на іх напасць. Тут вельмі важна, каб дазорные доўга наглядалі за імі і перадавалі аб іх вандроўках. Я ведаю, што ў вас ёсць такія дазорные, іх трэба мець не меншы за трох у адным напрамку. У нас сярод палонных ёсць немала добрых мазураў,

якія доўгачасовай працай і жаданнем жыцця сярод нас, сталі вольнымі і заможнымі. Яны паважаюць валхва і ведаюць хлусню лацінскіх прапаведнікаў. У адрозненне ад такіх мазураў, рыцары хрысціянскіх ордэнаў, асабліва тэўтонаў, гэта фанатыкі іўдзейскага бога, якім загадалі забіваць тых хто не такі фанатык, як яны. Міру ў нас з імі ніколі не будзе, або мы іх, або яны нас.

— Зразумело, князь. Мы згодны з табой, — запэўнілі ўсе адасобныя князі.

У гэтае лета князь Міндоўг не дазволіў Марфе і Войшалку пераселіцца ў Наваградак. Ён растлумачыў князю Ізяславу, што Войшалку трэба штодзенна трэніравацца ў бітве на мечах з сынам Альгерда, пад наглядам рыцараў Ленгвіна і Яўнута.

Калі Міндоўг вярнуўся з аб'езду новых рыцарскіх княстваў, яму паведамілі, што знахаркі вызначалі цяжарнасць князёўны Марфы. Князя гэтая навіна вельмі задаволіла, нарэшце ў яго будзе другі сын. Ён быў упыўнены, што будзе сын і таму не распытваў пра гэта ў знахарак. Міндоўг стаў асцярожно адносіцца да Марфы, да яе капрызам.

Аднойчы Марфа запрасіла на вячэру канстанцінопальскага прапаведніка. Той падумаў, што князь Міндоўг прагне хрысціцца ў канстанцінопальскага хрысціяніна, і прыйшоўшы на вячэру, стаў чытаць з вялікай кнігі выслоўі яго бога. Марфа насцярожілась і чакала, што Міндоўг зараз возьме гэтага прапаведніка за шкірку і выкіне яго з церама. Але князь улічывая, што Марфу трэба асцярогаць ад хвалявання і тое, што за сталом быў Войшалк, толькі ўсміхаўся і з гэтай усмешкай глядзеў то на Марфу, то на Войшалка. Сытна павячэраўшы, Міндоўг перапыніў галоднага прапаведніка:

— Развясяліў ты мяне, прапаведник. Усё што ты чытаў з вялікай кнігі, гэта неразумныя і недакладныя рэчы і з'явішча. Ты жадаеш каб я ў гэта паверыў. Але я веру ў тое, што мне і іншым зразумело і дакладно. Мне не зразумелы словы і ўчынкі вашага юдэйскага рабіна. Мабыць там, дзе жывуць гэтыя юдэйскія рабіны такія ўчынкі зразумелы іхнім жыхарам, але не тут і не нам. Для нас галоўнае дастатак і шчасце нашых суплеменнікаў, а таксама добрая прырода, аб якой клопацяцца нашы багі.

Яму было шкада гэтага благога, галоднага і неразумнага прапаведніка. Ён устаў з-за стала і выйшаў, каб прапаведнік перастаў гаворыць усю гэтую хлусню, і каб яго накармілі.

У пачатку восені да Міндоўга прыбыў гандляр Міхайла і распавёў, што кіеўскі князь Уладзімір Рурыкавіч зноў пасварыўся з чарнігаўскім князем Міхаілам Усевалодавічам. Кіеўскі князь запытаў падмогі ад Данііла Раманавіча, і ён рыхтуецца да паходу на Чарнігаў, а чарнігаўскі князь для супраціву ім уступіў у саюз з Северскім князем Ізяславам Уладзіміравічам.

— Міхайла, атрымліваетця Данііл Рамановіч згодзен з аслабленнем свайго княства, дзеля абароны свайго саюзніка, няздольнага да мірнага дагавору, кіеўскага князя. А не лепш было зноў іх памірыць? І сілы б захавалі абедзве спрачаюшчыясі бокі, і жыццё сваіх блізкіх. Больш за ўсё мяне здзіўляй тое, што ахвотныя да бітвы бокі, свае ж супляменнікі, не чужынцы з іншай гаворкай і іншымі звычаямі. Кіеўскія князі выбарныя, або спадчынныя?

— Князь, у іх лествічнае права атрымання ў спадчыну. Стол пераходзіць да старэйшага ў родзе, ад старэйшага да малодшага сына, а потым да пляменніка. Па гэтым парадку, старэйшыя пляменнікі часта сварыліся з малодшымі дзядзькамі.

— Атрымліваецца слабы і няздольны да мірнага дагавору князь, атрымлівая спадчыну можа шкодзіць княству і яго ніхто не зрушыць.

— Князь, раней так было, а цяпер заможныя людзі, ў іх яны называюцца баяры, на сваё багацце наймаюць уласную дружыну, і да іх прыслухоўваюцца князі. У Галічы вельмі ўплывовы іх баяры.

— А як жа выбарнасць у русінаў?

— Князь, гэта толькі ў паўночна-ўсходніх русінаў, у Наўгародзе і ў Пскове. Раней кіеўскі князь быў галоўны, і ён прызначаў ім пасадніка, які сумесна з заможнымі людзьмі выбіралі князя. Гэты выбарны князь займаўся толькі вайсковымі справамі.

— У нас, у Наваградку не так.

— Князь, раней Наваградак і Гародня, а таксама іншые яцвяжскія гарады, каб заваяваць незалежносць ад іншых, галоўным лічылі вайсковую справу. Таму ўказы моцнага князя-вая-

ра былі абявязковы для усіх. Ужо лет сорак ўсе суседзі ведаюць нашу вайсковую сілу.

— Гэта добра. І далей трэба, каб усе ўказы князя былі абявязковыя для ўсіх, а пасаднік і далей будзе выразнік думкі заможных людзей. У мяне ў Воруце нема вялікай колькасці рамеснікаў і гандляроў, і мне не патрэбен пасаднік.

Нечакана на восеньскія памінкі Дзяды прыбыў у Воруту старэйшы брат Доўспрунк. Старэйшы брат яшчэ больш распаўнеў, пакутаваў дыхавіцай, скардзіўся малодшаму брату на слабое здароўе. Толькі калі казаў пра сваіх сыноў, станавіўся ажыўленым і хваліўся, што збраяносцы вывучылі абодвух сыноў у добрых вояроў. Доўспрунк прасіў Міндоўга ўзяць яго сотню з сынамі ў паход. Сыны вельмі прасілі аб гэтым. Перад Калядамі прыбыў да Міндоўгу ваяр Копысь. Ён распавёў:

— У канцы мінулай зімы князь Яраслаў Усеваладавіч са сваімі пераяслаўскімі ваярамі і з наўгародскімі ваярамі ўзялі ў аблогу Дорпат (Юр’еў, сучасная назва Тарту). Сваіх людзей ён адпусціў рабаваць у наваколлі і каб сабраць для ўсяго войска ежу. Частка мечаносцаў зрабіла вылазку з Дорпта, іншая частка з Одэнпе, але русіны іх пабілі, вялікая частка загінула, калі абламаўся лёд. Русіны захапілі хлеб. Потым лівонцы заключылі мір з князем Яраславам. Мой дасведчаны русін распавёў, што ранняй восенню літоўскі атрад прыйшоў да Русе. Яны ўвайшлі на торжышчы і сталі рабаваць. Калі ўсе жыхары аб’ядналіся і сталі з імі змагацца, то тыя кінуліся ўцякаць. Русін дадаў, што ў таропецкай воласці іх нагнаў князь Яраслаў Усеваладавіч са сваім атрадам і многіх пабіў.

— Ты ведаеш, што гэта за атрад?

— Не ведаю, князь. Я начаваў у сястры, ў пасялішчы Люцічы, недалёка ад Нальшан, і распытваў пра паходы нальшанскіх атрадаў, але ўсе казалі, што паходаў не было.

— Копысь, па дарозе ў Полацк, зайдзі ў Лужышчы і разведай ў сотніка Вітмонта пра гэты атрад. Калі дакладна распазнаеш пра гэты атрад, то скачы сюды, а калі не распазнаеш, то паспрабуй больш падрабязней выведаць у русінаў. Я не думаю, што гэта атрад Доўспрунка, ён у мяне быў недаўна. А больш на іншых я не думаю. Калі Копысь адправіўся на ўсход, Міндоўг

стаў разважаць пра князя Выкінта. Яго дзядзька рыцар з вопытам і не пойдзе ў непадрыхтаваны паход. У яго няма сыноў, дзеля капрызаў якіх магчыма рызыкнуть, як нальшанскі князь Ердзівіл. Перад сустрэчай з ім трэба пагаварыць з Дангайло, ён адзіны хто ведае імкненне Выкінта.

Дангайла запэўніў князя Міндоўга, што не прыкмеціў жаданне князя Выкінта да паходу. Застаецца нальшанскі князь Ердзівіл, але гібель старэйшага сына павінна было прымусіць перагледзіць яго думкі аб асабістых вайсковых здольнасцях. Міндоўг вырашыў пачакаць васямнаццаць дзён. Калі Копысь не вернецца ў Воруту, значыць нема сведак аб тым, што атрад быў нальшанскі. Князю Міндоўгу было вельмі важна вызнаць пра гэты атрад. Пакуль нема жорсткіх проціборстваў з моцным ворагом, трэба было ведаць хто можа здрадзіць. Васямнаццаць дзён прайшло, а Копысь не з'явіўся.

У думках Міндоўг закрануў Булевічаў. Дазорныя Булевічаў маглі шмат разоў назіраць за палачанамі, латгаламі і русінамі. Запрошаный Дангайла паведаміў:

— Князь, я нядаўна вярнуўся ад Вышімута Булевіча, паселішча якога знаходзіцца на поўдзень ад іншых Булевічей, побач з нальшанскім і полацкім княствамі. Гэта першае паселішча куды я трапляю з таварам, таму Вышімут адбірае лепшые мячы, ільняныя кашулі і іншые тавары. Потым я накіроўваюся да Ердзівілу, а ўжо потым да Спрудейку. У апошні раз я ў Вышімута абменяў увесь свой тавар на яго футра і мёд, таму адразу вярнуўся. Калі нешта застаецца апошняму Спрудейку, то я абменьваю з маёй зніжкай, так мне загадаў гандляр Волімунт.

— Дангайла, хто лепей размауляе на жамойцкай гаворцы ты, або Булевічы?

— Князь, я лепей размауляю з імі.

— Дангайла, наступным разам пагавары без Булевіча з жамойтамі аб паходзе іх у чужынскія зямлі. Яны былі з князем Выкінтом, або без яго?

— Добра, князь Міндоўг.

Напярэдадні вясновага раўнадзенства новага 6743 лета (1235 па хрысціянскім календары) да Міндоўга прыбыў гандляр Міхайла і мовіў:

— Князь Міндоўг, умяшанне Данііла Раманавіча ў свару паўднёва-русінкіх князёў прывело да таго, што Міхаіл Чарнігаўскі заняў Галіч. Северскі князь Ізяслаў Уладзіміравіч рабуе Кіеў.

— Вось што атрымліваецца, калі сябруеш са слабым і неразумным князем. Пайшоў аказваць дапамогу неразумнаму князю і сам аслабеў. А што будзе, калі Арда цяпер нападзе? Ад гэтых аслабленых паўднёвых русін нічога не застанецца. Ардынцы не адчуюць супраціву і пойдуць на нас. Міхайла, а хто-небудзь з заходніх дапаможа Даніілу Рамановічу?

— Князь, магчыма ўгры, яны цяпер у добрых адносінах.

— Добра Міхайла, дзякуй.

Праз дзесяць дзён з Любчы прыбыў ганец ад князя Вісманта з запрашэннем на яго вяселле са старэйшай дачкой лясніка пушчы, дзе любіў паляваць князь Ізяслаў. Але на вяселле князь паслаў з падарункам Альгерда, а сам чакаў народзін сына ад князёўны Марфы. Міндоўг быў вельмі расчараваны, калі Марфа нарадзіла дачку. Ён восем дзён не жадаў паглядзець на нованароджаную, потым супакоілся і вырашыў, што ў свой час аддаць яе ў жонкі на карысных умовах.

## ГЛАВА 13

# ДАЎМОНТ

Княжыч Даўмонт толькі спусціўся з ганка церама, як убачыў, што праз браму замка хутка праскакаў іх ваяр. Саскочыўшы з коня каля ганка, ваяр прабягаючы Даўмонта вымавіў адно слова — рыцары. Княжыч яго ведаў, гэта быў адзін з дазорных, таму паспяшаўся за ім да таты. Дазорны паведаміў, што калі яны прасоўваліся на захад, да іх на сустрэчу з'явіўся дазорны адасобных яцвяг, і ўсхваляванна распавёў аб невялікім атрадзе мазураў, сярод якіх было восем вельмі моцна ўзброенных коннікаў, а таксама дваццаць узброенных коннікаў і трыццаць пешых ваяроў.

— Яны прасоўваліся на поўдзень у шасці верстах ад мяжы. Я паскакаў сюды, а ён да свайго князя. Мы дамовіліся, што нашых ваяроў будуць чакаць каля паселішча князя.

Эйсмант указаў неадкладна сабраць палову сотні цяжкіх коннікаў і сорак лёгкіх коннікаў з лепшымі лучнікамі. Калі прасоўваліся да ўмоўленага паселішчу, Даўмонт пачуў, як дазорны паведаміў, што ў паўднёвым напрамку ёсць невялікі лес, а ў ім забалочанае возера. Гэты лес знаходзіцца каля дарогі, якая ідзе на поўдзень. Калі прыбылі да паселішча князя яцвягаў, Эйсмант сказаў, што будзе достаткова палову сотні коннікаў з лукамі. Ваяводам яцвяжскіх коннікаў была дачка князя Тэкля. Аб'яднаны атрад князя Эйсманта накіраваўся на поўдзень. Па дарозе князь распавёў аб задумцы бою супраць мазураў з рыцарамі. Князь паспеў размясціць атрад у лесе.

У той час калі атрад мазураў з рыцарамі з'явіўся недалёка ад лесу, маленькі атрад князя Эйсмонта выйшаў з лесу. Наперадзе атрада прасоўваліся Эйсмант і Даўмонт, за імі два дзясяткі лёгкіх коннікаў, а ззаду дзясятак спешаных ваяроў. Князь і княжыч спыніліся, і зрабілі выгляд, як быццам разглядаюць атрад мазураў. Потым упэўнеўшысь, што гэта мазуры разгарнуліся і як быццам хутка кінуліся ў лес. Пешыя ваяры на самай справе хутка пабеглі, а конныя, як быццам замарудзіліся разгарнуцца назад. Мазурскія коннікі на чале з рыцарамі хутка накіраваліся на адступальны атрад. Ззаду адступальнага атрада былі князь і княжыч.

Калі першыя два рыцара амаль нагналі па вузкай лясной дарозе двух апошніх цяжкіх коннікаў, тыя раптоуна разгарнуліся ў розныя бокі. Першыя два рыцара не спыняючысь сумесна з конямі апынуліся ў балоце. Даўмонт хутка разгарнуўся і ўгледзіўшы, што іншая пара рыцараў трошкі павольна, але таксама апынулася ў балоце, напаў на бліжэйшага рыцара. Нечаканы для рыцараў манеўр яцвягаў, збянтэжыў іх, і яны не змаглі аказаць годнага супраціва Даўмонту, які хутка забіў траіх рыцараў. Ён спыніўся тады, калі пачуў таямнічае гучанне з балота. Гэты гук магчыма быў ад магутнага цмока або яшчуру, які пражывае ў гэтым балоце. Але імгненнае здранцвенне ад гэтага гука мінуло, трэба было знішчать ворага. У кожнага з астатніх мазурскіх

коннікаў трапіла па дзве, або тры стрэлы. Толькі адзін далёкі коннік хутка разгарнулся і кінуўся на ўцёк. Даўмонт накіраваўся за ім, але яго апярэдзілі дазорны і князёўна. Калі выскачылі з лесу, то бліжэйшым праследоваццелем быў дазорны, але хутка яго апярэдзіла князёўна. Гэта сапраўдная амазонка трошкі прыўзнялася ў стрэмя і трапна паразіла ўцякача. Паглядзеўшы на поле, Даумонт убачыў, што коннікі шматбожцаў узялі ў кругавую аблогу мазураў, і знішчаюць іх з лука. Пакуль пераможцы збіралі зброю і даспехі пераможных, да княжыча наблізілася князёўна.



— Княжыч Даўмонт, бачыла як ты забіў трох рыцараў. Мяне вельмі ўразіла.

— Князёўна Тэкля, а мяне вельмі ўразіла як ты забіла ўцекача. Да іх пад’ехаў князь Эйсмант.

— Князёўна Тэкля, па падзеле здабычы вам застаецца зброя і даспехі, а нам коні. Самыя лепшыя зброі і даспехі былі ў першых двух рыцараў, якія трапілі ў возера. Пакуль яшчэ магчыма, укажы сваім ваярам іх дастаць.

— Князь Эйсмант, дзякуй за шчодры падзел здабычы. Нам не хапае зброі і даспехаў, але ніхто не асмеліцца заходзіць ў гэтае возера. Тыя два рыцара здабыча яшчура. Князь, я буду вельмі ўдзячна калі дапаможаце перавезці на конях усіх загінулых мазураў да возера. Гэта будзе наша даніна яшчуру за поспех у гэтым баі.

— Добра, князёўна Тэкля. Зараз гэта зробім.

Калі ваяры князя Эйсманта і князёўны Тэклі сумесна і хутка перавезлі загіблых да возера, на полі каля лесу нічога не засталася. Эйсмант і Даўмонт былі вельмі задаволены гэтым, таму што будзе незразумела куды знік атрад з рыцарамі. А ў лацінскіх хрысціян узнікнуць розныя падазронасці. Як толькі князь Эйсмант вярнуўся ў свой замак, ён паслаў ганца ў Воруту з весткай пра гэты паход. А на другі дзень у Эйсманты прыбыў князь Міндоўг з Альгердам. Міндоўг доўга не атрымліваў добрых навін і таму быў ахвот да падрабязнасцей таго паходу. Калі пачуў Эйсманта, то быў вельмі задаволен Эйсмантам, Даўмонтом і Тэкляй. Нячакана прыбыў ганец ад князя Ігелда, таты Тэклі. Ён перадаў, што просіць Міндоўга, Эйсманта, Альгерда і Даўмонта да сябе на вячэру. Князь Ігелд быў вельмі рады князям, а таксама Даўмонту і Альгерду. А жыхароў княства вельмі ўразіў Даўмонт. Чуткі аб незвычайным волаце, які адным рухам рукі рассякаў на дзве часткі жалезных ваяроў, пераказвалі ва ўсім княстве. Даўмонт сядзеў за сталом побач з Тэклей. Спачатку ён прыслухаўся аб чым кажуць Міндоўг з татам і гаспадаром, але ён ведаў іх далейшую размову, таму ён звярнуўся да Тэклі.

— Князёўна Тэкля, хто навучыў цябе так добра скакаць на кані і трапна страляць з лука?

— Княжыч Даўмонт, у мяне быў брат,старэйшы на адно лета. Два лета таму яго забілі. Усё жыццё да гэтага мы былі разам. Разам вучыліся скакаць на конях, даглядаць за імі. У мяне ў пяць лет быў свой конь. Цяпер у мяне іншы, ранейшы памер ад старасці. З сямі лет я і брат вучыліся трапна страляць з лука. Нас навучаў наш дзядзька па маці. Ён як і наша маць з люцічаў. Калі былі маленькімі, яны з бацькамі перасяліліся сюды з люціцкай зямлі. Нашу маць узяў у жонкі яцвяжскі князь, наш тата. Братоў у мяне больш нема, а ёсць малодшая на тры лета сястра. Яна не

прагне вучыцца трапна страляць з лука. Яна прагне выйсці замуж за моцнага князя і нараджаць дзяцей.

— Але ты таксама жадаеш нараджаць дзяцей.

— Гэта не галоўнае. Тата хворы ад ран, а на нас нападаюць хрысціяне. Трэба навучыць вялікае войска. Раней надзея была на брата, а цяпер на майго мужа, або на мужа маёй малодшай сястры.

— А дзядзька, які раней вас навучаў?

— Два лета таму, калі забілі брата, яму сякірай моцна патрапілі ў правы бок. Цяпер у яго правая рука боўтаецца, як пуга. Знахаркі не могуць вылечыць правы бок ад розных цяжкіх хвароб. Таму на дзядзьку не маем надзеі.

— Я навучаў сваіх ваяроў. Магу навучыць вашых ваяроў.

Учыўшы гэта, Тэкля вельмі ўзрадавалася, што прыкмецілі князья. Князь Ігелд пацікавіўся:

— Тэкля, што цябе так ўзрадавала?

— Тата, княжыч Даўмонт паабяцаў правесці навучанне нашых ваяроў. Гэтая навіна для князя Ігелда была вельмі да спадобы.

— Мы будзем вельмі ўдзячныя княжычу Даўмонту за гэта. Аб княжычэ Даўмонте ў нас кажуць, як пра самага магутнага волата, які быў у гэтых зямлях.

Наступным днём Даўмонт пачаў навучаць ваяроў яцвягаў. Пасля двух дзён навучання, Даўмонт вырашыў вечарам не вяртацца ў Эйсманты, а спыніцца начаваць у паселішча яцвягаў. Гэтаму былі рады ўсе, асабісто князёўна Тэкля. Для Даўмонта гэта было не толькі шкада часу на штодзенныя перамяшчэння туды і на зварот. Ён лічыў добрай справай дапамагчы свайму суседу і саюзніку, асабліва пасля таго, што казала князёўна Тэкля. Княжыч добра памятаў аб яе рашучым пераследзе ўцекача і яе трапным стрэле. Даўмонт думаў, што апавяданні аб амазонках гэта дзіцячые казкі, але ён сам бачыў, як гэтая маленькая князёўна ператваравалась ва ўмелую ваяўніцу, і зрабіла тое што не змог дазорны. Яе думкі аб павышэнні баяздольнасці іх войска, сведчылі не аб асабістай зацікаўленнасці, а пра клопаце за ўсё княства. Гэта вельмі рэдкая зъява сярод дзяўчат. Даўмонт упершыню сустракаўся з такой з’явой. У Ростаке ён быў для

дзяўчат вельмі жаданым да знаёмства. Высокі, моцны і прыгожы, ён быў марай ўсіх маладых дзяўчат. З некаторымі яму падабалася мілавацца, але ні з адной з іх, ён не змог доўга мець зносіны. З Тэкляй наодварот, яму было цікава і ён доўга з ёй меў зносіны.

Эйсманту спадабалась рашэнне Даўмонта, калі ён прапанаваў навучаць яцвяжскіх ваяроў. Актыўная дапамога свайму саюзніку, сябру, гэта актыўны ўдзел у сваёй долі. Калі ты не удзельнічаеш у сваёй долі, то іншые ў ёй ўдзельнічаюць на сваю карысць за кошт цябе.

З'явіўся ў Воруце Дангайла і распавёў Міндоўгу, што ён шукаў магчымасці пагаварыць з жамойтамі без Вышімута Булевіча. Перад яго селішчам ён убачыў і падышоў да жамойта з роспытам пра паход, але той сказаў, што нічога не ведае пра паход. Зноў Вышімут Булевіч абменяў увесь мой тавар на яго. Таму я разгарнуўся назад у Воруту.

— Дангайла, ты адзін адвозіш тавар да Булевічаў?

— Князь, ёсць у мяне памочнік Пуцята. Мы ўдваіх адвозім тавар.

— А ён разумее жамойцкую гаварку?

— Князь, ён таксама размаўляе з жамойтамі.

— Наступным разам трэба каб ён крыху адстаў ад цябе. Пакуль ты будеш размаўляць з Вышімутом, трэба каб ён нешта карысліва для жамойта абмяняў, а потым распытаў у яго пра паход.

— Добра, князь Міндоўг, так і зробім.

Прыбыўшы ў Воруту, гандляр Міхайла распавеў, што северскі князь Ізяслаў Уладзіміравіч заняў кіеўскі стол. Ён яго далучыў да свайго пасля смерці князя Уладзіміра Рурыкавіча.

— Князь, у гэтым паходзе мой сын Міхалок своечасово заўважыў разбойнікаў і сумесна з ахоронцамі трапна забілі іх з лука.

— Твой сын не толькі шмат чытае, а і трапна страляе з лука. У якой мясціне гэта адбылося?

— Князь, гэта было каля Кіева. Ваяры новага кіеўскага князя многіх разрабавалі, вось яны і падаліся ў разбойнікі.

— Галоўнае каб да нас яны не накіраваліся.

— Князь, тураўскія, пінскія і валынскія князі іх да нас не прапусцяць.

— Добра, Міхайла.

На восеньскія памінкі Дзяды ў Воруту прыбыў князь Эйсмант. Пасля таго, як яны памянулі князя Рынгольда, Эйсмант пахваліўся, што ў іх стала шмат коней, у тым ліку і ад скрыжаванне месцовых нізкарослых коней з баявымі конямі гецкай і іншых парод. На пры канцы размовы Эйсмант сказаў, што яго сын часта бывае ў князёўны Тэклі.

Перад Калядамі аб'явіўся ў Воруце ваяр Копысь, і запэўніў князя, што ў нальшанскай зямлі ён у многіх распытваў пра паход, але ўсе казалі, што паходу не было. Каляды прайшлі не так весела, як раней. Князёўна Марфа хварэла часцей чым маленькая дачка. Міндоўг да гэтага стаў прызвычацца, ў яго было з кім мілавацца. На пры канцы зімы Міндоўг пераканаўся, што Марфа па свайму здороўю не зможа нарадзіць дзіця. Ён стаў больш патрабаваць ад сына Войшалка стараннасці да вучобы ваярскім навыкам. Праз дванаццаць дзён пасля вясновага раўнадзенства новага 6744 лета (1236 па хрысціянскім календары), да Міндоўга прыбыў гандляр Міхайла. Ён паведаміў, што Кіеў пераходзіць з рук у рукі. Спачатку князь Яраслаў Усеваладавіч з дапамогай пераяслаўцаў і наўгародцаў заняў кіеўскі стол. Праз кароткі час ён з Кіева сышоў у Уладзіміра-Суздальскае княства, да сваего старэйшага брата. А кіеўскім сталом завалодаў князь Міхаіл Чарнігаўскі, які сышоў з Галіча, пакінуўшы ў ім свайго сына Расціслава.

— Чую гандляр Міхайла, што гэтыя чаргаванне русінскіх князей не да дабра. Ардынцы назіраюць за гэтым і неўзабаве іх лёгка захопяць.

Праз дваццаць дзён у Воруту прыбыў усхваляваны гандляр Волімунт. Ён паведаміў:

— Князь, Папа Рымскі абвясціў крыжовы паход на Лютву.

— Лютву?

—Так, князь. У Колабреге, калі адпускалі соль на драккар, чуў што набіраюць шмат рыцароў супраць бязбожнікаў Лютвы, па закліку Папы Рымскага.

— Магчыма супраць люцічаў у вусце Нёмана?

— Не, князь. Казалі, што набіраюць у дапамогу рыцарам Лівонскага Ордэна супраць багацеяў Лютвы. Нават ёсць жадаючыя з ліваў, селаў, латгалаў і эстаў.

— А эсты чаму на нас апалчыліся, мы ж на іх не нападалі?

— Князь, сямнаццаць лет таму эстаў заваяваў кароль Даніі Вальдэмар Другі Пераможны, а ён па маці ўнук полацкага і менскага князя Валодара Глебавіча.

— Шмат рыцараў збіраецца?

— Князь, пры мне грузіўся вайсковы карабель з конямі і правіянтам. Чуў, што праз дваццаць дзён трэба чакаць вайсковы карабель з Гамбурга.

— А калі быў у вусці Нёмана, дасведчаны скалоў пра гэта нешта казаў?

— Не, князь. Яны чакаюць нападу тэўтонаў з Мазовіі і Куявіі.

— Важныя весткі. Дзякуй, гандляр Волімунт. Пасля сыходу гандляра, Міндоўг выклікаў да сябе Міколу і двух селаў, Кодруна і Туму.

— Ёсць вестка, што Лівонскі ордэн з войскам у шмат рыцараў прагне напасць на нас. Цяпер яны збіраюць вялікае войска. Калі пазбіраюцца, а я думаю, што хутка, таму што іх цяжкай конніцы патрэбны сухія дарогі, то адразу пойдуць у паход. Мне трэба ведаць якімі дарогамі пойдуць з Рыгі, і колькі часу гэта займе. Вы ведаеце тыя месціны і я чакаю вашыя думкі.

Першы сказаў Мікола:

— Князь, самы кароткі шлях на поўдзень ад Рыгі гэта праз земгалаў. З земгаламі меў зносіны Тума.

— Так, князь. Я быў у земгалаў. У іх вельмі шмат азёр, балот і малых рэк. Чым усходней і бліжэй да селаў, тым лепш дарога.

Яго сапыніў Мікола:

— Князь, праз земгалаў яны не пойдуць. Яны пойдуць толькі адной дарогай, ўздоўж ракі Заходняя Дзвіна, гэтая дарога даўжэй, алё надзейная. Лівы і селы подвласны Лівонскім рыцарам, а земгалы толькі на палову, іншая палова пад уладай Рыжскага арцыбіскупа Альберта. Вялікае войска можа прайсці толькі па адной шырокай дарозе ўздоўж Заходняй Дзвіны, і якая злучае Рыгу з замкамі Кукенойс і Герцыке. Князь, мы ў паходзе былі не па гэтай дарозе, асцярогаліс выходзіць на яе. Нашаму невялікаму атраду было цяжко ісці не па той вялікай дарозе, а вялікаму войску будзе вельмі цяжко. Яны загодзя завязуць шмат правіянту ў Кукенойс і асабліва ў Герцыке. Да Герцыке дойдуць

улегчы, а потым з правіянтам возьмуць заходней і праз селаў патрапяць да жамойтаў. Колькі часу гэта займе цяжко казаць, трэба ведаць ці будуць у войску пешыя ваяры, і якой колькасці.

— Так, сгодзен. Кодрун, пасылаю цябе на торжыще ў Рыгу з косторезнымі вырабамі. Тры дні табе для навучання гэтым навыкам ў нашага рамесніка. У торбе ў цябе будуць косторезные вырабы і інструмент, каб мог нешта падправіць па жаданню пакупца. Тума, цябе не пасылаю таму, што з такім шрамам рамеснікаў не бывае. Будеш суправаджаць Кодруна да надзейнага паселішча селаў. Пакуль Кодрун будзе ў Рызе, табе трэба знайсці надзейнага села, або земгала згоднага быць правадніком у гэтага рыцарскага войску па землях селаў, жамойтаў і земгалов. Па дарозе да селаў заўважце два паўночных паселішча жамойтаў, рыцарам на разрабаваньне. У адным з гэтых паселішчаў будзе чакаць аднаго з вас наш ганец. Кодрун, калі пачуеш, што рыцарскае войска выступае ў паход бліжэйшым часам, то хутка скачаш да Тумы, і высылайце ганца да мяне. Калі паход будзе не ў бліжэйшы час, то Кодрун скача ў паселішчы жамойтаў і адпраўляе ганца да мяне, а самі ўдваіх прадоўжыце шукаць правадыра для рыцарскага войска. Калі дамовіцеся з праваднікам дайце яму адну сярэбраную манету, скажыце што пасля таго як ён завядзе іх па нашаму знаку ў балоцістую мясціну жамойцкіх або земгаловскіх зямель, атрымае яшчэ дзесяць такіх манет.

Калі селы сышлі, Міндоўг загадаў Міколу ўзяць дадатковага коня і скакаць у паселішча Валасы, адкуль чакаюць важныя навіны ад русінскага напрамку, і пакінуць там гэтага коня. Па дарозе Міколе трэба заехаць у Нальшаны і папярэдзіць князя Ердзівіла аб чаканым нападзенні лівонскіх рыцараў. Міндоўг перадаў Ердзівілу аб магчымых з’яўленнях лівонскіх разведнікаў. З гэтай асцярогой, князь разаслаў ганцоў ва ўсе паўночныя княства і вялікія паселішчы. У той жа дзень Міндоўг прыбыў у Наваградак да князя Ізяслава і выклікаў пасадніка Тулунта, Дангайла і наваградскага сотніка Вітольда.

Міндоўг указаў Тулунту арганізоўваць праверку ўсіх чужынцаў, асабісто на торжышче. Сотніку Вітольду трэба было правесьці навучэньне ўсіх ваяроў Наваградка. Міндоўг папярэдіў Дангайла, што ён з рыцарам Альгердам, двое лесарубаў і двое

дазорных з Наваградка, а таксама пяць вояроў з Воруты праз тры дні адправяцца на поўнач жамойцкай зямлі. Воруцкіе селы распавялі, што на поўнач ад паселішчы Спрудейкі Булевіча ёсць тры малых паселішчы жамойтов, кіруючых валхвамі. Гэтым валхвам трэба растлумачыць аб пагрозе хрысціянскіх рыцараў і з імі дамовіцца. У самым паўднёвым з гэтых трох паселішчаў мы абсталюем стаянку нашага вялікага атрада, а ў двух паўночных паселішчах мы падрыхтуем бяспечны адыход жамойтаў праз усталяванне некалькіх пастак і перашкод. На наступны дзень у Воруту прыбыў князь Эйсмант, выкліканы праз ганца. Эйсмант параіў, каб з Ваўкавыска і Гародні не забіраць вялікую колькасць ваяроў, а пакінуць ад магчымага нападку тэўтонскіх рыцараў, якія маглі дамовіцца з лівонцамі аб аднačасовым паходзе з розных бакоў. Князі дамовіліся, што ў Ваўкавыску застануцца ўсе ваяры, Эйсмант адправіць у паход сотню з Даўмонтам, а Жыгімонт адправіць у паход сотню лёгкай конніцы з лепшымі лучнікамі. Трое гэтых заходніх князёў у выпадку нападу тэўтонаў будуць сустракаць рыцараў яшчэ ў лясных чашчах адасобных яцвяжскіх князёў, і чакаць падмогі ад слонімскага князя. Эйсмант запэўніў Міндоўга, што дамовіцца з князем Ігелдам аб накіраванні да яго двух яго дазорных, якія маглі наглядаць дзень і ноч на дрэвах. На чацвёрты дзень, пасля навіны ад Волімунта, Міндоўг адправіў атрад Альгерда да жамойтаў.

На наступны дзень ён правёў вайсковае навучанне не толькі сваіх ваяроў, а і ваяроў княстваў сваіх былых рыцараў, а таксама ваяроў свайго старэйшага брата Доўспрунка з яго сынамі. На гэты раз вучэнне праводзіў у нізіннай мясціне з малазаболоченными купінамі. Міндоўг арыентаваў ваяроў цэліць дзідай не ў каня, а ў вершніка, ўлічываючы што цяжкі конь з рыцарам у балоцістай мясціне будзе непаваротлівым. Вярнуўся Мікола і паведаміў, што нальшанскі князь Ердзівіл, выслухаўшы навіну сказаў, што ён хворы ў паход не пойдзе, а дасць тры сотні ваяроў пад кірованем сотніка Лаўрэна. З гэтых трох сотняў дзве крэўскія і адна лужыцкая.

— Нальшанскіх ваяроў шкадуе? Ён прагне каб за яго гінулі тыя хто ім незадаволены, а сваіх нальшанскіх ён ахоўвае. Ер-

дзівіл напэўна не разумее, што калі будзе недастаткова ваяроў і нас разграмяць, то па першае прыйдуць у нальшанское княства. На Полацк яны не пойдуць, у іх дагавор. Калі б ён не быў сынам паважаного гандляра Чорнавіла, я б даўно яго памяняў. З-за яго неразумных дзеянній і гібелі Яргайла, хварэе Чорнавіл. З гэтым потым разбярэмся, а ад русін ёсць навіны?

— Князь, ні ад русін, ні ад Полацка і Віцебска навін нема.

— Добра, Мікола. Чакаем весткі з поўначы.

## ГЛАВА 14
# БІТВА ПРЫ САЎЛЕ

Прыбыўшы з поўначы ганец Курыла, перадаў ад Кодруна, што паход рыцараў будзе не раней чым праз сорак дзён. Міндоўг праз тры дні адправіў ганца Курыла назад на поўнач, а таксама сумесна з ім два майстра па вырабе лодак з Гурнофіла, чатыры цесляра з Ліды і Жырмунты, а таксама два лесаруба з Родна. Князь даў ганцу наказ на дарогу, каб Кодрун праз трыццаць дзён зноў пайшоў на торжышча ў Рыгу, а да гэтага каб ён з Тумой шукалі правадыра і высвятлілі магчымасць і жаданне земгалаў напасць на лівонскіх рыцараў з тылу, калі ліцвіны будуць нападаць спераду. Зносіны з селамі сведчаць, што большасць селаў засталіся шматбожцамі. Селы Кодрун і Тума могуць растлумачыць на сваім прыкладзе добрыя адносіны з ліцвінамі, і пра лепшый дабрабыт сёння, чым раней. А калі земгалы не давераюць ім, тады князю Выкінту трэба зьявіцца да іх з люцічамі і жамойтамі, пераканаць іх, а потым і дапамагчы сваёй сотняй знішчаць лівонскіх рыцараў.

Падлічыў колькасць ваяроў, якіх можа прыцягнуць да паўночнага паходу, Міндоўг накіраваў князя Доўбуда з яго збраяносцамі да нальшанскага князя Ердзівіла з папярэджванем яго, што для паходу трэба яшчэ адна нальшанская сотня ваяроў. Праз два дні з’явіўся ў Воруце Доўбуд і паведаміў, што Ердзівіл згадзіўся адправіць у паход нальшанскіх ваяроў сотніка, які не-

задаволен князем. Міндоўг быў упэўнен, што так і будзе, таму толькі ўсміхнуўся пасля таго што пачуў. Калі чатыры сотні нальшанскіх ваяроў, незадаваленых Ердівілом будуць вяртацца з параможнага паходу, то князь будзе вельмі асцярогацца іх. Міндоўгу трэба зрабіць усё магчымае, каб так яно і адбылося. Праз трыццаць восем дзён рыцар Альгерд даслаў у Воруту Дангайла. Ён мовіў:

— Князь, Кодрун другі раз быў на торжышча ў Рызе, куды прадаўжаюць прыбываць заходнія пілігрымы, ахвочыя напасці на Лютву. З чулых размоў, Кодрун высвятліў, што цяпер вырашаюць хто ўзначаліць гэты паход, таму раней чым праз трыццаць дзён паходу не будзе.

— Ужо даўно мінула Купалле, хутка восень з дажджамі. Як яны збіраюцца ваяваць? Іх маруднасць нам на карысць. Добра, што яшчэ?

— Князь, жамойцкія волхвы добра дачыніліся да нашых вестак і прапаноў. Жамойты дапамагалі будаваць простыя дамы за перашкодамі і пасткамі, былі згодныя пакінуць ў старых дамах футра для разрабавання лівонцамі. Я зменяў іх лепшые футра на ганчарныя вырабы. Усё што ты князь загадаў, мы зрабілі. У самым паўднёвым з трох жамойцкіх паселішчах, мы пабудавалі два вялікіх дома без дымахода і без драўлянай падлогі, але з добрым дахам. Каля гэтых дамоў высеклі шмат дрэваў, і выкарчавалі іх. На рацэ трошкі спераду гэтага паселішчы пабудавалі на двух пнях маленькі дом для дазорных, каб яны далёка па рацэ слухалі. Змайстравалі дзве лодкі, на якіх заплываюць далёка на поўнач для дазору, і для рыбалкі. Правадыра знайшлі з земгалаў. Тума знайшоў паселішча, дзе не было лівонскіх рыцараў і іх прапаведнікаў. Гэта паселішча Саўле, знаходзіцца ў нізменнасці, сярод малых рэк і балот. Калі першы раз Тума размаўляў з земгаламі, то іх волхв казаў, што для напада на лівонскіх рыцараў трэба дамовіцца з іншымі земгаламі. Наступным разам у паселішча Саўле прыбылі рыцар Альгерд, Тума, Кодрун і я. Тады волхв сказаў, што з бліжэйшымі земгаламі ён дамовіўся. Рыцар Альгерд зрабіў здагадку, што лівонцы прапануюць земгалам сумесна з імі напасць на Лютву. У гэтым выпадку трэба адразу казаць, што ім боязна напасць на моцных ліцвінаў, а потым

сказаць, што яны згодныя пры ўмове, што ўсе захопленыя сякіры пакінуць ім. А калі ліцвіны пачнуць змагацца з лівонскімі рыцарамі, тады напасць на іх з тыла. Іх волхв згодзіўся з гэтым сказаўшы, што так лепей.

— Добра. Колькі ваяроў у земгалаў і якія яны?

— Князь, цяжка сказаць аб колькасці ваяроў. Магчыма дзве сотні. Большасць іх пешыя ваяры з лукамі, сякірамі і дзясятак з мечамі.

На наступны дзень Міндоўг адправіў ганца і два цесляра з Воруты да рыцара Альгерда. Яму трэба было гэтых двух цесляроў і яшчэ чатырох што там былі, накіраваць да земгалаў, для пабудовы каля паселішча Саўле становішча для сотні ваяроў Выкінта. Праз два дні прыбыў у Воруту, выкліканы князь Выкінт. Міндоўг распавёў яму аб апошніх навінах.

— Дзядзька, табе трэба з сотняй праз дваццаць дзён прыбыць да падрыхтаванага становішча каля паселішча Саўле, і ў час нашага нападу на лівонцаў, сумесна з земгаламі напасць на іх з тыла.

— Князь Міндоўг, у мяне нема сотні ваяроў. У мяне з зброяносцамі і навучанымі люцічамі і жамойтамі, толькі восемдесят адзін ваяр.

— Добра, праз дваццаць дзён я накірую да цябе ганца, і ты з восемдзесят адным ваяром адправішся да земгалаў.

— Добра князь, буду чакаць. Праз адзінаццаць дзён прыбыў Копысь і паведаміў князю, што лівонскія рыцары запрашаюць наўгародцаў і псковічоў да сумеснага нападу на Лютву. Пакуль далі згоду толькі пскавічы, іх будзе дзве сотні.

Наступіла восень, атрад князя Выкінта накіраваўся на поўнач. За сем дзён да восеньскага раўнадзенства, прыбыў ганец ад Альгерда і перадаў, што праз пяць дзён войска лівонскіх рыцараў пад кіраўніцтвам магістра Ордэна мечаносцаў Волквіна выступае ў паход на Лютву. У атрадзе Волквіна будзе пяцьдзесят рыцараў і каля трыццаці сотняў ваяроў, палову з іх пешыя. Міндоўг разаслаў ганцоў у ўсе княства, акрамя нальшанскаго, з указам каб заўтра да вечара ўсе запатрабаваныя атрады былі ў паселішча Ліда. Без уліка атрада князя Выкінта і земгалов ў Ліду прыбылі семнаццаць сотняў, з лідскімі ваярамі. Больш за ўсіх

прыбылі з Наваградка — чатыры сотні, з воруцскага княства — тры сотні. Раніцай, пасля сняданку атрад Міндоўга накіроваўся ў Нальшаны. Па прыбыцці, мясцовы волхв правёў з яго канём абрад варажбы на поспех паходу. Волхкаванне выявіло, што паход будзе поспеховым. Міндоўг з атрадам у дваццаць адну сотню адправіўся на поўнач. Нягледзячы на меншую колькасць ваяроў, князь разлічываў на разгром Лівонскага атрада.

Усе ваяры ў атрадзе разумелі, што гэта бітва будзе вырашальнай для іх і іх супляменнікаў. Яны ведалі аб гэтай пагрозе з дзяцінства, і яшчэ тады яны марылі, што калі вырастуць, будуць моцнымі ваярамі і праявяць сабе гераічна ў гэтым вырашальном бою. Амаль усе ваяры атрада Міндоўга мелі вопыт бітваў. Яны былі на лёгкіх нізкарослых конях і ведалі ў якіх умовах будуць біцца, і з якім ворагам. Усе ваяры ведалі, што імі кіруе самы разумны і моцны князь, які заўседы перамагаў. У Лівонскім атрадзе было толькі пяцьдзесят рыцараў фанатыкаў, гатовых дзеля хлуслівых прапаведнікаў біцца на смерць. Астатнія былі прагныя паграбіць, упэўненные што такім вялікім войскам і з моцнымі рыцарамі, яны лёгка здабудуць сабе багатую здабычу. Іх кіраўнік не мог ведаць ваярскіе здольнасці гэтых розных ваяроў. Аб гэтым думаў князь Міндоўг перад пачаткам паходу. Ён сумневаўся ці добра зрабіў, што не ўзяў больш сотняў ваяров з заходніх княстваў, алё пасля варажбы ў Нальшанах, быў упэўнен у перамоге над хрысціянамі.

Калі прыбылі ў жамойцкае становішча, Міндоўг накіраваў шмат дазорных ў паўночныя напрамкі. Рыцар Альгерд распавёў князю, што аднаго земгала з рознастайнымі нажамі ён адправіў гандляваць у Герцыку. Іншага земгала сумесна з селам Кодрунам, ён адправіў у бліжэйшее паселішча селаў на поўдзень ад Герцыке. Іх мэта, каб ім прапанавалі быць праваднікамі атрада лівонцев і далучыць земгалоў да гэтага войску. За гэтым наглядае сел Тума сумесна з адным дазорным. У наступны дзень прыбыў дазорны і паведаміў, што земгалы згодзілісь з прапановай лівонцаў напасць на Лютву. Раніцай прыбыў дазорны і паведаміў, што Лівонскі атрад перайшоў мяжу з жамойтамі, і накіроўваецца ў самае паўночнае паселішча жамойтаў. Князь Міндоўг звярнуўся да валхва з прапановай, каб ён з дапамогай

Перуна наслаў моцны дождж на гэту мясцовасць. Усе наглядалі, як волхв узняўся на самае высокае ўзвышша і паднятым посохам, як то таемніча меў зносіны з Перунам.

Паступова белыя воблака цямнелі, птушкі пачалі лётаць нізка да зямлі і рацэ, жабы пачалі моцна квакаць, з'явілася пена ў рацэ, лісце дрэваў паварочваліся, мухі пачалі ліпнуць і кусаць, а камары гудзець. На поўначы пачуліся гукі грымоты. Волхв пачаў сыходзіць з узвышша. Вецер стаў моцным, бліснула маланка і пайшоў моцны дождж. Ваяры схаваліся ў падрыхтаванае сховішча. На рацэ былі вялікіе бурбалкі, дождж быў працяглы. Раніцай смуга пазналася ад ракі, ішоў дробны і халодны дождж. Дазорные паведамілі, што Лівонскі атрад разрабаваў два жамойцкіх паселішчы, адзін з дамоў яны падпалілі, а потым павертались на поўнач.

Сёння было восеньскае раўнадзенства, свята Багач. У шматбожцаў радаснасць ад добрага ўраджая. На гэтым новым ураджаю згадваюць на будучыню, алё князю Міндоўгу не трэба гадаць, ён ведаў, што сёння яны пераможаць лівонцаў. Гледзячы на твар сваіх ваяроў, Міндоўг з здзіўленнем бачыў, што ўсе яны з радасцю і нецярплівасцю чакаюць яго знака да нападу на лівонцаў. Але неўзабаве хтосьці загіне, кагосьці моцна параняць. Паважлівы погляд на князя ўпэуніў іх, што яны гэта ведаюць і ўсётакі чакаюць гэтага з гонарлівым тварам. Можа гэта з-за таго, што шматбожжа ваяроў заадно з Перунам, і яно ўсіх перамогае. Дазорны паведаміў, што Лівонскі атрад вяртаецца да Рыгі найкарацейшым шляхам, праз земгалаў. Іншы дазорны паведаміў, што латгалы адлучыліся ад Лівонскага атрада і накіраваліся ў права, да сябе. Мабыць учулі жаданне Перуна дапамагчы ліцвінам, і пажадалі хутчэй пайсці ад гэтай зямлі. Міндоўг з Альгердам размеркавалі дазорных па атрадах і ліцвіны накіраваліся дaганяць Лівонскі атрад. Дазорные шмат разоў даносілі Міндоўгу дзе знаходзіца Лівонскі атрад і колькі застаецца вёрст да яго. Калі лівонскі атрад увайшоў у зямлі Саўле, Міндоўг даў указ браць ворагаў у аблогу. Першымі знішчылі дазорных лівонцаў, потым спешаные лучнікі сталі знішчаць заднія шэрагі варожага атрада.

А калі рыцары разгарнуліся ў бок нападнікаў, сумесна з лучнікамі іх атакавалі кідальнымі дроцікамі. У Лівонскім атрадзе

пачалася сумятня, яна павялічылась пасля нападу на іх атрада князя Выкінта з земгаламі. Коні рыцараў, у якіх патрапілі дроцікі, падалі ў балоцістую глебу, захапляючы за сабой цяжка ўзброенных коннікаў. Ім было цяжка ўстаць на ногі. Ліцвінскія ваяры на лёгкіх конях уклініліся ў шэрагі рыцараў і люта знішчалі іх. У кароткі час большасць войска лівонскага перат-



варылась у значную меншасць, і тая імкнулась сбегчы з гэтай бойні. Міндоўг нацэліў для сабе ў супернікі рыцара з багато ўпрыгожанным шлемам. Як толькі ён да яго наблізіўся, то са шкадаваннем убачыў, што яго з боку моцным сечаным ударом пад шлем забіў Даўмонт. Тады Міндоўг з лютасцю напаў на правага рыцара і коляшчым ударом у горла пад шлём забіў таго. Калі рыцараў усіх забілі, князь з палегкай падумаў, добра што гэты конь не Імклівы, а то той бы накінуўся на коня Даўмонта, і добром гэта б не скончылася. Агледзеўшы усю мясціну, Міндоўг быў задаволен безлітасным разгромам. Яму данесьлі, што ўсе рыцары, а таксама іх збраяносцы і пскоўскія ваяры забітыя. Цяпер ён падумаў, што наўрад ліцвіны ўсвядомілі якую вялікую справу яны ўчынілі. Аб сёнешняй перамозе ліцвінаў над лепшымі рыцарамі хрысціянства будуць ведаць у ўсіх моцных сталіцах розных зямель. Гэта перамога вельмі важная вестка шматбожцам для розных зямель пра тое, што трэба аб'яднацца і недапушчаць хлуслівых і прагных хрысціянаў у свае дамы, сваё жыццё і

сваё пачуцце. Пакуль збіралі з забітых даспехі і зброю, Міндоўг сустрэўся з земгаламі, і пажадаў ім, каб шматбожцы земгалаў, селаў, латгалаў, куронаў і іншых аб'ядналіся ў імкненні супрацьстаяць хрысціянам. На пры канцы ён перадаў дваццаць сярэбраных манет для двух правадыроў, а таксама ўсе сабраныя сякіры, трыццаць мячоў і вышытую тканіну, для ганцоў да Міндоўга. На зваротным шляху ён пачуў сумную навіну,ў бітве з рыцарам забіты яго князь Скірмунт. Загіблага замацавалі на кані і павезлі ў яго замак.

Вялікую частку шляху да начлегу ў полацкай зямлі Міндоўг размаўляў з нальшанскім валхвом Дабравітам. Князь упамінаў валхва Вітаўта, які ў свой час добра адклікаўся на нальшанскога валхва, нягледячы на тое, што яны ніколі не бачылісь. З гэтай размовы Міндоўг зразумеў, што волхв незадаволен князем Ердзівілам. Міндоўг наўмысна паставіў нальшанскіе сотні з правага флангу, далей ад рыцараў, каб было найменш страт сярод іх. На рыцараў ён накіраваў сваіх шмат навучаных рыцараў і ваяроў, а таксама сотні жырмунтаў і Даўмонта, і яны на здзіўлення хутка зьнішчылі іх. Калі ваяры Лівонскага войска зразумелі, што апынуліся ў аблозе ліцвінскіх ваяроў, то імкнуліся хутчэй ўцячы, і таму сустрэчныя ваяры князя Выкінта і земгалы змагаліся з вялікай колькасцю лівонцев, пакуль з фланга падышлі ліцвіны да іх на дапамогу. Больш за усіх страт было ў Выкінта і земгалоў. Улічывая гэта, князь перадаў земгалам шмат мячоў і сякір. Перад начлегам, Міндоўг заклопаціўся аб магчымым нападзе мазураў з рыцарамі на заходнія княства, і ён адправіў ганца ў Гародню да князя Жыгімонта.Пасля прыбыцця ў Воруту, неўзабаве там з'явіўся ганец ад Жыгімонта і паведаміў, што на заходнія межы нападу не было.

На пахаванне князя Скірмунта быў адпраўлены рыцар Альгерд. Вярнуўшыся Альгерд распавёў, што ён размаўляў з ваярамі, якія суправаждалі цела загінулага князя. Гэтыя ваяры скірмунцкага княства распавялі, што ў гэтым паходзе былі шаснаццаці летні сын Скірмунта, а таксама семнаццаці летні сын раней памерлага князя Стрыгівіла. Абодва гэтые сябры добра змагаліся, асабіста сын Стрыгівіла. Яго клічуць Стрыжмонт, і ён галоўны сярод сяброў, у яго ёсць малодшы дзевяцілетні брат.

Стрыжмонт яшчэ і добры распарадчык па гаспадарцы, многія ўказы князя Скірмунта ішлі праз яго.

— Таму, князь Міндоўг, я лічу будзе добрым для іх усіх, прапанаваць князем Стрыжмонта.

— Добра, Альгерд. Заўтра з раніцы накіруемся да іх.

Калі яны прыбылі ў замак Скірмунты, то Міндоўг убачыў, што жонка загіблага князя цяжарная. Застаўшыся самнасам з князёўнай і яе сынам, Міндоўг сказаў:

— Князёўна, я ведаю што ты з Стрыжмонтом і яго маці ладзіце між сабой. Ён добры ваяр і як кажуць добры гаспадарнік, таму я ўлічыў гэта не стаў накіроўваць да вас іншага князя, а прапаную яго. Як ты ставішся да гэтага?

— Князь Міндоўг, так мы ладзім між сабой, і добра ставімся да тваёй прапановы. Дзякуй табе, князь.

За час адсутнасці Міндоўга ў Воруце з-за паходу на поўнач, у Наваградку былі весткі, што прыбылі гандляры і прагнуць сустрэчся з князем. Міндоўг выклікаў абодвух. Міхайла распавёў, што Данііл Рамановіч марыць заняць Галіч, але гэты горад пад уладай князя Расціслава, сына Міхаіла Чарнігаўскага. Чарнігаўскага князя падтрымлівае новы вугорскі кароль Бела. Мінулым летам Данііл Рамановіч ездзіў на каранацыю караля Бела, з якім ён у дзяцінстве сумесна рос, але мабыць падтрымкі не атрымаў. Волімунт распавядаў, што калі яны былі ў вусце Нёмана, то дасведчаны скалоў распавёў, што тэўтоны занятыя будаўніцтвам замка Реден (сучасная назва Радзын), а князь Конрад Мазавецкі шкадуе, што дамовіўся з тэўтонамі, таму што яны не дапамогаюць яму ў барацьбе з шматбожцамі.

Перад Калядамі прыбыў полацкі ваяр Копысь.

— Князь Міндоўг, полацкі князь Брачыслаў ведае, што я шмат разоў бываю ў Воруце, і таму праз мяне перадае табе сваі віншаванні з вялікай перамогай над моцным Лівонскім войскам. Ён вельмі задаволен тым, што між намі добрыя саюзныя адносіны. Ад сябе дадам, што і ў Віцебску і сярод русін шмат усхваляючы гавораць пра цябе князь і пра гэту перамогу. Таксама русіны гавораць, што шматбожцы земгалаў, куронаў, селаў і латгалаў выганяюць лацінскіх хрысціянскіх прапаведнікаў са сваіх мясцін.

Апошняя вестка ўзрадавала князя. Гэта перамога дала ім надзею на бязпечнае вяртанне да дзедаўскіх абычаяў і да сумеснага супраціву лацінскай хрысціянізацыі. Невядома як будзе далей, але гэта перамога застанецца ў памяці шматбожцаў, і будзе заклікаць да супраціва гвалтоўнаму навязванню думак хлуслівых прапаведнікаў. Зіма прайшла б у добрым настроі, каліб не працяглая хвароба князёўны Марфы. На пры канцы зімы Марфа памерла. Больш за усіх гараваў яе тата князь Ізяслаў. У трэці дзень вясны і новага 6745 лета (1237 па хрысціянскім календары) прыбыў да князя Міндоўга з поўдня ваяр Павло, знаёмы па папярэднім наведваннем. Ен перадаў жаданне Даніїла Раманавіча каб князь Міндоўг напаў на рыцараў Конрада Мазавецкага.

— Князь Міндоўг, па весткам, якія два дні таму паступілі да Даніілу Рамановічу, з-за скаргаў Конрада Мазавецкага, рымская Царква накіравала яму каля дваццаці рыцараў, ці то гаспітальераў, ці то тэўтонаў. Гэтых рыцараў з збраяносцамі і слугамі, ен накіраваў у Драгічын, для ўзмоцнения гарнізона замка. Драгічын быў наш замак, Даніїл Рамановіч прагне яго вярнуць. Ён ведае, што ты князь Міндоўг, лёгка знішчаеш рыцароў. Князь прапануе твайму атраду напасць на гэтых рыцараў з збраяносцамі і знішчіць іх. У той жа час, атрад Даніїла Раманавіча пад выглядам рыцарскага атрада зойме замак. За гэты паход Даніїл Рамановіч дае сем кошаляў сярэбраных манет. Таксама мой князь, ведаючы што ў цябе князь Міндоўг, шмат рыцарскіх даспехаў, дае за кожныя два рыцарскіх даспеха па аднаму кошалю сярэбраных манет.

— Колькі ваяроў у іх, акрамя рыцароў?

— Князь, каля восьмідзесяці збраяносцаў і каля сарака ваяўнічых слуг.

— Калі я дам табе восем рыцарскіх даспехаў, то ты мне даш адзінаццаць кошаляў сярэбраных манет?

— Князь, мяне суправаджають трое і ў нас дзесяць кашэляў. Аднаго ганца трэба зараз адправіць да Даніїла Раманавіча з весткай аб дамоўленасці. А да астатнім тром калі дадаш аднаго свайго ваяра для перавозкі даспехаў, то на месце нашай сустрэчы мы дамо ящэ адзін кошаль сярэбраных манет. Месца сустрэ-

чы ў сямі верстах паўночней Драгічына. Трэба заўтра з раніцы адправіцца туды.

— Добра, дамовіліся.

— Дзякуй, князь Міндоўг. Я зараз пашлю ганца. Яшчэ асабістая просьба Данііла Раманавіча, каб адны даспехі былі ад кіраўніка рыцараў.

— Добра, будуць такія даспехі.

Паслаўшы ганцоў у Ваўкавыск і ў Эйсманты, Міндоўг даў русінам восем рыцарскіх даспехаў, аднаго свайго ваяра і чатыры коні для перавозкі даспехаў. Пасля бітвы пры Саўле, шмат ваяроў прымяралі рыцарскія даспехі і шмат з іх адмовіліся ад іх. Яны больш падыходзілі да турнірных бітваў, а да вайсковых бітваў трэба больш лягчэйшыя даспехі, і каб шлем быў з вялікім кругаглядам. Ліцвіны празвалі іх рыцарскімі даспехамі для баязлівых. Таму Міндоўг прагнуў іх больш аддаць русінам.Войшалк распазнаўшы, што тата збіраецца ў паход, упрасіў князя ўзяць яго з сабой. Войшалк адразу пахваліўся аб гэтым дзядулі, і той таксама пажадаў ісці ў паход. Міндоўг пасля смерці Марфы не ў чым не мог ім адмовіць, толькі даручыў двум ваярам наглядаць за імі.

У атрадзе Міндоўга, які сабраўся на захад ад Ваўкавыска, былі па адной сотні ад Ваўкавыска, Воруты і сотня Даўмонта. Шмат дазорных было ад Ваўкавыскага княства, і яны яшчэ да прыходу атрада назіралі за зямлямі мазураў на поўнач ад Драгічына.

Калі атрад перасек мяжу з мазурамі дазорные паведамілі князю, што бачылі атрад, у якім чатыры дзесяткі пешых мазураў, акрамя коннікаў. Дарога на поўдзень да Драгічына складаецца з дарог праз поле і дарог праз лес. Міндоўг вырашыў зрабіць засаду па дарозе праз лес, у якім магчыма было схавацца. У гэты паход князь узяў коня Імклівы, і таму ён са сваёй сотняй сустракаў ворага спераду іх атрада, а Даўмонт са сваёй сотняй нападаў ззаду атрада мазураў. Пасля таго, як ліцвінскія дазорные знішчылі дазорных мазураў, і пасля атакі з бакоў дарогі стрэламі і кідальнымі дроцікамі, ў бітву рынуліся цяжкія коннікі. Міндоўг наляцеў на рыцара, калі той яшчэ не зразумеў адкуль пагроза. Пасля яго князю ўдалося забіць яшчэ аднаго

рыцара. Калі з мазурамі было скончана і збіралі зброю і даспехі, Міндоўг з сямі сваімі рыцарамі вырашыў дапамагчы Даніілу Рамановічу, і накіраваўся да Драгічына. Наблізіўшыся да замка, князь зразумеў, што Даніілу Рамановічу ўдалося авалодаць гэтым замкам. Мабыць рыцарскія даспехі дапамаглі.

Вяртаючыся ў Воруту Міндоўг пазнаў, што паранены ў руку яго рыцар Яўнут, змагаўся пакуль не знішчылі ўсіх мазурскіх ваяроў. Аб гэтым яму распавядаў Альгерд, ён як заўседы суправаждает князя пры вяртані з паходу. Альгерд ведаў калі трэба казаць Міндоўгу, а калі трэба памаўчаць, тым самым даць князю магчымасць паразважаць. Зараз Міндоўг звярнуў увагу на Войшалка, які ехаў і аб чымсьці размаўляў з князем Ізяславам. Выраз твара Войшалка быў такі, як быццам ён толькі цяпер нешта важнае зразумеў. Яго чатырнаццаці летнія равеснікі даўно зразумелі тое, што ён зразумеў цяпер. Міндоўгу распавядалі, што пры яго працяглай адсутнасці, да князёўны Марфы прыходзіў канстанцінопальскі праповеднік, і пры іх размовах быў яго сын. Тады і закладваліся ў думкі Войшалка пакорлівасць, згодніцтво, адсутнасць рашучасці. Бітвы на мечах ён успрымаў, як спрыт у гульнях мужчын. Цяпер ён убачыў, што гэта не гульня, а тут забіваюць, і хто больш забівае, той заслугоўвае найбольшай пашаны. Сёння ён убачыў, што нашы ворагі хрысціяне імкнуліся нас забіць, а гэта не тое што напісана ў іх хрысціянскіх кнігах. Іх дзеяньні процілегласць іх словам.

Міндоўг жадаў, каб аб гэтым яму гаварыў князь Ізяслаў. Назірая за князем Ізяславам, асабісто за яго тварам, князь упэуніўся ў тым, што менавіта аб гэтым гаварыў дзядуля свайму ўнуку. Перад святам Яна Купалы Міндоўг з Альгердам аб'язджалі замкі ў саюзных княствах і праверали баяздольнасць іх. У замку Любча ён упершыню ўбачыў жонку князя Вісмунта. Яе клікалі Марта і яна была вельмі падобна Яньке, тая жа складнасць, такія ж разумныя спакойныя блакітныя вочы, і такія ж дробныя рысы твара. У яе былі каштанавага колеру валасы, якія адцянялі колер твара і рабілі яго бледным, як толькі ў спешчаных дзяўчат заможных людзей і дачок князёў. Яна адразу пачула захапленне ёй Міндоўгам, і ў яе вачах узніклі іскрынкі радасьці і сваей перавагі над гэтымі мужчынамі. Князь пажадаў больш звычай-

нага часу правесьці ў гэтым замку, і ён абвесьціў, што прагне заўтра бачыць як ваяры будуць бараняць замак. Міндоўг доўга не мог заснуць. Вось ужо васямнаццаць лет, як ён у першыню ўбачыў Яньку. Хоця яна неўзабаве выйшла замуж і паехала ў Слонім, алё прыемныя мары аб ёй не знікалі. Гэтаму дапамагала Вольга, трошкі падобная на Яньку. Але пасля таго, як яна нарадзіла і патаўсцела, вобраз Янькі стаў менш выразны. Сёння Міндоўг убачыў сваю мару гэтакай маладой, як васямнаццаць лет таму, і гэтакай жаданай.

Пасля сняданку, князі і Альгерд выйшлі да брамы замка, дзе іх чакалі ўсе ваяры Вісмунта, ўключаючы дваццаць дзевяць ваяроў з паселішча Купны. Міндоўг гучна абвясціў:

— У палове версты, з'явіўся вораг у дваццаць сотняў ваяроў.

Тут жа князь Вісмунт указаў зачыніць браму замка, заняць свае месца каля сцен, і падрыхтавацца да абароны. Міндоўг на здіўленне некалькі адсунуто пачуў трывожный гук з рога, а потым хуткія дзеяні ваяроў і жыхароў замка. Ён меркаваў наглядае Марта, ці не? Неўзабаве Міндоўг гучна абвясціў:

— Вораг узяў у аблогу замак пачаў атаку.

Адразу князь Вісмунт гучна абвясціл:

— Лучнікі атакаваць ворага.

Міндоўг хадзіў уздоуж сцен замка і абвяшчаў новыя цяжкасці для абаронцаў замка, а князь Вісмунт прыцягаў да абароны жанчын і дзяцей. Нават каля сцены, якая была побач з вельмі стромкім берагам ракі Нёман, Міндоўг абвясціл штурм сцяны з прыхіленымі лесвіцамі. Тут жа рамеснікі і жанчыны варылі смалу і вылівалі яе са сцяны. Акрамя дзяцей, ўсе жыхары стамілісь і моўчы глядзелі на Міндоўга, а ён чакаў калі з'явіцца яна і будзе таксама глядзець на яго. Зазірнуўшы на другі паверх церама, ён убачыў, што яна ўсміхаецца. Яго гэта раззлавала і ён спыніў вучэбную абарону замка.

Князі і Альгерд выйшлі з замка, і накіраваліся за абарончы роў, дзе Міндоўг паказаў як трэба зрабіць пасткі, перашкаждающые аблозе замка. Вярталіся ў Воруту моўчкі, Міндоўг быў незадаволены тым, што Марта хутка распазнала яго пачуццё. Яму, дасведчанаму ў розных адносінах з рознаўзроставымі і мудрагелістамі людзьмі, не ўдалося схаваць сваё пачуццё пе-

рад гэтай маладой дзяўчынай. Ён таксама быў незадаволены тым, што ўжо другі раз калі сустракаецца яму вельмі прывабная дзяўчына, з якой жадаеш як мажліва больш быць сам-насам, але ўзнікаюць перашкоды, якія не магчыма пераадолець. Яньку нельга было ўзяць у жонкі, таму што ёсць княжна Марфа, а калі Марфы нема, то Марта ўжо замужам. На жаль ў яцвягаў нема звычаю, калі магчыма перамогчы мужа ў рыцарскім баі, і забраць сабе яго жонку. У гэты вечар, калі Міндоўг мілаваўся са служанкай, ён замест аблічча служанкі бачыў аблічча Марты, і гэтае мілаванне было лепшае за апошніе лета. Дангайла, які прыбыў да князя Міндоўга, прасіў дазволу адправіцца па гандлёвым справам да Булевічаў. Гандляру Волімунту не хапала мяхоў для паўночнага гандлярскага паходу.

— Дангайла, трэба штоб твой памочнік Пуцята з таварам, адправіўся ў паселішча Вышімута Булевіча, а ты крыху аперэджвая, пойдзеш у паселішчы Ердзівіла і Спрудейка. Мне патрэбна штоб ты нарэшце высвятліў пра той шкодны паход.

— Добра, князь Міндоўг. Так і зробім.

Міндоўгу надакучыла непаразуменне гэтага шкоднага паходу на русінаў. Тое што дзве сотні пскоўскіх ваяроў былі ў паходзе на Лютву, было вынікам гэтага. А за гэта трэба караць. Праз пяць дзён Дангайла вярнуўся ад Булевічаў і распавеў, што Вішімут Булевіч угаворваў князя Выкінта, сумесна напасць і абрабаваць русінскае паселішча. Міндоўг вырашыў пакараць Вішімута безлітасна. Выкінта ён не чапаў, таму што сам князь у паходзе не быў, а толькі дазволіў пайсці жадаючым, а такіх у яго было дванаццаць ваяроў.

А вось Вышімута Булевіча трэба пакараць. Улічываючы што ў прусаў ёсць звычай кроўнай месці, то трэба караць усіх Булевічей. Міндоўг хутка сабраў сотню сваіх ваяроў, а таксама рыцараў з дазорнымі, і Дангайла з Пуцятам.

Пры падыходзе да паселішчу Вішімута, дазорные ўзялі ўсіх ў аблогу, штоб ніхто не змагчы ўцячы. Міндоўг адзін уварваўся ў дом Вышімута і забіў яго, нічога не сказаўшы. Жанчына якая спрабавала ўвайсці ў дом, крычала але яе не пускалі, а потым высвятлілось, што яна жонка Вышімута. Яна спадабалась Міндоўгу і ён з дапамогай Пуцяты растлумачыў ёй, што Вы-

шімут прычыніў жамойтам і ліцвінам вялікую шкоду, напаў на русінаў, а тыя ў адказ сумесна з іншымі, пайшлі паходам на жамойтаў і ліцвінаў. Хоця войска ліцвінаў разграмілі ворагоў, але загінула шмат ліцвінскіх ваяроў, таму яго і іншых Булевічаў трэба было пакараць. Ёй ні якай шкоды не будзе, наадварот яна яму падабалася, і ён вырашыў зрабіць яе маці будучага князя ўсіх жамойтаў. Дачакаўшыся калі жамойтка з гэтым згодзілась, Міндоўг выйшаў да сходу жамойтаў і з дапамогай Путяты, растлумачыл ім, чаму забіў Вышімута, і што будзе далей, а таксама паабяцаў сваю дапамогу гэтаму паселішчу.

Іх волхв станоучы выказаўся аб учынке князя Міндоўга. Князь паслаў свайго ганца ў Воруту, штоб той вярнуўся ў гэта паселішча з трыма цеслярамі для пабудовы дома будучыму князю жамойтаў. Пакінуўшы ў гэтым паселішчы Пуцяту і двух ваяроў, князь накіраваў астатніх на іншыя паселішчы Булевічаў з наказам, забіць Булевічаў, а кіраўнікамі прызначыць валхвоў, як было раней. Вярнуўшы дом Вышімута папярэдняму ўладальніку, Міндоўг накіраваўся з жамойткай Даўга ў дом яе бацькоў. Бацькі яе былі на сходзе жамойтаў і таму ведалі, што чакае іх дачку. Яны паслалі на ложку футравыя скуры мядзведзя і выйшлі з хаты. У вечары, калі цела загінулага Вышімута Булевіча дагарала на вогнішчы, вярнуліся ваяры Міндоўга і запэўнілі, што яго наказ выканалі. Атрад князя адправіўся ў Літву. Па прыбыцці ў Воруту, князь накіраваў печніка ўслед за цеслярамі. Князь гэтым учынкам даў зразумець Выкінту, што ўсё галоўнае павінна адбывацца самім Міндоўгом, або з яго дазволу, і ў будучыні ён будзе кіраваць зямлямі жамойтаў.

Праз дзевяць дзён Міндоўг адправіў ганца са збожжам і соллю, а таксама з яшчэ адным цеслярам у паселішча Даўга (сучасная назва Даўгай). А калі на другі дзень вярнуўся ганец і сказаў, што цесляры скончаць будаўніцтва дома праз чатыры дні, то князь зноў адправіў ганца з наказам купіць дзве козы ў паселішча Радунь для Даўгі, а цеслярам пабудаваць яшчэ хлеў для жывёл. Цесляры і печнік вярнуліся ў Воруту праз восем дзён. Яны распавялі, што пабудавалі ўсё патрэбнае князю. Даўге і яе бацькам вельмі спадабаўся новы дом, а таксама козы і хлеў. Яны былі вельмі ўдзячныя князю.

Гуляя ў шахі Альгерд прымеціў, што князь па ранейшему не ў добрым настроі. Калі яны сумесна вячэрелі, Альгерд спытаў князя:

— Князь Міндоўг, ты некалі казаў мне, што гэты твой залаты пярсцёнак з атрутай. А праз колькі часу яд пачынае атручанне?

— Не ведаю. На што табе Альгерд, трэба гэта ведаць?

— Я, князь Міндоўг, сустракаюсь па тваім указе з рознымі людзьмі. Бываюць сярод іх ворагі і мне таксама трэба такі пярсцёнак. Мне патрэбен пярсцёнак з атрутай які пачынае атручаць праз дваццаць і больш дзён.

— Добра, Альгерд. Заўтра адправімся да Чорнавілу.

Міндоўг быў ўпэунен, што Альгерд не будзе шкодзіць яму. Слуга гандляра праводзіў князя і Альгерда да ложка Чорнавіла, ён хварэў. Але гандляр убачыўшы князя Міндоўга з Альгердам, узрадаваўся і ўзняўся з ложку. Ён паскардзіўся на сваю хваробу, на свайго старэйшага сына Ердзівіла, што яму сорамна за яго. Потым стаў хваліць князя Міндоўга за яго розум і яго ўмеласць у бітве пры Саўле. Князь распавёў, што яму трэба для Альгерда залаты пярсцёнак з атрутай, які будзе атручаць праз дваццаць дзён, а не раней. Яны накіраваліся ў патаемны пакой. Чорнавіл перасоваўся з дапамогай слугі, яго сын Волімунт быў у гандлевым паходзе. У таемны пакой гандляр увашоў з дапамогай Альгерда, і яны накіраваліся да златакузнецоў, дзе памералі пальцы рыцара, а потым увайшлі ў пакой для вячэры. Чорнавілу цяжко даваліся гэтыя перамяшчэнні, нават з дапамогай слугі, але ён стараўся выглядаць бадзёрым. За трапезай гандляр хваліўся ўнукам Міхалком, сынам Міхайла. Ён ужо сапраўдны гандляр, ведае тры мовы добра, і яшчэ дзве мовы пасрэдна, добра страляе з лука, а цяпер старанна трэніруецца ў бітвах на мечах. Ведае дзе трэба пахваліць, а дзе прамоўчаць.

— Яго ўжо пара ажаніць.

— Так, князь. Волімунт вярнецца з гандлярскага паходу і адразу будзе яго вяселле, а потым ужо і Міхалка. Міхалок ужо тры святы Яна Купалы сустракаў з адной гарэзлівай дзяўчынай, але яго маці Таіса супраць. Пасля вяселля Волімунта будзем вырашаць.

Вяртаючыся князь думаў пра Чорнавіла. Яму ён абавязан цяперашнему становішчу моцнага князя. Гандляр дзевятнаццаць

лет таму абраў Міндоўга для князёўны Наваградка, тым самым вызначыў яго далейшы лёс. Ён і цяпер дапамагае Міндоўгу як толькі можа.

Праз дванаццаць дзён прыбыў у Воруту гандляр Волімунт, ён прывёз для Альгерда залаты пярсцёнак з выявай галавы яшчуру, і з атрутай. Гандляр распавёў, што апошнія рыцары Ордэна мечаносцаў далучыліся да Тэўтонскага ордэна, і цяпер яны ваююць з прускім племенем погезан. Тэўтоны скончылі будаўніцтва замка Эльбінг. Дасведчаны скалоў у вусце Нёмана вельмі хвалілі князя Міндоўга за разгром рыцараў мечаносцаў у землях земгалаў, а таксама асабіста за разгром рыцараў каля Драгічына.

— Рыцары хрысціянскіх ордэнаў, як лернейская гідра, адсякаеш ёй адну галаву, тут жа вырастаюць дзве новыя. Хаця мы не Гераклы, але ўсе роўна пераможам.

Увосень, калі ў чарговы раз вярнуўся з паселішча Даўга ганец Міндоўга, то паведаміў князю, што ў жамойткі усё прыкметы цяжарнасці. Міндоўг быў задаволен гэтай весткай, ўсё атрымліваецца па яго жаданню. У чарговы раз пасылаючы свайго ганца, князь дадаў ільняныя вопраткі для Даўгі. Перад Калядамі Альгерд прапанаваў князю, што ён можа аб'ехаць усходнія і паўночныя замкі з віншаваньнем іх з Калядамі ад імя Міндоўга. Спачатку князь здзівіўся, а потым згадзіўся з гэтым. З раніцы Альгерд накіраваўся ў Любчу, потым у Доўбуды, Скірмунты, якія з-за новага князя ўсё больш называлі Стрыженяты, потым у Жіжмы і паселішча Даўга.

## ГЛАВА 15
# АРДЫНСКАЯ ПАГРОЗА

Праз пяць дзён Альгерд вярнуўся ў Воруту. Ён распавеў:

— Князь, усюды мне былі рады і дзякавалі за твае падарункі. Твой старэйшы брат Доўспрунк цяжка хварэе, а ў іншых усё добра. У Даўгі вялікі жывот. Адчувае яна добра.

— Альгерд, а не пыталі яны, чаму я сам не прыехаў?

— Князь, пыталі. Але я гаварыў, што могуць з'явіцца важкія весткі.

— Добра ты задумаў. Дзякуй табе, Альгерд. Міндоўг жадаў спытаць, як асабіста рэагавалі на яго падарункі, але потым вырашыў, калі Альгерд не вызначыў чые-небудзь уражанне, то ўсе рэагавалі аднолькава. Яго больш за ўсіх цікавіло, як успрымала падарунак Марта, але ён перадужыў сваё жаданне спытаць. На пры канцы зімы ганец з Любчы паведаміў, што князь Вісмунт, пасля доўгай і загадкавай хваробы памер.

Пасля гэтай нечаканай весткі, прышла доўгачаканая і непрыемная вестка ад ваяра Копыся аб тым, што Арда напала на русінаў і люта знішчае іх.

— Князь Міндоўг, толькі на гэты раз напалі не на паўднёвых русін, а на ўсходніх, на тых якія дзве сотні лет таму пачалі займаць зямлі Тартарыі. Князь, у полацкім, віцебскім і мсціслаўскім княствах вельмі асцярогаюцца, што Арда пойдзе на нас, таму яны аб'ядналіся ў думцы, што трэба запрашаць цябе, князь Міндоўг, на вайсковага князя гэтых трох княстваў. І гэта агульнае запрашэнне трох княстваў я табе, князь Міндоўг, пераказваю. Ад сабе дадам, што калі я ужо гатаваўся ў дарогу сюды, то чуў як да князя Брачыславу прыбыў Ізяслаўскі князь. Я думаю, што ўсе крывіцкія князі далучацца да гэтага запрашэння, таму што ніхто з іх не мае такога вопыту бітваў, і такіх знакавых перамог, як у цябе князь.

— Я згодны быць вайсковым князем усіх крывіцкіх княстваў. Мне трэба спіс усіх княстваў, якія далучацца да гэтага запрашэння, я туды адпраўлю сваіх памочнікаў. А цяпер, калі ты накіруешся туды, перадай князям, штоб на торжышчах, а таксама каля брамы замка і іншых месцах каб правяралі чужынцаў, усіх падазроных бралі на допыт. Ад Арды трэба чакаць разведнікаў, гэта могуць быць русіны, якіх пад пагрозай знішчэння прымусілі быць іх разведнікамі. Выяўленных такіх таемно пытаць, а потым пры ўсіх князь абвешчае іх, што яны згодны нам дапамогаць. Потым іх адпускаюць на ўсход, а на самой справе таемна ад усіх, трэба іх забіваць далей за пятнаццаць вёрст. Такія разведнікі могуць прыйсці не адны, а калі хтосьці раскажа ў Ардзе, што забілі іх прадстаўніка, то пойдуць помсціць за яго. Яны зразу-

мела не паслы, за тых абявязкова прыйдуць знішчаць, але лепей так зрабіць. Калі дазорные разведаюць, што Арда накіруецца на адно з нашых крывіцкіх княстваў трэба, штоб гэтаму княству ішлі на дапамогу не суседнія ўсходнія княства, а суседнія заходнія княства, таму што яны качэўнікі і вельмі хуткорухомы. Да мяне трэба наладзіць хуткіх ганцоў з заменнымі конямі.

У новалецце, з надыходам вясны і новага 6746 лета (1238 па хрысціянскаму календары) памёр гандляр Чорнавіл. Міндоўг і Альгерд былі здіўлены, што на пахаванне таты не прыбыў нальшанскі князь Ердзівіл, хоця ганца да яго адправілі адразу пасля гэтага здарэння. Вярнуўшыся ў Воруту з пахавальнай трызны, князь адправіў ганца за Эйсмантам і Даўмонтам. Усе саюзныя князі ведалі ад Міндоўга пра нашэсце Арды на ўсходніх русін, таму Эйсмант і Даўмонт чакалі, што гаворка з Міндоўгам будзе аб гэтым, алё князь гаварыў аб іншым.

— Мяне вельмі турбуе нальшанскі князь Ердзівіл. У паўночны паход супраць лівонскіх рыцараў ён не пайшоў, сказаўшы што хварэе. А да гэтага хадзіў у неразумныя паходы на русінаў, пасля аднаго з іх яго старэйшага сына ўзялі ў палон, а пасля другога пахода забілі. Узмоцненнем абараназдольнасці не займаецца, новых ваяроў не навучае. У княстве ёсць моцны ваяр, з вялікага паселішча Лужышча сотнік Вітмонт, ён нашчадак перaселенцаў з палабскіх лужычан. Але ён ужо стары, а патрэбен малады, разумны, моцны і навучаюшчы ваяроў. Нальшанскае княства вялікае, нават больш за гародзенскае, два замка і шмат паселішчаў. Яно на паўночным усходзе ад Воруты, цяпер гэта княства вельмі адказнае, з-за пагрозы Арды. Для ўзмоцненя гэтага вялікага княства патрэбен Даўмонт.

Міндоўг заўважыў, што Даўмонту гэта прапанова вельмі падабаецца, але ён чакаў рашэньне яго таты.

— Князь Міндоўг, гэта прапанова для нас нечаканая. Штоб гэта вырашыць трэба пагаварыць з яцвяжскай князёўнай Тэкляй, яна цяжарная.

— Разумею. Даўмонт можа прыбыць у Нальшаны з жонкай. Я жадаю, штоб вы разумелі мой непакой аб пагрозе з усходу, цяпер больш, чым з захаду. Тэўтонскія рыцары зараз змагаюцца з прускім племенем погезане, а Арда з шматлікавымі ваярамі

можа неўзабаве з'явіцца на нашых землях і на саюзных нам землях крывічоў.

— Добра, князь Міндоўг. Дзевяць дзён нам будзе достаткова, штоб гэта вырашыць.

Князь праводзіўшы Эйсманта з сынам, быў упэўнен, што праз дзевяць дзён Даўмонт з жонкай прыбудзе за нальшанскім княствам. Але Даўмонт прыбыў адзін і раней, чым дамоўляліс. Ён гэта патлумачыў тым, што князёўна Тэкля адмовілась пакідаць сваю зямлю, і яна не будзе выходзіць замуж за яго. Міндоўг па выгляду Даўмонта, вырашыў што ў іх там усё абгаворана раз і на заўсёды. Князь накіраваў ганцоў у Нальшаны, Крэва і Лужышча да ваяроў, штоб яны падрыхтаваліся да сваёй доўгачаканай змене князя. А сам з Альгердам і Даўмонтом накіраваліся ў Любчу. Ён папeрадзіў ганцоў, што там будзе чакаць весткі з Нальшан пра гатоўнасці іх да яго прыбыцця.

Пры набліжэнню да замка Любча, Міндоўг прымеціў што каля дарогі пачалі рабіць пасткі, але не скончылі, і цяпер імі не займаюцца. На ганку церама іх сустракала Марта. Яна была ўстрывожаная, і твар яе быў не такі чароўны, як у мінулы раз. Міндоўг яе супакоіў, і спытаў, накорміць яна галодных падарожнікаў ці не. Зразумеўшы, што князь у добрым настроі, яна хутка ўказала служанкам прынесці ежу, а сама жвава стала распавядаць як ёй стала журботна пасля смерці мужа. Даўмонт трошкі паеў, і адчуўшы сябе не ёмка, з дазволу Міндоўга пайшоў аглядаць замак і яго аколіцу. Яго не было досыць доўга, а калі ён вярнуўся, то выглядаў сарамлівым.

Праз малы час, да іх з'явілася малодшая сястра Марты, Ядзя. Даўмонт стаў вельмі пільна прыглядацца да яе. Але неўзабаве з'явіўся ганец з Нальшан, таму Міндоўг з Альгердам і Даўмонтам накіраваліся ў Нальшаны.

Перад адчыненой брамай замка Нальшаны было шмат ветліва сустракаюшчых іх жыхароў, а таксама з Крэва і іншых мясцін гэтага княства. Нягледзячы на час палевых прац, прышедшые на агульны сход мужчыны, разумелі адказны час ў іх жыцці, яны ведалі аб ардынскай пагрозе, і ведалі здольнасьці князя Ердзівіла ёй процідзейнічаць. Таксама яны ведалі князя Міндоўга і добра разумелі, каму яны ўдзячныя за перамогу

каля Крэва, трынаццаць лет таму, па гэтаму шчыра віталі яго. Выбіралі князя па-рознаму. Калі была агульная згода, то рашэнне прымалі заможныя людзі, а калі былі розныя меркаванні, то рашэнне прымалі агульным сходам мужчын. Заехаўшы ў замак і ўбачыўшы валхва, Міндоўг саскочыў з коня, прывітаў валхва і ў добрым настроі ўзышоў на ганак церама, дзе яго чакаў князь Ердзівіл.

Міндоўг не прывітаў Ердзівіла, а паставіў перад ім Даўмонта, і тут жа пачаў гаварыць:

— Нальшанцы, вы ведаеце якая пагроза насоўваецца на нас з усходу. Вельмі шматлікіе ваяры ардынскіх качэўнікаў знішчаюць гарады ўсходніх русін. Яны раней разграмілі аб'яднаныя войскі паўднёвых русін. Нам цяпер патрэбна ўзмоцняць абараназдольнасць княстваў. Мы ў сябе вырылі абарончыя равы, насыпалі валы, зрабілі пасткі, а вы нічога не робіце. Я вас трынаццаць лет таму абараніў ад русінскага атрада ў баі каля Крэва. Русіны напалі на вашу зямлю з-за неразумнага паходу князя Ердівіла. Лівонскіе рыцары і ваяры ў леташнім паходзе накіраваліся праз нальшанскае княства, ведаючы што вы будзеце ім лёгкай здабычай, але мы выйшлі ім на сустрэчу і разгрaмілі іх больш за дваццаць сотняў ваяроў. Ваш князь Ердзівіл сказаўся хворым і не пайшоў у паход. Мы перамаглі і без яго, але навошта вам такі князь, які не прагне і не здольны вас абараніць? Вось княжыч Даўмонт, з нашага заходняга княства Эйсманты. Ён будзе прыслухоўвацца да голасу розуму, голасу нашых багоў, голасу вашага валхва, ў адрозненне ад папярэднага князя Ердзівіла. Таму я прапаную абраць Даўмонта нальшанскім князем. Хто за гэта, ўзніміце руку. Так, добра. Хто супроць? Нікаго, таксама добра. Цяпер ваш князь Даўмонт.

Пакуль нальшанцы крычалі Даўмонт, Даўмонт, да Міндоўга звярнуўся Ердзівіл:

— А мяне куды, ў Наваградак?

— Не, перад сваёй смерцю гандляр Чорнавіл перадаў твой былы дом Міхалку, свайму ўнуку, які ў хуткім часе ажаніцца. А ты з сям'ёй паедзеш валосціцелем ў маё паселішча Берасцы, гэта ў чатырох вёрстах на поўдзень ад паселішча Карэлчы. Збірайцесь, вас правядзё мой ганец Курыла.

Усё нальшанское акружэнне папярэдняга князя было заменена загадзя, таму Міндоўгу трэба было толькі пазнаеміць з ім Доўмонта, і супакоена вяртацца да сябе. Вяртаючысь у Воруту, Міндоўг пажадаў загарнуць у Любчу,але як толькі ён з Альгердам павярнулі туды, іх нагнаў ганец Песціла і паведаміў, што ў Наваградку памер князь Ізяслаў. Адправіўшы ганца ў Воруту за Войшалкам, сябры накіраваліся ў Наваградак.

Пасля смерці сваёй дачкі князёўны Марфы, князь Ізяслав сваю клопатлівасць засярэдзіў на сваім унуку Войшалку. Калі ўнук вымаліў узяць яго ў паход супроць хрысціянскіх рыцараў, Міндоўг не чакаў, што цяжкія параненні і загібель сваіх знаёмых, так уразіць чатырнаццацілетнега сына. Тады князь Ізяслаў спрабаваў растлумачыць свайму ўнуку, ў каго праўда жыцця. Але ён так і не змог пераканаць свайго ўнука. Князь Ізяслаў вельмі пакутаваў ад гэтага. Міндоўг разумеў, што тлумачыць Войшалку, абдуранаму маці і прапаведнікам хрысціянскай хлуслівай пакоры, аб нявінаватасці ў забойствах, вельмі цяжка. У свой час Міндоўг быў удзячэн князю Ізяславу за гэта, не толькі таму што вельмі шчыльна займаўся справамі княстваў, а і таму што не змог знайсці дакладные і не крыўдные словы для Войшалка, тлумача гэта. Цяпер для Войшалка астатні родны з дарослых, гэта тата, і на пахаванне князя Ізяслава княжыч вельмі гараваў. Пасля пахавання, Міндоўг сабраў заможных людзей Наваградка і тыя агульна выбралі яго князем Наваградка. Ён прызначыў ваяводам наваградкага княства яго сотніка Вітольда. Неўзабаве прыбыў ваяр Копысь і паведаміў:

— Князь Міндоўг, да крывіцкіх княстваў полацкага, віцебскага і мсціслаўскага яшчэ дадаліся крывіцкія княствы ізяслаўскае, менскае, лагожскае, аршанскае, браслаўскае, копыскае, барысаўскае, слуцкае, крычаўскае, пропошеское, рагачоўскае, чачэрскае, нясвіжскае і крутагорскае з запрошэннем цябе, князь Міндоўг, на вайсковага князя. Нема запрошэння ад князя Друцка і ад паўднёвых нашых княстваў, яны яшчэ не вызначыліся.

— Добра, Копысь. А ёсць весткі як ардынцы штурмуюць русінскія гарады?

— Так, князь. У іх ёсць абложныя катапульты. Перад аблогай яны заўседы прапануют здацца без бітвы. Два горада Растоў

і Угліч здаліся без супраціву, таму што іх князі з войскам загадзя пакінулі гарады, накіруясь у аб'яднанае войска. Чатырнаццаць гарадоў ардынцы падпарадкавалі сабе. Усе гавораць, што яны вельмі моцныя лучнікі.

— Копысь, а выведнікаў вы выяўлялі ў сабе?

— Так, князь. Выявілі ў Полацку на торжышча, чужынец гаварыў, што ардынцаў з Тартарыі сто тысяч напалі на Таржок, а на другі дзень падышлі столькі ж. Ён яшчэ гаварыў, што калі ўсе ліцвіны аб'яднаюцца з Полацкам, то ўсе роўна ардынцаў будзе ў сорак разоў больш. Яго забралі да князя, а потым выклікалі мяне. Я яго спытаў, ці блізка знаходзіцца торжышча ад брамы замка ў Таржку. Ён адказаў памылкова. Яго сталі катаваць, і ён прызнаўся, што сам з Разані, яго ардынцы прымусілі быць разведнікам пад пагрозай знішчэньня яго і яго сям'і. Яго таемно адвялі на ўсход вёрст за дзесяць, забілі і пахавалі. У Мсціславе таксама высвятлілі аднаго чужынца, які апынуйся разведнікам, яго таксама забілі.

— Толькі дваіх? Іх значна больш, трэба быць больш пільнымі. А з хуткімі ганцамі наладзілі?

— Так, князь Міндоўг. Ва ўсіх паселішчах, дзе будзе скакаць ганец прадбачаны заменныя коні.

— Добра, Копысь. Праз тры дні з табой адправяцца восем маіх памочнікаў, якія пакажуць якія працы трэба зрабіць для ўзмоцнення абараназдольнасці гэтых княстваў, а таксама навучаць вашых ваяроў бітвам на мечах. Пачынаць трэба з самых усходніх княстваў, потым пераходзіць на захад. Да зімы я меркую семнаццаць княстваў паспеюць аб'ехаць.

За тры дні Міндоўг вызначыўся з васьмью памочнікамі, гэта былі яго рыцары і збраяносцы. Ён ім распавёў, што ім трэба зрабіць чаму навучыць, і сумесна з Копысем яны адправіліся на ўсход.

Прыбыў да Міндоўга ганец з паселішча Даўга з чаканай прыемнай навінай, што жамойтка нарадзіла князю сына. Міндоўг з Пуцятам адправіліся з падарункамі ў паселішча Даўга. Хлопчык апынуўся буйней за звычнага дзіцяці. Даўга называла яго транас медаўс. Путята растлумачыў, што гэта труцень мядовы. Але Міндоўг не пагадзіўся з назвай і сказаў, што будзе першая

палова тваёй назвы, а другая палова маёй. Твая першая палова тран, а мая другая палова ята, ад Путята, і цалкам будзе Транята. Падарункі для іх, Міндоўг пасылаў з ганцом кожныя дзевяць дзён. У Наваградку Міндоўг зменшыў колькасць дружыннікаў Вялікага замка. Цяпер з дружыннікаў, якія збіраюць даніну для князя і ахоўваюць яго замак засталася пяцёра, астатнія перайшлі ваярамі ў сотні ваяводы Вітольда, дамы для іх пабудавалі ў пасадзе.

Прыбыўшы з поўдня гандляр Міхайла, разведаўшы што князь у Наваградку сустрэўся з ім і распавёў:

— Князь Міндоўг, у Галічы калі пачулі пра навалу Арды на ўсходніх русін, сын князя Міхаіла Чарнігаўскага Расціслаў пакінуў гэты горад і накіраваўся ў Чарнігаў. Пазнаўшы гэта, Данііл Рамановіч приступіў да Галіча і звярнуўся да яго жыхароў. І тыя былі згодны, штоб ён вярнуўся на бацькоўскае княжанне. Баяры таксама з гэтым згадзіліся. Вугорскі кароль, які раней быў супраць гэтага, цяпер пасля таго, што ты князь, дапамог Даніілу Раманавічу захваціць Драгічын, таксама згадзіўся, штоб ён сеў у Галічы.

— Міхайла, атрымліваецца, што Данілу Раманавічу быў патрэбен не толькі Драгічын, а ўражанне яго сілы на караля ўгорцев, штоб той даў яму згоду на Галіч.

— Князь, ён аддаваў табе сярэбраные манеты не столькі за Драгічын, сколькі за згоду вугорскага караля на Галіч. Цяпер Данііл Рамановіч адчувае сябе як прыдатны нашчадак князя Рамана Галіцкага. Валынь ён аддаў свайму малодшаму брату Васілька.

— Ён напэўна гуляе ў шахі. Добра, мне гэта да спадобы.

Пасля сыходу гандляра Міхайла, князь задумаўся, чаму Данііл Рамановіч так імкнуўся займаць Галіч, ці толькі ад таго, што гэты горад спадчына таты. Валынь таксама спадчына таты, але яе ён аддаў малодшаму брату. Галіч вельмі блізкі да зямель вугорскага караля, з якім ён сумесна правёў дзяцінства, а цяпер калі ардынцы напалі на ўсходніх русін, Данііл Рамановіч спадзяваецца сумесна з ім абараняцца. Шукае надзейнага саюзніка ў барацьбе з ардынцамі, гэта добра. Мне таксама трэба вызначыцца з надзейнымі саюзнікамі. Міндоўг праз ганцоў запрасіў усіх

саюзных князёў на сход у Наваградак. Ён вырашыў сустрэчся з князямі ў Наваградку, не толькі таму што прымальны пакой тут больш, чым у Воруце, але і таму каб падкрэсліць свой новы стан князя наваградскага і воруцкага.

На сход князёў не прыбылі толькі князь Выкінт і адасобныя яцвяжскіе князі. Замест цяжка хворага Доўспрунка прыбыў яго старэйшы сын Ердзівіл. Ад замка Любча прыбыў, пяць дзён таму прызначаны наместнікам, рыцар Ленгвін, а ад Воруты рыцар Альгерд. Акрамя Альгерда, Ердзівіла і Ленгвіна былі князі Нальшан, Гародні, Ваўкавыска, Слоніма, Здзітава, Случаску, Клечаска, Эйсманты, Даўбуды і Стрыжанята. Міндоўг у першыню збіраў усіх саюзных князёў. У добрых адносінах да яго большасці князёў ён не сумняваўся, але былі і тыя якіх ён мала ведаў. Іх адносіны да гэтага схода Міндоўга вельмі цікавілі.

— Князі, вы ведаеце што шматлікіе качавыя ваяры арды напалі з боку Тартарыі на ўсходніх русінаў. Ужо чатырнаццаць гарадоў розных княстваў апынуліся пад уладай ардынцаў. Ва ўсходніх русінаў, як і ў паўднёвых нема адзінага агульнага княства. А таксама нема адзінага галоўнага, або старэйшага князя, які здолеў бы арганізаваць вялікое адзінае і моцнае войска. У двух русінскіх гарадах ваяры пакінулі жыхароў без абароны, накіруючысь ў аб'яднанае войска. Пятнаццаць лет таму, Арда разграміла аб'яднанае войска многіх паўднёвых русін. Разграміла таму, што ў гэтым аб'яднаным войску не было адзінага галоўнага кіраўніцтва, кожны князь кіраваў сваімі ваярамі, як ён лічыў слушным. Усходнія русіны не ўлічылі памылкі паўднёвых русін і самі апынуліся ў такім жа становішчы. Я ўсё больш пераконваюся, што ў тых зямлях дзе князі хрысціяне нема згоды між сабой. У іх галоўнае быць багацей за сваяка. Нават у нашых саюзных крывіцкіх княстваў на ўсходзе нема агульнай згоды. Крывічы пачуўшы пра разгром ардынцамі ўсходніх русінаў, бальшасцю семнаццаццю княствамі запрасілі мяне быць іх вайсковым князем. Адразу высвятлілася адно вялікае княства Друцкае, якое не запрасіла мяне. Усё таму, што князь хрысціянін. Добра, што мы ўсе шматбожцы.

— Князь Міндоўг, ты запытанне прыняў? — спытаў князь Ваўкавыска Даў'ят.

— Так, князь Даў'ят, прыняў. З маёй дапамогай яны выяўляюць ардынскіх выведнікаў, наладзілі хуткіх ганцоў да мяне. Зараз маі памочнікі дапамагаюць ім у ўзмоцненні абараназдольнасці, навучаюць іх ваяроў бітвам на мечах. Калі на ўсходніе крывіцкае княства нападуць ардынцы, ім на дапамогу прыйдуць іх заходнія суседзі, пакуль я па весткі іх ганцоў, не прыйду ім на дапамогу. Па гэтых вестках я вырашу якія сотні ваяроў з нашых усходніх княстваў пазбіраць у атрад, для паходу на ўсход. Вельмі важна атрымліваць хуткія навіны ад розных крывічскіх разведнікаў і дазорных, таму что пры гэтым магчыма ўвядзенне новых соцен ваяроў с нечаканага ардынцамі напрямку от суседніх княжеств. Я лічу, што лепш змагацца ў дальніх зямлях за нашу зямлю і нашых жыхароў. Два лета назад я атрымаў весткі, что лівонские рыцары збіраюць вялікое войско супраць Лютвы. Мы добра падрыхтовалісь і не только знішчылі іх войско, значна большае за наше, на паўночных зямлях, а і вярнулі шматбожцаў земгалаў і куронаў к барацьбе супраць лацінскіх хрысціан. Я вас усіх запрасіў сюды, каб вырашыць вельмі важную справу. Пагрозы ад ардынцев і ад лацінскіх рыцарей с запада вымушают нас аб'яднацца ў адзінае магутное княство з адзіным галоўным, ці старэйшым князем, які будзе галоўным кіраўніком у вайсковых справах гэтага агульнага княства. Калі хто-небудзь з вас, князья сумневаецца ў неабходнасці аб'яднання ў агульное княство з адзіным галоўным князем, то яго ніхто не прымушае, змагайцесь адасобно ад нас. Нам трэба аб'еднаць толькі тыя княствы, якія разумеюць, прагнуць і здольны абараняцца сумесна. Я меркую, што гэта агульнае княство будзе складацца з княстваў добраахвотна стварывшае агульнае княство. У гэтым княстве ўсё будзе як раней, толькі вайсковымі справамі будзе кіраваць адзін галоўны князь. Усе князі абавязаны выконваць яго ўказы. Калі большасць князёў палічаць, што галоўны князь дрэнна спраўляецца са сваімі абавязкамі, то яны збіраюць сход князёў і выбіраюць іншага галоўнага князя. Для добрага меркавання галоўнага князя аб вайсковых паходах і іншых вайсковых справах, яму патрэбна добра ведаць аб колькасці ваяроў, аб іх здольнасцях ў кожным княстве, і яму патрэбна быць упэўненым ў яго князя, і яго ваярах. Таму калі князі добраахвотна створаць

агульнае княства і ведаюць, што гэтые княства будзе абавяскова абараняць агульнае войска, таму князі павінны выконваць усе ўказы галоўнага князя па вайсковым справам. Ні які князь не мае правы жадаць выйсці з гэтага агульнага княства. Калі будуць весткі, што якісьці князь не выканаў указ па вайсковым справам ад галоўнага князя, або прагне выйсці з агульнага княства, гэта будзе лічыцца здрадой агульнаму княству, і галоўны князь мае правы сваімі ваярамі пераменяць князя. Галоўнаму князю патрэбен давер да князёў і іх ваяроў з якімі ён збіраецца абараняцца ад ворага. Без гэтага не будзе перамогі над ворагам. Галоўнаму князю лепей змагацца меншымі ваярамі, але з тымі якім ён даверае. У гэтым я пераканаўся не аднойчы. Я меркую, што вы з гэтым згодны?

І ўбачыўшы, што большасць князёў былі згодны, дадаў:

— Бачу, што вы з гэтым згодны, таму я прапаную вырашыць ад свайго княства запрашэнне ў агульное княства з адзіным галоўным князем. Гэтым галоўным князем я прапаную сябе. Хто ад свайго княства згодзен даць гэта запрашэнне, падымае руку. Добра, ўсе згодныя. Дзякую за давер да мяне. Цяпер трэба даць назву галоўнаму, або старэйшаму князю і агульнаму княству.

Першым з князёў выказался старэйшы з іх, Дав'ят:

— Такога князя называюць Вялікім князем, а нашы зямлі называюць то Літвой, то Лютвой, алё гэта лацінцы так клічуць. Таму трэба казаць Вялікае Княства Літоўскае і Вялікі князь Літвы Міндоўг.

Усім гэта спадабалось. Пры развітанні, ўсе звярталіся да яго са словамі «Вялікі князь Літвы Міндоўг». Міндоўг застаўся начаваць ў Вялікім замку. Пасля смерці князёўны Марфы, яго маленькая дачка была на выхаванне ў князя Ізяслава, а пасля яго смерці, яна так і засталася ў Вялікім замку з выхавацельніцей. Дачке Міндоўга Адэліі было больш за тры лета і яна заўсёды была задаволена, калі ён заставаўся з ёй. У гэты вечар Міндоўг доўга гуляў з дачкой, жадаў адцягнуць сваі думкі ад мінулага сходу. Але калі ён легчы ў ложак, то думкі вярнулісь да схода. Міндоўг заўважыў, што апошнім хто падняў руку за запытанне на згоду, прытым неўпэўненна, быў Ердзівіл сын Доўспрунка. Узнікла думка, чаму менавіта родзічы так асцярожна адносяц-

ца да мяне, то дзядзька Выкінт, то старэйшы брат Доўспрунк з сынам Ердзівілам. І таму і другому, я дапамог атрымаць княства. Доўспрунк прагнаў больш моцнага княства, магчыма нальшанскага. Але гэта вельмі важнае княства і там патрэбны моцны ваяр, здольны ўзмоцніць абарону, а старэйшы брат не такі. Выкінт прыстасаваўся да большых цяжкасцяў, але і маей дапамогі яму было больш чым іншым. Ён атрымаў магчымасць быць самастойным, але гэтакім не стаў. Выкінт заўседы падпарадкаваўся то майму тату, то сваёй жонцы. А калі атрымаў магчымасць самастойнасці, то не змог працістаяць угаворам Булевіча. Жаданне быць агульным князем жамойтаў добрае, але для гэтага трэба быць рашучым, і ўсемі сродкамі пераконваць у сваёй правільнасці. У Выкінта гэта не атрымліваецца. Пакуль жаданні родзічэй перасягнулі іх здольнасці.

Пасля сняданку, Міндоўг накіраваўся ў Воруту. Перад брамай замка ён сустрэўся з ваяром Копысем. У замку ён разпавёў аб навінах з усходу.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, усё больш ардынскіх разведнікаў выяўляюць у сабе нашы крывіцкія княствы. Як ты раней папярэджваў, ардынскія разведнікі з’яўляюцца ў нашых гарадах па двое. У Віцебску, калі аднаго разведніка затрымалі, другі спрабаваў уцячы, але яго дагналі. Цяпер па прапанаве тваіх памочнікаў, перад уездом у горад усталявалі варту. У нас, у Полацку вартаўнікі заўважылі, што двое жадаючых увайсці ў горад, раптам павярнулі назад і хутка сталі ўцякаць. Тады адзін вартаўнік заклікаў на дапамогу двух ваяроў і тыя замянілі вартаунікоў, а самі вартаўнікі затрымалі падазроных. Выявілась, што яны ардынскія разведнікі. Вартаўнікам трапляюцца таксама злыдні і разбойнікі з іншых мясцін. Усіх затрыманых дапытваюць, а потым знішчаюць удалечыні. Па звестках нашых разведнікаў і затрыманых, ардынцы калі штурмуюць русінскія гарады, ўперадзі сабе вядуць русінскіх палонных, асабліва вядомых заможных людзей. У некалькіх выпадках гэта ім садзейнічае лёгка захапіць горад. Найбольш цікава нам разпавеў затрыманный ардынскі разведнік з Угліча. Пасля разгрому аб’еднаннага войску русінаў каля ракі Сіць, ардынцы захапілі горады Цвер і Таржок, а потым накіраваліся на поўнач для ўзяцця самага бага-

тага і самога дрэннага па абароне горада Ноўгарада. Яны прайшлі возера Селігер з правага боку, і дойдзя да Ігнач Крыж, нечакана павярнулі на поўдзень, а потым на паўднёвы ўсход да горада Казельск. Гэта потым падцвердзілі нашы разведнікі. Затрыманный з Угліча казаў, што з ардынцамі дамовіліся або наўгародскі князь Аляксандр Яраслававіч, які ужо два лета княжыў там, або яго тата князь Яраслаў Усеваладавіч. Князь Яраслаў Усеваладавіч раней княжыў у Наўгародзе і добра ведаў багацтва яго жыхароў і слабую абараназдольнасць горада, а калі стаў кіеўскім князем, то перадаў Наўгародскі стол свайму сыну Аляксандру. Цяпер, калі забілі ўладзімірскага князя Юрыя Усеваладавіча ля ракі Сіць, Яраслаў Усеваладавіч вельмі хутка заняў больш моцны стол Уладзіміра-суздальскага княства. Угліцкі затрыманны чуў ад уцекшага з той бітвы цвярскога ваяра, што ўладзімірскі князь чакаў падмогі ад свайго малодшага брата Яраслава, а замест яго нечакана напалі ардынцы, і перабілі амаль усіх непадрыхтаваных да нападу князёў з іх ваярамі. Прытым, гэта была вялікая частка ардынскага войска, якая вельмі хутка падышла да месца збору войскаў русінскіх княстваў. Яшчэ цвярскі ваяр казаў, што вельмі падазроно чаму ардынцы не пайшлі грабіць багаты Ноўгарад і тое, што на другі дзень пасля бітвы каля ракі Сіць, князь Яраслаў Усеваладавіч заняў горад Уладзімір. Князь Юрый Усеваладавіч быў забіты, а яго галава была адсечаная і паднесена ў дар хану Бату, а той загадаў гэтую галаву насунуць на дзіду і несці перад войскам штоб ўсе ведалі, русінскі галоўны князь забіты.

— Копысь, для ардынцаў галоўнае багатая здабыча, а не гонар за захопленыя гарады і зямлі. Таму я меркую, што князь Яраслаў Усеваладавіч паслаў свайго ганца адразу пасля бітвы каля ракі Сіць, да сыну Аляксандру, штоб той пазбіраў са сваіх гандляроў, рамеснікаў і іншых заможных людзей вельмі багатую даніну і з ёй выехаў на сустрэчу з ардынцамі. Ён перадаў ім гэты скарб і запэўніў іх у сваёй пакорнасці. А гэты горад Казельск на поўнач ад Віцебска, ці Смаленска?

— Не, Вялікі князь Літвы Міндоўг. Казельск на поўдні ад Смаленска.

— Мабыць, яны атрымалі такую багатую здабычу, што ім быў не патрэбен багаты Смаленск.

— Так, Вялікі князь. Яны без стараннасці напалі на маленькі горад Казельск. Прытым, гэты горад быў вызначаны месцам збору ўсіх ардынскіх атрадаў, таму яго абклалі і не штурмавалі. Калі праз шэсцьдзесят дзён падышлі войскі яшчэ двух ваяводаў, то горад узялі за тры дні. А потым накіраваліся на паўднёвы ўсход.

— Мабыць ардынцы атрымалі багатую здабычу, а таксама вялікі палон і дамовіліся з галоўным князем русінаў Яраславам Усеваладавічам і яго сынам наўгародскім князем Аляксандрам Яраслававічам пра даніну ў кожнае лета. Яны дамагліся таго чаго жадалі, атрымалі вельмі багатую здабычу, знішчылі тых русінаў якіе супрацьдзеялі ім, і вызначылі двух зраднікаў князеў, прыдатных выконваць іх пажаданні. У гэта лета яны ў паход больш не пойдуць. А ў надыходзячае лета трэба чакаць іх з поўдні. Добра, будзем рыхтавацца да сустрэчы з імі.

— Вялікі князь, яшчэ адно крывіцкае княства запрашае цябе ў вайсковыя князі, гэта друцкае княства.

— Добра, Копысь. Я згоден. Калі хтосьці з маіх памочнікаў завершыць сваю працу, няхай прыбудзе ў друцкае княства і там выканае тое самае.

Пасля сыходу Копыся, Міндоўг разаслаў ганцоў у свае княства з паведамленнем аб навінах з усходу. Калі на другі дзень вярнуўся ганец з Жыжмы, то Міндоўг пачуў сумную вестку, што ўчора яго старэйшы брат Доўспрунк памёр. Міндоўг з Альгердам адразу накіраваліся ў Жыжмы. Вялікі князь здзівіўся, што на пахаванне Доўспрунка не было іх дзядзькі Выкінта. Альгерд выведаў, што перад смерцью Доўспрунк пажадаў, штоб князем замест яго быў старэйшы сын Ердзівіл, також меркавалі заможныя людзі, а ваяры лічылі што лепей было бы паставіць князем малодшага сына Таўцівіла. Але Міндоўг не стаў праводзіць сход, і прызначыў князем Ердзівіла, як жадаў памерлы брат.

Вяртацца з Жыжмы, Вялікі князь пажадаў праз Любчы. Акрамя таго што трэба было пагледзець на працы па ўмацаванні абараназдольнасці, Міндоўг жадаў убачыць Марту. У мінулае наведванне Любчы, Міндоўг некалькі супакоіў сваё незадавальненне ад першай сустрэчы з Мартай, калі ён быў зачараваны ад гэтай маладой дзяўчыны. Яны наблізіліся да замка і ўбачылі,

як Ленгвін кіраваў працамі над пасткамі побач з валам. За карацейшы час Ленгвін выканаў больш прац па ўзмоцненню абароноздольнасці, чым ды яго. Накіроўваючыся ў Любчу, Міндоўга цікавіла, апраўдаецца яго рызыка прызначыць маладога, моцнага рыцара ваяводам да маладой ўдавы і прыгожай князёўне. За падлетком Ленгвіном ён уважліва назіраў на працягу ўсей яго вучобы на збраяносца і на рыцара. Міндоўг пераканаўся, што сірата Ленгвін больш за ўсё прагне быць вельмі моцным ваяром і цалкам адданым яму. Міндоўг навумысна накіраваў Ленгвіна на іспыт для маладога ваяра, жыць штодзённа побач з прыгожай і спакуслівай князёўнай. Марту ён лічыў разумнай і хітравай дзяўчынай. Мінулая сустрэча з ёй выразна сведчыла аб яе жаданні канчаткова зачараваць яго, і стаць яго жонкай. Цяпер Вялікі князь правяраў сябе і іх. Міндоўг быў задаволен, як старанна выконваў сваю працу Ленгвін. На ганку церама іх сустракала Марта, яна была ўсхваляваная і радасна.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, я вельмі рада доўгачаканаму з'яўленню ў Любчы. Яе бліскучыя вочы, па-сапраўднаму сведчылі аб яе радасці, і яму пад ціскам гэтых цудоўных вачэй пажадалася ёй верыць. Міндоўг амаль не супраціўляючыся падпаў пад яе зачараванне.

Вяртаючыся да Воруты, Міндоўг праз прыемныя думкі, пачуў разважанне Альгерда, што Ленгвін цалкам засяродзіўся на ўзмоцненні абараназдольнасці Любчы. Так, яны абодва вытрымалі іспыт. Перад Калядамі вярнуліся з крывіцкіх княстваў яго памочнікі, акрамя аднаго які вярнуўся праз тры дні. Прыбыўшы ў Воруту, ваяр Копысь падзякаваў Вялікага князя ад імя ўсіх крывічскіх князёў, за працу яго памочнікоў і за яго парады па ўзмоцненю абараназдольнасці.

— Копысь, ардынскіх выведнікаў вылоўліваеце больш ці меньш?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, у апошнія часы іх стала меньш.

— Я думаю, што іх не стала меньш. Крывіцкія князі пачуўшы, што ардынцы сышлі на поўдзень, вырашылі што выведнікі больш не прыйдуць да іх. Але яны вельмі памыляюцца. Цяпер, у зімку ардынцы меркуюць куды далей накіравацца. На Чарнігаў,

Смаленск, Віцебск, Полацк ці на Кіеў, Валынь і Галіч. Я меркую, што яны накіруюцца праз Чарнігаў на крывіцкія зямлі. Побач з гэтымі зямлямі знаходзяцца валоданне князёў зраднікоў, уладзіміра-суздальскае і наўгародскае княствы. У любы час ардынцы могуць патрабаваць ад іх дапамогі, і вельмі цяжка будзе змагацца з ардынцамі асцярогаясь нападзення з паўночнага боку наўгародскіх войскаў і з усходу ўладзіміра-суздаль. Таму вельмі важна зараз вылоўліваць ардынскіх разведнікаў. Лепей за ўсе каб ардынскія разведнікі накіруючыся ў крывіцкія княствы, бесслядоўна знікалі, гэта будзе сведчыць аб адзіным парадку ў саюзе крывіцкіх княстваў, і аб адзіным саюзным супраціве ворагам. Калі такое адбудзецца, то ардынцы прызадумаюцца нападаць на моцнае аб'яднанае войска шматлікіх княстваў, або паступова па чарзе знішчаць асобныя русінскія княства з малакалькасным войскам, якое кожнае лета слабей ад бітваў з суседзямі.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, я цалкам згодзен.

— Трэба, штоб з гэтым былі згодны крывіцкія князі і ўзмоцнілі нагляд за прыбыўшымі, і не толькі ў гарадах, а і ў вялікіх паселішчах.

— Вялікі князь, раней больш выяўлялі ардынскіх выведнікаў, а цяпер больш зладзеяў і разбойнікаў, а таксама русінаў якія ўцяклі ад ардынцаў і прагнуць жыць і працаваць у нас.

— Нягоднікаў і разбойнікаў знішчаць прылюдна. А калі сярод збеглых русінаў ёсць рамеснікі са сваімі інструментамі, і яны пакажуць крывіцкім рамеснікам свае ўмельствы, то няхай будуць. Калі будуць збеглыя ваяры, то паселіць у паселішчы далей ад горада, і дапамагчы ў будаўніцтве ім дамоў, а таксама стварыць з іх атрад пад кіраўніцтвам крывіцкіх ваяроў.

— Вялікі князь, прыходзяць земляробы са сваімі сем'ямі. Як быць з імі?

— Я меркую, што добрыя земляробчыя палі каля рэк усе занятыя,таму няхай займаюць тыя месцы, дзе ім пакажуць князі, або іншіе заможныя людзі. Пасля адыходу Копыся, Альгерд які амаль заўсёды быў пры Міндоўгу, калі ён сустракаў гандляроў і іншых разведнікаў, выказаў сваю асцярогу:

— Міндоўг, рызыкова ствараць атрад збеглых ваяроў, сярод іх могуць быць разбойнікі і ардынскія разведнікі.

— Так, рызыкова. Але яны будуць не ў горадзе, і за імі будуць наглядаць. Я лічу, што сярод іх будуць жадаючые адпомсціць ардынцам, або русінскім князям здраднікам. Першые две бітвы будуць паказальные, хто з іх хто.

Неўзабаве прыбыў ганец з Капыля, і ад імя нававыбранага князя, запэўніў Вялікого князя Літвы Міндоўга, што капыльскае княства далучаецца да іншых саюзных княстваў у стварэньня Вялікага Княства Літвы. Міндоўг папярэдзіў, што капыльскае княства знаходзіцца на паўднёвым усходзе, адкуль трэба чакаць нападу ардынцаў, таму трэба павялічыць колькасць дазорных і разведнікаў. Вялікі князь Літвы паабяцаў ранняй вясной прыбыць у Капыль. З надыходам вясны, ў 6747 лета (1239 па хрысціянскаму календары), Міндоўг сумесна з рыцарам Дзімінам і ганцом, вырашыў наведвацца ў сваі паўднёвыя саюзныя княства. Спачатку ён прыбыў ў Капыль.

Гэта было самае ўсходняе з паўднёвых саюзных княстваў Літвы. Па дарозе ў Капыль, ганец распавеў Вялікаму князю, што гэты горад пабудавалі на паселішчы нарманаў, якія тут засталіся па загаду нарманскіх гандляроў.

— У гэтых мясцінах ёсць валокі, па якім перацягваюць розныя корабелі з рэк ад вялікай ракі Нёман у ракі ад вялікой ракі Дняпро. Цяпер гэтыя валокі на працягу пяці вёрст, а раней было на працягу пятнаццаці вёрст. Уздоўж валок шмат хутароў, у якіх жылі нарманы. Яны ўжо даўно ажаніліся на дрыгавіцкіх дзяўчынах, цяпер усе яны яцвягі. Так яны зрабілі некалькі моцных гацей і па іх хутчэй прасоваюцца карабелі далей. Наш гандляр Міхайла скардзіўся, што тут самы даражэйшы праезд. А каля замка ў іх роў, які запаўняюць вадой, калі пагражае вораг.

Набліжаючыся ды Капыля, Міндоўг убачыў што гэта замчышча размяшчалася ў зліцці двух рэк, Мажы і Каменкі. Ад ворага горад прыкрывалі не толькі моцныя сцены замка і вады рэк, а таксама шырокі роў, запоўнены вадой. Сустракаючый Міндоўга князь Нормунт, апынуйся маладым і каранастым, з добрым ветлым тварам мужчынам.

— Добры дзень, Вялікі князь Літвы Міндоўг, вельмі рады бачыць у нас. Ад гандляроў і ваяроў я ведаю, што вы са сваімі ваярамі перамагаеце ўсіх, нават моцных лівонскіх і мазурскіх

рыцараў. Для нас вялікі гонар прымаць у сабе такога славутага Вялікага князя.

— Дзякуй, князь Нормунт. У гэтае лета я чакаю нападзенне ардынскіх ваяроў на нашых крывічоў і на нас. Таму я прыбыў, штоб дапамагчы ў узмоцненні абараназдольнасці твайму княству, ўваходжаннаму ў агульнае княства Літвы. Першае што я заўважыў, так гэта важны гандлярскі шлях. Гандляры шмат ведаюць навін, патрыбных нам, таму я прапаную табе, князь Нормунт, зацікавіць іх зборамі такіх навін для нас, за гэта магчыма зменьшыць кошт праезду па тваёй зямлі. Важныя навіны для нас трэба хутка давезці да мяне. Штоб ты князь не меў ад гэтага страту, я за кожныя важныя навіны буду плаціць срэбрам. Вось па гэтаму вышытаму кавалачку тканіны, ў нашых горадах твайму ганцу дадуць свяжэйшага каня.

— Добра, вялікі князь Міндоўг, я згоден.

Далей Міндоўг пабачыў паказальные бітвы на мечах капыльскіх ваяроў, даў некалькі парад гэтым ваярам. На другі дзень, пакінуў рыцара Дзіміна для навучэнне дазорных, Вялікі князь паспешыў ў горад Клеческ, да сваёй сястры Альгуты і да князя Карыбута, які пасля смерці свайго таты стаў князем. Міндоўг яшчэ не бачыў двух сыноў Альгуты і Карыбута, таму яму было цікава ў каго яны. Праз браму замка Вялікі князь убачыў, што сястра і князь выйшлі на ганак церама сустракаць яго. Сястра выглядала, як сапраўдная заможная князёўна. Чуйка Міндоўга падсказывала яму, што яна мабыць галоўная ў сям'і. Сястра першая кінулася на шыю брата. Два іх сына шаснаццацілетні Карыдоўг і пятнаццацілетні Мінгайла былі паўналетнімі і таму былі пры гутарцы за сталом з татам і маці. Старэйшый сын быў вышэй і моцней за яго аднaлеткі Войшалка, быў больш падобны на тату, а малодшый быў больш падобны на сястру і таксама быў дужы.

У адрозненне ад іншых пляменнікаў, сыноў старэйшага брата Доўспрунка, гэтыя здаравякі глядзелі на Міндоўга ветліва і нават з захопленнем. Князёўна Альгута з гонарам распавяла пра сваіх сыноў, пры гэтым яна была вельмі падобна на іх памерлую маці. У першыню за доўгі час, Міндоўг адчуў сабе ў сямейным, шчырым асяродзі. Сястра і князь шмат казалі пра хітрыкі сыноў,

а тыя не крыўдзілісь, а толькі ўсміхаліся. У гэты шчаслівы дзень не воднага слова не было сказана пра пагрозы. Перад вячэрай Вялікого князя добра папарылі ў лазне.

Раніцай па жаданню Вялікага князя, князь Карыбут сабраў на плошчы сваіх ваяроў, сотнікаў і дзесятнікаў. Сыны князя таксама прысутнічалі. Міндоўг біўся на трэніровачных мечах з жадаючымі яму супрацьстаяць. Кожны раз пасля паядынку ён тлумачыў аб памылках яго праціўнікаў, і адразу ж усе ваяры выконвалі практыкаванне якое ім загадваў Вялікі князь. Асобо ўважліва ён назіраў за дзеяннімі сваіх пляменнікаў і з задавольненнем бачыў, як яны старанна і дакладно выконвалі ўсе яго пажаданні. Наступным днём сотнікі і дзесятнікі навучалі сваіх ваяроў бітвам на мечах. Угэты дзень адбылося непрыёмнае здарэнне. Пры трэніровачным сражэнні на мечах малодшы сын Мінгайло прапусціў моцны ўдар ад старэйшага Карыдоўга. Патрыбна была дапамога знахаркі. Та запэўніла, што Мінгайло паправіцца праз пяць дзён.

Выбраўшы момант, калі Мінгайло застаўся адзін, Міндоўг падрабязно распавёў яму ад чаго так здарылась, і пажадаў выконваць кожны дзень тры практыкаванні, якіе дапамогуць яму ў далейшым перамогаць не толькі старэйшага брата, а і ўсіх іншых яго супернікаў. На пры канцы размовы, Вялікі князь з задавольненнем убачыў, што настрой Мінгайло вельмі палепшыўся. Таксама Міндоўг адзначыў, што сястра ўспрыняла гэта здарэнне як звычнае для сына, будучага сапраўднага ваяра.

На шосты дзень знаходджання ў Клецку, Міндоўг стаў навучаць узаемадзеянням сотні ваяроў пры розных абставінах бою. На наступны дзень у Клеческ прыбыў рыцар Дзімін і адразу стаў навучаць дазорных. Яшчэ праз тры дні Міндоўг накіраваўся ў горад Здзітаў.

Сумна развітаючыся з сям’ёй сястры, Вялікі князь разумеў, што доўга затрымлівацца ён не можа, ворагі могуць неўзабаве напасць. Перад тым, як адправіцца ў паўднёвыя княствы, Міндоўг дамовіўся з Альгердам, што калі будуць важныя весткі, то да яго адразу накіруюць ганца, але вестак не было, а ён чамусці спяшаўся, і ў Здзітаве на другі дзень адправіўся ў Воруту. Сустрэўшый яго Альгерд запэўніў, што важных навін нема. Раз-

важаючы потым, чаму ён так спяшался, ён прышоў да высновы, што ў Клецку назірая за сямейным добрабытам сястры, яму пажадалась зноў ажаніцца і стварыць такі сямейны добрабыт, як у сястры. Мінула больш за два лета, як памерла Марфа, таму абычай шматбожцаў дазваляе зноў ажаніцца.

Думкі толькі аб адной жанчыне прывабілі яго. Марта зачаравала яго з іх першай сустрэчы, нават пярсцёнак з капытоў лася не дапамог супроць сілы яе чар. Іншы раз узнікаюць думкі, што яна так ласкава з ім таму, што ён Вялікі князь, але гэтые думкі раптам знікаюць калі паўстае яе чароўны вобраз. А ўжо калі гэты вобраз паўстае, то вызваліцца ад яго вельмі цяжка. На гэты раз разважанне супэніў ганец, які чарговы раз вярнуўся з селішча Даўга. Ён распавеў Вялікаму князю, што яго сын Транята ўжо ўпэуненна ходзіць і вельмі цікавіцца ўсім.

Праз два дні Міндоўг з падарункамі, а таксама з Пуцятам і з ганцом, адправіўся ў паселішча Даўга. Малы на сам рэч з моцнымі нагамі цікавіўся ўсім, што бачыў. Ён ахвотна падышоў да Міндоўга, зазірнуў яму ў вочы і стаў цікавіцца яго нязвыклай вопраткой. Вялікі князь міжвольна параўнаў яго з маленькім Войшалкам, і прызначыў што Транята больш дужы і цікавы за Войшалка. Праз тры лета трэба да яго прымацаваць Путяту, штоб ведаў не толькі жамойцкую гаворку, а і нашу. На другі дзень, калі Міндоўг вярнуўся ў Воруту, да яго прыбыў гандляр Волімунт. Ён распавёў, што тэўтоны перамоглі прускія плямёны вармаў у паселішчы Бальга і цяпер будуюць там замак.

— Усё бліжэй падыходзяць да моцнага прускага племяні самбаў. На жаль, прускія плямёны не змаглі аб'яднацца для супраціва лацінскім хрысціянам. Калі я быў з татам у Тувангсце, іх князь Рудзевіч дамовіўся з маім татам, што калі будзе вялікая пагроза ім, то ён прышле ганца ў Наваградак з заклікам аб дапамозе. Пакуль не прыслаў, таму мабыць меркуе, што пераможа ворагаў самастойна.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, а калі прыбудзе яго ганец з заклікам аб дапамозе, то пойдзеш на дапамогу?

— Не ведаю Альгерд, чакаю навін з паўднёвага ўсходу.

Але навін не было. Гандляр Міхайла, які вярнуўся з поўдня, запэўніў Вялікага князя, што на поўдні ўсё без перамен. Полацкі

ваяр Копысь, прыбыўшы да Вялікага князя, пра ардынцаў таксама нічога не змогчы сказаць. Ён толькі спытаў, як быць з уцекшымі русінскімі ваярамі, яны крыўдзяцца на недавер да іх. Міндоўг прапанаваў сабраць іх у атрад і пад кіраўніцтвам крывіцкіх сотнікаў адправіць у Смаленск. Калі ардынцы вырашаць напасць на крывічоў, то пачнуць са Смаленска.

Тым часам чароўны вобраз Марты не пакідаў Міндоўга. Да поўдня, стаміўшысь ад трэніровачных бітваў на мечах са сваімі збраяносцамі, Вялікі князь накіраваўся ў Любчу. Марта чакала яго на ганку церама. Яна была прыгожа, ўсхвалявана і ў прыбранай адзежы, што здзівіла Міндоўга. Скакаў ён хутка, і за той вельмі кароткі час, што дазорны з вышкі перадаў Марте аб яго прыбыцці, яна маловерагодна паспела б прыбрацца. Хутчэй за ўсё, яе чуйка падсказала, што ён цяпер наведае яе.

За сталом сядзелі мужчына і жанчына, якіе штосці казалі адзін іншаму, сэнс сказанага быў невялікі, галоўнае было ў іх вочах. Узаемные погляды сведчылі, што ў іх аднальковае жаданне, застацца сам-насам і штоб ім ніхто не перашкаджаў. Але служанка раз за разам заглядала да іх з пытаннем аб дазволу зайсці то сястры, то Ленгвіну, то пара лі падаваць вячэру. Марту гэта вельмі раздражняла і яна нарэшце ўказала падаваць вячеру і дазволіла зайсці сястре і Ленгвіну. Рыцар спрабаваў расказаць Вялікаму князю аб працах па ўзмоцненню абараназдольнасці, але Міндоўг яго спыніў і адклаў гэта на заўтра. Вячэра была карацейшая за звычную. Доўгачаканая ноч для іх была і ласкавай, і шаленай, і доўгай, і вельмі кароткай. Раніцай разглядаючы яе, ён заўважаў, што яе твар стаў тонкаскуры і больш бялявы, як быццам палова крыві пакінула. У гэты час Міндоўг быў згодзен ісці ў палон яе чар, і яму больш не патрэбна была ні якая Янька, а толькі яна, Марта. За сняданкам, Марта выглядала, як жанчына якая толькі што знасіліла, але дамаглася свайго, а Міндоўг быў зачараваны ёю і яму гэта было да спадобы. Пасля сняданку Вялікі князь з рыцарам Ленгвінам аглядеў равы і пасткі, а потым яго пахваліў. Вяртаючыся ў замак, Міндоўг заўважаў набліжаюшчагася да Любчы, князя Даўмонта з ганцом. Пры сустрэчы, Вялікі князь спытаў:

— Князь Даўмонт, мяне шукаеш?

— Так, вялікі князь Міндоўг. Мне патрэбен рыцар Дзімін, штоб кіраваў навучэннем маіх дазорных.

Пры гэтым князь Даўмонт выглядаў некалькі разгублiным, напэўна ад нечаканасці сустарэчы. Міндоўг указаў ганцу Даўмонта накіравацца ў Воруту да рыцара Альгерда, і той па ўказу Вялікага князя адправіць рыцара Дзіміна ў Нальшаны. А Даўмонту прапанаваў наведаць замак Любча, гэта прапанова князю была да спадобы.

Пасля вяртання, з першага погляду на Марту, Міндоўг прымеціў ў яе вочах агеньчыкі хітрыкаў. Гэта Міндоўга насцярожыла, а што Даўмонт амаль адналетка яе, высокі, моцны, прыгожый і ўжо князь моцного княства. Але, калі выйшла да іх малодшая сястра Ядзя, і Міндоўг убачыў, як страпянуўся Даўмонт, стала зразумелым для каго прызначылась гэта маладая і высокая ахвяра. І хоця ў гэтага маладога і высокага ёсць на захадзе былая нявестка і сын, ён не змог устояць перад чарамі малодшай сястры. Вось гэтак за два дні сястры змаглі атрымаць дзве бліскучыя перамогі.

У мужчын вайна здзесняецца з дапамогай мячоў і стрэл, а ў жанчын з дапамогай стрэл амура і чар. Гледзячы як пагладаюць адзін на другога, малады ваяр і маладая ваярка, Міндоўг прышоў да высновы, што гэтакой паўнаважкай перамозе можа пазайздросціць не толькі ён, а і сам Аляксандр Македонскі. І чым прывабіла Даўмонта малодшая сястра Ядзя, цяжка зразумець. Яна была таўсцее і вышэй за Марту, рыжаваласая, і ў вочах было шмат прытворнай нявіннасці. Безумоўна, без чараў тут не абышлося.

Але ў Вялікага князя не было жадання ўцягнуцца ў схільнасці Даўмонта, яму быў патрэбен моцны нальшанскі князь, а гэтага лягчэй дамагчысь, калі ў яго будзе сямейны дабрабыт. Наступным днём князь Даўмонт пакінуў Любчу, трэба было падрыхтаваць сваіх дазорных да прыбыцця рыцара Дзіміна. Міндоўг вярнуўся ў Воруту праз два дні, яму не трэба было замінаць Марце быць у двухлетнім смутку па памерламу мужу. Праз дваццаць дзён да Міндоўга прыбыў полацкі ваяр Копысь.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, мы па тваему загаду накіравалі сотню ўцекшых русінскіх ваяроў з нашым сотнікам і дзе-

сятнікамі ў Смаленск. Іх там добра сустрэлі, але праз дзевяць дзён да Смаленска надышоў атрад русінаў князя Яраслава Усеваладавіча. Гэты князь патрабаваў ад Смаленска, штоб атрад ліцьвінаў пакінуў горад.

— Чаму ліцьвінаў?

— Вялікі князь, ён сказаў атрад ліцьвінаў.

— Сярод смалянаў ёсць здраднікі, а можа сярод уцекшых русінскіх ваяроў.

— Вялікі князь, мы пыталі ў сотніка, той казаў, што ніхто з яго ваяроў не адлучаўся з атрада.

— Так, а што смаленскі князь?

— Вялікі князь, смаленскі князь Усевалод Мсціслававіч з пскоўскіх. У яго шмат супернікаў, якія з віцебскіх заможных людзей, таму рашучых дзеяў ён прымаць не будзе. Прышоў да сцен Смаленска моцны князь Яраслаў Усеваладавіч, ен уступае яму каб толькі яго не чапалі, а калі прыйдзе другі моцны князь, то ён уступе яго патрабаванням. Па яго загаду наша сотня вярнулася ў віцебскую зямлю.

— Добра. Цяпер смаляне атрымалі яшчэ адно пацвярджэнне таго, што князь Яраслаў Усеваладавіч здраднік русінаў. Сотня ваяроў прыйшла да іх, каб ім дапамагчы ў будучай абароне ад ардынцаў, а князь Яраслаў Усеваладавіч патрабуе прагнаць іх. Больш навін нема?

— Нема, Вялікі князь. Альгерд пачуў, што размова завяршаецца, спытаў Капыся:

— А што самі ўцекшые русіны гавораць пра гэта з’яўленне атрада Яраслава Усеваладавіча?

— Яны таксама гавораць, што здраднік Яраслаў Усеваладавіч не прагне, штоб багаты горад Смаленск узмоцніў сваю абараназдольнасць.

— Добра, але ўсё роўна іх не трэба селіць у вялікіх гарадах.

Вялікі князь дадаў:

— Пачынается восень, я меркую, што цяпер яны на нас не пойдуць, а накіруюцца ў паўднёвыя зямлі.

Калі Капысь выйшаў ад іх, Альгерд спытаў у Міндоўга:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, а чаму ты меркуеш, што ардынцы цяпер не нападуць? Князь Яраслаў Усеваладавіч умысна

падышоў да Смаленска, штоб яны не ўзмоцнілісь і ардынцам было лягчэй іх заваяваць.

— У ардынцаў доўгія паходы. Зараз пачаліся доўгіе дажджы і гразь, коням будзе цяжка, а неўзабаве пойдзе снег, для коней недастатковы корм.

— Міндоўг, але на ўсходніх русінаў яны напалі ўзімку.

— Гэта для мяне была загадка. У кожнага ардынскага ваяра па два, а то і тры коня, ня толькі для змены ў час паходу, а і для перасовання здабычы. Такую вялікую колькасць коней цяжко пракорміць. У русінаў толькі два горада не былі спалены, запасаў корму ў іх недастаткова для ўсіх ардынскіх коней, таму я лічу, што з імі перад паходам была дамова з уплывовым князем. Гэты князь дамовіўся аб загатоўке корму па шляху ардынцаў. Аб гэтым сведчыць абставіны, пры якіх быў забіты старэйшы брат, і як хутка малодшы брат стаў князем Уладзіміра-Суздальскім. Дзеля гэтага княства Яраслаў Усеваладавіч дапамагаў ардынцам знішчаць сваіх супляменнікаў, а свайму сыну загадаў пазбіраць багатую здабычу для ардынцаў.

Праз дванаццаць дзён полацкі ваяр Капысь зноў прыбыў у Воруту.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, полацкі князь Брачаслаў выдаў сваю дачку за наўгародскага князя Аляксандра Яраславіча, вяселле адбылося ў русінскім Таропцы.

— Гэта здрада. Ён мабыць меркуе, што на іншыя крывіцкія княствы нападуць, а на яго не. Ён вельмі памыляется, ардынцам не цікава, хто чэй родзіч, ім патрэбна багатая даніна. А потым, калі ў яго дачкі з'явіцца сын, то здраднік Яраслаў Усеваладавіч, або яго сын, будзе лічыць Полацк сваім спадчынным княствам. Што палачане гавораць пра гэта?

— Большасць палачан ганьбуюць. Некалькі заможных людзей, якія былі за князя Брачыслава, цяпер адхіліліся ад яго.

— Добра. Альгерд, у якім княстве ёсць процістаянне княжычаў?

— Вялікі князь, у Жыжмах пасля смерці Доўспрунка, выбралі твайго старэйшага пляменніка Ердзівіла, але больш рашучым і майсцеровітым ваяром у Лівонскім паходзе быў твой малодшы пляменнік Таўцівіл, і ўсе іх ваяры гэта бачылі.

— Альгерд, ты пацвердзіў мае думкі пра Таўцівіла. Яго я накірую ў Полацк.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, у Полацку большасць заможных людзей хрысціяне, а пляменнік Таўцівіл шматбожац.

— Капысь, я гэта ўлічваю. Тата маіх пляменнікаў Доўспрунк, заўседы ўмеў дамовіцца з хрысціянскімі прапаведнікамі, дамовіцца і яго сын. Ён не возьме з сабой валхва. Ён возьме якоганебудзь сябра і слуг, я дадам свайго збраяносца Сымона, які навучаў ваяроў Полацка. А ты, Капысь, падскажаш яму добрых заможных людзей. У гэты ліхі час Полацку трэба, штоб яго князь быў дасведчаным ваяром. Дваццацілетні Таўцівіл такім будзе.

Вялікі князь выклікаў былога полацкага ваяра Міколу, і сумесна з Капысём растлумачыў яму з кім трэба сустрэчся і гаворыць, штоб па прыбыцці Вялікага князя з Таўцівілам у Полацк іх добра сустрэлі, і быў агульны сход веча для выбрання новага полацкага князя. Найбольшую цяжкасць для Міколы будзе ўгаворваць хрысціянскіх прапаведнікаў заклікаць на агульны сход вечавым звонам з Сафійскага сабора. Але Міндоўг ведаў кемлівасць Міколы і быў упэйнен, што ён зможа ўсяго дамагчысь. Яны вырашылі, што Полацку трэба іх чакаць праз тры дні. Свайго ганца Міндоўг адправіў сумесна з Сымонам у Доўбуды, штоб князь-волат Доўбуд накіраваўся ў Нальшаны і там з Даўмонтом чакалі яго. А сам сумесна з Капысем і з высокім рыцарам Яўнутам адправіўся ў Жыжмы.

Таўцівілу прапанова Вялікага князя прышлась да спадобы і ён узяўшы з сабой ваяра аднагодку Мірона, накіраваўся ў Нальшаны. З Нальшан сумесна з двума князямі-волатамі, а таксама з Яўнутам і Сымонам яны накіраваліся ў Полацк.

Вестка аб прыбліжэнні Вялікага князя з волатамі-ваярамі апярэдзіла іх, і яны за Капысем пад гукі Сафійскага звону прасоўваліс па самому старэйшаму гораду крывічоў. Горад уразіў Міндоўга не тым, што быў значна большы за Наваградак і за Пскоў, а тымі шматлікімі высокімі царквамі і кляштарамі, ў тым ліку мураванымі.

Капысь накіраваў Вялікага князя да Верхняга замка, да Сафійскага сабора, дзе заўсёды адбываліся важныя з’явы. Жыхароў Полацка сабралася вельмі шмат і Вялікаму князю патрабавалася

ўся яго гучнагалоснасць, штоб растлумачыць здраду князя Брачыслава, і якая небяспека ад гэтага атрымалася.

Таксама Міндоўг паясніў чаму зараз Таўцівіл самы патрэбны для Полацка князь. Бліжэй да Міндоўга стаялі прыхільнікі Вялікага князя, яны голасна падтрымлівалі яго і таму пры выбранні новага князя не было ні адзінага, хто быў супраць прапановы замены князя. У той жа дзень былога князя Брачыслава вывелі з княскага церама, а пасаднік усеагульна абвесціў, што Таўцівіл абраны новым князем Полацка. Наступным днём Вялікі князь, сумесна з Доўбудам і Даўмонтам пакінулі Полацк, а з полацкім князем Таўцівілам засталіся рыцар Яўнут, збраяносец Сымон, ваяры Мірон і Мікола. Ворутскія ваяры засталіся з Таўцівілам часова, пакуль новы князь будзе гуртаваць вакол сябе коло заможных і адданых яму людзей.

Вяртаючыся ў сваю зямлю, князь Доўбуд пацікавіўся ў Міндоўга:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, чаму твой выбар новага полацкага князя спыніўся на дваццацілетнім Таўцівіле, а не на вопытным Альгерде, княства ж вялікае і моцнае?

— Князь Доўбуд, Таўцівіл сын Доўспрунка, а ён умеў дамовіцца з хрысціянскім прапаведнікам. Я меркую што яго сын атрымаў такую ж асаблівасць таты. Ні ў каго іншага такой звычкі нема. Яму дваццаць лет, але ён не ажаніўся, я ведаю чаму, але гэта не важна. У Полацк ён накіраваўся без нявесткі, і гэта для мяне пахвальна. Зараз у Полацку шмат заможных людзей, ў тым ліку пасаднік. Яны будуць імкнуцца ажаніць яго на сваёй дачке. Хрысціянскія прапаведнікі ўлічвалі гэта, калі абвесцілі аб веча звонам з Сафійскага сабора. Прапаведнікі разлічываюць што Таўцівіл пажадае ахрысціцца перад вяселлем з хрысціанскай нявесткай. Іншые заможныя людзі таксама будуць імкнуцца наладзіць добрыя адносіны з ім. Яны меркуюць, што малады ваяр, не вопытный ў княжых справах, без іх дапамогі не зможа добра кіраваць вялікім княствам і будзе паслухмяны ў іх. Але там засталіся Мікола і Капысь, якія добра ведаюць заможных людзей і падскажут яму каму не треба давяраць, а каму магчыма. Наконт Альгерда, так ён сам не прагне быць князем, яму і ў Воруце добра.

— Вялікі князь, я сумняваюся, што ён не прагне быць князем, усе прагнуць.

— Доўбуд, у цябе ёсць шчыры сябра, якому ты суцэльна даверны, і які заўсёды цябе падтрымлівае ў усіх тваіх пачынаннях, не таму што ён павінен, а таму што яму гэта да спадобы?

— Такога нема.

— А ў мяне ёсць, гэта Альгерд. Ен мой наместнік у ворутском княстве па ўсім справам. Нават наваградчане, калі я адпраўляюся куды-небудзь, накіруюцца да яго, таму што ведаюць, яго ўказ гэта мой указ. Ніколі не было таго, штоб яго ўказу я быў супраць. Перад тым як прызначыць указ, ён думае якое рашэнне я б прызначыў. І ён ніколі не памыліўся. Мы ведаем адзін другога з дзяцінства, і ведаем добра, як ніякага іншага. Іншы раз я пытаюсь ў яго, каб праверыць годнасць маіх указаў. Доўбуд, ты кожны дзень займаешся трэніроўкай на мечах?

— Вялікі князь, не кожны дзень. Я больш знахожуся ў кузнецкай майстэрні.

— Доўбуд, гэта розны рух. Толькі кожнадзённы рух пры бітвах на мечах, забяспечыць табе поспех у сраженнні з рыцарамі. Ад гэтага залежыць не толькі тваё жыццё, але і годнасць усяго нашага войску. Альгерд гэта разумея і кожны дзень трэніруецца не толькі з мячамі, а і ў метані штылета, нажоў, а таксама ў стральбе з лука. Прычым, метані і стральбе ён навучыўся ў яцвягаў значна маладзейшых за сябе. Я бачыў, як ён старанна прыслухоўвался да навучаюшчых яго маладых ляснікоў, пры гэтым ён не лічыў сабе дасведчаным рыцарам. А я пасароміўся таму, штоб мяне навучалі маладыя яцвягі. Свайго сына ён выховае гэтакім. А ты?

— Вялікі князь, мае сыны больш за мяне трэніруюцца ў бітвах на мечах, але і ў кузню прыходзяць працаваць.

— Добра.

Прыслуховаюшчыйся да іх размовы, Даўмонт вырашыў звярнуцца да Міндоўга:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, прашу дазволіць мне ажаніцца з малодшай сястрой Марты, Ядзей.

— Добра, Даўмонт. Я згоден. Мне трэба, штоб нашы князі былі ў сямейным добрабыце.

— Дзякуй, Вялікі князь Міндоўг.

Вяртаючыся ў Воруту, Міндоўг жадаў заехаць у Любчу. Цяпер каля Крэва шляхі яго з Даўмонтом разыходзіліся і ён заўважыў, што настрой нальшанского князя на ўздыме. Мабыць пасля лазні апранецца ў святочную вопратку і паскача ў Любчу сватацца да Ядзі. Потым развітаўшысь і з Доўбудом, Міндоўг яшчэ хутчэй паскакаў у Любчу, ён жадаў да заходу сонца прыбыць да Марты.

Пры сустрэчы, Вялікі князь адчуў, што Марта яго чакала. Спачатку ён пажадаў, штоб яму хутка падрыхтавалі лазню, а калі праз вельмі кароткі час Марта яму сказала, што лазня падрыхтавана, ён недаверна накіроваўся ў лазню. Алё лазня на самой справе была растоплена і там чакаў яго лазеншчык.

Атрымлівая асалоду ад лазні, Міндоўг у чарговый раз разважаў, добра ці не, тое што Марта наперад ведае яго думкі. Нацешыўшыся ад майстэрства лазеншчыка, ён схіліўся да думкі, што гэта добра. Гэтым разам у Любчы была пазнейшая вячэра, чакалі Вялікага князя з лазні. Міндоўг на вячэре старанна спрабаваў ухіліцца ад размовы пра Даўмонта, штоб не выкрыць яго думкі аб сватаўстве. Але на пры канцы вячэры, гледзячы як Ядзе стала веселей, зразумеў што яна разведала тое, што ёй было патрыбна. Гэта малодшая сястра нічуць не менш за старэйшую, валодае вядзьмарскімі чарамі.

Раніцай Міндоўг быў вельмі задоволен і паездкай ў Полацк, і гасціннем у Марты. Праз тры дні пасля вяртання ў Воруту, прыбыў да Міндоўга ганец ад Даўмонта з запрашэннем на яго вяселле з Ядзей. Вяселле адбылося праз сем дзён. Па заканчэнні, вялікі князь пакінуў яго сумесна з Мартай. А яшчэ праз пяць дзён, ганец паведаміў, што ў Жыжмах князь Ердзівіл ажаніўся на мясцовай яцвяжке, якая была цікава не толькі для князя, а і для яго малодшага брата Таўцівіла. Перад Калядамі прыбыў у Воруту полацкі ваяр Капысь.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, пра што спачатку распавясці, пра ардынцаў, ці пра Таўцівіла?

— Спачатку пра ардынцаў.

— Вялікі князь, ад віцебскага гандляра я даведаўся, што ардынцы да восені паваявалі ў зямлях Тартарыі і ў двух русінскіх

горадах Мурам і Пороховец, памежных з тартарамі. На маі пытанні, ён гаворыў, што ардынскія коні нізкія і харчуюцца сенам і травой, збожжам не харчуюцца. У ардынцаў два скураных футра, адзін з вадой, другі з сушоным кіслым сырам.

— Пачакай. Капысь, ты не спытаў яго, чым ардынцы харчавалі коней зімой ў доўгім паходзе на ўсходніх русін?

— Вялікі князь, я яго спытаў аб гэтым. Ён адказаў, што іх коні капытамі разрывалі снег, штоб знайсці астатнюю траву. Мне не магчыма ўявіць сабе, як конь можа разгрэбці зляжалы снег з лёдам, штоб знайсці дрэнную траву.

— Зразумело. Далей.

— Мой смаленскі сябра казаў, што перад восенню ардынцы захапілі памежнае са стэпам пераяслаўскае княства русінаў.

— У ардынцаў розныя атрады з моцнымі ваяводамі?

— Так, Вялікі князь. Пасля смерці Чынгісхана дванаццаць лет таму, галоўным у іх хан чынгісід Удегей, сын памерлага Чынгісхана. Ён усе захопленыя зямлі падзеліў на ўлусы. Хан Бату, сын памерлага хана чынгісіда Джучы, які напаў на ўсходніх русін, валодае Улусам Джучы. У яго некалькі вялікіх атрадаў, якімі кіруюць моцныя ваяводы. Пасля таго, як ардынцы захапілі Переяславль на левым беразе ракі Дняпро, яны пайшлі на поўнач. Там яны аблажылі і захапілі стольны горад Чарнігаў і паселішчы вакол яго і ўздоуж рэк Дзясна і Сейм. Потым яны пайшлі на поўдзень. Вяртаясь уздоуж левага берага, ваявода ардынцаў Мунке ўбачыў Кіеў і паслаў туды свайго пасла з прапановай мірна сдаць яму горад. Але княжывшый там Міхаіл Усевалодавіч Чарнігаўскі з гэтай прапанавай не згадзіўся і забіў паслоў. Князь Міхаіл Чарнігаўскі заняў кіеўскі стол пасля таго, як яго пакінуў князь Яраслаў Усевалодавіч.

— Добра. Меркую, што ардынцы ў бліжэйшы час на крывічоў не пойдуць, а накіруюцца на Кіеў. Іх ваявода Мунке памыліўся, не трэба было пасылаць сваіх паслоў у Кіеў. Калі ў яго не хапала моцносці захапіць Кіеў, ці для коней было недастаткова харчэй, то не трэба было падыходзіць да горада, трэба адразу накіравацца на адпачынак. Цяпер ваявода Мунке зневажыў Арду і яны адсунуць яго, а прызначаць іншага ваяводу, які адразу накіруецца ў Кіеў, потым на галіцкія і валынскія зямлі, а потым

і на нашы паўднёвыя зямлі. Тое што ардынцы пасля Чарнігава не накіраваліся на Смаленск і далей на нашых крывічоў, а павярнулі на поўдзень, сведчыць што яны не атрымалі таго чаго чакалі. Чакалі яны, што русінскія здраднікі падрыхтуюць запасы харчоў для іх коней, але смаленскае княства самастойнае і не падпарадкаваецца ўладзіміра-суздальскаму князю. Князь Яраслаў Усеваладавіч не шмат чаго дамогся ад смаленскага князя. Тое што наша сотня ваяроў сышла са Смаленска, не апраўдавае тых выдаткаў вялікага атрада князя Яраслава Усеваладавіча на доугі паход па спустошаных сваіх зямлях. Пры першых звестках аб тым, што ардынцы накіруюцца ў Смаленск, іх князь запроша дапамогі ад крывіцкіх князёў, і ён ведае, што такую дапамогу атрымае. Вельмі важна тое, што ардынцы зразумелі, ў крывічоў чакаюць іх разведнікаў, вылоўліваюць і знішчаюць іх. Пасля Чарнігава яны чакалі здрадніка правадыра у крывіцкія зямлі, а прыбыў да іх ганец Яраслава Усеваладавіча з весткай, што нарыхтовак харчэй для ардынскіх коней нема, крывічы аб'ядняліся з ліцвінамі для сумеснага супрацыву, а таксама вылоўліваюць і знішчаюць разведнікаў. Ардынцам засталось толькі захапіць корм у акресных паселішчаў і павярнуць на поўдзень. Капысь, цябе трэба ад майго імя папярэдзіць усіх крывіцкіх князёў, што калі ардынцы ідуць на іх паходам зімой, ці перад зімы, то ўсе нарыхтоўкі сена, ці якой небудзь травы трэба адразу спаліць. Цяпер кажы пра Таўцівіла.

— Вялікі князь, разгарнулася змаганне сярод заможных людзей за тое, штоб Таўцівіла ажаніць на сваей дачке, ці нават на сваей пляменніцы. Найбольш стаpанны ў гэтым вельмі моцны і багаты землеўладальнік са сваёй дачкой, і пасаднік з пляменніцай. Таўцівіл прасіў мяне выведаць у цябе Вялікі князь, дазволіш лі яму перайсці ў хрысціянства, каб ажаніцца. Я меркую, што ён ужо вырашыў свой выбар, але трывае гэта пры сабе.

— Я дазваляю яму перайсці ў хрысціянства, штоб ажаніцца на крывіцкай дзяўчыне. Я яму жадаю, штоб не падвяло яго пачуцце да прыгожай дзяўчыны з моцнымі заможнымі сваякамі. Калі Копысь выйшаў, Альгерд звярнуўся да Міндоўга.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, з думкамі пра ардынцаў і пра князя Яраслава Усеваладавіча я з табой цалкам сгодзен, а пра

Таўцівіла і яго пераход ў хрысціянства, мяне штосці непакоіць, я нават не ведаю што. Так, чуйка.

— Альгерд, Таўцівіл нагадвае мяне. Я таксама малодшы з братоў, таксама больш ваяўнічы чым старэйшы брат, і ў яго таксама, як у мяне з'яўляецца шанец палепшыць сваю будучыню ў іншых зямлях.

— Міндоўг, чуйка мне гаворыць, што ў цябе добры настрой ад таго, што ардынцы не пайшлі на Смаленск, а вярнуліся на поўдзень, і ты лёгка дазволіў Таўцівілу перайсці ў хрысціянства.

— Альгерд, так у мяне добры настрой, ардынцы ўсвядомілі якая для іх небяспека аб'еднанне крывічоў з Літвой. Яны накіроўваюцца туды дзе раз'еднанне і варожасць між суседзямі, а калі наўадварот суседзі аб'едналісь, то яны накіруюць шмат разведнікаў, штоб іх раз'еднаць. Таму я ўпэйнен, што яны не пайдуць у бліжэйшы час на крывічоў. А за Таўцівілам наглядаюць Мікола і Капысь. Пакуль вопытный Мікола не вярнуўся да Вольгі, я меркую што для яго там шмат працы, а ён вярнецца тады, калі ўсё будзе добра.

У першыню прыбыў у Воруту ганец з Капыля ад князя Нормунта, яму дазволілі прайсці, калі ён паказаў вышыты кавалачак тканіны. Ён распавёў што кажут гандляры на волаках пра ардынцаў. Большасць таго што распавёў ганец, Вялікі князь ведаў ад Капыся, толькі навінай было тое, што калі запасы ежы скончаліся, то ардынцы пускалі кроў коням і пілі яе. Пасярэдзіне зімы прыбыў да Міндоўга той жа самы ганец з Капыля.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князь Міхаіл Усеваладавіч Чарнігаўскі, княжыўшы ў Кіеве, пакінуў гэты горад. Адні гавораць што ўцёк да ўграў, іншыя што да ляхаў. Князь Данііл Рамановіч заняў Кіеў, і пакінуўшы там намеснікам ваяводу Дзмітры Ейковіча вярнуўся ў Галіч.

— Князі пачуялі, што ардынцы прыйдуць горад знішчаць, таму і ўцяклі. Перадай князю Норманту, што ардынцы пасля Кіева пойдуць на галіцкіе і валынскія землі, а потым на нашы паўднёвыя землі, таму трэба павялічываць колькасць дазорных і больш цікавіцца навінамі ад гандляроў.

Гэта Вялікі князь казаў ганцу таму, што гандляр па далёкім паўднёвым землям Міхайла доўга хварэў, а яго сын Міхалок

ушэдшы ў першы самаўстойлівы гандлярскі паход, яшчэ не вярнуўся. За тры дні да вясны і новага 6748 лета (1240 па хрысціянскім календары) вярнуўся з паўднёвых зямель Міхалок. Шмат з таго, што ён распавеў Вялікаму князю было вядома, але адна навіна ўразіла Міндоўга.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, уладзіміра-суздальскі князь Яраслаў Усеваладавіч напаў на паўднёвы галіцкі горад Камянец. Там захапіў у палон жонку князя Міхаіла Чарнігаўскага, якая з'яўляецца сястрой князя Данііла Раманавіча Галіцкага. Сам Міхаіл Чарнігаўскі ўцёк з Кіева да ўграў, там ён спрабаваў угаварыць караля Белу Чацвёртага выдаць дачку за свайго сына Расціслава, які неасцярожна пакінуў Галіч. Ён разлічваў, што пасля гэтага шлюбу, Расціслаў вярне Галіч, але кароль ўграў ведаючы бядотны стан чарнігаўцаў, ад змовін адхіліўся. Таму князь Міхаіл Чарнігаўскі звярнуўся да свайго былога суперніка Данііла Рамановіча з просьбай аб дапамоге ў вызваленні жонкі. Князь Данііл Рамановіч угаворыў князя Яраслава Усеваладавіча вярнуць жонку Міхаіла Чарнігаўскага. Пасля гэтага князь Міхаіл Чарнігаўскі запэўніл Данііла Раманавіча, што будзе заўседы яму союзнікам.

— Мяне ўразіла не тое, як русінскія князі ваюць між сабой, нават калі на іх усіх напалі ардынцы, я да гэтага прызвычаіўся. Мяне ўразіла тое, што ўладзіміра-суздальскі князь Яраслаў Усеваладавіч не займаецца аднаўленнем сваіх спусташаных зямель, а накіроўваецца больш, чым за восемсот вёрст у чужынскае княства, для таго штоб захапіць чужую жонку. Тлумачэнне гэтаму паходу адно, ен накіраваўся туды штоб знайсці ў тых зямлях здраднікаў, якія б прызапасілі харчы для ардынскіх коней ў час паходу на гэтые зямлі. Я меркую, што пасля Кіева іх вялікое войска падзеліцца на дзве часткі, адна вялікая частка войска пойдзе на Валынь, а меншая частка на Галіцкае княства. Вялікая частка войска захапіўшы Валынь, пойдзе на нашы паўднёвыя зямлі. Я задаволен тым, што князь Данііл Рамановіч падпарадкаваў сабе не толькі галіцка-валынскія зямлі, а і кіеўскае княства. Цяпер я чакаю ад яго, што ён аб' яднае ўсіх ваяроў паўднёвых русінскіх княстваў вакол абароны Кіева. Мабыць ўсходнія русіны ўсвядомяць, што іх князь Яраслаў Усеваладавіч здраднік, і

пойдуць на дапамогу сапраўднаму моцнаму русінскому князю Данілу Раманавічу.

Калі гандляр Міхалок пакінуў іх, Альгерд пацікавіўся ў Міндоўга:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, а калі князь Даніл Рамановіч вырашыць, што ваяроў паўднёвых русін недастаткова і звярнецца да цябе аб дапамозе, ты яму дапаможаш?

— Альгерд, ён не дарма вельмі дамагаўся Галіча, гэты горад вельмі блізкі да ўграў. Даніл Рамановіч разлічвае на дапамогу вугорскага караля, таму я лічу, што спачатку ён звярнецца за дапамогай да яго, тым больш што да ўграў перасяліліся полаўцы.

— Міндоўг, а калі ад вугорскага караля ён не атрымае дапамогі, і звярнецца да цябе?

— Альгерд, вугорскі кароль разумеючы, што захапіўшы галіцкае княства, ардынцы накіруюцца на ўграў, ведаючы што ў іх полаўцы, іх даўнія ворагі. Таму ён дапаможа. Калі Даніл Рамановіч звярнецца да мяне, то я дапамагу яму. Сумесна мы здолеем ардынцаў, я ў гэтым упэўнен.

У пачатку вясны да Міндоўга прыбыў Мікола.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, полацкі князь Таўцівіл стаў хрысціянінам і ажаніўся на дачцэ багатага зямлеўладальніка Міхася. Да яго прыезджаў на вяселле яго старэйшы брат Ердзівіл са сваёй жонкай.

— Раскажы мне пра гэтага зямлеўладальніка Міхася.

— Вялікі князь, Міхась самы багаты зямлеўладальнік у полацкім княстве. У яго шэсць вялікіх, прыгодных да ворыва надзелаў зямлі, ўсе яны каля ракі. Ён узмацніўся калі быў недахоп збожжа ў смаленскага і наўгародскага княстваў. У Міхася ёсць гандлярскі драккар, а таксама асабістая дружына ў сем ваяроў.

— Мікола, ты лічыш што Таўцівіл трывала займае полацкае княства?

— Так, Вялікі князь. Полацк старажытны вялікі гандлярскі горад, у ім заўседы было шмат гандляров і рамеснікаў, алё калі прыйшлі лацінскія хрысціяне са сваімі рыцарамі ў вусце ракі Заходняя Дзвіна і захапілі два нашых горады ўнізе па рацэ, то гандлярам стала цяжэй. Яны зразумелі, што трэба ўзмоцняць

полацкіх ваяроў. Таўцівіл стаўшы полацкім князем падкрэсліў патрыбнасць у моцных ваярах. Да яго полацкія князі імкнуліся да павялічэння сваего багацтва, а ён імкнецца да павялічэння колькасці ваяроў і абараназдольнасці горада. Пры ардынскай пагрозе гэта зразумелі ўсе. Таму ўсе патрабаванні Таўцівіла па ўзмоцненню абараназдольнасці княства ўспрымаюць з разуменнем. Цяпер ім патрэбен гэты малады і ваяўнічы князь, і яны яго з задавальненнем атрымалі.

— Добра, Мікола. Сумаваў па сваей сям'і?

— Так, Вялікі князь, вельмі сумаваў.

— Добра. Дзякую. Перад святам Яна Купалы да Міндоўга прыбыў ганец з Капыля.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, гандляры кажуць што князь Данііл Рамановіч накіраваўся да вугорскага караля, штоб там ажаніць сваего сына Льва на дачцэ караля Канстанцыі.

— А ён змог дамогчыся аб'яднаць усіх вояроў паўднёвых русінскіх княстваў дзеля абароны Кіева?

— Вялікі князь, ён гэтым не займаўся. У Кіеве застаўся яго намеснікам тысяцкі Дзмітры Ейковіч.

— А пра ардынцаў ёсць весткі?

— Нема, Вялікі князь.

— Не апраўдаў маі надзеі Данііл Рамановіч, праявіў слабасць. А такім князям не атдаюць сваю дачку. Спачатку трэба было аб'яднаць усіх для абароны Кіева, а потым магчыма было і ажаніць сваего сына, і дамовіцца аб дапамогі ў абароне Кіева. Чарнігаўскі князь таксама спрабаваў ажаніць сваего сына, але вугорскі кароль растлумачыў яму, што бедны жаніх не патрэбен яго дачке. Зараз Данііл Рамановіч у такім жа становішчы, як Чарнігаўскі князь. Ардынцы захопяць Кіеў, а потым іншые русінскіе княства, тады Данііл Рамановіч застанецца ў спусташаных княствах. Ардынцы прызначаць князя здрадніка, а Данііл Рамановіч будзе ў яго васальнай залежнасці.

Альгерд назірая як Міндоўг перажываў, што Данііл Рамановіч не апраўдаў яго надзеі, вырашыў паслаць ганца за Мартай. Толькі яна магла адцягнуць Вялікага князя ад цяжкіх дум. Яна ўжо скончыла сумаваць па памерламу мужу, і была рашуча і чароўна ў сваім імкненні стаць Вялікой князёўнай Літвы. Па

завяршэні палявых прац, у пачатку восені Міндоўг ажаніўся на Марце. Адразу Вялікая князёўна дала зразумець усім, што яе трэба паважаць, асабліва калі пры гэтым Міндоўг адсутнічаў. Усе здзіўляліся, адкуль у гэтай дачкі лесніка столькі гонару. Альгерд бачыў, што Міндоўг задаволены новай жонкай і таму праяўляў павагу да яе, як усе астатнія. Толькі калі да Вялікага князя прыбывалі ганцы або гандляры з важнымі весткамі, іх прымалі Міндоўг з Альгердам. Яны чакалі навін з поўдня.

Першым з поўдня прыбыў Міхалок. Ён з ачуняўшым татам сумесна адправіліся на поўдзень. У Пінску Міхалок са сваімі памочнікамі сышоў на бераг, а гандляр Міхайла прадоўжыў на драккары шлях на ўсход і на поўдзень.

Міхалок і раней быў у Пінску, але цяпер яму патрэбна была не толькі гандляваць, а і выведаць думкі князёў Пінска, Турава і Давыд Горадка.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, у гэтых княствах моцна ўплываюць прапаведнікі канстанцінопальскага хрысціянства. Таму іх князі асцярогаюцца далучацца да агульнага Вялікага Княства Літвы, якім кіруе шматбожец. Але рамеснікі і жыхары Пінска і Давыд Гарадка з якімі я размауляў, былі згодны з аб'яднаннем у агульнае моцнае княства. Пінское княства больш моцнае сярод іх, іншыя князі прыслухоўваюцца да Пінскага князя. Але той не вельмі ўпэўнен у сваім становішчы, асцярогаясь сваіх сваякоў. Я князёў паперэдзіў, што ардынцы будуць засылаць сваіх разведнікаў, і што Вялікі князь раіў іх выяўляць і таемна знішчаць.

— Зразумела, у пінскага князя як у русінаў. А што ў Данііла Раманавіча?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князю Даніілу Раманавічу не ўдалося ажаніць сваего сына Льва на дачке вугорскага караля. Вайсковую дапамогу ён не атрымае.

— Мая чуйка аб гэтым мяне папярэджвала. Праз дванаццаць дзён да Міндоўга прыбыў гандляр Міхайла.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, далей Кіева мы не плылі, таму што перад гэтым горадам у наш драккар трапіла ардынская страла з наканечнікам у выглядзе ромба. У самым Кіеве ўсе чакаюць нападзення ардынцаў. Князя там нема, ўсімі абарончамі працамі

кіруе тысяцкій Дзмітры. Але да яго мала хто прыслухоўваецца. Заможныя людзі хаваюць свой скарб у глыбокіх схронах пад сваім домам. Мой сваяк з боку жонкі са сваей сям'ёй, са сваей дружынай у пяць ваяроў, а таксама са сваім скарбом накіраваўся на сваім драккары ў нашы зямлі. Яны засталіся на волоках у Капыля і чакаюць ад мяне весткі пра твой, Вялікі князь Міндоўг дазвол паселіцца ў Наваградку, або каля яго. Ен за гэта добра заплаце срэбрам. Мы з жонкай вельмі просім цябе, Вялікі князь Літвы Міндоўг, дазволіць ім выкупіць два ці тры вялікіх дома ў Наваградку, ці каля яго.

— Міхайла, ў яго дружыне ёсць вопытны ваяр які раней кіраваў сотняй?

— Так, Вялікі князь Міндоўг, ёсць у яго старшой дружыннік, які да цяжкага ранення ў нагу кіраваў сотняй.

— Добра. У замку Любча ваяводам рыцар Ленгвін, ён мне патрэбен тут. Калі твой сваяк добра плаціць, ён са сваёй дружынай і з тутэйшымі ваярамі займе гэты замак. Каля замка на рацэ Нёман ёсць добры прычал для яго драккара. Замак абараназдольны са ровам і пасткамі.

— Дзякуй, Вялікі князь Літвы Міндоўг я зараз пашлю гонца ў Капыль.

Сваяк Міхайла, кіеўскі гандляр Андрэй Кіян быў вельмі задаволены замкам Любча і шчэдра заплаціў за яго. Перад Калядамі прыбыў ганец з Капыля.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, ардынцы захапілі Кіеў, спустошылі і падпалілі горад. Потым яны пайшлі на захад, захапілі Ізяслаў у галіцкім княстве, а пасля яго падзеліліся на два войскі. Адно пайшло на Валынь, а іншае на Галіч.

— А ёсць весткі, дзе ардынцы прайшлі без супраціву?

— Так, Вялікі князь. Гандляры са здзіўленнем гаворылі, што болховскую зямлю яны прайшли без супраціву.

— А гэта зямля знаходзіцца побач з горадом Камянец?

— Так, Вялікі князь. Болоховская зямля на ўсходзе мяжуе з кіеўскім княствам, а на захадзе з галіцкім княствам. Каля мяжы знаходзіцца галіцкі горад Камянец.

— А хто князем у гэтай болохоўскай зямлі?

— Не ведаю, Вялікі князь.

— У наступны раз, спытай у гандляроў аб князю болоховской зямлі. А дзе знаходзіцца князь Даніїл Рамановіч?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князь Даніїл Рамановіч вярнуўшысь ад караля ўграў у галіцкую зямлю і разведаўшы, што ардынцы пасля знішчэння Кіева, пайшлі на захад, уцёк да ляхаў сандармірскай зямлі. Гэта між ляхамі кракаўскай зямлі і мазурскай зямлёй.

— А яго брат Васілька?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князь Васілька з сям'ёй ўцёк да Конрада Мазавецкага.

— Пасля Валыні, ардынцы накіруюцца на нашы паўднёвыя зямлі. Скажы сваему князю Нормунту, штоб вельмі пільна прыглядаліся да ўсіх чужынцаў. Зараз ардынскія разведнікі магчыма будуць сярод гандляроў і іншых русінаў.

Калі ганец пакінуў Вялікага князя, ён са шкадаваннем сказаў:

— Я спадзяваўся, што галіцка-валынскія князі будуць упарта супрацiўляцца ардынцам, але для іх асабістае жыццё больш значнае, чым думкі аб іх здрадзе жыхарам іх княстваў. Князь Яраслаў Усевалодавіч знайшоў на поўдні здрадніка, які дапаможа ардынцам, таму яны лёгка захопяць галіцка-валынскія зямлі. Альгерд, накіруй ганцоў у нашы паўднёвыя зямлі з гэтымі весткамі і з маім указам вельмі пільна прыглядацца да ўсіх чужынцаў.

— Добра, Вялікі князь. Я меркую, што кіеўскі гандляр Андрэй высветліць асобу болоховского князя.

— Так, згодзен. Няхай ганец перадасць яму маё запрашэнне ў Воруту.

Наступнай раніцай да Міндоўга прыбыў гандляр Андрэй. Ён ужо ведаў ад ганца, што Кіеў знішчылі ардынцы.

— Добрага ранка, Вялікі князь Літвы Міндоўг.

— Андрэй, што ты ведаеш пра болоховскую зямлю і іх князя?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, болоховская зямля знаходзіцца на захад ад кіеўскага княства, гэта маленькае княства і на заходняй мяжы ў яго галіцкае княства. Князі ў гэтай зямлі з рурыкавіцкай дынастыі, нашчадкі Ігара Святаславіча. Дваццаць восем лет таму галіцкія баяры палявалі за болоховскімі князямі і іх родзічамі. Ім удалося забіць усіх акрамя Уладзіміра Ігаравіча,

які ўцёк у Чарнігаў. Зараз князем у іх Ізяслаў Уладзіміравіч, ён сваяк чарнігаўскаму князю Міхайлу Усеваладавічу і для яго галоўны вораг князь Данііл Рамановіч Галіцкі. Вялікі князь Літвы Міндоўг, навошта цікавішся гэтым малазначным княствам?

— Ардынцы пасля Кіева без супраціву прайшлі праз гэту зямлю і толькі ў галіцкай зямлі ім супрацістаялі ў Ізяслаўлі. Я меркую, што ардынскі памочнік князь Яраслаў Усеваладавіч, знайшоў ардынцам яшчэ аднаго памочніка ў болохаўскай зямлі.

— Вялікі князь, мы ў Кіеве таксама здзівіліся таму, што князь Яраслаў Усеваладавіч са сваім атрадам быў у такім далёкім Камянцы. Цяпер я ўпэйнен, што захоп у Камянцы жонкі князя Міхайла Чарнігаўскага, гэта толькі падстава, штоб ён змог апраўдаць свой гэтакі далёкі паход з атрадам у гэты горад. Жонка чарнігаўскага князя з'яуляецца сястрой Данііла Рамановіча. Атрымліваецца што болохаўскій князь згодзілся з Яраславам Усеваладавічам на дапамогу ардынцам узамен на тое, што ён захопіць сястру Данііла Раманавіча, а сам ён як бы да гэтага захопу не прычастны.

— Атрымліваецца так. Мне раней маі гандляры гаварылі, што Кіеў вялікі і вельмі важны горад для ўсіх русін. Цяпер атрымліваецца, што ніхто не прагне яго абараніць. Чаму так?

— Вялікі князь, дзве сотні лет таму Кіеў параўноўвалі з Канстанцінопалем. У ім быў не толькі княжы двор, а і двары яго сыноў, братоў і іншых родзічаў. Пры князю Яраславе Уладзіміравічы ўжо шэсць яго сыноў і іншых родзічаў жадалі быць удзельнымі князямі. На вялікім гандлёвым шляху Дняпро-Дзвінскім усе гарады былі са сваімі князямі, таму яны пачалі адымаць месца купцоў на ўсходніх малых рэках, якія ўпадаюць у вялікія гандлёвыя рэкі, такія як Дняпро. На ўсходзе былі землі неславянскіх маларазвітых плямёнаў Тартарыі. Яны займаліся развядзеннем коней і хатней жывёлы, земляробствам і паляваннем на звяроў. Іх паселішча былі ў месцах не бачных з ракі, яны асцярогаліся, што на іх нападуць. Гэтыя паселішча былі невялікіе. Удзельныя князі расшыралі месца купцоў у бок усходніх плямёнаў мера, мурама, чудзь. І паступлова захапілі іх, таму што былі лепей ўзброеныя. Гэтая чудзь стала разумець славянскую гаворку і

перашла ў услужэнне русінам. Усходне-русінская гаворка стала напалову чудзьская. Але чудзь былі шматбожцы і ў іх, забіць што людзіну, што скаціну аднолькава. Удзельныя князі, штоб прымусіць іх да пакорнасці русінам прыводзілі прапаведнікаў канстанцінопальскай хрысціянскай веры. Але гэтая чудзь забівала ўсіх гэтых прапаведнікаў. У апошніе лета, ужо пры князю Андрэю Юр'евічу, якога на ўсходзе празвалі Богалюбскі, пабудавалі шмат царквоў і гэтая чудзь стала пакорлівай, але толькі для свайго князя. Каля сямідзесяці лет таму, князь Андрэй Юр'евіч пазбіраў вялікае войска з усякай чудзі і разбурыў Кіеў, разрабаваўшы ўсе царквы і манастыры. Два дні ўся гэтая богалюбская чудзь рабавала і паліла горад. Спустошаный горад Кіеў, князь пакінуў свайму малодшаму брату Глебу Юр'евічу, а сам вярнулся ва Уладзімір. У гэтым разрабаванні былі яго родзічы ад мацярынскага боку, полаўцы. Гэты князь Андрэй Юр'евіч першы хто парушыў старшынство ў родзе Рурыкавічаў. Да таго часу старэйшы князь быў уладальнікам старэйшага кіеўскага стола, а ён прымусіў прызначыць яго ўладзіміра-суздальскае княжанне старэйшым. Трыццаць сем лет таму смаленскі князь Рурык Расціслававіч ў саюзе з Чарнігава-северскімі князямі і з полаўцамі разрабаваў і спаліў Кіеў. Полаўцы шмат увялі палоненных. Кіеў яшчэ не зусім аднавіўся, як напалі гэтыя ардынцы. У Кіеве вельмі дрэнна гавораць пра князя Данііла Рамановіча.

— Андрэй, а якіе яны гэтая чудзь?

— Вялікі князь, яны выглядаюць як стэпнякі полаўцы, алё жывуць сярод лясоў. Яны каранастыя і ніжэй ростам, у іх маленькія і вузкія раскосыя вочы. Таксама яны плоскатварные і з цёмнымі валасамі. Яны ў адрозненне ад нас вельмі ваяўнічые, як полаўцы.

— Добра, Андрэй. Дзякуй.

Калі гандляр Андрэй пакінуў іх, Альгерд сказаў:

— Вялікі князь, маё пачуццё ад яго распавядання, што ён дрэнна адносіцца як да шматбожжа, так і да хрысціянства.

— Альгерд, гэта так. У гандляроў веравызнанне адно — срэбра.

Бліжэй да Калядаў прыбыў полацкі ваяр Капысь.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, рыцары якія былі раней у Лівонскім ордэне мечаносцаў, цяпер увайшлі ў склад Тэўтонскага

ордэна, крыжакоў. Сёлета крыжакі захапілі русінскія гарады Ізборск і Пскоў.

— А што Ноўгарад, не дапамог Пскову?

— Вялікі князь, у Ноўгарада і Пскова нема сгоды між сабой. Пскоў асцярогаецца, што Ноўгарад падначаліць яго сабе.

— А як Таўцівіл адчувае ў Полацку?

— Вялікі князь, пасля таго як ён ахрысціўся і ажаніўся, яго становішчэ ў Полацку ўзмоцнілось.

— Добра, Капысь. Дзякуй.

У сярэдзіне зімы прыбыў у Воруту ганец з Ваўкавыска. Ён распавеў Вялікаму князю, што ў іх княстве высвятлілі двух ардынскіх разведнікаў, а яшчэ аднаго разведніка высвятлілі ў асобным яцвяжскім княстве.

Адразу за ваўкавыскім ганцом прыбыў у Воруту слонімскі ганец. Ганец мовіў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, наш князь Велікаіл накіраваў шмат дазорных на поўдзень і паўднёвы захад у пошук ардынскіх разведнікаў, дваіх яны злавілі і знішчылі. А два дні таму дазорные сустрэлісь з гандляром паселішчы Кобрынь, які са сваім памочнікам вяртаўся з горада Берасцье. Гандляр казаў, што ардынцы пасля штурму і доўгага супраціва берасцейцаў, захапілі і знішчылі ўсіх жыхароў горада, а потым яго спалілі. Дазорные вырашылі праверыць гэтыя сведкі. Калі яны наблізілісь да горада, то быў смуродны пах ад памерлых жыхароў, таму ў горад яны не пайшлі. Ад іншых дазорных, вестак пра ардынцаў нема, таму магчыма лічыць, што яны павярнулі ці на захад, ці на поўдзень.

Пасля таго, як ганец пакінуў Вялікага князя, Міндоўг доўга быў маўклівым, а потым мовіў:

— Вось што атрымліваецца калі хтосьці прагне быць багатым і адасобленным.

У пачатку вясны і новага 6749 лета (1241 па хрысціянскім календары), Міндоўг вырашыў наведаць свайго трохлетняга сына Траняты ў паселішча Даўга. Наведванне было кароткачасовае. Вялікі князь убачыў, што сын добра расце, яго маці і сваякі задаволеныя жыццем. Па вяртані ў Воруту, Міндоўг убачыў, што Марта не задаволена яго наведваннем жамойцкага паселішча.

Вялікі князь ёй растлумачыў, што ён наведваў толькі сына, будучага князя ўсіх жамойтов. Ён жадае, штоб жамойты былі пад уладай жамойта Траняты, і штоб яны былі добрымі суседзямі з ліцвінамі, штоб яны хутка развіваліся ў рамесніцтве і ў сваім добрабыце. Ён з захапленнем гаворыў:

— Цяпер, калі ў іх нема рамесніцтва і гандлярства, на іх ніхто не нападае, таму што там, нема чаго грабіць. Зараз у іх умовах ён без асцярогі падрасце. Калі Транята падрасце і мы дапаможам ім у рамесніцтве, ў іх з'явяцца гандляры і будзе добрабыт, то ім будуць патрыбны ваяры, штоб абараняцца ад рабаўнікоў. Я жадаю вырасціць яго добрым ваяром. Сваего сына Войшалка я не змог вырасціць у добрага ваяра, а яму ўжо восемнаццаць лет. Нарадзі мне сына, або двух сыноў, я буду расціць іх для ліцвінскага княства. Калі адзін сын будзе кіраваць сярод сваіх у Жамойціі, а другі сын будзе кіраваць сярод сваіх ў Літве, то ў іх будуць добрыя роднасные адносіны, таму што яны шматбожцы. А шматбожцы, ў адрозненне ад хрысціян, вельмі шануюць сваіх дзядоў і сваякоў.

Нячакана да Міндоўга прыбыў ганец ад гародзенскага князя Жыгімонта.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, у Гародні нечакана аб'явіліся жамойцкія князі Рушковічы з прапановай гандля іх пушніны, воску і мёду на нашы мечы, кальчугі і наканечнікі стрэл. Князь Жыгімонт даў дазвол нашым гандлярам на гэты абмен, алё вырашыў запытаць у цябе, Вялікі князь Літвы Міндоўг, прадоўжыць з імі гэты гандль ці спыніць.

— Скажы маему сябру, князю Жыгімонту, што няхай гандлюе з Рушковічамі на сваю карысць.

Калі ганец пакінуў Вялікага князя, Альгерд спытаў:

— Вялікі князь, а навошта нам узмоцняць жамойтаў Рушковічаў?

— Цяпер я не дазваляю Волімунту гандляваць з Выкінтом. Раней гэты гандль узмоцнял Выкінта, цяпер я ў гэтым не зацікаўлен. Мне патрэбна, штоб узмоцнялісь ўсходнія жамойты з былых паселішч Булевічэй. Таму калі заходнія жамойты Рушковічаў гандлююць з князем Жыгімонтам, то няхай яны трошкі ўзмоцняцца перад Выкінтам. Раней я яму дапамогаў, але потым

ён стаў шмат памыляцца, што было шкодным да нас, і Выкінт пажадаў быць вельмі самастойным. Для мяне галоўнае, каб гэтыя Рушковічы і Выкінт, ведалі што за ўсходнімі жамойтамі, асабіста за паселішчам Даўга знахожуся я, Вялікі князь Літвы Міндоўг. Альгерд наглядаючы за Міндоўгом, у другі раз адзначыў, што ён вельмі задаволены сабой. Першы раз гэта было пасля перамогі над лівонскімі рыцарамі ў зямлі земгалаў пяць лет таму. А сёння гэта было ў другі раз. Прыбыўшы ганец з Капыля распавеў Вялікаму князю, што ардынцы знішчыў Берасце, пайшлі на поўдзень, захапілі Люблін, а потым захапілі Сандамір. Таксама яму гандляры казалі, што пасля захопу Валынскага княства, ардынцы калі праходзілі побач з новым валынскім замкам Холм, яго не захапілі.

— А чаму не захапілі гэты замак?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, гандляры аб гэтым не ведаюць.

— Мяне гэта цікавіць, трэба і далей аб гэтым пытаць. Праз пяць дзён ганец з Капыля зноў прыбыў да Міндоўга.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, гандляры распавялі чаму ардынцы не захапілі замак Холм. Ардынцы ідуць паходам некалькамі атрадамі. Адзін з малых атрадаў, ішоў заходнее ад іншых атрадаў, і на сваём шляху ўбачыў малы замак Холм, яго пабудавалі меньш чым тры лета таму. Ардынцы наблізіліся да замка і патрабавалі валынянам адчыніць браму замка і падпарадкавацца ім, але жыхары Холма браму не адчынілі, яны з-за высокіх сцен адказалі, што ў іх князя нема. Ардынцы пачалі страляць у замак стрэламі з запаленымі наканечнікамі, а потым убачыўшы, што гэта ім нічога не дае, накіраваліся даганяць асноўные атрады.

— Добра. Яшчэ навіны ёсць?

— Вялікі князь, ардынцы пасля Сандаміра захапілі Кракаў.

На пры канцы вясны прыбыў гандляр Міхалок.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, ардынцы ідуць у паход рознымі атрадамі. Атрады ёсць вялікие і малыя. Вялікие атрады ідуць па асноўнаму шляху, а малыя атрады ідуць побач з розных бакоў ў адлегласці не больш за дваццаць вёрст. Усе атрады накіроўваюцца на вялікі горад. Калі малыя атрады на сваім

шляху сустракаюць замкі, ці малыя гарады, то ім трэба хутка іх захапіць, штоб паспець да вялікага горада.

— Ведаю, што малы атрад не захапіў замак Холм.

— Так, Вялікі князь. Яны таксама не захапілі горад Крэменец, гэта на поўдзень ад Уладзіміра валынскага. Ёсць у Валыні гарады і вялікіе паселішчы, якія ардынцаў не бачылі.

— Зразумела, што гэтыя гарады знаходзіліся далёка ад іх шляху. Шмат такіх горадоу?

— Шмат, Вялікі князь. А ў землях лацінскіх хрысціан, атрымліваецца па-іншаму. Ардынцы ў ляхаў каля Сандаміра і каля Кракава шмат гарадоў знішчылі. Потым яны пайшлі на паўночны захад у Сілезію, гэта захад ад Куявіі. Там яны знішчылі горад Вроцлаў, і накіраваліся далей на паўночны захад. Пад Легніцай ардынцы разбілі аб'еднанное войска з розных заходніх зямель з рыцарамі.

— Хто кіраваў гэтым аб'еднанным войскам?

— Вялікі князь, гэтым войскам кіраваў кракаўскі князь Генрых другі Благачэсцівы. Ён там загінуў.

— Міхалок, падрабязнасці бою ведаеш?

— Вялікі князь Міндоўг, я гэтага не ведаю. У наступным гандлярскім паходзе буду распытваць пра гэта ў гандляроў. Таксама мой тата Міхайла з кіеўскім гандляром Андрэем накіраваліся на двух драккарах у Кіеў, мабыць яны аб гэтым выведаюць. Праз дваццаць дзён у Воруту прыбыў гандляр Андрэй.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, горад Кіеў спусташаны. Ад майго дома засталіся адні вуглі. У Кіеве да мяне звярнуліся мае друзі каваль Паўло і цесляр Мікіта. Яны жадаюць перасяліцца ў Літву са сваімі сямействамі. Вялікі князь Літвы Міндоўг, калі дазволіш ім пераселіцца ў Любчу, я добра заплачу.

— Андрэй, я згодзен і не трэба мне плаціць. Нам патрыбны рамеснікі і добра, што яны пераселяюцца да цябе. Кажы што чуў пра ардынцаў.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, дзякуй табе за дазвол. Пасля таго, як ардынцы захапілі Галіч, яны накіраваліся ў Угры. Там каля ракі Шайо яны разбілі вялікае, больш за ардынцаў удвая, войска караля уграў Белы Чацвёртага і яго брата харвацкага герцага Каламана.

— А якія падрабязнасці гэтага бою?

— Вялікі князь, гэтым паходам кіраваў сам хан Бату. Калі ён убачыў, што войска вугорскага караля больш за яго, то ён уцёк з войскам за раку Шайо. За ракой ён дачакаўся атрада яго ваяводы Субэдэя, і даўшы гэтаму атраду адзін дзень адпачынку, стаў рыхтавацца да нападу на ўграў. Ардынцы ноччу перад ранкам ціха знішчаюць вартаўнікаў адзінога моста праз гэту раку. Адразу пасля гэтага, яшчэ ў цемры, яны праз мост накіравалі атрад у абыход лагера ўграў. Пасля гэтага, ужо раніцай, яны абложнымі каменямётамі ўчынілі паніку ў лагеры ўграў, і аднachасова з моста пачалі напад. Калі ў моста разгарнуўся моцны бой, ардынцы з тылу ўграў пачалі асыпаць іх хмарамі стрэл. Бой быў доўгі, таму што ўграў было шмат. Штоб скончыць бой, ардынцы ў сваім акружэнні ўграў наўмысна ўчынілі праход. Туды накіраваліся коннікі ўграў і харватаў, мабыць жадая ўвайсці у тыл ардынцам. Алё ім у спіну рынуліс коннікі ардынцаў, якіе былі там у засадзе. З ўграў і харватаў мала каму ўдалося ўцячы, большасць была знішчана. Каралю ўграў ўдалося ўцячы да аўстрыйскага герцага.

— Цікава. Андрэй, можа ты ведаеш як адбываўся бой каля Легніцы?

— Вялікі князь, я ведаю што ардынцы разгрaмілі аб’еднанное войска пад Легніцамі, але не ведаю падрабязнасці.

— Добра. Дзякую, Андрэй.

Перад святам Яна Купалы прыбыў да Міндоўга гандляр Волімунт.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, даўно ў мяне не было цікавых навін, таму што мы не заходзім у Тувангсце і ў іншые небяспечные мясціны. Але Колабрег мы заўсёды заходзім за соллю. У гэты раз я пачуў, што ардынцы разгрaмілі аб’еднанное войска ляхаў, мазураў, куяваў, сілезцаў з рознымі рыцарамі пад сілезскім гарадам Легніца.

— Так, мне цікавы падрабязнасці.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, ардынцы пад кіраўніцтвам ваяводы Байдара, прыйшлі ў Сілезію з поўдня, захапілі Рацібуж і Аполе, і наблізіліся да вялікага горада Вроцлаў. Пад гэтым горадам, у кіраваўшага войскам кракаўскага князя Генрыха, ўжо

было вялікае войска, але ён не стаў абараняць горад, а пайшоў у бок горада Легніца, дзе быў атрад з заходніх рыцараў. Ваявода ардынцаў Байдар не стаў затрымлівацца пад Вроцлавам, толькі страліў у горад хмару стрэл з гарашчымі наканечнікамі і кінуўся даганяць войска Генрыха. Ардынцы дагналі іх пад Легніцай, гэта ўжо было аб'еднанное войска князя Генрыха. Пры збліжэнні войскаў пачаўся абстрэл стрэламі супраціўнікоў. Ардынцы ўчынілі дымавую заслону, і гэтым яны памылялі заходніх стралкоў, а самі атакавалі з бакоў коннымі лучнікамі. Рыцары пачалі атаку ў дыме па цэнтры і змялі знаходзяшчыхся там ардынцаў лёгкай конніцы. Але неўзабаве на іх былі накіраваныя з правага боку цяжкая конніца. Ваяры аб'еднанага войску былі збянтэжаны і пачалі ўцякаць. Гэтага і дамагаліся ардынцы. Яны іх люта знішчылі. Князя Генрыха забілі.

— З чаго была дымавая заслона? Як выглядае цяжкая конніца ардынцаў?

— Вялікі князь, аб гэтым яны не казалі. Вялікі князь, мне пушніну ў каго выменьваць?

— Выменьвай ва ўсходніх жамойтаў. Добра, Волімунт. Дзякуй.

Пасля сыходу Волімунта, Міндоўг звярнуўся да Альгерда:

— Альгерд, мяне зацікавіла дымавая заслона. Трэба разведаць, як яе падрыхтаваць і ўжываць у баі. Гэты загад Вялікага князя атрымаўся вельмі цяжкім для мясцовых жыхароў. Таму Альгерд загадаў ганцам пабываць у паселішчах і гарадах з пытаннем князя. Калі прыбывалі ганцы, ці гандляры, то гэта пытанне было абавязковым. Ганец з Капыля Каліст нічога не ведаў пра дымавую заслону, і пра цяжкую конніцу, але ён распавеў, што болоховскі князь Ізяслаў Уладзіміравіч сумесна з князем Расціславам Міхайлавічам, сынам Міхаіла Чарнігаўскага, захапілі паўднёвы галіцкі горад Бакота. А перад гэтым князь Даніiл Рамановіч атдаў спустошаны Кіеў князю Міхаілу Чарнігаўскаму.

— А чым цяпер займаецца Даніiл Рамановіч?

— Вялікі князь Міндоўг, ён цяпер пашырае замак Холм.

— Гэтым магчыма займацца без яго. Каб не лічылі яго слабым князем, трэба яму вызваліць гэты паўднёвы галіцкі горад і спустошыць болохаўскую зямлю. Спадзяюся ён разумее, што болохоўскі князь Ізяслаў Уладзіміравіч здраднік паўднёвых русін.

Калі яны засталіся адні, Альгерд прапанаваў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, можа трэба паслаць ганца ў Холм да Данііла Рамановіча з гэтай тваёй думкай?

— Я таксама аб гэтым падумаў. Альгерд, накіруй да яго навагрудского ганца. Неўзабаве прыбыў ганец ад ваўкавыскага князя Даў'ята.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, да князя Даў'яту прыходзіў дазорны Алвад князя яцвягаў Ігелда. Пасля таго як сын князя Эйсманта, перасяліўся ў нальшанское княства, ваяры і дазорные князя Ігелда прыпынілі зносіны з намі, але іх дазорны Алвад прышоў да нашага князя і распавеў тое, што бачыў у Берасце.

— Гэта цікава.

— Вялікі князь, ардынцы прыйшлі да Берэсце вялікім войскам, узялі яго ў аблогу, знішчылі ўсе бліжэйшые паселішча і пасад горада, пераправіліся пад горад праз замерзлую раку. Запусцілі ў горад хмары вогненных стрэл, але берасцейцы ўсё роўна стралялі з лука са сцен. Тады ардынцы абкладалі сцены сухім трысцем і сухістоем, і падпалілі. Спачатку быў агонь, а потым густы дым, у якім нічога не бачна. Праламалі сцяну, і ўварвавшысь у горад знішчылі усіх. Абрабаваўшы і спустоша, накіраваліся на поўдзень.

— А дазорны Алвад не казаў пра цяжкую конніцу, як яна выглядала?

— Вялікі князь, ён казаў пра незвыклых вершнікаў, у якіх коні былі ў абарончых накідках, а самі былі ў кальчугах дзе спераздзі жалезныя пласціны, а ссадзі скураныя пласціны.

— Як ён змагчы гэта разглядзець?

— Вялікі князь, я яго даўно ведаю і давяраю. Ён можа залезці на высокае дрэва і там наглядаць увесь дзень і ноч, не злазячы. І яшчэ, Вялікі князь, князь Даў'ят ліча, што ардынцы не пайшлі на нас таму, што мы высвятлілі і знішчылі іх разведнікаў.

— Добра. Я таксама такой думкі. Дзякуй.

Калі ганец пакінуў іх, Міндоўг звярнуўся да Альгерда:

— Адкуль зімой сухія трысце?

— Вялікі князь, яшчэ не з усіх мясцін адказалі на тваё пытанне пра дымавую заслону, але шмат прапаноў тычацца сухога трысце, якое ўжываюць для насціла даха. Ардынцы мабыць,

калі знішчалі паселішча перад Берасцем, узялі трысце з даха хаты, толькі верх скінулі, а пад ім сухія трысце.

— Але для даха трэба даўгая трысце.

— Так, вялікі князь. Для дымавой заслоны прыгодны будуць і малыя трысце. Толькі трэба звязаць сухі трысце і зверху яшчэ прапануюць галіну хвойніка.

— Так, добра. Я меркую, што трэба на вялікую галіну хвойніка прывязаць сухія трысце, а зверху малую галіну хвойніка. Вершнік будзе цянуць за вялікую галіну, прычым патрыбны па тры вязанкі з трысце. У патрэбным месцы ён спачатку пакідае вязанку з самай доўгай вяроўкай, потым з крыху карацейшай, а потым з самай кароткай. За гэтым вершнікам будзе скакаць другі вершнік трымаючы запалены факел з цёмным земляным алеем і будзе падпальваць вязанкі. Гэтыя вершнікі будуць скакаць пад пагразай лучнікаў, таму іх і іх коней трэба апрануць у даспехі як ардынцы сваю цяжкую конніцу. Накіруй ганцоў з наказам, штоб загатаўлялі трысьце і сушылі яго. У пачатку зімы да Міндоўга прыбыў гандляр Міхайла. Ен два дні як вярнуўся з паўднёвага гандлярскага паходу. Міндоўг убачыў яго ўпершыню пасля доўгай хваробы, і прымеціў, што ён прыкметно пастарэў.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, на ўсім шляху да Кіева не было ніякіх перашкод, але ніжэй за Кіеў я не рызыкнуў плыць, апасаючыся ардынцаў.

— Міхайла, а што ў самім Кіеве?

— Вялікі князь, там князем Міхаіл Усеваладавіч. Жыхары Кіева зноўку будуюць сваі дамы. Для гандля з імі я узяў шмат прылад для будаўніцтва, а таксама посуд, пінскія жалезныя замкі. Яны ў сваіх схронах змаглі збярэгчы срэбра. Але ў Кіеве жыхароў стала ўдвая меньш. Даніїл Рамановіч вярнуў сабе горад Бакота, а таксама абрабаваў і спустошыў болохоўскую зямлю. Вярнуўся я з кіеўскім гарбарным рамеснікам. Ен мой даўній сябра і добры гарбар.

— Міхайла, я чую ў цябе добры настрой, мабыць купіў кнігі?

— Так, Вялікі князь. Купіў кнігі.

— Добра, Міхайла. Дзякуй.

Перад Калядамі прыбыў з Полацка ваяр Капысь. Яго навіны тычыліся пераважна князя Таўцівіла, ў якога ўсе было добра,

яго жонка чакала пяршага дзіця. А таксама ён распавеў, што ў крывіцкіх княствах шмат перасяленцаў з спусташаных чарнігаўскіх зямель. Калі Альгерд вярнуўся з перадкалядным аб'ездам ліцвінскіх княстваў, ён таксама распавеў, што шмат паўднёвых русін перасяліліся ў гэтые княства. Прытым князі казалі, што перасяленцаў у Пінску, Тураве і іншых нашых паўднёвых княствах папярэджвалі, што Вялікі князь Літвы Міндоўг дае дазвол на перасялення толькі добрым рамеснікам. Таму напрыклад да нальшанского князя Даўмонта перасяліліся тые, хто ў паўднёвых княствах быў ваяром, а не рамеснікам.

— Альгерд, а ты што казаў на такія чуткі?

— Вялікі князь, я казаў што гэта хлусня, і што кожны князь самастойна вырашае каго сяліць, а каго не.

— Так яно і ёсць.

## ГЛАВА 16

## ЗНЕШНІЯ АДНОСІНЫ

У пачатку вясны і новага 6750 лета (1242 па хрысціянскім календары), Міндоўг накіраваў ганца ў Ваўкавыск з пажаданнем князю Даў'яту, штоб яго ваяры пошукалі ў Берасце, праз растаы снег даспехі на загінуўшых ардынскіх конях. Пасля вясновага раўнадзенства да Вялікага князя прывезлі даспехі з загінуўшага ардынскага коня. Адразу Міндоўг убачыў, што гэтые даспехі з нізкарослага коня. Яны былі малымі не толькі для яго старога і памерлага перад гэтой зімой Імклівага, але і для яго семілеткі Хуткага, нашчадка Імклівага і кабылы месцовых нізкарослых парод. Наморднік, нагруднік і накрупнік былі з танкіх, але трывалых жалезных пласцін. Міндоўг падзякаваў двум ваўкавыскім ганцам, якіе прывезлі гэтыя даспехі. Адразу Альгерд заклікаў да іх каваля Фрола. Ён убачыўшы даспехі з жалезных пласцін, адзначыў што яны даўжэй чым у вяроў і для іх трэба спачатку змайстраваць прылады пад гэту працу. Потым магчыма вырабіць гэтые пласціны, але ўсё роўна гэта будзе марудна.

Наступным днём Міндоўг прызваў да сабе гандляроў Міхайла і Андрэя. Гандляр Андрэй шмат разоў быў у Канстанцінопалі, там на торжышчы бачыў такія даспехі з жалезных пласцін.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, падобныя даспехі прывозілі з Каўказа, Сірыі, Галіі, з зямель Харэзмшахаў і Альманскіх. Каштавалі яны шмат срэбра. Такія даспехі па сілам купляць толькі вельмі багатым. У кіяўлян такіх даспехаў не было. Вялікі князь, такія даспехі коня магчыма былі ў тысячніка, або аж у дзесяцітысячніка, а яны як мне казалі наглядаюць і кіруюць сваім войскам ззаду, самі ў бой не ідуць.

— Андрэй, гэтые даспехі да мяне прывезлі з бою ў Берасце. Гэтыя даспехі належаць звычайнаму вершніку цяжкай конніцы ардынцаў.

— Вялікі князь, у цяжкай конніцы ардынцаў толькі ўплывовыя і вельмі моцныя ваяры. Кошт такіх даспехаў ардынскага ваяра больш кошта дзесяці коннікаў русін.

— Гэта так, Андрэй. Таму я толькі зараз зразумеў, як ардынцы перамоглі рыцараў пад Легніцай. У нас цяпер супраць цяжкай конніцы ардынцаў ёсць адна зброя, гэта доўгая дзіда. Супраць рыцараў мы доўгаю дзіду цэлілі ў каня, а супраць цяжкай конніцы ардынцаў трэба цэліць у вершніка.

— Вялікі князь, алё да дзіды справа можа не дайсці, ардынец раней стралой раніць.

— Таму і нам трэба на коней даспехі, толькі не гэтакіе дарагія.

У гэты дзень, Вялікі князь загадаў ганцам абвесціць ва ўсі гарады ліцвінскіх княжеств вызначыць прапановы з чаго зрабіць даспехі для коней. Наступным днём, Міндоўг учыніў праверку магчымасці кіданнем дроціка прабіць даспехі цяжкай конніцы ардынцев. Толькі моцным метацелям з паселішча Людвік атрымоўвалася прабіць гэтыя даспехі ў адлегласці трыццаць крокаў. Міндоўга ўстрывожыло тое, што пры такой адлегласці ардынская страла параніла б раней. Вялікі князь вызначыў тры дзесяткі самых моцных метацелей дроцікаў, а іншым указаў палепшыць навыкі лучніка.

Праз сорак дзён Міндоўг вырашыў разглядзець усі атрыманные прапановы. Пасля абмеркаванні з гарбарамі, Вялікі князь

падсумаваў і выбраў склададзены варыянт выраба даспеха. Скуру вала, пасля забойства і хуткай прамыўкі, і мездрення, фармавалі і консервірвалі соллю. Потым прасушвалі і прамачвалі ў сумесі апілак жалеза, рагоў і молатага шкла, залітага рыбіным тлушчам і бялком курыных яек, а потым зноў прасушвалі. Пасля гэтай даўгачасовай падрыхтоўчай працы зрабілі два ўзоры даспехаў, лёгкіх аднаскураных і ўзмоцненых двухскураных. Лёгкі даспех вытрымліваў стрэлы лука, а ўзмоцненный даспех вытрымлівал ўдар дзідай.

Вялікі князь загадаў зрабіць наморднік і нагруднік з двухскураных пласцін, а накрупнік аднаскураным. Майстэрню па вырабу даспехаў, Міндоўг наладзіў у Малым замку Наваградка, ў майстэрні аднаго былога бронзаліцейшчыка, ў якого гандляры летась прыпынілі закупляць яго вырабы, таму што купцам было не да іх. У гэтую майстэрню завозілі консервірваные скуры вала, апілкі жалеза, рагоў і молатага шкла з усіх месцін Вялікага Княства.

Прыбыў у Ворутуу ганец з Капыля.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, гандляры казалі, што ардынцы лютавалі ў гарадах ляхаў Сандомір і Кракаў, дзе вылоўлівалі і знішчалі лацінскіх прапаведнікаў, а іх царквы разбуралі і спалівалі. А пасля бою пад Легніцамі, яны накіраваліся праз Чэхію і Маравію да уграў. Прытым гандлярам стала вядома, што не ўсюды ардынцы ўсіх паспяхова знішчалі. У Маравіі калі ардынцы абкладалі крэпасць Оломоўц, ноччу на іх напаў ваявода Праслаў са сваёй дружынай з гэтай крэпасці. Яны забілі некалькі ардынцаў і паспяхова вярнуліся ў крэпасць. Калі ардынцы пачалі штурмаваць крэпасць, і не змаглі яе ўзяць, то накіраваліся далей на поўдзень. А калі ардынцы наблізіліся да горада Вена, ў дзевяці вёрст на поўдзень, каля Нейштада, яны сутыкнуліся з аб’еднанным чэшска-аўстрыйскім войскам, то на пры канцы бою ардынцы адышлі за раку Дунай ў зямлі ўграў.

— Каліст, а гандляры не здзіўляліся, што ардынцы ўжо амаль паўтара лета ідуць рабаўніцкім паходам са здабычай па чужынскіх землях. Гэта іх здабыча перашкаджае ім ваяваць. Мабыць ёсць атрад які збірае гэту здабычу ў умоўным месцы і ў умоўны час.

— Вялікі князь, аб гэтым гандляры не казалі. Я толькі дадам, што яны згадалі русінскую сотню ваяроў, якія былі ў складзе ардынскіх войскаў пры нападу на ляхаў і сілезцаў.

Калі ганец Каліст пакінуў іх, Міндоўг звярнуўся да Альгерда:

— Альгерд, мяне не здзіўляе, што ардынцы не заўседы ўсіх перамогаюць, і нават не здзіўляе як яны ваююць са шмат нарабаваным скарбам. Мне не зразумела мэта іх паходу на захад. Тое, што ардынцы знішчаюць прапаведнікаў і іх царквы, сведчыць аб тым, што яны не збіраюцца далучаць гэтыя зямлі да свайго валодання. У гэтым сваім паходзе яны грабуюць і знішчаюць зямлі лацінцаў. Нема не воднага выпадка, штоб ардынцы дасылалі сваіх паслоў у лацінскі горад з прапановай здаць яго, тады не будзем знішчаць, так як яны прапанавалі русінам. А чым адрозненюцца лацінцы ад русінаў? Зразумело русіны бліжэй да Арды. У русінаў хрысціянства канстанцінопальскае, а ў лацінскіх хрысціян Рымскі Папа. Але Канстанцінопаль больш за трыццаць лет захоплены лацінцамі.

— Вялікі князь Міндоўг, трэба спытаць кіеўскага гандляра Андрэя.

Наступным днём прыбыў гандляр Андрэй.

— Гандляр Андрэй, цікавыя навіны я атрымліваю. Ардынцы не прапануюць лацінцам адкупіцца за горад, а зразу зьнішчаюць іх, вылаўліваюць і знішчаюць лацінскіх прапаведнікаў, а іх царквы паляць. Не так як у русінаў. Чаму?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, ты добра заўважыў, што не так як у русінаў. Так у Кіеве з шмат якіх царквей, толькі адну малую дзесяцінную царкву спалілі, а іншые не краналі. У Кіеве толькі царквы выглядаюць некранутымі. У іншых русінскіх гарадах таксама ні царквей, ні прапаведнікаў не краналі. Мне казалі, што перад штурмам Кіева ўсе прапаведнікі выехалі з горада. Такое было і ў іншых русінскіх гарадах. Зараз усе прапаведнікі павароціліся ў Кіеў, і ўсе яны ні воднага слова благога ні кажуць пра ардынцаў, а пераконваюць што так трэба было богу. Яны прапаведуюць кіяўлянам, што гэта было Божая ласка на выпрабаванне, а пасля яго мы атрымліваемся моцнейшымі. І што калі знішчылі твой дом, то бог у вобразе ардынцаў жадае цябе добра, дае цябе дапамогу быць моцным.

— Алё лацінскіх прапаведнікаў хрысціян знішчаюць, хоця ў Канстанцінопалі лацінскія хрысціяне.

— Вялікі князь, так у Канстанцінопалі прапаведнікі лацінскіх хрысціян. Але цяпер русінскія хрысціянскія прапаведнікі падпарадкаваюцца не Канстанцінопалю, а Нікеі. Трыццаць восем лет мінула з таго часу, як лацінскія рыцары захапілі Канстанцінопаль. Гэта быў сусветны цэнтр гандлярства, самы вялікі, самы багаты, самы адукаваны горад. Адзін горад, дзе былі залатыя манеты. Але перад яго захопам, у гэтай сталіцы Візанцыі кіраваў Аляксей Комлін. Які не турбаваўся аб горадзе і аб Візанцыі, ен зблізіў да сабе ліслівых ваяводаў і заможных людзей. Ён любіў раскошу і ігрышча. У Канстанцінопалі былі вельмі заможныя людзі, ў якіх асабістая дружына была ў сотню ваяроў. Яны маглі адхіліць пажаданне Аляксея Комліна аб забяспячэння імі аховы і парадку пры спартовым ігрышчы, а таксама іншые пажаданні. Таксама ў горадзе былі заможные людзі лацінскай веры. Сябра майго таты, таксама гандляра, быў гандляр Джузэпэ з Венецыі. Яго асабістая дружына была ў трыццаць лацінскіх ваяроў, яшчэ да захопу рыцарамі горада. А пасля захопу яго дружына склала шэсцьдзесят пяць лацінскіх ваяроў. Усе гэтыя трыццаць восем лет яны грабуюць Канстанцінопаль. Сам бачыў, як ваяры Джузэпэ грузілі на яго вялікі корабель пазалочаную статую коня, каб перавезці ў Венецыю. З усіх уцекшых людзей з багацем, большасць накіравалася на поўдзень у Нікею. Там вялікая і моцная крэпасць, туды ўцеклі моцныя ваяводы. І там утварылась Нікейская імпэрыя. Першым імператарам быў Феадор Ласкарыс, а патрыярхам Міхаіл Аўтарыян. У Нікею накіраваліся ўсе прадстаўнікі канстанцінопальскіх прапаведнікаў. Праз восемнаццаць лет нікейскім імператарам становіцца Іоан Трэці Дука Ватац. Гэта моцны і ваяўнічы імператар. Пры ім Нікейская імперыя захоплівае вялікіе зямлі, ў тым ліку еўрапейскія. Шмат візантыйскіх жыхароў сыходзяць з-пад улады лацінян у Нікею, ў тым ліку большасць гандляроў і рамеснікаў. Дзе сілай, а дзе падманам Нікейскі імператар Ватац падпарадкаваў сабе амаль усю Малую Азію. Кіраваўшаму ў Канстанцінопалі лацінскаму імператару Генрыху Фландскаму Балдуіну другому застаўся

Канстанцінопаль і берагавая паласа Басфора. Мэта Нікейскага імператара Ватаца адрадзіць Візантыю.

— Атрымліваецца, што Нікейская імперыя адзіная каму дапамагае Арда.

— Так, вялікі князь. У малой Азіі акрамя Візанцыі, самымі ваяўнічамі былі сельджукі, але ардынцы і іх уціхамірылі на карысць Нікеі. Сярод лацінцаў ёсць варожасць між Свяшчэннай Рымскай імперыяй і рымскім Папам. Заходні паход і асабліва бой пад Легніцай засведчыў, што ардынцы супраць і тых, і іншых. Застаецца толькі Нікейская імперыя ў саюзніках. Мабыць калі Нікейскім імператарам стаў ваяўнічы і моцны Ватац, тады ён і патрыярх не пашкадавалі вялікага багацця каб умовіцца з Чынгісханам аб саюзных узаемадзеяннях. Таму мы бачым, што русінскіх прапаведнікаў ардынцы не чапаюць, а лацінскіх знішчаюць.

— Андрэй, Чынгісхан і Угедзеў шматбожцы. Як ты меркуеш можа нас, таксама шматбожцаў, яны не пажадаюць знішчаць.

— Вялікі князь, у мяне ёсць весткі, што ў кіеўскім, чарнігаўскім і валынскім княствах ардынцы знішчалі малыя паселішча з валхвамі і іх капішчамі. Гэта таксама сведчыць аб дамове з Нікеяй. Але я ўпэўнен, што ардынцы ведаюць пра твой бой з Лівонскімі рыцарамі пры Саўле. Іх мабыць уразіла тое, што ты не падпусьціў рыцараў на зямлю Літвы, і тое што цябе дапамог моцны дождж, які сваячасова абрынуўся на лівонцаў. Так, яны шматбожцы, і яны вельмі ўважлівы да такіх з'яў. Тое што яны знішчылі толькі Берасце, якое не было ў агульным Вялікім княстве Літвы, і што павярнуліся ў другі бок ад Літвы, сведчыць што ў іх вельмі даследчаныя разведнікі. У цябе не толькі добрыя разведнікі, але і лаўцы чужынскіх разведнікаў. Таксама цябе ўдалося аб'яднаць амаль усе яцвяжскія княствы і крывіцкія для сумеснага супраціву. Такога вялікага аб'еднання нема ні ў якай зямлі, на якую напалі ардынцы. Наадварот гэтыя княства былі раз'еднаннымі. Таксама я меркую, што Нікейскі патрыярх жадаў бы, штоб Літва была ў яго епархіі, але яму больш патрэбна аслабленне земель лацінскіх прапаведнікаў. За гандляром Андрэем неўзабаве прыбыў полацкі ваяр Капысь.

— Вялікі князь Міндоўг, весткі з поўначы. Атрады наўгародскага князя Аляксандра Яраслававіча і яго брата Андрэя вы-

звалілі горад Пскоў ад лівонцаў. Потым князь Аляксандр Яраслававіч, ведаючы што Лівонскі ордэн шмат рыцараў накіраваў да куронаў для ўціхамірання паўстання гэтых шматбожцаў, пайшоў на захад у зямлі Лівонскага ордэна. Там нечакана яго атрад сустрэўся з лівонцамі. Калі ў баі сталі перамогаць лівонцы, князь Аляксандр Яраслававіч з рэшткамі свaeгo атрада ўцёк да Чудскога возера, што на поўначы ад Пскова. Князь паслаў ганца за дапамогай. Калі яму ў дапамогу прышоў яго брат Андрэй Яраслававіч са сваім атрадам суздальцаў, то яны прынялі бой з лівонцамі, і перамоглі іх. Загінулі дваццаць рыцароў.

— Добра. А што ў князя Таўцівіла?

— Вялікі князь, жонка князя Тоўцевіла нарадзіла яму сына.

— Добра. Дзякуй, Капысь.

Дачка Міндоўга Адэлія расла пад наглядам выхавацельніцы ў Вялікім замку Наваградка. Там жа быў і дзевятнаццацілетні Войшалк, з якім упарта займаўся навучаннем ваяра вершніка рыцар Ленгвін.

Пасля сканчэння палявых прац, восенью, Міндоўг учыніў вайсковыя вучэнні. Гэтым разам у Наваградку Вялікі князь пажадаў правесці вучэбный бой між двума сотнямі ваяроў, якімі кіраваў ваявода Вітольд і двума сотнямі ваяроў, якімі кіраваў рыцар Ленгвін. Рыцар у пачатку бою прымяніў навіну. Вызначыўшы напрамак ветру, ён указаў сваім ваярам пакінуць вязанкі трысце і хвойніка так, штоб калі іх запалілі, то дым ад іх засланіў увесь яго атрад.

Так і атрымалася, гэты дым прыпыніў рух атрада Вітольда, і ў гэты кароткі час ваяры Ленгвіна ўсталявалі ў дымавой завесе драўляные перашкоды для коней, падобныя тым на якіх прасушваюць сена. У той жа час, кожная з сотняў коннікаў Ленгвіна з флангаў напала на ваяроў Вітальда і яны перамаглі.

Міндоўгу гэта вельмі спадабалось і ён указаў цеслярам вырабіць больш дасканальныя перашкоды для коней, якія б хутка разбіраліся і збіраліся. Прыбыўшы да Міндоўга гандляр Волімунт распавёў, што прусы ўслед за куронамі паўсталі супраць крыжакоў.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, раней князь паморскі Святаполк быў на баку крыжакоў, а цяпер на баку шматбожцаў прусаў.

Мой дасведчаны скалоў, чакаў нас у вусце Нёмана. Ён прасіў дапамагчы разбіць крыжакоў.

— Гандляр Волімунт, крыжакі пабудавалі шмат замкаў. Мне трэба ведаць якая ад мяне патрэбна дапамога. Штурмаваць замкі гэта адно, а ваяваць па-за замка гэта іншае. Калі нам трэба аб'еднацца з іншымі атрадамі ваяроў, то кіраваць гэтым аб'едданым войскам я жадаю самастойна. Калі ёсць галоўны кіраўнік гэтага паўстанне, то нам трэба раздяліць і ўзгадніць дзеянні. Я жадаю дапамагчы шматбожцам супраць крыжакоў, хаця мы чакаем нападу на нас ардынцаў. Таму мне трэба ўдакладніць усё гэта. Волімунт, ёсць у цябе хтосьці хто добра ведае гэтага скалова з якім ты гаварыў?

— Так, Вялікі князь. Мой памочнік заўсёды быў пры нашай з ім размове.

— Добра. Накіруй сваего памочніка ў Гародню да князя Жыгімонта. Няхай ад мяне дасць твайму памочніку сваего ганца ў суправаджальнікі, штоб яны абодва накіраваліся да гэтага скалова. Трэба штоб яны запамяталі шлях, пасля пераправы ракі Нёман у Гародні і далей да скаловаў. Трэба штоб яны падлічылі колькі дзён займе гэты шлях. Калі прусы ўсе абмяркуюць і ім хутка будзе патрэба наша дапамога, няхай накіруюць у Гародню свайго ганца, правадыра для нас.

— Добра, Вялікі князь. Я накірую сваего памочніка ў Гародню і далей да скаловаў.

Калі гандляр Волімунт пакінуў іх, Альгерд звярнуўся да Міндоўга:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, навошта нам такі доўгі паход, скарба мы там не здабудзем.

— Альгерд, гэтым паходам мы двойчы сабе дапаможам. Папершае, мы дапаможам шматбожцам прусам і спынім далейшае ўзмоцненне нашых ворагаў крыжакоў. Па-другое, Нікея і ардынцы, калі даведаюцца аб гэтым паходзе, то не пажадаюць нападаць на нас. Таму што гэтым паходам мы дзейнічаем на іх карысць, аслабляя лацінцаў. Перад Калядамі з'явіўся полацкі ваяр Капысь.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, мы атрымалі весткі, што ў Ардзе памер іх Вялікі хан Угедзей. Таму ўсе ардынскія атрады з захаду накіраваліся да сабе на ўсход.

— Іх усход далёка знаходзіцца?

— Далёка, Вялікі князь. Далей за Понтскае мора, якое знаходзіцца на поўдні, і нават далей за Хазарскае мора, якое знаходзіцца на ўсходзе. Гэта больш за дзве тысячы вёрст.

— Добра. Дзякуй.

У зімку гандляр Волімунт са сваім памочнікам прыбыў да Міндоўга. Памочнік распавеў, што ён сустрэўся спачатку з дасведчаным скаловам, а потым з прускім князем і з паморскім князем Святаполкам. Паморскі князь у іх галоўны. Яны згодны з усім, што перадаў памочнік ад імя Вялікага князя Літвы. У іх ужо былі паспяховые штурмы замкаў крыжакоў. У будучыні магчыма таксама будуць штурмы замкаў. Яны спадзяваюцца на добры вопыт Вялікага князя Міндоўга ў баях на раўніне. Калі ім патрэбна будзе хуткая дапамога Вялікага князя, то яны накіруюць свайго ганца ў Гародню. Адваротны шлях з прусаў да Гародні з прускім ганцом і гародзенскім заняў тры дні.

— Прускі князь гэта князь самбаў Рудзевіч?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, прускі князь гэта князь самбаў, але не Рудзевіч, а Буровіч.

— На сваім шляху вы бачылі, ці сустракалі ваяроў князя Конрада Мазавецка га?

— Не, Вялікі князь. Паморскі князь Светаполк казаў, што князь Конрад Мазавецкі зараз займаецца барацьбой за кракаўскае княства на поўдні.

— Калі вясной прусы запросяць у нас дапамогу і прышлюць свайго правадыра ў Гародню, то нашаму атраду з шасці сотняў ваяроў будзе дастаткова чатыры дні, штоб прыбыць да іх?

— Вялікі князь, калі трэба будзе прыбыць у зямлю самбаў, то дастаткова.

— Добра. Дзякуй.

Наступіла вясна і новае 6751 лета (1243 па хрысціянскаму календары), а чаканага прускага ганца не было. Калі пачаліся палявыя працы і зацвілі сады, з Гародні прыбыў ганец і абвесціў аб прыбыцці прускага ганца. Міндоўг вырашыў абмежавацца пяццю сотнямі ваяроў. Атрад склалі дзве сотні з Навагрудка, адна з Воруты, адна з Эйсманты і адна з Гародні. Прускі правадыр распавеў, што вялікае войска крыжакоў засяроджвалася

ў Хельмінскай зямлі. Туды яны і накіраваліся. На пяты дзень атрад Міндоўга ўвашоў у Хельмінскую зямлю. Там іх чакаў прускі дазорны, які іх накіраваў да Рейзенского возера. Прускі дазорны, Міндоўг і Ленгвін падняліся на гару, з якой ўбачылі як крыжакі накінуліся на збіраюшчыхся адпачыць каля возера прускіх ваяроў. Міндоўг адразу ўказаў Ленгвіну з двума сотнямі наваградскіх ваяроў абысці крыжакоў з правага боку, а сам з астатнімі ваярамі накіраваўся прама на лацінскіх рыцароў. Крыжакі гэтага не чакалі і не адразу перабудаваліся, і таму ўзятыя ў аблогу былі нешчадно знішчаны.

Летняе сонца нахілілася да захаду, таму трэба было хутка надаць дапамогу параненым, а таксама пазбіраць коней крыжакоў і іх зброю, і даспехі. У атрада Міндоўга было чацвёра загіблых, два гародзенцы і два з воруцкага княства. Вялікі князь быў задаволен, што ў сотні Эйсманта не было загіблых, толькі трое параненых.

Да Вялікага князя наблізіўся князь Светаполк, і пасля прывітання сказаў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, мы не чакалі нападу такой вялікай колькасці крыжакоў. Я з малым атрадам накіраваўся на захоп корабеляў лацінцаў.

— Князь Святаполк, перад адпачынкам у варожай зямлі заўседы трэба выставіць бліжэйшы і далёкі дазор.

Убачыўшы, што Светаполку гэта заўвага вельмі не спадабалась, Міндоўг дадаў:

— У ранку мы вяртаемся ў Літву.

— Вялікі князь, нам трэба штурмам узяць замак.

— А нам трэба доўгім шляхам хутка вяртацца, штоб пахаваць у сваёй зямлі загіблых. Загіблых крыжакоў шмат, таму я меркую, што іншых крыжакоў тут працяглы час не будзе. Вялікі князь указаў размясціць атрад у адной вярсце ад поля бою, выставіць дазоры і каравулы, а таксама дапамагчы параненым прусам. У бок поля бою былі выстаўлены зборныя перашкоды для коней. Дазорным і каравульным трэба было не дапушчаць сюды як лацінцаў, так і прусаў. З ранку атрад Міндоўга накіраваўся ў Літву. На адваротным шляху Міндоўг вырашыў паразмаўляць з князем Эйсмантам. У апошнія чатыры лета Эйсмант

вельмі пастарэў. Міндоўг здагадывался што гэтак ён з-за сына Даўмонта.

Таму Вялікі князь дазволіў сабе апраўдавацца перад ім, гэта ж не перад князем Светаполкам.

— Князь Эйсмант, калі я прапанаваў Даўмонту ў нальшанскія князі, я не чакаў, што ён пакіне цяжарную Тэклю. Я быў вельмі здіўлен, што ен прыбыў адзін без Тэклі. Даўмонт быў рашучым, а мне цяжка было здагадывацца аб чым яны дамовіліся.

— Міндоўг, я цябе разумею. Мабыць у апошнія лета кодэкс гонара рыцара змяніўся, і я не змог слушна выхаваць яго. Міндоўг, калі пачуў, што Эйсмант звярнулся да яго без княжацкага тытула, зразумеў, што настаўнік яго не вінаваціць, і быў вельмі задаволен гэтым.

— Эйсмант, колькі лет сыну Тэклі?

— Ужо пяць лет. Вялікі, моцны хлопчык, клікаць яго Яраш.

— Тэкля дазволяе бачыцца з унукам?

— Так, Тэкля дазволяе. Яна нічога дрэннага пра Даўмонта не кажа, а вось яе тата князь Ігелд ворожа адносіцца да мяне. Я калі да іх наведваюся, то ён да мяне не выходзіць. Я не толькі наведваю сваего ўнука, я таксама перадаю ім мечы і трэнірую іх ваяроў у бітвах на мечах. Чуў што Даўмонт ажаніўся. Дзяцей пакуль нема?

— Нема. Даўмонт ажаніўся на малодшай дачцэ лесніка, а я на старэйшай. Яны абодвы пакуль не цяжарны. Яны ці чароўніцы, ці вядзьмаркі. Іншы раз так прывабіць, што нема сіл ёй супрастояць.

У Гародні князь Эйсмант накіраваў сваю сотню на поўдзень. Да гэтага рыцар Ленгвін імкнуўся пагутарыць з Міндоўгам, але ён заўседы быў пабач з Эйсмантам. Па загаду Вялікага князя ва ўсе начлегі, варты і дазоры былі з двух сотняў ваяроў Ленгвіна. Да Гародні Вялікі князь абдумваў, як аднесціся да Ленгвіна, што ен накіраваў свае дзве сотні вакол узвышша, якое схавала перамяшчэнне яго атрада ад рыцараў. Гэтым абыходам ён зблізіўся з заднімі лацінцамі, калі атрад Міндоўга ўпарта змагаўся з рыцарамі, і ужо былі забітыя сярод ліцвінаў. Усёж такі Міндоўг прышоў да высновы, што вельмі нечаканае нападзенне на рыцароў ззаду было тое, што ўвагнала рыцароў у паніку, і збліз-

зіла да іх разгрому. Пасля Гародні рыцар Ленгвін звярнуўся да Вялікага князя, з апраўданнем сваего абыхода узвышша, але Міндоўг адразу прыпыніў і супакоіў рыцара, што ён усё выканаў добра. Сустракаюшчы Міндоўга, Альгерд адразу паведаміў, што навін нема. А праз дзесяць дзён прыбыў ганец з Капыля.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, гандляры кажуць, што ардынскі хан Бату пачаў будаваць свой горад-стаўку, каля вусця ракі Ітіль, якая ўпадае ў Хазарскае мора.

— Каліст, ен што не накіраваўся далей на ўсход для выбару Вялікага хана?

— Вялікі князь, хан Бату не накіраваўся на выбары, а застаўся каля ракі Ітіль. Застаўшысь з Альгердом, Міндоўг дапусціў, што хан Бату яшчэ не подрыхтаваў патрыбные абставіны і людзей для абрання яго Вялікім ханам. Відаць цяпер там вядзецца лютая барацьба за пасаду Вялікага хана.

Перад Калядамі ў Воруту прыбыў полацкі ваяр Капысь.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князь Яраслаў Усеваладавіч быў закліканы да хана Бату. Прыбыўшы да яго з дарамі, ён быў прызначан князем уладзіміра-суздальскім і кіеўскім. У Кіеў ён не паехаў, а пасадзіў там сваім намеснікам ваяводу Дзьмітра Ейковіча.

— Гэта той ваявода, які кіраваў абаронай Кіева?

— Так, Вялікі князь, гэта ён. А сам Яраслаў Усеваладавіч сваім сталом абраў Уладзімір.

— Капысь, нагадай мне колькі рыцараў Лівонскага ордэна знішчылі ваяры Андрэя Ярославовіча і Аляксандра Ярославовіча летась?

— Вялікі князь, казалі што два дзесяткі рыцараў знішчылі.

— Добра, Капысь. Дзякуй. Застаўшысь удвух, Міндоўг выказаўся:

— У тым, што ардынцы прызначаць здрадніка Яраслава Усеваладавіча самым галоуным князем русін, я быў упэунен. А тое, што ён прызнача сваім намесьнікам у Кіеве ваяводу Дзьмітра Ейковіча, гэта нечакана.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, мы жа не ведаем як паводзіў гэты ваявода пасля захопу Кіева. Можа ен дапамог ардынцам лёгка захапіць Галіч і іншые горады.

Напярэдадні вясны і новага 6752 лета (1244 па хрысціянскім календары), у Воруту прыбыў ганец ад Данііла Рамановіча. Ён перадаў просьбу свайго князя дапамагчы захапіць горад Сандамір. Ганец перадаў два кошаля сярэбраных манет і сказаў, што будзе достаткава тры сотні ваяроў. Міндоўг пагадзіўся дапамагчы Даніілу Рамановічу. Аднаго ганца ён накіраваў у Ваўкавыск з прапановай да князя Даў'ята падрыхтаваць адну сотню ваяроў для паходу на ляхаў. А сам з галіцкім ганцом адправіўся ў Наваградак. Там Вялікі князь прызначыў ваяводу Вітольда на чале атрада ліцвінаў, які накіруецца да ляхаў на дапамогу галіцкаму князю. Вітольд згуртаваў дзве сотні ваяроў і яны накіраваліся у Ваўкавыск. Калі Вялікі князь вярнуўся з Наваградка, Альгерд спытаў яго:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, растлумач навошта нам дапамагаць Данілу Раманавічу?

— Альгерд, ён наш сусед і адзін, хто можа супернічаць з Яраславам Усеваладавічам.

— Міндоўг, Данііл Рамановіч вельмі баязлівы, і калі ён не разумее, што супрастаяць Яраславу Усеваладавічу, гэта супрацьстаяць Ардзе, то хутка зразумее і не будзе яму супрацьстаяць.

— Альгерд, гэтым паходам мы ні чым не рызыкуем. Нам прапанавалі дапамагчы знішчыць лацінцаў з іх прапаведнікамі, мы дапамаглі. Гэта на карысць Ардзе і Нікеі. Таксама гэта дапамога суседу, ён будзе думаць, што мы заўсёды гатоўны яму дапамогчы.

— Міндоўг, а калі ты спытаў у Капыся, колькі рыцараў знішчылі русіны летась на поўначы, то ты ужо штосьці надумаў?

— Альгерд, перад з'яўленнем галіцкага ганца, я думаў аб адным паходзе. Сёлета мы дапамаглі прусам знішчыць лацінскіх рыцараў. Ёсць жаданне дапамагчы паўстаўшым куронам. Лівонскі ордэн дамовіўся з русінамі, таму яны засяроджваліся задушыць паўстанне куронаў.

— Але Міндоўг, яны будуць чакаць тваёй дапамогі куронам. Яны жадаюць адпомсціць цябе за паразу пры Саўле.

— Альгерд, гэта зразумела. Але яны будуць чакаць мой атрад у зямлях куронаў. А я жадаю напасць на іх галоўны замак, гэта не Рыга, а якісь каля Рыгі. Так, я ніколі не штурмаваў лацінскі

замак. Шчыра прызнаюсь, я не ўпэўнен, што змагу штурмам узяць мураваны замак у чужынскай зямлі. Гэта вельмі далёкі паход па чужынскай зямлі. На доўгі штурм не хопіць харчоў, ваяроў і сродкаў штурму. Таму трэба разлічываць на таемнасць, нечаканасць і дасканалыя разведніцкие весткі. У нас ёсць Кодрун і Мікола, ў іх ёсць вопыт здабычы разведніцкіх вестак.

— Міндоўг, гэта вельмі рызыковы паход, з якога мы нічога не здабудзем.

— Альгерд, па-першае, мы дапаможам куронам, і зноў жа стрымаем узмоцненне лацінскіх рыцараў, па-другое больш важнае, абаронім сябе. Якім чынам? Зараз князь Яраслаў Усеваладавіч амаль з усякага русінскага княства можа атрымаць у свой атрад шмат сотняў ваяроў. Я меркую, што Яраслаў Усеваладавіч, калі стаў князем больш ваяўнічай чудзі, чым наўгародцамі і кіяўлянамі, вельмі жадае адпомсціць сваему крыўдзіцелю. Я упэўнен, што ён добра памятае сваю паразу пад Крэвам. Таму меркую, што калі яго прызначалі на гэтае княжэнне, ардынцы яго папярэджвалі не чапаць Літву, калі яны знішчаюць лацінскіх рыцараў. Таму, што гэта на карысць Арды і Нікеі. Знішчыўшы лівонскіх рыцараў, мы забараняем Яраславу Усеваладавічу нападаць на нас. Зразумело?

— Зразумело, Вялікі князь.

Праз шэсць дзён вярнуліся з паспяховага паходу атрад ваяводы Вітольда. У атрадзе загіблых не было. Параненых у ваўкавыскай сотні было чацвёра, а сярод наваградцаў сямёра. Міндоўг пацікавіўся ў Вітольда, як ваявалі яго пятнаццаці і шаснаццаці летнія ваяры.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, я іх дадаў да дзесятніка Гедзівіла. Пасля бою ён адзначыў, што ўсе сямёра вельмі імкнуліся ў бой. У час бою ўсе праявілі сябе ўмелымі ваярамі. Ніхто з іх нават не паранены.

— Добра Вітольд. Дзякую. У вечары, Вялікі князь пазбіраў усіх маладых ваяроў, якія былі ў гэтым паходзе, і ў прысутнасці рыцара Альгерда, рыцара Дзіміна і валхва Воята, абвесціў, што яны цяпер яго збраяносцы.

Напярэдадні свята Яна Купалы, Міндоўг выклікаў да сабе Кодруна і Міколу, і растлумачыў ім заданне ў Лівоніі, а таксама

папярэдзіў, што яно вельмі таямнічае. Воруцкі каваль Фрол вырабіў два дзесяткі штылетаў па ўзору саксонскага, які быў у Альгерда, і два дзесяткі разнастайных нажоў. Костарезный майстер па саксонскага ўзору вырабіў ручкі для штылет, і разнастайные для нажоў. Кодрун, як і перад Лівонскім паходам восем лет таму, таксама працаваў як костарэз. Калі скончацца палявыя працы, Міколу і Кодруну трэба накіравацца ў Лівонію, спачатку ў Рыгу на торжышчэ, а потым да замку магістра Лівонскага ордэна. Наглядая за замкам магістра, Міколе як даследчанаму ваяру, трэба ацэніць яго абараназдольнасць і жыццё рыцараў, іх распарадак. Праз трыдцать дзён Мікола і Кодрун вярнуліся ў Воруту.

Першым распавеў Кодрун.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, спачатку хутка купілі адзінаццаць нажоў, тады я прыхаваў чатыры нажы і тры лепшые штылеты. А калі падышлі да мяне тры рыцара, я да іншых штылетаў дадаў тры лепшых штылета. Самы ўплывовы з гэтых рыцараў стаў прымераць штылет да сваей далоні. Я заўважыў, што яго далонь шырэй чым трэба і паказаў яму, што хутка дароблю пад яго далонь. Пакуль дарабляў штылет, я учуў што ён накіруется ў замак Вендэн, на капітул Лівонскага ордэна. Іншые рыцары вельмі паважліва вымаўлялі слова капітул. Я зразумеў, што гэта якісьта іх уплывовы сход. Мы высачылі яго. Ён сумесна з аднім рыцарам накіраваўся на паўночны ўсход ад Рыгі. Мы асцярожна за імі сачылі вёрст сем, а потым вырашылі не рызыковать і паўсталі. Замак знаходзіцца ў шэсцьдзесят вёрст ад Рыгі.

Мікола дадаў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, замак знаходзіцца на гары, побач рака, шырыной семдзесяць крокаў. На другім берагу ракі гара, мабыць рака глыбокая. Замак мураваны на высокай крутой гары. Уваход у замак толькі праз вузкі драўляны мост, шырыной два кроку, даўжынёй дваццаць пяць крокаў. Роў пад мостам дзевяць сажняў. Пад мостам рака сужаецца. Тры мураваные круглыя вежы паміж сценамі вышынёй дванаццаць сажняў. Малое паселішче латгал знаходзіцца каля ракі Гаўя. Каля замка пачалі будаваць царкву. У замку нязьменна знаходзяцца трыццаць рыцароў. Калі быў у іх сход, там было на восем рыцараў больш. Таксама у замку знаходзяцца трыццаць збраяносцаў і

каля сарака слуг. Большасць слуг з паселішча латгалаў ля ракі. Гэтыя латгалы ўсе хрысціяне, мы бачылі як яны крыжападобна рухаюць правай рукой. Калі ў замак прывозілі даніну, то іх суправаждаў рыцар і збраяносец. Перад мостом іх сустракалі збраяносцы, потым калі даніну разгрузілі, рыцар і збраяносец накіроўваюцца ў замак, а замест іх прыходзяць слугі і даніну па мосце перасоўваюць ў замак. Я меркую, што замест іх слуг па мосце прайсці не магчыма. Перад мостам збраяносцы дазваляць прайсці толькі ім вядомым слугам. Гэты замак па даўжыні і шырыне такі як наш ворутскій, але ён мураваный і вышей за наш.

— А калі гэты замак такі як наш, як жа там жывуць больш за сотню?

— Вялікі князь, у вельмі шырокіх мураваных сценах ёсць пакоі, дзе жывуць ваяры. Самі гэтые сцены вышэй за нашы. Таксама жывуць у вежах.

— Каля замка ёсць лясы?

— Вялікі князь, на поўначы ад замка паміж ракой Гаўя і замкам ёсць паселішча і невялікі лес. А на поўдні пачынаецца доўгае ўзвышша і таксама ёсць лес.

— Мікола, як жа нам узяць гэты замак, або выманіць з замка рыцараў?

— Вялікі князь, гэта вельмі цяжка. Можа ўзяць яго ў кругавую аблогу, знішчыть паселішче латгалов з іх слугамі, а потым спаліць мост і з гэтага боку штурмаваць каменямётамі, а з другога боку ў гары рыць падкоп, штоб абвалілася сцяна.

— Колькі дзён доўжыўся адваротны шлях?

— Вялікі князь, адваротны шлях доўжыўся сем дзён.

— Ты ж сам разумееш, што пра каменямёты не могуць быць гаворкі. Добра, буду думаць. Дзякуй.

Перад Калядамі да Вялікага князя прыбыў полацкі ваяр Капысь, але ні якіх важных навін у яго не было. У зімку гуляя ў шахі з Альгердм, Міндоўг нечакана спытаў:

— А як магчыма выманіць рыцароў з замка, штоб яны не западозрылі пасткі?

— Чую ў цябе ўжо ёсць адказ на сваё пытаванне. Ты жадаеш, штоб я цябе прапанававаў тое жа самае. Думаю, што яны вый-

дуць з замка тады, калі будуць упэунены, што гэта вылазка для іх бяспечная.

— Гэта зразумело, алё як іх пераканаць, што яна бяспечная?

— Міндоўг, трэба штоб яны бачылі не больш адной сотні ваяроў, прычым не нашу добра ўзброеннаю цяжкую конніцу, а лёгкую конніцу.

— Так, і якія дзеі гэтай легкай конніцы? Паслядоуна, крок за крокам.

— Міндоўг, уперад ідуць дазорные, беруць у аблогу замак з усіх бакоў. Распытваюць, а потым знішчаюць усіх хто набліжаецца да замка. Лёгкая конніца з'яуляецца перад замкам, і одночасова вядуць слуг з паселішча, якія пад пагрозай, што спаляць іх паселішче нясуць вязанкі сухога трысце, каб яго абкласці каля сцен замка, а потым падпаліць яго. Двое слуг несуць факелы, а двое нашых лучнікаў прыцэліліся стрэламі з падпаленамі наканечнікамі. Рыцары, нягледзячы на пагрозу, што дваццаць пяць крокаў будуць пад прыцэлам лучнікаў, на хуткім скаку адзін за адным выскокваюць на ворага. Я меркую, што іх даспехі дадуць ім упэуненасць у сваёй бяспекі. Нашы лучнікі пачнуюць страляць у рыцара калі ён праскоквае мост, прытым страляць толькі ў рыцара, а не ў каня. Калі дваццаць рыцараў праскокваюць мост, тады з'явіцца наша цяжкая конніца.

— Так. А як быць, калі з замка будзе ўказ слугам кінуць трысце ў роў, а самім пазбірацца ў брамы замка. Я на месцы рыцараў задаў сабе пытанне, навошта гэтая лёгкая сотня ваяроў прыйшла пад гэты мураваны замак без каменяметаў. Калі прыйшлі, штоб паграбіць, то грабіць нема чаго, гэта жа не замак з багатым гандлевым і рамесным горадам. Гэта замак для магістра Лівонскага ордэна лацінскіх хрысціян, пра якага лацінскія прапаведнікі кажуць, што яму не патрэбна срэбра, не патрэбна вясёлае звычайнае жыццё, яму нават не патрэбна добрая жанчына, яму толькі патрэбна вера ў свайго Хрыста. Таму яны западозраць, што іх прагнуць выманіць з замка. І найбольш імаверна вырашаць падцягнуць насціл моста ў замак. Я ўпэўнен, што яны паставілі перад мостам збраяносцаў, каб не бачылі што вузкі насціл моста магчыма ўцягнуць у замак. Малаверагодна, алё магчыма, што

калі лёгкая конніца ні з чым пакіне іх, яны ноччу не праз браму, а іншым шляхам накіруюць ганцоў да бліжэйшых замкаў за дапамогай. У гэтым выпадку атрады дапамогі будуць з шмат дазорнымі. Пры вяртанні нашаму атраду на варожай зямлі будзе вельмі цяжка.

— Міндоўг, я згодзен мае меркаванні памылковые. А якія ў цябе?

— Альгерд, ты запамятаваў што рыцары пры пасвяшчэнні абяцалі ахоўваць жанчын, асабіста ўдоў. Калі рыцары не адчыняць браму замка, то ўсе жанчыны будуць забітыя. Таму гонар рыцара патрабуе іх ахоўваць. Таксама вельмі важна, штоб яны прынялі наш атрад за русінскі. Яны добра памятаюць, як ліцвіны пад Саўле завабілі іх у дрыгву, і там іх знішчылі. Таму Літву яны будуць падазраваць у падмане. Да русін яны адносяцца інакш. Калі русінскае войска двух русінскіх князёў два лета таму знішчала дваццаць рыцараў, гэта для іх зразумела, перамоглі колькасцью. Калі наш атрад з'явіцца з усходняга боку, з русінскай гаворкай псковічаў, па русінску апранутай і нявялікай колькасцью, то ў іх будзе жаданне напасць на ворагоў. Калі нашы ваяры будуць ісці на замок, хаваючысь за жанчынамі, як ардынцы хаваліся за заможнымі русінскімі людзьмі, то рыцараў гэта будзе абураць і для іх будзе справа гонару напасць на гэтакіх нягоднікаў.

— Вялікі князь Міндоўг, ты мяне пераканаў у магчымасці гэтага паходу, але як дамагчысь, штоб у нашых ваяроў была русінская говорка?

— Мікола добра ведае гаворку псковічоў. Ён яшчэ у першым паходзе на Пскоў два дні быў сярод пскоўскіх рыбаловаў. У нас ёсць былыя палонныя з Пскова. Трэба Міколу апрануць па княжацку. Ён будзе кіраваць, калі будзе адбіраць жанчын, і потым калі яны будуць ісці ля замку. Мікола навучыць некалькіх ваяроў пскоўскай гаворцы, якія будуць ісці за жанчынамі. Ваярам патрэбна вывучыць, як будзе па пскоўску:

— Я возьму гэту дзяўчыну з сабой ў Пскоў.

Наступным днём Міндоўг успомніў, што да нальшанскага князя Даўмонта перасяліліся русінскія ваяры. Ён яго выклікаў да сабе і спытаў:

— Князь Даўмонт, колькі ў тваім княстве ваяроў з русінскіх зямель?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, такіх ваяроў у мяне каля сотні. Яны не толькі ў Нальшанах, а і ў Крэва, і ў паселішчах.

— Добра. Ты калісці штурмаваў замак?

— Не, Вялікі князь Літвы Міндоўг.

— Тады ўсім атрадам будзе кіраваць рыцар Ленгвін, у яго будзе дзве сотні ваяроў з Наваградка і дзве сотні тваіх нальшанскіх. Нальшанскіе будуць пад тваім кіраваннем, ці прызнач сваего ваяводу. Калі атрад адправіцца ў паход, Мікола навучыць тваіх русінскіх ваяроў што трэба гаварыць па пскоўску. Апошнія русінскія ваяры даўно прыбылі?

— Вялікі князь, апошніе дзве сям'і русінскіх ваяроў прыбылі перад Калядамі. Яны казалі, што ў іх царквах прапаведнікі прымушаюць маліцца за ардынцаў. А іх князі папярэдзілі, што калі хтосьці прычыне шкоду царкве, ці прапаведнікам, то будзе забіты.

Гэта навіна не здзівіла Міндоўга, гэтага ен чакаў. З наступленнем вясны і новага 6753 лета (1245 па хрысціянскаму календары), Міндоўг вырашыў наведаць паселішча Даўга і сына Траняту, якому неўзабаве будзе сем лет. Ужо другое лета, як Пуцята перасяліўся ў пабудаваны для яго дом у паселішча Даўга. Ён не толькі навучаў Траняту ліцвінскай гаворцы, а і навучаў яго змагацца на драўляных палках. Транята размаўляя з Міндоўгам, казаў яму што добра змагаецца на драўляных мечах. А Вялікі князь спытаў яго:

— Можа ты Транята, моцней за меня?

Траняты ўпэўнена адказаў, што ён мацнейшы. Міндоўг з задавольненнем убачыў, што ў іх бітве Транята паказаў усю сваю ўпартасць і, не па ўзросту, сваю злосць. Калі зямля трошкі падсохла, Вялікі князь адправіў у лівонскі паход атрад рыцара Ленгвіна з чатырма сотнямі, дзве з іх былі нальшанскімі з ваяводам Даманам. Волхв Воят па коню Ленгвіна запэўніл, што паход будзе паспяховы. Атрад Ленгвіна яшчэ не вярнуўся з Лівоніі, як да Мінгдоўга прыбыў ганец ад князя Данііла Раманавіча з просьбай аб дапамозе атрадам у чатыры сотні ваяроў. За гэта Галіцкі князь перадаваў два кошеля срэбра. Вялікі князь пагадзіўся да-

памагчы. Ён паслаў у дапамогу атрад ваяводы Вітольда з двума сотнямі наваградскіх ваяроў і двума сотнямі ваяроў воруцкага княства. Праз тры дні пасля сыходу атрада Вітольда, вярнулася наваградская палова атрада рыцара Ленгвіна. Раней за атрад у Воруту з'явіўся дазорны гэтага атрада. Ён мовіў, што рыцар Ленгвін узяў у палон адзінага ацалелага лівонскага рыцара, які нясе да Вялікага князя адсечаную галаву іх галоўнага рыцара комтура Генрыха фон Зессендорфа.

Міндоўг указаў дазорнаму вяртацца да свайго атрада і перадаць Ленгвіну, што будзе сустракаць атрад у Наваградку. Адразу ён сумесна з Альгердам накіраваўся ў Наваградак. Спераду атрада, падыходзяшчага да Вялікага замка быў рыцар Ленгвін, да сядла ягонага коня быў прывязаны конь з лівонскім рыцарам.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, наш атрад па тваёй задумцы выманіў рыцароў з замка Вендэн і знішчыў іх сумесна са збраяносцамі. Добра ведая, што ты, Вялікі князь, прагнуў пагаварыць з рыцарам лацінскага ордэна, мы захавалі жыццё адзінаму рыцару. Мы яго абявязалі прынесці цябе, вялікі князь, адсечаную галаву комтура Генрыха фон Зеесендорфа. Сярод наваградчан забітых нема, ёсць пяцёра параненых. Сярод нальшанскіх ваяроў двое загіблых і чацвёра параненых. З твайго дазвола, вялікі князь, мы падзялілі ўсю здабычу на апошнім начлегу. Таксама наваградскім ваярам дасталася дзевяць палонных маладых дзевіц.

— Добра, рыцар Ленгвін. Дзякую ўсім ваярам Наваградка за перамогу над лацінскімі рыцарамі!

Пакуль шматлікае жыхары Наваградка віншавалі сваих ваяроў, асабісто Ленгвіна, Міндоўг указаў Альгерду запытаць палоннага рыцара. Яго клікалі Герман, ён з саксонскіх зямель і вельмі просіць Вялікага князя дазволіць яму пахаваць галаву комтура. Міндоўг спытаўшы рыцара, што яму трэба каб годна пахаваць рэшткі комтура, а калі выслухаў то накіраваў ганца да столяра, штоб той вырабіў драўляны крыж. На пытанне Вялікага князя, што яшчэ яму патрыбна, рыцар праз Альгерда адказаў:

— Вялікі князь Лютвы Міндоўг, мінула больш за трыццаць лет, як у нашым замку Вендэн быў у зняволенні князь латгалаў Даўгерутэ. Ён таксама, як і вы люцвіны быў шматбожцам. Калі

ён вырашыў памерці, то запрасіў у нашых брацьеў свой княскі меч. Брацья, як усе рыцары паважаюць гонар рыцара, таму яны прынеслі яму яго меч. Яны дазволілі гэтаму князю забіць сябе гэтым мячом. Я таксама жадаю забіць сябе сваім мячом. Міндоўг праз Альгерда, сказаў рыцару:

— Рыцар Герман, мы выканаем усі тваі пажаданні. Мы дазволім пахаваць рэшткі комтура з драўляным крыжам каля хрысціянскай царквы. Вярнем цябе твой меч у хрысціянскай царкве, але толькі пасля таго, як ты шчыра адкажеш на ўсі маі пытанні.

Рыцар Герман пагадзіўся адказаць на ўсі пытанні Вялікого князя. Адразу Міндоўг паслаў за Ленгвіном, штоб ён прынёс меч рыцара Германа. Лацінец пахаваў рэшткі комтура каля замкавай царквы і ўсталяваў на месцы пахавання драўляны крыж. Хударлявы прапаведнік апранутый у чорнаю вопратку паглядзел на яго, алё нічога не сказаўшы, пайшоў ад царквы. Потым рыцар Герман увашоў у царкву, прабыў там кароткі час і падышоў да Вялікага князя, у якога ўжо быў меч рыцара. Міндоўг з двума рыцарамі накіраваліся ў прыёмны пакой, дзе за сталом з ежай пачалася іх размова.

— Рыцар Герман, распавяді аб сабе і чаму ты стаў рыцарам Лівонскага ордэна.

— Вялікі князь Міндоўг, я старэйшы сын графа Паўночнай маркі з старажытнага роду Хальденслебенаў. Мой тата валодае зямельнай ўласнасцю ў дванаццаць гуф. Мяне чакала добрая будучыня, пакуль я не залез на высокае дрэво, каб угледзіць за падазронымі вершнікамі. На дрэве я зачапіўся нагой за галіну і зваліўся, ўдарывшысь нізам жывата аб высечаны напалаву ствол маладога дрэва. Пасля гэтага балючага падзення, я хварэў больш за дваццаць дзён, мая мача была з крывью. Потым я адчуў, што з маёй каханай дзевіцай, дачкой суседского міністэріала я не магу мілавацца як мужчына. Я быў збянтэжан і пажадаў памерці самазабойствам. Тады прышоў да мяне біскуп і ўгаварыў мяне прысвяціць маё жыццё службе рыцара Ісуса Хрыста ў Лівонскім ордэне.

— Рыцар Герман, у нас ёсць моцныя знахаркі, якіе вылечаць цябе ад гэтай хваробы.

— Вялікі князь, мне гэта ўжо не патрэбна. Мая каханая зрабілась жонкай майго малодшага брата. Прышоў мой час з'явіцца перад Хрыстом. Мая апошняя просьба, пахаваць мяне каля комтура Генрыха фон Зеесендорфа.

Міндоўг перадаў рыцару Герману яго меч. Лацінец накіраваўся да магілы рэшткаў комтура і хутка забіў сябе. Вялікі князь з рыцарам Альгердам пахавалі рыцара Германа і ўсталявалі драўляны крыж. Вяртаючыся ў Воруту, Міндоўг абдумваючы размову з лацінцам, выказаў сваю выснову:

— Альгерд, я меркую, што шмат рыцараў хрысціянскіх ордэнаў сталі імі ў выніку асабістых трагедзій, калі яны не былі падрыхтаваны да цяжкім выпадкам долі. Сваёй першанароджанасцю ён апынуйся ў ільготных умовах жыцця, і пры першым жыццевым іспыце ён збянтэжыўся, і не знайшоў годнага выйсьце з яго. Яму прапанавалі шлях па якаму магчыма ісці без уселякіх перашкод і намаганній. Достаткова шмат разоў паўтараць цяжка зразумелые малітвы і ты ў гурту тваіх аднадумцаў, які цябе паважаюць і падтрымліваюць. Альгерд, ты заўважыў, што калі я прапанававаў яму дапамогу ад нашых моцных знахарак, ён не знайшоў у сабе жаданне паспрабаваць вылечыцца?

— Міндоўг, ён згубіў сэнс жыцця пасля таго, як яго каханая зрабілася жонкай малодшага брата.

— Але, каліб знахаркі яго вылечылі, ен бы закахаўся ў іншую дзевіцу. Ты што яму спачуваеш?

— Міндоўг, ёсць мужчыны якія бачаць сваё далейшае жыццё толькі з адзінай непаўторнай дзевіцай. Я спачуваю гэтаму.

— Альгерд, я таксама бываю дужа закаханым, зачарованым, алё калі трэба вырашыць больш важныя справы я адкладаю каханне і вырашаю гэтые важныя справы.

— Міндоўг, я гэта ведаю. Таму ты Вялікі князь Літвы.

Вярнуўся з поўдня атрад ваяводы Вітольда. Атрад быў цэласны і непашкоджаны.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, калі мы зблізіліся да поля бою пад горадам Яраслаўлем, бой скончаўся. Ваяры князя Даніла Раманавіча дабівалі разрозненых ваяроў супраціўніка. Наколькі я зразумеў, ваяры Даніла Раманавіча нячакана напалі на

ваяроў, якія няўзгодненнымі дзеяннямі вугорскага караля Белы Чацвёртага, князя ляхаў Болеслава і ваяроў князя Расціслава Міхайлавіча не ведалі што рабіць. Таму наша дапамога была ім не патрэбна.

— Добра, Вітольд. Галоўнае, што ўсе нашы ваяры непашкоджаны. Дзякуй.

Перад Калядамі да Міндоўга прыбыў полацкі ваяр Капысь.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, пасля таго як у полацкім і віцебскім княствах стала вядома, што ліцвінскі атрад выманіў і знішчыў рыцараў з лівонскага замка Вендэн, князь Таўцівіл вырашыў пайсці паходам на наўгародскія зямлі. Мяне ў паход не ўзялі, таму буду казаць тое, што чуў ад тых ваяроў, якія былі ў паходзе.

— Капысь, князь Таўцівіл сам вырашыў ісці ў паход, ці яму хтосці гэта прапанаваў?

— Вялікі князь, я гэтага не ведаю. Князь Таўцівіл накіраваў мяне ў Смаленск, выведаць якіе кошты на зерне там. Калі я вярнуўся, то даведаўся, што князь Таўцівіл з атрадам, праз два дні пасля мяне, накіраваўся паходам да русін на ўсход. Ад ваяра, які быў у паходзе, я даведаўся што атрад князя Таўцівіла накіраваўся да русінскага горада Бежецк. Абрабаваўшы там, накіраваўся на горад Таржок, абрабаваўшы ў яго наваколе і ўзяў палон, атрад павярнуў на Полацк. Але за Тарапцом, каля Жыжыцкага возера на атрад напаў князь Яраслаў Усеваладавіч са сваім атрадам і адбіў палон, і выгнаў з русінскай зямлі. Ваяр казаў, што полацкіх ваяроў загібла каля трыццаці, параненых каля сарака. Загіблыя засталіся ў зямлі русінаў, каля Жыжыцкага возера.

— Капысь, возера Жыжыцкое каля віцебскага горада Усвят, няўжо Таўцівіл не запрасіў падмогі ад віцебскага князя?

— Вялікі князь, русінскі князь Яраслаў Усеваладавіч напаў нечакана і таму Таўцівіл не паспеў паслаць ганца за дапамогай. А калі атрад Таўцівіла зблізіўся да Усвята, то Яраслаў Усеваладавіч павярнуў свой атрад на ўсход.

— Калі нечакана напаў, тады ззаду не было дазорных. Гэта дрэнна. Ён кепскі ваявода. Атрымліваецца, што я перабольшыў яго здольнасці.

— Вялікі князь, ваяр гаварыў, што калі русіны напалі, то Таўцівіл не змог наладзіць адпор нападнікам. Усе кінуліся на уцёк. У каго было шмат нарабаванага і палону, той загінуў.

Міндоўг быў вельмі раззлаваны пачулым. Ён доўга спрабаваў супакоіцца, а потым ціхенька сказаў:

— Капысь, перадай Таўцівілу, што сваім паходам на русін ен заклікаў ардынцаў і русін напасць на яго, і на Літву. Перадай Таўцівілу, што я забараняю яму, без майго дазволу нападаць на русін.

Калі Міндоўг застаўся з Альгердам, ён яшчэ доўга супакоіваўся.

— Альгерд, Таўцівіл разумеў, што я буду незадаволен паходам на русін, таму ён не ўзяў у паход Капыся, а адаслаў яго з Полацка. Але ўсероўна пайшоў ў паход. Ім хтосці кірую. Ён паслаў Капыся разведаць кошты на зерне, а гэта патрэбна тату яго жонкі. Але гэтым паходам Таўцівіл можа выклікаць незадоволенасць не толькі маю, а і родзічэй загіблых, і параненых. Няўжо ен не разумея, што яго могуць скінуць з князёў, і вярнуць Брачыслава? Гэта трэба высвятліць. А як? Ад Капыся ўтойваюць намеры Таўцівіла. Трэба ў Полацку імець іншых разведнікаў.

Міндоўг праз слугу заклікаў Міколу. Пакуль Мікола не прышоў, Альгерд звярнуўся да Міндоўга:

— Вялікі князь Міндоўг, ты заўважыў, што князь Яраслаў не ўвашоў на зямлі нашых крывічаў?

— Так, Альгерд, заўважыў. Але ён абавязкова паскардзіцца ардынцам на рабаўніцкі паход полацкага князя. Таму трэба чакаць усяго.

Калі прыйшоў Мікола, Міндоўг указаў яму, што ў Полацку трэба знайсці не меньш за двух разведнікаў, якія высвятлілі б задумкі ў асяродзе князя Таўцівіла. Гэтым разведнікам, а таксама Капысю, трэба мець магчымасць усё важныя навіны хутка перадаваць Вялікаму князю. Міндоўг дамовіўся з Міколам, што на пры канцы зімы ён накіруецца ў Полацк. Перад вясной і новым 6754 летам (1246 па хрысціянскаму календары) вярнуўшыйся з гандлёвага паходу на поўдзень, Міхалок паведаміў, што князь Данііл Рамановіч запатрабаваны ханам Бату да сабе, вярнуўся з ярлыкам на галіцкае княства. Пры гэтым ен быў вельмі неза-

доволен той зневажальнасцю, якую сустрэў у ханскай стаўцы, ў Сарае. Неўзабаве вярнуўся з Полацку ваяр Мікола.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, спачатку я быў у ваяра Капыся. Той распавеў, што калі ен перадаваў загады Вялікага князя Таўцівілу, то полацкі князь быў разлаваны тым, што ўчуў. Таўцівіл сказаў, што сам разважыць чым займацца ў полацкім княстве, і забараніў Капысю накіравацца да Вялікага князя. Ён сказаў Капысю, што замест яго будзе іншы ганец да Вялікага князя. Капысь прапанаваў мне двух полацкіх рамеснікаў, якія могуць у любы час перадаць важную навіну Вялікаму князю. Ад Капыся я накіраваўся не да гэтых рамеснікаў, а да сваёй пляменніцы, асьцярагаючыся што за мной будуць сачыць людзі Таўцівіла. Першы рамеснік Фадзей, вырабляе жалезныя замкі. Ён адразу згадзіўся за ўзнагароджванне выканаць гэтую справу. Другі рамеснік Ждан. У яго майстэрні златокузнецы і бронзоліцейшчыкі. Ён калі пачуў маю прапанаву, доўга меркаваў, а потым сказаў, што згодзен без узнагароды, а дзеля гонара сувязі з Вялікім князем. Мабыць разлічвае на якуюсць прывілею ад цябе, Вялікі князь.

— Добра, Мікола. А як большасць жыхароў Полацка адносяцца да Таўцівіла і да ўсяго, што адбываецца ў іншых княствах?

— Вялікі князь, у мяне не было магчымасці размаўляць з шматклікімі жыхарамі. Я магу толькі перадаць тое, што гаварыла мая пляменніца і яе муж. Яны казалі, што больш за усё іх здзівіла тое, што ў русінаў у царквах моляцца не толькі за Хрыста, але і за ардынскіх ханаў. І таму яны шмат моляцца ў полацкіх царквах Хрысту за тое, што ён не дапушчае ганьбы на нашых зямлях. А за мяжамі царквы падзякаваюць цябе Вялікі князь і князю Таўцівілу.

— А пасля паходу Таўцівіла на русінаў?

— Вялікі князь, пра паход на русінаў розныя меркаванні. Шкада па загіблых і па параненым, шкадуюць князя Таўцівіла за яго паразу, тлумача гэта яго маладосцью. Малая частка жыхароў гаварыла аб тым, што добра калі пайшлі на русінаў, якія здрадзілі Хрысту, параўновывая іх з ардынцамі, а вялікая частка гавораць, што трэба было ісці з Вялікім князем Міндоўгом.

— А таго, каб скінуць Таўцівіла з князёў не гаварылі?

— Вялікі князь, жыхары ведаюць, што мая пляменніца і яе муж за Вялікага князя Міндоўга, і калі ён прапанаваў Таўцівіла, то і яны за Таўцівіла, таму ў вочы не гавораць, што трэба скінуць яго, але магчыма думаюць аб гэтым.

— Зразумело, Мікола. Дзякуй. Прыбыўшы з Капыля ганец паведаміў, што ў галоўную стаўку Арды заклікалі старэйшага князя русінаў Яраслава Усеваладавіча. Хан Бату не пажадаў прыбыць у галоўную стаўку на курултай дзеля выбрання новага Вялікага хана Арды. Там зараз кіруе ўдава памерлага Вялікага хана Угедея. Князь Яраслаў Усеваладавіч адправіўся са сваім асяродзем і з вялікімі багатымі дарамі.

— Добра, Каліст, дзякуй. Калі ганец пакінуў іх, Міндоўг звярнуўшысь да Альгерда зрабіў вывад, што хан Бату зразумеў пра сваю паразу ў выбарах Вялікага хана. Перад восенью прыбыў ганец з Ваўкавыска, і паведаміў што дазорные іх княства бачылі як атрад жамойтаў накіраваўся ў валынскія зямлі, а потым бачылі, як гэты атрад толькі ўдвая зменьшаны вяртаўся. Падзякаваўшы ганца, Міндоўг палічыў, што гэта Айшовно Рушкевіч пажадаў паграбіць валынцаў.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, але князь Данііл Рамановіч можа вырашыць, што гэта быў ліцвінскі атрад.

— Альгерд, князь Данііл Рамановіч бачыў нашых ваяроў і таму ён добра ведае вялікую розніцу між нашымі атрадамі і атрадам жамойтаў.

У сярэдзіне восені да Міндоўга прыйшоў гандляр Андрэй.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, хан Бату заклікаў да сабе князя Міхаіла Чарнігаўскага. Калі той прыбыў у стаўку Сарай, то яму патрыбна была прайсці праз шаманскія абрады. Перад адпраўленнем у Сарай, духоўнік князя Міхаіла Чарнігаўскага вельмі старанна папярэджвал яго, што шаманскія абрады ганьбуюць хрысціянства, таму ён адмовіўся іх выконываць. Тады ардынцы яго забілі. А раней яго там быў старэйшы князь Яраслаў Усеваладавіч, які потым накіраваўся ў стаўку Арды. Я меркую, што Яраслаў Усеваладавіч дамовіўся з духоўнікам Міхаіла Чарнігаўскага старанна папярэджваць аб злачыннасці шаманскіх абрадаў, а потым пераканаў хана Бату забіць гэтага

князя. Князь Яраслаў Усеваладавіч даўно ворагаваў з Міхаілам Чарнігаўскім.

— А якая карысць духоўніку ад смерці Міхаіла Чарнігаўскага?

— Вялікі князь, Міхаіл Чарнігаўскі сябраваў з лацінскімі хрысціянамі, ляхамі і вугорцамі. Лётась, ваяры ўгорцаў і ляхаў спрабавалі дапамагчы сыну Міхаіла Чарнігаўскага парамагчы князя Данііла Рамановіча, і захапіць дзеля яго галіцкія зямлі.

— Зразумела. Андрэй, а хто цяпер будзе замест Міхаіла Чарнігаўскага?

— Вялікі князь, Андрэй Мсціслававіч будзе князем Чарнігаўскім, яго тата загінуў у бітве з ардынцамі каля ракі Калка. Ён угодзен Яраславу Усеваладавічу і яго прапаведнікам.

— Зразумела, Андрэй. Дзякую. У сярэдзіне зімы ў Воруту з'явіўся капыльскі ганец Каліст.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, гандляры гавораць, што князь Яраслаў Усеваладавіч вяртаючыся з галоунай стаўкі Арды з курултая, памер на сёмы дзень. Перад вяртаннем ён атрымаў ад новага Вялікага хана Арды Гуюка ярлык старэйшага князя русін. А напярэдадні вяртанне, князь Яраслаў Усеваладавіч быў на вячэры ў удавы мінулага Вялікага хана Туракіне. Таксама гандляры гавораць, што сын Яраслава Усеваладавіча князь Андрэй Яраслававіч ажаніўся на дачцэ князя Данііла Рамановіча.

— Добра, Каліст. Дзякуй. Міндоўг ад гэтых навін задумаўся, а Альгерд не вытрымаў і спытаў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, а хто ў іх зараз старэйшы князь?

— Мяне яшчэ цікавіць, каму было патрыбна атруціць князя Яраслава Усеваладавіча. Трэба заклікаць гандляра Андрэя, хай растлумачыць. Прыйшоўшы гандляр Андрэй, не здзівіўся навінам.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, хан Бату добра ведаў, што будзе атручаны варожай ўдавой Угедея, якой ён прайграў выбары новага Вялікага хана. Хан Бату пашкадаваў пасылаць замест сябе свайго маладога брата, паслаў князя Яраслава Усеваладавіча ведаючы, што яго атруцяць. Я ўпэўнен, што хан Бату не прызнае хана Гуюка Вялікім ханам. Доўгі час адсутнасці Вялікага хана перад курултаем на выбары, сведчыць што сілы супраціва

прыхільнікоў хана Бату амаль роўные з прыхільнікамі хана Гуюка, таму іх змаганне яшчэ наперадзе.

— А хто будзе замест Яраслава Усеваладавіча?

— Вялікі князь, права на спадчыну ў князя Святаслава Усеваладавіча, брата Яраслава Усеваладавіча. Гэты князь мяккага і пакорлівага характару. Заўсёды выконаваў указы таты, а потым указы брацьеў. Ён вельмі набожны.

— Зразумело, такі князь будзе цалкам падпарадкаваны хану Бату. Дзякуй. На дзяявяты дзень вясны і новага 6755 лета (1247 па хрысціянскім календары), да Міндоўга прыбыў гандляр Міхалок.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, я быў у Холме і пачуў размову двух лацінцаў. Больш значны лацінец гаварыў іншаму, што ў іх размове князь Данііл Галіцкі адзначыў сваі добрыя адносіны да лацінскага хрысціянства і да магчымасці аб'еднання лацінскіх ваяроў з яго ваярамі дзеля разгрому войскаў ардынцаў. Зараз калі ў ардынцаў вялікая варожасць між уплывовамі ханамі, іх разрозненыя войскі лягчэй разбіць. Тым больш, што ва ўсходніх русін зараз нема такога заўзятага прыхільніка ардынцаў, якім быў памерлы князь Яраслаў Усеваладавіч, таму хану Бату будзе цяжэй атрымаць падмогу русінскімі ваярамі. Больш значны лацінец накіраваў другога лацінца ў Рым да кіраўніка Царквы, з прапанавай Папе Рымскаму даслаць да князя Данііла Галіцкага запрашэнне да лона лацінскага хрысціянства з наступным уручэннем кароны караля Русі.

— Міхалок, калі лацінцы размаўлялі між сабой, яны бачылі цябе?

— Не, Вялікі князь, не бачылі. Я быў каля іх, алё за кутом сцены і яны мяне не бачылі. Вялікі князь, таксама я даведаўся, што князь Данііл Рамановіч ажаніў свайго сына Льва на дачцы вугорскага караля Белы Чацвёртага Констанцыі, па прапанове вугорскага караля.

— Добра, Міхалок. Дзякуй.

Пасля сыходу Міхалка, Міндоўг трошкі быў задуменным, а потым мовіў:

— Альгерд, у тых навінах ёсць якаясць блытаніна. Міхалку я цалкам давяраю, але гэты значны лацінец не ведае, што новы

старэйшы князь русін будзе цалкам падпарадкаваны хану Бату. Ён дасць ардынцу столькі ваяроў сколькі той запатрабуе. Калі лацінец не ведае характар новага старэйшага князя русін, то князь Даніїл Рамановіч павінен яго ведаць. Калі Даніїл Рамановіч аддаў сваю дачку замуж за ўплывовага сына Яраслава Усевалодавіча, мне гэта зразумела, ён узмоцняў адносіны з усходнімі русінамі і сваімі прапаведнікамі. А калі ён ажаніў свайго сына на дачцэ караля лацінцаў, то гэта не спадабаецца Нікеі, і сваім прапаведнікам, якія сталі вельмі моцнымі пры ардынцах.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князь Даніїл Рамановіч жадаў ажаніць сваего сына на дачцэ вугорскага караля яшчэ да нашэсця ардынцаў на яго зямлі. А цяпер, калі ён атрымаў ярлык ад ардынцаў, ён стаў для вугорскага караля вельмі моцным, асабліва пасля перамогі пад Яраслаўлем, і кароль пажадаў з ім пароднiцца. А для Нікеі ен нічога дрэннага не ўчыніў. Яго сын прывядзе да сабе лацінку і ператворыць яе ў сваю веру. Чарнігаўскія князі таксама імкнуліся ажаніць сваіх сыноў на дачках лацінцаў.

— Тут я з табой згодзен, Альгерд. Але пад уплывам сваей зневажальнасці ў стаўцы хана Бату, ен пажадаў пайсці пад лацінскую Царкву, мабыць жадае ад яе іх ордэнскіх рыцараў дзеля супраціва ардынцам. Гэта вялікая памылка. Я меркую, што калі яго ваяры ўведаюць што князь Даніїл Рамановіч пайшоў пад лацінцаў, то ў іх будуць вельмі дрэнныя адносіны да гэтага князя.

— Міндоўг, я з гэтым згодзен. А чым ты растлумачыш гэты яго ўчынак?

— Паспешлівасцю нельга растлумачыць, ужо шмат часу прайшло з таго, як ён павярнуўся ад хана Бату. Маладосцю таксама нельга растлумачыць, ен на два лета старэйшы за мяне. Таму я меркую, што толькі ў выпадку таго, што большасць ваяроў і жыхароў валынскіх і галіцкіх зямель абураны зневагой Хрыста праардынскімі дзеяннімі і малітвамі іх прапаведнікаў. Як абураны жыхары нашых крывіцкіх горадоў і паселішч. Таму трэба зараз выведаць адносіны ваяроў і жыхароў тых зямель да праордынских малітваў.

Наступным днём Міндоўг, чарговым разам, наведваў у Вялікім замку Наваградка сына і дачку. Тады ж запрасіў да сабе гандляроў Волімунта і Міхалка.

Старэйшы гандляр Міхайла хварэў. Вялікі князь указаў Міхалку высвятліць адносіны жыхароў і па магчымасці ваяроў, да праордынскай дейнасці іх прапаведнікаў. Волімунту трэба было высвятліць адносіны лацінцаў да князя Данііла Раманавіча. Вярнуўшысь у Воруту, Міндоўг заклікаў да сабе гандляра Андрэя і яму такоеж загадаў. Неўзабаве прыбыў ганец з Ваўкавыска з сумнай весткай, што князь Даў'ят памёр ад хваробы. Зараз князем яго старэйшы сын Глеб. Міндоўг папрасіў ганца перадаць усім родным памерлага князя Даў'ята яго спачуванні. Князь Даў'ят заўседы быў першым у дапамоге Міндоўгу, і за гэта Вялікі князь быў удзячны яму.

Перад Купаллям, вярнуўшыся з поўдня гандляр Міхалок распавеў, што жыхары паселішч валыншчыні больш трымаюцца шматбожжа, таму ім абыякава да знявагі Хрыста. Гандляр валынскага горада Уладзімір казаў Міхалку, што толькі ў Галічы мабыць большасць жыхароў будуць супраць знявагі Хрыста, і тое толькі таму, што іхнія баяры шукаюць кожную зачэпку супраць князя Данііла Рамановіча. Таксама Міхалок паведаміў, што памёр князь Конрад Мазавецкі, а замест яго кіруе князь Болеслаў Мазавецкі, яго старэйшы сын.

## ГЛАВА 17

## УНУТРАНЫЯ АДНОСІНЫ

У вечары, калі гулялі ў шахі, рыцар Альгерд усміхаясь спытаў у Міндоўга:

— Вялікі князь Міндоўг, ты ведаеш, што да тваёй князёўны Марты шмат разоў наведваецца старэйшая знахарка?

— Не, не ведаю.

— Гэта мне Ванда паведаміла. Калі я накіраваўся да цябе, Ванда ўбачыла гэту знахарку, і сказала, што зачасціла да кня-

зёўны знахарка. Мабыць штосьці робіць з князёўнай, штоб тая зацяжарыла.

— Хай, пора б ужо. Перад Калядамі да Міндоўга прыбыў рамеснік Ждан з Полацка. Яго прывёў Мікола і паведаміў вялікаму князю, што рамеснік Ждан прыбыў з навінами і яму магчыма давяраць.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, з вясны ў цераме князя Таўцівіла жыла яго сястра, а перад восенью прыбыў у княскі церам ваяр ад князя Данііла Раманавіча. А недаўно я даведаўся, што князь Таўцівіл быў у валынскіх зямлях, і там выдаў сваю сястру замуж за князя Данііла Раманавіча.

— Дзякую, Ждан, за навіну. Скажы мне яшчэ, як рамеснікі і ваяры ставяцца да князя Таўцівіла, і ці ведаюць яны, што князь Данііл Рамановіч ажаніў свайго сына на дачке лацінскага вугорскага караля?

— Вялікі князь Міндоўг, рамеснікі добра ставяцца да Таўцівіла таму, што ты Вялікі князь паставіў яго нам. Калі ты пажадаеш іншага паставіць нам, то мы прымем іншага. Сярод ваяроў і жыхароў ёсць тые хто дрэнна ставіцца да Таўцівіла пасля паходу на русін. У большасці маі майстры і чаляднікі шматбожцы, таму ім абыякава тое, што сын князя Данііла Раманавіча ажаніўся на лацінцы. Усіх жыхароў абурае тое, што па сведкам, ардынцы пры штурме русінскіх гарадоў прымушалі ісці наперадзе іх ваяроў, русінскіх заможных людзей, як прыкрыццем для іх. Так робіць подласць, ніколі ніхто так не рабіў. Таму дзеля нас самыя дрэнныя гэта ардынцы з іх шаманамі. А калі іншы князь будзе іншым хрысціянінам, ці шматбожцем, нам усё роўна. Князь павінень быць моцным ваяром.

— Добра, Ждан. Дзякуй.

Пасля выхаду Ждана, рыцар Альгерд звярнуўся да Міндоўга:

— Вялікі князь, меркуеш каго іншага паставіць замест Таўцівіла?

— Альгерд, тое што ён шукае дапамогі сабе каб застацца князем Полацка сведчыць, аб тым што яго становішча ў княстве не трывалае. Добра што Таўцівіл гэта разумее, як і тое, што не трэба было ісці паходам на русінаў. Мяне цікавіць аб якой дапамогі яны дамовіліся. Улічывая нашы сяброўскія з Даніілам

Рамановічам адносіны, Таўцівіл мог дамовіцца, штоб Даніїл Рамановіч папрасіў мяне не чапаць яго. Гэта адна магчымасць, а іншая вельмі дрэнная дзеля нас. Князь Даніїл Рамановіч цяпер адчуў сваю моц і ўплывовасць. Ад хана Бату атрымаў ярлык, парадніўся з ваяўнічым русінскім князем Андрэем Яраславічам, перамог у вырашальной бітве пад Яраслаўлем, вугорскі кароль прапанаваў сваю дачку за яго сына, а князь вялікага полацкага княства аддаў сваю сястру за яго. Безумоўна зараз князь Даніїл Рамановіч са сваімі галіцка-валынскімі княствамі самы ўплывовы князь русін на зямлях правага берага ракі Дняпро. Таму заможныя людзі ад рымскага Папы будуць прапанаваць яму карону караля Русі, а з ёй і рыцароў хрысціянскіх ордэнаў. Пасля таго, як у яго будуць сотні рыцароў, ен вельмі магчыма пажадае напасць на Літву, па прапанове Рыма. Тым больш, што князь Полацка яму ў дапамогу з усходу.

— Міндоўг, але ён не ведае, што ў такім выпадку князь вялікага полацкага княства будзе без полацкіх ваяроў і жыхароў.

— Я таксама меркую, што ў Полацку ў яго нема падтрымкі. Але цяжка здагадацца аб чым меркуе Даніїл Рамановіч. Таму пакуль пачакаем яшчэ навін. У гэту ноч Міндоўг доўга не мог заснуць, і Марта не была таму прычынай. З ранка Міндоўг заклікаў да сабе Міколу.

— Мікола, хто цяпер самы ўплывовы ў Полацку?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, зараз у Полацку самы ўплывовы пасаднік Язэп. Цяпер палачанам зразумела, што паход на русін Таўцівіл учыніў без згоды з табой, Вялікі князь. У гэтым паходзе ен праявіл сабе, як слабы князь, з шматлікімі забіццём нашых ваяроў, таму даверу да яго стала значна меньш. Пасаднік Язэп з павагай адносіцца да цябе, Вялікі князь Міндоўг.

— Мікола, а праз каго ў Полацку магчыма выведаць аб чым дамовіліся князь Даніїл Рамановіч і князь Таўцівіл?

— Вялікі князь, ёсць толькі адзін чалавек у Полацку, які можа гэта ведаць, яго цесць Міхась. Але ён не гаварлівы, і выведаць гэта ў яго не магчыма.

— Добра, Мікола. Дзякуй. Міндоўг звярнуўся да сваіх гандляраў з указам таемно выведаць аб чым дамовілісь князь Даніїл Рамановіч з князем Таўцівілам.

Але прайшла зіма і наступіла вясна, а з ёй і новае 6756 лета (1248 па хрысціянскім календары), а вестак пра іх дамову не было. Князь Данііл Рамановіч не чым не праявіў сабе, штоб магчыма была здагадацца аб сутнасці іх дамовы. Прыбыў ганец з Капыля, які паведаміў, што памёр князь Болеслаў Мазавецкі, замест яго князем стаў яго малодшы брат Сомовіт. Таксама ен распавеў, што паморскі князь Светаполк дамовіўся аб міры з Тэўтонскім ордэнам. Пасля Купалля вярнуўся гандляр Андрэй. Ён мовіў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, у ўсходнім Уладзіміры старэйшы князь Святаслаў Усеваладавіч быў выгнаны сваім пляменнікам Міхаілам Яраслававічам.

— А як да гэтага ставіцца хан Бату?

— Вялікі князь, з Сарая ёсць весткі, што Вялікі хан Гуюк прапанаваў хану Бату сумесна напасць на Еўропу. Адказа на гэту прапанаву пакуль нема. Я меркую, што хан Бату пакуль разважае над гэтай прапановай, таму пакуль яму не да русін.

— А пра князя Данііла Раманавіча ёсць весткі?

— Вялікі князь, пакуль пра яго вестак нема. Я думаю, што ён яшчэ не атрымаў запрашэнне ад Папы Рымскага.

У Міндоўга была надзея на спрытнага гандляра Міхалка, але калі ён вярнуўся, то паведаміў, што пра князя Данііла Раманавіча навін нема. Навіны прыйшлі толькі ў сярэдзіне восені, і з нечаканага боку. Ганец ад князя Эйсманта паведаміў, што мазуры князя Сомовіта і русіны князёў Данііла Раманавіча і Василька Раманавіча напалі на адасобленных яцвягов. Мазуры прыйшлі ад Драгічына і запалілі першае на іх шляху паселішча яцвягаў. Калі пазбіраліс суседнія яцвягі і напалі на мазураў, то ў дапамогу мазурам адразу прышлі русіны Данііла Раманавіча, а таксама сумесна з ім прыйшлі ваяры здрадніка, князя паўднёвых яцвягоў Яшчэлта. Князь Эйсмант жадае дапамагчы сваему суседу князю яцвягаў Ігелду, і таму просіць у Вялікага князя дазвол на гэту дапамогу.

— Рыцар Альгерд, табе трэба хутка скакаць з ганцом да князя Эйсманта і растлумачыць яму, што цяпер нельга ваяваць супраць князя Данііла Рамановіча пакуль ён не перайдзе мяжу з нашымі саюзнымі княствамі. Калі нашы ваяры дапамогуць яцвягам і будуць ваяваць супраць вяроў князя Данііла Рамановіча,

гэта будзе адзначаць што мы парушылі нашу мірную дамову. Ён зараз чакае дамовы з Папам Рымскім, і дапамогі яму рыцарамі хрысціянскіх ордэнаў. Няхай князь Эйсмант забярэ да сабе ў замак князёўну Тэклю і сваего ўнука. Заўтра, з ранка я накірую дзве сотні ваяроў у Ваўкавыск і дзве сотні ў Эйсманты. Няхай павялічваюць дазорных ў заходні бок, на мяжу нашых зямель. Таксама трэба папярэдзіць аб гэтым князёў Гародні і Слоніма.

Наступным днём Вялікі князь накіраваў дзве сотні наваградскіх ваяроў з ваяводам Вітольдам да Ваўкавыска і дзве сотні воруцкіх ваяроў з рыцарам Ленгвінам да Эйсманты. Праз чатыры дні ўсе ваяры вярнуліся цалкам здаровыя. Русіны і мазуры не перашэдшы мяжу павярнулі да сабе.

Супернікі, як яцвягі, так і русіны з мазурамі страцілі шмат загіблых. Тэкля не пагадзілась перайсці ў замак Эйсманты. Калі русіны павярнулі ў сваі зямлі, князь Эйсмант накіраваў сваего дазорнага да князёўны Тэклі, выведаць якія вынікі гэтага супраціва ў княстве Ігелда.

Вярнуўшысь, дазорны паведаміў, што атрад пад кіраўніцтвам Тэклі згубіў дваццаць два ваяра загіблымі. І хоця ў іх землях русіны не былі, але іхнія ваяры незадаволены тым, што ліцвіны не дапамаглі ім. Альгерд чуў, як дазорны гаварыў аб гэтым князю Эйсманту, і бачыў што яму было непрыёмна гэта чуць. Адразу пасля Калядаў, прыбыў да Міндоўга рамеснік з Полацка Фадзей. Ён распавеў, што хан Бату паслаў да Вялікага хана Гуюка дзеля перагавораў сваего брата Шейбані. У выніку гэтага, Шейбані быў забіты, а Гуюк паранен.

— Фадзей, а як ставяцца ў асяродзе князя Таўцівіла да яго адносін з князем Даніілам Раманавічам?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, я не бываю ў асяродзе князя Таўцівіла і таму не ведаю. Навіну пра хана Бату мне перадаў ваяр Капысь, штоб я яе перадаў цябе, Вялікі князь.

— Добра, Фадзей. Дзякуй.

Калі Фадзей пакінуў іх, рыцар Альгерд звярнуўся да Міндоўга:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, настае гарачы час ў Ардзе.

— Так, я меркую, што крывавы час. Але мяне больш турбуе тое, што ў асяродзе Таўцівіла, доўгі час ніхто не гаворыць пра

адносіны з князем Данілам Раманавічам. Нават нема вестак, як сястра Тоўцевіла жыве з мужам. Такая вялікая таемнасць сведчыць аб пагрозе для нас.

У вечары князёўна Марта паведаміла Міндоўгу, што яна цяжарная. Гэта навіна Міндоўгу была да спадобы. На пры канцы зімы ў Воруце з'явіўся рамеснік Ждан.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, смаленскі князь Усевалад Мсціслававіч доўга хварэе, цяпер там ідзе барацьба за вызваляючыся стол смаленскага князя. Права на спадчыню ні ў каго няма. Таму я думаю, што цябе Вялікі князь, гэта будзе цікава.

— Так, Ждан. Цікава. Дзякуй.

Калі Ждан выйшаў ад іх, Альгерд не вытрымаў і спытаў:

— Міндоўг, ня ўжо ты жадаеш захапіць Смаленск?

— Альгерд, я яшчэ не вырашыў. Перадай ганцу, штоб выклікаў да мяне гандляра Андрэя. Наступным днём гандляр Андрэй з'явіўся ў Міндоўга.

— Гандляр Андрэй, ёсць весткі, што хутка памрэ смаленскі князь Усевалад Мсціслававіч. Хто тады можа атрымаць смаленскі стол?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, прамых нашчадкаў у яго нема, нават і другасных родзічэй нема. Сярод далёкіх продкау ў яго князі з полацкіх, кіеўскіх, наўгародскіх, віцебскіх, тураўскіх і пінскіх дынастый.

— Андрэй, хто на тваю думку будзе актыўна дамагацца смаленскага стала?

— Вялікі князь Міндоўг, князь Аляксандр Яраслававіч жанаты на полацкай князёўне Брачаслаўне. Яго ў Ноўгарадзе не вельмі паважаюць.

— Але старшага князя русін выгналі з Уладзіміра, я чакаю што Аляксандра Ярославовіча паставяць старшым князем.

— Вялікі князь, учора я атрымаў вестку, што Сарай вырашыў аддаць Уладзімір князю Андрэю Яраслававічу, а Кіеў князю Аляксандру Яраслававічу, але ён у Кіеў не пайшоў, а застаўся ў Наўгарадзе.

— Нечакана. Мне гэта не зразумела. Няўжо ў ардынцаў адметнасць князёў не па падляшчуванні, а па ваярскому майстэрству. Як ты гэта растлумачыш?

— Вялікі князь, мне яшчэ гэта таксама не зразумела. Можа яны зразумелі, што здраднікі яны і іншым будуць здраднікамі.

— Добра, Андрэй. Дзякуй.

Потым Вялікі князь прызнаўся Альгерду, што Смаленск яму патрэбен, штоб выслаць туды князёў якіх ен падазрае ў непадпарадкаванне яму.

— Гэта маі сваякі Таўцівіл, Эрдзівіл і Выкінт. Я лічу што яны атрымалі княства не па сваім дасягненням і здольнасцям, а па сваей роднасцю са мной, але лічаць што заслугоўваюць вялікого княства, мабыць нальшанскага. Я спрабаваў прызначыць аднаго з іх на вялікае княства, і што ад гэтага атрымалася, ты ведаеш. Яны не разумеюць, што я да свайго княства імкнуўся кожны дзень з дзяцінства. Дзеля гэтага княства, я ўзяў у жонкі нелюбаю мне князёўну, а ў іх каханыя імі дзяўчыны. Няхай праявяць сваі здольнасці і самастойныя рашэнні па дапамогі адзін іншаму, каб узяць Смаленск і іншы горад у смаленскай зямлі. Я разлічываю, што Выкінт, як старэйшы з іх будзе ахочы заняць Смаленск, але на яго будзе ахочы і Ердзівіл. Тоўцевіл, галоўны з іх таму, што ен мае права на Смаленск, як полацкі князь, і як бы ён не вырашыў, камусьці незадаволіць. Будзе сварка паміж імі, пасля гэтага адзінства ў іх не будзе, назаўседы.

— Вялікі князь, а калі русіны аб'еднаюцца і перамогуць атрад ваяроў тваіх сваякоў?

— Ужо шмат дзесяцілецій русіны не аб'яднаюцца, а ваююць між сабой за лепшы стол. Для іх галоўны вораг не ардынцы, а суседні русінскі князь, у якога лепшы стол. У іх сварка калі яшчэ смаленскі князь Усевалад Мсціслававіч жыве, а калі памрэ, то яны будуць забіваць адзін іншага, каб толькі гэты стол не атрымаў яго сваяк сусед, ужо лепей гэты стол атрымае ардынец, ці ліцвін. Але я прадбачыў і гэтакую нечаканасць, як аб'яднаны моцны супраціў. Я меркую, што трэба атрады ваяроў князя Выкінта і князя Ердзівіла зараз накіраваць у Полацк да Таўцівіла. Трэба штоб у Смаленску было шмат разведнікаў, і калі здароўе князя пагоршаецца, трэба штоб аб гэтым хутка папярэджвалі Полацк. Адразу з Полацка аб'еднанное войска накіровываецца ў Віцебск, бліжэй да Смаленска, і штоб пры весткі аб смерці князя Усевалада Мсціслававіча хутка занялі Смаленск. А калі з Віцебска

аб'яднанное войска пойдзе ў Смаленск, то адразу з Нальшан і Крэва чатыры сотні ваяроў князя Даўмонта накіруюцца ў Віцебск, каб дапамагчы ў непрадбачаных акалічнасцях.

Міндоўг устаў, прайшол уперад, назад, а потым дадаў:

— Я падкрэсліваю адну думку, што не галоўнае ўзяць Смаленск, а галоўнае тое штоб ваяры, асабісто полацкія, высвятлілі для сабе, што Таўцівіла трэба меняць. Я жадаю, штоб Полацк запрасіў мяне зменіць князя Таўцівіла. Так, прызначэнне Таўцівіла мая памылка, але я жадаю штоб Полацк дараваў мне гэту памылку і пажадаў ад мяне прапанову іншага князя. Гэта будзе паказальны прыклад для іншых князёў, штоб ведалі, калі я так паступаю з князем самога вялікага княства, то тое самае будзе і з іншымі князямі. Я таму усё так падрабязна табе говару, што ведаю, ты Альгерд, мой сябра і гэтая размова будзе толькі між намі. Таксама таму, што ты Альгерд з іншымі давернымі ваярамі накіруешся ў Віцебск пасля весткі, што здароўе смаленскага князя пагоршаецца. Цябе з пяццю ваярамі трэба пайсці за аб'еднанным войскам і не ўмешывацца ў іх дзеянні, пакуль ты не зразумееш, што іх дзеянні памылковые і трэба дапамога ад атрада князя Даўмонта. Цябе ўсе ведаюць, як маего намесьніка. Усе тваі ўказы, гэта маі ўказы.

Наступным днём, Вялікі князь накіраваў ганцоў да князя Выкінта, князя Ердівіла, а таксама князям у Нальшаны, Полацк і Віцебск. Напярэдадні вясны і новага 6757 лета(1249 па хрысціянскаму календары) да Вялікага князя паступіла вестка, што здароўе смаленскага князя пагоршалася. Адразу Міндоўг накіраваў у Віцебск рыцара Альгерда з адным рыцарам, які раней абучаў ваяроў Полацка, і чатырма збраяносцамі, ў тым ліку, з яго сынам Казімірам.

Праз восем дзён у Воруту прыбыў ганец ад рыцара Альгерда. Ён распавеў Вялікаму князю, што калі смаленскі князь памёр, атрад з ваярамі князёў Таўцівіла, Ердзівіла і Выкінта пайшоў у паход на Смаленск, а рыцар Альгерд са сваімі ваярамі і віцебскім дазорным накіраваліся ім услед. Але не дайдзя да Смаленска, Альгерд сустрэў аб'яднанный атрад без князёў Таўцівіла, Ердзівіла і Выкінта. Полацкі ваявода Ясь распавеў Альгерду, што да Таўцівіла прыбыў ганец з Наваградка, і пасля гэ-

тага князі хутка з двума сваімі ваярамі, і гэтым ганцом уцяклі ў паўднёва-заходні бок. Рыцар Альгерд абвесціў усім ваярам, што князі Таўцівіл, Ердзівіл і Выкінт здраднікі, і накіраваў увесь атрад назад у Полацк.

У Віцебску рыцар Альгерд вярнуў атрад князя Даўмонта назад у нальшанскія зямлі. У Полацку, рыцар Альгерд абвесціў здраднікам Таўцівіла і выгнаў яго сям'ю з княскага церама. Зараз ён з пасаднікам і ваяводам разпазнае ў пасаджанага пад варту цэсця Таўцівіла, зямлеўладальніка Міхася, яго апошніе деянні. Праз тры дні ў Воруту вярнуўся рыцар Альгерд, ён распавеў Міндоўгу:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, на допыце Міхась казаў, што пасля адыхода атрада князя Таўцівіла з Полацка, да яго прыбыў ганец з Наваградка. Ганец распавеў, што Міндоўг адправіў рыцароў за атрадам Таўцівіла, штоб забіць Таўцівіла, Ердзівіла і Выкінта, таму што яны перашкаджаюць яму кіраваць у Вялікім Княстве Літвы. Я яго прасіў апісаць гэтага ганца і распавесці хто яшчэ яго бачыў. Ён распавеў як выглядаў ганец і казаў, што не ведае хто яшчэ яго бачыў. Па яго апісальні, такога ганца ў Наваградку нема. Адзін яго служка, які казаў, што бачыў ганца, апісаў ганца не так, як Міхась, а іншые ў асяродзе зямлеўладальніка ганца не бачылі. Я сумесна з пасаднікам і полацкім ваяводам вырашылі, што Міхась хлусіць і таму трэба трымаць яго пад вартай, пакуль не высвятліцца куды і навошта ўцёк Таўцівіл, і хто быў гэтым ганцом. Таксама вырашылі частку зямлі, бліжэйшай да Полацку, якую забралі падманам пры Таўцівілу ў зямлеўладальніка Лаўрыша, вярнуць яму. Служку Міхася, які хлусіў нам пра ганца, зрабіць падпарадкаваным Лаўрышу. Таксама мы вырашылі, што канчатковае рашэньне прыме Вялікі князь Міндоўг, сумесна з пасаднікам і ваяводам. У княжым цераме я пакінуў рыцара Сымона, які раней навучаў полацкіх ваяроў, а таксама яшчэ аднаго збраяносца. Ім трэба будзе правесьці навучанне полацкіх ваяроў, пакуль не пачаліся палявыя працы.

— Добра, Альгерд. Зразумела, што сваякі накіраваліся да князя Данііла Рамановіча. Добра, што ты арганізаваў навучанне полацкіх ваяроў, гэта падкрэсліць здраду Таўцівіла і магчы-

масьць пагрозы ад гэтага. Галіцка-валынскія князі могуць пагражаць з прычыны звяржэння выбранага князя Таўцівіла, іхняга сваяка. Арда бачыць у гэтым тое, што ў Літвы з крывічамі нема таго яднанне якое было раней. Таму, Альгерд, накіруй ганцоў у крывіцкія княства, ў тым ліку на поўдні, штоб узмоцнілі дазоры далёкія, і пры навінах аб нашэсці ардынцаў, ці русінаў, адразу трэба паліць траву, і хутка накіраваць ганцоў у Воруту. Таксама перадай гандлярам, каб высвятлілі куды ўцяклі князі.

— Вялікі князь Міндоўг, а як быць з князем Полацка?

— Трэба пачакаць. Калі пасаднік не супраць, то няхай абавязкі ваеннага князя выконвае іх ваявода Ясь. На трыццаты дзень вясновага сонцастаяння, да Вялікага князя прыбыў менскі ганец.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, да маего князя Глеба Уладзіміравіча прыбыў ганец з поўдня, і паведаміў, што вялікі ардынскі атрад мінуў чарнігаўскія зямлі і Лоеву гару, каля ракі Дняпро і хутка ідзе на паўночны захад. Усе князі выконваюць твой, Вялікі князь, загад паліць траву. Паўднёвы ганец стаміўся, таму князь Глеб Уладзіміравіч накіроваў мяне ў Воруту.

— Якая колькасць ардынскіх ваяроў?

— Вялікі князь, паўднёвы ганец толькі казаў, што вялікі атрад.

— Добра, заўтра з ранку накіруеш наш атрад у тые мясціны.

Міндоўг адразу накіраваў ганца ў Нальшаны да князя Доўмонта, і іншых ганцоў да паўднёвых княстваў у Слуцк, Капыль, Клечаск, а таксама да князя Доўбуду і ў Жыжмы. У ранку ад Воруты, атрад Міндоўга накіраваўся ў паход насустрач ардынцам. У гэтым атрадзе было дзве сотні наваградскіх ваяроў пад кірованнем ваяводы Вітольда, дзве сотні наваградскіх ваяроў пад кірованем рыцара Ленгвіна, тры сотні ворутскіх ваяроў Міндоўга, і сотня князя Доўбуда з яго і жыжмаскімі ваярамі. У шляху Вялікі князь растлумачыў князю Доўбуду, ваяводзе Вітольду і рыцару Ленгвіну, што поспех бою з ардынцамі будзе залежыць ад паспяховых дзей дазорных, таму з імі ўсе дазорныя якія ёсць у бліжэйшых княствах. Атрад князя Даўмонта ў чатыры сотні ваяроў ужо таксама накіраваўся ў Менск, з ім таксама ўсе яго дазорные. Дазорным трэба будзе знішчыць усіх

шматлікіх, Міндоўг упэўнен у гэтым, ардынскіх дазорных. Таксама ім трэба прадбачыць далейшы шлях ардынцаў, каб нашы ваяры змаглі падрыхтаваць пасткі на поле бою з ардынцамі. Гэта будзе вельмі цяжка зрабіць, таму да іх будуць далучаны ваяры лёгкай конніцы. Ад менскага і суседніх князёў будзе патрыбна не толькі лёгкая конніца, а і пешыя ваяры з доўгімі пікамі, а таксама лучнікі. Аб гэтым Вялікі князь перадаў свайму ганцу, які накіраваўся ў Менск вечарам напярэдадні. Яшчэ ганец узяў з сабой ўзор зборных перашкод для коней, штоб менскія сталяры зрабілі гэтакія. Да Вялікага князя наблізіўся іншы ганец з Менска, і распавеў што ардынскі атрад набліжаецца хутчэй, чым яны разлічывалі, таму што паўднёвыя гарады і замкі Рэчыца і Стрэшын ардынцы абмінулі, не рабуючы іх, а каля паселішча Лешніца яны павярнулі больш на заходні накірунак, чым на Менск, хутчэй за ўсё ў напрамку Крутагорье. Наперадзі іх ідзе разведніцкі атрад у сотню ваяроў. Атрад нальшанского князя Даўмонта яшчэ не падышоў да Менска. Міндоўг адразу ўказаў атраду ісці да Крутогорья. А потым спытаў у ганца:

— Гэтую разведніцкую сотню накіровывае якісьта правадыр?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, мабыць нема такога правадыра, таму што яны два разы апынуліся ў дрыгвяністай мясніцы, каля Злобіна і Бабруйску.

Міндоўг паклікаў рыцара Дзіміна, і ўказаў яму амаль з усімі дазорнымі, і з ганцом хутка накіравацца ў Крутогорье, а адтуль з сотняй коннікаў-лучнікаў ісці насустрэч разведніцкаму атраду ардынцаў. Вялікі князь перадаў з ганцом указ, штоб сотня крутогорскіх вершнікаў дзейнічала па ўказах рыцара Дзіміна, і штоб да Крутогорья накіраваліся іншые атрады суседніх княстваў. У атрада рыцара Дзіміна была перавага ў веданні мясцовасці, але ніколі ад дазорных Дзіміна не патрабавалі знішчать атрад у сотню ваяроў суперніка, тым больш што гэта сотня разведнікаў, найбольш умелых ваяроў з вопытам бітваў з атрадамі большай колькасці, чым яны.

Размясціўшысь на начлег, Міндоўга не пакідала асцярога за вынік сутычкі атрада Дзіміна і разведніцкай сотняй ардынцаў. Нават варажба валхва Воята аб перамозе ў гэтым

паходзе, не супакоіла яго. Вялікі князь вельмі паважаў Дзіміна і разумеў, што гэта заданне найбольш небяспечнае для яго за ўсе паходы.

З ранку да Вялікага князя прыбылі два ганца крутогорскага князя Вінцука. Яны апісалі асабістасці мясцовасці на паўднёвы ўсход ад Крутогорья. Аднаму ганцу Міндоўг указаў падрыхтаваць сухое трысце, галінкі хвойніка, жалезныя ланцугі і драўляные перашкоды для коней, па ўзору, якому яму перадалі ліцвіны. З іншым ганцом атрад Міндоўга накіраваўся да Крутогорья. У шляху ганец распавеў, што атрад рыцара Дзіміна прыбыў у Крутагорье ноччу, тады хутка пазбіралі сотню коннікаў-лучнікаў і з тутэйшым дазорным накіраваліся на паўднёвы ўсход. У Крутагорскага князя яшчэ былі дзве сотні ваяроў, якіх пазбіралі з усіх яго паселішч. Ваяроў цяжкай конніцы ў яго нема. Калі наблізіліся да Крутогорья, Міндоўг убачыў князя Вінцука на кані і каля яго амаль сотня коннікаў, а таксама сотня пешых ваяроў з доўгімі пікамі і з лукамі. Князь Вінцук прапанаваў прымаць бой каля ракі Нецечы, павольнай, нешырокай, але глыбокай.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, справа ад ракі ёсць поле шырыной сто дзевяноста шагоў, далей на паўднёвы ўсход яно больш шырокое. Справа ад поле, лес, але ён цягнецца дзве версты, а потым дрыгвяная мясцовасць каля адной версты, а потым зноў лес.

Міндоўг чуў аб гэтай мясцовасці ад ганца, але ўзнікала пытанне:

— А як накіраваць ардынцаў на гэта поле?

— Вялікі князь, ардынцы выбіраюць шлях толькі па полі між лесамі і дрыгвой. У лесе ёсць толькі вузкіе сцежкі дзеля аднаго вершніка, па двое не працяснуцца. У гэтай мясцовасц іх магчымы шлях толькі па гэтаму полі.

— Князь Вінцук, а ў тваім княстве ёсць ваўкалак і ваўкі?

— Вялікі князь, ваўкалака мабыць нема, а ваўкі ёсць.

— У тваіх далёкіх паўднёва-ўсходніх паселішчах мабыць ёсць зласлівыя сабакі і іх люты важак, трэба накіраваць туды ганца. Калі ардынцы пройдуць іх, яны пасля малога часу, накіравалі б зласлівых сабакаў з лютым важаком ім у след. Калі ў

ардынцаў наперадзі бой, то яны выбудоўваюць сваіх коннікаў поруч, без завадных коней. Завадныя коні застаюцца ззаду, і нам трэба напужаць іх злаславымі сабакамі, каб яны вельмі хутка паскакалі на сваіх вершнікаў і збянтэжылі іх. Таксама накіруй на гэта поле ўсіх сваіх мужчын з лапатамі, сякерамі, і жалезнымі ланцугамі будаваць драўляные перашкоды для коней.

Пакуль крутогорскі князь указваў сваім ганцам, Міндоўг убачыў набліжаюшчыйся атрад у тры сотні ваяроў з Менска. Сярод іх не было цяжкай конніцы, але ў іх былі доўгія дзіды, мечы і лукі. Некаторые з іх трымалі бярвенья таўшчыней з кулак, для драўляных перашкод коням. Іх прывёў менскі ваявода. Усе накіраваліся на полі, дзе мелі намер узяць бой з ардынцамі. Як толькі пачалі будаваць перашкоды для коней, Міндоўг убачыў двух вершнікаў у паўднёва-ўсходнім баку, хутка скачушчых да іх. Вялікаму князю стала трывожна, тым больш, што ў аднім з іх ён распазнаў сына рыцара Дзіміна, дазорнага Будзіміна. Убачыўшы трывогу у вочах Міндоўга, дазорны Будзімін спешна сказаў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, мой тата паранены, але мы знішчылі ўсіх ардынскіх разведнікаў. Мы ўчынілі пастку ў малым лесе, ў якім была шырокая сцежка ў тры коня. Гэты малы лясок не магчыма было мінуць. Ардынцы яро змагаліся, і калі адзін з іх кінуўся на ўцёк, то мой тата паскакаў у пагоню, а я за ім. Ардынец якто развярнуў сваё плячо і стрэліў з лука. Стрэла трапіла ў твар таты, каля носа. Астатніх ардынцаў мы забілі. Яны палову нашых забілі і паранілі стрэламі, і таксама палову ваяроў з Крутогорья. Зараз усё з забітымі і параненымі вяртаюцца сюды. Мы толькі ардынскіх коней забралі з сабой, а даспехі, мечы і лукі засталіся з забітымі ардынцамі. Мабыць хутка будуць тут.

І сапраўды яны ўбачылі далёка па полі коннікаў і коней без коннікаў. Пакуль яны збліжаліся, ва ўсю шырыню поля працавалі ваяры і жыхары Крутогорья. Пасярэдзіне вырылі яму, шырынёй восем шагоў, даўжынёй пяць шагоў, а глыбіна у рост ваяра. Уваткнулі завостраныя калы, а зверху ўсталявалі жэрдкі на якіх шчыльна абклалі галінкі хвойніка. Побач з ямай ўсталявалі з абодвух бакоў драўляные перашкоды для коней, а за імі

імітываные ямы па краях якіх быў насыпаны пясок, як бы з ям. Імітваныя ямы былі са шчыльна пакладзеных галін хвойніка, з пад якога трошкі тырчалі вострые канцы калоў, нахіленых у бок наступаючых. З боку абараняючых па ім магчыма без асцярогі скакаць. За імітыванымі ямамі зноў былі ўсталяваны драўляные перашкоды коням.

У драўляных перашкодах трэцьега раду былі шчыльна прымацаваныя высокія дошкі, адразу за якімі магчыма была размяшчаць ліцвінскіх коннікаў, не асцярагаючыся ардынскіх стрэл.

З правага баку поля драўляные перашкоды былі ўсталяваны ўсытыч з лесам, а з левага баку перашкоды заканчваліся за дваццаць шагоў да ракі. У гэтым месцы рака паварочваецца і там дрыгва. А перад дрыгвой на узвышшы, Міндоўг размясціў трыццаць ваяроў легкай конніцы з доўгімі дзідамі і лукамі.

Менскія ваяры пакінулі доўгія дзіды і бярвенья, і па ўказу Вялікага князя накіраваліся ў таемны абыход ракі злева ў тыл ардынскага атрада. Крутагорскія ваяры без коней, але з лукамі і доўгімі дзідамі занялі вельмі гушчыны лес. Усіх уразіла колькасць забітых і параненых дазорных і ваяроў. Дзімін трымаўся на кані, але гаварыць не мог. Яго твар быў перавязаны да вачэй, з пад тканіны тырчала акрайчык спляснелага хлеба. Ён паказаў рукой на паўднёвы ўсход, а потым стаў хутка кружыць рукой. Будзімін растлумачыў:

— Вялікі князь, тата слухаў зямлю, і па ёй ардынцы хутка накіровываюцца сюды.

— Будзімін, у іх малая адлегласць атрада разведнікаў ад атрада ваяроў?

— Вялікі князь, атрад разведнікаў кожныя чатыры версты даганяюць два дазорных, а два былыя разведнікі адстаюць і чакаюць атрад ваяроў. Я меркую, што адлегласць між імі вёрст сем.

Непакоінасць Міндоўга паменшылась, калі ён нарэшце ўбачыў атрад князя Даўмонта ў чатыры сотні вершнікаў. Адну сотню коннікаў-лучнікаў Даўмонта сумесна з крутогорскімі ваярамі, размясцілі за ракой. Ведаючы, што нізкарослыя і шырокацелыя коні ардынцаў добра плаваюць, Міндоўг указаў у тых

месцах, дзе магчыма коню выйсці з вады на бераг, усталяваць перагародку з жалезных ланцугоў на паверхні вады. Уздоўж процілеглага берага за кустамі і за драўлянымі шчытамі размясціліся лучнікі, ў якіх таксама былі доўгія дзіды. Па ўказу Вялікага князя, на сорак шагоў перад лініяй ям і перашкод для коней, паклалі сухія трысьце з хвойнікам наверсе. Па задумцы Міндоўга, калі ардынцы наблізяцца, вершнік з конскімі даспехамі і з факелам, запаліць трысце, па ўсей лініяй перашкод. Гэта трэба зрабіць не раней, чым пярэднія вершнікі ардынцаў убачаць асабістасці лініі перашкод, у тым ліку імітываных ям, палічыў іх сапраўднымі.

Дымавая заслона хутка праясніцца і ардынцы, не спыняючы сваёй хуткасці павінны накіравацца на левы бок поля, дзе на ўзвышша будуць знаходзіцца трыдцать коннікаў, а за ўзвышшам знаходзіцца дрыгва. Таксама ардынцы накіруюцца ў сярэдзіну поля, дзе схавана яма, а за ёй будуць ліцьвінскія коннікі. Галоўнае ў гэтай задумцы тое, штоб ардынцы ўбачыўшы, як ліцьвіны схаваліся за шчытамі прыстасаваных на конскіх перашкодах, не стрэлялі з лука. Вялікаму князю трэба было наблізіцца да ардынцаў целымі ваярамі, а ў сутычках на мечах Міндоўг быў упэўнен у перамозе ліцвінаў.

Яшчэ ардынцы не з'явіліся, а па гуку ад зямлі ўсе зразумелі, што яны набліжаюцца і іх шмат. Міндоўг убачыў, як лучнікі схаваныя ў лесе, пачалі стрэляць у ардынцаў. Частка ардынцаў спрабавала накіравацца ў мясцовасць, дзе заканчвацца лес, штоб абысці яго, але там пачыналася дрыгва, там у іх учынілася замяшанне. З лесу ўсё больш было стрэлаў ў ардынцаў. Малая частка ардынцаў стрэліла ў лес, але большая не спынялася імкнуцца наперад. Калі Вялікі князь убачыў у пярэдніх коннікаў цалкам коней ардынцаў, ён падаў знак ваяру з факелам, і той запаліў трысце. Міндоўг ведаў, што ардынцы з вузкімі вачымі бачаць далей, чым еўрапейскія людзі, таму ён быў упэўнен што ардынцы разглядзелі асабістасці перашкод для коней.

Што далей будзе, і што трэба далей рабіць, Вялікі князь растлумачыў кожнаму сотніку загадзя, і таму цяпер ён прыслухоўваўся да таго, што адбываецца за дымавой заслонай. Ён учуў, што ардынцаў, мабыць не здзівіла дымавая заслона, і яны з гэ-

такай хуткасьцю працягвалі зблiжацца да iх. Мабыць яго надзея, што з тылу ардынцаў на завадных коней нападуць зласлiвыя сабакi падцвердзiлася. Ардынцы наскочылi раней, чым дымавая заслона праяснiлася. Усе чакаюшчыя iх лiцьвiны сустрэлi ардынцаў доўгiмi дзiдамi, а потым узялiся за мечы. На хуткiм скаку пярэднiя ардынцы трапiлi ў яму, i каля яе ўтварылася замяшанне з павалiвшымся конямi i вершнiкамi. У левым баку поля трыццаць лiцьвiнаў хутка перакiнулiся за драўляные перашкоды, а ардынцы на скаку трапiлi ў дрыгву i там таксама ўтварылася замяшанне з павалiўшымся конямi i вершнiкамi.

Частка ардынцаў кiнулася ў раку, алё з берага па iм стрэлiлi крутогорскiе ваяры i ваяры Даўмонта. Калi ардынскiя конi наляцелi на драўляные перашкоды i павалiлiся, то лiцьвiнскiя вершнiкi хутка пачалi сваю бязлiтасную знiшчальную справу. Вялiкi князь Мiндоўг, князь Даўмонт, князь Доўбуд, рыцары i сотнiкi былi тымi, хто рабiлi калiдоры ў ардынскага войска. Лiцвiнскiя конi былi вышэй i моцней за ардынскiх, таму лiцвiнам было зручна знiшчаць супернiкаў. Ардынскае войска, ўзятае ў акружэнне з усiх бакоў, акрамя як з баку ракi, ўпарта супрацьстаяла, але нарэшце не вытрымала i кiнулася на уцёк. У Мiндоўга ужо не было сiл iмкнуцца ў пагоню, таму ён застаўся на гэтым полi, залiтым крывёй забiтых i параненых. Ён ведаў, што лiцвiны кiнуцца ў пагоню, i будуць iмкнуцца знiшчаць усiх ардынцаў. Неўзабаве, да Вялiкага князя наблiзiўся князь Вiнцук з ваярамi.

— Вялiкi князь Лiтвы Мiндоўг, маi ваяры паланiлi ардынскага правадніка, цi тлумача, ён крычаў на нашай гаворцы. Мiндоўг паглядзеў на палоннага, але ён так стамiўся, што ў яго не было жаданне яго распытывать.

— Аховывайце яго пiльна, я распытваць буду пазней.

— Вялiкi князь, ен крычаў, што ардынскiм атрадам кiруе Кайдан, цi Кадан, неяк так.

— Добра, князь Вiнцук. Зараз трэба дапамагчы нашым параненым.

— Вялiкi князь, зараз дапаможам параненым. А цябе, Вялiкi князь, i князёў Даўмонта i Доўбуда я запрашаю да сабе на вячэру.

— Дзякую, князь Вiнцук. Але трэба дачакацца ўсiх ваяроў, якiя кiнулiся ў пагоню, таму лепей штоб на начлег мы размяс-

цілісь ў палове вёрсты на поўнач. Яшчэ трэба падрыхтаваць усіх нашых забітых, штоб з ранку мы накіраваліся да сабе. Князь Вінцук, нам трэба сена дзеля коней ардынцаў, якіх возьмем з сабой. Ардынскіх коней вельмі шмат, большасць застанецца з табой.

Міндоўгу спадабаўся князь Вінцук, яго меньш цікавіла размяркаванне здабычы, чым тое, як ён хоча выказаць удзячнасць Вялікаму князю за перамогу над ардынцамі. Амаль усе дарослые жыхары Крутагорья дапамагалі ліцвінам выконваць усе загады Міндоўга. Нават падлеткі займаліся ардынскімі конямі. Вялікаму князю, а таксама князям Даўмонту і Доўбуду, рыцарам і сотнікам усталявалі на ноч шатры.

На вячэру крутагорцы забілі шмат хатніх жывел. Пасля поўначы вярнуліся коннікі, якія былі ў пагоні. Сотнік князя Даўмонта, які ўзначаліў пагоню, распавеў што ад вялікага войска ардынцаў застаўся малы атрад.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, мы б іх дагналі, але нашы коні стаміліcь, а іх не. Ардынцы ўцякалі з вялікай хуткасцю. Іх ваявода нават згубіў сваю нагайку. Вось яна.

— Добра. Мне не трэба, гэта твая здабыча.

З ранку адпраўляючыся ў Літву, Міндоўг успомніў палоннага правадыра ардынцаў. Штосці ў яго абліччы паказалася яму знаёмым.Вялікі князь загадаў прывесці правадыра да сабе. Убачыўшы яго, Міндоўг успомніў рысы твара гандляра Чорнавіла і ужо не сумневаўся, што перад ім Сенгайла, малодшы сын былога нальшанского князя Ердзівіла і ўнука Чорнавіла.

— Дык вось хто апынуйся здраднікам, Сенгайла! Ты ганьбуеш імя сваего дзеда. Маўчыш! Прыбудзем у Воруту, аддам цябе кавалю Фролу, ў яго загаворыш. Казіміра да мяне!

Сенгайла маўчаў, толькі з ненавісцю паглядаў на Міндоўга. Калі збраяносец Казімір зблізіўся да Міндоўга, той яму загадаў хутка накіравацца ў паселішча Берасцы і ўсё выведаць пра былога нальшанского князя Ердзівіла і яго сына Сенгайло, а потым хутка скакаць у Воруту і адтуль са сваім татам Альгердам накіравацца на сустрэч атрада Вялікага князя. У Міндоўга ўзнікла падазронасць, што Сенгайла і ёсць той ганец, які прыбыў да Таўцівіла ад яго цесця. Вялікаму князю трэба было до Воруты

высвятліць гэта ў рыцара Альгерда, і штобы не распаўсюджваць вестку пра здраду ўнука гандляра Чорнавіла ў Наваградку і ў Воруце, цішком забіць Сенгайла.

Усе ліцвінскія сотні мелі шмат загіблых і параненых. Асабліва Міндоўг перажываў за вялікую страту дазорных. Рыцар Дзімін шмат часу навучаў іх, а цяпер трэба збіраць новы гурт вучней дазорных, а ён не можа размаўляць. Вялікі князь выклікаў да сабе сына Дзіміна, дазорнага Будзіміна. З размовы з ім, Міндоўг зразумеў, што Будзімін не зможа замяніць тату. Таксама Будзімін паведаміў Вялікаму князю, што ў таты хоць і спынен крывацек, але шмат зубоў нема і разарваная частка твару. Ён можа толькі піць. Міндоўг накіраваў ганца ў Наваградак, штоб знайшлі лепшую знахарку, і штоб яна чакала іх у Воруце.

Атрад Міндоўга са шматлікавымі параненымі і загіблымі прасоўвался марудна. Каля ракі Рута, рыцар Альгерд і яго сын Казімір сустрэлі Вялікага князя. Казімір распавеў, што жонка Ердзівіла памерла неузабаве, як іх выслалі з Нальшан у паселішчэ Берасцы. Лётась памёр Ердзівіл. Зараз у Берасцы нікога з родзічаў Сенгайла нема, а сам ён знік адтуль ужо дзён сорак таму. Рыцар Альгерд убачыўшы Сенгайла, пацвярджаў Міндоўгу, што гэтакім апісваў ганца цесць Таўцівіла. Вялікі князь загадаў забіць Сенгайла каля паселішча Берасцы і там яго пахаваць.

Адразу па прыбыцці у Воруту, да Дзіміна накіравалі знахарак. Міндоўг адправіў ганца ў Полацк з загадам вызваліць з вязніцы цесця Таўцівіла. Абмерковывая гэты паход ардынцаў, Міндоўг быў упэўнен, што ардынцы накіроваліся ў Літву, дзеля знішчэння Вялікага князя.

— Увесь іх шлях сведчыць аб гэтым. Тое што яны накіровываясь на паўночны захад і набліжаючыся да Менска, ўхіліліся ад гэтага горада больш на захад, пацвярджае што ім патрэбен толькі Вялікі князь. Цяжка дагадвацца што казаў ардынцам Сенгайла, але яны паверылі яму, што калі яны заб’юць мяне і дадуць ярлык Сенгайла, то Літва будзе плаціць даніну Ардзе. У нас нема хрысціянства, таму гэта не магчыма. Крутогорскій князь і менскі ваявода, нягледзячы на вялікіе сваі страты, былі згодны ўсе даспехі, зброю і коней ардынцаў аддаць нам. Крывіцкія князі ведаюць, што іх людзі пойдуць на ўсё ледзь бы не

было ардынцаў. Памятаеш, што полацкія рамеснікі зараз згодны з лацінскім хрысціянствам, толькі б не было ардынцаў?

— Памятаю, Вялікі князь Міндоўг. Я думаю, што Сенгайла ўгаворваючы ардынцаў на паход, казаў што ў Наваградку ёсць хрысціянская царква, і што шматбожца Міндоўг не задавальняя хрысціянаў. Таксама думаю, што ардынцы разлічывалі, знішчыў цябе, паставіць Сенгайло, і парушыць упэўненасць у адзінства Літвы.

— Мабыць і так. А на што разлічываў Сенгайла? Як толькі ардынцы пакінулі б Літву, то Сенгайла і двух дзён не пражыў бы.

— Я думаю, што ён ні на што не разлічываў. Калі яго тата памёр і ў яго не засталася ні воднага родзіча, ў яго была толькі помста. Як у прусаў, кроўная помста.

— Так, згодзен.

Вярнуўшыся ганец з Полацка, распавеў што ў Смаленску князем стаў Глеб Расціслававіч, сын Расціслава Мсціслававіча, з кіеўскай дынастыі. Памерлы смаленскі князь Усевалад Мсціслававіч быў яго траюрадны дзядзька. Полацкі пасаднік і ваявода віншуюць Вялікага князя Літвы Міндоўга з перамогай над ардынцамі пад Крутогорьем. Неўзабаве прыбыў ганец з Крутагорья. Ён перадаў Вялікаму князю падарунак ад князя Вінцука, скураны пояс з арнаментным цесненнем і сярэбранай спражкай. Ганец сказаў, што ў гонар перамогі над ардынцамі, горад Крутагор'е пераімяновалі ў Койданава (сучасная назва Дзяржынск). Вярнуўшыся з поўдня гандляр Міхалок, распавёў што ў валынскіх зямлях бачыў наваградскага прапаведніка. Таксама там ён чуў, што ліцвінскія князі, ўцекшыя з Літвы, дамоўляліся з князем Даніілам Рамановічам напасць на літоўскія зямлі. А пра дамоўленнасці Данііла Раманавіча з лацінскімі хрысціянамі не было чутак.

Міндоўг адразу накіраваў свайго ганца да князя Данііла Рамановіча, штоб ён не дапамагаў уцекшым з Літвы князям. Ганец вярнуўся ад князя Данііла Раманавіча без княскага адказа.

— Ганец Песціла, што ён наогул нічога не казаў?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, ён сказаў мне, штоб я вяртаўся ў Літву.

Адразу як ганец пакінуў іх, Альгерд спытаў.

— Вялікі князь Міндоўг, чаго трэба чакаць нам?

— Альгерд, адсутнасць вестак аб дамоўленнасці Данііла Раманавіча з лацінскімі хрысціянамі, сведчыць што хтосьці з іх патрабуе больш, чым іншы бок можа ажыццявіць. Таму зараз найбольш уплывовые на Данііла Раманавіча ардынцы. Я меркую, што яны патрабуяць ад яго паходу на нас. Ён асцярогаецца ардынцаў, таму ён будзе прымушаны пайсці на нас паходам. Мы заўсёды яму дапамагалі, няхай за гэту дапамогу трэба было плаціць, але ён заўсёды ведаў, што мы прыйдзем яму на дапамогу. Наша дапамога паспрыяла ягонаму ўзмоцненню і ўплывовасці сярод русін, і не толькі. Таму мяне вельмі здзівіла, што маёго ганца ён адправіў без сваего адказу. Я ведаю, што маіх ганцоў ён слухае сам-насам. Каліб я быў бы на ягоным месцы, я б казаў ганцу, што я пайду на тры ліцвінскіх гарады, спалю некалькі хат і ўвяду з сабой некалькі хатніх жывёл, штоб паведаміць ардынцам аб паходзе.

— Але, ён так не паступіў, і гэта азначае што трэба рыхтавацца да горшага.

— Так, магчыма ён паступіць не па сяброўску. На жаль лекаванне Дзіміна затрымліваецца, а дазорных не хапае. Табе Альгерд, вымушан сказаць, што я зрабіў памылку, ўзяўшы ў паход на ардынцаў вельмі шмат дазорных. Трэба было замест паловы дазорных узяць вояроў з лепшымі лучнікамі. Я асьцярагаўся, што калі адзін дазорны не заўважыць штосьці важнае, то другі, ці трэці заўважыць.

— Міндоўг, то мінула, а што трэба рабіць зараз?

— Зараз трэба навучаць новых дазорных. Таксама трэба меркаваць, як абараняцца з розных накірунках.

## ГЛАВА 18
## ЦЯЖКІЯ ЧАСЫ

Перад Калядамі, князёўна Марта нарадзіла хлопчыка, яго назвалі Рукля. Хлопчык рос здаровым і жвавым. Нарадзіўшы нашчадка Вялікага князя Літвы, Марта адчула ў сабе гонар і

ўплывовасць. Яна стала цікавіцца адносінамі з іншымі князямі, і не толькі ліцвінскімі. Спачатку Вялікі князь ветліва растлумачыў ёй аб гэтых адносінах, а потым яму такія размовы надакучылі і ен абвесціў ёй, што гэта не жаночые справы, яны вельмі таемны і гэта ён абмяркоўвае толькі з рыцарам Альгердам.

— Так было, і так будзе далей. Нашчадак Вялікага князя не абявязкова будзе наступным Вялікім князем. Князя і Вялікага князя выбіраюць па яго заслугам і здольнасцям. Штоб Рукля ў будучыні стаў Вялікім князем, трэба выхоўвываць ў яго рысы характару сапраўднага князя, мужнага і разумнага ваяра. Зараз трэба штоб ён і далей быў здаровым і жвавым. Таксама трэба яму брата, штоб ён клопаціўся аб малодшым, у будучыні яму гэта дапаможа клопаціцца аб сваіх падначаленых.

На трэцій дзень вясны і новага 6758 лета (1250 па хрысціянскім календары), Марта паведаміла Міндоўгу, што яна цяжарная.

Праз дваццаць дзён да Міндоўга прыбыў ганец ад князя Эйсманта. Ён распавёў, што ў адасобных яцвягах аб'явіўся важны ваяр з ганцом паўднёвага адасобнага князя яцвягаў Яшчэлта, які раней хадзіў паходам на яцвягаў сумесна з валынцамі.

Гэты важны ваяр прапанаваў іншым адасобным яцвяжскім князям, напасць на ліцвінскія паселішча і гарады Міндоўга. За гэта ён даваў багатыя дары. Князь Эйсмант ліча, што па вопісу важны ваяр падобен князю Выкінту. Княства Ігелда адмовілася ад гэтай прапанавы.

— Дзякуй князю Эйсманту і табе за гэту вестку. Заўтра з раніцы, я табе перадам маё рашэнне. Не паспелі Вялікі князь і рыцар абмеркаваць гэту навіну, як паведамілі што прыбыў ганец з Капыля.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, памёр Вялікі хан Арды Гуюк. Зараз у Ардзе рэгентшай яго ўдава Огул-Гайміш.

Як толькі ганец Каліст пакінуў іх, Міндоўг адразу сказаў:

— Зараз хану Бату не да нас. Усе яго думкі аб новым Вялікім хане. Таму для Арды, князю Даніілу Рамановічу будзе дастаткова штосьці папаліць у нас і прывесьці да сабе нашых хатніх жывел. На сапраўдную цяжкую вайну з намі, ён сваімі ваярамі не будзе рызыковать.

— Вялікі князь, але ардынскі ваявода Кайдан будзе патрабаваць помсты.

— Не, ваявода Кайдан будзе адчуваць сабе падманутым засланым ліцвінам, заведшым іх атрад у пастку.

З ранку Міндоўг растлумачыў ганцу, што князю Эйсманту трэба абараняцца ў сваім замку, калі нападуць на іх. Трэба ашчаджаць сваіх ваяроў і не дапамогаць іншым. Дапамогі ад іншых не чакаць. Падрыхтаваць пасткі перад замкам і шмат стрэл. З такімі наказамі ён таксама паслаў ганцоў у Гародню, Слонім, Ваўкавыск, Клечаск, Капыль і Здзітаў. Ганцу ў Ваўкавыск ён таксама прапанаваў тое, што калі ворагі размешчацца на начлег, штоб іх ваўкалак прывеў ваўкоў, і це знішчалі коней ворагоў.

У вечары, калі гулялі ў шахі, рыцар Альгерд спытаў:

— Міндоўг, а калі Данііл Рамановіч, акрамя яцвягаў прывядзе ў нашы зямлі яшчэ полаўцаў і крыжакоў, тады ты пераканаешся, што ён жадае забіць цябе і паставіць Вялікім князем падпарадкаванага яму князя?

— Тады буду ўпэўнен, што ён гэтага пажадаў. Я вырашыў, што ён нічога не сказаў маёму ганцу, таму што па выразу твара, вышадшага ад князя Песціла, магчыма было здагадацца аб чым была размова. А ардынскіх выведнікаў у Данііла Раманавіча шмат, у першаю чаргу гэта хрысціянскія фанатыкі, навучаныя прапаведнікамі. Але неадкладна трэба зноў паслаць у Рыгу на торжышчэ Кодруна і Міколу, за чуткамі пра намер лівонцев.

З ранку наступнага дня, Кодрун і Мікола накіраваліся на торжышчэ ў Рыгу. Па загаду Вялікага князя, рыцар Дзімін і яго сын Будзімін згуртавалі дваццаць два вучня дазорных, з Наваградка, Доўбуды і ворутского княства. Дзімін яшчэ з цяжкасцямі вымаўляў, таму яму дапамогаў Будзімін. Неўзабаве прыбыў ганец з Здітава. Ён распавёў, што ваяры Данііла Раманавіча з яцвягамі напалі на зямлі здзітоўскага князя, спалілі адно паселішча, сагналі адтуль усіх хатніх жывел і павярнулі да сабе ў валынскія зямлі. Да замка Здзітава наблізіліся, але яго не штурмавалі.

Праз два дні прыбыў ганец з Слоніма. Ён распавеў, што калі валынскія русіны з яцвягамі наблізіліся да замка, то князь Вілікаіл указаў лучнікам стрэліць у іх. Русіны адышлі ад зам-

ка і накіраваліся на поўдзень, дзе паграбілі паселішча, а потым спалілі яго. На наступны дзень прыбыў ганец з Ваўкавыска.

— Вялікі князь Міндоўг, замак Ваўкавыск узялі ў аблогу валынцы з яцвягамі, частка іх апынулася ў пасткі перад замкам, частка была знішчаная нашымі лучнікамі. Аблогу не знімалі ноччу. Тады князь Глеб накіраваў аднаго ваяра да ваўкалака і той прывеў ваўкоў, якія спачатку вылі вакол іх стану, а калі іх коні збянтэжыліся, то нападалі на іх. У русінаў пачалася замяшанне ад іх вогнішчах запаліліся бліжэйшые дрэвы. А потым было вялікае зарава, пагарэла частка лесу да дрыгвы. Іх атрад накіраваўся на паўднёвы захад. Учора ўведамілі князя, што русіны паграбілі наша паселішча і забралі ўсіх хатніх жывел.

Міндоўг з кожным з гэтых ганцоў адправіў па два цесляра дзеля дапамогі ў будаўніцтве новых дамоў. Стала вядома, што на іншых русіны не нападалі. Вялікі князь задумаў атрадам у адну сотню ваяроў знішчыць здрадніка паўднёвага яцвяжскага князя Яшчэлта. Але ад гэтага прышлося адмовіцца, калі нарэшце прыбылі Кодрун і Мікола. Іх весткі былі нечаканыя і непрыемныя. У Рызе Мікола ўбачыў Тайцівіла, які праз кароткі час ахрысціўся там па лацінскаму абраду. Лівонцы пачалі рыхтавацца дзеля нападу на Літву. У Лівонскага ордэна новы магістр Андрэас фон Шцірлянд. Для Вялікага князя стала відавочна, што для Літвы надыходзяць вельмі цяжкіе часы.

Ён вырашыў накіраваць да магістра Лівонскага ордэна рыцара Альгерда з яго сынам збраяносцам Казімірам. Трэба было Альгерду дамовіцца з магістрам аб мірным пагадненні. Дзеля гэтага Альгерд браў з сабой шмат дарагіх падарункаў. Альгерд па паходжанню саксонец, добра ведаў гэтую гаворку, таксама ён добра ведаў Міндоўга і адчуў ад яго наколькі важная гэта дамова. Вялікі князь быў упэўнен, што толькі Альгерд можа дамовіцца з магістрам Лівонскага ордэна, і выратуе яго і Літву. Але раніцай перад адпраўленнем у Лівонію, па ўказу Міндоўга, волхв Воят правел варажбу на вынік гэтага паходу. Прадвесце паходу было станоўчым, але Вялікі князь прымеціл, што калі конь Альгерда выбіраў якой нагой пачаць пераступаць гарызантальнае дзіды, то конь замарудзіўся. Мабыць перамовы будуць з вялікімі цяжкасцямі. Чаканне не станоўчае пачуццё і Мін-

доўг імкнуўся як мага больш працаваць, штоб чаканне Альгерда з Лівоніі меньш яго кранала. Больш увагі ўдзяляў гульням з сынамі. Міндоўг ужо даўно паслаў ганцоў у паўночныя паселішча і княства ліцвінаў з наказам, штоб рыхтаваліся да нападу рыцароў з поўначы. Прыбыўшы з гандлярскага падарожжа Волімунт казаў, што лацінскія хрысціяне рыхтуюцца да нападу на Лютву. Нарэшце рыцар Альгерд з сынам вярнуліся ў Воруту. Па выяўленню твара Альгерда, Міндоўг не змог здагадацца аб выніку яго сустрэчы з лівонцамі.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, магістр Андрэас фон Шцірлянд быў настроены вельмі ваяўніча да Вялікага князя Лютвы. Але калі я распавеў, што твой атрад знішчыў вялікае ардынскае войска пад Крутогорьем, якое мэтанакіравана імкнулася забіць Вялікага князя Літвы ў яго замку, абыходзя іншыя багатыя гарады, ён супакоілся і задумаўся. Мабыць ён не ведаў аб гэтым змаганні. Магістр загадаў сваім рыцарам-брацьям выведаць пра гэта. Ён прапанаваў павячэраць з ім, а потым згуляць у шахі. Гуляючы ў шахі, я дамогся, што маі сланы абстралівалі сумежныя дыяганалі перад яго каралем. Становішчэ было такое, што праз тры хады я перамагаю, тады я наўмысна зрабіў дрэнны ход, і ен прыкрыў бліжэйшэйшую да яго караля діогональ сваім канём. Становішчэ выраўнілось, і праз два хады я прапанаваў нічыю, з чым ён пагадзіўся. Наступным днём яму падцвердзілі пра нашу перамогу над ардынцамі і ён выклікаў мяне, пачаліся перамовы. На ўсе маі дары ён не звярнуў вялікай ўвагі, першае што ён патрабаваў так тое, штоб ты са сваімі ваяводамі ахрысціўся па лацінскаму абраду. Па-другое, штоб у Лютве была заснавана епархія лацінскага хрысціянства. Па-трэцьяму, частку нашых зямель перадаць Лівонскаму ордэну. Я на ўсе гэтыя патрабаванні згодзіўся. Па зямлях я ўдакладніў, што гэта будуць зямлі жамойтаў, якія прымыкаюць да зямель Лівонскага ордэна. Таксама я дамовіўся, што Рымская Царква каронуе цябе каралем Лютвы, а Марту каралевай. Убачыўшы, што ў Міндоўга не з’мяніўся нездаволены твар, Альгерд дадаў:

— Міндоўг, перад пачаткам перамоваў я доўга размеркаваў, што магістр патрабуе і на што магчыма згодзіцца. Першыя два патрабаванні былі абавязковыя таму я доўга меркаваў над



імі, і прыйшол да высновы, што давер да цябе ў наваградскім і воруцкім княствах такі, што ўсе жыхары добра зразумеяць гэту дамову. Яны ведаюць, што ты сілком не будзеш прымушаць іх да гэтага хрысціянства. Пры князі Ізяславе таксама нікога не прымушалі. У ваяводаў і сотнікаў давер да цябе самы поўны. Магістр напісаў на пергамене пасланне да Рымскага Папы, дзе пералічаны нашы дамоўленасці з яго пячаткай. У канцы я дапісаў ад твайго імя, што ты запрашаеш дазволу ў Папы Рымскага Інакенція Чацвёртага прыняць цябе ў лона рымскай Царквы. Трэба падпісаць і пацвярдзіць гэта сваёй пячаткай, і неадкладна пераслаць гэты пергамен са сваім паслом і суправаждальным рыцарам магістра ў Рым. Усі падрыхтоўкі да нападу на Лютву яны адкладаюць.

— Добра, я аб гэтым падумаю, а ты ўкажы зрабіць маю пячатку. На пячатке ў вершніка ў правой руке меч, а в левой руке шчыт з шэсціканечным крыжам Еўфрасініі Полацкой, ўнучке полацкого князя Всеслава Брячыславовіча.

Міндоўга здівіў талант пасла ў Альгерда. Ён ў размове з нім, чуць не прымусіў яго абараняць ад яго жа Міндоўга высновы. Вялікі князь перакананаўся, што Альгерд зрабіў усё магчымае, і

нарэшце будучыня высвятлілась. Праз два дні прынеслі пячатку, і Міндоўг падпісаў пергамен, пацвярдзіў яго сваей пячаткой, і накіраваў гандляра Волімунта і сына Альгерда збраяносца Казіміра к магістру Лівонского ордэна. А яшчэ праз тры дні, напярэдадні Каляд, Марта нарадзіла хлопчыка якога назвалі Рупенем.



Замкавую царкву, пакінуўшую прапаведнікам пачалі прыбіраць, дзеля правядзення хрышчэння Міндоўга, Марты і часткі яго ваяров. Не ўсе жыхары Наваградка гэту навіну ўспрымалі без спрэчак, але праз недоўгі час гэтакіх заставалась усё меньш і меньш. Праз дваццаць дзён вярнуўся сын Альгерда збраяносец Казімір. З нім прыбылі магістр Лівонскага ордэна Андреас фон Шцірлянд з дванаццацю ордэнскімі рыцарамі-брацьямі, а таксама епіскап Кульмскі з прапаведнікамі. З раніцы наступного дня ў замкавай царквы Наваградка Міндоўг, Марта і яго дванаццаць бліжэйшых ваяров ахрышчыліс па лацінскому абраду.

У вечере, ў Вялікім замку Наваградка адбылась урачыстая вячэра, пасля якой Міндоўг і магістр адасобіліс. Гуляя ў шахі, яны таемна, але ўважліва наглядалі адзін за другім. Першую партыю Міндоўг выгуляў, а другую наўмысна праіграў, каб не раздражняць магістра, для якога шахі былі не толькі гульня.

Наглядая за нім, Міндоўг прыйшоў да думкі, што ён з дзяцінства прызвычаен да падлашчвання яму. Мабыць ён быў у сваего заможнага, багатага таты адзіным сынам, і ўсе слугі паслухмяна выконвалі яго капрызы. Яму не патрэбна было выконваць цяжкіе трэніроўкі ваяра. Достаткова было зрабіць незадаволены твар і ўсі тваі жаданні хутка выконваюцца. У дарослым узросце яму знайшлі наілепшае месца ў жыцці дзеля яго характара. Трэба было толькі купіць вялікі сан лацінскага прапаведніка і ўжо моцные рыцары-фанатыкі хрысціянства па-

корліва выконваюць твае загады. Зараз ён задаволен сабой. Ён такі важны, што ад аднаго яго пагражальнага выгляда шматбожцы ліцвіны, якіе раней неаднаразова знішчалі лівонскіх рыцароў, зараз рады выконваць усі яго патрабаванні. Рымскі Папа Інакенцій Чацвёртый павінен быць вельмі задаволен магістром Андреасом фон Шцірляндом.

Уважліва наглядая за магістром, Міндоўг пераканаўся што ён думае толькі аб сваей карысці. Яму не магчыма паставіць сябе на месцы ліцвіна, і таму не магчыма зразумець, што Літва вымушана пайсці на гэтые патрабаванні толькі таму, што апынулась у дрэнных абставінах. Цяпер яму Міндоўгу, любяшчаму сыну, атручанай хрысціянскім прапаведнікам маці, трэба быць ахрышчаным гэтымі прапаведнікамі. Для Альгерда быць ахрышчаным, гэта толькі прайсці ўмоўны неразумны абрад, а для мяне гэта здрадзіць памяці любай маці. Але дзеля захаванне жыцця і дабрабыта ліцвінаў, Вялікі князь Літвы Міндоўг вытрымае гэту абразу. Ён нават ранкам наступнага дня суправодзіць з дванаццацью ваярамі світу магістра Андреаса фон Шцірлянда і епіскопа Кульмскога з прапаведнікамі шляхом у дзесяць вёрст.

Вярнуўшысь у Наваградак, Міндоўг мел непрыемную размову з Войшелком. Дваццаці семі летні сын патрабаваў тлумачэнне за змену погляду на хрысціянства. Яшчэ до таго, як Міндоўг ажаніўся на Марце, ён паселіў Войшелка з яго сястрой ў Вялікім Замку Наваградка. Аб іх там клопаціліс як о нашчадках князя. Войшелка гэта задавольняло пакуль яго сябра наваградскі прапаведнік не знік.

— Войшелк, я не зменіў свой погляд на хрысціянство. Я вымушан быў ахрысціцца таму, што яны напалі бы на нас і шмат каго, і чаго знішчылі бы. Гэта мая таемнасць. Я яе цябе аб гэтым тлумачу, таму што ты мой сын. Я спадзяюсь, што ты мне не здрадзіш, і не распавядзеш маі словы каму-небудзь іншаму, у тым ліку тваему прапаведніку.

— Не распавяду. Ён раптам знік. Я не ведаю куды.

— Ён уцёк да волынцев, і це пайшлі паходом на нашы замкі і паселішча. Шмат паселішч знішчылі і забілі іх жыхароў. Волынцы з здраднікам Таўцівілам умовілі лівонцаў напасть на нас, таму я прымушан быў ахрысціцца.

— А дзе зараз маліцца хрысціянам узходняга абрада?

— Войшелк, пачакай, калі наше становішчэ палепшыцца, тады я дам табе срэбра, штоб ты пабудаваў царкву якую пажадаеш.

— Мне зараз патрэбна срэбра дзеля будучай царквы.

— Зараз я зрасходваў шмат срэбра, штоб нас не чапалі лівонцы. Пакуль не ведаю, колькі яшчэ патрабуецца, таму трэба пачакаць. Войшалк, я ўкажу лічыць цябе князем Наваградка, і частку даніны срэбрам будзеш захоўваць у сабе, штоб калі палепшыцца наша становішчэ, ты пабудаваў царкву.

— Добра, я згодзен.

Надыходзячым днём такі ўказ быў абвешчан, а напарэдні вясны і новага 6759 лета (1251 па хрысціянскаму календары) прыбыў ганец з Капыля.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, хан Бату на сваёй зямлі Улуса Джучы пазбіраў іншых ханаў і ўпаўнаважаных ад іншых ханаў, і прапанававаў усім абраць хана Мунке Вялікім ханам Арды. Усе з гэтай прапановай пагадзілісь.

— Добра, Каліст. Дзякуй. Але на самай справе, гэта была кепская навіна. Хан Бату ўзмоцніўся і дамогся таго, што неўзабаве выбірут Вялікім ханам яго сябра. Цяпер, ці трошкі пазней, трэба чакаць пагроз з удзелам ардынцаў. Трэба ўзмоцняць абараназдольнасць усіх ліцвінскіх княстваў. Аб гэтым Вялікі князь паведаміў праз ганцоў усіх ліцвінскіх князёў.

Перад святам Яна Купалы, вярнуўся з Рыма гандляр Волімунт.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, рымскі Папа Інакенцій Чацвёрты, на восем лет старэйшы за цябе. Родам ён з генуэзскіх зямель, і мы размаўлялі з ім на лацінскай гаворке. Ён быў вельмі задаволены тым, што нашы ваяры перамоглі вялікі атрад ардынцаў. Таксама ён вельмі задаволен жаданнем Вялікага князя Лютвы Міндоўга стаць лацінскім хрысціянінам. Ён казаў, што Царква апостала Пятра будзе заўседы дапамогаць сваім сынам. Рымскі Папа пажадаў, штоб магістр Лівонскага ордэна вырабіў дзве кароны для караля Лютвы і для каралевы, а потым штоб кульмскі біскуп каронаваў Міндоўга і яго жонку.

— Гандляр Волімунт, ты ў сваім падарожжы быў побач з рыцарам Лівонскага ордэна. Хто ён і аб чым вы размаўлялі?

— Вялікі князь, ён саксонец, а я ўжо добра размаўляю на саксонскай гаворцы. Але, ён рыцар-фанатык хрысціянства, і мы мала размаўлялі між сабой. Калі мы дзесьці спыняліся на начлег, то ён па-першае маліўся доўга, а потым пачынаў есці. Я асцярогаўся гэтага фанатыка, таму таксама маліўся, але хутка скончаў і пачынаў есці. Самое доўгае аб чым мы размаўлялі, тады калі я спытаў яго, як сабе паводзіць пры сустрэчы з Рымскім Папам. Ён мне доўга і падрабязна растлумачыў. Больш мы доўга не размаўлялі. Гэта падарожжа было самае цяжкае, што было ў маім жыцці. Нават тое, што я бачыў новыя зямлі і гарады, паводзіны гэтых незнаёмых жыхароў, не змагло ўпрыгожыць маё падарожжа з гэтым фанатыкам. У Рыме я набыў кнігу на лацінцы, меркаваў што яна мне дапаможа, але я яе хутка прачытаў, а потым нават перачытаў, і зноў вярнуўся да нудліваму жыццю побач з фанатыкам. І толькі, калі мы раз’ехаліся ў розныя бакі, я адчуў сабе вольным і шчаслівым.

— Я цябе, Волімунт добра разумею. Дзякую за цяжкую, але вельмі патрэб ную працу.

— Вялікі князь, Дангайла сення вярнуўся з жамойцкага паселішча Даўга. Пуцята прасіў перадаць цябе, Вялікі князь, што заходнія жамойты гавораць, пра паход князя Выкінта і князёў Рушковічаў на Міндоўга бліжэйшым часам. Пуцяце гэта казаў жамойт з іх паселішча, які на паляванні сустрэўся з заходнім жамойтом.

Не паспелі Міндоўг з Альгердам абмеркаваць гэту навіну, як паведамілі, што прыбыў гандляр Андрэй.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, ва ўсходніх русін іх старэйшы князь Андрэй Яраслававіч вырашыў, што хан Бату вельмі шчыльна заняты ўнутранымі справамі, і трэба скарыстацца гэтым, штоб аслабіць яго стаўленіка князя Аляксандра Яраслававіча. Князь Андрэй Яраслававіч дазволіў сваему малодшаму брату захапіць горад Пераяслаў Залескі, вотчыну таты, князя Яраслава Усеваладавіча і радзіму Аляксандра Яраслававіча, які вызначыў гэты горад сваёй вотчынай пасьля смерці таты. Туды князь Яра-

слаў Яраслававіч перавёз сваю сям'ю. Сам жа князь Аляксандр Яраслававіч хварэе ў Наўгарадзе.

— Гандляр Андрэй, алё зараз хан Бату ўзмоцніўся. Ён прапанаваў свайго сябра хана Мунке выбраць Вялікім Ханам, і ўсе іншыя ханы з гэтым пагадзіліся. Таму я ўпэўнен, што новы Вялікі хан Мунке прызнае старшым князем русін Аляксандра Яраслававіча, стаўленіка хана Бату.

— Вялікі князь, я таксама гэта ведаю, але цікава тое што Андрэй Яраслававіч пазбіраў вакол сабе ўсіх усходне-русінскіх князёў, акрамя Аляксандра Яраслававіча, і запрасіў у гэты саюз князя Даніла Раманавіча. На мой погляд, мэтай гэтага саюза можа быць толькі агульны супраціў ардынцам.

— На жаль, гэта не адбудзецца. Сёння мяне паведамілі, што заходнія жамойты з князем Выкінтам і князямі Рушковічамі збіраюцца для нападу на мяне. Яны вельмі слабыя і малакалькасные, таму я меркую што з імі пайдуць на мяне адасобныя яцвягі і ваяры князя Даніла Раманавіча.

Надыходзячым днём да Вялікага князя прыбыў ганец са Слоніма і паведаміў, што іх дазорные ўбачылі атрад валынскіх русін у тры сотні, якія праходзілі на ўсход ад іх, і накіраваліся на поўнач. Як толькі выйшаў слонімскі ганец, абвесьцілі што прыбыў ваўкавыскі ганец. Ён паведаміў, што яцвяжскія адасобные князі са сваімі ваярамі накіровалісь ці ў Наваградак, ці ў Воруту. Міндоўг загадаў ваўкавыскаму ганцу хутка прыбыць у Наваградак і перадаць Вітольду і Ленгвіну ўказ Вялікага князя аб сігналах у начы аб дапамозе адзін другому. Калі нападуць на кагосьці з іх, то днём трэба самастойна абараняцца, а ў начы з самага вышэйшага месца запаліць тры факела і чакаць дапамогі. Сваіх ганцоў Міндоўг накіраваў у ворутскіе паселішча, штоб іх жыхары схаваліся ў схроны, а ўсі рамеснікі прыбылі са сваімі прыладамі ў замак Ворута.

З ранку наступнага дня вакол Воруты пазбіралілісь валынскія ваяры, жамойты і яцвягі. Яшчэ ноччу перад пасадам Воруты і глыбокім ровам прыбралі масткі, цяпер у пасад на конях не магчыма было трапіць таму, што роў крута абрываўся на вострые колы. Нават пешым ваярам было цяжка спусціцца і не трапіць на колы. У некалькіх месцах коннікі ворагоў апынуліся ў паст-

ках. Пасля гэтага ў лесу пачалі рубіць дрэвы. Яны знаходзілі пасткі і засланялі іх дрэвамі і галінкамі. Доўгіе дрэвы складалі перад ровам і абчасвалі іх.

Нягледзячы на тое, што пачыналася восень, дзень апынуйся спякотны. Наглядая за маруднай працай з доўгімі дрэвамі, Міндоўг здзіўляўся, няўжо ганец Данііла Раманавіча, неаднаразова бачыўшы гэтые равы і масткі, не растлумачыў яму, што трэба падрыхтаваць для паходу на Воруту такія масткі.

Жыхары Воруты таксама цікавіліся што робяць іх ворагі. Яшчэ ўчора яны ўкрылі доўгімі дошкамі бліжэйшые да рова дамы. Ваяры рыхтаваліся да начной вылазкі. Вялікі князь даўно высвятліў дзе знаходзяцца кіраўнікі валынскіх ваяроў і нацэліў у тое месца вялікі камнемет. Малы камнемет нацэлен на круты пад'ем ад ракі Рута.

Калі пачалось цямнець і ворагі зрабілі вогнішча дзеля вячэры, Міндоўг указаў лепшым лучнікам стрэліць у тые месцы, дзе былі пасткі, а зараз іх накрылі берваннем і галінкамі хвойніка. Канцы стрэл былі запаленыя і таму галінкі хвойніка хутка запаліліся, і ў гэтых месцах зрабіліся вогнішча. А праз кароткі час там выпалілася ўсё і зноў атрымаліcь ямы. Па краях пасада запалілі факелы і яны асвятлялі сваю ваколіцу.

Па загаду Міндоўга, ў кош вялікага камнемёта заклалі два каменя абгоршваные сухім трысьце і звязаны вяроўкай. Запалілі іх і кінулі ў табар кіроўнікоў валынцаў. Там штосьці яшчэ запалілася і атрымалась мітусня. Вялікі князь наглядаў за вогнішчамі, калі большасць з іх пачала тушыцца, па яго загаду запалілі тры факела на вяршыні ў Замку. Гэта быў умоўны сігнал для Наваградка. Цяпер Міндоўгу і яго ваярам засталось чакаць калі наваградчане нападуць на лагер ворагаў. Вялікі князь больш спадзяваўся на Ленгвіна, якому было звычна ў цэмры скакаць па воруцкім шляхам. Міндоўг яшчэ асцярогаўся, што валынцы ў начы прыставяць сваі масткі, і пачнуць штурмаваць пасад, але калі ў іх лагеры пачалася завяруха, і якісь ваяр стаў факелам круціць кола ў адным напрамку, а потым у іншым, сумневы адпалі.

Ворутскіе ваяры хутка прыставілі свалі масткі і праз іх атакавалі ворагоў.

Раней Міндоўг папярэджваў, што трэба знішчаць валынцаў, астатніе самі ўцякуць. Штоб у начы не забіць сваіх ваяроў, усе воруцкія ваяры былі ў шлемах з белай стужкай. Атака ворутскіх коннікаў, якія трымалі левай рукой факел, а правай рукой меч, вельмі ўразіла ворагаў. Яны ўцякалі хто куды, не ведаючы шляху.

Міндоўг указаў Яўнуту з яго сотняй імкнуцца ў пагоню. А сам са сваімі ваярамі абяззброіў яцвягаў і жамойтаў. Усе наваградскія дазорные, а таксама ваяры Вітольда прыбылі на лодках ўніз па раке Рута. Яны цішком знішчалі ворагоў у лесе. Коннікі Ленгвіна таксама з белымі стужкамі біліся з валынцамі, а потым імкнуліся ў пагоню за імі.

На світанні вершнікі Ленгвіна і Яўнута вярнуліся, схавацца ў начы лягчэй, чым шукаць. Таўцівіла і Выкінта не знайшлі, як і кіраўнікаў валынскіх ваяроў. Міндоўгу паказалі забітага яцвяжскага здрадніка Яшчэлта. Вялікі князь атрымаўшы клятву, аб нежаданні больш супраціўляцца яму, адпусціў яцвягаў і жамойтаў.

— Вялікі князь Міндоўг, мэтанакіраваны паход русін Данііла Рамановіча на цябе, сведчыць што ён жадае замяніць цябе на сваяка Таўцівіла?

— Альгерд, мабыць і так, але я ў гэтым сумняваюся. У гэты паход ён не ўзяў полаўцаў, а толькі яцвягаў і жамойтаў. Ён меркаваў, што я больш пажадаю знішчаць здраднікаў. Мабыць ён разлічываў першымі іх накіраваць на штурм. Потым валынцам вырашыць, ці далей штурмаваць, ці ўйці ад Воруты. Полаўцы мала прыгодны для штурму замка, для гэтага больш прыгодны яцвягі і жамойты. Альгерд, тое што Данііл Рамановіч пайшоў на мяне сведчыць, што ён не верыць у сапраўднае абъеднанне русін супраць ардынцаў. Ужо шмат часу мінула пасля яго абразы ў стаўке хана Бату. Яго жаданне помсты змянілася на жаданне, як бы не зрабіць памылкі. Я меркую, што ад Рымскай Царквы ён чакаў, што яны запэўняць яго ў дапамогі рыцарамі супраць ардынцаў, але пакуль ён з імі не дамовіўся. Калі ен напаў на Ваўкавыск, Слонім і Здітаў, у яго было жаданне праверыць будзе ўзаемадапамога ліцвінскіх князёў, ці не. Разведаўшы, што кожны ліцвінскі князь абараняецца самастойна, не чакаючы да-

памогі, ён мэтанакіравана пайшоў на мяне. Гэтым паходам, я думаю ён пажадаў праверыць дапамогуць лівонскія рыцары імі ахрышчанаму Вялікаму князю, ці не.

— Міндоўг, але гэта не магчыма, уж вельмі далёка яны знаходзяцца, і яны ні як не паспеюць.

— Альгерд, тое што мы не знайшлі іхніх масткоў, і тое як яны марудна рабілі новыя масткі, сведчыць што валынцы ўзяўшы Воруту ў аблогу, не спяшаліся нас штурмаваць. Мэта валынцаў была павольна рыхтаваць штурм Воруты і чакаць дапамогі нам ад лівонскіх рыцараў, ці ад нашых ліцвінскіх князёў. Мабыць Таўцівіл запэўніў Данііла Раманавіча, што ліцвінскія князі не пойдуць на дапамогу мне. Але я меркую, што Данііл Рамановіч дапушчаў такую магчымасць. Каліб лівонскія рыцары прыйшлі на дапамогу мне, тады б валынцы хутка вярнуліся да сабе.

— Міндоўг, тады б Данііл Рамановіч дамовіўся з рымскай Царквай?

— Альгерд, тады ў яго былі б падставы для дамоўленасці з імі. Але зараз ардынцы знішчаць усходне-русінскіх князёў, жадаючых да аб'еднанага супраціва ардынцам. А іх новы старэйшы князь русін, я ўпэўнен што гэта Аляксандр Яраслававіч, будзе ціснуць на Данііла Раманавіча, штоб ён ваяваў з Літвой. А яго прапаведнікі атрымаюць загад з Нікеі, штоб яны лаялі ліцвінаў, саюзнікаў лацінцаў. Ціск з усходняга боку пераважыць карысць супрацоўвання з Захадам, тым больш так атрымалась, што ён так і не даведаўся дапамогуць лівонскія рыцары мне, ці не.

— Міндоўг, атрымліваецца што нам зноў трэба чакаць нападу паўднёвых русін, а лівонцы на самой справе нам не дапамогуць.

— Альгерд, не хвалюйся, твая праца з Лівонскім магістрам карысная дзеля нас. Я не чакаю дапамогі ад іх. Галоўнае, што мы раз'ядналі іх, і гэта нас выратавала. А зараз мы пераканалі адасобных яцвягаў і жамойтаў, што не трэба ім шкодзіць нам. Напарэдні Каляд у Воруце з'явіўся полацкі ваяр Капысь.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, хан Бату адправіўся ў галоўнаю стаўку Арды, або як яны кажуць у карэнную юрту, дзеля абрання новага Вялікага хана Арды. Не ведаючы гэтага, князь Аляксандр Яраслававіч ачуняўшы ад хваробы, накіраваўся ў Са-

рай, дзе зараз галоўным застаўся Сартак, сын хана Бату. У Полацку паранейшаму кіруюць пасаднік Язэп і ваявода Ясь, яны і паслалі мяне да цябе, Вялікі князь.

— Добра, Копысь. Дзякуй. На пры канцы зімы нечакана прыбыў з Пінска ваяр Вітан і паведаміў, што ў іх горад прыбыў атрад князя Даніїла Раманавіча, з яго братам Васілька, і сынам Львом з полаўцамі.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, з імі таксама быў Таўцівіл. Усіх ваяроў каля пяці сотняў. Даніїл Рамановіч угаворвае Пінскага князя, штоб ён далучыўся да іх.

— Вітан, якая мэта гэтага паходу?

— Вялікі князь, я чуў што яны казалі пра Міндоўга і пра Наваградак.

— Добра, Вітан. Дзякую.

Міндоўг адразу выклікаў да сабе Вітольда і Ленгвіна з Наваградка, а таксама рыцара Дзіміна і дазорнага Будіміна. Паведаміў іх аб вялікай пагрозе, ён указаў дазорным хутка вызначыць асабістасці мясцовасці Наваградка пры абароне і дзеля знішчэньня суперніка. З ваяводам Вітольдам і рыцарам Ленгвінам абмеркавалі адбіцце штурму русінаў і далейшага ўзаімадзеяння. Пасля наваградскіх ваяроў, Міндоўг накіраваў ганца ў паселішчэ Гезгало,с указом валосціцелю якому трэба было падрыхтавацца да прытулку двух сотняў ваяроў. А потым ганцу трэба было адправіцца ў паселішчы Ліда і Жырмунты, штоб яны накіравалі сваі сотні ваяроў у паселішчы Гезгало і там чакалі сігналу ад Вялікага князя, штоб напасць на русін пад Наваградкам.

У вечары Міндоўг быў задумлівы. Альгерд чакаў, што ён першы пачне размову, але потым не вытрымаўшы спытаў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, што думаеш пра гэты паход русін?

— А што тут думаць, гадаць, трэба абараняцца. Даніїл Рамановіч пераканаўся, што ў мяне будзе дапамога ад бліжэйшага Наваградка, таму трэба ім спачатку знішчыць яго. Вялікі і Малы замкі ім не захапіць, там вялікіе валы і глыбокія равы. А пасад Наваградка вялікі, не тое што ў нас, і валы з равамі не такія як жадалася, таму пасад пад пагрозай. Яшчэ шмат снегу і халад-

на, таму яны возьмуць пасад у аблогу, і адразу пачнуць усімі ваярамі яго штурмаваць. Доўга наваградчане не вытрымаюць, таму нам трэба хутка ім дапамагчы з аднаго боку, а з іншага я разлічываю на жырмунтцкіх і лідскіх ваяроў.

— Міндоўг, можа запатрабаваць дапамогу ад нальшанскага князя Даўмонта?

— Яны па снезе не паспеюць. А Доўбуд пад Крутогорьем шмат ваяроў згубіў. Сваіх амаль усіх трэба прыцягнуць. Адну сотню пакіну з табой ў Воруце і паўсотні ў Карэлчы. Астатніх паведу на дапамогу Наваградку. Шмат залежыць ад таго, як доўга наваградчане вытрымаюць штурм. Калі доўга пратрымаюцца, то русіны цалкам увязнуць у штурм, і наша наступленне будзе нечаканым для іх. Я рыцару Ленгвіну дазволіў узяць да сабе дзесяць ваяроў з нашага паселішча Ваўчыцы.

З ранку надыходзячага дня прыбыў слонімскі ганец. Ён паведаміў, што русіны ідуць на захад ад Слоніма ў накірунак Наваградка, ці Воруты. Міндоўг даручыў яму накіравацца ў паселішче Гезгало, і перадаць сотнікам Радмонту і Пагоняйло, што ім трэба ісці на дапамогу Наваградку. Рыцар Дзімін з сынам Будзімінам адправіліся з усімі дазорнымі да ваколіцы Наваградка.

Пасля поўдня прыбыў ганец ад рыцара Дзіміна і паведаміў, што русіны з полаўцамі прыбылі да Наваградка, і ўзялі яго ў аблогу. Полаўцы занялі мясціну каля леса. Міндоўг пераканаўся, што русіны пакуль не знішчаць Наваградак, не пойдуць на Воруту. Але Вялікі князь дапушчаў, што ворагі ўзяўшы Наваградак у аблогу магчыма раптам трымя, або нават чатырмя сотнямі накіруюцца ў Воруту. Таму Альгерду трэба было чакаць такой неспадзеванкі.

Пасткі перад ровам пасада былі абнаўлены і шчыты з дошак на пярэдніх дамах усталяваны. Пры набліжэнні атрада Міндоўга ў дзве сотні ваяроў да Наваградка, іх сустрэў дазорны Будзімін. Пачыналась цямнець.

— Вялікі князь Міндоўг, усе русіны і полаўцы ўвязлі ў штурм Наваградка, але абараняючые добра трымаюцца. Ні ў якім месцы вялікага Замка нема сігналу, што дзесьці абарона прорвана. Дапамогі з Гезгало пакуль яшчэ нема, як падойдзе, адразу да-

зорны з захаду ад Наваградка прыбудзе да нас. Дваіх дазорных русін, якія накіраваліся ў наш бок мы забілі. Нашы дазорные наглядаюць з дрэвах.

— Добра, Будзімін. Пачынайце ўкладку трысце у лесе дзе полаўцы, але пакуль яго не запальваць да майго ўказу. Чакаем дапамогі з Гезгало, або сігналу з Наваградка. Міндоўг яшчэ наблізіўся да Наваградка і расстаўляў лучнікаў і коннікаў. Калі дазорны паведаміў, што ў паўночнай часткі вялікага Замка запалілі факел, гэта азначыла ў паўночнай часткі абароны пасада русіны прарвалі супраціўленне абаронцаў.

Вялікі князь загадаў запаліць трысце, лучнікам высунуцца з лесу на адлегласць атакі і пачынаць знішчаць ворагоў, а сам з вершнікамі накіраваўся на паўночную частку абароны пасада. Улічваючы дзве малыя ракі і пажар у лесе, русінам і полаўцам лепей за ўсё ўцякаць у паўднёвазаходнім напрамку. А туды з заходу павінна прыйсці дапамога з Гезгало. Нападзенне вершнікаў Міндоўга было нечаканым для русінаў і тые, ўпэуненные ў сваёй хуткай перамозе, ўбачыўшы шмат ліцвінаў ззаду, разгубіліся і сталі ўцякаць у розныя бакі. Гэта дапамагло ліцвінам лёгка забіць шмат ворагоў.

Неўзабаве Вялікі князь заўважыў, што наваградчане перайшлі ў нападзенне на русін, мабыць прыбылі сотні ваяроў з Гезгало. У начы ліцвіны не імкнуліся да пагоні.

Вясну і новае 6760 лета (1252 па хрысціянскому календары) Міндоўг сустрэў з надзеяй, што яно будзе меньш ваяўнічае, чым мінулае. Спачатку навіны ад гандляроў гэтыя надзеі пацвярджалі. Гандляр Міхалок паведаміў, што князь Даніiл Рамановіч ажаніў сваего сына луцкага князя Рамана Даніілавіча на пляменніцы аўстрыйскага герцага Фрыдрыха Другога, Гертрудзе Бабенберг. А прыбыўшы ў Воруту нальшанскі князь Даўмонт паведаміў Міндоўгу, што па яго загаду знайшоў добрае месца на поўначы каля возера Свір, для пабудовы замка-крэпасці. Яно знаходзіцца побач з полацкім княствам, русінамі пскоўскай зямлі і зямлі лівонскага ордэна.

Міндоўг быў задаволены тым, як гадуюцца яго сыны ад Марты. Таксама ен уважліва наглядаў за ўзросленнем сына Траняты. Гэты чатырнаццаці летні здаровяка сумесна з Пуцятам ужо трэ-

цяе лета запар прыбывае ў Воруту дзеля навучанне майстэрству ваяра, якое яму вельмі да спадобы. Таксама з кожным прыбыццём у Воруту, ён усё лепей размауляў на ліцвінскай гаворцы.

Толькі Войшалк трывожыў Міндоўга. Пасля таго як уцёк наваградскі прапаведнік у валынскія зямлі, Войшалк пасяброваў з Елісеем з паселішча Лаўрышева, каля Наваградка. Елісей заснаваў у гэтым паселішчы прытулак веруюшчых хрысціян, манастыр.

Акрамя малітваў яны яшчэ пачалі летапісанне падзей у Літве, а таксама пачалі пісаць Евангелле на ліцвінскай гаворцы. Войшалк неаднаразова прасіў у таты срэбра на патрыбы дзеля гэтага манастыра, мабыць часткі даніны яму не хапала.

Гандляр Волімунт паведаміў непрыемную навіну:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, каля правага канала вусцья ракі Нёман, рыцары Лівонскага ордэна пачынаюць будаваць драўляны замак.

— Лівонцы прагнуць заснаваць там апорны замак дзеля барацьбы з скаловамі і куронамі. Тваім гандлярскім паходам яны пакуль не будуць замінаць, там шмат каналаў?

— Так, Вялікі князь. Пакуль не будуць, але потым яны магчыма такі замак пабудуюць угору па раке.

Прыбыўшы з Капыля ганец Каліст паведаміў, што вугорскі кароль Бела Чацвёрты запрасіў у князя Даніїла Раманавіча дапамогі супраць чэхаў. Той згадзіўся і пайшлі яны на чэхаў, спачатку на горад Опаву, а потым на іншые гарады, і знішчылі іх. Вярнуўшыся з поўдня гандляр Андрэй распавёў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, у Ардзе абралі Вялікім ханам Мунке. Вялікі хан Мунке і хан Бату падзялілі ўсю Арду на дваіх. Калі хан Бату быў у Карэннай юрце, яго сын Сартак навёў на ўсходніх русін вялікае войска пад кіроўніцтвом Неврюя і ардынскага ваяводы Каціака. Першае змаганне між імі адбылося каля Суздаля. Разбіты атрад русінаў адышоў у Пераяслаў-Залескі. Іншае змаганне адбылося каля гэтага горада, побач з возерам Клештын і ракі Нерлі. Пасля паразы русінскі атрад адышоў у глушэйшые леса, дзе ардынскім вершнікам было немагчыма іх прайсці. Невруй з ардынцамі захапіў Пераяслаў-Залескі і забіў жану і дзяцей князя Яраслава Яраслававіча, а таксама кіроўніка

абаронай ваяводу Жыраслава. Князь Андрэй Яраслававіч уцёк у Пскоў. Горад Пераяслаў-Залескі Неврюй не паліў. Вялікі князь, маі дасведчаныя гандляры сярод усходніх русін, якія абражальна выказваліся аб князе Аляксандра Яраслававіча называлі яго князь Неврюй. Гэта таму, што калі ён быў малады, то ён са сваей дружынай нечакана сустрэўся з малым шведскім атрадам і ў іх атрымалась сутычка каля ракі Невра. Тое, што захапіўшы горад, які абараняўся ад ардынцаў, ён не спаліў яго, сведчыць што Неврюй і ёсць князь Аляксандр Яраслававіч. Тым больш, што Неврюй прозвішчэ славянскае, а не ардынскае. Назва ракі Невра таксама славянскае, у гэтай назве две согласные побач, як ва ўсіх рэках тых мясцін, таксам як і ў нас.

— Зразумело, Андрэй. А пра Данііла Раманавіча, што кажуць кіяўляне?

— Вялікі князь, кіяўляне кажуць што ён з кракаўскім князем Болеславам Сарамлівым і з сваім братам Васілька пайшлі у паход на чэхаў.

— Добра, Андрэй. Дзякуй. Міндоўг быў задаволены тым, што ваяры Данііла Раманавіча змагаюцца на поўдні з чэхамі, толькі бы на ліцвінаў не нападалі. Гэтай думкай ён быў супакаёны. Таму калі ў сярэдзіне восені да Міндоўга прыбыў ганец ад князя Жыгімонта, і паведаміў што на Гародню, і яго наваколле напалі русінскія ваяры Данііла Рамановіча і яго брата Васілька, ён адразу не паверыў у гэта.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, калі дазорные паведамілі князю Жыгімонту аб русінскім атрадзе, то застаўся вельмі кароткі час на падрыхтоўку адпора ім. Шмат жыхароў ваколіцы схавалісь ў замку, але пасад нашы ваяры не змаглі зберагчы, і яго русіны разрабавалі, а потым спалілі. Замак яны спрабавалі штурмаваць, але ў іх нічога не атрымалася.

— З якого напрамку яны падышлі да Гародні і колькі іх было?

— Вялікі князь, яны падышлі з захаду атрадам у чатыры сотні ваяроў. Павярнулі яны таксама на захад.

— Я спачуваю маему сябру князю Жыгімонту. У адваротны шлях з табой накіруюцца пяць маіх цесляроў. Калі Міндоўг застался ўдвух з Альгердам, ён спытал ў яго:

— Альгерд, растлумач навошта яму гэты паход?

— Вялікі князь, мне гэты паход таксама не зразумелы.

— Ён упершыню пайшоў далёка на поўнач ад сваіх зямель, можа разлічываў на дапамогу адасобных яцвягов, ці жамойтов. Але яны пасля паразы пад Ворутой адмовілісь ісці. Можа звярнуўся да мазураў, але яны таксама адмовілісь і ён вырашыў паграбіць Гародню, самы бліжэйшы да межы горад, і вярнуцца.

— Міндоўг, пасля паразы пад Ворутай я сумневаюсь, што б ён разлічываў на яцвягаў і жамойтаў. Чатыры сотні ваяроў не такое вялікае войска штоб зноў накіравацца на цябе. Дваццаць пяць сотняў, ці трыццаць яшчэ магчыма было на штосьці разлічываць. Таму я меркую, што тут штосьці іншае, а не ты.

— Так, згодзен. Апошнія навіны павязаны з жаніцьбай яго сына луцкага князя Рамана на пляменніцы аўстрыйскага герцага і вайной з чэхамі. Вайна з чэхамі я меркую за герцагства аўстрыйскае. Каму з моцных правіцеляў гэта вайна не да спадобы? Ардзе, хану Бату аслабленне і Данііла Раманавіча, і чэхаў да спадобы. Рымскі Папа на баку абоіх, ён не зацікаўлен ні ў чыей перамозе. Нікея на боку русінскіх прапаведнікаў. Паўстае пытанне, дзе яго сын Раман Даніілавіч? Хутчэй за ўсё ён застаўся ў аўстрыйцаў. У гэтым сэнс жаніцьбы на пляменніце герцага, штоб атрымаць у спадчыну Аўстрыю. А гэта будзе тады калі Раман Даніілавіч перойдзе пад Рымскую Царкву. Нікея ўспрымае гэтыя падзеі, як схільнасць князя Данііла Рамановіча да Рымскай Царквы, і таму паўднёва-русінскія прапаведнікі, а за імі ардынцы будуць ціснуць на яго.

— Міндоўг, атрымліваецца што мы дамовіўшысь з Лівонскім ордэнам, будзем заўсёды пад пагразай Данііла Раманавіча, таму што на яго будуць цісвуць прапаведнікі і ардынцы?

— Не заўседы, ўсё пераменліва, а пакуль што так. Мабыць у яго нема трыццаць сотняў ваяров, ці калі ёсць, то ён не рызыкуе імі ісці на мяне, таму што пакуль наблізіцца да Наваградка, ці Воруты, я разведая аб такім вялікім войску, пазбіраю такую жа колькасць і сустрэну яго ў зручнай для мяне мясцовасці. Чаму ён пайшоў на Гародню? Таму што Гародня вельмі блізкі ад мазураў і ніхто не паспеў папярэдзіць князя Жыгімонта аб гэтым паходзе. Тое што пайшоў невялікім атрадам і пасля знішчэння ваколіцы

Гародні, вярнуўся да мазураў, сведчыць што ён жадаў захаваць сваіх ваяроў, і супакоіць сваіх прапаведнікаў і ардынцаў.

— Міндоўг, ён такімі набегамі шмат шкоды нам робіць. Трэба штосьці адказаць на гэтыя выклікі.

— Альгерд, я меркую што ён чакае вайсковай дапамогі рыцарамі ад Рымскай Царквы. Мы таксама пачакаем навін. Калі яго сын Раман Даніілавіч стане аўстрыйскім герцагам, і ўлічвае што Рымская Царква шануе пераможцаў, тады я ўпэўнен яны дадуць Даніілу Рамановічу карону караля і дапамогу рыцарамі супраць ардынцаў. У мяне чуйка, што ён гэтага вельмі чакае.

Перад Калядамі прыбыў полацкі ваяр Капысь і паведаміў, што хан Бату атрымаў права самостойна прызначаць старшага, ці Вялікага князя русін. Вялікім князем русін ён прызначыў Аляксандра Яраслававіча. На пры канцы зімы Міндоўг указаў упрыгожыць царкву дзеля яго ўрачыстай каронацыі.

На дваццаты дзень вясны і новага 6761 лета (1253 па хрысціянскім календары) прыбыўшы з гандлярскага паходу Валімунт, распавеў, што Рымскі Папа абвесціў крыжовы паход супраць самбаў, самых моцных з прусаў. Міндоўг праз Волімунта запрасіў да сабе Міхалка. Вялікі князь загадаў гандляру Міхалку выведаць навіны пра луцкага князя Рамана Даніілавіча. Калі гэтых навін будзе недастаткова, то трэба прыбыць у Луцк і выведаць там.

Нечакана, раней чым звычайна, прыбыў у Воруту Транята, але без Пуцяты, а з яго сынам Вітаславам. Транята растлумачыў тату, што ён прагне зноў навучацца бітвам на мечах. У сваім паселішчы ён трэніраваўся з сынам Пуцяты Вітаславам, які на два лета старэйшы за яго, але яму гэтага недастаткова і ён вырашыў прыбыць у Воруту да рыцараў. Міндоўг пахваліў Траняту за гэта яго жаданне і даручыў рыцару Яўнуту трэніраваць Траняту і Вітаслава.

Назірая за Транятам, Вялікі князь шкадаваў, што імкненне да дасканальнага ваяра ёсць у Траняты, а не ў Войшалка. На свята Яна Купалы Міндоўг атрымаў вестку, што неўзабаве прыбудуць хрысціяне для каранацыі яго і Марты. Марта не ведала ўсіх матываў і намераў Міндоўга, і шчыра ганарылась будучай каранацыей. Замкавая царква ў Наваградку была ўпрыгожана да

ўрачыстай каранацыі. Шматлікіе жыхары Наваградка з вялікай цікавасцью сустрэлі абрад каранацыі.

Яны апрануліся ў святочную адзежу і чакалі вясёлых ігрышч, але перад царквой ваяры двума шэрагамі трымалі калідор сярод жыхароў. І калі з'явілася ўрачыстая працэсія строю хрысціянскіх святароў з харугвамі, вышытых срэбрам і золатам, а за імі ішлі манахі ў доўгіх балахонах з капюшонамі, настрой жыхароў з'мяніўся. А калі наперадзе ў поўным урачыстым строі, належным яго сану, з'явіўся хельмінский біскуп Генрых, а за ім двое іншые біскупы, вядучыя пад рукі Міндоўга, ў жыхароў склалось уражанне, што іх Вялікага князя прымушаюць да пакараньня. Але ўрачысты і ганарлівы выраз твару Марты, казал ім што так трэба.

Міндоўга пад таямнічыя гукі ўрачыстага лацінскага спеву, праводзілі да алтара, дзе ён укленчвае і кладзецца на дыван, пасцелены ля самых алтарных прыстанак. Гэтым уладар Літвы паказвае сваю пакору перад Царом нябесным, лежачы ніцма пад яго тронам. Біскуп Генрых уздымае над Міндоўгам рукі і гучна прамаўляе:

— Божа, ўратуй караля!

Уладар Літвы павольна падымаецца і ўссядае на каралеўскі трон, злева ад яго сядае Марта. Пачынаецца ўрачыстая каранацыйная імша. Потым Міндоўг павольна ўстае са сваего трона, яго плячы ахінаюць каралеўскай мантыяй і падводзяць да алтара. Уладар Літвы зноў кладзецца перад ім на падлогу, яго цэла з выпрастаным ў бакі рукамі ўтварае выяву крыжа. Гучаць літаргічные спевы. Міндоўг просіць біскупа Генрыха блаславіць яго на каралеўскую прыдатнасць. Адразу спевы сціхаюць. Уладар Літвы ўстае і біскуп перад алтаром задае яму шэсць урачыстых пытанняў: ці будзе ён памяркоўным уладаром; ці будзе бараніць хрысціянскую веру; ці будзе справядлівым манархам; ці будзе клопаціцца аб дзяржаве; ці будзе апекавацца беднымі і сіротамі; ці будзе да канца паслухмяны Папе і святой Рымскай Царкве? На ўсі пытанні Міндоўг тройчы адказваў:

— Так, так, так.

Пасля ўручэння карлеўскага меча, зашпількі для каралеўскай мантыі, божаму памазаніку перадалі атрыбуты каралескай ўла-

ды: берла і дзяржаву, а на галаву ўысклалі каралеўскую карону. Потым каранавалі Марту. Перад урачыстай вячэрай, Міндоўг зацвердзіў подпісам і сваёй пачаткай акты, ў якіх ён надаў лівонскім рыцарам некалькі зямель у заходніх жамойтаў.На ўрачыстай вячэры, вельмі задаволеная і гонарлівая ад мінулай каранацыі Марта, спытала:

— Міндоўг, а чаму яны называюць кароль Лютвы?

— Марта, гэта па лацінскай гаворке. Наступным днём да Міндоўга прыбыў гандляр Міхалок.

— Кароль Літвы Міндоўг,быў я ў Луцку. Зараз луцкі князь Раман Даніілавіч у Аўстрыі, але луцкія жыхары чакаюць яго ў сабе і дабудоўваюць у замку мураваную царкву Іоана Багаслова.

— Добра, Міхалок. Дзякуй.

Гэта навіна трошкі супакоіла Міндоўга, але не адцягнула ад думак пра абавязак караля заснаваць у Літве біскупства лацінскай Царквы. Міндоўг схіляўся да думкі заснаваць біскупства ў Наваградку, і перадаць лацінянам замкавую царкву, тым больш што там адбыліся лацінскіе абрады ахрышчання і каранацыі. Але наваградскім князем лічыўся Войшалк, які прытрымліваўся веры іхніх ворагаў канстанцінопальскіх, а зараз нікейскіх прапаведнікаў. Новаму каралю не трэба было гэтае супрацьстаянне.

Нарэшце Міндоўг вырашыў, што трыццацілетнему Войшалку прыспеў час апраўдаць яго княства не павагай да яго таты а сапраўдным змаганнем з моцным супернікам, лацінскім біскупам. Калі Міндоўг паведаміў сына аб яго пастанове заснаваць у наваградскай царквы Літоўскае біскупства, то Войшалк толькі гнеўліва паглядзеў на тату і маўкліва выйшоў ад яго. У пачатку восені нечакана прыбыў ганец са Слуцка.

— Кароль Літвы Міндоўг, нашы дазорные паведамілі што валынскае войска ў тры сотні ваяроў накіроўваецца заходнее ад Слуцка ў паўночна-ўсходнім накірунку, мабыць на Наваградак.

Міндоўг адразу пазбіраў атрад з двух сотняў ваяроў Наваградка і адной сотні ворутскага княства, і накіраваў яго пад кіроўніцтвом рыцара Ленгвіна на сустрэч валынскаму атраду. Праз два дні ліцвінскі атрад вярнуўся і рыцар распавёў Міндоўгу:

— Кароль Літвы Міндоўг, наш атрад з дапамогай слуцкага ганца і нашых дазорных нечакана для варагоў, напаў на валынцаў каля возера Зьято. Асабістасці мясцовасці і нечаканасць нашага нападу садзейнічалі нашай перамозе. Шмат валынскіх русін уцякалі, абы куды, і трапілі ў дрыгву. Малая частка русін змагла пераплыць раку Шчара, гэта на поўдзень ад Слуцка. Гэтых мы не праследовалі. Сярод ліцвінаў пяцёра забітых і дванаццаць параненых. Зброю, даспехі і коней мы падзялілі, як умовіліс. Дапамога Слуцка не спатрэбілася.

— Добра, рыцар Ленгвін. Сем'ям загіблых і параненых з здабычы ахвяраваў?

— Так, Кароль Літвы. Ахвяраваў, як дамаўляліс.

— Дзякуй, рыцар Ленгвін.

У пачатку зімы прыбыў з поўдня гандляр Міхалок.

— Кароль Літвы Міндоўг, луцкі князь Раман Даніілавіч, раней асаджаны чэхамі ў замку Гімберг каля Вены, спяшаючы вярнуўся ў Луцк.

Міндоўг пачуйшы гэтую навіну прызадумаўся, а потым спытаў:

— Гандляр Міхалок, акрамя ажаніўшыхся сыноў Льва і Рамана, ў князя Даніла Рамановіча ёсць яшчэ малодшы сын, які не ажаніўся. Як да яго адносіцца тата?

— Так, Кароль Літвы. Малодшы сын Шварн не ажаніўся, і ён самы любы сын у князя.

— Добра, Міхалок. Дзякуй.

— Міндоўг, што ты задумаў? — спытаў Альгерд.

— Альгерд, трэба штосьці рабіць з Данілам Раманавічам. На ўзаемнае знішчэнне не ён, ні я не гатоўны, мы ў гэтым не зацікаўлены, і гэта нам не на карысць, а наадварот толькі шкода. Гэта толькі на карысць ардынцам. Шматразовыя напады на нас сведчаць ардынцам і сваім прапаведнікам, што ён ваюе з намі. А два яго пахода на Воруту і Наваградак павінны былі засведчыць Папу Рымскаму, што ён моцны ваяр, і яму трэба надаць шмат рыцароў для барацьбы з ардынцамі. Я лічу што гэта для яго галоўнае ў жыцці. Але гэтые два пахода не засведчылі яго моц. Яшчэ яго сын Раман Даніілавіч не змагчы атрымаць аўстрыйскае герцагства. Я магу яму дапамагчы.

— А навошта? — не зразумеў Альгерд.

— Па-першае, Данііл Рамановіч пасля таго, як рымскі імператар не дапамог рыцарамі вугорскаму каралю Белы Чацвёртаму, разлічвае на Рымскага Папу. Зараз ён адзін, хто можа дапамагчы рыцарамі. Пасля смерці апошнега з дынастыі рымскіх імператараў Гогенштаўфеноў, узрасла ўплывовасць адасобных княстваў, а імператар аслабеў. А па-другое, таму што Данііл Рамановіч па-ранейшаму будзе шкодзіць нам. Ліцвінам гэта не патрэбна, гэта толькі на карысць ардынцам. А калі Данііл Рамановіч стане сваяком мне, то Рымскі Папа ўбачыць наш моцны саюз супраць Арды, і я меркую ён дасць Даніілу Раманавічу доўгачаканую дапамогу рыцарамі. Я жадаю ператварыць неўдалы мінулы яго паход на нас у пасьпяховы ў вочах Рымскага Папы. Таму я жадаю выдаць сваю дачку замуж за яго сына Шварна, і няхай ён будзе князем Наваградка. Войшалк усё роўна не князь, а здзек і мне за яго сорамна. А наваградскі князь, хто б ён ні быў, мне падпарадкаваецца.

Надыходзячым днём Міндоўг накіраваўся ў Наваградак. Узімку, калі ўся даніна палічана, Міндоўг радзёй наведваў Войшалка і дачку Адэлію ў Вялікім замку. Таму калі ён заклікаў іх да сабе, для іх гэта было нечаканым. Спачатку Міндоўг звярнуўся да дачкі.

— Адэля, я ведаю што мінулае Купалле ты сустракала з маладым ваяром, але ты князёўна і таму разумееш, што тваё вяселле будзе з княжычам. Я вырашыў што цябе будзе добра з княжычам Шварнам, сынам князя Данііла Рамановіча. Так, ён хрысціянін з русін, якія на нас нападаюць. Тваё вяселле з ім, я меркую дапаможа нам замірыцца. Як ты ставішся да гэтага?

— Тата, я цябе разумею і я згодна.

— Добра. Зараз ты, Войшалк. Ваяром не пажадаў быць, якія думкі ў цябе на будучыню?

— Ніякіх, тата. Мінулым летам настаяцеля манастыра Елісея забіў звар'яцелы паслушнік манастыра. Замест яго стаў манах, з якім мне цяжка ўжыцца. Таму я не ведаю што будзе далей.

— Ты жа ведаеш, што манастыр заснавалі Елісей і манах, таму тваё ахвяраванне срэбрам не дае правоў на кіраўніцтва манастыром. Я прапаную цябе ўзначаліць наша пасольства да

князя Данііла Раманавіча з дамовай аб міры і сватаўстве Адэліі і яго сына Шварна. У маей пасольскай грамаце я прапаную Шварну сваю дачку Адэлію ў жонкі, а таксама выбранне яго наваградскім князем. Ты нічога не робіш дзеля ўзмоцнення Наваградка, а тым часам узмоцненне неабходныя. Трэба будуваць мураваныя сцены замка. У галіцкава-лынскай зямлі шмат мураваных царквей і манастыроў. Сярод заможных людзей там амаль усе тваі хрысціяне. Там ёсць чаму навучацца. Пасля дамовы з намі, там да цябе будуць вельмі добра ставіцца, асабіста пасля таго як ты сваё наваградскае княства перадаш Шварну. Як ты ставішся да гэтага?

— Тата, для мяне гэта нячакана. Я думаю, што дрэннага ты мне не пажадаеш, таму я згодзен.

— Добра. Пасля Каляд накіруецесь да князя Данііла Рамановіча. Акрамя цябе, Войшалк, з табой будзе Адэля з служанкай, нашы ганцы і два рыцара. Патрабуецца Адэліі ахрысціцца, дапаможаш ёй там. А зараз рыхтуйцесь да падарожжа.

Перад Калядамі прыбыў Полацкі ваяр Копысь.

— Кароль Літвы Міндоўг, былы Уладзімірскі князь Андрэй Яраслававіч, брат Аляксандра Яраслававіча ўцёк да свеяў. Прусы разбілі крыжакоў каля Гірмава. Забіты іх ордэнскі комтур.

— Добра. Дзякуй, Копысь. На пяты дзень пасля Калядаў, Войшалк з Адэліяй і суправаждальные іх накіраваліся да князя Данііла Рамановіча. Прыбыўшы ў Воруту Пуцята, паведаміў што жамойцкі князь Выкінт памёр.

— А хто ў тым паселішчы застаўся галоўным?

— Кароль Літвы Міндоўг, са збраяносцаў Выкінта застаўся адзін, які даўно паранены і хворы. Зараз там зноў кіруе іх волхв.

— У Выкінта была яцвяжка Мелеціна, што з ёй?

— Кароль Літвы, мінула два лета, як яна памерла.

— Акрамя тваего сына, хто яшчэ сябруе з Транятай?

— Кароль Літвы, ёсць яшчэ чатырнаццаць маладых жамойтаў якія сябруюць з Транятай, самому старэйшаму з іх дзевятнаццаць лет. Старэйшые з іх далучыліся да дружыны Траняты апошнімі, калі ўбачылі што ён сваім дружыннікам дае сапраўдные жалезныя мячы. Усіх сваіх дружыннікаў Траняты навучае бітвам на мечах.

— Добра. У цябе з жонкай ёсць яшчэ дачка?

— Так, Кароль Літвы. Ёй чатырнаццаць лет.

— Пуцята, вяртайся да сабе. Ты з жонкай і дачкой перасялішся ў паселішча Выкінта, будеш там намеснікам князя жамойтаў Траняты. Для дачкі выбіры добрага мужа з жамойтаў. Праз два дні я прыбуду ў паселішча Даўга і адразу з тваёй сям'ёй, вашым валхвом, а таксама Транятай з яго дружынай накіруемся ў былое паселішча Выкінта.

— Добра, кароль Літвы Міндоўг. Праз два дні будзем чакаць цябе.

Калі Міндоўг прыбыў у паселішча Даўга, ён прызначыў Траняту князем усіх жамойтаў. Потым яны накіраваліся ў мінулае паселішча Выкінта. На шляху туды Міндоўг праз Путяту растлумачыў валхву, што ён заўсёды зацікаўлен ў шматбожжы жамойтов. Заходнія зямлі жамойтаў ён перадаў лацінянам, таму што яны супрацістаялі з ім. Зараз, гэтыя жамойты заходніх зямель няхай адчуюць ціск лацінян за гэта, а потым выбіруць, з кім ім лепей з жамойтамі Траняты, сынам Міндоўга, ці з лацінскімі хрысціянамі. Гэтыя думкі трэба валхву поселішча Даўга перадаць валхву будучага паселішча Путяты.

Вяртаючыся задаволеным у Воруту, Міндоўг быў упэўнен, што тые дзеянні якія ён зрабіў у жамойтаў, забяспечат яму не толькі добрыя адносіны з імі, а і тое што неўзабаве заходнія жамойты запросяць яго дапамогі ад лацінцаў.

Па прыбыцці ў Воруту, ён убачыў ганца які раней накіроваўся з Войшалкам і Адэліяй ў валынскія зямлі. Ганец паведаміў, што князь Данііл Раманавіч будзе згодзен з прапановай караля Літвы пры ўмове, што яго сын Шварн з тытулам князя Наваградка ўспадкуе тытул караля Літвы пасля смерці Міндоўга. Уладар Літвы прадугледзіў гэтакую ўмову і адразу напісаў згоду з гэтай ўмовай, штоб ганец зноў накіраваўся ў валынскія зямлі. Гэтая згода ні чым не перашкаджала ў будучыні ліцвінам абраць іншага караля Літвы. Тым больш што тытул караля і рымскае ахрышчанне, гэта толькі, як спадзяваўся Міндоўг, часовая саступка лацінянам.

Падобна, што гэтая дадатковая ўмова для Данііла Раманавіча, важкі доказ сваім прапаведнікам, што ён цяпер моцна ўплывае

на Літву, і яго паходы прымусілі Міндоўга пайсці на запрашэнне міру.

Праз дванаццаць дзён у Наваградак прыбылі Шварн з Адэліяй і іх суправаждальнікі. Адэлія распавяла тату, што Войшалк сустрэўшы мінулага наваградскага прапаведніка, вырашыў застацца ў валынскіх землях, таксама ён прасіў перадаць, што жадае накіравацца ў паломніцтва на Святую Гару ў грэцкай зямлі.

На вячэру ў Вялікім замку, Міндоўг запрасіў наваградскага пасадніка і ваяводу. Там ён павіншаваў Шварна і Адэлію з мінулым шлюбам і прызначыў Шварна князем Наваградка.

За два дні да вясны і новага 6762 лета (1254 па хрысціянскаму календары) прыбыў у Наваградак арцібіскуп Віт з двума прапаведнікамі. Ён наймаў двух цесляроў, і це па яго загаду ўпрыгожылі царкву на яго густ. Міндоўг наўмысна вельмі рэдка бываў у Наваградку, яму было цікава як біскуп будзе прывабліваць наваградцаў і іншых ліцвінаў да сваего лацінскага веравызнанне.

Вярнуўшыся з поўдня гандляр Міхалок, паведаміў Міндоўгу, што яго сын Войшалк прыняў манаскі сан на Валыні. А пляменнік хана Бату Курэмса заняў Галіцкі горад Бакота на мяжы з яго улусам.

— А што князь Данііл Раманавіч?

— Кароль Літвы Міндоўг, князь Данііл Раманавіч збірае войска сыноў Рамана і Льва для паходу на Курэмсу. Падобно, што Данііл Раманавіч вызначыўся супраціўляцца ардынцам.

— Добра, Міхалок. Дзякую.

— Кароль Літвы Міндоўг, я ўсеж такі не давераю гэтай навіне, што Данііл Раманавіч вызначыўся на супраціў ардынцам.

— Альгерд, ты каму не давераеш Міхалку, ці князю?

— Міндоўг, Міхалку я давераю, а вось Даніілу Раманавічу не.

— Альгерд, Даніілу Раманавічу хан Бату ўручыў ярлык на галіцка-валынскае княжанне, а яго пляменнік Курэмса захоплівае галіцкі горад Бакота, атрымліваецца што Курэмса парушае пагадненне з ім. Таму князь Данііл Раманавіч пойдзе вяртаць тое што яму належыць па ярлыку. Гандляр Міхалок упершыню агучыў сваё стаўлянне да навіны, відаць ён штосьці

цікавае прымеціў у адносінах Данііла Раманавіча да гэтага, і што будзе важкім для мяне, і гэта трэба дадаць да навін.Князь Данііл Рамановіч меў магчымасць паскардзіцца хану Бату на Курэмсу, але ён вырашыў адваяваць свой горад, гэта азначае што ён вызначыўся супраціўляцца хану Бату. Мне гэта вельмі да спадабы, гэта азначае што ўсе маі адносіны з Даніілам Рамановічам і з лацінцамі правільныя. Дзеля жыхароў Літвы пяць лет ліхіх часоў прайшлі без вялікх страт і перашкод добрабыту. Я дараю розуму гандляра Міхалка і таму я ўпэўнен, што Данііл Раманавіч пачне вайсковае супраціўленне ардынцам. У яго зараз вырашальны момант. Па-першае ён парадніўся з ваяўнічым паўночным суседам, які стаў лацінскім хрысціянінам, і пры тым яго любы сын у будучыні стане каралём суседней зямлі. Па-другое, лацінцы ацэнівая магчымасць Данііла Раманавіча ўзначаліць супраціў Ардзе, будуць улічываць што яго сваяк Міндоўг дапаможа сваімі ваярамі, і таму я спадзяваюся дадуць яму ордэнскіх рыцараў. Па-трэцье, абраза Данііла Раманавіча ў стаўке хана Бату, пры ўручэньнні ярлыка надоўга закранула яго, а таксама тое што ардынцы прызначылі русінскіх прапаведнікаў недакранальнымі і вельмі ўплывовамі. Таму зараз, калі ардынцы парушылі дамоўленасць аб падпарадкаванасці галіцкага горада Бакота, ў князя Данііла Рамановіча ёсць усе падставы да ваеннага супраціва Курэмсе. Пры гэтым русінскім прапаведнікам нема падстаў для асуджэнне гэтага супраціва ардынцам. Гэта важка дзеля ўсіх жыхароў галіцка-валынскіх зямель.

Надыходзячым днём, бліжэй да вячэры рыцар Альгерд гуляя ў шахі з Міндоўгам, і апынуйшысь у цяжкім становішчы, нечакана спытаў:

— Міндоўг, ты ведаеш што Марта кожную раніцу пытае ў Ванды чаму на сёння зварылі гэтую ежу, а не іншаю, пры чым кожны адказ неабходна пачынаць са слоў каралева Марта? Калі гэта запамятаваць, то яна вельмі разлаваецца.

— Тое, што яна з раніцай прымушае Ванду нервавацца, я ёй гэта забараню.

Для навучэння ваяроў жамойтаў, Міндоўг паслаў да Траняты рыцара Ленгвіна. Ленгвін быў больш умелы ваяр, чым Яўнут і яго звычкі ваяра былі больш патрыбны памоцнейшым ваярам

Траняты. Пуцята, атрымаў дапамогу цеслярамі ад Міндоўга пачаў будаваць абарончыя валы ў сваім паселішчы. Адразу пасля свята Купалле прыбыў гандляр Міхалок.

— Кароль Літвы Міндоўг, Войшалк сумесна з былым навагрaдскім прапаведнікам накіраваўся на захад у Афонскі манастыр. Пляменнік хана Бату Курэмса пасля захопа галіцкага горада Бакота, накіраваўся на Галіч і захапіў яго. Але ваяры луцкага князя Рамана Даніілавіча выбілі ардынцаў з Галіча. Ардынцы Курэмсы адышлі ў Болоховскіе зямлі.

— Міхалок, а чаму Галіч не абараняў старэйшы сын Леў Даніілавіч, гэтаж яго горад?

— Кароль Літвы Міндоўг, трынаццаць лет мінула як ардынцы спустошылі горад Галіч. Князь Данііл Рамановіч не пажадаў яго аднаўляць, а пабудаваў для старэйшага сына Льва новы горад пасярэдзіне шляху між Галічам і яго новым горадам Холмам, і даў яму назву Львоў. Зараз гэты горад больш за Галіч і там жыве князь Леў Даніілавіч. Атрад луцкага князя Рамана Даніілавіча ўжо быў у паходзе на горад Бакоту, калі атрымалі вестку што ардынцы захапілі Галіч, таму яны адразу накіраваліся на Галіч.

— Добра, Міхалок. Дзякуй.

Прыбыўшы з гандлярскага паходу Волімунт паведаміў:

— Чэшскі кароль Оттокар Другі ўзначаліў крыжацкій паход на самбаў. Ён раптоўна напаў на прускае паселішче Пілаў і захапіў яго.

Потым нечакана, ў Міндоўга з'явіўся Таўцівіл. Ён папрасіў прабачэнне ў Міндоўга і запэўніў яго, што будзе старанна выконваць усі ўказы караля Літвы, а без яго ўказаў ні якіх самастойных дзеянній не будзе. Міндоўг дараваў яму здраду і ўказаў прасіць прабачэнне ў палачан. На пры канцы размовы Міндоўг пацікавілся дзе знаходзіцца яго брат Ердзівіл, і атрымаў пацверджанне сваёй дагадкі, што яго брат у Жіжмах. Міндоўг адправіў яго з рыцарам Альгердам у Полацк, якому трэба было наглядаць як пасля звону Сафійскага сабора князь будзе прасіць прабачэнне ў палачан.

У сярэдзіне восені да Міндоўга прыбыў гандляр Андрэй і паведаміў, што луцкі князь Раман Даніілавіч вызваліў галіцкія гарады Галіч і Бакота ад ардынцаў Курэмсы. А потым атрады

ваяроў Даніїла Раманавіча і яго брата Васілька захапілі і знішчылі гарады, і паселішча Болоховской зямлі, якія служылі ардынцам. Калі Андрэй пакінуў іх, Міндоўг звярнуўшысь да Альгерда ў добрым настроі.

— Гэта ўжо не абарона сваіх зямель, гэта напад на зямлю саюзніка ардынцаў. Пасля Андрэя, ў той жа дзень гандляр Волімунт паведаміў, што лацінскіе ваяры чэшскага караля Оттокара Другога разбілі прусаў у горадзішча Медзенове, Рудава і Ногімпце, пры гэтым яны ўсё знішчылі. Перад Калядамі ў Воруту прыбыў полацкі ваяр Капысь.

— Кароль Літвы Міндоўг, мы ўважліва сочым за Таўцівілам. Пасаднік і ваявода гавораць, што ўсе ўказы ён прымае толькі пасля размовы з імі. Яго цесць вельмі рэдка заходзіць да яго, асцярогаясь нездаволенасьці жыхароў Полацка. Наступным днём прыбыў капыльскі ганец і паведаміў, што князь Даніїл Раманавіч па-лацінскі ахрысціўся і каранаваўся ў Драгічыне. Зараз ён кароль Русі.

Нягледзячы на тое, што Шварн быў хрысціянінам, ён з Адэліяй весела калядавалі ў Вялікім замку. Па чуткам ад іх служылых, у іх былі добрыя адносіны. Намаганні арцібіскупа Віта прывабіць жыхароў Наваградка да лацінскай веры былі марныя. Аднойчы ў зімку Марта, з дазвола Міндоўга, наведалася да арцібіскупа Віта. Але пасля гэтага наведвання яна толькі пад прымусам Міндоўга, распавяла як гэта адбылося. Больш яна не імкнулася туды.

Перад вясной і новым 6763 летам (1255 па хрысціянскаму календары) Міндоўг пагутарыў з Шварным аб узмоцненні абараназдольнасці Вялікага замка Наваградка. Яны дамовіліся пачаць мураванае будаўніцтво двух высокіх вежаў у нізе на крутой гары, ў пяцідзесяці маховых сажен ад замка. Нячакана прыбыў да Міндоўга яго сын Войшалк. Ён быў зхудзеўшым у чорным адзенні і з неспакоім у вочах.

— Тата, я прыняў манаскі сан у Галічы, а потым з сябрам, былым наваградскім прапаведнікам пайшоў у Афонскі манастыр, што ў грэцкай зямлі, праз Болгарскае царства. Але там было ваяўнічае становішчэ. Летась памёр Нікейскі імператар Ян Трэці Дука Ватац. Болгарскі цар Міхаіл Асень думаў скарыстац-

ца гэтым, штоб вярнуць сабе македонскія зямлі, але атрымаў паразу. Нам, прыхільнікам Нікеі, было вельмі цяжка ісці таемна па зямлі болгарскага цара, таму мы вырашылі вярнуцца і ісці паўночней. Мы вярталіся праз Люблін. Там мы шчыра распавялі, што новы імператар Нікеі Феадор Другі Ласкарыс разбіў войска болгарскага цара, яны ўсё выслухалі, нічога ў нас не спыталі. А потым я нечакана ўчуў, як яны дамовіліся нас абодвух забіць, каб нашы весткі ніхто больш не ўчуў. Калі я хутка пусціўся папярэдзіць маего сябра, то каля нашага пакоя ўбачыў, што яны мяне апярэдзілі па карацейшаму шляху. Я немарудзячы ўцёк з Любліна. Тата, я прашу цябе вызваліць маего сябра з Любліна.

— Войшалк, больш верагодна што яны яго забілі.

— Тата, іх мэта была знішчыць нас абодвух, штоб вестка далей не распаўсюдзілася. Але я ўцёк і ім нема сэнсу яго забіваць, ен у іхнім палоне. Я ведаю, што напад на лацінскій горад, для цябе будзе азначаць пагаршэнне адносін з лацінскай Царквой, але можа ты не чуў, што лацінцы ўжо шмат разоў пасварыліся з наваградчанамі. Яны нават прыглядзелі каля Любчы добрую мясціну для пабудовы там іхняга манастыра.

— Гэта я ведаю, няхай будзе. Гэта не азначае, што хтосьці там з тутэйшых, ці наваградчан будзе манахам. І аб сварках я таксама ведаю. Добра. Я накірую ў Люблін атрад для вызвалення тваего сябра. Міндоўг выклікаў да сабе ганцоў, і з іх дапамогай, Ленгвіна і Яўнута. Калі ўсцешаны Войшалк пакінуў іх, Міндоўг звяртаючыся да Альгерда растлумачыў, што гэты паход на лацінскій горад Люблін будзе добрай весткай Арде, што Літва паранейшаму на баку Нікеі. Надыходзячым днём Міндоўг накіраваў атрад Ленгвіна з двума сотнямі наваградчан і двума сотнямі ворутскіх ваяроў на Люблін. З атрадам адправіўся Войшалк.

Праз сем дзён атрад Ленгвіна вярнуўся з паходу. На патрабаванне Ленгвіна вярнуць яму былога наваградскага прапаведніка, яму адказалі што яго ў горадзе нема. Таму ліцвіны штурмам узялі, не вельмі ўмацаваны пасля ардынскага спустошэння, горад і разрабавалі яго. Прапаведніка не знайшлі. Ленгвін паведаміў каралю Літвы, што Войшалк вырашыў паселіцца ў Лаўрышскім манастыры. На дваццаты дзень пасля вясеннега раў-

надзенства, з'явіўшыйся ў Воруце гандляр Волімунт паведаміў Міндовгу, што замест магістра Лівонскага ордэна Андрэаса фон Шцірлянда прызначылі магістрам Ано фон Зангергузена. Кароль Літвы выклікаў да сабе рыцара Ленгвіна, штоб зноў накіраваць яго да Траняты для навучання жамойтаў ваярскаму майстэрству. Яму,трэба навучаць жамойтаў групавым дзеяннім ў баі.

Адразу пасля Купалля прыбыў гандляр Міхалок. Ён распавеў, што ардынскі атрад Курэмсы асадзіў Луцкі замак князя Рамана Даніілавіча. Ардынцы спустошылі пасад і доўга трымалі замак у аблогу, пакуль хвароба малярыя не напала на ардынцаў і шмат з іх памерлі, а пасля гэтага вярнуліся да сабе.

— Міхалок, а што луцкаму князю Раману Данілавічу ніхто не дапамог?

— Кароль Літвы Міндоўг, ардынцы напалі раптоўна, відаць ішлі паходам таемна і мэтанакіравана на Луцк, таму дапамогі князю Раману Даніілавічу не было.

— Дзякуй, Міхалок. Калі гандляр пакінуў іх, рыцар Альгерд дапусціў:

— Кароль Літвы Міндоўг, мабыць Данііла Раманавіча і яго брата Васілька не было побач у сваіх горадах.

— Альгерд, луцкі князь Раман Даніілавіч хадзіў у паходы, якія не прынеслі яму здабычы. Ён вызваляў гарады Галіч і Бакота ад ардынцаў, таму Курэмса пажадаў яму адпомсціць. А Данііл Рамановіч з братам Васілька рабавалі болоховскую зямлю. Мабыць Данііл Рамановіч злаецца на сярэдняга сына за тое, што ён не змог захаваць за сабой аўстрыйскае герцагства. Але мяне больш цікавіць чаму хан Бату не адрэагаваў на паразы сваего пляменніка Курэмсы і спустошання болохоўшчыні. У пачатку восені, з'явіўшыйся ў Воруце гандляр Андрэй. Ён растлумачыў прычыны бездзеяні хана Бату на паразы яго пляменніка Курэмсы.

— Кароль Літвы Міндоўг, хан Бату памёр у сваім Сарае. Ён цяжка хварэў, у яго былі моцныя болі ў нагах і нават здранцвенне іх. Яго твар шмат разоў пакрываўся плямамі. Па іх звычаям, ноччу па яго магіле ў зямлі шмат разоў прагналі табун коней, штоб ніхто і ніколі не знайшоў месца пахавання. Па яго смерці

правы на спадчыну атрымлівае яго сын Сартак, які знаходзіцца ў гэты час пры галоўнай стаўке Вялікага хана Мунке.

— Гандляр Андрэй, чаго чакаць ад гэтага Сартака?

— Кароль Літвы Міндоўг, ужо мінула тры лета, як князь Аляксандр Яраслававіч пасля хваробы ў Наўгорадзе, накіраваўся ў стаўку хана Бату. Там ён вельмі пасяброваў з сынам хана Бату Сартаком, нават пабратаўся з ім. Таму трэба чакаць узмоцнення князя Аляксандра Яраслававіча. Я меркую, што ў першаю чаргу гэтага трэба асцярагацца Данілу Раманавічу, а потым і Літве.

Як толькі гандляр пакінуў іх, Міндоўг і Альгерд аднадумна згодзіліся з Андрэем і вырашылі далей ўзмоцняць абараназдольнасць ліцвінскіх гарадоў. Палявые працы скончылісь, таму кароль Літвы вырашыў правесці вучэбны бой між двума сотнямі наваградскиx ваяроў ваяводы Вітольда і двума сотнямі ваяроў рыцара Ленгвіна. У гэтым сражэнні замест мячоў былі драўляные палкі, стрэлы без наканечнікаў і пікі без наканечнікаў. Вітальду і Ленгвіну трэба было прапанаваць Шварну план бітвы.

Першым па жэрабю план прапанаваў Вітольд. Наваградскі князь з ім згадзіўся. Потым свой план прапанаваў Ленгвін. Шварн таксама згадзіўся. За ўсім гэтым наглядаў Міндоўг. У гэтым сражэнні дазволялася скарыстацца рознымі перашкодамі, дымавой заслонай і іншымі хітрысцямі. У гэтым паказальным і вучэбным сражэнні перамог атрад Ленгвіна. Пасля скачэння бітвы Міндоўг з Шварнам, Вітольдам і Ленгвіном разглядзелі яго вынікі, памылкі і пераможныя дзеяні. Потым кароль Літвы застаўся на вячэру ў Шварна. На вечары Міндоўг пацікавіўся:

— Князь Шварн, што на тваю думку трэба палепшыць у ваяўнічых дзеянній наваградскіх ваяроў?

— Кароль Літвы Міндоўг, мне ўсе ў гэтым сражэнні да спадобы. Толькі параўновывая майстэрствы палавецкіх лучнікаў з наваградскімі і з нашымі русінскімі, трэба адзначыць што палавецкія лучнікі лепшыя.

— Вось гэтым і трэба цябе, князь Шварн заняцца ў бліжэйшые дні. Вяртаючыся ў Воруту, Міндоўг супакоіўшысь ад непрыёмнага выраза Шварна аб нашых русінскіх, ён падвёў вынікі гэтага дня. Узгодненне абоіх планаў бітвы, сведчыць што Шварн дрэнна ацэніў іх. Міндоўг адразу зразумеў што ваяры Ленгвіна

перамогуць. Але тое як ён перажываў, гледзячы на бітву, і як бліскалі яго вочы пры абмеркаванні прашэдшага змаганні, сведчыць што ён зразумеў дзе і ў чым перамог Ленгвін. Кароль Літвы з задавольненнем адзначыў, што Шварн уключыўся ў пошук недахопаў абараназдольнасці наваградчан. Добра што ён зараз будзе займацца ўдасканаляннем майстэрства лучнікаў. Гэта будзе яго першая самастойная і адказная праца, і ад таго наколькі шчыльна ён будзе ёй займацца, залежыць наколькі хутка ён стане лічыць сваімі наваградчан. На вячэры Міндоўг прымецыў добрыя адносіны між Шварнам і Адэліяй. Гэта дадала ўпэўненнасці каралю Літвы, што Шварн зможа зрабіцца сапраўдным князем Наваградка і шчыра абараняць інтарэс наваградскага княства. Міндоўга паведамлялі, што Шварн ці самастойна, ці пад чыйсьці падказкі спачатку вызначыў самых лепшых лучнікаў, потым яны навучылі астатніх лучнікаў. Не адкладаліся працы па падрыхтоўцы да будаўніцтва двух вежаў каля Вялікага замка, але ў гэта Шварн не ўмешваўся, штоб ім не перашкоджаць.

Перад Калядамі прыбыў у Воруту ваяр Копысь.

— Кароль Літвы Міндоўг, пасля смерці хана Бату яго нашчадак сын Сартак на зваротным шляху ў Сарай памёр. Ханам прызначылі малалетняга сына Сартака Улагчы. Рэгентам пры хане стала яго маці Боракчы-хатун.

— А калі Улагчы памрэ, то хто будзе ханам?

— Кароль Літвы, нам гэта не вядома.

— Добра, Копысь. Дзякуй. Выкліканы ў гэты дзень гандляр Андрэй дапусціў, што ханам у гэтым выпадку прызначаць брата памерлага хана Бату, Берке.

— Андрэй, чаго чакаць ад гэтага Берке? Я думаю, што Сартака атруцілі.

— Кароль Літвы Міндоўг, Берке як і яго старэйшы брат хан Бату імкнуўся да незалежнасці Улуса Джучы ад галоўнай стаўкі Арды. Таму я сумневаюсь, што па ўказу Вялікага хана Мунке атруцілі Сартака. Яму не да спадобы Берке. Але я таксама думаю, што Улагчы хутка памрэ. Тады Берке замене Курэмсу на моцнага ваяводу Субедея і той адпомсціць за паразы ардынцаў.

— Атруціць Сартака маглі і прыхільнікі Берке ў стаўке, а таксама з асяродзя Сартака. Для нас галоўнае, што ад Берке нічога добрага для нас і для Данііла Раманавіча не трэба чакаць. Дзякуй, Андрэй.

Узімку Міндоўг папрасіў гандляроў Волімунта і Міхалка гуляць у шахі з князем Шварнам. Князю будзе на карысць тактычныя пабудовы ў шахах.

За два дні до вясны і новага 6764 лета (1256 па хрысціянскаму календары) з'явіўшыйся перад Міндоўгом полацкі ваяр Копысь, паведаміў што хан Улагчы памёр. Да ўлады прыйшоў брат былога хана Бату Берке. Ён абвінаваціў Боракчын-хатун у замове супраць яго і пакараў яе смерцью.

Прадоўжылісь працы па падрыхтоўцы да будаўніцтва двух вежаў Вялікага замка Наваградка. Князь Шварн правёў агляд лепшых лучнікаў у кожнай сотні ваяроў. Напярэдні вясновага раўнадзенства прыбыў ганец ад князя Эйсманта і паведаміў, што войска Данііла Раманавіча і яго сына Льва нанеслі паразу войску адасобных яцвягаў. Гэта сведчыло, што Данііл Рамановіч пакуль яшчэ не дамогся дапамогі рыцарамі ад Папы Рымскага, таму ён пажадаў яшчэ больш выслужвацца перад ім, разбіўшы шматбожцаў яцвягов.

Да тых пятнаццаці трэніравальным мечам, якія перадалі Траняце раней, ён запрасіў яшчэ дзевяць. Таму колькасць дружыны Траняты павялічваецца. Напярэдадні кароль Літвы накіраваў Яўнута ў паселішче Пуцяты для навучання жамойтаў майстэрству ваяроў гэтага паселішча. Кароль Літвы быў зацікаўлен дапамагаць жамойтам у ўзмоцнені іх абараназдольнасці, а гэта не магчыма без заснаванні кузні і рамеснікаў. Міндоўг вырашыў больш дапамагаць паселішчу дзе раней быў Выкінт, а зараз Пуцята. Тое што гэта паселішча павялічылась у бок ракі Нёман, рабіло яго ўплывовым не толькі на гандлярскі шлях Літвы, а і на хуткае перамяшчэнне ваяроў уніз па раке. Міндоўг жадаў гэта паселішча зрабіць горадам і галоўнай стаўкай князя жамойтаў Траняты. Ён накіраваў у гэта паселішча гарбара і памочніка каваля, а таксама цесляроў для пабудовы дамоў гэтым рамеснікам.

Памочнік каваля жыў ў шматдзетнай сямі і ён не быў ў ліку любых сыноў, таму лёгка пагадзіўся пераселіцца да жамойтаў.

Гарбар правініўся і наменніку паселішча было ўказана каралём накіраваць яго да жамойтаў.

Ад Пуцяты Міндоўг чуў, што лівонцы яшчэ не наведваліся ў паселішча жамойтаў, якімі кіруюць Рушковічы. Яны ўжо ведалі, што кароль Літвы перадаў іх землі лівонцам, яны вельмі абураліся на яго, тым больш што гэтые землі былі не яго. Але супраціўляцца з больш дужэйшымі ў іх не было жаданне.

Перад святам Яна Купалы да Міндоўга прыбыў полацкі ваяр Копысь. Ён распавёў што летась русіны Ноўгарада выгналі старэйшага сына князя Аляксандра Яраслававіча Васіля, які выехаў у Таржок. Замест яго наўгародцы прызначылі князем Яраслава Яраслававіча, малодшага брата Аляксандра Яраслававіча. Даведаўшысь аб гэтым, князь Аляксандр Яраслававіч наблізіўся да Ноўгарада з войскам і патрабаваў выдаць яму пасадніка Ананья. Ноўгародцы адмовілі князю ў гэтым. Тады Аляксандр Яраслававіч патрабаваў з'няць яго з пасады, і прызначыць вернага яму пасадніка. Наўгародцы далі змову і прызналі пасаднікам прыхільніка князя Аляксандра Яраслававіча.

Пасля гэтага Яраслаў Яраслававіч пакінуў Ноўгарад, а Васіль Аляксандравіч вярнуўся ў горад.

— І яшчэ, кароль Літвы Міндоўг, віцэбскі князь і іншые прасілі спытаць, ці дазволяеш ты напасць на іншые землі. Яны пачулі што ліцьвіны летась разрабавалі горад Люблін, таму вырашылі што ўжо магчыма пагрaбаваць і ім.

— Копысь, тое што я скажу цябе, то дазваляю сказаць полацкаму пасадніку і пры ўмове збяражэння таемнасці, толькі надзейным князьям нашых крывіцкіх земель. На русінаў нападаць нельга. Новы хан за сваіх даннікаў адпомсціць. На лівонцаў нападаць яшчэ час не настаў. Калі прыйдзе зручны момант, я дадам да сваего войскі атрады жадаючых ваяроў крывіцкіх княстваў.

Нечакана прыбыў да Міндоўга князь Шварн. Ён распавеў што маладыя наваградчане разлаваліся на біскупа Літвы Віта за тое, што той перашкаджаў праводзіць свята Яна Купалы і яны яго моцна лупілі, нават паранілі.

— Кароль Літвы Міндоўг, як мне ставіцца да гэтага здарэння, і што адказываць біскупу Віту, калі той прыйдзе скардзіцца?

— Князь Шварн, свята Яна Купалы асабістае сярод іншых свят ліцвінаў. Пасля гэтага свята ўтвараліся большасць сямей ліцвінаў. У гэты старажытны абычай не магчыма ўмяшацца не толькі князю, але і нават бацькам. Інакш яны адразу атрымліваюцца ворагамі на ўсё жыццё, пры тым што ліцвіны вельмі паважаюць сваіх бацькоў. Гэта трэба ведаць усім, з якой бы зямлі ён сюды не прышоў і якой бы веры ён не прытрымліваўся. Калі хтосьці пажадае памяняцьць, ці забараніць гэты старажытны абычай, той хутка будзе забіты. Я не ведаю як у русінаў, але ў яцвягаў, у цяперашніх ліцвінаў гэта так. У нашых крывіцкіх землях шмат тых хто прытрымліваецца хрысціянства. Але і яны шануюць старажытныя абычаі і ў іх удзельнічаюць. Таму там ніколі не было ворожасці на гэтай глебе. Мне казалі, што старадаўнія полацкія князі будавалі хрысціянскія царквы і адначасова ўдзельнічалі ў старажытных абрадах шматбожцаў. Гэтак будзе і ў нас. Я думаю што ты, князь Шварн, усё зразумеў і ведаеш што адказаць лацінцам на іх скаргу.

— Так, кароль Літвы Міндоўг, ведаю.

Пасля сканчэння палявых прац, князь Шварн вырашыў правесці трэніравальны бой, як летась між двума сотнямі наваградскіх ваяроў з кожнага боку. На гэты раз першым свой план бою прапанаваў рыцар Ленгвін. План быў абараняльны з шматлікімі перашкодамі для коннікаў і пешых лучнікаў, і з доўгімі дзідамі. Мэта гэтага плана была прывабіць коннікаў суперніка ў пастку дзе пешым лучнікам было зручна і бяспечна стрэліць у коннікаў.

Калі Шварн пагадзіўся з гэтым планам, Ленгвін патрабаваў адзін дзень на падрыхтоўку. Кароль Літвы змяніў умовы бою. Калі летась лічылась што адзіны трапны стрэл быў смяротны, то зараз каб забіць суперніка трэба было двойчы трапна стрэліць. Міндоўг ацэніў нязвыклы і карысны для будучыні план рыцара. Больш за ўсе яго цікавіло, як Ленгвін зацягне ваяроў Вітольда ў пастку. Звычным уцёкам малакалькасных коннікаў нікога не здзівіш, таму трэба было штосьці іншае.

Наступным днём атрад ваяводы Вітольда па дамове пайшоў у атаку. На сваім шляху яны ўбачылі злева шчыты з дошак праз дзіркі ў іх торчалі канцы дзід. Гэтыя шчыты былі прыкрытыя маладымі хвойнымі дрэвамі, прымацаванамі так як быццам

раслі з пад зямлі. Атрад Вітольда павярнуўся ў правы бок, дзе іх сустрэлі перашкоды для коннікаў і трапныя стрэлы пешых лучнікаў. Атрад Вітольда накіроваўся ў прамым напрамку. Калі апошніе коннікі Вітольда мінулі злева шчыты з дошак, то гэтые шчыты паваліліся на зямлю і праз іх з'явілісь коннікі Ленгвіна. Яны хутка накіраваліся на атрад Вітольда.

Міндоўгу ўсё вельмі спадабалось, ён падзякаваў усім за бой, а потым з цікавасцью разглядаў шчыты. Яны былі ўстойлівые праз запорное бервяно, якое достакова было лёгка з'няць, як шчыты і падпорка хутка падалі на зямлю. Ленгвін таксама прапанаваў на канцы дзід ўмацаваць жалезны крук, штобы з яго дапамогай скідаць вершніка з коня.

Міндоўгу спадабалась прапанова Ленгвіна і ён указаў Шварну вырабляць гэтакіе дзіды. Вярнуйшыся з гандлярскага пахода, Волімунт распавёл что Папа Рымскій, пачуў аб параненні біскупа Віта і яго ўцёка з Літвы, і тое што ліцвіны разграбілі лацінскій горад Люблін. Ён выдаў буллу. У ёй ён абвесціў аб крыжацкім паходзе супраць Літвы. Таксама гандляр паведаміў, што на мяжы зямель скаловаў і куронаў, лівонцы пабудавалі цагляную крэпасть Мемель і пачалі будаваць горад Мемельбург. Ён будзе злучаць зямлі тэўтонаў з іх аддзяленнем лівонцамі.

— Гандляр Волімунт, а што самбы?

— Кароль Літвы Міндоўг, тэўтонцы летась нанеслі паразу самбам.

Прыбыўшы ў Воруту полацкі ваяр Копысь паведаміў, што у русінаў Уладзіміра-Суздальской зямлі, ардынцы пачалі перапіс жыхароў кожнага горада і паселішча, штоб усталяваць дакладную даніну. Хан Берке не даверае русінам, і таму гэты перапіс ён даручыў праводзіць сваім упаўнаважаным.

— Зразумела. Копысь, мне трэба ведаць ваяры Полацка і іншых нашых крывічскіх княстваў, жадаюць пайсці толькі ў грабіцельскі паход, ці згодны пайсці ў бескарысны, але неабходны для будучыні паход супраць лацінцев?

— Кароль Літвы Міндоўг, до Каляд я гэта высветлю і табе распавяду. Напярэдадні Калядам прыбыў Копысь і казаў, што крывічские ваяры жадаюць ісці толькі ў грабіцельскі паход.

Альгерд пацікавіўся:

— Міндоўг, а ты чакаў іншага адказа?

— Не, я гэтым пытаннем даў ім зразумець, што ў бліжэйшы час нашы паходы будуць з адной мэтай, абарона ліцвінаў ад лацінскіх рыцараў. Пасля сведак гандляра Волімунта аб крыжацкім паходзе на нас, нам застаецца рыхтавацца да гэтай барацьбе. Я меркую, што для ліцвінаў лепей таемна ісці паходом на паўночных лацінцаў. У гэтым выпадку на нашым боку нечаканасць нападу. Там нашы шматбожцы мабыць падумалі, што Міндоўг і Літва на сам рэч аб'ядналісь з лацінскімі хрысціянамі. Зараз, калі лацінцы абвесцілі крыжацкі паход на нас, ужо магчыма пераканаць шматбожцаў у адваротным. Я спадзяваўся на самбаў і скаловаў, што яны будуць больш змагацца з лацінцамі, але іх паразы сведчаць што яны разупэўнілісь у нашым змаганні з лацінскімі хрысціянамі.

Кароль Літвы задумаўся, а потым дадаў:

— Я накірую гандляра Волімунта з сваім збраяносцам да скаловаў і самбаў. Яму патрэбна будзе разведаць у іх і іншых прусаў жаданне і магчымасці барацьбы супраць лацінцаў. Таксама яму неабходна распавесці аб прычынах па якім я пайшоў на змову з лацінцамі, і тое што ліцвіны не жадаюць быць хрысціянамі, а толькі шматбожцамі. Трэба іх запэўніць што Міндоўг па-ранейшаму будзе змагацца з лацінскімі рыцарамі. Адначасова з імі, я накірую ў Мемельбург села Кодруна, села Туму і сына Путяты Вітаслава, ведаюшчага жамойтскую гаворку. Ім трэба разведаць усе магчымасці як захапіць гэты Мемельбург. Кодрун ужо вопытны для гэтай справы. А нам нельга дапушчаць штоб тэўтоны і лівонцы абмерковывалі сумесные дзеянні супраць шматбожцаў і нас. Наш захоп Мемельбурга будзе сігналам пруссам і куронам, а таксама іншым шматбожцам, што мы, зноў заклікаем іх змагацца з лацінскімі хрысціянамі. Марта вельмі нервуецца калі я накіроўваюсь ў паселішча Даўга, таму табе Альгерд сумесна з ганцом, трэба туды ісці, штоб адтуль з Вітаславам і ганцом накіравацца ў паселішча Путяты. Заадно возьмеш калядные падарункі для Даўгі. Заўтра я накірую Волімунта, збраяносца, Кодруна і Туму, а таксама двух ворутскіх цесляроў са сваімі сякірамі ў паселішча Путяты. Дадам яшчэ две сякіры для жамойтскіх цесляроў. Калі ўсе збіруцца ў паселішча Путяты,

пойдзіце ўніз па раке Нёман. Няхай Волімунт выбірэ зручнае месца каб пабудаваць там дом, у якім пазней будуць дозорные, а зараз ён будзе для адпачынку на зваротным шляху тых хто накіруецца на поўнач. Я меркую, што дом трэба пабудаваць у палове версты ад ракі, а каля ракі зрабіць метку. Зараз я асцярагаюсь лацінскіх разведнікоў, таму дом не каля ракі. Потым там трэба пабудаваць яшчэ дамы ў бок ракі, і калі наблізяцца да яе, то пабудаваць замок і горад. Трэба штоб жамойты ведалі, што гэта будуць іх замок і горад шматбожцаў.

— Кароль Літвы Міндоўг, ты жадаеш напасць на Мемельбург у зімку?

— Не, ў зімку будзе цяжка ісці і вяртацца па доўгаму шляху. Нам не трэба, штоб хварэлі ваяры ад моцнага мароза. Волімунт і Кодрун вырашаць калі раздзеляцца і будуць ісці ў розные бакі. Я спадзяваюся, што Кодрун знойдзе чым зацікавіць скаловаў, ці куронаў штоб іх узялі на начлег, і штоб гэта было таемна. Праз тры дні вярнуўся Альгерд.

— Кароль Літвы Міндоўг, ад паселішча Пуцяты я не суправаждаў іх далей на поўнач. Па-першае я ўжо стары і асцерагаўся захворэць, па-другое яны далей без мяне ўправіцца.

— Добра, Альгерд. Дзякуй. Усё адбылося як я загадаў?

— Так, кароль Літвы Міндоўг. Калі Пуцята абвесціў, што трэба два цесляры каб пабудаваць з ліцвінамі дом унізу па раке Нёман і за гэта кожны атрымае ліцвінскую сякіру, то жадаюшчых было аж шэсць жамойтаў.

Першымі вярнуліся Волімунт і збраяносец. Гандляр распавёў, што скаловы і самбы вельмі абураны лютасцю лацінскіх рыцараў.

— Кароль Літвы Міндоўг, спачатку я сустрэўся з скаловамі. Яны прызналіся, што ў іх не было адзінаначалле. Скаловы з аднаго берага ракі Нёман не ведалі што атрымліваецца на іншым. Таму рыцары перамоглі іх па асобку. Зараз яны збіраюцца дзейнічаць сумесна. Толькі ніяк не вызначацца хто будзе галоўным у сумесным войску. Скаловы па-ранейшаму лічаць Міндоўга самым моцным ваяром сярод шматбожцаў і спадзяюцца на яго дапамогу ў барацьбе з крыжакамі. Самбы лічылі сабе самымі моцнымі сярод прусаў, але леташняя параза ад лацінцаў змен-

шыла іх самаўпэўненасць. Калі я ім паказаў метку, скураны раменьчык з косцяным наканечнікам, якую ты мне перадаў, то яны сталі даверлівыя. Уплывовыя самбы прызналіся, што зараз яны разгубіліся. Раней іх прыгняталі даны, але гэта было не так моцна, як зараз крыжакі. Пасля маіх слоў, што Міндоўг жадае дапамагаць шматбожцам, яны сталі больш жвавыя і казалі што вельмі чакаюць калі ты нападзеж на крыжакоў. Яны казалі што вельмі жадаюць, каб прышоў Міндоўг са сваім войскам, далучыў іх ваяроў да сваіх і разграміў крыжакоў.

## ГЛАВА 19

# НА ДАПАМОГУ

На прыканцы зімы вярнуліся Кодрун і Тума. Вітаслаў накіраваўся ў паселішча Даўга. Міндоўг выклікаў з Наваградка Ленгвіна, штоб ён выслухаў выведнікаў. Кароль Літвы вырашыў яго прызначыць кіроўнікам ліцвінскага атрада, які пойдзе на Мемельбург. Распавеў Кодрун:

— Кароль Літвы Міндоўг, лівонскія рыцары наймалі куронаў у бліжэйшым паселішчы дзеля загатоўкі бярвенне на распальвання печ і на будаўніцтва ўнутры замка. Я змагчы дамовіцца з аднім з гэтых куронаў, штоб мы былі яго жыльцамі на ўсю зіму. Яму спадабаліcь маі нажы з косцярэзнымі ручкамі. Тума лепей за нас ведае і размаўляе на куронскай гаворке. У нашага курона сваяк быў галоўным сярод куронаў якія загатоўлялі бярвенне і дровы. Тума дамовіўся, што замест нашага курона ён будзе працаваць дваннацаць дзён у яго адзенні. Замак цагельны ў чатыры сцяны рознай даўжыні. Каля самай кароткай сцяны глыбокі заліў з прычалам, побач доўгая сцяна з адзінай брамай ў замак. Перад брамай мост праз не шырокую, алё глыбокую раку Дана. Гэта рака агібае трэцюю сцяну. Толькі ў чацьвёртай сцяны зямля, але вышыня гэтай сцяны найбольшая, у шэсць маховых сажняў.

Тума дадаў:

— Кароль Літвы Міндоўг, куроны шматбожцы і яны здагадаліся, што мы наглядаем за замкам і горадам, штоб яго захапіць. Я нашага курона распытваў, хто жыве ў горадзе і ў замку. Ён казаў што рыцары і іх збраяносцы з зямель альманскіх, мабыць саксонцы. Яны жадаюць штоб тут быў галоўны замак у Курляндыі, а таксама галоўная царква Курляндыі. Жыхары горада таксама з зямель альманскіх. У замку дванаццаць рыцараў і прыблізна тры дзесяткі збраяносцаў. Сярод слуг у замку большасць з зямель альманскіх, але ёсць куроны. Іх мала, мабыць пяць, ці шэсць, і ўсе яны хрысціяне.

— Тума, а ёсць сярод гэтых слуг куронаў тые хто служыць на кухні?

— Не, кароль Літвы Міндоўг, куроны толькі на прыбіранні і на мыцці бялізны. На кухню ім забаронена заходзіць. У замку нема жанчын. На самым версе дазорны ў той сцяны дзе зямля, і яшче адзін дазорны, які наглядае за брамай і мостом, а таксама наглядае за карабелямі, якія набліжаюцца да замка. На прычале заўседы адзін, ці два карабеля. Вада ў заліве ніколі не замярзае.

— Тума, а бывала такое, што з замка выходзілі шмат рыцараў і збраяносцаў, і з чым гэта адбывалася?

— Кароль Літвы Міндоўг, такое адбылось толькі аднойчы, на пры канцы нашага назірання. Яны праз горад накіраваліся на поўдзень. Я спытаў курона куды яны накіраваліся, але ён не ведаў.

— Тума, вы не дачакаліcь калі яны вярнуліся?

— Не, кароль Літвы Міндоўг. Адразу ў замку паведамілі, што больш працаваць на іх не патрэбна.

— Кодрун, як меркуеш штурмаваць замак?

— Кароль Літвы Міндоўг, адзіны шлях нападу толькі праз чацвёртую сцяну дзе зямля, прытым зямля роўная. Тума казаў, што мост хутка магчыма прыбіраць у браму замка. Перад тым як сцямнее яны запальваюць факелы на сценах замка.

— Добра дзякую. Я спадзяюся што рыцар Ленгвін штосьці прыдумае.

Неспадзявана з'явіўся Транята і прасіўся ў Міндоўга ўзяць яго з трыма дзясяткам жамойцкіх вaяроў у паход на поўнач. Пры абмеркаванні Міндоўгом, Альгердом і Ленгвіном магчымасці

захопу замка, кароль звярнуў увагу што спачатку трэба спаліць два карабеля ў прычала, таму што з іх дапамогай яны запытаюць падмогу. Таксама ён загадаў Ленгвіну з дапамогай курона, замест якога працаваў Тума, адразу захапіць у палон тых хрысціанскіх куронаў якіе працавалі ў замку. Выпытаць у іх штосьці карыснае дзеля нападу на замак, а калі яны згодны дапамагчы ліцвінам, то скарыстацца імі.

У канцы абмеркавання, рыцар Альгерд да гэтуль маўклівы, прапанаваў:

— Кароль Літвы Міндоўг, я сумневаюсь ў поспеху гэтага паходу невялікім атрадам, вельмі цяжка захапіць гэты замак. Калі там было дзесяць сотняў і з каменямётамі, тады яшче магчыма. Акрамя камнемётаў яшче патрэбна было падкапаць пад замак, штоб затапіць яго. Без абрушэння часткі сцяны нам не ўзяць замак.

— Альгерд, немагчыма правесці вялікі атрад у тые месціны дзе ніколі не было не толькі гарадоў уздоуж ракі Нёман, а нават паселішч. Калі неўзабаве ўбачаць шмат дымоў ад вогнішч, то адразу здагадаюцца пра вялікі атрад. А Волімунт яшчэ раней папярэджваў, што лацінцы будуць імкнуцца будаваць замкі ўверх па раке Нёман, таму дазорные патрыбны і на левым берагу ракі. Ужо сярод куронаў і скаловаў ёсць хрысціяне, а яны пажадаюць выслужыцца перад лацінцамі, і данесуць ім на з'яўленне вялікага атрада. А нашаму атраду вельмі патрэбна нечаканасць нападу. Цягаць камнемёты, няхай нават і разборныя, вельмі цяжка па бездарожжы. Асноўны сэнс гэтага паходу, тое штоб шматбожцы ведалі, што я, Міндоўг не здрадзіў шматбожцам. Я часова прыняў аблічча хрысціяніна, каб іх рыцары, сумесна з іншымі хрысціянамі русінскімі не спустошылі нашы гарады і не знішчылі ліцвінаў. Калі я дамовіўся з тымі і з іншымі, з русінамі нават парадніўся, то гэтага небяспечнага саюза не стала, і я зноў жадаю знішчаць лацінскіх хрысціян, ненавісных нам. Ты Альгерд ведаеш што Волімунт растлумачыў гэта прусам, цяпер словы трэба падцвердзіць паспяховым паходам супраць лацінцев. Мемельбург знаходзіцца на мяжы прусаў і іншых шматбожнікаў. Я меркую што скаловы раскажуць аб гэтым паходзе іншым прусам, а куроны раскажуць іншым усходнім шматбожцам. Я спад-

зяюся, што пасля гэтага ўсе шматбожцы будуць рыхтавацца для ўсеагульнага супраціва лацінским хрысціянам.

На семнаццаты дзень вясны і новага 6765 лета (1257 па хрысціянскаму календары) атрад ліцвінаў у чатыры сотні ваяроў накіраваўся на поўнач.

У атрадзе Ленгвіна было дзве сотні наваградчан і дзве сотні воруцкіх ваяроў, а таксама тры дзесяткі ваяроў Траняты. У атрадзе знаходзіліся Кодрун, Тума і два дзесятка дазорных. Накіраваліся яны спачатку ў паселішче Путяты, а потым ім трэба яшчэ 60 вёрст на поўнач у месца, дзе іх будуць чакаць два ворутскіх цесляра з двума пабудаванымі дамамі. Гэтых цесляроў замяняць чатыры воруцкіх цесляра і тры жамойцкіх. Ад гэтага месца на трох лодках паплывуць уніз па раке Нёман, спачатку Тума з шасцю дазорнымі і двума цеслярамі. Ім трэба спыніцца за дваццаць вёрст да вусце ракі, і дамовіўшыся з тутэйшымі скаловамі, падрыхтаваць месца адпачынку ліцвінскага атрада.

Пасля адплыцця Тумы з дазорнымі, праз два дні атрад Ленгвіна накіруецца ўздоўж правага берага ракі Нёман на поўнач.

У вясновае раўнадзенства на Саракі прыляцелі буслы, паўсюды ў гарадах і ў паселішчах Гукалі вясну. Нават наваградскі князь Шварн з Адэліяй прымалі ўдзел у Гуканне вясны, вадзілі карагоды. Паўсюды ў Літве пяклі 40 булачак, штоб у доме быў лад і дабрабыт.

У гэтыя святочныя дні, Міндоўг не спыняўся абдумываць акалічнасці паўночнага паходу атрада Ленгвіна. Гэты паход павінен быць паспяховым, інакш шматбожцы засумневаюцца ў цяперашняй сіле Міндоўга і яго ваяроў. Толькі паспяховы паход супраць лацінскіх рыцараў уздыме шматбожцаў на ўсеагульны супраціў лацінскім хрысціянам, а без яго рыцары па асобку лёгка знішчать шматбожцаў.

Як толькі скончыліс святочныя дні, ганец з Наваградка прынёс сумную навіну, памёр гандляр Міхайла. Ён даўно і цяжка хварэў. Мінула мабыць два лета, як ён захварэў пасля паўднёвага гандлярскага паходу. Гандлярства небяспечная праца, асабліва ў паўднёвых зямлях. Хворая вада, хворая ежа, хворыя людзі штодзенныя спадарожнікі гандляроў на поўдні. Гэтага не мінуюць і вельмі дасведчаныя, і разумныя людзі. Міндоўг

як толькі прыбыў у гэтыя мясціны, знайшоў у асобе гандляра Міхайла вельмі начытанага і добразычлівага наваградчаніна. Міхайла ў кожны час, калі да яго прыходзіў, адразу адкладаў сваі справы і ахвотна зносіўся. Гэтые зносіны былі прыемныя не толькі Міндоўгу, а і Міхайлу. Зараз з'явіўся дасведчаны і начытаны былы кіеўскі гандляр Андрэй, але зносіны з ім не былі гэтакімі шчырамі і сяброўскімі, як з Міхайлам.

У пахаванні прымалі ўдзел усі жыхары Малага замка, дзе ён жыў, і большасць жыхароў з пасада. Былі на пахавані Міхайла наваградскі князь Шварн з Адэліяй. Міндоўгу было прыемна адчуваць, што Шварн успрырмае радасць і гора ў яднані з наваградчанамі. На дваццаць восьмы дзень паходу атрад Ленгвіна вярнуўся.

— Кароль Літвы Міндоўг, на ўсім шляху ўздоуж ракі Нёман нашы дазорные ўбачылі толькі адно паселішча, яно знаходзіцца на левым берагу ракі ў зямле скаловаў, і прыблізна ў трыццаці вёрст ад левага рукавы вусця ракі. Скаловы добра ставіліся да нашых дазорных. Ад правага рукава вусця ракі Нёман мы аддаліліся на поўнач на мяжу з куронамі. Там атрад размясціўся ў дзесяці вёрст ад Мемельбурга. Дазорные былі выстаўлены ў розныя бокі. Тума, пабываўшы ў знаёмага курона, паведаміў што атрад лівонскіх рыцараў вярнуўся ў замак, алё колькасць яго паменшылась на два рыцара і дзесяць збраяносцаў. Куды накіроўваліс рыцары і дзеля чаго, куронцы не змаглі высветліць. У горадзе чатырнаццаць дамоў. Узяўшы горад з замкам у аблогу дазорнымі, мы не змаглі наблізіцца да прычала. Да карабелей і прычала магчыма было наблізіцца толькі каля брамы замка. У раніцы, калі яшчэ не світало, па падказке знаёмага курона, мы ўзялі ў палон усіх ахрышчаных куронаў. А калі пачалося світаць, самыя лепшыя лучнікі стрэлілі ад бліжэйшага да прычала дома ў два карабелі на прычале. Бліжэйшы вялікі карабель запаліўся, а другі хутка адчаліў і мы не змаглі яго запаліць. Насціл моста з начы быў уцягнут у замак. Мы разрабавалі горад, але дома не запальвалі. Жыхароў гарадскіх дамоў мы пазбіралі ў крайні дом і ахоўвалі іх.

— Ленгвін, корабель адплыў да таго як ваяры захапілі гарадскія дамы?

— Так, кароль Літвы Міндоўг, перад горадам мы спешыліся і на самым пачатку світання, мы ціха захапілі гарадскія дамы. З уцекшага карабеля не было бачна колькі нас.

— Добра, далей.

— Кароль Літвы Міндоўг, тое сухое трысце якое мы бралі з сабой, у паходзе панамакала і было непрыдатнае, таму мы падцягвалі ўсё драўлянае з гарадскіх дамоў да сцяны замка. Запальвалі пад прыкрыццем дошак і шчытоў з гарадскіх дамоў, адначасова стрэляя ў байніцы сцяны стрэламі з запалянымі наканечнікамі. З гэтакімі наканечнікамі стрэлялі ўнутр замка, але за чатыры дні замак так і не запаліўся. Мы спрабавалі пабудаваць мост, але доўгай карабельнай хвоі там не знайшлі. З малых лодак не атрымалась зрабіць мост. Спрабавалі пераплыць раку на конях, але круты і глыбокі бераг не дазволіў зачапіцца за вельмі вузкі бераг каля замку. На чацвёрты дзень аблогі замка, дазорные паведамілі, што да Мемельбурга накіроўваецца рыцарскі атрад з васямнаццацю рыцарамі і амаль у сотню збраяносцаў. Мы не паспелі іх атрад акружыць, алё наша сотня цяжкіх коннікаў зайшла ім у канец атрада, а спераду іх сустрэлі спешаные лучнікі з доўгімі дзідамі. З левага боку іх сустрэлі лучнікі, а за імі былі лёгкія коннікі. Калі за пяреднімі лучнікамі з'явіліся лёгкія коннікі, а ззаду цяжкія коннікі, і лацінцы ўбачылі мноства нашых ваяроў, у іх пачалася паніка і яны кінуліся на ўцёк. Мы забілі дзевяць рыцароў і каля восьмідзесяці збраяносцаў, астатнія ўцяклі. Сярод нашых ваяроў нема забітых і толькі пяцёра параненых.

— Ленгвін, а як праявіў сабе Траняты і яго жамойты?

— Кароль Літвы Міндоўг, Траняты выканваў усе ўказы сотніка і яго жамойты былі паслухмяны. Па заканчэнне бою, я дазволіў яму узяць сабе рыцарскі меч і надзець даспехі рыцара.

— Добра, рыцар Ленгвін. Дзякуй.

Пасля выхаду Ленгвіна, Альгерд пацікавілся:

— Міндоўг, ты меркуеш што гэтага паходу і бою з рыцарамі дастаткова, каб шматбожцы пажадалі зноў супрацiўляцца лацінскім хрысціянам?

— Альгерд, спадзяюся што будзе дастаткова. Цяпер трэба чакаць Волімунта, можа ён сустракаўся з прусамі і яны выказаліся аб сваіх думках.

Праз дзявяць дзён прыбыў гандляр Волімунт.

— Кароль Літвы Міндоўг, скалоў які жыве ў канцы левага рукава вусця ракі Нёман казаў, што ліцвіны нанеслі паразу лівонскаму атраду, забілі некалькі рыцараў. Яму гэта паведаміў скалоў, які жыве каля правага рукава вусця ракі.

— Волімунт, а казаў ці ён што скаловы і іншыя прусы цяпер будуць нападаць на хрысціянскіе замкі і атрады?

— Кароль Літвы Міндоўг, ён меркаваў што скаловы аб'ядналюцца з іншымі прусамі і будуць забіваць хрысціян.

— А гэты скалоў, які знаходзіцца ў канцы левага рукава вусця ракі, ен з кім жыве?

— Кароль Літвы, там два дамы і дзве сям'і. Праз іх зносяцца скаловы абодвух берагоў ракі Нёман.

— Волімунт, там яшчэ ўверх па раке ёсць паселішче скалоўаў. Яны ўдзельнічаюць у супраціве хрысціянам?

— Кароль Літвы, гэта рыбаловы. Спачатку іх таксама было дзве сям'і ў двух дамах, а зараз там восем дамоў. Хрысціяне яшчэ не натрапілі на іх, таму яны не ўдзельнічаюць у супраціве хрысціянам. Але я меркую што неўзабаве рыцарам будзе патрэбен замак уверху па ракі, штоб кантраляваць гандлярскі шлях і ліцвінскія вайсковыя перамяшчэнні.

— Добра, Волімунт. Дзякуй.

Увечары гуляючы ў шахі, Альгерд зноў паскардзіўся на Марту якая нервуе ўсіх на кухні. Апошнім часам у яе з'явілася звычка патрабаваць перад вячэрай келіх чырвонага віна.

— А я здзіўляюся, чаму яна мала п'е віна на вячэры, а потым выглядае як шмат выпіўшая. Так Марта вельмі дзіўная. Аднойчы я ёй казаў, што пачаў адкрыта выяваць супраць лацінскіх хрысціян, і таму мне трэба не дазваляць звяртацца да мяне, як да караля, а вяртацца да зварота Вялікі князь. Яна адразу зірнула на мяне, як на здрадніка, але гэта было імгненне, а потым яе позірк зьмяніўся на звычны, самоўпэўнены каралеўскі. І спакойна запэўніла мяне, што яна заўседы будзе каралевай. Што дзіўна, ўжо мінула больш за лета, а я па-ранейшаму не магу дазволіць звяртацца да мяне інакш чым, як да караля. У мяне такое адчуванне, што яна ведае маю і сваю будучыню, прытым цалкам упэўнена ў гэтым. Ужо не аднойчы ў мяне ўзнікала думка звяр-

нуцца да яе, штоб яна прадказа будучыню Літвы, але я заўседы спыняўся з-за таго, што як толькі я яе аб гэтым папрашу, яна адразу будзе адчуваць сабе больш моцнейшай за мяне.

— Міндоўг, у мяне таксама было падазрэнне, што яна прадказальніца, і не толькі яна, а і яе малодшая сястра. Мяне павядамлялі, што яе бачылі за ведзьмарскімі рытуаламі ў нальшанскай зямлі. Цябе не здзіўляе, што яна да гэтага часу не нарадзіла дзіця князю Даўмонту?

— Здзіўляе. Але яшчэ больш мяне здзіўляе, тое што Марта нарадзілася і доўгі час жыла не ў горадзе, нават не ў паселішча, сярод іншых людзей, а ў адзінокім доме лясніка, сярод звяроў. Калі я ўпершыню яе ўбачыў у памерлага Вісмунта, яна не выглядала здзічэлай. Памятаю мне тады казалі, што яна дачка лясніка і гэта мяне здзівіла. Марта ужо тады была ўпэўненай ў сабе гаспадыняй. А зараз так і наогул жадае кіраваць мною і ўсемі іншымі. Як так магчыма, хутка ператварацца ад сяброў звяроў да асобы жадаючай кіраваць усімі ўплывовымі людзьмі з розных кністваў? Памерлы наваградскі князь Ізяслаў гаварыў, што на палявані быў у гэтага лясніка. У апошняе яго паляванне там, жонка лясніка памерла. А сам ляснік памёр пасля вяселля Марты з Вісмунтом, тады яна сваю маладзейшую сястру ўзяла да сабе ў Любчу. Большасць жыцця Марты з сястрой ляснік даглядаў за імі адзін. Я ўпэўнен, што ў яго не было часу распавядаць сваім дачкам пра асабістасці жыцця выдатных імператараў і ваяводаў, як гэта рабіла мая маці мне з братам. Я сумневаюсь, што ён штосьці такое ведаў. Аднак яго старэйшая дачка лічыць, што раптоўна апынуцца замужам за князем достаткова штоб кіраваць іншымі.

— Так, Міндоўг. Яна лічыць што достаткова закахаць у сабе князя, ці нават караля і ужо магчыма адчуваць сабе ўпэўненай ва ўсім што гавораш, ці робіш, толькі таму што ты каралева. Яна стала гэтакай гонарлівай пасля таго, як стала каралевай.

— Яна спрабавала заганарыцца раней пасля нараджэньня першага сына, але я ёй растлумачыў, што трэба другі сын, і трэба іх выхаваць так, каб яны былі дастойны, штоб іх выбралі князямі. Летась у выхавальніцы сыноў я запрасіў Таісію, жонку гандляра Міхайла, але яна неўзабаве прапанавала замест сабе

сваю дачку Алесю. Тая таксама вельмі адукаваная і начытаная. Таісія казала, што ёй трэба наглядаць за хворым Міхайла, але я думаю што яна пасварылася з Мартай. А калі Марта стала каралевай, тады я меркую што яна захварэла на галаву, нават мне адказвала ў маіх жаданнях.

— Я заўважыў, што ты Міндоўг, стаў вельмі добразычлівым да адной служанкі.

— Так, я яшчэ не стары. У пачатку восені вярнуўшыся з гандлярскага паходу Волімунт, паведаміў што вышэй чым рыбацкае паселішча скаловаў па раке Нёман, з'явілісь лацінцы і пачалі будаваць дамы на левам берагу ракі.

— Волімунт, яны пагражаюць твайму гандлярскаму паходу?

— Кароль Літвы Міндоўг, пакуль не пагражаюць, іх мала. Але яны выбралі добрае месца, недалёка мазуры, якія ў саюзе з тэўтонамі, а ў скаловаў нема адзінства і яны слабыя. Я меркую што праз тры, ці чатыры лета яны будуць пагражаць маёй гандлярскай працы.

— Добра, Волімунт. Будзем думаць аб будучыні.

Пасля таго як гандляр пакінуў іх, першым выказаўся Альгерд:

— Міндоўг, атрымліваецца адной перамогі над рыцарамі недастаткова, каб узняць прусаў на далейшае супраціўленне лацінскім хрысціянам?

— Атрымліваецца што так. Але яны ведаюць пра маё жаданне ім дапамагчы. Ведаюць аб гэтым і лацінцы, таму і пачалі будавацца на левым берагу ракі Нёман.

— Дык можа зараз іх захапіць, штоб ведалі нашу ўплывовасць там?

— Зараз яны нам не перашкоджаюць, таму захопліваць два, тры дамы нема сэнсу. Калі яны амаль пабудуюць замак, тады мы захопім, дабудуем і будзе наш замак, ці што яшчэ лепей замак нашых сяброў скаловаў.

— Міндоўг, чаму прусы марудзяць з аб'яднаннем і агульным супрацівам лацінцам.

— Альгерд, ты жа ведаеш што ў кароткі час лацінцы захапіўшы зямлі шматбожцаў пераканалі легкаверных і маларазумных стаць хрысціянамі. Гэтыя новыя хрысціяне жывуць адным

днём, яны не думаюць аб будучыні. У будучыні тэўтоны іх прымусяць быць рабамі не толькі іх адзінага бога Хрыста, а і іх сапраўных рабоўладальнікоў — хрысціянскіх прапаведнікаў. Гэтых хуткасных хрысціян не шмат, але яны ёсць. Калі лацінцы даюць ім якісьці прывілеі, то іншые зайздросьцяць і пачынаюць думаць аб ахрышчанні. Толькі разумныя ўспрымаюць лацінскую веру, як рэчаісны спосаб прымусіць да рабства. Таксама тые шматбожцы ў каго хрысціяне забілі іх родых, заўседы будуць супрацiўляцца ім. Помста, моцны сэнс жыцця. Зараз усё вырашае сіла.

Нечакана ў сярэдзіне восені да Міндоўга з’явіўся Транята.

— Кароль Літвы Міндоўг, я жадаю каб усі жамойты, а не толькі ўсходнія, вызначылі мяне сваім князем. Дзеля гэтага мне патрыбна яшчэ тры мяча, дзевяць кальчуг, дзевяць шлемаў і дзесяць коннай збруі з жалезным стрэмені. Тады ў мяне будзе чатыры дзясяткі добра ўзброеных вавяроў, і я прайду па ўсім заходнім і паўночным паселішчам жамойтаў, і прызначу там сваіх намеснікаў.

— Траняты, калі ты жадаеш самастойна ісці ў паход па жамойцкім паселішчам, то добра і Пярун табе ў дапамогу. Рыцар Альгерд выдасць цябе ўсё, што табе патрэбна.

— Дзякуй, кароль Літвы Міндоўг.

Перад Калядамі прыбыў полацкі ваяр Копысь з яшчэ аднім полацкім ваяром.

— Кароль Літвы Міндоўг, ардынцы працягваюць перапіс жыхароў гарадоў і паселішчаў ва ўладзіміра-суздальскай зямлі, а таксама пачалі перапіс у наўгародскай зямлі. Кароль Літвы Міндоўг, я ўжо стары і замест мяне весткі будзе распавядаць надзейны полацкі ваяр Сымон.

— Добра, Копысь. Дзякуй.

На Каляды Міндоўг паслаў ганца ў паселішчэ Даўга з падарункамі. Пасля вяртанне, ганец распавеў, што Транята яшчэ не вярнуўся з паходу па жамойцкім паселішчам. Міндоўг пачаў перажываць за яго і таму праз дваццаць дзён паслаў ганца ў паселішча Пуцяты.

У моцныя маразы, вярнуўшыся ганец распавеў, што атрад Траняты паспяхова схадзіў у заходнія жамойцкія паселішча і ў

большасць паўночных паселішчаў. Зімуе ён у дабудаваным для яго вялікім доме паселішча Путяты.

За дваццаць дзён да вясны і новага 6766 лета (1258 па хрысціянскаму календары) ў Наваградку прадоўжылі будаваць падмурак абодвух вежаў Вялікага замка.

У пачатку вясны атрад жамойцкага князя Траняты накіраваўся ў тые жамойцкія паселішча ў якіх ён не паспеў пабываць у пачатку зімы.

На пры канцы вясны да Міндоўга прыйшоў гандляр Волімунт, вярнуўшыйся з гандлярскага паходу на поўначы.

— Кароль Літвы Міндоўг, лацінцы пабудавалі ужо чатыры дамы на левам беагу ракі Нёман. Рыбакі, якія знаходзяцца ніжэй па раке, казалі што яны ўзаемна бачылі лацінцев, але не размаўлялі з імі.

— А што скаловы і іншые прусы?

— Кароль Літвы Міндоўг, па-ранейшаму ў іх нема адзінства і згоды між сабой.

— Зразумела, Волімунт. Дзякуй.

Перад святам Яна Купалы, з’явіўся полацкі ваяр Сымон.

— Кароль Літвы Міндоўг, у русінскім Ноўгарадзе ардынцы пачали перапіс жыхароў горада. Ноўгародцы ўзбунтаваліся, іх падтрымаў княжыўшы там сын князя Аляксандра Яраслававіча Васіль. Тады князь Аляксандр Яраслававіч павёў войскі ў горад, а яго сын Васіль уцёк у Пскоў. Князь Аляксандр Яраслававіч бязлітасна расправіўся з дружынай Васіля, каго цяжка параніў, а каго забіў. Самаго Васіля злавіў у Пскове, ўзяў пад варту, а потым адправіў яго ў Уладзімір. Наўгародцы адкупіліся і запэўнілі яго, што будуць рэгулярна выплачваць даніну, але перапіс не ўчынілі.

— Добра, Сымон. Дзякуй.

Неўзабаве з’явіўся ўстрывожаны гандляр Міхалок.

— Кароль Літвы Міндоўг, я ўчуў размову двух уплывовых асоб ў Валыншчыне. Адзін казаў, што цемнік хана Берке Бурундай запатрабаваў ад князя Данііла Раманавіча ісці з ім у паход на Літву. Данііл Рамановіч схільны замест сабе паслаць з ардынцамі свайго брата князя Васілька.

— Няўжо Данііл Рамановіч нападзе на зямлю, дзе княжыць яго любы малодшы сын Шварн, тым больш у той час, калі жонка Шварна цяжарная?

— Кароль Літвы Міндоўг, ардынскі ваявода Бурундай самы моцны ў хана Берке, і таму Данііл Рамановіч яго асцярагаецца.

— Міхалок, цябе вядома калі яны нападуць на нас і якім шляхам?

— Кароль Літвы Міндоўг, гэтага я не ведаю. Я калі гэту размову пачуў, то адразу накіраваўся сюды, але па паводзінам іх ваяроў было бачна, што ў хуткім часе яны накіруюцца ў вайсковы паход.

— Добра, Міхалок. Дзякуй.

Міндоўг адразу выклікаў ганцоў і накіраваў іх у паўднёвыя землі, а таксама ў Нальшаны, у Ліду і ў Жырмунты. Потым гледзячы на сумны твар Альгерда, і нецярплівасць у вочах, сказаў:

— Хан Берке, разведаўшы што Данііл Рамановіч парадніўся са мной, жадае нас пасварыць. Зразумело парадніўшысь, мы абодва сталі больш моцныя, а яму патрыбна штоб мы аслабелі. Нічога, адзін ардынскі ваявода адчуў на сабе наша ліцвінскае яднанне і моц нашых дазорных, адчуе і іншы. Праз тры дні з'явіўся ў Міндоўга ганец з Здзітава.

— Кароль Літвы Міндоўг, нашы дазорные выявілі вялікае войска ардынцаў і паўднёвых русін каля крэпасці Ветла ў ракі Прыпяць. Зараз яны накіроўваюцца на наш Здзітаў.

— Колькасць гэтага войску выявілі?

— Не, кароль Літвы Міндоўг. Дазорные толькі казалі, што войска вялікае. Наш князь указаў паўсюды паліць траву. Я таксама паспеў папярэдзіць слонімскага князя Вілікаіла аб пагрозе, і ен таксама ўказаў паўсюды паліць траву.

— Добра. Альгерд, збірай на раніцу заўтрашнега дня ўсе войска воруцкага княства. А я з ганцом адпраўлюся ў Наваградак, штоб сення чатыры сотні адправіліся ў Слонім. Калі прыйдзе нальшанскі атрад князя Даўмонта ў чатыры сотні, няхай не затрымліваюцца, адразу ідуць у Слонім. Толькі дзве сотні з Крэва застануцца ў Наваградку. Сотні Доўбуда, лідскія і жырмунтцкія таксама няхай ідуць у Слонім. Ганцы да Жыгімонта і Эйсманта няхай перададуць мой ўказ князям, ісці ў Ваўкавыск.

Бліжэй да вечара, чатыры сотні наваградчан з князем Шварнам, ваяводам Вітольдам і рыцарам Ленгвінам, накіраваліся ў Слонім. З ранку наступнага дня, чатыры сотні воруцкага княства і сотня Доўбуда адправіліся ў Слонім.

Скачучы побач з Доўбудам, Міндоўг з неахвотай выслухваў жаданне гэтага старога, але да гэтуль сапраўднага волата, пазмагацца з супернікамі. Міндоўг падазраваў, што Доўбуд выглядаў гэтак бадзера не ад таго, што рэгулярна займался трэніроўкай з мячом, а хутчэй за ўсё ад працы ў кузні. Доўбуд нечакана быў вельмі гаманлівы, што замінала Міндоўгу засяродзіцца на больш цікавай думкі. Раптам у Міндоўга ўзнікла думка, што Доўбуд зараз гэтак гаманлівы ад таго, што ён нервуецца за сваё майстэрства ваяра. Праца ў кузні, гэта зусім іншае чым трэніроўка ў бітвах на мечах. Зараз Ленгвін, які на галаву ніжэй чым Доўбуд, будзе пераможцам у іх сражэнні.

Сам уладар Літвы стаў радзёй займацца трэніроўкамі з мячом, праз дзень, а то і праз два, але для яго гэта была і ёсць самая ўлюблёная праца з дзяцінства. Калі ў яго быў кепскі настрой, ён выклікаў маладога ваяра, а то і двух, тады кепскі настрой сумесна з потам выходзіў з яго ручаём. Магчыма Доўбуд у кузні таксама выганяў свой кепскі настрой.

Міндоўг вырашыў сотню Доўбуда накіраваць на сутычку з ардынцамі ў цеснаце, дзе волату на высокім кані будзе зручна рубіць шмат ардынцаў на іх нізкіх конях. Не паспелі яны наблізіцца да Слоніма, як сустрэлі аднаго з галоўных дазорных Будзіміна, сына рыцара Дзіміна.

— Кароль Літвы Міндоўг, ардынцы сумесна з валынянамі захапілі Здітаў, разрабавалі і знішчылі яго, а потым накіровалісь на захад. Князь Слоніма Вілікаіл, ведаючы што ты кароль Літвы, набліжаешся да яго, прасіў спытаць цябе, ісці яго атраду ў чатыры сотні з табой на захад ці не, а таксама ці патрыбны яго шчыты з дошак? Наваградчане з князем Шварнам накіраваліся ў Ваўкавыск.

— Будзімін, перадай князю Вілікаілу, што няхай яго атрад застаецца ў Слоніме. Калі ён спатрэбіцца, я прышлю ганца. Няхай дапаможа жыхарам Здзітава. За мной прыйдуць яшчэ атрады, ўсіх іх накіраваць у Ваўкавыск.

Міндоўгу гэта навіна спадабалась тым, што яны паспелі да Слоніма раней чым ардынцы з русінамі. Ён не шкадаваў, што не ўбачыў Яньку, галоўнае што яна ў бяспечнасці. Звяртаючыся да Доўбуда, ён сказаў:

— Ардынцы з русінамі зразумелі, што ліцвіны ўжо ведаюць аб іх паходзе і падрыхтаваліся да яго. Гэта яны зразумелі па спаленай траве.

Калі Міндоўг з атрадам падышоў да Ваўкавыска, сустрэўшы яго князь Глеб, сказаў:

— Кароль Літвы Міндоўг, дазорныя паведамілі, што ардынцы з русінамі накіраваліся на Бярэсце. Летась, мы пабудавалі замак для майго малодшага брата Ізяслава ў дваццаці вёрст на захад, каля мяжы з адасобнымі яцвягамі. Прышэдшы наваградскі атрад князя Шварна я накіраваў туды, а атрады князя Жыгімонта і князя Эйсманта чакаюць тваіх указаў.

Наблізіўшыйся князь Эйсмант, які прывітаў Міндоўга, і паведаміў :

— Кароль Літвы Міндоўг, я чакаю што ардынцы з русінамі пасля Берасцья пойдуць на адасобных яцвягаў. У апошнія лета русіны часта нападаюць на іх, я ўжо не ведаю што там яшчэ можна грабіць. Мой унук Яраш, сын князёўны Тэклі, зараз княжыць у гэтых яцвягаў, яму ўжо дваццаць два лета. Дазволь Міндоўг, дапамагчы ім сваім атрадам.

— Добра, князь Эйсмант, дазваляю. Князь Жыгімонт, дапамагі сваім атрадам абараніць гэтых яцвягаў сумесна з князем Эйсмантам.

Адразу пасля гэтай размовы, атрады князёў Эйсманта і Жыгімонта накіраваліся на паўночны захад. Неузабаве з’явіліся лідскі і жырмунтцкі атрады, а потым і атрад нальшанскага князя Даўмонта ў чатыры сотні. Пакуль гэтыя атрады ваяроў адпачывалі, Міндоўг вырашаў пагаварыць з Даўмонтам.

— Даўмонт, князь Эйсмант меркуе, што ардынцы з русінамі пасля Бярэсце нападуць на адасобных яцвягаў. Жадаючы абараніць суседніх да яго яцвягаў, якімі кіруе князь Яраш, дваццаці двух летні сын Тэклі, я дазволіў ягонаму атраду, а таксама атраду князя Жыгімонта дапамагчы ім. Міндоўг змоўкнуў, чакая што скажа Даўмонт, але той нічога не сказаў, тады кароль дадаў:

— Табе Даўмонт трэба размясціць свой атрад між Ваўкавыскам і замкам Эйсманта. Таксама трэба штоб твас дазорные супрацоўнічалі з дазорнымі Эйсманта і Жыгімонта.

Калі Даўмонт накіраваўся ў свой атрад, Міндоўг са здзіўленнем падумаў, чаму Даўмонту лепей шмат лет быць з жанчынай якая не можа нарадзіць яму дзіця, чым з той, якая яму нарадзіла і добра выхавала, і да якой з вялікай павагай адносіцца яго тата. Штобы не здарылась між ім і Тэкляй, а пацікавіцца як выглядае яго сын, які ў яго характар, што ад яго, Даўмонт павінен. Калі князь Глеб паведаміў, што ардынцы з русінамі накіраваліся ў Бярэсце, Міндоўг пераканаўся што яны не пойдуць у Літву. Таму ён без сумнёва дазволіў Эйсманту ісці на дапамогу сваему ўнуку, а Даўмонта накіраваў у тые мясціны штоб у яго з'явілась думка аб сваім сыне.

Калі першыя дазорныя апавясцілі Міндоўга, што ардынцы і русіны накіраваліся на поўдзень, ён паспеў пагутарыць з князем Глебам аб узмоцненні абараназдольнасці Ваўкавыска. А калі іншыя дазорные запэўнілі Міндоўга, што ворагі ўжо вярнуліся ў валынскія зямлі, тады ён указаў ганцам апавесціць усе атрады штоб вярталіся ў сваі зямлі.

Пры вяртані ў Воруту, дазорны паведаміў Міндоўга, што князь Даўмонт накіраваўся ў Нальшаны, не пажадаўшы пабачыцца ні з сынам Ярашом, ні з князем Эйсмантам. Вярнуўшысь у Воруту, Міндоўг выказаў Альгерду думку, што русіны пацверджалі сваю пакорнасць цемніку Бурундаю, але пры тым стараліся пазбегчы бітвы з ліцвінамі

Гандляр Андрэй, вярнуўшысь з поўдня, паведаміў, што паходам русін сумесна з ардынцамі кіраваў малодшы брат Данііла Раманавіча князь Васілька, а таксама сыны Леў і Раман. Таксама ен паведаміў, што ўсходнія русіны абураюцца перапісам у іх землях, праводзімых прадстаўнікамі Арды.

Прыбыўшы пасля Калядаў у зімку, полацкі ваяр Сымон распавеў:

— Кароль Літвы Міндоўг, перад Калядамі ў Ноўгарад прыбыў з Уладзіміра ардынскі пасол і абвесціў, што калі яны не падпарадкуюцца яго ўказу аб перапісу, то ардынскі атрад, знаходзяшчыйся ў Уладзімірскай зямлі, пойдзе на Ноўгарад.

Наўгародцы пагадзіліся. Добра ведаючы наўгародцаў, князь Аляксандр Яраслававіч са сваёй дружынай і ардынскім атрадам сталі ў Гарадзішча, на берагу ракі Волхаў. Як толькі пачалі праводзіць перапіс, наўгародцы ўзбунтоваліся. Тады князь Аляксандр Яраслававіч з дружынай і ардынцамі ўвайшлі ў горад. Праз малы час супраціў спыніўся. Князь Аляксандр Яраслававіч пакінуў ў Наўгародзе сваего сына Дзмітрыя, і накіраваўся ў Уладзімір. Узімку ўладар Літвы накіраваў ганца да Траняты з пытаннем, ці ёсць сярод яго дазорных жамойтаў тые хто добра ведае найкарацейшы шлях праз жамойтаў на куронскаю зямлю. Калі такіе ёсць, то трэба з ім, а таксама з сынам Пуцяты Віташлавам, прыбыць да яго. Праз два дні ў Міндоўга з'явіліся Траната, Віташлаў і яшчэ адзін жамойт.

— Траняты, ты мне казаў, што ў чатыры паўночныя жамойцкія паселішча ўжо прыходзілі лацінскіе хрысціяне. Хто іх прыводзіў? І ці ёсць дарогі па якім яны ішлі?

— Кароль Літвы Міндоўг, дарог нема. Яны прыйшлі па лясным сцежкам і сярод іх быў то ці курон, ці ліў, але ніхто нікаго не зразумеў. Так і сышлі. У мяне ёсць дазорны Ёнавас, ён ляснік і паляўнічы. Ёнавас добра ведае паляўнічага з суседнега паўночнага паселішча, якому можна давяраць, і які ведае мясціны на поўнач.

— Віташлаў, спытай у Ёнаваса, як далёка ад сваего паселішча, яго сябра ведае паўночныя мясціны.

— Кароль Літвы Міндоўг, Ёнавас гаворыць што яму сябра хваліўся аб паляванні на поўначы каля двух дзён шляху.

— Добра. Траната, на прыканцы зімы мне трэба штоб Віташлаў з дазорным Ёнавасам і яго сябрам, праводзілі маіх дазорных найкарацейшым шляхам да куронаў каля Мемельбурга. Гэты шлях пажадана штоб праходзіў праз жамойцкія паселішча, якія добра ставяцца да цябе Траната і да нас ліцвінаў. Трэба выведаць якія ім падарункі патрэбны, можа ганчарныя вырабы, ці штосьці іншае.

— Добра, кароль Літвы Міндоўг. Калі прыйдуць твае дазорныя, мы будзем падрыхтаваны. Кароль Літвы Міндоўг, мне патрэбна яшчэ сем кальчуг для павелічэння маёй дружыны.

— Добра, рыцар Альгерд выдзяле табе кальчугі.

На пры канцы зімы Міндоўг накіраваў Туму і Кодруна спачатку да Траняты, а потым да куронаў. На дзяваты дзень вясны і новага 6767 лета (1259 па хрысціянскаму календары) Адэля, жонка князя Шварна, нарадзіла дзяўчынку. Яе назвалі Ганна, ў гонар маці князя Шварна.

На здіўленне Міндоўга, князь Шварн быў задоволен тым, што нарадзілася дачка. У Наваградку вясной прадоўжыліся, як і летась, працы па ўзмацненню падмурка двух новых вежаў і сцен між імі. Праз сорак дзён Тума і Кодрун вярнуліся ў Воруту. Яны распавялі, што замест тых ахрышчаных куронаў, якіх два лета ў мінулым забілі ліцвіны, ўзялі ізноў прыбыўшых з альманскіх зямель. Усе бліжэйшые да крэпасці дамы, яны засялілі горажанамі з альманскіх зямель, яны жа дапускаюцца да працы ўнутры крэпасці. Усіх куронаў, якія пражывалі паблізу да крэпасці павыганялі з іх дамоў.

Пачалі будаваць царкву. Усе дровы, якія загатаўляюць куроны, прыносяць і пакідают іх перад мостам у крэпасць, а потым служкі крэпасці заносяць іх. Кодрун прымеціў, што калі куронам загадываюць больш не прыносіць дроў, гэта азначае што заўтра атрад рыцароў пакідае крэпасць і ідзе ў паход. А Тума са знаёмым куронам пабываў у іншых паселішчах куронаў. Ва ўсіх паселішчах, дзе яны былі, амаль усі супраць лацінскага хрысціянства і жадаюць з іншымі моцнымі шматбожцамі аб'яднацца, штоб зніШчаць лівонскіх рыцараў.

— Тума, а якім чынам вы гэта высвятлілі?

— Кароль Літвы Міндоўг, мы спачатку размаўлялі з валхвом, а потым з тымі ўплывовымі куронамі на якіх ён паказываў.

— Але ёсць і такія хто можа здрадзіць. Хто яны і колькі іх?

— Кароль Літвы Міндоўг, гэта тые не на чыю карысць вырашыў спрэчку волхв. Значная большасць пагаджаюцца з пастановай спрэчкі, але ёсць такія хто назаўсёды будуць нездаволеныя гэтым. Гэтакія шукаюць сабе сяброў з іншымі нездаволенымі, сярод слабаразумных і гультаёў. Але такіх вельмі мала. Значная большасць паважаюць валхва і жадаюць не рушыць даўніны.

— Як далёка, вы прайшлі па куронскім паселішчам?

— Кароль Літвы Міндоўг, прайшлі далёка, амаль да ліваў.

— Добра, дзякуй. Праз дваццаць дзён пойдзеце ў паход.

Наступаючым днём прыбылі да караля выкліканыя Ленгвін, Транята і новы намесьнік і сотнік жырмунтаў Скірмонт, сын памерлага намесьніка Радмонта. Міндоўг растлумачыў, што мэта паходу будзе знішчаць як мага большы атрад лівонскіх рыцараў. Калі не атрымліваецца знішчыць іх у крэпасці, то трэба чакаць калі яны выйдуць у паход. Таксама трэба прадэманстраваць сваю моц пераможцаў перад куронамі і перад жамойтамі. У паселішчах жамойтаў, якія будуць на іх шляху, выдаць нашы падарункі, а на зваротным шляху прадэманстраваць нашу пераможную здабычу.

У паход пайшлі две сотні наваградчан, дзве сотні ваяроў воруцкага княства, сотня жырмунтаў і шэсць дзясяткаў жамойцкіх ваяроў дружыны Траняты. Міндоўг навумысна далучыў сотню жырмунтаў да гэтага паходу, штоб яны знайшлі паразуменне з жамойтамі. Гэта было вельмі важна дзеля будучыні, таму што жырмунтцкае паселішча было бліжэйшым да жамойтаў. Сотніку Скірмонту ў гэтым паходзе давядзецца ваяваць побач з жамойтамі, таму трэба было дапамагаць Траняце, і наладзіць з ім узаемны давер. У гэтым паходу вырашальным будзе праца дазорных, таму іх было шмат.

Атрад Ленгвіна накіраваўся на поўнач пасля заканчэння асноўных вяснавых, палявых прац. Па задумцы Міндоўга, ў апошнім жамойцкім паселішчэ перад куронамі, застанецца Вітаслаў з тымі конямі, якія выкараставаліс дзеля перасовывання ежы для атрада. Калі атрад Ленгвіна знойдзе добрае месца дзеля стаянкі атрада, тады жамойт Ёнавас з сваім сябрам паляўнічым, вярнецца ў паселішча жамойтов, дзе застаўся Вітаслаў. А да Вітаслава прыцягнуць новаю ежу з паселішча Путяты. Міндоўг меркаваў, што Ленгвіну спатрэбіцца доўгі час чакання, пакуль настае вырашальны момант для нападу на рыцараў. Таму ён яшчэ накіруе чатырох рыбакоў да Вітаслава.

Выхавацелька васьмілетніх сыноў Міндоўга, Алеся нервавалася ў дні паходу яе мужа рыцара Ленгвіна. Сыны Міндоўга былі вельмі жвавыя і ахочыя да ігрышч, у тым ліку розных змаганняў. Іх вельмі цяжка было прымусіць паважліва слухаць выхавацельку, штоб набыць патрэбныя веды. Міндоўг аднойчы быў сведкам, як Марта абразліва прыпыняла Алесю, ў час

навучэння яго сыноў. Тады ён папярэдзіў Марту, што калі гэта паўтарыцца, то ён адмовіцца ад назвы караля Літвы, і яна ўжо не будзе каралевай.

Гэта пагроза супэніла яе ўмешанне ў навучанне сыноў. Але яна ў помсту не дапускала яго да сабе доўгі час.

На трыццаць дзевяты дзень паходу атрад Ленгвіна вярнуўся.

— Кароль Літвы Міндоўг, наш атрад размясціўся ў васьмі вёрст ад Мемельбурга. Дазорные былі выстаўлены ў розныя бокі. Іх колькасць была достатковай, каб наглядаць ад правага рукавы вусця ракі Нёман і да мяжы з лівамі. Калі на дваццаты дзень нашага наглядання, дазорные паведамілі, што з паўднёвага захаду ідзе атрад лацінцев з васямнаццацю рыцарамі і дзевяноста двума збраяносцамі, пад кіраўніцтвам важнага рыцара. Як толькі гэты атрад з'явіўся ў Мемельбургу, адразу ім не спатрэбіліся дровы для крэпасці. Тады я рызыкнуў і вялікую частку нашага атрада накіраваў на паўночны ўсход. Я меркаваў, што гэта лацінскі атрад падышоў да Мемельбурга, каб аб'яднацца з рыцарамі ў крэпасці і ісці далей на паўночны ўсход. Калі ў раніцу яны накіраваліся на паўночны ўсход, я ўпэўніўся, што ў нас усё добра атрымаецца. Нам засталася знайсці выгаднае месца для нападу, такое каб нечакана для іх, яны былі акружэны, і штоб у іх не было магчымасці ўцячы. Такое месца было каля гарадзішча Шкуды (сучасная назва Скуодас) у сямідзесяці вёрст перад землямі ліваў. Наш нечаканы для іх напад і абстрэл са ўсіх бакоў, выклікаў у іх паніку, таму мы знішчылі ўсіх лацінцев, ніхто не змагчы ўцячы. У нас адзін забіты, сярод жырмунтаў, дваццаць пяць параненых. У лацінцаў было трыццаць тры рыцара. Памятая аб тваім кароль наказе, я аддаў даспехі і зброю важнага рыцара Траняце, а таксама большасць рыцарскіх даспехаў раздарыў жамойтам. Некалькі даспехаў аддаў ваярам з паселішча жырмунтаў. Калі праходзілі побач і праз паселішча куронаў, мы дэманстравалі нашу пераможную здабычу, таксама і ў жамойцкіх паселішчах. Я з Тумам гутарылі з куронамі розных паселішч. Яны жадаюць супраціўляцца, але сярод іх нема таго хто ўзначаліць супраціў лацінцам, валхвы ў іх старыя. Таму куроны спадзяюцца на нас, ліцвінаў. Больш цяжкае становішчэ і большае жаданне супраціва на поўначы

зямлі куронаў, каля мяжы з лівамі, таму што лівы амаль цалкам падуладны лівонскім рыцарам і лацінскай Царкве.

— Добра, Ленгвін. Дзякуй.

Калі Ленгвін пакінуў іх, Альгерд мовіў:

— Кароль Літвы Міндоўг, я лічу што гэты паход за апошніе лета самы паспяховы.

— Так, гэтым паходам мы дамагліся таго чаго жадалі. Але лацінскіе рыцары аб'едналісь і ішлі вялікім атрадам штоб выканаць якуюсь патрыбную для іх справу. Мы гэтаму перашкодзілі, але ў гэтай гідры вырасце новы атрад і яны зноў прыйдуць выконваць сваю хрысціянскую працу. Нам патрыбна наладзіць сярод куронаў добрых разведнікаў, штоб ведаць задумкі лацінцаў.

На наступны дзень Міндоўг выклікаў да сабе Туму і Віталава. Кароль Літвы растлумачыў, што ім трэба пераселіцца ў паселішча жамойтаў. Тума пераселіцца ў паўночнае паселішча жамойтаў і наладзіць хуткаю сувязь з рознымі куронамі праз сваего сябра з Мемельбурга. Віталаў паселіцца ў жамойцкае паселішча пасярэдзіне між Тумой і паселішчым Пуцяты, і ад яго трэба навіну хутка перадаць да караля Літвы. Праз пяць дзён Міндоўг накіраваў з Тумой і Віталавам шэсць цесляроў штоб пабудавалі два дамы для іх. Таксама з імі былі чатыры коня, якіх трэба было пакінуць для Тумы і Віталава. Кароль Літвы выдзяліў Туме шмат падарункаў для куронаў і жамойтаў.

Неўзабаве прыбыў гандляр Міхалок.

— Кароль Літвы Міндоўг, да князя Данііла Раманавіча прыбыў пасол ад ваяводы Бурундая з запытаннем сустрэчы яго на мяжы галіцкай зямлі з волхоўскай. Данііл Раманавіч замест сабе накіраваў на сустрэчу брата Васілька, старэйшага сына Льва і холмскага біскупа з падарункамі. Ці падарункі не спадабаліся Бурундаю, ці то што Данііл Раманавіч на сустрэчу накіраваў замест сабе іншых, але гэты ардынец раззлаваўся і прымусіў князя Васілька разбіраць усі абарончыя ўмацаванні ўсіх русінскіх гарадоў, якія былі на іх шляху. Ужо разбурылі ўмацаванні ў чатырох гарадах, таму я штоб не трапіць ім на вочы хутка павярнуўся ў Літву.

— Міхалок, князь Васілька суправаждае Бурундая са сваім войскам, ці з дружынай?

— Кароль Літвы Міндоўг, ён суправаждае са сваёй малой дружынай.

— А ў русінаў ёсць весткі пра нашу перамогу над лацінскімі рыцарамі?

— Не, кароль Літвы, пакуль нема.

— Добра, Міхалок. Дзякуй. Убачыўшы ўстрывожаны погляд Альгерда, Міндоўг супакоіл сябра.

— Я меркую што Бурундай не пойдзе на Літву, а калі пачуе што мы нанеслі паразу лацінскім рыцарам, то тым больш. Нягледзячы, на ўсё большае ўмацаванне адасобленнасці ўлуса хана Берке ад галоўнай стаўкі Арды, саюз між усімі ардынцамі з Нікеяй супраць лацінскага хрысціянства застаецца. Але я накірую ганцоў у паўднёвыя і паўднёва-заходнія княствы, штоб адправілі сваіх дазорных для назірання за землямі паўднёвага суседа.

Наступным днём прыбыў гандляр Волімунт.

— Кароль Літвы Міндоўг, тэўтоны і лівонцы сумесна пабудавалі замак на правам берагу ракі Інструч, якая праз адну вярсту ўпадае ў раку Ангpаппу і дае пачатак асноўнай ракі прускіх самбаў Преголь. Гэты замак знаходзіцца побач з прускім гарадзішчам Карзовін на гары Святога Георгія. Лацінцы далі назву гэтаму замку Георгенбург. Ён прызначаецца дзеля ўзмоцнення хрысціянства сярод прусаў.

— Волімунт, атрымліваецца, прусы не гатовы для нападу на лацінцаў?

— Так, Кароль Літвы. А на раке Нёман будаўнічые працы па замку пакуль ідуць марудна. Зараз яны не перашкаджаюць нам у гандлярскім паходзе.

— Добра, Волімунт. Дзякуй.

Калі гандляр пакінуў іх, Міндоўг усталеваўшысь у сваіх ранейшых думках паведаміў:

— Я замацаваўся ў сваёй думцы, што лацінцы адчуўшы нерашучасць прусаў, вырашылі яшчэ больш умацаваць сваю перавагу над імі, штоб у далейшым без асцярогі запрашаць на гэтые землі перасяленцаў з альманскіх зямель. Тым больш, што на поўдзень ад іх знаходзяцца таксама хрысціяне.

— Міндоўг, няўжо мы не дапаможам прусам?

— Альгерд, пакуль яны не пачуюць сваю мажлівасць супраціўляцца лацінцам, наша дапамога будзе дарэмнай. Нам лепей і лягчэй дапамагчы куронам і земгалам, тым больш што на поўдзень ад іх знаходзяцца таксама як і яны шматбожцы. А прусы, гледзячы як куроны, ці земгалы з нашай дапамогай перамогаюць лацінскіх рыцараў, пажадаюць таксама іх знішчаць. Праз дзевяць дзён прыбыў ганец ад Ваўкавыскага князя Глеба.

— Кароль Літвы Міндоўг, нашы дазорные наглядалі за ардынцамі ў паўночнай часткі валынскай зямлі. Ардынцы пасля разбурэння ўмацаваній русінскіх гарадоў, накіраваліся на захад у зямлі хрысціянскіх ляхаў.

— Добра. Дзякуй. А праз дваццаць дзён прыбыў да Міндоўга гандляр Андрэй. Ён паведаміў, што ардынцы пасля зраўнавання ўмацаваній галіцкавалынскіх гарадоў, пайшлі на захад і захапілі хрысціянскіе гарады Люблін і Сандамір. З ардынцамі ў гэтым паходзе былі атрады князя Васілька і яго пляменнікаў Льва і Рамана. Перад Калядамі прыбыў полацкі ваяр Сымон.

— Кароль Літвы Міндоўг, купец з русінскага Ноўгарада распавеў, што ардынцы правелі перапіс жыхароў не толькі дзеля збірання даніны, а таксама для ўсталявання чысла ваяроў якіх выклікаюць у ардынскае войска.

— Для Ноўгарада, дзе ўсі жыхары імкнуцца гандляваць а не ваяваць, гэта будзе цяжка зрабіць. Я меркую, што гэта патрабаванне ардынцаў выклікае шмат незадаволенасці.

— Так, кароль Літвы Міндоўг, незадаволенасць ёсць. Пры тым купец думае, што ардынцы патрабуюць ваяроў ад Ноўгарада ў апошнюю чаргу, таму што змяншэнне гандля не выгадна ардынскім гандлярам.

—Добра. Дзякуй.

Узімку ад куронаў былі весткі, што лівонцы павялічваюць колькасць сваіх рыцараў. На пры канцы зімы Міндоўг атрымаў вестку, што нават кароль Даніі пажадаў накіраваць з Рэвеля, што ў зямлі эстаў, сваіх рыцароў на сумесны з лівонцамі паход супраць Лютвы. А ад курона, які зносіўся з скаловам, у вусця ракі Нёман, пачуў вестку, што сярод прусаў, нават самбаў, ёсць тыя хто супрацоўнічае з хрысціянамі. Пазней, ён жа перадаў, што сярод помезан ёсць ваявода Матто, які стаў актыўным пры-

хільнікам лацінскіх хрысціян. Усе гэтыя весткі сведчылі, што лацінская Царква вырашыла аб'яднанымі намаганнямі лацінскіх хрысціянскіх ваяроў знішчыць галоўную перашкоду распаўсюджвання іх уплыву ў гэтых землях — Лютву. Адно цешыла Міндоўга, што яго чуйка прадбачыла гэта і ён арганізоваў нагляд за супернікам.

У пачатку вясны і новага 6768 лета (1260 па хрысціянскаму календары) з'явіўся ў Міндоўга Транята.

— Кароль Літвы Міндоўг, я чую што неўзабаве мы будзем ваяваць з хрысціянамі. У мяне ўжо ёсць сотня ваяроў, але трошкі нехапае даспехаў і мячоў.

— А хто навучае іх бітвам на мечах?

— Кароль Літвы Міндоўг, я з сваім памочнікам навучаем.

— Добра. Альгерд, выдай Траняце і яго ваярам даспехі і мечы.

Міндоўг задумаўся, чаму так атрымалась што Траняце я ўдзяляў менш часу, чым старэйшаму сыну Войшалку, а рысы характара і імкненне да жыцця, значна больш маі ў Траняты, чым у Войшалка? Так, у іх розныя выхаванні. Міндоўгу было добра вядома жыццё ў паселішча Даўга. Жыхары паселішча не імкнуліся наладзіць сваё жыццё як у ліцвінаў Наваградка, яны гэтага жыцця не ведалі і не імкнуліся ведаць. Для іх жыццё было добрае, калі яно было лепей чым у суседа гэтага жа паселішча. Да іх прышоў князь ліцвінаў, пабудаваў ім самы лепшы дом у паселішча, і на гэтым усе іх мары скончыліся. Дзіўна што ў гэтым нерухомым асяродзе з'яўляецца дзіця, якое вельмі цікавіцца ўсімі незвыклымі рэчамі, потым незвыклымі гульнямі, як сражэнні на драўляных мечах, а ў дарослым узросце жадае ўсімі кіраваць і ведае што для гэтага патрэбна. Міндоўг не навучаў яго быць князем, ён толькі абвясьціў жамойтам, што Транята іх князь. Уладар Літвы прыгадаў што яго тата князь Рынгольд таксама не навучаў яго як стаць добрым князем. Міндоўг самастойна вырашыў стаць моцным ваяром, і стаў ім з дапамогай рыцара Эйсманта.

Таксама Транята самастойна знайшоў шлях палепшэння не толькі свайго жыцця, а і жыцця сваіх супляменнікаў. На дваццаты дзень вясны, кароль Літвы накіраваў свайго ганца да Тумы ў паўночнае паселішча жамойтаў. Ганцу трэба было перадаць

наказ Міндоўга, штоб ён з дапамогай куронаў выведаў у якіх паўночных паселішчах куронаў каля мяжы з лівамі, супрацiўляюцца хрысціянізацыі, а якіе цалкам падпарадкаваны лаціня-нам. У тых паселішчах трэба знайсці куронаў якіе супраць лацінскай хрысціянізацыі. Да Купалля трэба паведаміць аб гэтым. Перад Купаллем у Воруту прыбыў гандляр Міхалок. Ён распавеў каралю Літвы, што ардынцы прымушаюць галіцка-валынскіх князёў правесьці перапіс жыхароў гарадоў і паселішч.

А наступным днём прыбыў ганец з чаканымі весткамі ад Тумы.

— Кароль Літвы Міндоўг, Тума перадаў, што ёсць адно рыбацкае паселішча Ліва (Лібава, сучасная назва Ліепая), дзе амаль усе ахрысціўшыяся. Гэта паселішча куронаў, але пасля таго як лацінцы захапілі зямлю ліваў, то шмат ахрышчаных ліваў прыйшлі ў гэтае рыбацкае паселішча на берагу мора, і пад пагрозай хрысціянскіх рыцароў пабудавалі сабе дамы і прымусілі куронаў ахрысціцца. Але ў адной сям'і, рыбак ажаніўшыйся на дачцэ валхва з суседнега паселішча, запрацівіўся прымусу ліваў. Калі ліваў стала ў гэтым паселішча столькі сколькі куронаў, то ён пераселіўся з жонкай ў суседнее паселішча. У іншых куронскіх паселішчах ахрышчаных мала, больш шматбожцаў.

— Гэтае рыбацкае паселішча Ліва, побач з мяжой зямлі ліваў?

— Не, кароль Літвы Міндоўг, яно на захад ад гарадішча Шкуды, дзе лётась атрад ліцвінаў знішчыў шмат лацінскіх рыцараў, а мяжа з лівамі на поўнач ў трыццаці вёрст. На ўсход у сарака вёрст мяжа з земгаламі.

— У іншых куронскіх паселішчах ёсць уплывовыя жыхары, імкнувшыеся да супраціва лацінскім хрысціянам?

— Так, кароль Літвы Міндоўг, Тума казаў што ва ўсіх куронскіх паселішчах ёсць такія.

— Добра, дзякуй. З ранейшых вестак, Міндоўг ведаў што лацінскіе рыцары збіраюцца ў Мемельбурге і ў зямле самбаў. Мабыць яны аб'яднанным войскам накіруюцца ў Літву праз землі самбаў, скаловаў і мазураў, уздоуж левага берага ракі Нёман. Міндоўг пажадаў павярнуць іх на поўнач да куронаў, у асяродзе супраціўляюшчыхся лацінянам шматбожцаў. На Купалле Мін-

доўг выклікаў да сабе Шварна, Ленгвіна, Вітольда, Даўмонта і Траняту.

— Лацінцы рыхтуюць аб'яднаннае войска каб пайсці на Лютву. Па звестках яны аб'яднаюцца між Мемельбургам і зямлёй самбаў, і накіруюцца хутчэй за ўсё ўздоуж левага берага ракі Нёман. Калі яны прыйдуць туды, то ім дапамогуць з ежай і магчыма з ваярамі хрысціянскіе мазуры, нам патрыбна іх накіраваць у зямлю куронаў, жадаючых ім супраціўляцца. Таму табе, князь Даўмонт, трэба з шасцю сотнямі ваяроў на дзесяты дзень Купалля знішчыць адно рыбацкае паселішча Ліва ахрышчаных куронаў і ліваў. Гэта паселішча Ліва знаходзіцца ў трыццаці вёрст на паўночны захад ад гарадзішча Шкуды, дзе летась атрад Ленгвіна знішчыў лацінскіх рыцараў. Таму двое жамойтаў з сотні Траняты сумесна з Дангайла, які ведае гаворку жамойтаў, будуць суправаждаць атрад князя Даўмонта ў лес, адкуль з'явіліся лётась ваяры Ленгвіна перад атрадам лацінскіх рыцароў.

Убачыў здзіўлены твар Даўмонта, Міндоўг дадаў:

— Я зараз не чакаю пагрозы ад русінаў, не з усходу, не ад поўдня. Таму князь Даўмонт, пазбірай ваяроў і з Крэва. Я з пяццю сотнямі ворутскіх ваяроў і дзве сотні ваяроў Ленгвіна накіруемся ў месца побач з Мемельбургом, і будзем там на дзесяты дзень Купалля. Князь Шварн і Вітольд з трыма сотнямі наваградских ваяроў, а таксама сотня Траняты накіруюцца на адзін дзень раней у гэтае жа месца. Калі мой атрад падыйдзе да месца каля Мемельбурга, атрад князя Шварна адразу накіруюецца на поўнач у бок паселішча Шкуды. На дзесяты дзень Купалля, атрад князя Даўмонта будзе чакаць курон, з маёй пазнакай вышытай пагоні. Ён накіруе вас на паселішче Ліва. Гэта паселішча трэба разграбіць, увесці ў палон маладых жанчын і дзяцей да зямлі жамойтаў, а ахрышчаных куронаў і ліваў забіць. Дамы ў большасці спаліць, курон пакажа якія не паліць. Пасля гэтага брат гэтага курона паскача ў Мемельбург з весткай, што ліцвіны напалі на яго паселішча, спалілі дамы і ўвялі жыхароў у палон, і што ліцвіны пасля яго паселішча накіраваліся ў бок мяжы з зямлёй ліваў. Я меркую, што аб'яднаный атрад лацінскіх рыцароў накіруецца ў бок паселішча Ліва. У зямлі куронаў ёсць разведнікі, якія знайшлі ўплывовых куронаў прыдатных на су-

месны з намі супраціў лацінскім рыцарам. У гэты паход трэба ўзяць усіх сваіх дазорных і шмат ганцоў, праца для іх будзе адказная. Князю Эйсманту я ўкажу прыбыць у Гародню і сумесна з Жыгімонтам быць насцярожа ад нападу лацінскіх рыцараў.

Адразу пасля сустрэчы з князямі і ваяводамі, Міндоўг адаслаў свaего ганца да Тумы з растлумачэннем далейшых дзей яго і памочнікаў куронаў. Асноўные палевыя працы скончыліcь, таму неабходныя сотні ваяроў былі хутка згуртаваны. З атрадам князя Шварна таксама накіраваліся рыбакі, паляўнічыя і ляснічыя, для папаўнення ежы.

## ГЛАВА 20

# ПЕРАМОЖЦА

Спераду атрада Міндоўга, які праходзіў паселішча жамойтов, быў рыцар Ленгвін, добра знаёмы жыхарам гэтых паселішч. Міндоўг рухаючысь услёд за двума сотнямі ваяроў Ленгвіна, заўважыў што жамойты не асцярогаясь суправождаюць поглядамі ліцвінаў, а маладыя жамойты збіліжаючыся бліжэй да ліцвінаў, з цікавасцю разглядаюць даспехі і збрую вершнікаў. Уладар Літвы з здавальненнем азначаў, што яго надзея на Траняту, як на жамойцкага князя, дае добры вынік. На дзясяты дзень Купалля атрад Міндоўга прыбыў у дамоўленае месца, і адразу яму насустрэч зблізіўся ўстрывожаны князь Шварн.

— Кароль Літвы Міндоўг, нашы куроны паведамілі, што з ранку вялікі атрад лацінцаў, у якім было каля сотні рыцароў і тры сотні збраяносцаў накіраваўся на паўднёвы захад.

— Князь Шварн, рыцар Ленгвін, мне зараз патрэбен ваяр, які добра ведае гаворку скаловаў і ўмела плавае. Трэба пераплыць раку Нёман і сустрэцца з рыбакамі скаловаў.

— Кароль Літвы Міндоўг, у маёй сотні ёсць такі, ваяр Мілігеда.

— Пакліч яго. Князь Шварн, дазорные выстаўлены да ракі Нёман?

— Так, кароль Літвы Міндоўг, учора дазорныя накіраваліся да ракі Нёман, а на поўначы да гарадзішча Шкуды. Учора ў вечары да крэпасці Мемельбурга прыбылі з поўначы лацінскіе рыцары і збраяносцы.

Убачыўшы Ленгвіна з ваяром, Міндоўг звярнуўся да ваяра:

— Мілігеда, табе трэба пераплыць раку Нёман і сустрэцца з рыбакамі скаловамі ў усцья левага берага ракі. Там у двух дамах жывуць скаловы, аддаш ім манету срэбра і ад майго імя скажаш, што мне патрэбна ведаць куды накіраваўся атрад лацінскіх рыцароў і дзеля чаго. Калі яны накіраваліся на поўдзень штоб ісці на Літву, то на беразе Нёмана трэба запаліць тры малых вогнішча, а калі яны не вызначыліс, то няхай будзе адно вогнішча. А калі яны вызначыліс, але ідуць не на поўдзень і Літву, то трэба пагасіць вогнішча. Пасля іх табе трэба пайсці ўверх па берагу ракі да паселішча рыбакоў скаловаў і ім таксама аддаць адну манету срэбра з гэтакімі умовамі. Зразумело?

— Так, кароль Літвы Міндоўг. Зразумело, я выканаю гэты ўказ.

— Добра, Мілігеда. Зараз табе выдадуць манеты і цябе будуць суправажваць двое дазорных, якія будуць чакаць на гэтым берагу тваіх сігналаў, а таксама сухая адзежа і конь.

У вечары дазорные паведамілі, што ў замак Мемельбурга прыскакаў курон, а праз кароткі час, ён сумесна з яшчэ адным вершнікам накіраваліся на паўднёвы захад.

Міндоўг вельмі хваляваўся, абставіны складаліся так, што калі лацінцы вырашат ісці гэтай вялікай колькасцю рыцараў, да яшчэ тэўтонскіх рыцараў на Літву, то яны пройдуць праз мазурскія зямлі і нападуць на Гародню. І на гэтым шляху нідзе ім не ўладкуеш пастку, і нечакана нападаць не атрымаецца. А без гэтага бой з шматлікімі хрысціанскімі фанатыкамі не прадвяшчаў добрага выніка. Ён спадзяваўся на курона, на тое што той змагчы пераканаць лацінцаў ісці на сустрэчу ліцвінскаму войску і вызваліць куронаў з палону. Міндоўг разлічываў, што лацінцы падумаюць аб магчымасці ліцвінаў напасць на арцыбіскупа Рыжскага і разграбіць Рыгу. Кароль Літвы ўлічываў вялікую колькасць рыцароў, прышедшых з поўначы ў Мемельбург. Мабыць гэта рыцары з Вендэна і частка рыцароў з

гарнізона Рыгі. Таму ліцвіны без моцнага супраціва пажадаюць напасць на Рыгу.

У гэтых умовах нявызначанасці, атрад князя Шварна застаўся побач з атрадам Міндоўга. На наступны дзень, дазорные паведамілі што на левам берагу Нёмана і ў усцья,і ў паселішча рыбакоў, адно вогнішча. Пакуль лацінцы не вызначыліс, Міндоўг вырашыў што калі лацінцы ўсёж пойдуць на Літву, то ён загадае князю Даўмонту разграбіць Рыгу, і па магчымасці захапіць, ці забіць арцыбіскупа Рыжскага. Трэба скарыстацца адсутнасцю лацінскіх ваяроў у гэтай мясцовасці і ў гэты час. Надыходзячая ноч была самая неспакойнай за апошніе лета для Міндоўга.

Раніцай дазорны, які быў насупраць паселішча рыбакоў, паведаміў што ваяр Мілігедо пераплыў на правы бераг і паведаміў, што лацінскае вялікае войска вяртаецца ў Мемельбург. Доўгачаканая добрая вестка ўзняла Міндоўга на хуткія, але абдуманыя ўказы. Адразу ён накіраваў ганца і дазорнага да князя Даўмонта. Князю трэба было на ўсходзе ад паселішча Ліва выбраць выгадную для бою з лацінцамі мясцовасць. Таксама трэба з дапамогай курона, які сустракаў Даўмонта, згрупаваць уплывовых куронаў на сустрэчу з ваяводамі лацінскага войска, штоб яны накіравалі іх у патрыбную для ліцвінаў мясціну. Міндоўг асцярагаўся, што войска лацінцев ад Мемельбурга накіруецца напрамкі да Рыгі, і на гэтым шляху трэба чакаць уплывовым куронам. У кагосці з гэтых куронаў абавязкова на шыі павінен быць крыж. Міндоўг меркаваў, што лацінцы каб адпусціць курона, які прынёс ім вестку, пажадаюць паглядзець на спаленае паселішча, таму трэба пры набліжэнні лацінцаў зноў трошкі падпаліць рэшкі дамоў. Мабыць убачыўшы дым, яны адразу павярнуць на Рыгу, на ўсход. Таксама куронам трэба пазбіраць сваіх ваяроў і прапанаваць лацінцам сумесна з імі напасць на ліцвінаў. А на самой справе, калі ліцвіны пачнуць атакаваць рыцароў, то яны павінны атакаваць лацінцаў з тылу.

Потым Міндоўг адправіў атрад князя Шварна ў тым жа накірунку. Калі войска лацінцаў наблізіліс да Мемельбурга, дазорные паведамілі, што рыцароў у гэтым войску дзве сотні, а збраяносцаў і іншых ваяроў каля дванаццаці сотняў. Такой вя-

лікай колькасці рыцараў Міндоўг не чакаў, але цяжкай конніцы ліцвінаў было ўтроя больш, таму ён не сумневаўся ў перамозе.

Свой атрад ён павёў на дзесяць вёрст наперадзе магчымага шляху лацінцаў і на сем вёрст на ўсход. Замыкалі ліцвінаў дзве сотні ваяроў Ленгвіна. Большасць дазорных і ганцоў былі падпарадкаваны рыцару, і ад іх працы шмат у чым залежаў поспех паходу. Ганец ад дазорных паведаміў, што лацінскае войска пасля Мемельбурга накіравалася ў бок паселішча Ліва. Гэта было лепей, чым на Рыгу.

Міндоўг адправіў свайго ганца з гэтай навінай да ўплывовых куронаў, ім трэба было наблізіцца да паселішча Ліва. Войска ліцвінаў здейснівала ўсе тые крокі, якіе рабілі лацінцы, толькі паўночнее і ўсходнее. Калі лацінцы прыпыняліся, то і ліцвіны па весткам дазорных прыпыняліся, а калі лацінцы ішлі далей, тады і ліцвіны ішлі далей. Нарэшце атрад Міндоўга сустрэўся з атрадамі князёў Шварна і Даўмонта.

Гэта адбылося каля паўночнай часткі возера Дурбе, побач з ракой Дурбін. Дазорны ад рыцара Ленгвіна паведаміў, што лацінцы побачыў дым каля паселішча Ліва, абышлі яго з усходу і павярнулі на паўночны ўсход і адразу сустрэліс з уплывовымі куронамі. Калі да лацінскага войску далучыліся ваяры куронаў, то яны прадоўжылі ісці на паўночны ўсход. Міндоўг апасаўся, што лацінцы павярнуць на ўсход і нават трошкі на паўднёвы ўсход, каб абыйсці возера з поўдня, але яны прадоўжылі ісці на паўночны ўсход і выходзілі на поле, дзе з усходу ў іх была рака Дурбін. Мабыць куроны вывелі іх на гэта поле. Міндоўг накіраваў атрад князя Шварна на сустрэчу з паўднёвай часткай войску лацінцаў і дадаў яму дзве сотні Ленгвіна.

Сам уладар Літвы высунуў свой атрад у сярэдзіну лацінцев, а князю Даўмонту трэба было ісці ў атаку на пярэднюю частку войск суперніка.

Лацінскае войска сустрэлі спешаные лучнікі ўсіх ліцвінскіх атрадаў. За імі былі бачны толькі лёгкая конніца ліцвінаў. Ваяводы лацінскіх рыцароў засяродзіліс у сярэдзіне сваего войску. Калі лучнікі адстрэлілі сваі запасы стрэл, адразу за імі лёгкая конніца стала па кругавой чарзе кідаць дроцікі ў рыцараў, а за імі трыма клінамі высунулася цяжкая конніца. На вяршыні ле-

вага кліну быў рыцар Ленгвін, на вяршыні сярэдняга кліну быў Міндоўг, а на вяршыні правага кліну быў князь Даўмонт. Калі яны наблізіліся да лацінскіх рыцараў, там была лёгкая мітусня, выкліканая не толькі забітымі і параненымі рыцарамі ад ліцвінскіх дроцікаў, а і нечаканым для іх нападу ззаду куронаў. Насустрач Міндоўгу скакаў важны рыцар, з багата ўпрыгожаным шлемам. Міндоўг накіраваў коня так, штобы рыцар у сутычкі быў злева, і выставіўшы левай рукой шчыт, і злёгку адхілівшысь управа, рэзка ўтыкнуў востры канец меча ў вуха рыцара. Гэты прыем ён неаднаразова ўжываў на трэніроўках з збраяносцамі, якія былі ў спецыяльна ўзмоцненых шлемах. Справа за ім скакаў ляўша рыцар Яўнут, які моцным ударам знізу адвеў пагрозлівы ўдар рыцара лацінцаў. Праскаківая забітага важнага рыцара, Міндоўг рубяшчым ударам зверху трапіў па спіне рыцара справа. І хаця лацінскіе рыцары былі ў белых накідках з чорным крыжам, якія прыкрывалі даспехі, але Міндоўг адчуў, што канец яго мяча рассек кальчугу і параніў рыцара.

Праз імгненне, і рыцар справа Яўнут і рыцар злева Лясота, былі побач з каралем Літвы. Ён трошкі прытрымаў сваего коня і рыцары адразу зразумелі, што ў далейшым яны вольны не ахоўвываць яго. Конь Міндоўга Хуткі быў вельмі паслухмяны, ў адрозненне ад мінулага коня Імклівага. Міндоўг, ці ад таго, што шмат хваляваўся апошнія тры дні, ці ад таго што пастарэў, усёж адчуў стомленасць. Ён гэта адчуў, калі ўбачыў, што лацінскіе рыцары разгублены і ледзь адбіваюцца ад колькасна перавышаючых іх ліцвінаў. Міндоўг прымеціў, што Яўнут і Лясота былі вельмі задаволеныя, калі ім не патрэбна было ахоўвываць караля, і яны рынуліся на лацінскіх рыцароў. Таксама збраяносцы з скрываўленымі мечамі імкнуліся да яшчэ не забітых лацінскіх рыцараў.

Міндоўг адчуў зайдрасць гэтым маладым ваярам, прышоў іх час. Таму чаму яны амаль штодзённа навучаліся, зараз магчыма выпрабаваць супраць моцнага і лютага ворага, а заадно выявіць сваё майстэрства перад каралём Міндоўгом. У вяршыні адзінага кліна лацінскіх рыцароў супраць караля былі ўплывовые асобы хрысціянскага ордэна, яны былі больш кіраўнікамі, чым моцнымі рыцарамі. А іншые рыцары былі больш умелымі ваярамі,

фанатыкамі. Зараз яны змагаліся без захаванне вайсковага парадку. Кожны лацінскі рыцар змагаўся супраць дваіх ліцвінскіх збраяносцаў, змагаўся фанатычна, мабыць не за сваё жыццё, а за сваю веру. Ліцвінскаму збраяносцу достаткова было цяжка параніць коня рыцара, штоб потым было лягчэй яго забіць, але збраяносцы гэтага не рабілі.

Міндоўгу спадабалось, што яго збраяносцам патрэбна была перамога ў майстэрстве ваяра, а не звычнае забойства. Не ўсе лацінскія рыцары прынялі бой, некаторые адразу кінуліся ўцякаць, мабыць асабістае жыццё ў іх больш каштоўнае, чым веравызнанне. Але ўцякаць ім не было куды, з усходу перашкаджала рака Дурбін, з поўначы былі атакуючыя іх куроны, ў іншых накірунках іх атакавалі ліцвіны.

Неўзабаве да Міндоўга наблізіўся радасны князь Шварн, мабыць пагоня для яго справа не толькі не каралеўская, а і не княская.

— Кароль Літвы Міндоўг, я забіў двух рыцараў!

— Добра, князь Шварн. А дзе рыцар Ленгвін?

— Калі рыцар Ленгвін напаў на паўднёвую частку рыцароў, лацінцы кінуліся на поўдзень уцякаць. Я са сваімі ваярамі кінуўся за імі. Дваіх забіў, а астатніх забілі маі ваяры. А рыцара Ленгвіна я яшчэ не бачыў.

Міндоўга агарнула трывога, чуйка прадказала кепскае здарэнне.

— Князь Шварн, трэба яго хутка знайсці і мяне паведаміць. Князь паскакаў на поўдзень, а Міндоўг не змог супакоіцца. Рыцары Яўнут і Лясота ў апошніе паходы былі заўседы побач з Ленгвіном. Зараз яны побач са мной, а незвыклыя да Ленгвіна ваяры магчыма зрабілі штосьці нечаканае.

За князя Даўмонта ён не хваляваўся. Магутны рыцар з доўгім мечом, забіваў суперніка які той толькі марыў наблізіцца да яго.

Да Міндоўга падскакаў ваяр і паведаміў:

— Кароль Літвы Міндоўг, рыцара Ленгвіна знайшлі з кроватачывым ротам, а пабач з ім два забітых нашых ваяра і два забітых лацінскіх рыцара.

Ваяр суправадзіў Міндоўга да Ленгвіна. Увесь у крыві, ён выглядаў вельмі бледным. Яму спрабавалі дапамагчы, затрымаў-

шы кроў сплясневелым хлебам, але надзея была малая. Хутчэй за ўсё, лацінскі рыцар сваім мячом трапіў яму з левага боку ў рот. Ведаючы майстэрства рыцара Ленгвіна, Міндоўг не змог сабе ўявіць, як гэта атрымалась. Ён шмат забіваў сам, шмат бачыў забітых і цяжка параненых сваіх ваяроў, але ніколі смерць свайго паплечніка не была такой нечаканай і ўплывовай на яго. Кароль ужо быў прызвычаен да думкі, што якія б не былі цяжкія і непрадбачаные заданні ў паходзе, Ленгвін з імі спраўляўся. Рос сіратой, не мея вялікого росту, ён за кошт упартай працы ваяра і імклівага розуму, дамогся таго што Міндоўг яму даручаў кіраваць самымі цяжкімі і адказнымі паходамі.

У толькі што мінулай сутычкі з лацінскімі рыцарамі, Міндоўг адчуў сабе старым. Ён вырашыў, што гэты паход будзе для яго апошнім. Гэта ён вырашыў, ведаючы што ёсць Ленгвін, які будзе кіраваць лепей за яго. А зараз утварылася пустата.

Да яго наблізіліся і князь Даўмонт, і ўплывовыя куроны. Хтосьці дзякаваў, хтосьці запытваў аб размеркаванні здабычы, а ў яго толькі адклалась у памяці што трэба ўсё аддаць куронам. На гэтым полі было забіта сто пяцьдзясят шэсць тэўтонскіх, лівонскіх, дацкіх і свейскіх рыцароў і больш адзінаццаці сотняў іншых ваяроў.

Палонныя ваяры казалі, што сярод забітых былі магістр Лівонскага ордэна Бурхард фон Хорнхаўзен, прускі маршал Генрых Ботель і свейскі прынц Карл, а таксама тры комтуры. Пасля вяртанне з самага доўгага сваего паходу, Міндоўг адразу пажадаў лазню, а пасля яе яго чакала, як яму здалася, засумваўшаяся Марта. Наступным днём ён прыняў удзел у пахавані рыцара Ленгвіна. А ў вечары, гуляючы ў шахі з рыцарам Альгердам, ён пачуў ад яго, што Марта сваімі прыдзіркамі і капрызамі давяла кухарку і дзве служанкі да плачу. Міндоўга гэта скарга раззлавала і ён паведаміў ей, што ён больш не кароль, а яна не каралева. У Марты здарылась істэрыка, а Міндоўг успрымаў гэта спакойна.

Пакідая зямлі куронаў, Міндоўг указаў Туме, застацца ў паўночным паселішча жамойтов, штоб рэгулярна паведамляць яго аб падзеях у гэтых і ў іншых землях. Тума, для якога раней пабудавалі добры дом, прасіў з здабычы рыбалоўные прылады, а таксама штоб да яго прыбыла жонка з малодшым сынам.

Прыбыўшы да Міндоўга гандляр Міхалок паведаміў, што князь Земавіт Мазавецкі зноў заключыў мірнаю дамову з Тэўтонскім ордэнам. У пачатку восені прыбыў ганец з Эйсманты. Ён паведаміў:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, наш князь Эйсмант пасля хваробы памёр. А перад смерцю ён прапанаваў абраць князем замест сабе свайго ўнука Яраша. Калі далі згоду на гэта ў нас, а таксама Яраш і яго маці Тэкля, тады ён у вечары памёр. Учора князя Эйсманта пахавалі. Зараз князь Яраш з'яўляецца князем нашага Эйсмантцкага княства і адасобнога ятвяжскага княства.

— Добра. Перадай князю Ярашу і ўсім жыхарам абодвух княстваў, што я задаволены гэтым выбарам.

Калі ганец пакінуў іх, абодва доўга маўчалі, а потым Міндоўг сказаў:

— Ты жа ведаеш, што ён для мяне быў другім татам. Я спадзяюся, што ён паспеў перадаць сваё майстэрства не толькі сыну, а і ўнуку. Не ведаю як для сына, але для мяне ён яшчэ перадаў тое, што заўсёды трэба шанаваць продкаў і прытрымлівацца кодэкса гонару рыцара. Але ён ужо быў вельмі стары. З растокскіх пераселенцаў засталіся мы з табой Альгерд, да яшчэ князь Доўбуд.

— Я старэйшы з вас. Таму я першы ў гэтай чарге.

— Альгерд, ты аб гэтым нават і не думай. Перад Калядамі прыбыў полацкі ваяр Сымон.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, ва ўсходніх русінаў жыхары якія не прынялі хрысціянства, вельмі абураны тым, што русінскія царкоўнікі дапамагаюць ардынскім баскакам праводзіць перапіс жыхароў і ўсталёўваць чысла — колькасць мужчын для войска ардынцаў. А самых гэтых царкоўнікоў ў спіс не ўключалі. Абураные русіны не дапушчаюць іх да сваіх дамоў.

— Сымон, яны групуюцца ў якіясь атрады супраціву?

— Не, Вялікі князь Літвы, атрадаў там нема, аб'еднаюцца толькі з суседамі, два, тры, ці чатыры гаспадара.

— Добра, Сымон. Дзякуй. Наступным днём да Міндоўга з'явіўся гандляр Андрэй.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, у галоўнай юрце Арды памер вялікі хан Мунке. Новым Вялікім ханам абралі Хубілая, які

жадае аслабіць уплыў хана Берке на ўсю Арду. Яго стаўленнік хан Хулаху ўварваўся ў Каўказ, зямлі якіе падпарадкаваны хану Берке. Але супраць хана Хулаху выступілі мамлюкі, і разбіўшы яго войска, адрадзілі Аббасінскі Халіфат. Гэта мусульманіну хану Берке спадабалось. Зараз ёсць весткі, што хан Берке прагне замест хрысціянскіх памочнікаў баскакаў замеціць на мусульманскіх, тым больш што ёсць шмат абураных перапісчыкамі нехрысціянскіх жыхыроў.

— Гандляр Андрэй, можа хан Берке адвярнуўся ад саюза з нікейскай хрысціянскай Царквой?

— Не, Вялікі князь Літвы, ён гэта робіць толькі штоб узмоцніцца ў барацьбе сярод сваіх ардынскіх ханаў. А да нікейскай Царквы ён па-ранейшаму саюзнік. Зараз ён у сваёй стаўкі Сарай Берке будуе цагельную царкву дзеля хрысціянскіх несторіанскіх русінаў. Там будзе Сарайская епархія. Адразу пасля Калядаў, прыбыў ганец ад Тумы.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, у пачатку восені паўсталі амаль усі прускія плямёны, акрамя помезанцаў і ў хелмінскай зямлі. Прусы вызвалілі вялікую частку сваіх зямель, а таксама захапілі некалькі горадоў:Бартенштейн, Рэшаль, Гейльсберг і Браўнсберг. Забілі шмат хрысціянскіх прапаведнікаў. Іншых хрысціян узялі ў палон, і зрабілі іх нявольнікамі.

— Добра, а што куроны?

— Вялікі князь Літвы, замест забітага Лівонскага магістра зараз Юрген фон Эйхштэт. Ён арганізаваў некалькі паходаў супраць куронаў. Адзін з гэтых паходаў завяршыўся ўзяццём замка Сінцілен і знішчэннем усіх куронаў старэй за адзінаццать лет. Гэты замак куроны захапілі, калі рыцары былі знішчаны ля ракі Дурбін. А зараз куроны напалоханыя.

— А дзе гэты намесьнік Лівонскага магістра знаходзіцца?

— Вялікі князь Літвы, ён як і былы магістр знаходзіцца ці ў крэпасці Вендэна, ці ў горадзе Рыга, ці ідзе у паход.

— А што земгалы?

— Вялікі князь Літвы, пасля бою ля ракі Дурбін, земгалы прагналі хрысціянскіх прапаведнікаў, дзе яны былі, і ўжо ўся зямля земгалов без іх.

— Заўтра з ранку накіруешся да Тумы. З табой адправіцца адзін ваяр.

Калі ганец пайшоў адпачываць, Міндоўг выклікаў Кодруна.

— Кодрун, зноў трэба штоб ты з Тумам дамовіўся з земгаламі аб сховішчы нашага атрада ваяроў у зямлі земгалов, бліжэй да горада Рыга. Узімку торжышчы горада Рыга не працуюць, таму табе трэба знайсці таго ліва ў якога ты быў раней, жыць у яго і шукаць магчымасці знайсці весткі пра намер лівонцев. Як толькі разведаеш аб паходзе атрада намесьніка Лівонскага магістра Юргена фон Эйхштэта, трэба хутка накіравацца за атрадам нашых ваяроў. Тума пасля дамовы з земгаламі няхай накіруецца ў Нальшаны да князя Даўмонта і правядзе яго атрад у дамоўленаю мясцовасць. Калі ў табе пытанняў нема, заўтра ў раніцу адправішся з ганцом да Тумы.

Адразу пасля Кодруна, Міндоўг выклікаў да сабе ганцоў і адправіў іх да князя Даўмонта і князя Траняты, штоб яны заўтра прыбылі да яго.

— Наша перамога каля ракі Дурбін дапамагла прусам паўстаць супраць лацінскіх хрысціян. Зараз яны вызвалілі вялікую частку сваіх зямель і захапілі некалькі гарадоў. Куроны пасля нашага адыходу з іх зямель, таксама захапілі замкі. Але замест забітага намі магістра з'явіўся другі магістр Юрген фон Эйхштэт. Ён пасля захопу замка Сінцілен, забіў усіх куронаў у замку, якіе старэй за адзінаццать лет. Зараз куроны зноў напалоханы. Трэба знішчыць яго і яго атрад. Нашы разведнікі будуць збіраць весткі аб намерах гэтага лацінца з яго атрадам. Земгалы знойдуць добрае месца нашаму атраду, недалёка ад горада Рыга, дзе трэба чакаць весткі ад разведнікаў. У лацінскім атрадзе будзе не больш за трыццаць рыцараў, а агульная колькасць не больш адной сотні ваяроў.

— Вялікі князь Літвы, мой атрад будзе ў паўтары сотні.

— Пачакай. Транята, я прыцягваю цябе да гэтага паходу таму, што ты будзеш пакрыўджаны, калі я цябе не прыцягну. Паход узімку вельмі цяжкі, таму трэба адабраць толькі тых хто добра адчувае сабе ў маразы. Пры гэтым яны павінны быць моцнымі ваярамі. У будучыні гэтакія ваяры будуць тваі, Транята, сотнікі і ваяводы. Таму іх колькасць павінна быць не больш

за пяць дзясяткаў. Князь Даўмонт, таксама адбярэ самых моцных. На мой погляд атрад у дзве сотні ваяроў будзе достатковым. Невядома колькі часу патрабуецца чакаць неабходнай весткі. Я спадзяюся, што лацінцы не будуць чакаць напад ліцвінаў на іх узімку, тым больш што летам ужо нападалі. Разведнік Тума прыбудзе ў Нальшаны не раней чым праз сем дзён, таму зараз трэба рыхтавацца да паходу. Калі Тума прыбудзе да цябе, князь Даўмонт, адразу накіруеш ганца за Транятай і яго ваярамі ў паселішче Путяты. Князь Даўмонт, ад цябе залежыць каб атрад Юргена фон Эйхштэта быў знішчан.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, я ўсе зразумеў і мы знішчым гэтых лацінцаў.

— Добра. На пры канцы, ёсць дзеля цябе сумная навіна. Твой тата, рыцар і князь Эйсмант памер пасля хваробы. Маі табе спачуванне. Ён мяне навучыў быць добрым рыцарам і князем. Рыцар Эйсмант быў для мяне другім татам. Замест яго князем абралі сына Тэклі Яраша. Зараз Яраш князь эйсмантцкага княства і княства адасобных яцвягаў. Гэту навіну Даўмонт успрымаў маўчком, толькі вочы бліснулі нездаволенасцю. На гэта звярнуў увагу Транята. Праз чатырнаццаць дзён ганец з Нальшан паведаміў, што атрад з нальшанскімі і жамойтскімі ваярамі накіраваўся на поўнач. А яшчэ праз дваццаць дзён у Воруту прыбылі князь Даўмонт і князь Транята. Распавядаў князь Даўмонт:

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, земгалы размясцілі нас у самым паўночным сваім паселішча, каля мяжы з лівамі. Мы доўга чакалі вестку ад Кодруна, а калі дачакаліс то вельмі ўзрадаваліся, надакучыла чакаць. Кодрун паведаміў, што Юрген фон Эйхштэт з атрадам ідзе на поўдзень па замерзнуйшай раке Заходняя Дзвіна. Мы адразу накіраваліся яму на сустрэчу. Уперадзі ў нас былі дазорные з белымі накідкамі не толькі для вершнікаў, а і для коней. Гэтыя накідкі для дазорных мы зрабілі ў Нальшанах, калі рыхтаваліся да гэтага паходу. У лацінскім атрадзе было трынаццаць рыцараў і каля сотні ваяроў. Аднаго дозорнага і аднаго лепшага лучніка я накіраваў на сустрэч лацінскага атрада. Астатніх дазорных ў белых накідках я накіраваў у тыл

лацінскага атрада. За дазорнымі ў адлегласці, штоб не было бачна, ішлі ваяры.

— А лацінскіе дазорные?

— У іх не было дазорных. Лацінскіе рыцары ў паходным маршу сваі шлемы трымалі ў руцэ, таму калі яны наблізіліся, то наш лепшы лучнік трапіў стрэлам у твар важнага рыцара, мабыць гэта быў Юрген фон Эйхштэт. Дазорны за ім трапіў у коня гэтага жа важнага рыцара. Як толькі лацінскіе ваяры паскакалі на нашага лучніка, то мы адразу паскакалі ім насустрэч. Лацінцы нас убачылі, і я заўважыў што гэтага важнага рыцара ўсадзілі на іншага коня, і ён пры падтрымкі двух рыцараў паскакаў на ўсход. Астатнія рыцары і ваяры прынялі бой з намі. Я накіраваў чатырох моцных ваяроў у пагоню за важным рыцарам, але глыбокі снег і невядомая мясцовасць не дазволіла іх дагнаць. Я бачыў з якімі цяжкасцямі важнага рыцара ўсаджвалі на коня, і таму меркую што ён цяжка паранены. Мы забілі астатніх дзесяць рыцароў і ўсіх лацінскіх ваяроў. У маім атрадзе забіта дзевяць і паранена чатырнаццаць ваяроў. У жамойтаў адзін забіты і пяцёра параненых. Бой адбыўся каля Леневарде (Леневорд, Лінвор, сучасная назва Ліелварде), але важны рыцар паскакаў не ў бок гэтага замка, а ў іншы бок.

На трэці дзень вясны і новага 6769 лета (1261 па хрысціянскаму календары) у Воруту прыбыў ганец з Гародні.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, нашы гандляры паведамілі, што на дапамогу тэўтонам прыбылі іншые рыцары з альманскіх зямель. Яны ўварваліcь ў зямлі натангаў і спустошылі некалькі паселішч прусаў. Але натангі напалі на частку крыжаносцаў пры Покарвісе і нанеслі ім паразу. Іншые крыжакі пад кіраўніцтвам графа Вальтэра фон Барбі пайшлі паходам на самбаў, і спачатку таксама знішчылі некалькі паселішч. Але самбы аб’едналісь і нанеслі крыжакам паразу. А пасля гэтага аблажылі замкі Кёнігзберг, Крэйцбург, Бартэнштэйн і Хейльзберг, і ўчынілі ў іх голад. Ордэнскія рыцары пакінулі замкі Хейльзберг і Резель.

— Добра, дзякуй. А як сабе адчувае мой сябра князь Жыгімонт?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князь Жыгімонт хварэе ўжо адзінаццаць дзён.

— Перадай маему сябру князю Жыгімонту маё пажаданне хутчэй ачуняць.

У пачатку восені прыбыў да Міндоўга полацкі ваяр Сымон.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, мітрапаліт Кіеўскі Кірыл Другі і князь Аляксандр Яраслававіч пры падтрымкі хана Берке заснавалі ў Сарае для русінаў Сарайскую епархію. Першым біскупам Сарайскім стаў преасвяшчэнны Мітрафан. Хан Берке надаў яму правы недатыкальнасці. Цяпер пры хане знаходзіцца свяшчэннік, ведаючый грэчэскую гаворку і ён жа прызначан саветнікам па несторіанскай хрысціянскай веры.

— Хан Берке ўсе веравызнанні вітае, ці ёсць выключэнне?

— Ёсць выключэнне, Вялікі князь Літвы. Гэта лацінскіе хрысціяне.

— Добра, Сымон. Дзякуй.

У сярэдзіне восені з'явіўся ў Міндоўга гандляр Андрэй.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, летась войскі суправіцеля і галоўнага ваяводы Нікейскай імперыі Міхаіла Палеолага знішчылі аб'еднаные войскі сіцылійскіх нарманаў, дэспата Эпірскага і франкскага княства Ахайскага. Потым Міхаіл Палеолаг пасля доўгіх перамоваў заключыў дамоўленасць аб міру і садзеўнічанню з генуэзцамі, галоўнымі ворагамі венецыянцаў. А венецыанцы галоўная апора Лацінскай імперыі Канстанцінополя. Пасля гэтага суправіцель Нікеі пажадаў захапіць Канстанцінопаль. Ён пачаў накіровываць таемные разведніцкіе атрады ў наваколле гэтага горада. І калі венецыанскі флот з бальшай часткай франкскага гарнізона адплыў у Понтскае мора, нікейскі атрад увайшоў у горад па падземнаму праходу. Гэты праход падсказалі тутэйшыя жыхары. Лацінскі імператар Балдуін Другі ўцёк пасярэдзіне начы, пакінуў карону і скіпетр. Перад восенью, Міхаіл Палеолаг урачыста ў'ехаў у Канстанцінополь і жыхары горада радасна сустракалі яго. У пачатку восені імператар Міхаіл Восьмы быў каронаваны ў галоўнай царкве Святой Софіі. А па праву імператар, дзесяцілетні Іоан Чацвёрты Ласкарыс быў аслеплены.

— Гандляр Андрэй, як ты меркуеш ці ёсць сувязь паміж адраджэннем Абасінскага халіфата, з аснаваннем Сарайскай епархіі ханам Берке і вяртаннем Канстанцінопаля ўсходняму хрысціянству?

— Вялікі князь Літвы, як бы дзіўна гэта не ўспрымалась, але такая сувязь ёсць. Гэта сувязь паходзіць ад хана Берке, яго ўнутрыардынскай вайны між ім і ханам Хулагу. Падрабязнасцей я не ведаю, але ўпэунен, што ідзе змаганне ў тых зямлях за ўплыў на важныя гандлярскіе шляхі з поўдня на поўнач, з усходу на захад і наадварот. Перад Калядамі прыбыў да Міндоўга полацкі ваяр Сымон.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, хан Берке накіраваў мусульманскіх баскакаў для перапісу жыхароў і ўсталявання чысла ваяроў з усходніх русінаў. Цяпер ужо ўсі і хрысціяне, і шматбожцы абураны гэтым. Пакуль паўстання няма, але нездаволенасць вялікая. Мне давялося пагаворыць з моцным гандляром з усходніх русін. Так ён кажа, што гэтые мусульманскія баскакі па чыслу адбіраюць ў войскі хана Бату толькі моцных мужчын. Слабых не бяруць. Гэты гандляр казаў, што іх набіраюць у войскі мусульман супраць хрысціян.

— Супраць якіх хрысціян збіраюцца ваяваць?

— Вялікі князь Літвы, гандляр казаў, што ваяваць будуць на Каўказе супраць хрысціянскіх войскаў хана Хулагу. Жонка хана Хулагу з несторіанскіх хрысціян. А гандляр казаў, што хан Берке прыняў іслам пад уражаннем ад наложніцы мусульманкі Рісаль, а потым ад зносін з арабам Нажмудіном Мухтар аз Західій. Пасля таго, як Сымон пакінуў іх, Міндоўг выказаўся:

— Альгерд, памятаеш як гандляр Андрэй тлумачыў вайну паміж ханам Берке і ханам Хулагу?

— Так Міндоўг. Ён меркаваў што гэта вайна за ўплыў на важныя гандлярскія шляхі, а Сымон выказаў думку, што гэта з-за асабістых пачуццёў да сваіх дзявіц і прыняцця іх веравызнання. Я схільны да думкі гандляра Андрэя.

— Так, безумоўна ўплыў на гандлярскія шляхі вельмі важны, але і асабістыя пачуцці шмат вырашаюць. Захапленне цудоўнай дзявіцай моцна ўплывае на жыццё, але гэта не даўгавечна, а потым застаюцца звычкі на якіх будаваўся характар і ўжо цяжка штосьці рэзка меняць. Але гэта думка не адносна хана Берке, а агульны погляд. Хан Берке вялікую частку свайго жыцця быў пад старэйшым братам, ханам Бату. Я таксама рос з старэйшым братам, таму я меркую што Берке больш разважаў у тым ліку

крытычна адносна дзей хана Бату. Мусульмане больш адукаваны, чым хрысціяне, юдэі і прыхільнікі шаманства. На поўдні іслам больш распаўсюджван, чым іншые веравызнанні. Яшчэ гандляр Міхайла казаў, што каля вялікай ўсходняй ракі Ітіль у тартараў іслам. Сарай Берке знаходзіцца сярод мусульман, таму мне дзіўна што хан Бату не быў прыхільнікам ісламу. Хан Берке стаў першым мусульманінам сярод ардынцаў, што сведчыць аб яго мудрасці і прадбачлівасці. Трэба жыць у добразычлівым асяродзі. Таму я не здзівіўся што ён знішчыў сына і ўнука хана Бату. Берке прадбачыў шмат памылак у іх дзеяній. Берке на маю думку, яшчэ пры старэйшым браце імкнуўся да ўзмоцнення і адзялення Улуса Джучы. Зараз ён будзе дамагацца саюза з мусульманскімі мамлюкамі Егіпта. Можа таму ён даручыў мусульманам праводзіць перапіс і набор сваіх ваяроў са ўсходніх русін. Для мусульман Егіпта гэта будзе яшчэ адно пацвярджэнне прыхільнасьці ісламу хана Берке. Але на мой погляд гэта памылка. Усходнія русіны мяжуюць з зямлямі тартароў, мусульман. Мяжа раздзяляе не толькі зямлі, а і погляды, звычкі, гаворку. Часта за мяжой знаходзіцца вораг. Таму даручаць такую асцярожную працу, як набор ваяроў для свайго войска, іншаверцу і замежніку гэта памылка. Зараз хан Берке засяроджваецца на вайне з ханам Хулагу, а гэта далёкія зямлі, і ва ўгоду гэтаму ён пагаршае свае справы ў сваіх данніках. А свае ўнутраныя справы павінны быць галоўнымі.

— Міндоўг, а як бы ты зрабіў?

— Гэту справу ардынскія баскакі павінны выконваць з русінскімі князʼямі з іх дружынай, калі жадаюць атрымаць ярлык на княжэнне.

Наступным днём прыбыў ганец з Гародні з сумнай весткай.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князь Жыгімонт памер ад хваробы. Князем гародзенскага княства выбралі яго старэйшага сына Жывінмонта.

— Спачуваю ўсім гародзенцам. Выбарам князем Жывінмонта я задаволен. Пасля абвяшчэнне Марце, што яна ужо не каралева, яна не хаваючысь стала больш піць віна. Міндоўг пасля смерці сябра Жыгімонта стаў задумвацца, што смерці блізкіх яму людзей ў апошніе часы, звязаны з варожасцю і варажбой Марты.

Асцерагаясь яе, ён перастаў мілавацца з ёй. Для навучэння сыноў, Міндоўг прыцягнул дачку гандляра Андрэя. Вялікі князь папярэдзіў Марту, штоб яна не ўмешывалась у гэтае навучанне. Але яна, калі Міндоўг адсутнічаў у Воруце, знаходзіла магчымасць перашкаджаць навучанню і добрым адносінам сыноў з дачкой Андрэя. Пачуйшы аб гэтым, Міндоўг замыкаў Марту ў яе пакоі, і забараняў прыносіць ёй віна. На другі дзень вясны і новага 6770 лета (1262 па хрысціянскаму календары) да Міндоўга прыбыў полацкі ваяр Сымон.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, сын полацкага князя Таўцівіла Канстанцін жадае змагацца з лівонцамі. Таму ён запрашае дазволу на перамовы з князем Аляксандром Яраслававічам аб сумесным паходзе на лівонцаў.

— Сымон, чаму аб гэтым запрашае княжыч а не князь Таўцівіл?

— Вялікі князь Літвы, князь Таўцівіл асцерагаецца без тваега дазвола замаўляць аб гэтым. А княжыч Канстанцін вельмі жадае змагацца.

— Добра. Недалёка ад Пскова ёсць крэпасць Вендэн. У гэтай крэпасці знаходзіцца магістр Лівонскага ордэна. Ад нас гэта далёкая крэпасць, а ад Пскова яна блізкая. Калі русіны возьмуць з сабой каменямёты, то гэту крэпасць магчыма знішчыць. Калі мы сумесна знішчым рыцараў Вендэна, то мы сумесна разграбім горад Рыга, які за гэтай крэпасцью. Я зацікаўлен ў гэтым сумесным паходзе. Я накірую ў паход на Вендэн тры сотні ваяроў князя Даўмонта, да іх далучацца дзве сотні полацкіх ваяроў. Пяць соцен ліцвінаў і столькі русінаў. І гэты паход будзе паспяховым. Перадай князю Таўцівілу, шо ў такім разе, я згодзен на гэтую дамову з русінамі. Калі Сымон адправіўся назад у Полацк, рыцар Альгерд спытаў:

— Міндоўг, а чаму Траняту не далучыць да Даўмонта?

— Альгерд, навіны Сымона нечаканыя для мяне. Траняту я меркаваў далучыць да трох соцен князя Шварна з ваяводам Вітольдам у паход на мазураў. Трэба даць вестку прусам, штоб яны не асцерагаліся мазураў, а змагаліс з тэўтонскімі рыцарамі. Перад Купаллем атрад князя Шварна ў тры сотні наваградцаў і сотня жамойтаў Траняты адправіўся ў зямлі мазураў. Адразу

пасля Купалля прыбыў Сымон з Полацку. Ён паведаміў, што паслы князя Аляксандра Яраслававіча дамовіліся з князем Таўцівілом аб сумесным паходзе супраць лацінскіх рыцараў. Князь Аляксандр Яраслававіч згодзен сваім атрадам сумесна з ліцвінамі напасць на крэпасць Вендэн, разбурыць яе і знішчыць усіх рыцараў, а потым напасць і разграбіць горад Рыга. Сумесны штурм Вендэна князь Аляксандр Яраслававіч вызначае на дзесяты дзень восені.

— Добра, што ў восені, пасля асноўных палевых прац. Перадай князю Таўцівілу што атрад князя Даўмонта ў восьмы дзень восені прыбудзе ў Полацк, для далейшага сумеснага паходу з палачанамі.

Вярнуўшыяся з паходу на мазураў князь Шварн, князь Траняты і ваявода Вітольд прыбылі да Міндоўга. Апавядаў князь Шварн.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князь Мазавецкі Земовіт схаваўся ад нас у замку Яздава. Пры штурме, ў сумятні бою яго забілі, а яго сына ўзялі ў палон. Потым мы захапілі, паграбілі і спалілі горад Плоцк, а потым калі вярталіся, паграбілі ўсі паселішча мазураў, якія былі на нашым шляху. Сярод усіх нашых ваяроў забіта дзевяць, а паранена дваццаць два ваяра.

— Добра. Сына князя Земовіта трымай ў сваім наваградскім замку, я яго абменяю. Дзякую ўсім. Неўзабаве Вялікі князь Літвы абменяў сына Земовіта Конрада на срэбра і ўмову, што мазуры не будуць дапамагаць рыцарам тэўтонаў ваяваць супраць прусаў. Калі прыбыў у Воруту, выкліканы князь Даўмонт, то Міндоўг паведаміў яму аб паходзе з полацкімі ваярамі на поўнач і штурме сумесна з русінамі крэпасці Вендэн.

— Князь Даўмонт, твой ваявода Доман сем лет у мінулым, ужо нападаў на крэпасць Вендэн. Тады рыцар Ленгвін з ваярамі выманілі рыцараў з крэпасці. Зараз гэтага не трэба чакаць, лацінцы зрабілі вынік з мінулай памылкі, і больш іх не падманіш. Русінскі атрад будзе з каменямётамі, таму трэба гэту крэпасць разбурыць і знішчыць усіх рыцараў і іншых ваяроў. Калі гэта адбудзецца, то сумесна з русінамі разграбіце горад Рыга. Полацкі княжыч Канстанцін вельмі пажадаў змагацца з лацінскімі рыцарамі, паназірай за ім. Увечары Альгерд паведаміў,

што князь Даўмонт прыбыў у Воруту сумесна са сваей жонкай. Мабыць тая ўчула, што яе старэйшая сястра доўга хварэя, і вырашыла яе наведаць.

— Так, штосьці яна разхварэлася. Знахарка казала што не разумея як яе лячыць, адвары не дапамагаюць. Можа малодшая сястра ведае. Шмат хто кажа, што гэта Ядзя ведзьмарка.

Праз дзесяць дзён прыбыў да Міндоўга князь Транята.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, князь Даўмонт рыхтуецца да паходу на поўнач супраць лацінскіх рыцараў, я жадаю далучыцца да яго са сваімі ваярамі.

— Транята, да князя Даўмонта далучаюцца дзве сотні полацкіх ваяроў. Іх князь Таўцівіл дамовіўся з русінскім князем аб сумесным паходзе. Перш за ўсё яны з дапамогай русінскіх каменямётаў будуць разбураць крэпасць, а потым знішчаць рыцараў гэтай крэпасці. А ўжо пасля таго, як заб'юць усіх рыцараў, тады пойдуць грабіць горад Рыгу. Так, а не інакш. Калі ты разлічываў, што яны будуць штурмаваць крэпасць, а ты будзеш грабіць Рыгу, то ты памыляешся. У Рызе ёсць моцны гарнізон рыцараў, таму яго магчыма грабіць сумесна з русінамі і толькі пасля знішчэння рыцараў крэпасці Вендэна. Я ведаю што сярод палонных мазураў, ты атрымаў трох цесляроў, таму займайся будаўніцтвам дамоў.

— Яны ўжо будуюць дамы.

— Добра. Будуць яшчэ паходы. У Рызе жывуць больш гандляры, чым рамеснікі. Як толькі Транята пакінуў іх, Альгерд спытаў:

— Міндоўг, а чаму ты думаеш што ён жадае захапіць рамеснікоў?

— Мне казалі, што ён дамоўляўся з Даўмонтам, штоб нальшанскія цесляры працавалі ў яго сорак дзён.

У восьмы дзень восені прыбыў нальшанскі ганец і паведаміў што атрад князя Даўмонта накіраваўся на Полацк. А праз восем дзён з'явіўся князь Даўмонт.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, калі мой атрад у пяць сотняў ваяроў набліжаўся да крэпасці Вендэн, дазорны папярэдзіў што ўперадзі ідзе ў наш бок атрад лацінскіх ваяроў, сярод якіх пяць рыцараў. Мы гэты атрад акружылі і лёгка знішчылі. На дзяся-

ты дзень восені, мы ўзялі ў аблогу крэпасць Вендэн, але русінаў не дачакаліся ні ў гэты дзень, ні ў два наступныя дні. Крэпасць Вендэн без каменяметаў узяць не магчыма. Таму мы знішчылі чатыры паселішча ліваў, якія былі побач з гэтай крэпасцью, а таксама тые якія былі на нашым шляху. Пры вяртанні, паселішча латгалаў і селаў, мы не бурылі. Сярод нашых ваяроў адзін паранены, забітых нема. Княжыча Канстанціна пры сутычцы з лацінцамі я накіраваў на звычайных ваяроў, а сам з маімі ваярамі цяжкай конніцы забіў рыцараў. Я заўважыў, што княжыч Канстанцін не ўхілялся ад змагання з ваярамі, а наадварот імкнуўся да іх.

— Вось як атрымліваецца, калі дамоўляешся з русінскім князем Аляксандрам Яраслававічам. Будзем ведаць. Але, і пры такіх абставінах нездарма схадзілі ў паход. Добра, Даўмонт. Дзякуй.

Як толькі князь Даўмонт пакінуў іх, Міндоўг адразу выказаўся:

— Да гэтага Аляксандра Яраслававіча, як і да яго таты Яраслава Усеваладавіча ні якога давера. Альгерд, ты чаго такі сумны, можа захварэў?

— Міндоўг, не я захварэў, а Ванда. Мабыць памірае.

Чуйка Альгерда спраўдзілась. Праз два дні Ванда памерла. Рыцар Альгерд цяжка перажываў страту любай жонкі. Як ні падтрымлівалі яго сыны і ўнукі, але на дзевяты дзень памёр і ён. Пахаваўшы сваего сябра і паплечніка, Міндоўг адчуў сабе вельмі адзінокім. Альгерд быў для яго не толькі памочнікам і апорай з падлеткавага ўзроста, але і надзейным прыхільнікам яго думак, і выканаўца яго вельмі рызыкоўных даручэнній. Альгерд больш дасканальна ведаў аб ім, чым ён сам аб сабе. Міндоўг заўседы правераў сваі высновы на Альгердзе, і калі чуў згоду, то гэта давала больш упэўненасці і жадання.

Зараз усё больш яго наведвае думка, што ён стары. Апошнім часам яго пакідаюць вельмі ўплывовые на яго асобы: гандляр Міхайло, рыцар і князь Эйсмант; рыцар Ленгвін; князь Жыгімонт; а зараз рыцар Альгерд. Апошняя страта кінула Міндоўга ў самоту і старасць. Зноў з'явілась думка пра шкоду Марты. Але яна наўрад бачыла князей Эйсманта і Жыгімонта. Зразумело, што Альгерд і Ванда былі ворагі для яе, а вось Ленгвін, ён жа ў Люб-

чы быў пакорны ёй. Ад гэтакіх думак ён нечакана віну аддаў перавагу над медавухай.

Перад Калядамі прыбыў Сымон з Полацка.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, усходнія русіны павыганялі перапісчыкаў басурман з Ростова, Уладзіміра, Суздаля і Яраслаўля. У Яраслаўлі забілі манаха Зосіму, які адрокся ад хрысціянства і стаў мусульманінам. Зараз ардынскія атрады караюць усходніх русінаў.

— Добра Сымон. Дзякуй.

Гэтыя навіны неабходна было абмеркаваць, але не з кім. Найбольш дасведчаны па ўсходнім русінам быў гандляр Андрэй, але Міндоўг падазраваў што ён гандлюе не толькі таварамі, а таксама і весткамі з кім та ў Кіеве. Таму ён асцерагаўся яму паведамляць аб сваіх думках.

Ганцы з Полацка не мелі кругагляда штоб рабіць правільных высноў. Міндоўг падумаў, што будзе калі ён памрэ. Штоб прадоўжыць яго справу, трэба кагосці падрыхтоўваць да гэтага. Войшалк не здольны, не самастойны. Ён хутка падпарадкуецца пад іншых. Князь Шварн чужынец, тым больш з сям'і хрысціяніна. Транята нарадзіўся і жыў сярод жамойтаў. Яго імкненне — ўзмоцняць дабрабыт жамойтаў, а перад гэтым узмоцніць абараназдольнасць. З гэтым ен справіцца. А жадаць стаць ліцвінскім князем яму не магчыма. Ён разумны, і ён пажадае штоб у яго асяродзе былі жамойцкія паплечнікі, але яны не ведаюць ліцвінскую гаворку. У іншых княствах магчыма абраць князем сына-падлетка, пры моцным апекуне. Але ў Літве такога не было, і не будзе. Кагосці выбіруць, і выбіруць дастойнага. Ім трэба давераць. Калі я ахрысціўся, яны добра разглядзелі што гэта я зрабіў вымушана і часова. А зараз мне трэба падрыхтаваць кагосці на князя Воруты.

Гэты роздум перарвала служанка, якая паведаміла што Марце пагоршылась і яна запрасіла да сабе Міндоўга. Яна ўжо даўно не ўставала з ложку, а зараз на сам рэч выглядала вельмі кепска. Яна ціха, але патрабавальна прасіла Міндоўга, каб пасля яе смерці, яго новай жонкай і выхавацельніцай яе сыноў была яе малодшая сястра Ядзя. Ён адразу згодзіўся, штоб толькі

супакоіць яе і адразу пра сабе падумаў, што яна звар'яцела. Але Марта вельмі ўважліва на яго пагледзела і вымовіла:

— Заклінаю.

Міндоўг адскочыў, як быццам гук гэтага аднаго словы яго штурхануў. Марта ўвечары памерла. А Міндоўг увесь гэты час і наступны дзень быў пад уражыннем ад заклінанні Марты.

Нечакана з'явіўся Транята, хтосьці яму распавеў аб гэтым. Ён стаў пераконваць Міндоўга, што ў жамойтов ёсць такі звычай, што калі паміраe жонка ўплывовага жамойта, то ён замест яе бярэ ў жонкі сястру памерлай. Хтосьці пацьверджыў гэта і тым, што ў прусаў гэты звычай таксама ёсць. Транята прыпыніў пераконваць Міндоўга ў гэтым толькі тады, калі Вялікі князь Літвы ўказаў ганцу запрасіць Ядзю на пахаванне Марты. Калі яна прыбыла наступным днём, Міндоўг распавёў ёй аб апошніх словах Марты. На здзіўленне, Ядзя адразу згадзілась.

Праз некалькі дзён Міндоўг учуў смех у пакоі сыноў, ён зазірнуў туды і ўбачыў разам з сынамі Ядзю. Ён не змагчы зразумець, ці ён сам жадае штоб сынам было добра з Ядзей, ці хтосьці прымушае яго так думаць.

Міндоўг запрасіў да сабе гандляра Волімунта і той пацьвердзіў, што ў прусаў ёсць такі звычай.

Пасля гэтага Вялікі князь Літвы супакоілся і стаў жыць з Ядзей, як з новай жонкай. Міндоўг чамусьці не звярнуўся да валхва Войта за тлумачэньнем гэтага звычая. Мабыць лічыў Войта выпадковым валхвом, ці яго хтосьці прымушаў так думаць. На трыццаты дзень пасля Калядаў зноў з'явіўся да Міндоўга князь Транята.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, пакуль тэўтонскія рыцары з цяжкасцямі супраціўляюцца прусам, у нас ёсць добрая магчымасць знішчыць апошніх рыцараў Лівонскага ордэна і паграбіць горад Рыга.

— Транята, ты якіх рамеснікаў жадаеш узяць у палон да сабе?

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, я жадаю пабудаваць вялікае паселішча, нават горад унізе па раке Нёман. Мне трэба шмат рамеснікаў розных, і цесляры, і кавалі, і ганчары, і іншые. Маі новыя ваяры жадаюць змагацца, яны ведаюць што з паходу яны

ідуць са здабычай. Раптоўна служка паведаміў, што прыбыў Сымон з Полацка.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, русінскі атрад, які ўзначаліў Яраслаў, гэта малодшый брат князя Аляксандра Яраслававіча, захапіў і знішчыў пасад горада Дерпт (сучасная назва Юр'еў). Але замак русіны не змаглі захапіць.

— У іх што камнеметаў не было?

— Не было, Вялікі князь Літвы.

— Добра Сымон. Адпачывай, а ў ранку зайдзі да мяне.

Яшчэ не паспеў Сымон выйсці, як Транята ўскрыкнуў:

— Вялікі князь Літвы, нам трэба паспець раней за русінаў разграбіць горад Рыга. Дазволь мне з князем Даўмонтам разграбіць і знішчыць Рыгу.

— Транята, я цябе ўжо казаў што ў горадзе Рыга шмат не рамеснікаў, а гандляроў. Спачатку трэба знішчыць замкі, якіе побач з Рыгай. У пасадах гэтых замкаў ёсць рамеснікі. А ў Рызе моцны гарнізон. Транята, мне падабаецца тваё жаданне пабудаваць горад унізу па раке Нёман. Я разумею тваіх новых ваяроў, таму дазваляю твайму атраду сумесна з полацкім атрадам у тры сотні, захапіць, паграбаваць які-небудзь замак з пасадам побач з горадом Рыга. У Полацку таксама ёсць жадаючыя пазмагацца з лацінскімі рыцарамі. А для Даўмонта я меркую іншы паход.

Міндоўгу чуйка падказывала асцерагацца сяброўства Траняты і Даўмонта. Ён доўга разважаў, чаму Даўмонт пакорна ўспрымаў тое, што яго жонка Ядзя адразу згадзілася быць яго новай жонкай, і чаму ў іх нема дзяцей. Можа Доўмонту надакучыла што ў яго з Ядзей нема дзяцей, і таму ён пагадзіўся, штоб яна пайшла да іншага. А калі ён не пагадзіўся, а пагадзілась толькі яна, то чаму не прыйсці да Міндоўга і не абмеркаваць гэта з ім. Дійныя ў яго былі адносіны з Тэкляй, дійныя і зараз. Можа ён лічыць, што заўсёды правы. Але так не бывае. У Міндоўга значна больш поспехаў, але ён заўсёды правераў сваі думкі і высновы з Альгердам. Раней Даўмонт не змагчы дамовіцца з сваім татам князем Эйсмантам па адносінам з Тэклей, зараз не жадае абмерковываць сваі адносіны да Ядзі з Вялікім князем Літвы. З гэтага магчыма зрабіць выснову, што для яго паважаных людзей не існуе, а чаму тады ён адправіў сваіх цесляроў на дапамо-

гу Траняте, а ўзамен нічога ад яго не атрымаў. Зразумела, што Транята дамогся дапамогі хітрасцю. Значыць яго магчыма лёгка абхітрыць. Таму Міндоўг асцерагаўся сяброўства Траняты і Даўмонта.

Вялікі князь Літвы дамовіўся з Транятам, што праз дзевяць дзён ён са сваім атрадам прыйдзе ў Полацк, а адтуль з полацкім атрадам накіроўваецца на поўнач у наваколе горада Рыга. З ранку наступнага дня Міндоўг растлумачыў Сымону аб мэтах сумеснага паходу полачан з атрадам Траняты на поўнач. Праз дваццаць дзён вярнуўся з паходу князь Транята.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, наш сумесны атрад полацкія дазорные завялі далёка на поўнач у зямлю эстаў. Там мы захапілі і паграбавалі горад Пярноў (сучасная назва Пярну). Потым мы правільна арыентаваліся і прыйшлі ў наваколле горада Рыга, дзе ў вечары сутыкнуліся з Лівонскім атрадам. Бой быў каля ўсцья ракі Заходняя Дзвіна побач з горадам Дюнамюнде (Усць-Дзвінск, сучасная назва Даўгагрыва). Мы змагаліся да начы. Мы перамоглі, сярод забітых лівонцаў было дзевяць рыцараў. У маего атрада трое забітых, сем параненых. У полачан трошкі больш.

— Эсты зараз хрысціане? Каму яны падпарадкаваны?

— Так яны ахрышчаны і падпарадкаваны данам.

— Рамеснікаў узяў у палон?

— Так, Вялікі князь Літвы.

— Добра. Дзякуй.

На трэці дзень вясны і новага 6771 лета (1263 па хрысціанскаму календары) прыбыў ганец з Гародні.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, прусы перамоглі тэўтонаў у вялікім баі каля горада Любава. Яны забілі шмат лацінцев, у тым ліку сорак рыцараў.

— Добрая вестка. Сорак забітых рыцараў гэта вельмі добрая вестка. Дзякуй.

Перад Купаллем прыбыў да Міндоўга гандляр Андрэй.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, хан Берке ў Сарае дамовіўся з пасламі мамлюкскага султанату Егіпта і Сірыі Бейбараса, аб вайсковым і гандлярскім саюзе. У тые часы, ваявода хана Берке Ногай змагаўся з войскамі хана Хулагу і не заўсёды паспаяхова. Калі ў апошняй бітве ён пацярпеў паразу ад хана Хулагу, тады

Ногай звярнуўся да хана Берке за дапамогай. Хан Берке пазбіраў вялікае войска з усіх зямель яго даннікаў і ў дзевятнаццаты дзень пасля Калядаў у раніцу напаў на войска хана Хулагу каля ракі Церак. Войска хана Берке знішчылі войска хана Хулагу, а потым праследавалі рэшткі войскаў з Ханам Хулагу аж да Дербента. Пасля гэтага хан Берке вярнуўся ў Сарай.

— Гандляр Андрэй, хан Хулагу яшчэ зможа супраціўляцца хану Берке?

— Вялікі князь Літвы, я меркую што малы час ён яшчэ будзе супраціўляцца, але гэта будзе марна. Пасля гэтай бітвы мусульманства будзе пашырацца.

— Добра. Дзякуй. У пачатку восені нечакана да Міндоўга прыбыў друцкі князь.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, я друцкі князь Давыд Барысавіч, сын Барыса Усяслававіча з дынастыі полацкіх князёў. Мой горад Друцк знаходзіцца ў ракі Друць. Мой сын Глеб Давыдавіч ажаніўся на дачцы Рагачоўскага князя Мірона Барысавіча. Рагачоў знаходзіцца пры ўпадзенні ракі Друць у раку Дняпро. Узімку памёр Рагачоўскі князь Мірон Барысавіч, і маяго сына выбралі Рагачоўскім князем. Перад святам Яна Купалы мой сын накіраваўся ў Чачэрск, што ля ракі Сож. Ён накіраваўся з мэтай дамовіцца аб міры, ўзаемадапамозе і гандлярстве з іх князем Міколам Глебавічам. Калі яны дамоўляліс, то з'явіўся ганец з Гомія, які ў ракі Сож. Гэты ганец перадаў прапанаву сваего князя Расціслава Уладзіміравіча аб сумесным паходзе на Чарнігаў. Чачэрскі князь пагадзіўся з гэтым прапанаваннем і дамовіўся з маім сынам, што і той пойдзе ў гэты паход. Яны трыма атрадамі напалі на Чарнігаў, захапілі яго і выгналі чарнігаўскага князя Андрэя Усеваладавіча. Калі яны дзялілі здабычу, нечакана на іх напаў дзебрянскі князь Раман Міхайлавіч. У змаганні з ім быў паранены мой сын Глеб Давыдовіч, і яго ўзялі ў палон. Гомійскі і чачэрскі князі ўцяклі. У гэтым баі быў паранены дзебрянскі князь Раман Міхаілавіч. Ён пакінуў у Чарнігаве замест сабе намесьніка, а сам з маім палонным сынам накіраваўся ў Дзебрянск. Глеб Давыдовіч мой адзіны сын, акрамя яго ў мяне тры дачкі. Вялікі князь Літвы Міндоўг, дапамажы мне захаваць маю дынастыю, вызвалі майго сына. Я прынёс шмат срэбра.

— Князь Давыд Барысавіч, я памятаю што ты не адразу згадзіўся штоб я быў прызначаны на вайсковага князя ўсіх крывіцкіх зямель.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, гэта была незвычайная прапанаванне, і мне трэба было гэта абдумаць. Тады неўзабаве я даў згоду.

— Але гомійскі князь не даваў запрашэння мяне на вайсковага князя.

— Вялікі князь Літвы Міндоўг, гомійскі князь сваяк чарнігаўскага князя. Таму маему сыну і чачэрскаму князю не трэба было ўмешывацца ў іх спрэчку, але яны маладыя і не разумеюць яшчэ як быць князем. Зараз яны зразумелі сваю памылку. Малю цябе, Вялікі князь Міндоўг, дапамажы.

— Не трэба за мяне маліцца. Трэба выхоўваць разумных і самастойных сыноў. Ты, князь Давыд Барысавіч, як думаеш чаму ардынцы не нападаюць на Літву і на нашыя крывіцкія княствы?

— Таму, Вялікі князь Літвы Міндоўг, што ты вельмі моцны, перамогаеш лацінскіх рыцараў і перамог ардынцаў пад Крутагор'ем, і ты вайсковы князь усіх крывіцкіх княстваў.

— Гэта так, але галоўнае што я ім не перашкаджаю, я не нападаю на зямлі ардынскіх даннікаў. Тое што яны не зрабілі даннікамі смаленскага і гомійскага князёў, гэта значыць што яны не ведаюць, што гэтыя князі не запрасілі мяне быць іх вайсковым князем. Тое што ардынскі ваявода Кайдан накіраваўся на мяне, абыходзячы іншые крывіцкія гарады, так гэта ад таго, што ім наш здраднік распавеў што достаткава толькі забіць мяне, як астатнія будуць пакорліва плаціць ардынцам даніну. Больш разумныя ханы Арды ведаюць, што я знішчая лацінскіх рыцараў, дапамагаю ім і іх саюзнікам канстанцінопольской Царквы. А ты, князь Давыд Барысавіч, прапануеш мне напасць на даннікаў Арды і назаўсёды пасварыць Арду з Літвой і нашымі крывіцкімі князямі.

— Дапамажы, Вялікі князь Літвы, ўсе ў маім княстве будзем маліцца за цябе, ўвесь наш скарб перадам цябе.

— Не трэба маліцца за мяне, і не трэба мне тваё срэбра. Я дапамагу цябе. Праз дзевяць дзён у твой Друцк прыйдуць

чатыры сотні ваяроў нальшанскага князя Даўмонта і адна сотня воруцкіх ваяроў. Табе князь патрэбна пазбіраць як мага больш сваіх ваяроў у добрых даспехах. Усім гэтым атрадам будзе кіраваць князь Даўмонт. Атрад накіруецца на Дебрянск. Мэта гэтага паходу выкуп тваего сына ў дебрянскага князя. На шляху не чапаць ні якія гарады, ні паселішча. Калі атрад Доўмонта возьме ў аблогу Дебрянск, ты князь Давыд Барысавіч падыйдзеш да замка і абвесціш, што табе трэба да князя Рамана Міхаілавіча на перамовы. На перамовах не трэба прасіць, а трэба абвясціць умовы выкупу тваёго сына і даць малы час на згоду. Калі ён з умовамі не пагадзіцца, ці час згоды скончыцца адразу трэба пайсці на штурм і іх знішчыць. У ўсякім выпадку, вяртаючыся не чапаць русінскія паселішча і гарады, тым больш не чапаць Чарнігаў. Умовы выкупу павінны быць такімі, штоб не прынізілі гонар ні іх, ні нас. Усё забеспячэнне ад Друцка і на ўвесь адваротны шлях на табе, князь Давыд Барысавіч. Усё зразумело?

— Так, усё зразумело. Дзякуй, Вялікі князь Літвы Міндоўг.

Калі князь пакінуў Міндоўга, той выклікаў да сабе ганца і накіраваў яго ў Нальшаны.

Наступнымым днём, прыбыўшаму князю Даўмонту, ён растлумачыў мэту і ўсі акалічнасці гэтага паходу. Даўмонт пачаў выходзіць ад Міндоўга, і той зноў адзначыў што ён не пажадаў гаворыць пра Ядзю. Як толькі Міндоўг пачаў разважаць, а чаму ён сам не закрануў гэту размову, то адразу пачуў гучны смех сыноў і Ядзі у суседнім пакоі. Міндоўг вырашыў, што Ядзя нічаму карыснаму не навучыць сыноў, і таму зноў трэба звяртацца да дачкі гандляра Андрэя.

Калі пачалось цямнець, Вялікі князь стаў разважаць аб наступствах гэтага паходу. Ён са задавальненем адзначыў, што ардынцам зараз не да падзей ў Дзебрянску. Раптам Міндоўг учуў шум мітусні за яго дзверамі, і да яго ўварваўся раз'юшаны Даўмонт. У святле бліскнуйшага мяча ўладар Літвы імгненнямі ўбачыў і сваё пасвяшчэнне ў рыцары, і рыцарскі паядынак з Жыгімонтам, і скачушчаю на кані Яньку, і перамогу пад Саўле, і абранне яго Вялікім князем Літвы, і першае мілаване з Мартай.



## ГЛАВА 21

# КНЯЗЬ ДАЎМОНТ

Калі пасля забойства Міндоўга і дваіх яго сыноў, Даўмонт хутка скакаў у начы ад Воруты, і яго конь двойчы амаль не спатыкнууўся, ён прадбачліва спыніўся. Указаў дваім сваім дружыннікам, што пераначуюць тут каля дубу, ён расцеліў свой княскі плашч і з цяжкім уздыхам апусціўся на яго.

Дружыннікі з русін, якім ён даў прытулак у час ардынскай навалы на іх зямлі, былі ўдзячны і аддадзены яму, і выконвалі ўсі яго загады. Накіруясь да Міндоўга, Даўмонт не жадаў яму помсціць за яго ўчынак з Ядзей, можа ўжо трошкі ўціхамірыўся ад гэтай балючай страты каханай, тым больш ганец казаў, што Ядзя без прымусу згадзілась быць з Міндоўгом. Але яго бяздушны погляд і тон размовы аб паходзе, ні аднаго словы спачування мне, як быццам так павінна быць.

Гэта маім дружыннікам няма куды было ісці, і яны служаць мне як хатні сабака, а я магчы і не згадзіцца на княства нальшанскае.

Прызначыўшы мяне на нальшанскага князя, ён думае што ашчаслівіў, і мне трэба назаўседы быць удзячны яму. А тое што гэта княства было вельмі слабым у вайсковых справах, і мне патрэбавалася шмат часу займацца з імі, ад раніцы да цемнаты, штоб іх навучыць, гэта ён не прагне разумець. А я магчы аб'яднаць Эйсмонтцкае княства і княства Тэклі. Хоця сама Тэкля з капрызамі, не пагадзілась пераселіцца са мной ў нальшанскае княства. І добра што не пагадзілась, затое я ўбачыў Ядзю, маю каханаю.

Калі Міндоўг з Мартай штосьці абмеркоўвалі, я пайшоў агледаць наваколле Любчы і трапіў на малое возера, дзе ўбачыў каля вялікага каменя, як аголеная дзявіца кобнілась з двума доўгімі гадзюкамі. Гэтыя гадзіны пераплятаючыся і мілуючыся між сабой, абвілі дзявіцу і той гэта спадабалось. Але тая штосьці ўчула і імгненна кудысьці знікла.

На ўвесь зваротны шлях да Любчы перад вачамі былі мяняючыяся чароўныя выгібы цудоўнага цела дзявіцы. Неўзабаве я яе ўбачыў, калі яна прыйшла на вячэру, і Марта сказала што гэта яе малодшая сястра Ядзя. Я адчуў што вельмі моцна закахаўся ў яе, і нікому не сказаў, што яна ведзьмарка.

Калі ішоў у паход, яна заўседы казала мне сколькі заб'юць нашых ваяроў, і заўседы так і атрымлівалось. Ніколі не казала мне, што можліва мяне заб'юць, ці параняць, і гэта прыдавала мне ўпэўненасці ў змаганні. У маім асяродзі здзіўляліся, што яна не можа зацяжарыць, а мне гэтага не патрэбна. Мне лепей заўсёды бачыць і адчуваць яе маладое, жвавае і чароўнае цела.

Усё было добра пакуль яна не наведала сваю хвораю старэйшаю сястру. Пасля гэтага ў нас пачаліся непаразуменне. Яна раптам стала казаць, што Міндоўг моцнейшы і розумейшы за мяне. Розум не буду параўновываць, але ўсі ведаюць што я самы моцны ваяр. Пасля смерці Ленгвіна ён асцерагаўся ісці ў паход, таму што баіцца загінуць пры змаганні з рыцарамі. Ён стары, якая ў яго можа быць сіла. Яна яшчэ казала, што не ў гэтым сіла, а ў тым што ў яго нема слабасці, а я слабахарактарны.

Калі Марта адмоўляла яму ў мілаванні, ён звяртаўся да служанкі і мілаваўся з ёй, а калі яна мне адмовіла, то я два дні з ёй не зносіўся. На маі тлумачэнні, што я вельмі яе кахаю і мне не патрэбны іншыя, яна рогатала і казала, што я слабавольны. Вось такі рогат яе і сыноў Міндоўга раззлаваў мяне, калі я выходзіў ад Вялікага князя. Я яшчэ спрабаваў супакоіцца, але не змогчы. Перад гэтым яшчэ Транята, як змей спакуснік нашаптаваў, што ён бы такога не сцярпеў, калі ў яго адыб'юць жонку.

Яшчэ абяцаў, што пасля гэтага яго выбіруць Вялікім князем, і ён прызнача мяне Вялікім ваяводам Літвы. Старэйшы сын



Міндоўга Войшалк манах, а ім хрысціянства не дазволяе займацца вайсковымі справамі, таму з астатніх сыноў ён старэйшы. Спадзяюсь ён стрымае сваё абяцанне. А калі Ядзя вярнецца да мяне, то ўсё будзе цудоўна.

## ГЛАВА 22

# ЗАКЛЮЧНАЯ

Трынаццатое сталецце вельмі цікавае, жорсткае і вырашальнае не толькі на наступнае, а і на некалькі будучых. Спачатку лацінская Царква заявіла, што толькі яна імея правы на манаполію прадстаўляць адзінага бога Ісуса Хрыста. У до хрысціянскіе часы існавалі шматбожцы, якіе стварылі вялікую антычную культуру. Розные багі шанавалісь у сувязі з рознымі абставінамі і з рознымі праявамі прыроды.

Прагавітые і прадпрымальные юдэі прыдумалі адзінага бога, стварылі вакол вобраза Ісуса Хрыста міфалогію з розных ужо існуючых міфалогій іншых народаў.

Хрысціяне прапаведавалі не толькі новаю рэлігію, але і падпарадкавалі ёй княскіе ўлады. Яны прапаведавалі што ёсць анёлы, якіе далучэны да кожнага і ахоўваюць яго і днём, і ноччу. Хваробу і няшчасце прыпісвалі дзеяннім бесаў, для змаганне з якімі патрэбны царкоўные заклінанні. Усі гэтые царкоўные забабоны патрэбны ім каб уздзейнічаць на розум і дзеянні веруючым гэтым прапаведнікам. У адзінаццатым і дванаццатым сталецці лацінская Царква павольна, але ўпарта пашырала свой ўплыў на розные плямёны і княства.

Наібольшая па тэрыторыі, па насельніцтву, па фінансам і па росквіту культуры Візантыйская імпэрія ўсярэдзіне адзінаццатага сталецця пачала слабець. Уплывовые людзі пачалі паспяхова супрацьстаяць імпэратору. Слабасць усходне-хрысціян догм, усё больш параджалі сумневы ў канстанцінопольскім хрысціянстве, а іконоборство і шматнацыянальнасць падзяліла імпэрыю на

два варожых лагеря, якіе вельмі эмацыйна ўспрымаліс нават у спартыўных спаборніствах.

У 1204 лета лацінскіе рыцары захапілі Канстанцінополь. Ліквідаваў сваего моцнага суперніка па ўнутрыхрысціянскім спрэчкам, лацінцы папоўніўшысь сваімі аднадумцамі, прадоўжылі насільную хрысціянізацыю шматбожцаў — славян: ободрытаў, люцічей, паморан. К гэтаму іх прызваў у 1193 лета рымскій Папа Целісцын Трэцій. А ў 1217 лета рымскій Папа Гонорый Трэцій абвясціў крыжовый паход супраць прускіх шматбожцаў.

У пачатку трынаццатага сталецця на землях з цяперашняй назвай Беларусь пражывалі балты з славянскай гаворкай. Раней плямёны на гэтых землях былі з рознай назвай: яцвягі; дрыговічы; драўляне; радзімічы; крывічы. У трынаццатым сталецці захаваліс две назвы. На заходніх землях былі яцвягі, а на ўсходніх крывічы. У яцвягаў было шматбожжа, толькі адзінкі з князей і ўплывовыых людзей прытрымліваліс канстанцінопольскага хрысціянства. У крывічэй большасць селянства былі шматбожцы, а большасць князеў і уплывовых людзей былі канстанцінопольскіе хрысціяне, хаця традыцыі і абрады шматбожжа захавалі і яны.

Ва ўсіх гэтых землях быў высокі ўзровень жыцця, ў параўнанні з суседзямі. Напрыклад, у горадзе Наваградак былі двухпавярховые і нават адзінкі трохпаверховые дамы з шклянымі вокнамі і дымаходам. Гэтага яны дамагліс за кошт паспяховага рамесніцтва, а таксама гандлярства па Дняпро — Прыпяцко-Неманскага шляху ў яцвягоў, і па Дняпро — Заходнедвінскага хляху ў крывічоў.

У трынаццатым сталецці спрэчак меж князямі ў гэтых землях не было, ў адрозненне ад суседзей. На захадзе ранейшае моцнае адзінае полянскае княство пад уладай Казіміра, пасля яго смерці падзялілас на шмат княств варожасць меж якімі большая, чым з іншаземцамі. На поўдзене і на ўсходзе русіны таксама змагаюцца з суседнімі русінамі больш, чым з іншаземцамі.

А на поўначы ў жамойтов быў вельмі замкнуты лад жыцця, без рамеснікоў, без гандляроў, без гарадоў, без магчымасці ваяваць. Да іх звярталіс яцвягі, крывічы, земгалы, латгалы, ку-

роны якіе мянялі вырабы сваіх рамеснікоў на іх пушніну, мёд, воск. Таму яцвягі і крывічы іх не асцерагаліс.

У пачатку трынаццатага сталецця полабскіе славянскіе князі яшчэ захоўвалі традыцыі і абрады шматбожцаў, але ўжо былі вымушаны таксама выконваць абрады лацінскага хрысціянства. Пасля 1204 лета полабскіе князья ўжо выпрабавалі на сабе моцны ціск прапаведнікоў лацінскага хрысціянства. Сярод тых хто з гэтым ціскам не пагадзілся былі абадрыцкі князь Ростака Рынгольд і его сыновья: Доўспрунк і Міндоўг. Ад наваградскіх і гародзенскіх гандляроў яны атрымалі запрашэнне ў сваі княства.

Для князя Рынгольда і яго сыноў гэта запрашэнне шматбожцаў спадабалась тым, што ў запрашаемых быў вялікі ўзровень жыцця, аднолькавая гаворка, жаданне і магчымасць абараняцца ад лацінскіх хрысціян.

Для малодшага сына Міндоўга гэта быў добры шанец праявіць сабе ў якасці моцнага ваяра і князя. Наваградскі князь Ізяслаў дапамог князю і ваярам з Ростака пабудаваць замак побач з Наваградкам.

Тое, што Міндоўг быў малодшым сынам князя, пры спадчынам праве маярат, садзейнічала таму што ён з малолетства быў вымушан засяродзіцца на набыццё майстэрства рыцара. Яго настаўнік у гэтым рыцар Эйсмант навучыў яго быць не толькі моцным ваяром, а і моцным ваяводай.

Абставіны склаліс так, што ён усі сваі здольнасці змагчы праявіць у чужынскай зямлі, але сярод шматбожцаў да якіх Міндоўг быў схільны ўсё сваё жыццё. Пераканаўшысь у здольнасці Міндоўга быць добрым ваяводам і князем, наваградскі князь ажаніў яго на сваёй адзінай дачке. У гэты час, Міндоўг стаў воруцкім князем, пасля смерці Рынгольда, і атрымаў ад князя Ізяслава ў валоданне чатыры паселішча. Атрымаўшы некалькі перамог, ён быў прынзачан яцвяжскімі князямі самым моцным вайсковым князем.

Па запрошанню гэтых князёў, Міндоўг навучыў іх ваяроў майстэрству змагання на мечах і іншай вайсковай працы. Ён не толькі ўзмацняў абараназдольнасць яцвяжскіх княстваў, а і быў прапаноўцам заключэння дамовы з уплывавым паўднёвым русінскім княствам.

Гэтай дамовай Міндоўг садзейнічаў зменшэнню напрамкаў пагроз да Літвы, і засяродзіўся на пагрозе ад лацiскага хрысціянства. Ён ніколі не запамятаваў з-за чаго Міндоўг з князем Рынгольдом быў вымушаны сысці з сваіх зямель. Таму змаганне з рыцарамі лацінскіх хрысціян былі галоўнымі для яго.

У гэтыя часы для Рымскага Папы пашырэнне падуласных зямель і распаўсюджванне лацінскага хрысціянства на паўночна-ўсходнем напрамку было галоўнымі. Для паспяховага пашырэння хрысціянства ў гэтыя зямлі лацінцам перашкаджалі толькі моцныя ліцвінскія ваяры. Ведаючы што ліцвінскія князі з яцвяжскіх зямель не толькі моцныя ваяры, а і багатыя, Рымскі Папа арганізаваў паход вялікім войскам на Літву. Але гандляры загаддзя паперэдзілі Міндоўга аб гэтым паходзе, і ён накіраваўшы сваіх разведнікаў у Рыгу, падрыхтаваў сваё войска каб у вырашальным баі ў зямлі земгалаў знішчыць лацінскае войска.

Праз два лета, вялікая пагроза для ліцвінаў і сяброўскім крывічам узнікла з усхода. Далёкая на ўсходзе ваенная імпэрыя Арда, захапіўшая шмат зямель тартар і шмат зямель, якія на поўдні, захапіла русінскія зямлі на ўсходзе, а потым і на поўдні, і наблізілася да крывічоў. У гэтых умовах ліцвінскія князі аб'ядналісь і выбралі Вялікім князем Літвы Міндоўга, а крывіцкія князі запрасілі яго на пасаду вайсковага князя крывіцкіх княстваў. Адразу Вялікі князь Літвы прыняў меры па выяўленню і знішчэнню ардынскіх разведнікаў, і па ўзмоцненню абараназдольнасці ўсіх ліцвінскіх і крывічскіх гарадоў.

Пасля таго як ардынцы прызначылі прывелеі хрысціянскім царкоўнікам перад іншымі русінамі, а таксама па аналізе падзей з удзелам Арды і Нікеі, Міндоўг пераканаўся што паміж імі заключана дамова аб узаемадапамоге. Такім чынам, Рымская Царква з'ўляясь унутрыхрысціянскім ворагам Нікеі, стала ворагам Арды. Шмат гарадоў з лацінскім хрысціянствам падвяргаліся знішчэнню ардынцамі. Калі ліцвіны і русіны знішчалі атрады лацінцев, то гэта было да спадобы Ардзе і Нікеі.

Але галіцка-валынскі князь Данііл Раманавіч вырашыў parodніцца з прыхільнікам лацінскага хрысціянства вугорскім каралём, а таксама ахрысціцца ў лацінскае хрысціянства, прыняць тытул караля русін, і атрымаўшы дапамогу лацінскімі рыца-




*Мяжа ВКЛ і землі ў 6771 лета (1263 па па хрысціянскім календары)*

рамі заменіць Міндоўга з Вялікага князя Літвы на сваего сына. А потым з аб'яднаным войскам ліцвінаў і яго русінаў, а таксама лацінскіх рыцараў вызваліць усіх русінаў ад ардынцаў. Але яго план не спраўдзіўся ад таго,што Рымская Царква не дапамогла яму рыцарамі. Зразумеў што дапамогі ад лацінцаў не будзе, Данііл Рамановіч стаў больш пакорным Ардзе.

Хітрасцю вырашыўшы сваі часовыя цяжкасці, Міндоўг сваімі перамогамі над лацінскімі рыцарамі, актывізаваў супраціў лацінцам сярод шматбожцаў прусаў, куронаў і земгалоў. Пазашлюбны сын Міндоўга Транята рукамі нальшанскага князя Даўмонта, забіў свайго тату, а потым забіў магчымага суперніка на тытул Вялікага князя Літвы Таўцівіла, сына старэйшага брата Міндоўга Доўспрунка. Па шматклікім просьбам, старэйшы сын Міндоўга Войшалк змяніў манаскі сан на свецкага ваяра і ўзначаліў барацьбу супраць Траняты. Траняту забілі ў лазні былыя конюхі Міндоўга.

Нальшанскаму князю Даўмонту выказалі недавер уплывовыя людзі Нальшан, і ён быў вымушаны накіравацца ў тые мясціны, дзе змагчы і ў далейшым змагацца з лацінскімі рыцарамі. Да жамойтаў ён не пайшоў, таму што не ведаў іх гаворку, і таму што яны з іх нізкім узроўнем зброі не змагчы быць моцнымі супернікамі лацінскіх рыцараў. Ён накіраваўся ў Пскоў, бліжэйшы да лацінцаў русінскі горад. Войшалк перадаў правы на Вялікага князя Літвы Шварну, ў якога жонка была дачкой Міндоўга. Але ў іх не было сыноў, а толькі дачкі.

P.S. У пачатку восені 6807 лета (1299 па хрысціянскаму календары), калі ў пакоі Вялікага князя Літвы Віценя абмеркавалі супрацьдзеянне лацінцам, паўстаў служка і паведаміў, што з'явіўся ваяр з Пскова, які прагне змагацца супраць лацінцаў. Яго запрасілі да Вялікага князя. Калі ён зайшоў і назваў сабе, то твары шмат прысутных пабарвавелі ад злосці, а трое схапілісь за дзяржанне меча.

# ЗМЕСТ

Глава 1. Уводная ........................................................3
Глава 2. Пасвячэнне ў рыцары ..........................................8
Глава 3. Усходнія землі ...................................................26
Глава 4. Ворута ..............................................................49
Глава 5. Паход ................................................................85
Глава 6. Князь Рынгольд ...............................................107
Глава 7. Перамены .........................................................125
Глава 8. Размова з гандляром Міхайла .............................150
Глава 9. Дагавор з паўднёвымі русінамі ............................164
Глава 10. Весці з поўдня ................................................180
Глава 11. Яшчэ адна пагроза ...........................................193
Глава 12. Радаснае папаўненне .......................................229
Глава 13. Даўмонт ..........................................................250
Глава 14. Бітва пры Саўле ..............................................260
Глава 15. Ардынская пагроза ..........................................275
Глава 16. Знешнія адносіны ............................................322
Глава 17. Унутраныя адносіны .........................................351
Глава 18. Цяжкія часы ...................................................370
Глава 19. На дапамогу ...................................................411
Глава 20. Пераможца .....................................................436
Глава 21. Князь Даўмонт ................................................462
Глава 22. Заключная ......................................................465

**Валер ЖЫГМАН**

**МІНДОЎГ**

Гістарычная хроніка

Падпісана ў друк 20.01.2021. Друк лічбовы.
Умоўна-друк. арк. 29,5. Наклад 100 асобнікаў

Мінск
Выданне аўтара
2021



Кніга прысвечана Міндоўгу – стваральніку Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), і гісторыі так званай «летапіснай» (або «сапраўднай») Літвы ў XIII стагоддзі.

Хронікі і летапісы тых часоў вывучаны недастаткова, а тыя што вядомыя даследчыкам, прадстаўлены ў скажоным выглядзе. Аднак крытычны аналіз пісьмовых крыніц, археалагічных і этнаграфічных дадзеных, тапонімаў ды гідронімаў дазволіў аўтару даволі падрабязна растлумачыць абставіны стварэння ВКЛ і галоўных падзей з жыцця Міндоўга – першага і апошняга караля старажытнай Літовіі.

Кніга разлічана на беларускіх чытачоў, якія цікавяцца гісторыяй Айчыны.

Валер ЖЫГМАН

# МІНДОЎГ